ГІСТОРЫКА–ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ
ВЫДАННЕ
СТВАРАЕЦЦА
ПАВОДЛЕ
РАШЭННЯ
ЎРАДА
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

2017©nasledie-sluck.by

СЛУЦКІ РАЁН
СЛУЦК

Кніга 3-я

МІНСК
БЕЛТА
2015

2017 © nasledie-slutsk.by

УДК 94(476.1)
ББК 63.3(Беи)
П15

Раённая камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі:
Л.Г. Дабравольская (старшыня камісіі), І.А. Барадзіна, В.С. Відлога,
Л.В. Гурыновіч, П.Б. Даўгучыц, С.У. Жаўрыд, Т.Я. Міхалькевіч,
В.В. Ражанец, Н.Г. Серык

Укладальнік
В.С. Відлога

Мастак
Э.Э. Жакевіч

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі
В.А. Рагалевіча

Памяць: Слуцкі раён. Слуцк. Кн. 3 / уклад. В.С. Відлога; маст.
П15 Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БЕЛТА, 2015. – 624 с. : іл.

ISBN 978-985-7064-14-4.

Трэцяя кніга хронікі – дадатак да гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк», якая была выдадзена ў 2 кнігах у 2000 і 2001 гадах. Кніга ахоплівае перыяды гісторыі краю ад старажытных часоў да сучаснасці. Галоўная мэта новага выдання – увекавечыць памяць родных і знаёмых, чые прозвішчы не ўвайшлі ў папярэднія кнігі. Гісторыка-эканамічныя і біяграфічныя нарысы ў тэтым томе дапоўнены новымі матэрыяламі і дакументамі, таксама ўключаны новыя артыкулы пра знакамітых землякоў.

Кніга будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй свайго роднага краю.

УДК 947.6
ББК 63.3(Беи)

ISBN 978-985-7064-14-4

© Слуцкі раённы выканаўчы камітэт, 2015
© УП «БЕЛТА», 2015

Цэнтральная плошча ў Слуцку.

7 мая 2002 г.
У Слуцку прайшоў X рэспубліканскі фестываль беларускай журналістыкі «Залатое пяро – 2002».

Верасень 2002 г.
Рашэннем Мінскага аблвыканкама Сорагскай сярэдняй школе прысвоена імя генерал-палкоўніка К.В. Герчыка.

Ліпень 2003 г.
У гарадскім Доме культуры адбыўся прэм'ерны паказ кінафільма «Анастасія Слуцкая».

1 верасня 2003 г.
У Слуцку адкрыта сярэдняя школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Снежань 2003 г.
Упершыню прадукцыя ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» была прадстаўлена на рэспубліканскім грамадскім конкурсе «Лепшая прадукцыя года – 2003».

2017©nasledie-sluck.by

Помнік воінам-вызваліцелям у Слуцку.

Верасень 2004 г.

Зарэгістравана Дзяржаўная ўстанова «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Слуцкага раёна».

22 чэрвеня 2004 г.

Адбылося адкрыццё памятнага знака ахвярам лагера палонных (1941–1944) на тэрыторыі ваеннага гарадка па вул. Віленскай.

20 студзеня 2005 г.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб правядзенні ў Слуцкім раёне рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2005».

Люты 2005 г.

У в. Сярагі пачала дзейнічаць новая Свята-Пакроўская царква.

2017©nasledie-sluck.by

У час святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

28 сакавіка 2005 г.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Слуцкі раён і горад Слуцк аб'яднаны ў адну адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку – Слуцкі раён.

Май 2005 г.

У Слуцку на тэрыторыі 307-й асобнай чыгуначнай брыгады адкрыты помнік Герою Савецкага Саюза П.І. Купрыянаву.

Кастрычнік 2005 г.

У Слуцку адкрыта галерэя мастацтваў – філіял Дзяржаўнай установы «Слуцкі краязнаўчы музей».

7–8 кастрычніка 2005 г.

У Слуцку праходзіў рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2005».

2017©nasledie-sluck.by

Помнік Г.К. Жукаву ў Слуцку.

Лістапад 2005 г.
Здадзены ў эксплуатацыю газаправод «Слуцк – Грэск».

Снежань 2005 г.
У Слуцку адкрыта новая лазня.

2006 г.
Выйшаў з друку альбом-даследаванне «Слуцкія паясы».

Люты 2006 г.
Адбыўся сход упаўнаважаных па выбары ўдзельнікаў на 3-і Усебеларускі народны сход.

Люты 2007 г.
У в. Вясея Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі асвячоны храм у гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

Красавік 2007 г.
У Слуцку на вуліцы 14-ці слуцкіх партызан установлены новы помнік Маршалу Савецкага Саюза, чатыры разы Герою Савецкага Саюза Г.К. Жукаву.

2017©nasledie-sluck.by

У час цырымоніі пасвячэння ў кадэты выхаванцаў Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча ў Слуцку.

Ліпень 2007 г.

Адбылося ўрачыстае адкрыццё абноўленага пасля рэканструкцыі аўтавакзала.

Верасень 2007

У Слуцку на вул. Капыльскай адкрыты мемарыяльны знак у памяць загінуўшых у гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Снежань 2007 г.

У аграгарадку Вежы пабудаваны сельскі Дом культуры.

8 мая 2008 г.

У аграгарадку Лучнікі прыняў першых наведвальнікаў музей «Гісторыя СВК «Аграфірма «Лучнікі».

2017©nasledie-sluck.by

Дом культуры ў Слуцку.

18 лістапада 2008 г.
Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь заснаваны флаг горада Слуцка і Слуцкага раёна, зацверджаны палажэнне, апісанне і выява.

18 лістапада 2008 г.
У прафесійна-тэхнічным каледжы перапрацоўчай прамысловасці адкрыта першая ў Беларусі школа кулінарнага майстэрства.

Лістапад 2008 г.
У Слуцку на вуліцы М. Багдановіча адкрыты Цэнтр праваслаўнай асветы імя святіцеля Дзімітрыя Растоўскага.

1 верасня 2009 г.
На базе СШ № 7 пачала дзейнічаць гімназія № 2 г. Слуцка.

2017©nasledie-sluck.by

У час адкрыцця рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2005» у Слуцку.

30 кастрычніка 2009 г.
Скасаваны Амговіцкі сельсавет, населеныя пункты якога ўвайшлі ў склад Сорагскага сельсавета.

1 верасня 2010 г.
У Слуцку адкрыта Мінскае абласное кадэцкае вучылішча на базе былой школы-інтэрната.

Снежань 2010 г.
У цэнтральнай раённай бальніцы адкрыта аддзяленне гемадыялізу.

Снежань 2010 г.
На вытворчых плошчах рэалізацыйнай базы ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў» адкрыты цэх па перапрацоўцы алейных раслін.

Май 2010 г.
У Слуцку на вуліцы Сацыялістычнай заснавана Алея Герояў.

2017©nasledie-sluck.by

Галерэя мастацтваў у Слуцку.

21 мая 2011 г.
На Случчыне прайшоў першы конкурс «Вучань года – 2011».

1 ліпеня 2011 г.
Адбыўся першы выпуск тэлепраграмы «Слуцк TV».

Верасень 2011 г.
Да 895-годдзя Слуцка выдадзены фотаальбом «Слуцк. Падарожжа ў часе» – сумесны творчы праект двух калектываў: краязнаўчага музея і цукраварафінаднага камбіната.

Кастрычнік 2011 г.
307-я асобная чыгуначная брыгада (г. Слуцк) аб'яднана з 30-й асобнай чыгуначнай Чырванасцяжнай брыгадай (г. Жодзіна).

2017©nasledie-sluck.by

Аўтавакзал у Слуцку.

Лістапад 2011 г.

У г. Слуцку дыслацыруецца 30-я асобная чыгуначная Чырванасцяжная брыгада.

Студзень 2012 г.

Рашэннем Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі зацверджаны ордэн святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай.

Чэрвень 2012 г.

У Слуцку пасля рэканструкцыі адкрыты стадыён. Установлены дзве новыя трыбуны з навесамі на 828 пасадачных месцаў.

6 ліпеня 2012 г.

У Слуцку на Доме культуры ўстаноўлены гарадскі гадзіннік.

2017©nasledie-sluck.by

Фабрыка мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы».

11 верасня 2012 г.
Каля аграгарадка Леніна ў азнаменаванне 200-годдзя Айчыннай вайны 1812 года ўстаноўлены паклонны Крыж.

30 лістапада 2012 г.
Зацверджана Дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гг.

28 мая 2013 г.
Скасаваны Акцябрскі, Ленінскі, Маяцкі і Паўстынскі сельсаветы.

23 жніўня 2013 г.
Каля фабрыкі мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы» ўстаноўлены памятны знак «Адраджэнне слуцкага пояса».

Верасень 2013 г.
Каля фабрыкі мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы» установлена скульптура «Ткач».
Адкрыўся музей слуцкага пояса.

2017©nasledie-sluck.by

Скульптура «Ткач». Слуцкія паясы ў музеі слуцкага пояса.

29 кастрычніка 2013 г.

Выраблены першы слуцкі пояс па новых тэхналогіях.

Лістапад 2013 г.

У в. Замосце ўстаноўлены памятны знак у гонар разведчыка-нелегала М.І. Мукасея.

21 лістапада 2013 г.

Нацыянальным банкам Беларусі ўведзены ў абарачэнне памятныя манеты «Слуцкія паясы. Меткі» і «Слуцкія паясы. Калекцыянаванне» серыі «Слуцкія паясы».

21 лістапада 2013 г.

Адбылося ўрачыстае адкрыццё фабрыкі фасоўкі ААТ «Слуцкі цукровараф інадны камбінат».

Лістапад 2013 г.

Спартыўны футбольны клуб «Слуцк» увайшоў у вышэйшую лігу.

2017©nasledie-sluck.by

Слуцкі прафесійна-тэхнічны каледж.

4 снежня 2013 г.

У галерэі мастацтваў – філіяле ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей» – урачыста прадстаўлены слуцкі пояс, набыты пры фінансавай падтрымцы случчан.

24 студзеня 2014 г.

У Слуцку адкрыты першы дзіцячы дом сямейнага тыпу.

24 жніўня 2014 г.

Адкрыта дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дашкольны Цэнтр развіцця дзіцяці «Сонейка».

У Слуцку ўведзены ў дзеянне адміністрацыйна-спартыўны комплекс «Гарадскі».

Лістапад 2014 г.

У ДУ «Гімназія № 1» адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар вядомага астранома і даследчыка В.К. Цэраскага, ураджэнца Слуцка.

Пачаў работу першы буйнафарматны гандлёвы аб'ект «Маяк».

2017©nasledie-sluck.by

ДА ЧЫТАЧА

Шаноўныя чытачы! Перад вамі новае выданне – дадатак да гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк», выдадзенай у 2 кнігах у 2000 і 2001 гг. На мэце было адлюстраваць у гэтых кнігах гістарычныя падзеі роднага краю, а галоўнае – памяць пра людзей, якія ўпісвалі і ўпісваюць свой радок у гісторыю Случчыны. Дзякуючы ім яна такая багатая і цікавая, чым ганарацца сучаснікі.

На жаль, як гэта і прадбачылі стваральнікі выдання, імёны не ўсіх загінуўшых у войнах розных часоў, а таксама тых, хто з перамогай вярнуўся да мірнай працы, увайшлі ў гэтыя кнігі.

Прайшлі гады... Час яшчэ больш прыўзняў завесу памяці. Сталі вядомы новыя падзеі, імёны, сведкі, шматлікія дакументы, якія раней былі схаваны пад грыфам «Сакрэтна». Гэта вялікі вынік творчай працы навукоўцаў і краязнаўцаў, навуковых супрацоўнікаў музеяў і архіваў. З прыемнасцю хочацца адзначыць, што многія матэрыялы асабістых, сямейных архіваў случчан сталі каштоўнымі рэліквіямі Слуцкага краязнаўчага музея, а гэта дало магчымасць дапоўніць асобныя раздзелы новага выдання – дадатку да кніг «Памяць».

Але галоўнае: з'яўленне новага выдання – гэта моцнае жаданне нашых землякоў увекавечыць памяць родных і знаёмых, чые прозвішчы не ўвайшлі ў папярэднія кнігі. Дзеці, унукі, пляменнікі гадамі адшуквалі апошні прытулак блізкіх, якія аддалі сваё жыццё за Радзіму, шчасце і каханне. У некаторых – з'явіліся станоўчыя вынікі. Яны адлюстраваны ў гэтым выданні.

Пры падрыхтоўцы кнігі вялікая ўвага надавалася складанню спісаў па розных напрамках: «Удзельнікі 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў», «Загінуўшыя ў гады савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг.» і г.д., але не трэба лічыць, што яны вычарпальныя. Многія прозвішчы пакуль што так і засталіся невядомымі. Вельмі шкада.

Новае выданне ахоплівае перыяды гісторыі краю ад старажытных часоў да сучаснасці. Значная частка кнігі адведзена перыяду Вялікай Айчыннай вайны: ад першых дзён нямецка-фашысцкай акупацыі Случчыны да Дня Перамогі, даюцца звесткі пра воінаў-землякоў і партызан, якія мужна змагаліся з ворагамі, спісы загінуўшых і г.д.

Асвятляецца мірная праца: прыводзяцца звесткі пра ардэнаносцаў, лаўрэатаў прэмій і заслужаных работнікаў Беларусі, знакамітых землякоў (дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, вучоных, пісьменнікаў) – усіх, хто праславіў і праслаўляе нашу Бацькаўшчыну.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, установы «Занальны дзяржаўны архіў у г. Слуцку», фондавыя калекцыі «Дакументы», «Друкаваныя выданні», «Фотадакументы» ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей», матэрыялы Слуцкага раённага ваенкамата, публікацыі газет і часопісаў, асобных беларускіх выданняў з фондаў раённай бібліятэкі, а таксама звароты і прапановы насельніцтва, сямейныя архівы случчан.

Камісія па стварэнні кнігі выказвае шчырую падзяку ўсім, хто прымаў удзел у рабоце над ёй і яе выданні.

2017©nasledie-sluck.by

Есть на белорусской земле удивительный край с мелодичным названием – Слутчина, с богатой и славной историей, великим культурным наследием. Его по праву называют колыбелью и кузницей великих мастеров и ученых, военных деятелей и талантливых людей, людей, совершивших подвиги во имя родной страны.

Мир подвига неисчерпаем, и в нем крепчайшими нитями связаны прошлое, настоящее и будущее. Кровь, пролитая за победу, и горячая, беспокойная кровь подвига послевоенных лет. Об этом повествуется в 3-м томе историко-документальной хроники «Памяць», которая являет собой специализированную региональную энциклопедию. В ней все значительно, и читать ее равнодушно нельзя. Наверное, так и должна воздействовать на читателя книга, рожденная памятью народной.

У человека, листающего страницы этой энциклопедии истории Слутчины, перед глазами встают события седой старины, проходят архивные материалы, документы и фотографии разных периодов, судьбы людей.

Собранный в книге бесценный материал – завещание наших предков, тех, кто находился в тот или иной период в гуще исторических событий родной Беларуси, Слутчины.

Мы принадлежим к разным поколениям, но нас объединяет одно – любовь к Родине, желание и стремление бережно хранить наши традиции, делать все возможное, чтобы подрастающее поколение знало о подвигах ратных и трудовых. Ведь духовное единство народа основывается на его исторической памяти, и мудрость гласит: без прошлого нет настоящего, без настоящего нет будущего, а это значит – жить, чтобы помнить, и помнить, чтобы жить.

Председатель Слуцкого районного исполнительного комитета
А.В. Янчевский

2017©nasledie-sluck.by

Слуцкі раён. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 156 ад 28 сакавіка 2005 года Слуцкі раён і г. Слуцк аб'яднаны ў адну адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку – Слуцкі раён. Адміністрацыйны раён – горад Слуцк. Мяжуе з Салігорскім, Капыльскім, Уздзенскім, Пухавіцкім, Старадарожскім і Любанскім раёнамі. Плошча – 1821 кв. км, у тым ліку г. Слуцка – 30,5 кв. км.

Уключае 208 сельскіх населеных пунктаў, 14 сельсаветаў. Насельніцтва на 1.1.2015 г. складала 92 379 чалавек. Паводле нацыянальнага складу ў раёне пражываюць прадстаўнікі 43 нацыянальнасцей, з іх беларусаў – 89,8 %, рускіх – 6,4 %, украінцаў – 1,4 %, палякаў – 0,3 %, іншых – 2,0 %.

Агульная плошча сельгасугоддзяў – 119,3 тыс. гектараў, з іх ворнай зямлі – 81,8, садоў і ягаднікаў – 1,6, пашы і сенакосаў – 35,9. Сярэдні бал ворнай зямлі – 38,1, сельгасугоддзяў – 35,5.

Змяненні ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле раёна

На падставе рашэння Мінскага абласнога Савета дэпутатаў ад 28.05.2013 г. № 234 былі скасаваны адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – Ленінскі, Маяцкі, Акцябрскі і Паўстынскі сельсаветы Слуцкага раёна.

Зменены межы:

Беліцкага сельсавета – у яго склад увайшла частка тэрыторыі скасаванага Акцябрскага сельсавета з населенымі пунктамі Акцябр, Цалевічы, Еўлічы, Машчыцы;

Грэскага сельсавета – у яго склад увайшла частка тэрыторыі скасаванага Маяцкага сельсавета з населенымі пунктамі і выключана частка тэрыторыі, у тым ліку населеныя пункты Шышчыцы, Вераб'ёва, Еўладавічы, Забелы, Швяды, Ульянаўка;

Гацукоўскага сельсавета – у яго склад увайшла частка тэрыторыі, выключаная са складу Грэскага сельсавета, у тым ліку населеныя пункты Шышчыцы, Вераб'ёва, Еўладавічы, Забелы, Швяды, Ульянаўка;

Знаменскага сельсавета – у яго склад увайшла частка тэрыторыі скасаванага Ленінскага сельсавета з населенымі пунктамі і частка тэрыторыі скасаванага Акцябрскага сельсавета, у тым ліку населены пункт Селішча;

Ісернскага сельсавета – у яго склад увайшла частка тэрыторыі, выключаная са складу Казловіцкага сельсавета, у тым ліку населеныя пункты Вялікая Сліва, Валаты;

Казловіцкага сельсавета – у яго склад увайшла тэрыторыя скасаванага Паўстынскага сельсавета з размешчанымі на ёй населенымі пунктамі і выключана частка тэрыторыі, у тым ліку населеныя пункты Вялікая Сліва, Валаты;

Сяражскага сельсавета – у яго склад увайшла тэрыторыя скасаванага Акцябрскага сельсавета, у тым ліку населеныя пункты п. Бязверхавічы, Рэтаўшчына, в. Бязверхавічы і выключана частка тэрыторыі, у тым ліку населеныя пункты Бранавічы (у межах вуліц Энергетыкаў, Спаская, Новая, Зялёная, Розы Люксембург; Іванаўская, Цэнтральная (ад рысы горада Слуцка да дома № 16А ўключна), Лучнікі (у межах вуліц Светлая, Сонечная – дамы № 1–6, 1А, 3А–5А), Старыя Лучнікі (дамы № 1, 1А, 3);

горада Слуцка – у яго склад увайшла частка тэрыторыі, выключанай са складу Сяражскага сельсавета, у тым ліку населеныя пункты п. Бязверхавічы, Рэтаўшчына, в. Бязверхавічы і выключана частка тэрыторыі, у тым ліку населеныя пункты Бранавічы (у межах вуліц Энергетыкаў, Спаская, Новая, Зялёная, Розы Люксембург, Іванаўская, Цэнтральная (ад рысы горада Слуцка да дома №16А ўключна), Лучнікі (у межах вуліц Светлая, Сонечная – дамы № 1–6, 1А, 3А–5А), Старыя Лучнікі (дамы № 1, 1А, 3).

2017©nasledie-sluck.by

АД ЧАСОЎ СТАРАЖЫТНЫХ

1917



2017©nasledie.sluck.by

СЛУЦК У КНІГАПІСАННІ БЕЛАРУСІ

Слуцкі летапіс (Ураваўскі летапіс, XV ст.) – адзіны спіс трэцяй скарочанай рэдакцыі летапісу 1446 г. Збярогся ён у рукапісе першай чвэрці XVI ст. Паходзіць са Слуцка, таму названы Слуцкім. Назву Ураваўскі атрымаў па месцы знаходжання ў бібліятэцы графа А.С. Уварава (да 1917 г.). Цяпер – у Гістарычным музеі ў Маскве. У летапісе пададзены падзеі, што адбываліся ў Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, ёсць тут звесткі і пра князёў Слуцкіх.

Слуцкае кнігапісанне, а потым і кнігадрукаванне, бярэ пачатак у летапісанні. Першы выпуск выдання «Сводный каталог славяно-русских рукописных книг, хранящихся в СССР (XI–XIII вв.)» (М., Наука, 1984) налічвае 493 рукапісныя кнігі X–XIII ст. (уключаючы фрагменты). Некаторыя з іх паходзяць з беларускіх зямель і маюць імя ўласнае – паводле гарадоў, у якіх яны знойдзены. З беларускіх зямель вядуць паходжанне і некаторыя рукапісныя кнігі, якія не маюць дакладнай лакалізацыі. У такім выпадку месца стварэння рукапісу можна вызначыць параўнальным аналізам мовы, мастацкага афармлення, чытацкіх памет на палях. Беларускія рукапісы (адпаведна і слуцкія) сёння можна сустрэць у самых нечаканых, на першы погляд, месцах: бібліятэцы Томскага ўніверсітэта, Краснаярскім абласным архіве, Харкаве, Капенгагене, Растове-на-Доне, Амстэрдаме... Многія беларускія рукапісныя кнігі XIV–XVI ст. маюць прыпіскі велікарускім скорапісам XVII ст., якія сведчаць аб бытаванні кнігі ў Маскоўскай дзяржаве. Гэтыя кнігі – часцей за ўсё трафеі або перададзеныя па ўказу патрыярха Нікана з беларускіх (Полацк, Супрасль, Віцебск, Жыровічы і інш.) у толькі што заснаваныя манастыры (Іверскі, Новы Ерусалім, Анежскі і інш.). Нездарма насупраць некаторых кніг у вопісе бібліятэкі Супрасльскага манастыра, як сведчыць «Археологический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси», том 9, пазначана «Масква ўзяла». Сустракаюцца там і кнігі са Слуцка. У час заняткаў у Маскоўскай Сінадальнай, Друкарскай, Хлудаўскай бібліятэках, бібліятэцы Троіца-Сергіевай лаўры і сховішчах Слуцка Я.Ф. Карскі пазнаёміўся з многімі арыгіналамі, да гэтага вядомымі яму толькі з публікацый. Так што сярод такіх вялікіх асяродкаў кніжнасці на Беларусі, як Полацк, Супрасльскі манастыр, Віцебск, Жыровічы, пачэснае месца займае і Слуцк.

Аснову рукапіснай даўніны – старажытных «рукапісных патрыярхаў» складаюць кнігі (пергаміны) богаслужэбныя і чытальныя («четьи-минеи»). Чэцці-мінеі (штомесячныя чытанні) – зборнікі жыцій святых, складзеныя па месяцах у адпаведнасці з днямі ўшанавання царквой памяці кожнага святога. Мінеі (ад грэч. Μηνοί – месячны) – месячнікі, хрысціянскія богаслужэбныя кнігі, якія змяшчаюць тэксты службаў гадавога круга.

Сярод мінейных чытанняў захавалася нямала літаратурных помнікаў мясцовага паходжання або звязаных з беларуска-літоўскімі землямі. У прыватнасці, адзін з ранніх спісаў жыція літоўскіх пакутнікаў Антонія, Іаана і Яўстафія змешчаны ў спісе Мінеі месячнай за лістапад, які паходзіць са Слуцка. У Мінеі агульнай XVIII ст. змешчаны спіс казання «Хождение Богородицы по мукам». Абодва помнікі

2017©nasledie-sluck.by

знаходзяцца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы...

Да царкоўнай рукапіснай кнігі належаць ірмалоі і памяннікі. Ірмалой – зборнік царкоўных спеваў – ірмасаў, якімі пачынаецца кожная з песняў цыкла тэкстаў канона – адной з дзевяці частак ранішняга богаслужэння і так званага «келейнага правіла» – сутачнага цыкла малітваў, абавязковых для манахаў.

Памяннік – кніга з пералікам асоб для памінання ў царкве; іншыя назвы памянніка – сінодык, суботнік. Самыя старажытныя з ацалелых беларускіх памяннікаў датуюцца 1500 г. (Супрасльскі) і 1517 г. (Слуцкі).

Слуцкі памяннік захаваўся ў некалькіх спісах. Сёння вядома аб трох: найстарэйшы (1517) захоўваўся ў Беларускім музеі імя Івана Луцкевіча ў Вільні; другі – у царкоўна-археалагічным музеі ў Мінску і трэці – у Варварынскай царкве ў Слуцку. Апошні перапісаны ў 1684 г. і мае такі загаловак: «Сынодык альбо зобраніе імен преставленных душ, споражены в року 1684 іюліа 14 презь отцевь соборных на тот час будучых Саву Подтопу, Сіміона, Ліонтія, Іоанна Мінкевічовь, Матфея Богушевіча і діакона Іакова Козюлі». Пачынаецца памяннік ад вялікага князя Альгерда; далей, пасля пералічэння мужчынскіх і жаночых імён з роду Алелькавічаў, ідуць імёны князя пінскага Фёдара Яраславіча, мінскіх князёў Глебавічаў, троцкага кашталяна Аляксандра Агінскага, шляхетных родаў Ваньковічаў, Барсуковічаў, Зверавых, Яцковічаў, Неміровічаў, Пажарыцкіх, Караткевічаў, Ляўковічаў, Лапіцкіх. Працягваюць гэты спіс імёны слуцкіх мяшчан з прыпіскамі (калі памерлі, побач з некаторымі напісаны і прозвішчы) – усяго некалькі тысяч імён.

У мінскім асобніку гэтага памянніка ўпісаны імёны васьмідзесяці двух манахаў кіеўскага пустыннага манастыра. Тут жа спіс граматы, якая сведчыць, што ў 1517 г. архімандрыт слуцкага Свята-Троіцкага манастыра і архімандрыт Свята-Мікольскага манастыра ў Кіеве дамовіліся аб бясплатным пісанні братоў слуцкіх у кіеўскі памяннік і кіеўскіх, адпаведна, у слуцкі (пры ўмове атрымання пісьмовага пацвярджэння смерці), што само па сабе сведчыць пра сталыя кантакты (магчыма, пра наяўнасць паштовай сувязі) паміж Кіевам і Слуцкам.

Цікава адзначыць, што ў тэксце аднаго са слуцкіх памяннікаў пазнейшых часоў (XVIII ст.) ёсць такія словы: «В Богоспасаемом граде Слоуцкоу». Гэты памяннік таксама калісьці быў уласнасцю музея І.І. Луцкевіча ў Вільні.

Зборнікі жыцій складалі пацерыкі. Паводле зместу матэрыялу ў іх яны дзеляцца на тэрытарыяльныя: Егіпецкі, Ерусалімскі, Рымскі, Сінайскі, Кіева-Пячэрскі, а таксама на зборныя: Алфавітны і Скіцкі. Часам кнігапісец рабіў выпіскі з розных пацерыкоў, складаючы патрыстычны зборнік (патрыстыка). Прыкладам такой кнігі можа служыць перапісаны ў Слуцку ў 1487 г. зборнік патрыстыкі. Да апошняга часу ён захоўваўся ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы М.Я. Салтыкова-Шчадрына (Ленінград), цяпер – Расійская нацыянальная бібліятэка (Санкт-Пецярбург).

Пасля прыняцця каталіцтва Літвою ў 1387 г. князь Ягайла пабудаваў касцёлы ў Мерачы, Крэве, Брэсце, Гайне, Мінску, Абольцах; князь Вітаўт – у Ашмянах, Гародні, Слуцку, Полацку. У далейшым каталізацыя беларускіх зямель пашыралася, узніклі дзясяткі манастыроў (кляштараў) і сотні касцёлаў. Шырокае распаўсюджанне каталіцкага касцельнага кнігапісання Случчыну закранула ў меншай ступені. Слуцк заставаўся апорай праваслаўя. У другой палавіне

2017©nasledie-sluck.by

XVII – XVIII ст. з рэлігійных зборнікаў у асобныя рукапісныя кнігі выдзяляюцца прыродазнаўчыя тэксты. Кнігі тыя сталі пашырацца ў вялікай колькасці. Гэтаму садзейнічала дзейнасць вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, адчыненых на беларускіх землях у асноўным рознымі каталіцкімі ордэнамі. Традыцыяй стала міграцыя прафесараў гэтых школ. Адпаведна павялічылася і колькасць асяродкаў кніжнай вытворчасці. Цяпер гэта: Гродна, Полацк, Нясвіж, Пінск, Навагрудак, Жыровічы, Віцебск, Орша, Слонім, Слуцк, Брэст, Мінск, Друя, Шчучын і інш. У нецаркоўных кнігах з канца XV і да канца XVIII ст. важнае месца займалі летапісы і хронікі. Аднак з дваццаці двух вядомых цяпер спісаў летапісаў і хронік толькі чатыры выступаюць у выглядзе асобных кніг: Слуцкі летапіс, а таксама Запіскі ігумена Арэста, Хроніка Сурты-Трубніцкага і Хроніка Віцебска Панцырнага і Аверкі.

Рукапісная кніга як сродак захавання і памнажэння духоўнай інфармацыі заўсёды з'яўлялася і прадметам мастацтва. Гэта праяўлялася ў выкананні і размяшчэнні пісцом тэксту і самога афармлення кнігі (вокладка, пераплёт, зашпількі, фарбы і г.д.). У пазнейшыя часы ўсяму гэтаму надавалася надзвычай вялікая ўвага, увага ў духу Адраджэння. Характэрным прыкладам першых рэнесансных пераплётаў канца XV ст. з'яўляюцца два пераплёты месячных міней, якія выкананы, хутчэй за ўсё, у Слуцку ў 1480–1490 гг. Знаходзяцца яны ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. Добра выкананыя, ціснёныя рознымі арнаментамі і таблеткамі. Скура гэтых пераплётаў займае дзве трэці плошчы дошкі. Карашок прымацаваны да тоўстай скуры, якая «ў стык» злучана з ціснёнай. Аналагі такой наборнай канструкцыі можна знайсці сярод нямецкіх пераплётаў таго часу. Тады ў духоўным жыцці Слуцка прыкметную ролю адыгрывалі кальвіністы. Цудоўнага мастацкага эфекту дасягнулі пераплётчыкі, робячы замест металічных навугольнікаў і сярэдніка цісненне гэтых элементаў на скуры. На вонкавым баку кнігі пераважала залатое цісненне, а на адваротным – срэбнае. Для гэтага выкарыстоўваліся штампы, якія рабілі прафесійныя ювеліры. Металічныя элементы пераплёту (зашпількі, навугольнікі з чаканкай або гравіроўкай) таксама заказвалі ювелірам. Часам ювеліры наносілі на зашпількі лацінскія літары і манаграмы. Яны ёсць на пераплёце Пяцікніжжа Майсеевага і Тлумачальнага псалтыра са Слуцка і інш. На пераплётах кніг Маскоўскай Русі даследчыкі не знаходзяць гэтых зашпілек, таму іх можна разглядаць як адну з лакальных прыкмет. Зношаныя пераплёты аддавалі на рэстаўрацыю. Так, у студзені 1687 г. слуцкі войт Іван Лапіцкі «і іншыя» для ўсіх міней (відаць, да гатовага камплекта) сваёй прыхадской царквы заказалі новыя пераплёты. Сёння ўсе яны знаходзяцца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы.

Ёсць меркаванні, што пераплётчыкі рукапісных кніг у Слуцку (а можа, і яшчэ дзе) карысталіся паслугамі і матэрыяламі персіярні – фабрыкі слуцкіх паясоў як для пераплётаў новых кніг, так і рамонту старых. Што гэта фабрыка, апроч паясоў, вырабляла і іншыя рэчы, можа сведчыць і факт знаходжання ў касцёле ў Будславе фіранак для іконы мясцовай Божай маці, якія былі выраблены ў Слуцку. З мануфактуры слуцкай персіярні было выраблена для таго ж Будслаўскага касцёла і касцёла ў Касцяневічах службовае святочнае адзенне для святароў. Штогод апякун

2017©nasledie-sluck.by

кніжнай справы землеўласнік Брэсцкага павета шляхціц Сцяпан Карыцінскі рабіў значныя закупы слуцкай мануфактуры на кірмашы ў Высокім Літоўскім, дзе траціў ад 800 да 1000 злотых. Тут ён купляў сабе і сыну знакамітыя паясы, за якія плаціў па 200 злотых.

Асноўным матэрыялам, на якім перапісваліся кнігі ў XVI–XVIII ст., была папера. Паперні – фабрыкі па вытворчасці паперы – былі амаль звычайнай з'явай на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага. У Слуцку паперня была заснавана ў 1648 г. Радзівіламі; у 1760 г. пераведзена ў Любань.

На вялікі жаль, сёння ў нас мала інфармацыі пра кнігапісцаў. Так, сваю прысутнасць у XV ст. зафіксавалі толькі некалькі пісцоў. Імі былі названы мясціны, дзе яны працавалі: Каляда – у Слуцку, Яўстафій – у Гародні, Андрэй Сцяпанаў сын – у Слуцку, Арцемій – у Віцебску, Іванчык – у Вільні. У XVI ст. вядомы толькі чатыры свецкія кнігапісцы: князь Юрый Алелька ў Слуцку, Іван Праскура ў Супраслі, Грыгорый Іванавіч – спісальнік, а магчыма, і складальнік супрасльскага спісу летапісу Вялікага Княства Літоўскага і Парфён, які перапісваў у 1543 г. псалтыр па заказу пінскага старасты Івана Міхайлавіча. Астатнія адзінаццаць вядомых перапісчыкаў – дзякі і іераманахі. Месцамі, дзе працавалі кнігапісцы, былі: Слуцк, Вільня, Нобель, двор Шылкіні (каля Вільні за ракой Віллёй) і Супрасль. Пятнаццаць кнігапісцаў вядомы нам у XVII ст. Яны працавалі ў Лешчанскім, Куцеінскім, Супрасльскім манастырах; у Слуцку і Турыйску, прычым пяцёра – у Супраслі. Толькі трое не адзначылі сваёй прыналежнасці да святарскага сану: Іакім Гладкевіч, мешчанін турыйскі, Багдан, «спявак» родам з Пінска, ды названы ўжо паланянік полацкі Іван. Астатнія кнігапісцы – манахі, дыяканы і святары. Прыпіскі манахаў да рукапісаў вылучаюцца тым, што яны часам называюць сваё прозвішча. У папярэднія перыяды такое не практыкавалася. Прыпіскі перапісчыкаў не толькі даюць інфармацыю пра месца працы і нараджэння кніжнікаў, але і называюць іх імёны. Часта ў прыпісках сустракаюцца і імёны заказчыкаў кніг. Сярод іх людзі самых розных слаёў грамадства – ад буйных феадалаў да дробнай шляхты і мяшчанства: паны Солтан Солтанавіч і Фёдар Валовіч, маршалак Аляксандр Солтан, князь Юрый Сямёнавіч Слуцкі, пан Іван Касабуцкі, мешчанін шклоўскі, браты Еўстафіевічы, Юрый Андрэевіч Галянішча. Часта заказчыкамі выступалі прадстаўнікі духавенства – манах Аляксей, іераманах Ісая, святар Казьма Васільевіч Жаба, прэсвітар Андрыевіч, слуцкія ігумены Іосіф Балгарыновіч і Аўрамій, беразвецкі ігумен Васіль Паляціла, архіепіскапы – полацкі Нафанаіл, тураўскі і пінскі Паісій Сікоўскі, мітрапаліты Іосіф Солтан, Габрыэль Каляда, Іосіф Вельямін Руцкі. Характэрна, што калі ў XV–XVI ст. сярод укладчыкаў сустракаюцца пераважна буйныя магнаты, дык пазней кніга робіцца ўкладам сярэдняга і ніжэйшага станаў грамадства.

Вось спіс некаторых кнігапісцаў па Слуцку XV–XVII ст.: Каляда, дыякан (Псалтыр, 1462 г.); Андрэй Сцяпанаў сын (Патрыстычны зборнік, 1487 г.); Антоній, іераманах (Евангелле, 1502 г.); Юрый Юр'евіч Алелька, князь (Евангелле, 1582 г.); Пахомій Тацэнка (Псалтыр, Евангелле, 1669 г.).

Каб вызначыць ролю кнігі як інструмента пашырэння культуры на беларускіх землях, зафіксаваць розныя яе грамадскія функцыі і акрэсліць уплыў на эвалюцыю поглядаў, перакананняў і вераванняў, на развіццё паняццяў і ведаў, трэба вызначыць, якога асяроддзя і якіх

2017©nasledie-sluck.by

грамадскіх і прафесійных груп дасягала кніга, якія былі магчымасці і спосабы кантакту спажыўца з кнігай, як яна абарачалася ў грамадстве. Інакш кажучы, трэба знайсці адказ на пытанне, звязанае са збіраннем, захаваннем, выкарыстаннем, спосабамі пашырэння; карацей – бытаваннем рукапіснай кнігі.

Частка царкоўных бібліятэк на беларускіх землях належала ў XVII–XVIII ст. Кіеўскай праваслаўнай епархіі. Кіеўскі мітрапаліт Арсеній Магілянскі так апісваў іх стан на падставе данясення слуцкага архімандрыта Дасіфея Галяноўскага: «Шмат якія цэрквы, асабліва што былі ў лясах сярод непраходных балот, не мелі ні евангелляў на прастолах, ні друкаваных апосталаў і карысталіся старадаўнімі рукапісамі, і тое без пачатку або без пазначэння зачалаў, некаторыя цэрквы мелі толькі адзін часоўнік старадаўні, а іншых кніг ніякіх не мелі».

Другім тыпам бібліятэкі, які ахопліваў асноўны масіў рукапіснай кнігі, была бібліятэка манастырская. На жаль, інвентары такіх буйных кніжных асяродкаў, як віцебскага Маркава манастыра, слуцкага Троіцкага, полацкага Іаана Прадцечы на Востраве, не захаваліся да нашых дзён, і таму цяжка ўявіць агульную карціну манастырскай бібліятэкі.

Самую вялікую прыватную бібліятэку на беларускіх землях мелі магнаты Радзівілы. Размяшчалася яна разам з радавым архівам у Нясвіжскім замку і выклікала захапленне ў шматлікіх наведвальнікаў. Кніжныя зборы былі і ў іншых гарадах, што належалі Радзівілам. У прыватнасці, вядома слуцкая бібліятэка князя Багуслава Радзівіла. У Слуцку захоўвалася дзевяць рукапісных кніг, перададзеных пасля ў Кёнігсберг (Калінінград). Цяпер нясвіжская бібліятэка знаходзіцца ў фондах бібліятэкі Акадэміі навук Расіі ў Санкт-Пецярбургу. Яна дагэтуль мала вывучана. Рукапісы, сабраныя Радзівіламі, якія складалі выдатную калекцыю ілюмінаваных кніг, не выяўлены і не ідэнтыфікаваны са старымі вопісамі.

Заканамернасці эканамічнага і сацыяльнага працэсу зноў і зноў прыводзяць нас да высновы, што спосаб жыцця і эфектыўнасць гаспадаркі непасрэдна залежаць ад ведання асаблівасцей духоўнага (таксама, як і эканамічнага) развіцця і ад уменння творча прымяняць культурную традыцыю. Пра гэта згадаў яшчэ ў 1588 г., пішучы прадмову да першага выдання Статута Вялікага Княства Літоўскага, Андрэй Рымша: «Перадавайце нашчадкам, што маеце з продкаў».

У гісторыі нашай культуры рукапісная кніга была папярэдніцай і спадарожніцай кнігадрукавання. Беларускае кнігадрукаванне прыняло ў спадчыну вопыт папярэдніх стагоддзяў у складанні і напісанні кніг. Але перш чым выйсці з друкарні, кнігі доўгі час ствараліся ў скрыпторыях пры манастырах, княжацкіх палацах ці яшчэ ў якіх месцах, дзе кнігапісец, нібы які маг, заставаўся адзін на адзін з часам і, безумоўна, з Творцам. На пергаміне і на паперы, багата аздобленыя і з-пад друкарскага варштату – старыя кнігі захоўваюць лад нашага мыслення, нашу эстэтычную культуру, нашу мову ў якасці асноўных складнікаў нашага менталітэту. І адначасова складаюць наш гонар. Слуцк жа займае годнае месца ў геаграфіі асяродка беларускай (і не толькі беларускай) культуры кнігі.

Я.С. Гучок.

2017©nasledie-sluck.by

СЛУЦКІ ТРОІЦКІ МАНАСТЫР

Слуцкі Троіцкі манастыр становіцца вядомым у 1205 г., калі «падчас вайны з палякамі ён быў абрабаваны». Першае вядомае наданне манастыру было зроблена ў 1455 г., калі баярын Васіль Цар, з дазволу слуцкага князя Міхаіла Аляксандравіча Алелькі, купіў «дворец Ивашка Гридковича на Локнеи» і «придал Святей Троици у Слуцку...».

Троіцкі манастыр знаходзіўся пад патранатам слуцкіх князёў. У другой палове XV – XVI ст. гэта былі князі з роду Алелькаў, якія выдзялялі сродкі на яго ўтрыманне. У 1489 г. княгіня Ганна Слуцкая сваёй граматай дорыць манастыру «став Локнейскый»; у 1492 г. выдае даравальныя граматы на «чоловека нашого данного Ивана Козича» і на сяло Драбышэўскае.

Звесткі пра манастырскую маёмасць можна знайсці ў інвентары 1494 г. На жаль, у ім не апісваюцца ўсе ўгоддзі, якія належалі манастыру. Затое ўказваецца колькасць харчовых прыпасаў і жывёлы, якая мелася ў гаспадарцы: «А животины: сем волов, а десять коров, а иной животины десятеро. Жита 32 бочки, а немолочоного шестьдесят коп тут, а в Селци стирта сеголетняя сто коп, ечменю сем бочек, гречки шестнадцать бочек, овса пять бочек, пшеницы бочка. Свиней 30, коней работных четверо, а пятый находник вороный. Меду пресного чотыри ушатки...».

У падпарадкаванні манастыра знаходзіліся сяляне, якія плацілі даніну і чынш: «...А в людех не взято 28 ведер (мёду. – *А.Д.*), а в пана Зверя три ведра, а в Мордвиновича человека чотыри ведра. А грошей в людех с шесть коп, а на Сверженьских людех 27 грошей, а куници замонастырскии вси; а за рубль за кун Гринец, а Свержанин за копу». Агульная колькасць сялян і вёсак, падпарадкаваных манастыру, у інвентары не згадваецца.

У XVI ст. уладанні Троіцкага манастыра пашыраюцца за кошт новых ахвяраванняў. 30 сакавіка 1535 г. слуцкі князь Юрый Сямёнавіч Алелька адпісаў манастыру в. Пасека з сялянамі. Манастыр атрымаў права на лоўлю рыбы і баброў на р. Арэса і азёрах – Жыд і Вепр. Гэта права было пацверджана Юрыем Юр'евічам Алелькам у 1566 г. У 1582 г. манастыр валодаў пяццю вёскамі з сялянамі: Пухавічы, Рэдкавічы, Шыпялевічы, Ямінск, Вяхшыковічы.

Від з моста на манастыр

2017©nasledie-sluck.by

Жаночы пансіён. Пачатак XX ст.

Ахвяраванні на карысць манастыра рабілі не толькі князі, але і мяшчане. У 1629 г. жыхар Слуцка Васіль Фёдаравіч Цішэвіч завяшчаў Троіцкаму манастыру фальварак «Зверинец», на якім «он имеет записанных 300 злотых польских…».

Вядома, што ў 1566 г. у Слуцку існавала юрыдыка, а ў ёй «люди монастыря Святой Троицы, которые при городе Слуцке проживают». У 1678 г. у ёй было 26 гаспадароў, з якіх архімандрыт манастыра атрымліваў 300 злотых чыншу ў год. Акрамя таго, жыхары юрыдыкі выконвалі некаторыя гаспадарчыя работы на карысць манастыра.

Манастыр атрымліваў таксама і грашовыя падараванні. Так, у 1641 г. князь Багуслаў Радзівіл загадаў, каб кожны год са слуцкага скарбу манастыру выдавалася 40 коп грошаў ці 100 польскіх злотых; у 1659 г. княгіня Марыя, жонка Януша Радзівіла, адпісала манастыру 4000 злотых.

Троіцкаму манастыру прыносіла прыбытак і выстаўленне ў заставу часткі маёмасці. Архімандрыт Гіларыён Дарапховіч Балоцінскі, «испытав неудобства и хлопоты при собирании с мещан Троецких, назначенного прежними слуцкими князьями, для сычения 150 ведер меду для Троицкой обители, при чем возникали споры и недоразумения, а посему он отдает в арендное содержание еврею Довиду Якубовичу пивной шинк с плацом, а также «канон медовый благовещенский и Свято-Троицкий» на три года с 1647–1650 по 170 злотых в год». Акрамя гэтага, Давід Якубовіч павінен быў пастаўляць у манастыр 50 фунтаў чыстага воску штогод. Дадзены дагавор быў пацверджаны і ў 1654 г.

Такім чынам, у XVI – другой палове XVII ст. Троіцкі манастыр валодаў значнай маёмасцю, у склад якой уваходзілі вёскі з сялянамі, розныя ўгоддзі – ворыўная зямля, сенажаці, лясы, бабровыя і рыбныя ловы. Неблагое матэрыяльнае становішча, падтрымка магнатаў, шляхты і мяшчан давалі магчымасць манастыру заставацца праваслаўным на працягу ўсяго перыяду існавання уніі.

А. Дзянісава. Гаспадарчая дзейнасць праваслаўных манастыроў Турава – Пінскай епархіі ў другой палове XVI–XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2009. № 4. С. 12.

Уваход у манастыр. Пачатак XX ст.

2017©nasledie-sluck.by

СЛУЦКІЯ ЗВАНЫ

Упершыню гукі царкоўнага звона над Слуцкам разнясліся, верагодна, у XII ст. Адкуль прывезены былі ў наш горад першыя званы – невядома, магчыма, з Кіева, найбуйнейшага тагачаснага ўсходнеславянскага мастацкага і культурнага цэнтра, з якім Слуцк меў трывалыя палітычныя, дынастычныя і культурныя сувязі.

Горад з часам разрастаўся, будаваліся новыя храмы. У XVI ст. у Слуцку разам з прадмесцямі можна было налічыць да 14–16 праваслаўных цэркваў, у XVII–XVIII ст. – да 18–20, дзейнічалі некалькі каталіцкіх і пратэстанцкіх храмаў. Акрамя храмавых, для горада былі неабходны набатны, сігнальныя і іншага прызначэння званы, якія размяшчаліся ў замку, у Цытадэлі, на ратушнай вежы. У XVI ст. з'явілася патрэбнасць у вытворчасці званоў на месцы. Спрыяла гэтаму і пашырэнне гандлёвых сувязяў. Метал для ліцця званоў і гармат прывозілі купцы з Заходняй Еўропы.

Вяршыняй майстэрства слуцкіх ліцейшчыкаў-канвісараў стаў вялікі звон, адліты для Слуцкага Троіцкага манастыра. Лёс яго досыць цікавы. Апісанне манастыра за 1678 г. падае, што ляжаў ён тады побач са званіцай на зямлі і быў разбітым. У час войнаў сярэдзіны XVII ст. манастыр зазнаў разбурэнні, таму верагодна, што звон быў скінуты і атрымаў тады пашкоджанні. Звесткі ў літаратуры дазваляюць прыйсці да высновы, што зрабілі гэты звон у часы князёў Алелькавічаў, гэта значыць у XVI ст. Звестак пра яго ў пазнейшыя часы не знойдзена. Але ў 1799 г. мясцовыя майстры зноў адлілі вялікі звон для Троіцкага манастыра, які меў вагу 207 пудоў і 10 фунтаў. Можна выказаць меркаванне, што быў гэта той стары, разбіты ў XVII ст. Але нейкім чынам яго захавалі, а пасля знялі форму і пералілі нанава. З таго часу на працягу сарака гадоў ён вісеў на драўлянай манастырскай званіцы. Яго голас далёка разносіўся па наваколлі, а ў святы, дасягаючы горада, служыў сігналам для званароў іншых мясцовых храмаў. У 1840 г., калі са Слуцка ў Мінск была перанесена кафедра мітрапаліта і пераведзены ў Мінск Слуцкі Троіцкі манастыр, разам з іншымі манастырскімі каштоўнасцямі ў губернскі цэнтр адправілі і вялікі звон. Недзе па дарозе яго з-за недагляду скінулі з воза і разбілі. У Мінску звон зноў чарговы раз быў пераліты і падняты на званіцу Петрапаўлаўскага сабора.

Дзейнасць мясцовых канвісараў на працягу XVI–XVIII ст. стымулявалася попытам, які, верагодна, быў не малым. Кожны звон мог служыць доўга, тым не менш за працяглы час зношваўся. Званы маглі быць разбітымі ў час войнаў, атрымліваць пашкоджанні і гінуць пры пажарах. Напрыклад, пры пажары гарадскога Успенскага сабора 29 мая 1702 г., як пра тое пісаў слуцкі святар Юзаф Навумовіч, «згарэла таксама званіца. Тры большыя званы толькі разляцеліся (на кавалкі. – *І.І.*), а два меншыя расплавіліся і мала што можна было з іх знайсці».

Тут мы можам адзначыць, што асноўным заказчыкам у слуцкіх канвісараў выступала праваслаўная царква. На царкоўных званіцах звычайна вісела ад чатырох да шасці званоў. У XVI ст. у Слуцку разам з прадмесцямі магло быць да дзесяці званіц (адзначым, што не кожная царква мела званіцу), у XVII – да 12, а ў XVIII ст. – да 14. Да таго ж, трэба дадаць неабходную колькасць званоў для іншых цэркваў Случчыны, што, як мяркуецца, павінна павялічыць колькасць адпаведна не менш як удвая, і тады мы можам даволі ўмоўна

2017©nasledie-sluck.by

вызначыць неабходную колькасць званоў у кожны перыяд. Трэба ўлічыць таксама і патрабаванні каталіцкіх (іх было да XVII ст. адзін, у XVII–XVIII ст. – чатыры) і двух пратэстанцкіх храмаў горада, хаця попыт з іх боку мог быць значна меншым. Званіцы касцёлаў змяшчалі ад аднаго да трох званоў. Да таго ж, каталіцкія храмы мелі моцныя сувязі з Заходняй Еўропай, і званы для іх маглі быць прывезенымі адтуль. Некаторыя крыніцы прыводзяць апісанні слуцкіх званіц. На кожнай звычайна меўся вялікі, некалькі сярэдніх і малыя званы. Напрыклад, на званіцы гарадскога Успенска-Мікалаеўскага сабора ў XIX ст. віселі шэсць званоў вагою 25, 20, 6, 4, 1 і 0,5 пуда. На званіцу Васкрасенскай царквы ў 1879 г. падвесілі званы ў 15,5, 7,5, 2 і 1 пуд. Званіца востраўскай Міхайлаўскай царквы ў XIX ст. мела званы ў 30, 15, 8, 1 пуд і 1 звон 30 фунтаў. На званіцы Троіцкага манастыра ў 1678 г. віселі вялікі, сярэдні і два малыя званы (акрамя ўжо згаданага вышэй самага вялікага, што ляжаў у той час разбіты). А ў 1800 г. на гэтай званіцы ўжо мелася восем званоў. Шэсць званоў вісела на званіцы Юр'еўскай царквы. На званіцы прыхадскога касцёла ў XIX ст. віселі два вялікія званы. Несумненна, што гэта былі адмыслова падабраныя адзін да аднаго званы, і кожная званіца, як сапраўдны музычны інструмент, мела свой голас і сваё гучанне.

Завяршылася вытворчасць званоў у Слуцку ў XIX ст. Прычынай стала змяншэнне попыту. Справа ў тым, што на працягу XVIII ст. скараціласа колькасць жыхароў горада, да таго ж узрос працэнт яго нехрысціянскага насельніцтва. Таму ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. змяншаецца і колькасць дзеючых слуцкіх цэркваў. Тыя, што засталіся з малымі прыходамі, альбо закрываліся, альбо

Мікалаеўскі сабор у Слуцку. Канец XIX ст.

станавіліся прыпіснымі. А іх маёмасць перадавалася іншым храмам. Можна сказаць, што ў XIX ст. назіраецца своеасаблівае перанасычэнне гарадскіх цэркваў, якія засталіся, царкоўнымі прадметамі. Многае вывозілася за межы Случчыны. Напрыклад, уся маёмасць закрытага Ільінскага манастыра была перададзена Пінскаму Варварынскаму манастыру. Амаль уся маёмасць Троіцкага манастыра ў 1840 г. была забрана ў Мінскі Свята-Духаў манастыр. Ды нават калі б і была ў XIX ст. неабходнасць у званах, то старажытная тэхналогія мясцовых майстроў ужо не змагла б вытрымаць канкурэнцыі з больш развітымі на той час цэнтрамі ліцейнай вытворчасці, што з'явіліся ў іншых гарадах на новай прамысловай аснове.

У час першага ўсталявання ў Слуцку савецкай улады ў 1918 г. са званіцы гарадскога Мікалаеўскага сабора званы былі

2017©nasledie-sluck.by

скінуты. Пазней пазбаўлены сваіх галасоў і іншыя храмы.

Тым не менш вялікая колькасць званоў, нават калі іх знішчалі і мэтанакіравана, не магла знікнуць поўнасцю і бясследна. Некаторыя знятыя званы знаходзіліся ў Слуцкім краязнаўчым музеі, пра што сведчаць здымкі 1920-х гг. Захоўваліся яны па вясковых храмах, зберагаліся або хаваліся вернікамі і аматарамі даўніны. Да нядаўняга часу яшчэ спраўна служылі старыя званы, што віселі на званіцы слуцкай Міхайлаўскай царквы. Даўнейшыя званы, якія маглі захавацца, можна сустрэць у некаторых дзеючых храмах, але пераважна іх званіцы цяпер аснашчаюцца новымі званамі, якія ў нашай краіне прапануе мінская фірма «Отменное литьё». А старажытныя званы для нас павінны заставацца як гістарычная каштоўнасць, як помнікі нашай матэрыяльнай і мастацкай культуры.

І.А. Цітковскі.

Балада Юрыя Алелькавіча

(17.8.1559 – 6.5.1586)

Слуцкае Евангелле напісана табой,
І дачка ў цябе расце і вырасце святой
Соф'яй Слуцкай, пра якую будзе ведаць свет
І якой маліцца будзе панства і паэт
Бедны, як і бедная старонка, у якой,
Часам, нават і ў магіле не знайсці спакой
Ад вайны і здрады братняй, ад атрутных слоў.
Пройдзе ўсё, як праз пясок вада, праз тлум гадоў,
І забудзецца, і знікне, каб з'явіцца зноў.
Княства ж застаецца, як на полі бітвы кроў, –
Кветкамі, што будуць праз вякі расці й цвісці,
Дзе да Бога тым, хто любіць родны край, ісці
Вечна маладымі, маладымі, як і ты.
І цалуе сонца за табой твае сляды,
У якіх, нібыта ў гнёздах жаўрукі, святло
Княскае, якое пылам не пазамяло.

І не замяцецца, бо жыве твой родны край,
Над якім анёлы, над якім птушаны грай
І малітва Соф'і Слуцкай – радасці тваёй,
А для беларусаў на вякі – святой...

Віктар Шніп, лаўрэат Літаратурнай прэміі «Залаты купідон», спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура»

Полымя. 2010. № 2. С. 60

2017©nasledie-sluck.by

СЛУЦКАЕ ЕВАНГЕЛЛЕ – БЕЛАРУСКАЯ СВЯТЫНЯ

Духоўнай святыняй Беларусі стала Слуцкае Евангелле, якое ў XVI стагоддзі перапісаў слуцкі князь Юрый III Юр'евіч Алелькавіч (1559–1586). Пра гэта Евангелле (Чатырохевангелле) Ф.Ф. Серна-Салаўевіч у кнізе «Древнерусский город Слуцк и его святыни» (1896) напісаў, што «работа – верх художественного совершенства. Первые буквы каждого евангелия представляют собою прекрасные рисунки акварельно – голубая с зелёною краска, с золотом; текст писан чернилами; печатные буквы славянского алфавита, на вид как будто воспроизведены механическим типографским способом; оговорки или отметки евангелия для чтения на известный праздник или случай внизу страницы написаны золотом, а зачала отмечены на полях киноварью; кроме того, при первой главе каждого евангелия имеется особый вначале страницы рисунок». Рукапіс мае памер 34,5х24,5 сантыметра, зроблены на т. зв. чарпанай паперы з філігранню ў форме высокага крыжа, пераплёт – з дошак у чырвоным аксаміце без якіх-небудзь аздобаў.

Лёс Слуцкага Евангелля – вельмі цікавая, можна нават сказаць дэтэктыўная старонка гісторыі нашага краю, якая ў поўным аб'ёме яшчэ не вывучана і чакае сваіх магчымых зацікаўленых даследчыкаў. Да канца XIX ст. яно захоўвалася ў Слуцкім Свята-Троіцкім манастыры. Пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі 1917 г. Слуцкае Евангелле трапіла ў Мінскі дзяржаўны

Аркушы са Слуцкага Евангелля



2017@nasledie-sluck.by

музей. У 1929 г. яно было перададзена на захоўванне Беларускаму дзяржаўнаму музею ў Магілёве.

Ёсць некалькі версій таго, што адбылося са Слуцкім Евангеллем у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Па адной з іх, каштоўную кнігу ў 1941 г. вывезлі нямецка-фашысцкія захопнікі, якія акупіравалі Магілёў. Другая версія дапускае, што Слуцкае Евангелле да прыходу ў Магілёў гітлераўцаў паспелі вывезці супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі. Магчыма, хтосьці зацікавіцца гэтымі версіямі і расставіць кропкі над «і». А для нас найбольш важна тое, што Слуцкае Евангелле вярнулася пасля шасцідзесяцігадовага небыцця. На Епархіяльных чытаннях 12 чэрвеня 2003 г. Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ўпершыню паведаміў аб тым, што зніклы ў 1941 г. помнік беларускай нацыянальный культуры знайшоўся! Яго перадаў Уладыку адзін са свяшчэннаслужыцеляў, якому, у сваю чаргу, рэліквію падарыла нейкая прыхаджанка. Цяпер рукапіс захоўваецца ў Дамавым храме ў гонар Сабора беларускіх святых пры Мінскім епархіяльным упраўленні.

У 2004–2006 гг. Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (цяпер Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы) Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь стварылі электронную копію Слуцкага Евангелля. Электроннае выданне «Слуцкае Евангелле – беларускі рукапіс XVI ст.» змешчана на CD-ROM у выглядзе паўнатэкставай электроннай копіі з транслітарацыяй тэксту, прыкладаннем змястоўнай бібліяграфіі, комплексным лінгвістычным аналізам нацыянальнага рукапіснага помніка.

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі прадстаўляе Слуцкое Евангелле. 2003 г.

Слуцкае Евангелле мае дзве асаблівасці. Па-першае, тое, што яго перапісаў чалавек не духоўнага звання (у старадаўнія часы перапісчыкамі кніг часцей за ўсё былі дзякі, манахі, дыяканы), а прадстаўнік вядомага магнацкага роду, які займаў значнае месца ў тагачаснай дзяржаўнай іерархіі Вялікага Княства Літоўскага. Яго праца ў якасці перапісчыка кнігі – выключны выпадак у гісторыі Беларусі, пра іншыя падобныя прыклады звестак няма. Па-другое, ёсць дастатковыя падставы лічыць напісаную свяшчэннікам Малафеем прадмову да Слуцкага Евангелля першым літаратурным творам на Случчыне, які зафіксаваны на паперы і ў якога вядомы аўтар.

У 2009 г. выдавецтва Беларускага Экзархата падрыхтавала і выпусціла ў свет факсімільнае выданне Слуцкага Евангелля. У кнізе беражліва адноўлены ўсе асаблівасці арыгінала, работа выканана ў поўнай адпаведнасці з першакрыніцай. У гэтым маглі ўпэўніцца ўдзельнікі прэзентацыі факсімільнага выдання Слуцкага Евангелля, якую правялі супрацоўнікі раённай цэнтральнай бібліятэкі 10 верасня 2011 г. Яны пазнаёмілі прысутных з эпізодамі гісторыі выдатнага помніка беларускага пісьменства XVI ст., прадэманстравалі яго фрагменты.

Благачынны праваслаўных прыходаў Слуцкай акругі, настаяцель Свята-

2017©nasledie-sluck.by

Міхайлаўскага сабора протаіерэй Міхаіл Вейга ў слове перад удзельнікамі сустрэчы адзначыў: «Перапісаная Юрыем Юр'евічам Алелькам свяшчэнная кніга стала адным з момантаў таго, што гэты род зрабіў для свайго народа. Перапісваючы Евангелле, князь Юрый Юр'евіч турбаваўся пра духоўнасць, але яшчэ больш значна тое, што яго душа патрабавала зрабіць штосьці духоўнае не толькі для сябе, але і для сваіх нашчадкаў».

В.У. Жук.

Факсімільнае выданне Слуцкага Евангелля

СЛУЦКАЕ ВЫДАННЕ «МАНАРХІІ ТУРЭЦКАЙ»

У 1678 г. у Слуцку была надрукавана кніга англійскага гісторыка і дыпламата Пола Рыкота «Манархія Турэцкая». Яе пераклад на польскую мову зрабіў ураджэнец Беларусі Казімір Клакоцкі – адукаваны, улюбёны ў кнігу чалавек. Ён вучыўся і пэўны час жыў за мяжой (у 1645 г. у Арлеане працаваў бібліятэкарам), а з 1669 г. быў ваяводам слуцкім. З 1684 г. займаў пасаду мінскага харунжага.

«Манархія Турэцкая», напісаная Рыкотам, убачыла свет у 1671 г. у Амстэрдаме на французскай мове. Яна зацікавіла К. Клакоцкага тым, што там давалася даволі шырокая, аб'ектыўная і ўсебаковая інфармацыя пра Турцыю. Гэта інфармацыя была неабходная для палітыкаў і вайскоўцаў, бо перакладчык у прадмове да кнігі гаворыць аб пагрозе вайны з боку Асманскай імперыі, што навісла над Рэччу Паспалітай.

Слуцкае выданне «Манархіі Турэцкай» выдатна праілюстравана Максімам Вашчанкам, мастаком з Магілёва. Усе 19 медзярытаў зроблены настолькі вобразна і дасканала, што нават сёння, калі з часу іх стварэння мінула болей як 300 гадоў, ілюстрацыі не страцілі сваёй прывабнасці. Гэта – яркая з'ява ў беларускай кніжнай гравюры. Цалкам свецкі цыкл ілюстрацый выкананы з рэдкай для таго часу жыццёвай перакананасцю і праўдзівасцю.

Некаторыя ілюстрацыі – медзярыты – незалежныя ад тэксту. Асновай для гэтых гравюр з'явіліся, відаць, канкрэтныя назіранні, а магчыма, і накіды з натуры, зробленыя мастаком у Магілёве. Напрыклад, на адным малюнку паказаны тыповыя беларускія жанчыны з характэрным абліччам. Тут ва ўсім адчуваецца, што, ствараючы жаночыя вобразы, магілёўскі гравёр ішоў ад жыцця, ад натуры. Мае рацыю А. Сайкоўскі, калі піша, што ў гэтых ілюстрацыях М. Вашчанка «высокіх і стройных турэцкіх наложніц ператварыў у прысадзістых магілёўскіх маладзіц».

Ілюстрацыі да слуцкага выдання «Манархіі Турэцкай» рабіліся ў Магілёве, пра што сведчаць надпісы пад імі: «Выгравіраваў і намаляваў Максім Вашчанка ў Магілёве».

Устаноўлена, што першакрыніцамі для ілюстрацый М. Вашчанкі з'явіліся працы французскіх мастакоў Себасцьяна Ляклерка і Наэля Кашэна, якія змешчаны ў французскім перакладзе гэтай кнігі. Аднак ілюстрацыі магілёўскага

2017©nasledie-sluck.by

мастака – не копіі. У асобных працах ён прыкметна змяніў кампазіцыю, вобразы, характар штрыхоўкі. Святлоценявой мадэліроўкай магілёўскі мастак дасягаў аб'ёму ў перадачы фігур. Ілюстрацыі М. Вашчанкі даволі маляўнічыя, густыя, кантрастныя; сакавітыя плямы ў іх удала спалучаюцца з лёгкімі паўтонамі і светлымі месцамі на паперы. Яны больш лаканічныя, чым у згаданых французскіх мастакоў.

В. Шматаў.
Магілёўская школа гравюры
(XVII–XVIII ст.ст.) //
Беларускі гістарычны часопіс. 1997.
№ 2. С. 152–153. Друкуецца ў скарачэнні.

«НА ВСЕМИРНУЮ ПОЛЬЗУ...»

Сярод беларускіх асветнікаў, якія працавалі на ніве расейскае культуры, не апошняе месца належыць нашаму земляку Ілье Фёдаравічу Капіевічу – папулярызатару навукі, выдаўцу, перакладчыку, распрацоўшчыку новага расейскага шрыфту, які атрымаў назву «грамадзянскага».

Нарадзіўся І. Капіевіч (або Капіеўскі) каля 1651 г. у сям'і дробнага шляхціца. Пра мейсца ягонага нараджэння дакладных звесткаў няма. Але вядома, што яно знаходзілася на тэрыторыі сучаснае Берасцейскае вобласці, недзе ў ваколіцах Бярэсця. Пра гэта сведчыць прадмова Капіевіча да перакладзенага ім з лаціны «Краткого собрания Лва Миротворца...».

Капіевіч (Капіеўскі) Ілья Фёдаравіч (каля 1651–1714), беларуска-рускі выдавец навучальных кніг, пісьменнік, мысліцель

У неспакойны час нарадзіўся Капіевіч. Хлопчыку было ўсяго тры гады, калі «на всю зямлю Полскую прогневалася был великий государь и повелел огнём и мечем разорити»... Мноства бедстваў прынёс нашай зямлі «гнев государевый». Палалі гарады і вёскі, сотні тысячаў мірных людзей былі забітыя, уведзеныя ў палон, прададзеныя ў рабства... Але, як і заўсёды ў вялікай бядзе, па-рознаму паказвалі сябе людзі, па-рознаму выяўлялася іх стаўленне да захопнікаў. Былі сярод іх і сумленныя барацьбіты за волю Бацькаўшчыны, былі і тыя, хто імкнуўся перачакаць навалу, адседзецца ў сваім доме, былі і здраднікі. Відаць, да апошніх адносіўся і бацька Ілы – Фёдар Капіевіч. Інакш цяжка растлумачыць, чаму цар праявіў такую міласэрнасць да яго, «повелевши совсем дом его сохранити, придавши караул и двух трубачей, иже оглашаша, дабы никто не посмел в двор заехати, не токмо запаляти...».

Толькі нядоўга працягвалася такое прывілеяванае жыццё сям'і Капіевічаў. Варта было ваяводзе Хаванскаму, які

2017@nasledie-sluck.by

ВВЕДЕНІЄ КРАТКОЄ
Во Всякую Исторію
СЪ СОЗДАНІА
МІРА
ДОНЫНѢ СОВЕРШЕННУ СПИСАНОЄ
СЕЯЖЕ ЕСТЬ
Благородным Юношам, Первѣншим Степен.
Истории и Всѣх Премудрых Мѣтописцов Хотѣнія
Читати, Читающей, Совершенно Познавати, Познавшим
Благорасно Всѣх Арѣнаї Діалектов Разумѣвати
Разсуждати и Проповѣдати
Издахся Сія Книга По Указу
Пресвѣтлѣйшаго и Великаго Царя Нашего.
Царя Гдря и Великаго Кнзя
ПЕТРА АЛЕѲѢЕВИЧА.
Всеа Великія и Малыя и Бѣлыя
Россіи Самодержца
Лѣто 1699
На Печатнѣ В Амстердамѣ Сѣ Тщанію
Отца Сына и Стаго Духа
В Дому Аптекаря Іоанна Янсонія Сѣтнера

Тытульны аркуш адной з першых кніг Капіевіча «Введение краткое во всякую историю...». Амстэрдам. 1699 г.

апекаваўся ёю, пакінуць са сваім войскам наваколле Бярэсця, як захопнікі, што засталіся тут, адразу ж прыступілі да сваёй звыклай практыкі і, нягледзячы на ўсе ўказы ды загады, зрабілі з Капіевічамі тое, што і з іншымі на панаволенай імі зямлі беларускай. Вось што піша пра гэта сам Капіевіч: «Егда Хованский великий гетман, ходи под Ляховиче город с войскими силами, тогда боярский сын с Бежецкия пятины (адна з пяцёх частак Ноўгарада Вялікага. – *Г.П.*) противу наказа великого государя меня малого, в девятом году, украл и завёз с собою». Так пачалося вандроўнае жыццё нашага славутага земляка, якому з гэтага часу амаль да скону давялося есці горкі хлеб чужыны...

Нядоўга прабыў Капіевіч у наўгародскім палоне. Неўзабаве яму надарыўся выпадак збегчы ад свайго гаспадара, але вярнуцца на радзіму не было ніякае магчымасці – на абязлюдзелай, спляжанай, зруйнаванай зямлі беларускай працягвалі гаспадарыць чужынцы, і не было ніякай гарантыі, што хлопца зноў не зняволяць... Таму доўгія гады давялося Капіевічу жыць у Масковіі. Як ён тут жыў, чым займаўся, на вялікі жаль, звестак не захавалася. І толькі па прашэсці шасцёх год «умилосердился великий государь и повеле... пустити» Капіевіча «в свою землю с Цехановецким, воеводою мстиславским», які прыехаў у Маскву для перамоваў аб замірэнні.

Але і на радзіме не сустрэў юнак спакою. Як выявілася, за час ягонай адсутнасці ў сям'і Капіевічаў, выкрытай у здрадзе Рэчы Паспалітай падчас ваенных дзеянняў, зямля з вёскаю, ім належачая, была канфіскаваная і перададзеная каталіцкаму касцёлу.

...Бацькоў Капіевіч таксама не знайшоў, таму заставацца на роднай Берасцейшчыне не стаў і як сірата паступіў у Слуцкую кальвінскую гімназію, у так званыя «Слуцкія Афіны», якая была заснавана яшчэ Янушам Радзівілам у 1617 г. Тут і выявіліся ягоныя выключныя здольнасці да гуманітарных навукаў. Юнак дасягнуў вялікіх поспехаў у авалоданні расейскай, польскай, лацінскай, нямецкай і іншымі мовамі.

Вучоба давалася Капіевічу лёгка, і ён без цяжкасцяў скончыў гімназію з адзнакаю. Але тут паўстала іншае пытанне – што рабіць далей маладому чалавеку-кальвіністу, пазбаўленаму родных, без сталага прытулку і сродкаў для існавання ў краіне, дзе набірала моц каталіцкая рэакцыя? І. Капіевіч вырашае з'ехаць з Рэчы Паспалітай і накіроўваецца ў Амстэрдам.

...Здавалася, што нарэшце шчасце ўсміхнулася Капіевічу, што ён знайшоў сваю ціхую гавань. Малады кандыдат-пастар ажаніўся, у яго нарадзілася дачка...

2017@nasledie-sluck.by

Але ў тым самым 1697 г. адбылася ягоная сустрэча з Пятром I, якая перавярнула ўсё ягонае жыццё…

Калі «Вялікае пасольства» расейскае дзяржавы разам з царом, які знаходзіўся ў складзе яго інкогніта, пад імем «некоторого волонтёра» або Пятра Міхайлава, трапіла ў Амстэрдам, Пётр I звярнуў увагу на сціплага службоўцу Амстэрдамскага сабору, бо ў шматлюднай і такой чужой сталіцы Галандыі фактычна немагчыма было знайсці чалавека, які б добра ведаў расейскую мову і да таго ж быў бы абазнаны ў шматлікіх замежных навуках. Таму Капіевіч адразу быў запрошаны ў якасці настаўніка замежных моваў і некаторых навукаў для самога Пятра I і іншых членаў пасольства.

З'язджаючы з Амстэрдама, цар даручыў Капіевічу не толькі працягваць навучанне расейскіх дваранаў, што прыязджалі на Захад дзеля засваення «навукі замежнай», але і скласці шэраг кнігаў, так неабходных для арганізацыі адукацыі ў самой Расеі. Той з радасцю пагадзіўся, бо веды, якімі чалавек валодае, заўсёды патрабуюць рэалізацыі і без перадачы іх іншым робяцца пустым і марным грузам. Але выкладчыцкая дзейнасць не прынесла Капіевічу нічога, апроч непрыемнасцяў. Больш за год вучыў ён расейскіх князёў і дваранаў, але пасля навучання «вси поехали и спасибо не сказавши за учение». Ды мала таго, што яны не заплацілі ані шэляга свайму першаму настаўніку, але ж яшчэ, як скардзіўся Капіевіч Пятру I у лісце ад 18 снежня 1699 г., «мои ж еще глобусы четыре, не заплативши, завезли: два – князь Осип Иванович Щербатов… Два глобусы завезли Семён Андреевич Салтыков, за тое, что я его долгое время учил и трудился его ради». Не спадзеючыся ўжо атрымаць грошаў за навучанне, Капіевіч прасіў у згаданым лісце



Паходны друкарскі станок Пятра I. З гравюры 1900-х гг.

хаця «глобусы... поплатить…». Такое ашуканства з боку расейскіх дваранаў было не выпадкам, а хутчэй, нормаю. Неаднаразова асветніку не плацілі за навучанне, неаднаразова не выкуплялі замоўленых кнігаў...

Але асноўнай турботай Капіевіча было ўсё ж не настаўніцтва, а складанне і друкаванне навуковых кнігаў, так неабходных расейскай дзяржаве, па загадзе Пятра I. А гэтая дзейнасць асветніка шчыльна звязаная з імем Яна Тэсінга, які, паводле сямейных паданняў, пазнаёміўся з царом яшчэ ў Расеі, куды прыязджаў па гандлёвых справах. Менавіта Я. Тэсінгу, па ягонай просьбе, даручыў Пётр I, «за учиненныя им великому посольству службы» друкаваць «земныя и морския картины, и чертежи, и листы, и персоны, и математическия, и архитектурныя, и городостроительныя, и всякия ратныя и художественныя книги на славянском и латинском языках вместе, тако и славянским и голландским языком по особну, от чего б русские подданные много службы и прибытка могли получити и обучатися во всяких художествах и ведениях». Адно забаранялася друкаваць царкоўныя выданні, таму што дзе-

2017©nasledie-sluck.by

ля бяспекі ад ерасяў, «книги церковныя, славянския и греческия, со исправлением православнаго устава восточныя церкве, печатаются в нашем царствующем граде Москве…».

Тэсінг атрымаў прывілей на выданне кнігаў за мяжою.

Не выключана, што ролю памагатага Тэсінгу для Капіевіча вызначыў сам Пётр I, які, з'язджаючы з Амстэрдама, даручыў яму перакласці «Краткое собрание Лва Миротворца, августейшего греческого кесаря, показующее дел воинских обучение».

Беларускі асветнік хутка справіўся з даручанай яму задачай.

...Капіевіч працягваў займацца той працай, якая сталася мэтаю ягонага жыцця. У снежні 1699 г. ён падаў цару рэестр кнігаў, якія ён паспеў надрукаваць ці скласці на працягу 17 месяцаў. Сярод іх чатыры ўжо былі надрукаваныя, трынаццаць падрыхтаваныя да друку і чатыры яшчэ не скончаныя. Здзіўляе працавітасць і абазнанасць Капіевіча, бо нават адзін пералік назваў кнігаў сведчыць пра шырокую эрудыцыю выдаўца ды пра тую вялізную ролю, што адыгралі гэтыя кнігі ў тагачаснай Масковіі, беднай на навучальныя ды ўвогуле на свецкія выданні. Прывядзем некаторыя назвы кнігаў, падрыхтаваных Капіевічам: «Введение краткое во всякую историю», «Руковедение в арытметыку, сирень во всякой счёт», «Поверстание кругов небесных с толкованием», «О деле воинственном», «Номенклятор на русском, латинском и немецком языке», «Притчи Есоповы на латинском и русском языке», «Грамматыка латинская и русская» і інш.

Нядоўга Капіевіч пражыў у згодзе з Тэсінгам. Ужо ў прадмове да лацінскай граматыкі 1700 г. маюцца звесткі, што ён «своими деньгами сооружих типографию». Прычына разрыву друкара са сваім былым паплечнікам невядомая. Мабыць, немалое значэнне мелі тут матэрыяльныя прычыны. Бо яшчэ ў згаданым лісце да Пятра I ад 1699 г. Капіевіч скардзіўся, што Тэсінг «не может мне заплатить противу великих трудов моих, в них же со усердием труждаюся…» і таму ўжо тады падумваў пра ад'езд у Берлін, «к курфирстовскому величеству». Але, як бы там ні было, да 1700 г. Капіевіч адкрыў новую друкарню разам з галандцам Янам Юнгам.

Аддрукаваная ў 1700 г. першая «Грамматыка латинская и русская» не магла распаўсюджвацца ў Расеі, бо прывілей на продаж рускамоўных кнігаў заставаўся

Тытульны аркуш «Руководение в грамматыку во славянороссийскую». Штольцэнберг. 1706 г.


РУКОВЕДЕ́НІЕ ВЪ ГРАММА́ТЫКУ.
MANUDUCTIO
IN
GRAMMATICAM.
Во славянороссійскую.
In Sclavonico Rosseanam.
Нѧ̀ Моско́вскою. Seu Moscoviticam,
Ко оу́треблѧ́нію In Usum
оу́чащыхся discentium
Ꙗ̀зыка̀ linguam
Моско́вскаго. Moscoviticam.
Per
ELIAM KOPIJEWITZ. V.D.M.
Adornata
ANNO 1706.
Ejusdem impensis
& Typis.
STOLTZENBERGII,
Excudebat, CHRISTIANUS PHILIPPUS
GOLTZIUS.

2017@nasledie-sluck.by

за Тэсінгам. Да таго ж існавала рэальная пагроза таго, што Тэсінг, пазбавіўшыся класіфікаванага і такога рэдкага ў Галандыі знаўцы расейскае мовы, перадрукуе выдадзеную кнігу ды прадасць свой наклад у Расею. Таму Капіевіч прыклаў вялікія высілкі на тое, каб дамагчыся напачатку ад галандскіх уладаў прывілею на выключнае друкаванне гэтай кнігі на працягу 15-ці гадоў. Атрымаць такі прывілей было справаю вельмі няпростай.

...Дазвол быў атрыманы. Але становішча друкарні ўсё роўна заставалася незайздросным. Грошай катастрафічна не хапала. Нерэалізаваныя кнігі ляжалі на складах...

Капіевіч вырашае перабірацца бліжэй да тых мясцінаў, дзе ягоны талент мог быць належна ацэнены. У 1703 г. ён пакінуў Амстэрдам і накіраваўся на ўсход.

Як складаўся ягоны лёс на працягу трох год – невядома. Толькі ў 1706 г. след Капіевіча і ягонай друкарні выяўляецца ў прадмесці Данцыга, у Штольцэнбергу, дзе ён надрукаваў «Руководение в грамматыку во славянороссийскую».

Трэба адзначыць, што, друкуючы свае кнігі, Капіевіч з самага пачатку ўводзіў змены і спрашчэнні ў царкоўнаславянскі шрыфт. Мабыць, гэта і сталася прычынаю таго, што ў 1707 г. ён разам з трыма галандскімі друкарамі быў запрошаны ў Маскву для распрацоўкі новага шрыфту, які пазней атрымаў назву «грамадзянскага». Пры гэтым друкары прывезлі з сабою ўзоры новага шрыфту: «три азбуки с пунцонами, матрицами и формами, да два стана на ходу со всяким управлением».

Цяжка пераацаніць значэнне распрацоўкі новага шрыфту для тагачаснай Расеі, дзе да таго часу панаваў царкоўнаславянскі ягоны варыянт, маладаступны для шырокага кола чытачоў. Цяжкасць вывучэння царкоўнаславянскае мовы перашкаджала распаўсюджанню асветы, што з'яўлялася адным з прыярытэтных кірункаў палітыкі Пятра I. Парушэнне шматвекавых традыцыяў пісьма ў шрыфце мела наступствам змены ў лексіцы, граматыцы і г.д., у выніку чаго выпрацоўвалася руская літаратурная мова... Вялізнае значэнне новага шрыфту для Расейскае дзяржавы цудоўна разумеў і Пётр I, які, нягледзячы на Паўночную вайну, якая працягвалася ўжо каторы год, уважліва сачыў за ягоным адліццём. І ў 1708 г. новым шрыфтам у Маскве была надрукавана «Геометриа славенски землемерие издается новотипографским тиснением». Яна сталася першынцам кнігаў грамадзянскага друку ў Расеі, ля вытокаў якога стаіць беларус Ілья Капіевіч.

Пасля працы над грамадзянскім шрыфтам Капіевіч мусіў паехаць у Данцыг з мэтаю перавесці сваю друкарню ў Расею. Адначасова яму з царскае канцылярыі было выдадзена 50 яфімкаў на пакупку кнігаў за мяжой. Але бязлітасны лёс працягваў праследаваць Капіевіча. Друкарні сваёй ён у Данцыгу не знайшоў, бо тая была захопленая і вывезена шведамі.

...Але нягоды Капіевіча не скончыліся са стратаю друкарні. Па дарозе напалі на яго казакі і «тое румедишку однели и, сверх того, били... довольно». Так без аніякае маёмасці і дабраўся ён з дачкою да Варшавы, дзе тады стаялі расейскія войскі. Тут Капіевіч далучыўся, паводле царскага ўказу, да палкоў Якава Бруса.

Можна ўявіць сабе, якое цяжкае жыццё чакала Капіевіча «в походе»: ягоны ўзрост падыходзіў да 60-ці гадоў, што на той час азначала ўжо глыбокую старасць; сродкаў для існавання не было, бо, як скардзіўся друкар у «чалабітнай» цару, «где мне вашего величества годовое жалованье брать, того не определено»: да таго ж, знаходжанне ягонай дачкі ў вай-

2017©nasledie-sluck.by

сковым стане таксама выклікала мноства турботаў. Таму і звяртаецца Капіевіч да Пятра I у згаданай чалабітнай: «А жыву со оною дочеришкою моею девятый месяц с немалою нуждою, и быть мне в походе при старости не возможно, разве да повелит пресветлое ваше царское величество во определениии того моего дела быть где инде», тым больш, што «по се число живу я без дела». Таму Капіевіч прасіў: «да повелит державство ваше в определении дела моего быть за старостию в ином месте кроме здешняго походу, и чтоб вашею превысочайшею и щедролюбивою милостию в совершенство был делом и вашего величества жалованьем определен».

У сваю чаргу і Я. Брус, пры якім знаходзіўся Капіевіч, яўна быў абцяжараны прысутнасцю друкара, які быў яму зусім непатрэбны і ад якога яму даводзілася чуць скаргі на нэндзу і нястачу. Таму палкаводзец таксама піша да Пятра I з просьбаю перавесці асветніка ў іншае месца, каб той займаўся перакладчыцкай дзейнасцю: «не лучше ли его отослать к Гавриле Ивановичу (Галоўкіну, начальніку пасольскай канцылярыі. – *Г.П.*), понеже мне не надобен».

Просьба гэтая была задаволена. Апошнія гады свайго жыцця Капіевіч правёў у Маскве, дзе працаваў перакладчыкам Пасольскага прыказу. Але больш дакладных звестак пра ягоны далейшы лёс не захавалася, вядома толькі, што памёр ён 23 верасня 1714 г.

Так і пакоіцца прах нашага славутага земляка недзе ў Маскоўскай зямлі, для адукацыі якой ён зрабіў вельмі многа. І сапраўды, гаворачы пра значэнне І. Капіевіча для расейскае культуры, нам часта прыдзецца паўтараць слова «першы».

Ён склаў і выдаў першы ў Расеі падручнік па арыфметыцы, першыя

слоўнікі – «руска-лацінска-нямецкі» і «руска-лацінска-галандскі...».

Ён паклаў пачатак перакладу і друкаванню расейскіх перакладаў антычных пісьменнікаў...

Капіевічу належыць гонар быць выдаўцом першага ў Расеі календара («Святцы или календарь»)...

Наш зямляк стаўся аўтарам першай у суседняй дзяржаве мапы зорнага неба...

Ён упершыню ўвёў у расейскі навуковы ўжытак назвы сузор'яў, такіх як Арыён, Дзева, Воўк, Лебедзь, Рак, Стралец, а таксама некаторыя тэрміны – паралель, полюс, вертыкаль, лагарыфм, компас, градус, гарызонт, экватар і г.д...

Менавіта Капіевіч стаіць ля пачатку новага расейскага «грамадзянскага» шрыфту...

Гэта пералік можна доўжыць і доўжыць. Але абмяжуемся тут канстатацыяй таго факту, што Ілья Капіевіч столькі

2017©nasledie-sluck.by

зрабіў для расейскае культуры, што ягонае імя з'яўляецца гонарам для Расеі.

Але праца Ільі Капіевіча мае велізарнае значэнне і для Беларусі. Навучэнец Слуцкае гімназіі сваёй дзейнасцю на глебе суседняе дзяржавы сцвердзіў высокі ўзровень тагачаснае беларускае адукацыі. У ягоных творах сустракаецца мноства беларусізмаў: ведати, друкарня, бураки, крейда, близнята, меж тым, свитание і г.д. «Грамадзянскі» ж шрыфт, распрацаваны ім для Расеі, зараз ужываецца і ў нашым пісьме.

Таму Беларусь можа з поўным правам ганарыцца сваім сынам, Ільёй Капіевічам, беларускім асветнікам Расеі.

Г. Прыбытка.
«На всемирную пользу...» //
Беларуская мінуўшчына. 1994. № 5.
С. 52–56. Друкуецца ў скарачэнні.

СІМВАЛЫ СПРАВАВОДСТВА

Неабходным атрыбутам справаводства, які вядомы ад пачатку цывілізацыі і без якога немагчыма ўявіць дзейнасць любой установы ў наш час, з'яўляецца пячатка. Напісаны тэкст, пацверджаны пячаткай, заўсёды атаясамліваецца з рэальнымі словамі, сказанымі яе ўладальнікам. Пячатка сведчыць аб юрыдычным паўнамоцтве заверанага ёю дакумента.

Пячатка Юрыя Алелькавіча, князя слуцкага і капыльскага. Канец XVI ст.

Як правіла, пасля знікнення або пераўтварэння юрыдычнай асобы яе пячаткі, дзеля пазбаўлення магчымасці пазнейшай падробкі дакументаў, знішчаюцца. Таму, захаваўшыся па нейкіх прычынах, старажытныя пячаткі з'яўляюцца сапраўднымі рарытэтамі, больш вядомы іх адбіткі на дакументах.

Найранейшыя вядомыя нам пячаткі, звязаныя з гісторыяй Случчыны, належаць князю Аляксандру Уладзіміравічу Алельку. З іх адна адносіцца да перыяду яго княжання ў Слуцку, другая – да часу, калі, пакінуўшы сваімі намеснікамі ў Капылі малодшага сына Міхаіла, а ў Слуцку старэйшага Сімяона, сам ён адбыў на княжанне ў Кіеў. На першай бачым зроблены па кругу тэкст, у сярэдзіне – адыходзячую ад падобнага на месяц паўкруга стралу з перакрыжаваннем пасярэдзіне. На пячатцы кіеўскага перыяду выява іншая – тэкст, у абрамленні якога – знак, сходны са знакамі ранейшых кіеўскіх князёў, што ўладарылі ў часы Кіеўскай Русі. Падобная трансфармаваная выява дайшла да нашага часу ў выглядзе трызубца і цяпер з'яўляецца гербам Украіны.

Алелька быў прадстаўніком велікакняжацкага роду, радавым гербам яго

2017©nasledie-sluck.by

і нашчадкаў была Пагоня. Выявы сведчаць, што свае прывілеі князь завяраў пячаткамі са знакамі, якія пэўным чынам былі звязаны з падуладным яму краем – або з Кіеўшчынай, або, як у першым выпадку, – са Случчынай.

Пра цікавы факт, звязаны з прыналежнасцю выявы стралы, што адыходзіць ад паўмесяца, да слуцкіх Алелькавічаў, паведамілі ў «Банкаўскім весніку» за красавік 2009 г. даследчыкі Юрый Барэйша і Эўтеніюс Іванаўскас. У другой палове XV ст. у краіне існавала супрацьстаянне княжацкіх груповак. Феадалы праваслаўнай арыентацыі, якія групаваліся вакол Алелькавічаў, прэтэндэнтам на велікакняжацкі прастол вылучалі Сімяона, а пасля яго смерці – Міхаіла. На падуладных згаданай групе феадалаў тэрыторыях, у тым ліку на Мсціслаўшчыне, Браншчыне, Валыні ў абарачэнні ў тыя часы знаходзіліся грошы з надчаканенай на іх выявай вядомай ужо нам стралы з паўмесяцам. Апагею апазіцыйная барацьба дасягнула напрыканцы 1470-х гг., скончылася раскрыццём змовы і смяротным пакараннем у Вільні ў 1481 г. князя Міхаіла. Верагодна, з гэтым звязана і знікненне з ужытку ў нашых краях выявы-знака «Страла з паўмесяцам».

Дакументы князёў Алелькавічаў XVI ст. ужо маюць пячаткі з выявай Пагоні. Пагоня стала і гербам Слуцкага княства, яе выяву сустракаем на пячатцы замкавай княжацкай адміністрацыі. Можна выказаць меркаванне, што Пагоня магла быць і гербам горада пасля надання яму ў 1441 г. Магдэбургскага права.

Дакументы Слуцкага магістрата XVII–XVIII ст. адзначаны пячаткамі з выявай Пегаса. Тое, што каралеўскі прывілей, якім Слуцку надавалася Магдэбургскае права ў другі раз, зацвярджаў гербам горада Пагоню (Пагоньчыка), а пячаткі магдэбургіі змяшчаюць выяву крылатага каня, стала ў нашы часы прычынай з'яўлення пытання: якім у сапраўднасці быў гістарычны герб Слуцка? Можна сказаць, што канчатковага адказу на яго пакуль што няма, чым мы і патлумачым факт, што пры аднаўленні гістарычнай геральдыкі ў якасці герба Слуцка была спачатку зацверджана Пагоня, а праз нейкі час замест яе была прынята выява Пегаса.

Захаваліся пячаткі, звязаныя з царкоўнай гісторыяй. Адна з іх належыць праваслаўнаму Праабражэнскаму брацтву. Яна авальная па форме, з гравіраваным у цэнтры сюжэтам Праабражэння, распаўсюджаным у іканапісе. Дзейнасць гэтага брацтва ў XVII–XVIII ст. мела важнае значэнне ў справе падтрымкі праваслаўя, а таксама і ў справе арганізацыі адукацыі і асветы ў нашым горадзе. Брацтвам была арганізавана школа для дзяцей, а потым духоўнае вучылішча, якое рыхтавала кадры для цэркваў Случчыны. Акрамя Праабражэнскага, у Слуцку дзейнічала Успенскае брацтва. А вось знойдзеная пячатка Троіцкага брацтва сведчыць, што мелася яшчэ адно, пра якое звестак пакуль што няма.

Вядома пячатка слуцкага архімандрыта Феадосія Васілевіча 1661 г. Слуцкія архімандрыты мелі рэзідэнцыю ў Троіцкім манастыры, яны кіравалі дзейнасцю праваслаўных цэркваў Случчыны, часам іх паўнамоцтвы прасціраліся і значна шырэй. Яны з'яўляліся намеснікамі Кіеўскага мітрапаліта. А Феадосій Васілевіч з 1678 г. стаў таксама і епіскапам Магілёўскім і Беларускім.

З даўніх часоў пячаткі маглі ставіцца на сам дакумент, таксама былі і вісячыя, што мацаваліся на шнурках, якія злучалі лісты. Воск і сургуч, на якіх рабіліся адбіткі, з часам замяніла фарба.

2017©nasledie-sluck.by

У якасці пячаткі магнаты любілі выкарыстоўваць выгравіраваную паверхню пярсцёнка – такая пячатка заўсёды была пад рукою. Але больш распаўсюджанымі сталі адлітыя або вытачаныя з металу круглыя, авальныя або гранёнай формы пячаткі з ручкамі. Заказ на іх выкананне атрымлівалі ювеліры высокай кваліфікацыі, якія маглі гравіраваць. Вядома, што былі такія майстры і ў Слуцку.

Цяпер у пячатках замест металічнай прымяняецца гумавая аснова, іх выраб механізаваны. Паколькі пячаткі – неабходная частка афіцыйных дакументаў, то яны рэгіструюцца, а выраб знаходзіцца пад кантролем адпаведных органаў. Форма і канструкцыя сучасных пячатак пастаянна ўдасканальваюцца. А старажытныя з'яўляюцца музейнымі экспанатамі. Напрыклад, зробленыя з металу пячаткі XIX ст. можна ўбачыць у экспазіцыі Слуцкага краязнаўчага музея. Цэняцца старажытныя пячаткі не толькі як помнікі гісторыі, але і як творы прыкладнога мастацтва.

І.А. Ціткоўскі.

Дакументы сведчаць

... II. Фабрика персидских поясов

Графини Стефании Витгенштейн, урожденной княжны Радзивиловой, в г. Слуцке собственном деревянном строении.

Устроена назад тому более 60 лет князьями Радзивилами; первоначально состояла в арендном содержании помещика Моджарского. Во все продолжение времени, доколе поляки одевались в национальный свой костюм, для убранства которого нужны богатые, шитые золотом и серебром, шелковые пояса, фабрика сия была в полном действии и цветущем состоянии; но когда таковая одежда более и более стала выходить из употребления, то означенный арендатор оставил содержание фабрики, и на оной в продолжение 16 лет выделка была прекращена; с 1815 г. по 1819 г. мастера фабрики, с дозволения помещицы, выделывали пояса и материи на собственное пропитание; а с 1823 г. оная состоит в арендном содержании слуцкого мещанина Канторовича, который, однако, по недостатку материалов, порче инструментов, малому числу и недовольному искусству мастеров не в состоянии выделывать в прежнее время цветущего своего существования.

При сей фабрике состоит верстаков 4, из коих только на одном производится работа; пресс для выглаживания материй 1, челноков для ткания 30.

В 1828 г. выделено: шелковой каймы, затканой золотом и серебром (шириною ½ арш.) 16 ½ арш.

Все сие количество продано в разных местах.

Материалы: золото и серебро в цевках, шелк, несученый разных цветов, покупаются в Москве.

Число рабочих: мастер 1, подмастер 1.

Друкуецца па кн.: Хрестоматия по истории Белоруссии с древнейших времен до 1917 г. Минск, 1977. С. 227. Падрыхтавала В.С. Відлога.

1808 г. – О бунте крестьян шести деревень кн. Радзивилла

…В начале весны прошедшего года крестьяне помещика действительного камергера кн. Радзивилла 6 деревень, лежащих в Слуцком пов., возмечтав, что они свободны от подданства, намеревались отложиться от должного повиновения помещику.

2017@nasledie-sluck.by

Сколь скоро дошло сведение о сем до губернского начальства и что действие одной земской полиции не имело никакого успеху, что тотчас командирован был на место возмущения сего член губернского правления, и взбунтовавшиеся крестьяне в несколько дней силою закона приведены без всякой от военной стороны помощи в должное помещику повиновение по-прежнему.

Причины, отважившие крестьян сих на ослушание, были: 1) перемена помещиком некоторых работ, какие прежде они не исполняли, но какие, однако же, повсеместно прочими крестьянами отправляются, и 2) мысль о вольности, какую питают некоторые из них, что имеют доказательство о дворянстве.

Причины сии, так как и вышеписанное происшествие, подробно описаны в донесении предместника моего вашему сиятельству, от 20-го числа июня минувшего 1808 г.

1809 г. – О восстании крестьян в имениях кн. Радзивилла и помещика Юдицкого

…В течение 1809 г. крестьяне кн. Радзивилла в Слуцком и Игуменском поветах в разных деревнях, а также помещика Юдицкого в Речицком пов. деревень Черемис и Просмычь, не восхотев исполнять ту повинность помещикам своим, которую прежде сего они не отбывали по разным помещицким расчетам и обстоятельствам и которая, однако, есть у крестьян здешних обыкновенная, воспротивились сим новым их распоряжениям и никак не могли быть наклонены к повиновению оных, возмечтав, что они шляхта или люди вольные, обсевшие издревле по договорам, и якобы новая повинность до них не относилась, до такой наконец степени ослушания приведены были, что не только не внимали действию земской полиции, но и пренебрегали воинскою командою, которая употреблена была в Речицком и Игуменском поветах на усмирение, жертвуя имуществом и всем стяжением своим до тех пор, пока по исследовании не открыты были зачинщики сего бунта и не осуждены к должному наказанию, в Слуцком только повете возмутившиеся крестьяне не обращены были одним внушением полиции к повиновению и к своим хозяйственным упражнениям, которыми с начала весны на своих жилищах не хотели заниматься и не мыслили даже засевать свои поля хлебом в намерении привести себя совсем до истощения, что не быть способными к исполнению повинностей крестьянских своему господину.

Вникая в подробность сих обстоятельств, нашел, что до присоединения Польши к России многие богатые помещики имели у себя из своих крестьян род войска: казаков, гусар, стрельцов и пр., – которые от всех работ и повинностей крестьянских были свободными, а потому те люди, считая и теперь себя не в крестьянском звании, ныне, когда наследники тех господ восхотели сих людей обратить в повинность крестьянскую, то они считают оное насильством, а паче по нарушению праздной шляхты к такому их ослушанию.

Впрочем, никаких неповиновений, уклоняющихся к явному нарушению тишины и спокойствия, в прошедшем году замечено не было, что самое подтверждается донесениями, кои чинимы были в свое время по распоряжению правительства.

Друкуецца па кн.: Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў 4 т. Мінск, 1940. Т. 2. С. 136–137.
Падрыхтавала В.С. Відлога.

2017@nasledie-sluck.by

СЛУЦКАЯ БАТЛЕЙКА

Лялечны тэатр батлейка на Случчыне – даволі старая з'ява, ён быў прыстасаваны для калядных святкаванняў. Праўдападобна, што першымі батлеечнікамі былі езуіты, якія ў канцы XVII ст. пачалі прыстасоўваць батлейку ў сваіх манастырскіх школах для ўплыву пры выхаванні моладзі ў такіх гарадах, як Полацк, Гродна, Слуцк, Мінск і іншых месцах. Мы ўжо ведаем, што ў XVIII ст. школьнікі большасці школ на Беларусі ходзяць па хатах з батлейкаю і са звяздою, пры гэтым імі спяваюцца хорам калядныя канты, а часамі ў шэрагу набожных песень адчувалася выкананне і гістарычных песень. Пры выкананні песень выкарыстоўваліся папулярныя тады ў нас на Случчыне інструменты – скрыпка, дуда і часамі гармонь. Батлейка праіснавала ў нас аж да пачатку XX ст., і мы асабіста добра яшчэ памятаем яе, калі і нам прыходзілася хадзіць з ёю ў Слуцку.

У нас батлеечны тэатр меў форму скрынкі на лёгкіх ножках (паннах), кіравалі ім два чалавекі – гаспадар і яго памочнік, якія і гаварылі ў часе калядавання сваімі галасамі за лялек. Лялькі рабіліся з дрэва, каляровай паперы і матэрыі. Батлейка звычайна суправаджалася шматлікай моладдзю і даволі ўжо дарослай, якая прымала ўдзел у выкананні як рэлігійных кантаў, так і розных другіх песень, а таксама батлеечнага тэксту, які быў даволі рэалістычны, ад чаго справа часамі канчалася дрэнна паміж асобнымі ўдзельнікамі.

Пачатак і антракты мелі сваю музыку, але выкананне яе адбывалася яшчэ лепей, калі меўся тут рэгент.

Персанажы тэатра былі больш блізкімі народнаму гледачу асобамі: шляхта, селянін, вандроўца, венгерац, чорт, карчмар і інш.

Хрэстаматыя па гісторыі
беларускага тэатра
і драматургіі
у 2 т. Мінск, 1975. Т. 1. С. 129.

АРГАНІЗАЦЫЯ ПАЛЯВАННЯЎ У АРДЫНАЦЫЯХ КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ У КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

У XIX ст. адной з галоўных форм правядзення вольнага часу магнатаў і шляхты на беларускіх землях было паляванне.

У вялікіх магнацкіх гаспадарках арганізацыі паляванняў адводзілася важнае месца, у іх удзельнічала па некалькі соцень чалавек. Аднымі з самых вялікіх і шыкоўных паляванняў у гэты перыяд былі паляванні князёў Радзівілаў.

...У вялікай радзівілаўскай гаспадарцы лясоў было шмат, за іх адказвала спецыяльна створаная Лясная адміністрацыя. Тэрыторыя кожнай ардынацыі падзялялася на лясніцтвы (акруговыя адміністрацыі). На чале лясніцтва стаяў ляснічы, які прадстаўляў Галоўнае ўпраўленне ардынацый. Ляснічыя мелі акрэсленыя функцыі: назіралі за тым, каб арандатары выконвалі ўмовы кантрактаў, даносілі ў Галоўнае ўпраўленне аб усіх выпадках злоўжыванняў у арандаваных надзелах. Кожны квартал ляснічыя збіраліся на сесіі ў Галоўным упраўленні, дзе абмяркоўвалі бягучыя справы, трымалі справаздачу. Ляснічаму падпарадкоўваліся леснікі, з дапамогай якіх і вялася лясная гаспадарка – нарыхтоўка лесу, барацьба з несанкцыянаванымі вырубкамі, браканьер-

2017©nasledie-sluck.by

ствам і г.д. Абавязкі леснікоў былі дакладна акрэслены. Падчас уступлення на службу кожны з іх падпісваўся ў спецыяльнай друкаванай кніжачцы, дзе былі пералічаны іх абавязкі, акрэслены межы тэрыторыі, за якой назіралі, і г.д. Арыгінал такой кніжкі захоўваўся ў Нясвіжы, а яе копія з подпісам ляснічага выдавалася на рукі леснічку.

Леснікі таксама павінны былі сачыць за папуляцыямі звяроў на сваіх участках. У залежнасці ад вынікаў такіх назіранняў прымалася рашэнне аб тым, дзе будзе праводзіцца паляванне. Так, напрыклад, у 1818 г. егер Омгавіцкага лясніцтва Наўман дакладваў галоўнаму адміністратару маёнткамі і лясамі Радзівілаў Пашкоўскаму аб тым, што ў ваколіцах вёскі Омгавічы ў лясах сустракаюцца: 12 ласёў, 3 сарны, два статкі дзікоў і іншыя жывёлы. У лясах каля вёскі Шчыткавічы ёсць таксама ласі, дзікі. У суседніх лясах – мядзведзі і ваўкі.

Паляванні часам арганізоўваліся з-за скаргаў мясцовага насельніцтва на нанесеную іх зямельным надзелам шкоду ад дзікіх звяроў. Так, у ліпені 1898 г. прыстаў 2-га стана Слуцкага павета Мінскай губерні звярнуўся ў Галоўнае ўпраўленне маёнткамі Антонія Вільгельма Радзівіла з просьбай арганізаваць аблаву на дзікоў у ваколіцах в. Дзяніскавічы Слуцкага павета, бо мясцовыя жыхары скардзіліся на тое, што дзікі наносяць шкоду іх пасевам…

У другой палове XIX ст. правядзенне палявання рэгламентавалася дзяржаўнымі ўладамі. Князь Антоній Вільгельм Радзівіл быў членам Мінскага таварыства правільнага палявання, меў гадавы членскі білет. Кожны паляўнічы, незалежна ад паходжання і матэрыяльнага становішча, павінен быў мець «паляўнічае пасведчанне». Антоній Вільгельм Радзівіл і яго сын Георгій (1860–1914) атрымлівалі такія пасведчанні ў слуцкага павятовага спраўніка. Пасведчанні мелі парадкавы нумар і дзейнічалі на працягу года. У 1897 г. Георгій меў пасведчанне пад № 152, а яго бацька – № 153. У пасведчанне ўкладвалася выпіска з правілаў палявання, якія былі зацверджаны 17 лютага 1892 г. Паводле гэтых правілаў, кожны паляўнічы павінен быў мець такое пасведчанне пры сабе для прад'яўлення яго па патрабаванню паўнамоцнай асобы. У выпадку, калі паляванне адбывалася на чужой зямлі, то паляўнічы павінен быў мець і пісьмовы дазвол ад яе ўладальніка.

Кіраўніцтва ардынацый князя Антонія Вільгельма Радзівіла ў 1880-я гг. супрацоўнічала з адміністрацыяй маёнткаў, якія належалі князю Пятру Віттенштэйну. У першай трэці XIX ст. да Віттенштэйнаў перайшлі ўладанні князя Дамініка Радзівіла ў якасці пасагу яго дачкі Стэфаніі, маці Пятра Віттенштэйна. Гэтыя ўладанні на доўгі час сталі зачэпкай для спрэчак паміж Радзівіламі і Віттенштэйнамі. Аднак да 1880-х гг. старыя крыўды былі забыты, і Радзівілы часта палявалі ў лясах, якія належалі Віттенштэйнам.

У 1882 г. Антоній Вільгельм Радзівіл звярнуўся да Пятра Віттенштэйна з просьбай дазволіць яму паляваць на мядзведзя ў чучэвіцкіх і омгавіцкіх лясах, на што атрымаў дазвол. Галоўнае ўпраўленне ардынацый князя Антонія Вільгельма займалася арганізацыяй паляванняў праз галоўнага ляснічага гэтых лясоў Шумскага. Мясцовыя леснікі не былі задаволены, што людзі Радзівілаў арганізоўваюць паляванне, і часта перашкаджалі гэтаму. У перапісцы паміж Галоўным упраўленнем ардынацый Антонія Вільгельма Радзівіла і ўпраўленнем маёнткамі Пятра Віттенштэйна захоўваецца шмат сведчанняў такога супрацьстаяння. Напрыклад, калі князь Пётр выехаў на адпачынак у Францыю, у гэты

2017@nasledie-sluck.by

час паміж прадстаўнікамі Радзівілаў і служачымі адміністрацыі Віттенштэйнаў разгарэўся канфлікт. Каб дабіцца свайго, кіраўнікі радзівілаўскіх ардынацый шукалі з дапамогай тэлеграм князя Пятра па атэлях Ніцы, каб той разабраўся са сваімі падначаленымі.

Неабходна адзначыць, што калі князі палявалі на землях сялян, яны павінны былі атрымаць ад іх афіцыйны пісьмовы дазвол. У 1898 г. такія дазволы давалі сяляне Слуцкага павета.

Адпаведна правілам, на працягу года нельга было паляваць на зуброў, самак ласёў, аленяў і дзікіх коз, а таксама на маладняк гэтых парод. Былі ўстаноўлены тэрміны, у якіх забаранялася паляванне на іншых дзікіх звяроў і птушак: на самцоў ласёў – з 1 студзеня па 15 жніўня, аленяў – з 1 сакавіка па 15 ліпеня, дзікіх коз – з 1 лістапада па 1 чэрвеня, на глушцоў і цецерукоў – з 15 мая па 15 ліпеня і г.д.

На працягу ўсяго года можна было забіваць бадзяжных катоў і сабак, драпежных звяроў і птушак, да якіх адносіліся мядзведзь, воўк, ліса, барсук, рысь, арол, беркут, сокал, ястраб, воран, варона і, як ні дзіўна, верабей. З 1 сакавіка па 29 ліпеня забаранялася паляванне з сабакамі. Праз 10 дзён пасля таго як пачынала дзейнічаць забарона на паляванне на пэўны від звяроў, ужо нельга было перавозіць, прадаваць і набываць гэтую дзічыну.

Штогод ляснічыя падавалі ў Галоўнае ўпраўленне інфармацыю аб «прыходзе» і «расходзе» звяроў і птушак.

З 14 красавіка па 25 красавіка 1866 г. князем Антоніем Вільгельмам Радзівілам і лоўчым (прозвішча якога невядома) было забіта: лось, 4 зайцы, ліса, 16 ваўкоў, глушэц, 10 цецерукоў, 16 рабчыкаў, 72 бакасы, 18 качак, 25 курапатак і 30 іншых птушак. Усяго ж за гэты перыяд князем, яго паляўнічымі і лоўчымі было забіта: 46 дзікіх свіней, 32 дзікія кабанчыкі, 30 ласёў, 11 сарнаў, 4 мядзведзі, 9 зайцоў, 3 лісы, 16 ваўкоў, глушэц, 10 цецерукоў, 72 бакасы, 18 качак, 25 курапатак, 20 рабчыкаў і «розных птушак» 30 штук. Можна зрабіць выснову, што княжацкі стол у значнай ступені ў тыя часы складаўся са страў, прыгатаваных з паляўнічых трафеяў.

Зімовыя паляванні давалі дадатковы заробак мясцовым сялянам. За дапамогу ў арганізацыі паляванняў (напрыклад, за дастаўку дошак для рамонту домікa ляснічага) сялянам бясплатна выдаваліся дровы. За ўдзел у паляванні давалі воз дроў. Такую плату атрымлівалі аблаўнікі ў паляванні на ласёў і тыя, хто ўдзельнічаў у пошуках мядзведзяў для зімовага палявання. У красавіку 1884 г. Грэскае лясніцтва паведамляла, што для пошуку мядзведзяў быў задзейнічаны 331 чалавек, кожнаму з якіх было абяцана па 2 вазы дроў. Усяго павінны былі выдаць ажно 662 вазы дроў. Зімой 1884/85 г. у пошуках мядзведзяў былі задзейнічаны 462 чалавекі, кожнаму з якіх абяцалі па 2 вазы дроў.

Пазней сялянам пачалі выдаваць і грошы. У 1899 г. 82 загоншчыкі з вёскі Машукі атрымалі за сваю работу 16 рублёў 40 капеек. Сялянам давалі грошы і за прадастаўленне фурманак падчас палявання па 50 капеек за штуку. За чатыры дні палявання ў снежні 1899 г. было задзейнічана 137 загоншчыкаў і 47 фурманак. Усяго расходы на іх склалі 100 рублёў 50 капеек.

Пасля паляванняў заставалася шмат звярыных шкур, якія дасылаліся ў Нясвіж. Некаторыя з іх пасля апрацоўкі вывозіліся «князю за мяжу» (гэта значыць у Берлін) або прадаваліся. У 1890 г. пасля аднаго з паляванняў у Радзівілімонтаўскім лясніцтве былі апрацаваны шкуры мядзведзяў, забітых графам Лёндорфам, князем Віндзіхгрэтцам, князямі Каралем і Вільгельмам Радзівіламі. Такія шкуры звы-

2017@nasledie-sluck.by

чайна ўпрыгожвалі кабінет як сведчанне паляўнічых поспехаў яго гаспадара.

Выраблены шкуры лічыліся таксама добрым падарункам. У 1896 г. у Ірэскім лясніцтве па загаду жонкі князя Антонія Вільгельма Марыі былі забіты два ваўкі, а іх шкуры дасланы гаспадыні. Летам 1897 г. у якасці падарунка графу Андрэю Патоцкаму былі адвезены 4 шкуры, 16 ног і 4 пары ласіных рагоў.

Звярыныя шкуры выкарыстоўваліся ў аздабленні шматлікіх паляўнічых домікаў Радзівілаў, якія станавіліся добрым прытулкам падчас доўгіх зімовых паляванняў. Нягледзячы на тое, што паляўнічыя домікі выкарыстоўваліся рэдка, яны багата ўпрыгожваліся, былі абсталяваны добрай мэбляй, напоўнены каштоўным посудам і ўсімі неабходнымі для камфорту гаспадароў і іх гасцей рэчамі.

В. Папко.
Беларускі гістарычны часопіс.
2010. № 8. С. 13–15.
Друкуецца ў скарачэнні.

ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ XX СТАГОДДЗЯ

Святы вечар, людзям добрым!..
Плывеце тае стрэлачкі да мае дзевачкі.
Святы вечар людзям добрым
А ў мае дзевачкі русы косы па плечыкі,
А ў руках платочак тонкі, беленькі.

Счастливый смех и гомон всколыхнули застывший воздух… Так начинался в Лучниках, да и по всей округе, щедрый вечер, вечер богатой кутьи (щедрец) накануне нового тысячелетия… Разве кто мог предположить, что новый, наступающий век будет самым жестоким и противоречивым в истории всего человечества…

Начало XX века… Леса, окружающие Лучники и Варковичи, уже отступили подальше от деревень, и взору открывались: зимой – заснеженная равнина, в другие времена года – заливные луга да узенькие и длинные крестьянские полоски земли.

Местность вокруг Лучников низкая, местами заболоченная. Именно здесь берет свое начало река Бычок, впадающая в Случь. Когда-то это был большой ручей с чистой проточной водой, где ребятня ловила вьюнов и другую рыбешку. Низкие его берега группами обступали дубы, чередуясь с кустарниками. Но время и технический прогресс сделали свое дело – омелела и затянулась речушка, а русло ее выпрямлено в результате мелиоративных работ, и сегодня – это уже небольшая канава.

Здесь же, за огородами, протекало еще несколько таких же чистых ручьев, только поменьше да помельче. Был и большой пруд. Это место в старину называлось Залесскими канавами: может быть, это было как-то связано с распространенной в Лучниках фамилией Залесский, но не исключно, что название произошло от места расположения: за лесом. Такое же происхождение имеют, впрочем, и многие другие топонимы. Например, большой луг, находящийся за огородами, назывался Загородье. Причем название это сохранилось и доныне, но сегодня это улицы Полевая и Шоссейная.

На лучниковских землях в старину было несколько участков, отличающихся от окружающей местности – урочищ, каждое из которых имело свое название. А некоторые колхозные поля и ныне сохранили их.

2017@nasledie-sluck.by

Слева от дороги между Лучниками и Варковичами урочище Панастрово. Посреди болот лежал луг с уклоном. Его называли «пана остров». По дороге на деревню Подлипцы – самое большое урочище Плитница, название которого произошло, вероятно, от слова плита, плитница – твердый слой почвы, земли. Когда-то, еще в начале XIX в., здесь рос большой старый грибной лес, в котором были три пруда и болото. Но собирать грибы местному населению можно было лишь по одноразовому билету. Моя тетя Мариля (М.П. Саванович, 1910 г.р.) рассказывала, что старые люди говорили: «…Когда шли французы на Романово летом 1812 г., молодые лучниковские мужчины бежали в Плитницу, залезали на самые высокие деревья и наблюдали, как велся бой». Во второй половине XIX в., после того как Слуцк и выбранецкие деревни были выкуплены государством у наследников князя Радзивилла, многие лучниковские земли были выставлены на продажу. Плитницу купили несколько крестьян, которые пустили лес на строительство, а впоследствии и выкорчевали его.

Призывники д. Лучники: слева – Лукевич, в центре – П.П. Саванович

Земли, расположенные слева от дороги на Плитницу, приобрел помещик Циков. Но в Лучниках он не жил и приобретенную землю не распахивал, поскольку это было самое низкое место в окрестности, с большим прудом (сажалкой), «чавкающими» местами лугом и болотцем. А название Циково сохранилось. И уже после Великой Отечественной войны оно же закрепилось за вновь построенной улицей.

За Циковским болотцем, в сторону Поповщины до нынешней кольцевой дороги, находилось урочище Горелик. Именно так называли местные жители в давние времена выжженное место в лесу. Известно, что в 1895–1900 гг. земли этого урочища были раскуплены и местными крестьянами. Немало пришлось приложить им труда и пролить пота, чтобы провести первый посев на целине, заросшей кустарником и мелколесьем с множеством пней.



Тип подгородного слуцкого белоруса, д. Лучники. 1908 г.

2017©nasledie-sluck.by

Крестьяне д. Лучники. Начало XX в.

Крестьянский мальчик д. Лучники. Начало XX в.

Катерина Борисевич и Василиса Крот из д. Лучники. 1912 г.

За Гореликом, в сторону Безверхович, – большая возвышенность – Лисья гора. Когда-то здесь был также лес, в котором водилось много лис. Со временем лес был вырублен, а слово «лисья» трансформировалось в «лысую» (именно так у славянских народов издавна было принято называть горки без растительности). Так и появилось название «Лысая гора». Впоследствии, когда образовался колхоз, это место было распахано и с годами возвышенность становилась все ниже. Интересен и такой факт: в конце 1930-х гг. на Лысую гору приехали военные, осмотрели местность и приняли решение построить здесь аэродром. В этом месте когда-то даже приземлилось несколько «кукурузников». А потом началась Великая Отечественная война, и мирным планам не суждено было сбыться, а вот колхозное поле получило еще одно название – «аэродром».

Немало названий урочищ произошло от рельефа местности. Например, от подлипской дороги, напротив Плитницы, в сторону выбранецкой деревни Серяги, находилось урочище Ровища, которое было все в глубоких рвах.

2017©nasledie-sluck.by

Роман Крот и Никита Савинович из д. Лучники. 1912 г.

Семья Кухта из д. Лучники. 1905 г.

А по дороге, ведущей в Серяги (справа от нынешней кольцевой), находилось еще одно урочище – Горки. Название его также связано с рельефом: здесь были две возвышенности – горки. Их распахали и выровняли лишь в конце 70-х гг. XX в. Это урочище еще называли Серяговщина.

От дороги, ведущей в деревню Молотково, и до нынешней кольцевой, простиралось урочище Нагота, получившее свое название от того, что здесь были ровные, пустующие земли без леса и кустарника, т.е. нагие (голые).

С образованием колхоза два поля получили название «Былеўка» (от слова «былье») – это между урочищами Лысая гора и Плитница, и «Прысады» (находилось рядом с посаженным садом, при саде).

Вокруг соседней деревни Брановичи простирались большие заливные луга с прудами, ручьями да болотами. За земельными наделами крестьян, в сторону нынешней улицы Пахарь, находился большой глубокий пруд, рядом дубняк. К нему подступало болото. Пруд называли Дубничок. Из циковского пруда сюда вытекал большой ручей. Во время паводка они разливались так, что весь луг превращался в единое длинное озеро.

За огородами было еще одно заболоченное место с прудом под названием Болотце. От него, пересекая огороды в сторону нынешнего рынка, протекал большой ручей. И эта часть луга до самой мельницы (комбинат хлебопродуктов) всегда затапливалась. Заливные луга поражали своей красотой: ранней весной они были желтыми от цветущей лототи (калужница болотная), затем – белыми или розовыми: радужная расцветка зависела от того, какого цветочка пришло время покрасоваться. На лугах произрастало много лекарственных трав: кровохлебка, ужовник (таўкачыкі), сабельник (звездочки), кукушкин горицвет (тарановочки), василек луговой и другие. Были среди крестьян и травники, которые точно знали, от каких хворей какая трава помогает.

Варковичи также когда-то находились среди лесов, постепенно отступивших от деревни, открывая болото и пруды. Со стороны Лучников посреди большого луга рос густой кустарник, который окружал болотистое место, где, по словам старожилов, в зимнюю пору водилось много волков. А вот неподалеку от деревни находился большой родник, в котором вода была холодная

2017©nasledie-sluck.by

и необычайно чистая. Да и в наши дни почти каждый местный житель покажет, где находится криничка, хоть со временем она почти затянулась.

До сих пор память деревни хранит названия полей – «Полянка» и «Крамянка». Когда-то на опушке леса, подступавшего к деревне, находилась красивая большая поляна. Владелец, любитель карточных игр, проиграл лес, а новый хозяин продал его крестьянам. Полянка постепенно расширялась за счет вырубки леса и со временем превратилась в поле. Но прежнее название осталось в людской памяти. А вот по поводу возникновения второго наименования сведений не сохранилось.

За Варковичами есть болотистое место с когда-то большим, а теперь уже обмелевшим прудом, который до сих пор называют Вонячка. Старые люди рассказывали, что в 1812 г. здесь была трясина, и французы бросали в нее своих убитых собратьев. Долгое время летом над топью поднимался неприятный запах, который и дал название сажалке.

Все эти три деревни – Брановичи, Варковичи и Лучники – были не только объединены общей историей, но и похожи внешне. Планировка их традиционная – уличная. В Брановичах и Варковичах избы стояли настолько близко друг к другу, что крыши их почти или даже полностью смыкались. По этому узенькому проходу, который назывался «судочки», ходили в хлевы и другие хозяйственные постройки. В Лучниках расстояние между избами было несколько больше – между ними мог проехать возок с сеном, правда, цепляясь за крыши.

Для этих деревень была характерна погонная планировка дворов: все строения размещались в один ряд, прилегая друг к другу, и накрывались общей соломенной крышей. Иногда крыша хозяйственных построек располагалась ниже крыши избы.

Из-за их скученности часто вспыхивали пожары, в результате которых выгорало несколько хозяйственных построек. В «Вестнике Минского губернского земства» (№ 2 за 1914 г.) писалось: «Сельское население, которое страдало от пожаров, ежегодно несло убытки почти на 2 млн. рублей». Согласно царской статистике, почти каждые 20 лет в деревнях случались опустошающие пожары. Это касалось и наших деревень.

Известный белорусский писатель и переводчик, наш земляк, Ю.П. Гаврук в своей автобиографии писал: «Бацька мой, Павел Сямёнавіч, сялянскага паходжання, з вёскі Шалавічы, кіламетраў дваццаць ад Слуцка …быў забраны ў армію і даволі доўга служыў звыштэрмінова, а потым, вярнуўшыся ў Слуцк, прыстаў у прымы да Еўдакіі Максімаўны Маскаленка, маёй маці… У 1914 г. бацьку мабілізавалі на вайну ратнікам апалчэння, і вярнуўся ён у Слуцк аж у канцы 1917 г. пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1915 г., маці, кінуўшы хату, паехала ў бежанцы да бацькі ў горад Пскоў. Там я вучыўся… Першыя страхі ўлягліся, і ў 1916 г. …прывезла мяне маці назад у роднае сяло… ».

С начала войны Слуцкий уезд стал прифронтовым. Линия фронта установилась на западной границе уезда, в двух километрах от Ляховичей и сохранилась до февраля 1918 г. В городе разместился штаб 3-й, затем 2-й русской армии Северо-Западного фронта.

В начальный период войны в Барановичах размещалась Ставка Верховного главнокомандующего русской армией (с августа 1915 была перебазирована в Могилев). В связи с этим для укрепления состава полиции в Барановичи из Слуцка было откомандировано 10 стражников, 1 опытный урядник и полицейский надзиратель города Красовский.

Сражения начала войны в Восточной Пруссии, Галицийской, Варшавско-Ивангородской и Лодзинской операциях не увенчались успехом русских войск, и они вынуждены были отступить вглубь своей страны. В результате весной–летом 1915 г. Беларусь стала одним из главных центров боевых действий. Здесь на линии Двинск – Поставы – Сморгонь – Барановичи – Пинск на два с половиной года установился участок российско-германского фронта. Численность его составляла свыше 2 млн человек. Трудно даже представить, что здесь творилось: кровопролитные бои, сожженные деревни, эвакуация населения и предприятий, беженство. Для эффективности атак немцы стали применять химические вещества – ядовитые и удушливые газы, несмотря на то, что это запрещалось существующим международным правом.

В связи с ухудшением ситуации на фронтах минским губернатором А.Ф. Гирсом было разработано и направлено уездным предводителям дворянства и начальникам полиции предписание об эвакуации учреждений и заведений. Так, в случае эвакуации учреждения Слуцкого уезда должны были направиться в г. Мозырь, а в случае дальнейшей эвакуации – в г. Ковров

2017©nasledie-sluck.by

Владимирской губернии. Однако дело до этого не дошло, но многие жители Слутчины в порыве паники покидали родные места и направлялись вглубь России. Так, семья Трухана Луки (жили в г. Слуцк по ул. Виленской) оказалась в Мценском уезде Орловской губернии, Гавруков – в Пскове, Феропонтовых – в Истре и т.д. Многим слутчанам довелось испытать долю беженцев, а потом долгую, нелегкую дорогу возвращения. Отдельные семьи лишь в 1920–1921 гг. вернулись под родной кров.

Полно трагизма было беженство. Беженцы стали появляться уже в первые месяцы войны, но с поражением на фронтах количество их возрастало с каждым днем. Крестьяне западных районов Беларуси покидали родные места. Но переждать войну они стремились неподалеку от своих поселений. Особенно много их было в Минской губернии. Властями было принято решение размещать их только в шести уездах – Минском, Слуцком, Игуменском, Борисовском, Бобруйском и Новогрудском, т. к. в Пинском, Мозырском и Речицком были отмечены вспышки холеры.

Дороги представляли собой встревоженный пчелиный рой. Бесконечным потоком в сторону фронта двигались пехота, обозы, артиллерия, казаки, кавалерия, а по обочинам навстречу им шли и ехали семьями на телегах мирные жители с пожитками. Вдоль дорог валялись вещи, лежало много погибшего скота, особенно коров. Все это создавало большие проблемы с обеспечением фронта. Поэтому генералом Даниловым, главным начальником обеспечения армии Северо-Западного фронта, было приказано беженцам двигаться дальше на восток по четырем путевым дорогам, в т. ч. Слуцк – Калужская губерния. По пути следования беженцев по Московско-Брестскому шоссе дополнительно создавались врачебно-продовольственные пункты, открывались чайные с выдачей горячей пищи и хлеба. Было принято решение председателям Слуцкого и Бобруйского отделения Комитета по делам беженцев предоставить право на аренду прилегающих к шоссе лугов и пастбищ, покупать фураж для лошадей и скота беженцев, обустраивать мастерские и кузницы для ремонта повозок, упряжи и т. д. Было откомандировано пять врачебно-санитарных отрядов. Один из них разместился в Слуцке.

Всего на территории Слуцкого уезда было принято 4856 семей, что составляло около 17 тыс. человек, из них детей – 4204. В Слуцке – 427 семей, количество беженцев – 1495, из них детей – 590 (данные Губернского Отделения Татианского комитета на март 1916).

Беженские обозы зачастую отклонялись от главных дорог и шли по объездным проселочным. Поэтому многие блуждали по незнакомой местности. От недостатка кормов падал скот. Отдельные семьи в лесах стали делать землянки и жить в них. С сочувствием принимало беженцев местное население, но вскоре оно было уже не в состоянии оказывать им помощь. Голодные, полураздетые беженцы стали совершать грабежи, выкапывать картошку, пускать скот на посевы. Среди беженцев увеличилась смертность. Э.А. Войнилович в своих воспоминаниях писал, что пока у местного населения были запасы досок, хоронили в гробах. Позже погребали без них.

Минский губернатор телеграфировал слуцкому врачу Гавловскому: «… поступают сведения о неубранных на дорогах трупах умерших главным образом от холеры. Примите меры к приданию земле умерших». Так вдоль дорог оставляли беженцы своих родных – тысячи безымянных могил.

2017©nasledie-sluck.by

С наступлением холодов положение беженцев резко ухудшилось, т.к. у них не было теплой одежды, обуви. Благотворительные общества оказывали всяческую помощь: выдавали валенки, полушубки и другую теплую одежду. Но всех обеспечить было просто невозможно. Местное население также оказывало помощь, особенно детишкам, но и этого было недостаточно. Беженство приостановилось лишь со стабилизацией положения на фронте.

На население неоккупированных территорий легли все тяготы войны. Трудоспособные мужчины были мобилизованы, на сельском хозяйстве остались женщины, старики и дети, а армии нужно было поставлять продукты и обмундирование, беженцам – также помогать. Еще оказывалась помощь другим уездам, пострадавшим от войны. Так, из Слуцка в Пинский уезд был направлен медикопитательный отряд, имевший в распоряжении 1000 пудов хлеба, 10 тыс. консервов, 100 пудов соли, 2 пуда чая. В состав отряда входили фельдшер, две медсестры милосердия, шесть санитаров и капитан Михалевич, который его возглавлял. При этом, следует отметить, Слутчина сама нуждалась в медицинском персонале.

Сегодня сложно назвать количество беженцев из Слуцкого уезда, также как и назвать число земляков – участников Первой мировой войны.

Не все имена их известны, но с уверенностью можно сказать, что каждый из них совершил подвиг во имя Отечества. Это подтверждает и выдержка из «Положения о Георгиевском Кавалере»: «Сие лицо совершило подвиг отличный от обычного». Значит, подвиг был и обычный, и миллионы обычных подвигов принесли победу.

В эту победу внесли свой вклад наши земляки Михаил Борисович Протасеня из д. Старцавичи (ныне д. Знамя), который сражался в составе войск Западного фронта, принимал участие в Брусиловском прорыве и Нарочанской операции 1916 г., а после ранения находился в действующей армии под Сморгонью. В 1916 г. закончил учебную радиокоманду Западного фронта Петр Ксенофонтович Савонович из д. Лучники и был лучшим радистом радиостанции штаба Верховного главнокомандующего этого же фронта.

Сражались «За веру, царя и Отечество» жители д. Белая Лужа Петр Андреевич Дубовик, Григорий Опанасович Дубовик, Петр Минович Давидовский, д. Лядно Конон Иванович Давыдчик и др. Многие не вернулись с поля боя, но о них, к сожалению, сведений почти нет. Беспощадной по отношению к ним оказалась история. Миллионы жертв этой войны были несправедливо преданы беспамятству.

Несколько слов о наградах того периода.

В Первую мировую войну новые награды не утверждались, награждение проводилось существующими медалями и орденами. Самой почетной наградой был орден Святого Великомученика и Победоносца Георгия, который с давних времен считается покровителем воинов. Орден был учрежден императрицей Екатериной II в 1769 г. Четыре его степени были введены царским указом лишь через 87 лет – в 1856 г. Награда считалась очень высокой и была редкостью. Об этом говорят следующие цифры: за 151 год было награждено 25 человек орденами 1-й ст., 119 – 2-й, 671 – 3-й и около 13,5 тыс. – 4-й. Даже личное распоряжение царя не могло послужить основанием для награждения орденом Св. Георгия, т.к. в Статуте ордена было сказано, что основанием для награждения не могут служить иные заслуги или высокое положение, а лишь

2017©nasledie-sluck.by

«…храбрость и мужество, проявленные на поле брани». Орденом награждались только офицеры, солдаты – Георгиевскими крестами и медалями.

За Первую мировую и Гражданскую войны 77 человек было награждено орденом Св. Георгия 3-й ст., 2-й степени – лишь четыре полководца: Н.В. Рузский, Н.И. Иванов, великий князь Н.Н. Романов и Н.Н. Юденич. Свыше 3 тыс. – награждено орденом 4-й степени.

Временное правительство ввело награждение орденом 4-й ст. и особо отличившихся солдат, но при этом они сразу же производились в офицеры. Следует заметить, что солдатский знак Георгиевский крест (с 1913) был учрежден еще в 1807 г., но степеней не имел, а с 1856 г. императорским указом введены четыре степени креста и Георгиевская медаль «За храбрость».

За Первую мировую войну более 30 тыс. солдат были награждены Георгиевским крестом четырех степеней. Среди них – уроженец д. Рачковичи Степан Петрович Богдан, который служил в 99-м пехотном Ивангородском полку. Первую награду – Георгиевский крест 4-й ст. получил он в 1914 г., в 1915 г. храбрый боец был награжден крестами 3-й и 2-й ст. В 1916 г. наш земляк принимал участие в бою под Сморгонью и был награжден Георгиевским крестом 1-й ст. Полный Георгиевский кавалер С.П. Богдан, к сожалению, не оставил воспоминаний о Первой мировой войне, о нем не писали в газетах, т.к. был период, когда незаслуженно умалчивали и не восхищались мужеством борцов «За веру, царя и Отечество». Умер герой в 1964 году.

В фондах ГУ «Слуцкий краеведческий музей» хранится газета «Страж Балтики», изданная в Калининграде, с воспоминаниями Ивана Евдокимовича Дуболеко из д. Лучники, участника знаменитого Моонзундского сражения. В царскую армию на флот И.Е. Дуболеко был призван в 1913 г. Закончил Кронштадтскую школу комендоров и направлен на эсминец «Гром», но, так как корабль тогда еще не вошел в строй, службу начал на эсминце «Генерал Кондратенко».

Представляю отрывки из воспоминаний: «…Из службы на «Громе» наиболее памятен мне июньский поход 1916 г. в северо-западную часть Балтики, где эсминцы «Новик», «Победитель» и «Гром» нанесли удар по немецкому каравану судов, причем потопили крейсер «Герман». За меткую стрельбу и храбрость в этом бою я был награжден первым Георгиевским крестом. А второе событие – уже Моонзундского сражения, где довелось мне первым выстрелом сбить немецкий самолет, за что получил я второго Георгия…

Но главное событие не это. Главное – видел я героизм балтийцев, героизм матросов «Грома»… 29 сентября 1917 г. наблюдательные посты островов Эзель и Даго обнаружили приближающуюся эскадру – свыше 50 вымпелов. Это были немцы. После жестокого обстрела русских позиций они высадили десант… на третий день сражения, 1 октября, эскадра немецких кораблей в составе линкора «Кайзер», крейсера «Эмден», почти двух флотилий эсминцев, многочисленных тральщиков и вспомогательных судов снова попыталась прорваться на Кассарский плес. Мы в это время стояли на якоре у мыса «Памерорт».

Доклад командиру «Грома» о приближении врага поступил, когда новейший линкор немцев «Кайзер» был уже в 125 кабельтовых… Третий залп линкора накрыл эсминец. Один из снарядов главного колибра пробил правый борт, прошел через машинное отделение и взорвался над кораблем. Сотрясение было

2017©nasledie-sluck.by

настолько сильным, что на переднем мостике сорвало главный компас и минные прицелы. Наш миноносец получил крен. Теряя ход, он вернулся на мыс и вышел из-под огня. На помощь подоспела канлодка «Храбрый» и подала нам швартовы.

А бой между тем разгорался. Даже поврежденный «Гром» участвовал в нем. Метко стреляли мои товарищи… да и мое 3-е орудие не подкачало… У «Храброго» лопнули швартовы, и он отошел. Крен «Грома» вырос до 10–15 градусов. Почти полтысячи тонн воды откатывали трюмные, но эсминец все равно медленно погружался. А тут еще новые попадания немецких снарядов. Взрывной волной несколько человек сбросило за борт. Взлетела в воздух грот-мачта, получило повреждение носовое орудие. По палубе растеклись нефть и мазут из перебитых трубопроводов, корабль окутало дымом и паром, начался пожар.

Экипаж самоотверженно боролся с водой и огнем… Но повреждения были огромные, и командир принял решение перевести команду на снова подоспевшую к борту канлодку «Храбрый». Перенесли раненых паром матросов и старшин, комендоры постепенно прекращали огонь. Вся команда уже на «Храбром», и вдруг член судового комитета минно-машинный старшина Федор Самончук перепрыгнул на «Гром»… увидели мы, как ползком он подобрался к машинному аппарату, и когда немецкий миноносец стал брать «Гром» на буксир, выпустил торпеду. Раздался взрыв. Погибли и «Гром», и немецкий корабль. Таков бессмертный подвиг «Грома».

Как впоследствии оказалось, Федор Самончук остался жив. За совершенный им подвиг, уже через полвека, он был награжден Советским правительством орденом Красного Знамени…».

К Георгиевским крестам 4-й и 3-й ст. И.Е. Дуболеко после этого боя добавилась еще и Георгиевская медаль.

С 1912 г. служил в царской армии Иван Максимович Сукач из д. Прощицы. На фронте – с первых дней войны. Сапер-понтонщик, унтер-офицер в боях отличался смелостью и умением принимать правильные решения. Об этом говорят и его награды – три Георгиевских креста 4-й, 3-й, 2-й ст. и две Георгиевсие медали.

Обоз беженцев. Слуцк, 1915 г.

2017©nasledie-sluck.by

В лагере беженцев. Слуцк. 1915 г.

Георгиевскими крестами 4-й, 3-й, 2-й ст. был также награжден Игнат Кузьмич Мартинович из д. Кальчицы, 4-й и 3-й ст. – Андрей Демьянович Русакевич из д. Варковичи, 4-й ст. – Александр Петрович Саванович, стрелок 256-го Западного полка, из д. Лучники; Павел Михневич, уроженец д. Сороги, Василий Сильвестрович Неронский из д. Липники (погиб в 1916 в Карпатах) и многие другие.

В начале 1917 г. под воздействием специфических условий, сложившихся в годы войны, на Слутчине стали развиваться революционные события. Солдаты и офицеры Западного фронта проводили среди населения активную пропагандистскую работу и в марте 1917 г. был организован Совет рабочих депутатов. А потом были Гражданская война и интервенция – германская и польская оккупации. К мирной жизни слутчане приступили лишь в конце 1920 г.

Литература:

1. Белявина В.Н. Беларусь в годы Первой мировой войны. Минск, 2013.

2. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918). Минск, 2014.

3. Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Минск, 1985.

4. Смольянинов М.М. Беларусь в Первой мировой войне, 1914–1918 гг. Минск, 2014.

5. Смольянинов М. Обреченные на исход: проблема беженства и ее решение на белорусских землях в годы Первой мировой войны // Беларуская думка. 2013. № 10. С. 76–83.

6. Фонды ГУ «Слуцкий краеведческий музей».

В.С. Видлога.

2017©nasledie-sluck.by

Удзельнікі 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў, рэвалюцыйных падзей на Случчыне

З выхадам у свет папярэдніх кніг «Памяць» пошукавая работа аб удзельніках 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў, рэвалюцыйных падзей нашага краю не была спынена. У выніку за гэты час папоўніліся фонды краязнаўчага музея новымі матэрыяламі пра нашых землякоў, удзельнікаў тых далёкіх падзей. У гэтым напрамку праводзілася работа і калектывам раённай газеты «Слуцкі край», на старонках якой неаднаразова друкаваліся цікавыя артыкулы адпаведнай тэматыкі. У камісію па падрыхтоўцы кнігі звярталіся і жыхары Случчыны, прозвішчы свайго якіх не ўвайшлі ў раней надрукаваныя спісы. Агульнымі намаганнямі сабраўся значны матэрыял. Але ж і ён не з'яўляецца вычарпальным, бо людзі пайшлі з жыцця, а дакументаў не захавалася.

АЛЕШКА Лявон Цімафеевіч, н. у в. Балотчыцы, удзельнік Грамадзянскай вайны, першы старшыня к-са імя Чапаева (пазней к-с «Праўда»).

АМЯЛЬКОВІЧ Пётр Лаўрэнцьевіч, н. у 1890 у в. Балотчыцы, удзельнік Грамадзянскай вайны (1919–1921) у складзе 465-га стралковага палка 52-й СД.

АНДРУКОВІЧ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1887 у м. Цімкавічы Слуцкага пав., удзельнік 1-й сусветнай вайны, пісар, яфрэйтар, мал. унтэр-афіцэр 169-га пяхотнага палка.

АНДРУКОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у м. Цімкавічы Слуцкага пав., удзельнік 1-й сусветнай вайны, змагаўся на Каўказе.

АСТРОЎСКІ Мітрафан Андрэевіч, н. у 1898 у в. Грэск, у гады Грамадзянскай вайны – стралок 1201-га стр. палка, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

БАБІНСКІ Пётр, н. у в. Варкавічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

БАБКО Міхаіл Макаравіч, н. у 1895 у в. Заполле Баранавіцкага раёна, удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок 414-га палка,

М.М. Андрукович (стоіць)

Сям'я Андруковічаў: А.М. Андрукович (сядзіць злева), В.М. Андрукович (стаіць злева)

2017©nasledie-sluck.by

удзельнічаў у баях на Перакопскім перашыйку. Жыў у Слуцку.

БАРАНОЎСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1896 у в. Строхава, удзельнік Грамадзянскай вайны. Жыў у Слуцку.

БАРАНОЎСКІ Сцяпан Фоцієвіч, н. у 1896 у в. Ліпнікі, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

БАРОН Рыгор К., н. у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

БАРЫСАВЕЦ Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1893 у в. Бранава, удзельнік 1-й сусветнай вайны, служыў у 141-м пяхотным палку пісарам, пасля працаваў настаўнікам, дырэктарам школы. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскага атрада. У пасляваенны час працаваў настаўнікам.

БАСІНКЕВІЧ Ісак Раманавіч, н. у 1899 у Слуцку, удзельнік рэвалюцыйных падзей, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. (Гл. артыкул «За шчасце простага чалавека» ў кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 1. С. 158–161).

БАЧКО А. Іванавіч, н. у в. Лапацічы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў, загінуў пад Варшавай у 1921.

Г. Бачко (Макіеўская)

І. Бачко

БАЧКО (МАКІЕЎСКАЯ) Ганна Іванаўна, н. у в. Лапацічы, настаўніца, удзельніца барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

БАЧКО Іван Іванавіч, н. у 1899 у в. Лапацічы, скончыў Слуцкую гімназію, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920), старшыня Слуцкага падпольнага павятовага камітэта КП(б)Б, памёр у 1921 у Маскве, пахаваны на Новадзявочых могілках.

БЕЛАШ Міхаіл Іванавіч, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

БІРЫЧ Пётр Андрэевіч, н. у 1898 у в. Малышэвічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, артылерыст, змагаўся супраць Калчака.

БРАНЯВІЦКІ Пётр Сямёнавіч, н. у 1891 у Слуцку, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Памёр у 1949. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 438).

БРАЦУН Трафім Аўрамавіч, н. у 1897 у Бранскай вобласці, удзельнік Грамадзянскай вайны, старшына 5-га эскадрона 1-га Украінскага артылерыйскага палка. Жыў у Слуцку.

БУРАК Максім Іосіфавіч, н. у в. Васілінкі, удзельнік Грамадзянскай вайны.

БЯЛЬКЕВІЧ Піліп Цімафеевіч, н. у 1894 у в. Еўлічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, змагаўся на Заходнім фронце (1919–1921).

ВАДАНОСАЎ, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў 1919–1921.

ВАЙЦЯХОВІЧ Феадосій Мітрафанавіч, н. у 1897 у в. Бязверхавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок 25-й Чапаеўскай дывізіі, змагаўся на Уральскім фронце.

ВАСІЛЕЎСКІ Мікалай Нічыпаравіч, н. у 1896 у в. Чапліцы, удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок 25-й Чапаеўскай дывізіі.

ВЯРЖБІЦКІ А.А., урач, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ВЯРЖБІЦКІ Аляксандр Антонавіч, н. у 1889 у в. Маргі Капыльскага раёна, удзельнік

2017@nasledie-sluck.by

Партызаны атрада М. Кухарчыка. Злева направа: Г.Л. Таранда, І.Я. Занцэвіч, С.А. Юруць, М.Ф. Громак

Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну – фельчар на Туркестанскім фронце. Жыў у Слуцку.

ГАПАНОВІЧ Дзмітрый Апанасавіч, н. у 1896 у в. Танежыцы, генерал-лейтэнант (1914). Удзельнік 1-й сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Жыў у Маскве. Памёр у 1952. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 438).

ГРОМАК М.Ф., удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

ГРУШЭЎСКІ Уладзімір Лявонцьевіч, н. у Слуцку, удзельнік 1-й сусветнай вайны, у 1-м гв. арт. дывізіёне Валынскага корпуса, у 1937 рэпрэсіраваны, расстраляны.

ГРЫЦКЕВІЧ Емяльян Васільевіч, н. у 1899 у в. Сярагі, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую – стралок экспедыцыйнага атрада асобага назначэння Смаленскага гарнізона.

ГРЫЦКЕВІЧ Іван, н. у в. Варкавічы, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг.

ГРЫЦКЕВІЧ Пётр Навумавіч, н. у 1897 у в. Варкавічы, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі (1919–1920) на Случчыне, у Вялікую Айчынную вайну – на фронце. Загінуў у кастрычніку 1941. (Гл. артыкул «У барацьбе супраць захопнікаў» у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 1. С. 187–189).

У.Л. Грушэўскі

ГУК Антон Рыгоравіч, н. у 1897 у в. Гарадзішча, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну – радавы 1-га Тамбоўскага артдывізіёна. Жыў у Слуцку.

ГУРБО Цярэнцій Трафімавіч, н. у 1897 у в. Бязверхавічы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

ГУРЫНОВІЧ Мацвей Панфілавіч, н. у 1880 у в. Сорагі, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

ДАВІДОЎСКІ Пётр Мінавіч, н. у в. Белая Лужа, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

ДАВЫДЧЫК Аляксандр Фёдаравіч, н. у в. Лядна, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ДАВЫДЧЫК Конан Іванавіч, н. у 1897 у в. Лядна, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

ДУБОВІК Пётр Андрэевіч, н. у в. Белая Лужа, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

ДУБОВІК Рыгор Апанасавіч, н. у в. Белая Лужа, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

ДУБОВІК Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1903 у в. Немча, генерал-лейтэнант (1959). Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Жыў у Маскве. Памёр у 1987. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 438).

ДУБОВІК Якім Язэпавіч, н. у в Белая Лужа, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

ДУДАР Сямён Савіч, н. у 1900 у в. Бялевічы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

ЗАНІЦЭВІЧ І.Я., удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

2017@nasledie-sluck.by

ЗАХАРЭВІЧ Ціт Ніканавіч, н. у в. Лучнікі, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

ІЛЮКЕВІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1897, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну змагаўся ў Сібіры супраць Калчака. Жыў у в. Рачкавічы.

ІЦКІН Макс Сямёнавіч, н. у 1902 у Слуцку, генерал-маёр медыцынскай службы (1943). Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Памёр у 1965. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 438–439).

КАЗЮЧЫЦ Антон Васільевіч, н. у в. Азярцы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

КАЗЮЧЫЦ Пётр Андрэевіч, н. у в. Азярцы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

КАЛЯДА Васіль Аксёнавіч, н. у 1898 у в. Буда-Грэская, удзельнік 1-й сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Змагаўся ў Карпатах (м. Броды), з польскімі акупантамі, бандамі Булак-Балаховіча. У Вялікую Айчынную вайну – сувязны атрада асобага назначэння «Местные». Удзельнік партызанскага парада ў Мінску 16.7.1944. Памёр у 1979.

КАЛЯДКА Лукаш Сямёнавіч, н. у 1887 у в. Лесуны, генерал-маёр (1940). Удзельнік рэвалюцыйных падзей 1905–1907, кіраваў 3-месячнай забастоўкай студэнтаў. З 1910 у арміі. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. З 1918 у Чырвонай арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1921–1922 ад'ютант М.В. Фрунзе ў Турцыі. Жыў у Маскве. Памёр у 1966. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 439).

КАМЯК Сцяпан Андрэевіч, н. у 1888 у в. Лядна, удзельнік Грамадзянскай вайны.

КАРОЛЬ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1896 у в. Лядна, удзельнік 1-й сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Змагаўся на Туркестанскім фронце. Памёр у 1970.

І.Р. Клішэўскі

(Гл. артыкул «Зоры насустрач» у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 1. С. 154–158).

КАХАНОВІЧ Сямён Іванавіч, н. у в. Бранавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

КАЧАНОЎСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1895 у в. Шулякі, удзельнік Грамадзянскай вайны. Жыў у Слуцку.

КАШАНСКІ Пётр Сільвестравіч, н. у 1892, удзельнік Грамадзянскай вайны, арганізатар першай камуны на Случчыне імя К. Маркса ў 1921.

КЛЕВАНОВІЧ Якаў Якаўлевіч, н. у в. Лучнікі, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

КЛІШЭЎСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1886, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920), член Прэзідыума ЦВК Беларусі (1920–1922), у складзе дэлегацыі ўдзельнічаў у падпісанні мірнага дагавору з Польшчай.

КОЗАК Антон Іванавіч, н. у в. Бокшыцы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

КОПАЦЬ Іван Макаравіч, н. у 1900 у в. Сцяпкова. У Грамадзянскую вайну – партызан. Арыштаваны ў 1937. Далейшы лёс невядомы.

КОПКА Фёдар Канстанцінавіч, н. у 1896 у в. Васілінкі, удзельнік рэвалюцыйных падзей у Казані, загінуў у чэрвені 1918. (Гл. артыкул «Чэкіст з Васілінак» у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 1. С. 161–162).

КОЎЧУР Кузьма Ігнатавіч, н. у 1898 у в. Бялевічы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну – стралок 25-й Чапаеўскай дывізіі.

2017@nasledie-sluck.by

КРЫЖАНОЎСКІ Васіль Мікітавіч, н. у в. Крывая Града, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, загінуў.

КРЫЖАНОЎСКІ Максім Мінавіч, н. у в. Белая Лужа, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў, загінуў.

КУДЗЁЛКА Павел Яўхімавіч, н. у в. Шыпчыцы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

КУЛАКОЎСКІ Мікалай Адамавіч, н. у 1896 у в. Заняведамка Капыльскага раёна, удзельнік 1-й сусветнай вайны, кавалерыст гусарскага Нежынскага палка.

КУЛІКОЎСКІ Георгій Васільевіч, н. у 1897 у в. Сярагі, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай (1944–1945) войнаў. У Грамадзянскую вайну змагаўся супраць Калчака.

КУЛІКОЎСКІ Якаў Афанасьевіч, н. у в. Лучнікі, удзельнік 1-й сусветнай вайны, актыўны ўдзельнік калектывізацыі.

КУРЛОВІЧ Рыгор Карнеевіч, н. у 1893 у в. Селішча, удзельнік 1-й сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Прапаў без вестак у лютым 1945.

ЛІНЕВІЧ Арсенцій Іванавіч, н. у в. Пераходы, удзельнік Грамадзянскай вайны, працаваў у лясгасе да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Расстраляны і спалены фашыстамі 23.2.1943.

Злева направа: Р.Г. Лфшыц, Я.І. Сініцкі, Р.К. Барон, Манюк

І.А. Лунёў

ЛІСТАПАД Аляксандр Сяргеевіч, н. у в. Лучнікі, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

ЛІФШЫЦ Рафаіл Гілелевіч, н. у 1901 у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

ЛУНЁЎ Іван Аляксеевіч, н. на Тамбоўшчыне, вайсковец, удзельнік 1-й сусветнай вайны, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920), дэпутат Слуцкага пав. Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, узначальваў ваенна-аператыўную работу Савета, потым – у спецыяльных атрадах ЧК, змагаўся з бандамі Мамантава і Антонава, служыў у органах бяспекі (1920–1940).

ЛЫСЫ Кузьма Яўхімавіч, н. у 1897 у в. Вялікая Слівa, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай (1944–1945) войнаў. У Грамадзянскую вайну – артылерыст 25-й Чапаеўскай дывізіі (1919–1921).

ЛЮЦКО Сямён Нічыпаравіч, н. у 1897 у в. Працавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны. Дзейнічаў у кавалерыйскім эскадроне 16-й арміі Заходняга фронту.

МАМОНЬКА Язэп Аляксеевіч, н. у 1889 у в. Залессе, удзельнік Грамадзянскай вайны, малодшы унтэр-афіцэр. Рэпрэсіраваны і расстраляны ў 1937. (Гл. раздзел «Вернутыя імёны»).

2017©nasledie-sluck.by

МАМЧЫЦ Сямён Паўлавіч, н. у 1893 у в. Пагост Салігорскага раёна, удзельнік Грамадзянскай вайны (1917–1922), машыніст мінаносца «Войсковый» Балтыйскага флоту, у Вялікую Айчынную вайну – у Працоўнай арміі (1944–1946). Жыў у Слуцку.

МАНЮК, н. у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

МАРТЫНОВІЧ Ігнат Кузьміч, н. у в. Кальчыцы. Георгіеўскі кавалер, удзельнік 1-й сусветнай вайны, барацьбы з польскімі акупантамі, актыўны ўдзельнік калектывізацыі на Случчыне. Узнагароджаны Георгіеўскім крыжам 4, 3 і 2-й ступеняў.

МАРТЫНЧЫК Аляксандр Раманавіч, н. у 1897 у Уздзенскім раёне, удзельнік Грамадзянскай вайны, змагаўся пад Петраградам і Крандштатам. Жыў у в. Рачкавічы.

МАСАРСКІ Абрам Давыдавіч, н. у 1901 у Слуцку, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну змагаўся на Усходнім фронце супраць Урангеля. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалём «За адвагу». Жыў у Слуцку. (Гл. артыкул «Яны вярнуліся пераможцамі»).

МАСКАЛЕВІЧ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1897 у в. Покрашава, удзельнік Грамадзянскай вайны (1919–1922), ваяваў на Паўднёвым фронце ў дывізіі Катоўскага.

МАХНОВІЧ Рыгор, н. у в. Варкавічы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў.

МАХНОВІЧ Цімафей Рыгоравіч, н. у в. Варкавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

МІХНЕВІЧ Павел, н. у в. Сорагі, удзельнік 1-й сусветнай вайны, узнагароджаны Георгіеўскім крыжам. Жыў у в. Волашава.

МУРАШКА Дзмітрый Мікалаевіч, н. у 1895 у в. Бязверхавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны (1919–1921). Стралок асобнага зводнага ўдарнага батальёна стралковай дывізіі 13-й арміі, змагаўся на Украінскім фронце пад Перакопам.

Злева направа: І.Г. Раманчук, С.А. Несцер, М.І. Белаш

МУРАШКА Дзяніс Прохаравіч, н. у 1893 у в. Бязверхавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, санітар экспедыцыйнага атрада па барацьбе з дэзерцірствам і бандытамі ў Магілёўскай вобласці (1919–1921).

МЯЦЕЛЬСКІ Васіль Уладзіміравіч, н. у 1901 у в. Грэск, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920). (Больш падрабязна гл. у раздз. «Нарадзіліся на Случчыне» ў кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 451).

МЯЦЕЛЬСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1896 у в. Дзюдзева (Маяк), удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1986.

НЕЙМАН Леў, н. у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

НЕСЦЕР Сцяпан Антонавіч, н. у 1888 у в. Заастравечча Слуцкага пав., удзельнік барацьбы за сав. уладу, сакратар Раманскага валвыканкама (1917–1918), член Слуцкага павятовага выканкама (1919), член ліквідкама Слуцкага пав. у Смаленску, дзярж. арбітр СНК Беларусі (1932–1936). Рэпрэсіраваны. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1957.

НІКАНОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1895 у в. Бранавічы. У 1919–1921 – у атрадзе па ліквідацыі банд у г. Рослаўлі і яго акрузе.

2017©nasledie-sluck.by

С.І. Падліпскі

Л.А. Паўлоўскі з жонкай

В.А. Пенязь

НІКІФАРАЎ Марк Андрэевіч, н. у 1901 у Пскоўскай вобл., удзельнік Грамадзянскай вайны, кулямётчык 1-га асобнага ўзорнага кулямётнага батальёна Петраградскай ваеннай акругі. Прымаў удзел у задушэнні кранштацкага мяцяжу. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга. Жыў у Слуцку.

НОВІК Раман Трафімавіч, н. у 1897 у в. Селішчы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

НОВІК Уладзімір Фёдаравіч, н. у в. Іграева, удзельнік вайны 1904–1905 з японцамі ў Маньчжурыі.

НОВІКАЎ Ілья, н. у в. Варкавічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

НЯМКОВІЧ Антон Сцяпанавіч, н. у в. Крывая Града, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, загінуў.

НЯРОНСКІ Васіль Сільвестравіч, н. у 1892 у в. Ліпнікі, удзельнік 1-й сусветнай вайны, узнагароджаны Георгіеўскім крыжам, загінуў у 1916 у Карпатах.

ПАДЛІПСКІ Самуіл Іванавіч, н. у 1893 у в. Лучнікі, служыў у царскай арміі, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. Памёр у 1982.

ПАЛЯШЧУК В.И. (на рус. мове), н. у в. Гулевічы Слуцкага пав., удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, удзельнічаў у баях супраць Карнілава, Каледзіна, Махно, курсант камандзіра вучылішча на крэйсеры «Аўрора», у 1923 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ПАЛЯШЧУК Мікалай Сяргеевіч, н. у 1897 у в. Белічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, змагаўся пад Смаленскам у каменданцкім атрадзе па барацьбе з бандытызмам.

ПАРХІМОВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1897 у в. Селішчы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну – стралок 25-й Чапаеўскай дывізіі.

ПАЎЛЕНКА Фёдар Раманавіч, н. у 1896 у г. Альшаніца Кіеўскай вобл., удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок. Жыў у Слуцку.

ПАЎЛОЎСКІ Лук'ян Антонавіч, н. у 1901 у в. Лучнікі, удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1979.

ПЕНЯЗЬ Васіль Афанасьевіч, н. у в. Ніва, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

ПЕНЯЗЬ Пётр Раманавіч, н. у 1897 у в. Амговічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, радавы. Жыў у Слуцку.

ПЛЯШКОЎ Аксён Паўлавіч, н. у в. Азярцы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў.

2017©nasledie-sluck.by

С.В. Пракаповіч

Дз.К. Праскаловіч (сядзіць)

М.Б. Пратасеня з братам Данілам

ПЛЯШКОЎ Фёдар Паўлавіч, н. у в. Азярцы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў.

ПРАКАПОВІЧ Сямён Васільевіч, н. у 1894, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920), арганізатар і старшыня калгаса «Рассвет камунізму».

ПРАСКАЛОВІЧ Дзямід Карнеевіч, удзельнік 1-й сусветнай вайны.

ПРАТАСЕНЯ Міхаіл Барысавіч, н. у 1888 у в. Старцавічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, у складзе войска Заходняга фронту. Удзельнічаў у Брусілаўскім прарыве, Нарачанскай аперацыі 1916. Паранены. Пасля доўгі час знаходзіўся ў дзеючай арміі пад Смаргонню. У мірны час працаваў у роднай вёсцы. Памёр у 1977.

ПРЫМА Максім Якаўлевіч, н. у 1902 у в. Заўшыцы Салігорскага раёна, удзельнік Грамадзянскай вайны, служыў у часцях асобага назначэння. Жыў у Слуцку.

ПУНЧЫК Цімафей Трафімавіч, н. у 1893 у в. Падліпцы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ПЯТРОВІЧ Ксенафонт Адамавіч, н. у 1897 у в. Падліпцы, удзельнік Грамадзянскай вайны, у 1926 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1945 ва Усходняй Прусіі.

РАМАНЧУК Іван Герасімавіч, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

РАСІЧ Фёдар Сцяпанавіч, н. у в. Кублішча, дзе і жыў, удзельнік 1-й сусветнай вайны. Загінуў.

РУДАМІНСКІ Віктар Раманавіч, н. у в. Белая Лужа, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Загінуў.

РУСАКОВІЧ Пракоп Аляксеевіч, н. у 1896, удзельнік 1-й сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У гады Грамадзянскай вайны – кавалерыст, служыў у кавалерыі Будзённага, у гады Вялікай Айчыннай вайны сувязны партызанскіх атрадаў «26 гадоў Кастрычніка», імя Матросава, радавы, на фронце з 1944 па 1945. Памёр у 1974.

САВАНОВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1893, удзельнік 1-й сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1-ю сусветную вайну (1914–1918) – стралок 256-га Заходняга стралковага палка, узнагароджаны Георгіеўскім крыжам

2017©nasledie-sluck.by

І.М. Сукач

А.П. Савановіч

4-й ступені. Памёр у 1982. (Гл. спіс «Яны вярнуліся пераможцамі»).

САВАНОВІЧ Павел Піліпавіч, н. у в. Варкавічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны. Жыў у в. Лучнікі.

САДОЎСКІ Абрам Ісанзелінавіч, н. у Слуцку, удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок 40-й Сібірскай стралковай дывізіі з 1917 па 1921. Жыў у Слуцку.

САКОВІЧ Ігнат Іванавіч, н. у 1894 у в. Еўлічы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну – артылерыст, ваяваў у Карпатах.

СЕЛЯНКОВІЧ Іван Трафімавіч, н. у 1896 у в. Радкава Салігорскага раёна, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, Грамадзянскай вайны, камандзір узвода з 1919 па 1921, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны (1941–1943). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга. Жыў у Слуцку.

СІВЕЦ Герасім Фаміч, н. у 1898 у в. Шышчыцы, у Грамадзянскую вайну стралок 25-й Чапаеўскай дывізіі. Жыў у в. Шышчыцы.

СІНІЦКІ Яўхім Ізраілевіч, н. у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

СЛАВАШЭВІЧ Мацвей Сцяпанавіч, н. у 1897 у в. Варкавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

СУКАЧ Іван Максімавіч, н. у в. Прошчыцы, прызваны ў царскую армію ў 1912, сапёр-пантоншчык, унтэр-афіцэр у 1-ю сусветную вайну, узнагароджаны трыма Георгіеўскімі крыжамі, двума медалямі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1930-я адзін з арганізатараў калгаса. Жыў у в. Малоткава. Памёр у 1944 (1945).

СУЧОК Раман Іванавіч, н. у 1895 у в. Лучнікі, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ТАРАНДА Г.Л., удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

УЛАСЕВІЧ Іван Міхайлавіч, н. у 1886 у г. Навагрудак, удзельнік Грамадзянскай вайны (1917–1919), унтэр-афіцэр, камандзір атрада 10-й арміі (Варашылава), ваяваў пад Растовам, Царыцынам.

УЛАСЕВІЧ Сямён Афанасьевіч, удзельнік Грамадзянскай вайны, камбрыг, рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна.

ХАРОШКА Сцяпан, н. у в. Балотчыцы, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ХАРЧАНКА Павел Емяльянавіч, н. у 1895 у в. Нікалаеўка Днепрапятроўскай вобл.,

С.А. Упасевіч (стаіць) з жонкай і братам

2017©nasledie-sluck.by

Я.Р. Цымбал (злева) і Л. Нейман

В.І. Цымборэвіч

удзельнік Грамадзянскай вайны, чырвоны партызан у Алтайскім краі, Слаўгарадскай акрузе. Змагаўся супраць войскаў Керанскага, Калчака. Жыў у Грэску.

ХЛЕБКА Фёдар Данілавіч, н. у в. Мусічы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну чырвонаармеец 220-га стралковага палка.

ЦЫМБАЛ Якаў Рыгоравіч, н. у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

ЦЫМБАРЭВІЧ Вікенцій Іосіфавіч, н. у 1901 у в. Лутка Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ваенфельчар, урач-хірург, з 1945 у Слуцку – гал. урач бальніцы, ардынатар хірургічнага аддзялення, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 2-й ст., медалямі. Памёр у 1991.

ЧУЙКА Піліп Фёдаравіч, н. у 1897 у в. Сярагі, удзельнік Грамадзянскай вайны, камісар стралковай роты, змагаўся супраць Калчака, на Заходнім фронце, пад Кранштатам.

ЧЫГІР Рыгор Емяльянавіч, н. у 1899 у в. Малышэвічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок 141-га батальёна АДПУ.

ШАХНОВІЧ Трафім Міхайлавіч, н. у 1900, удзельнік Грамадзянскай вайны, ваяваў на Заходнім фронце з 1919.

ШУЛЯК Міхаіл Максімавіч, н. у Слуцку, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, трыма баявымі медалямі.

М.В. Юшкевіч

Л.А. Янковіч

ЮРУЦЬ С.А., удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920).

ЮШКЕВІЧ Міхаіл Вікенцьевіч, н. у в. Каты (Гуляева), удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне (1919–1920), адзін з кіраўнікоў Слуцкага падпольнага павятовага камітэта КП(б)Б.

ЯНКОВІЧ Лука Аляксеевіч, н. у 1895 у в. Падліпцы, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Да пачатку 1-й сусветнай вайны праходзіў вайсковую службу ў Петраградзе, у асобых войсках Імператара, якія мелі дачыненне да Зімняга палаца. У гады 1-й сусветнай змагаўся на розных франтах, быў пяць разоў паранены. Жыў і працаваў у роднай вёсцы, у 1944 мабілізаваны ў працоўную армію, камісаваны па стану здароўя. Памёр у 1974.

ЯНОВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1880 у в. Сорагі, удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Жыў у в. Волашава.

ЯНОВІЧ Сцяпан Панфілавіч, удзельнік Руска-японскай вайны, быў у палоне. Жыў у в. Сліўка Амговіцкага сельсавета.

ЯЎСЕЕНКА Ілья Мікалаевіч, н. у 1892 у в. Бязверхавічы, удзельнік Грамадзянскай вайны, стралок Смаленскага запаснога палка.

2017@nasledie-sluck.by

ЯЎСЕЕНКА Кірыл Мікалаевіч, н. у 1893 у в. Бязверхавічы, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну ваяваў супраць банды Антонава.

ЯЦКО Іван Аляксандравіч, н. у 1897 у в. Гольчыцы, удзельнік Грамадзянскай вайны, у Вялікую Айчынную вайну – сувязны партызанскага атрада імя М. Астроўскага.

ЯЧЭНІН Леанід Іванавіч, н. у 1898 у в. Іграева, у Чырвонай арміі з 1917, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Грамадзянскую вайну – камандзір браняпоезда. Памёр у 1952, пахаваны ў Растове-на-Доне. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 2. С. 440).

Падрыхтавала В.С. Відлога.

І.А. Яцко

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

У 1920–1930-я гг. склалася савецкая грамадска-палітычная сістэма, пры якой камандна-адміністрацыйныя метады кіравання пашыраліся на ўсе сферы жыцця грамадства. Гэты час, супярэчлівы і складаны, стаў пачаткам рэпрэсій супраць народа. Для абгрунтавання неабходнасці насілля шырока выкарыстоўваўся тэзіс пра абвастрэнне класавай барацьбы па меры пабудовы сацыялізму. У савецкім грамадстве жорсткасць стала нормай жыцця. Рэпрэсіі былі патрэбны кіруючым колам па шматлікіх прычынах. Яны давалі магчымасць знішчыць палітычных праціўнікаў, дазвалялі перакладаць «на ворагаў народа і шкоднікаў» пралікі ў эканоміцы і сацыяльнай палітыцы, далі мільёны бясплатных рабочых, стварылі атмасферу страху, які заглушыў спробы супраціўлення. «Праціўнікі» ўлады па даносах ссылаліся на Поўнач і ў Сібір у лагеры і на спецпасяленні. У выніку пацярпелі ад рэпрэсій сотні тысяч ні ў чым не павінных людзей. Многія лёсы былі скалечаны – на іх свой адбітак наклалі ссылкі, высылкі, лагеры і турмы. Сярод іх прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, сацыяльных слаёў і прафесій. Гэта быў жудасны генацыд супраць свайго народа. Случчане, як і іншыя жыхары Беларусі, спаўна адчулі на сабе лютасць рэпрэсіўнай палітыкі.

Адной з першых ахвяр рэпрэсій, якія разгарнуліся ўжо у 1920-я гг. і не спыняліся да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а потым працягваліся і пасля яе, стала Беларусь.

Разам з рэпрэсіямі ў грамадстве з'явіўся новы тэрмін «вораг народа», і гэтым было ўсё сказана. Кожнага можна было западозрыць у варожых намерах, навесці паклёп і падвергнуць самаму жорсткаму пакаранню з парушэннем усякіх норм законнасці. Прысуд «ворагам народа» маглі выносіць «двойкі і тройкі» – пазасудовыя органы.

Хваля рэпрэсій пракацілася над прадстаўнікамі беларускай навукі, літаратуры, мастацтва, работнікамі дзяржаўных органаў улады рэспублікі, якія абвінавачваліся у так званым нацыянал-дэмакратызме. З 826 удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху (1917–1924) былі рэпрэсіраваны ўсе, хто застаўся жыць на тэрыторыі БССР. Сярод іх аказаліся нашы землякі: М.А. Асвяцімскі, П.Я. Жаўрыд, А.В. Бараноўскі, А.Ю. Бараноўскі, Г.І. Лістапад і інш. (гл. гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Кн. 1. С. 250–278).

2017©nasledie-sluck.by

У Цэнтральным архіве ФСБ РФ знаходзіцца цікавы дакумент – справаздача ДПУ Беларусі за 1926 г., дзе гаворыцца аб паказальным працэсе над «контррэвалюцыйнай арганізацыяй», якую ўзначальваў настаўнік са Слуцка Ю. Лістапад. Спецслужбамі было ўстаноўлена, што 4 настаўнікі, 1 студэнт і 3 слухачы агульнаадукацыйных курсаў «готовили план свержения Совласти», прызывали «к организованному неплатежу налогов», да аб'яднання з Заходняй Беларуссю, стварэння сялянскай арганізацыі. І хоць пацвярджэння варожай дзейнасці настаўнікаў і іх былых вучняў не было, усё ж яны былі асуджаны. Услед за гэтым была распрацавана праграма барацьбы з варожымі элементамі ў школах: «а) чистки нежелательного элемента среди учительского состава низших школ и семилеток; б) мероприятия в области выпрямления классовой линии в социальном подборе учащихся с чисткой социально чуждого и а/с элемента из них; в) ряд мероприятий в области оздоровления методов преподавания в школах и изжития ненормальностей в школьном вопросе».

Разумеецца, праграма пачала выконвацца. У маі 1929 г. сакратарыятам ЦК КП(б)Б быў разасланы акружным камітэтам сакрэтны цыркуляр, дзе ўказвалася, што з 5339 студэнтаў вышэйшых устаноў знаходзіцца 112 чалавек «іншых», бо па сацыяльным паходжанні іх нельга аднесці да катэгорыі рабочых, сялян і служачых. Сярод 5545 студэнтаў тэхнікумаў такіх «іншых» налічвалася 144 чалавекі. Сакратарыятам ЦК было рэкамендавана акружным і раённым камітэтам правесці адпаведную праверку і «чыстку», што і было зроблена.

У 1930 г. больш за палову сваіх членаў у выніку рэпрэсій страціў Саюз пісьменнікаў Беларусі, лепшыя кадры страціла і Акадэмія навук рэспублікі. 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў, а колькі навуковых супрацоўнікаў!

Кульмінацыяй расправы над інтэлігенцыяй у 1930–1931 гг. стала справа аб «нацдэмаўскай контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», па якой было арыштавана больш за 110 прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

Трагічны лёс напаткаў маладых пісьменнікаў і вучоных родам са Случчыны: Ю.Л. Гаўрука, пісьменніка і перакладчыка, дацэнта кафедры мовы і літаратуры Магілёўскага педінстытута; В.У. Мяцельскага, прафесара кафедры аграхіміі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі; С.А. Баркоўскага, літаратуразнаўца і этнографа; Г.П. Бараноўскую, навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры і мовы АН БССР; С.І. Ліхадзіеўскага, паэта, супрацоўніка газеты «Літаратура і мастацтва»; Ф.Г. Шантыра, публіцыста і грамадскага дзеяча; Я. (Восіпа Лявонавіча) Дылу, пісьменніка і грамадскага дзеяча… Пералік можна доўга працягваць.

У гэты перыяд набірала абароты і барацьба з «вясковай контррэвалюцыяй», якая ўзяла пачатак з сярэдзіны 1920-х гг. На першым месцы ў полі зроку аказалася праблема «кулака».

Быў распрацаваны шэраг цыркулярных пісем і інструкцый, у якіх называліся крытэрыі раздзялення кулацкіх гаспадарак па трох катэгорыях і адпаведныя ім меры пакарання: ад вышэйшай (расстрэл) да рассялення ў межах свайго раёна. Ужо ў лютым 1930 г. на месцах былі створаны спецыяльныя камісіі, якія складалі спісы кулакоў, устанаўлівалі катэгорыі гаспадарак, вялі ўлік канфіскаванай маёмасці і г.д. Аднак дзяленне кулакоў на катэгорыі страціла сэнс: на месцах па розных

2017©nasledie-sluck.by

прычынах не была наладжана сістэма рассялення ў межах сваіх рэгіёнаў. Гэта прывяло да масавага прымусовага накіравання значных груп сялянства ў аддаленыя куткі СССР, амаль непрыгодныя для пражывання.

Так, з 1 па 14 чэрвеня 1931 г. кожны дзень адпраўляўся эшалон з перасяленцамі. З 61 раёна Беларусі да высялення была прыгаворана яшчэ 5671 сям'я (больш за 22,5 тыс. чал.), у т.л. са Слуцка 382 сям'і. Спецперасяленцы працавалі на лесапавалах, у горназдабыўной прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Людзі гінулі ад хвароб, недаядання, холаду. Лёс многіх з іх застаўся невядомым.

Масавае раскулачванне, якім суправаджалася калектывізацыя, у выніку пераўтварылася ў барацьбу з сялянамі-аднаасобнікамі.

У гэты цяжкі для сялянства перыяд пачала праводзіцца і «чыстка» радоў вясковых камуністаў, а таксама «чыстка» пагранпаласы, якая не спынялася амаль да 40-х гг. Тагачасная граніца з буржуазнай Польшчай праходзіла за 30–40 км ад Слуцка, таму асаблівая ўвага надавалася раскрыццю ўсякага роду шкодніцкіх арганізацый, барацьбе са шпіянажам, тэрарыстычнымі намерамі супраць савецкай улады і г.д. Амаль у кожнай вёсцы «раскрываліся» кулацкія групіроўкі, было «выяўлена» шмат шпіёнскіх арганізацый.

Так, у в. Машчыцы Акцябрскага сельсавета ў 1930 г. была «раскрыта» кулацкая групоўка, «кіраўніком» якой з'яўляўся Бараноўскі І.В. Усяго ў гэты год у вёсцы было арыштавана 19 чалавек, з іх трое, у т.л. і «кіраўнік», былі прыгаворaны да вышэйшай меры пакарання. Арышты праводзіліся кожны год.

У 1937 г. у гэтай жа вёсцы было арыштавана 12 чалавек, з іх да ВМП прыгаворана ўжо 5 вяскоўцаў. За два гады (1937–1938) у в. Замосце Покрашаўскага сельсавета было арыштавана 25 чалавек, да ВМП прыгаворана 23. Большасць з іх абвінавачваліся як члены ПАВ – польскай арганізацыі вайсковай. Паводле афіцыйных даных НКУС аб сем'ях, рэпрэсіраваных у пагранічных раёнах БССР (на 20 кастрычніка 1937), па Слуцкім раёне па першай катэгорыі была рэпрэсіравана 71 сям'я (290 чал.), па другой – 72 сям'і (255 чал.)

Прыведзеныя лічбы не з'яўляюцца канчатковымі, бо гэта тое, што мы ведаем дзякуючы адкрытым дакументам. А колькі яшчэ не ведаем? Цяжка сказаць.

«Контррэвалюцыйныя, шпіёнскія, шкодніцкія» арганізацыі былі раскрыты ў Слуцку: у 1932 г. у МТС, дзе «ворагамі» былі 5 аграномаў і землеўпарадчык, у 1937 г. узбуджана справа супраць вялікай групы работнікаў чыгункі (каля 20 чал., да ВМП былі прыгаворaны нач. станцыі Слуцк Бельскі С.С., ст. дарожны майстар 13-й дыстанцыі пуці Адась Ф.С., майстар чыгункі Вайшвіла Л.Я., рабочы Гірэль В.В., дзяжурны па станцыі Кісялёў М.В. і інш.).

У 1932 г. у СССР была прынята суровая пастанова «Об охране имущества государственных предприятий, колхозов и кооперации и укреплении общественной (социалистической) собственности», якую ў народзе празвалі «законам аб пяці каласках». З гэтага часу распаўсюджванне атрымала прыцягненне да адказнасці «за службовую злачыннасць». Так, былі арыштаваны і расстраляны на Случчыне старшыні калгасаў: «Ленінскі шлях» (Лучнікі) Х.Л. Дубалека за дрэннае захоўванне збожжа, імя Молатава (Бранавічы) М.П. Савановіч, «Другая пяцігодка» (Старэва) М.Ф. Дубовік у 1937 г., а пасля яго – Ц.І. Жалуновіч у 1938 г. і інш.

2017©nasledie-sluck.by

Сярод рэпрэсіраваных нашага горада і раёна былі людзі рознага ўзросту, заняткаў і пасад – кіраўнікі прадпрыемстваў і ваеннаслужачыя, бухгалтары і краўцы, урачы і настаўнікі, артысты калгасна-саўгаснага тэатра, прадаўцы і нават хатнія гаспадыні… А колькі загінула калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў?! Гаротных цэлымі сем'ямі вывозілі на Поўнач і ў Сібір, без маёмасці, без самага неабходнага для жыцця.

Праводзіліся рэпрэсіі і супраць духавенства. У 1933 г. была асуджана група святароў Слуцкага вікарыяцтва (больш за 20 чал.), якія быццам бы з'яўляліся членамі «контррэвалюцыйнай царкоўна-паўстанцкай арганізацыі», філіял якой быў створаны ў Слуцку, і ўзначальваў яго Слуцкі епіскап Шамяціла М.І.

Разам з гэтым зачыняліся і разбураліся храмы. У Слуцку былі зачынены цэрквы: Свята-Георгіеўская (Юр'еўская), Благавешчанская, Уваскрасення Хрыстовага, Нараджэння Багародзіцы, Святога першапакутніка архідыякана Стэфана; Свята-Мікалаеўскі сабор і Свята-Троіцкі манастыр.

Царкоўная маёмасць (золата, парча, камяні) перадаваліся фінансавым органам, мастацкія і музейныя каштоўнасці забіралі народныя камітэты адукацыі. Была прынята нават пастанова Савета працы і абароны СССР «О заготовке колокольной бронзы» ў 1934 г. Па разнарадцы Беларусі патрэбна было здаць 100 т, потым дабавілі яшчэ 50, усяго 150.

З улікам цэркваў была складзена разнарадка здачы па гарадах. Слуцку трэба было здаць 10 т. План быў выкананы.

У 1931–1938 гг. прайшлі палітычныя працэсы ў выніку «раскрыцця» ўдзельнікаў антысавецкіх арганізацый «Аб'яднанне антысавецкага падполля», «Беларуская аўтакефальная царква», «Беларуская народная грамада», «Беларускі нацыянальны цэнтр», «Беларускі філіял Працоўнай сялянскай партыі» і інш. Аднак усё гэта было сфальсіфікавана, бо ў рэальнасці такіх антысавецкіх арганізацый не было.

Ахвярамі сталінскіх рэпрэсій сталі вядомыя дзеячы КП(б)Б і кіраўнікі БССР М.Ф. Гікала, А.Р. Чарвякоў, М.М. Галадзед і інш. Не абышлі рэпрэсіі і кіраўнікоў мясцовых улад. Так, у 1938 г. у Слуцку былі арыштаваны і расстраляны старшыня Слуцкага акружнога выканкама К.М. Жолудаў і старшыня Слуцкага райвыканкама А.Н. Шкляр, да гэтага ў 1937 г. – сакратар Слуцкага акруговага камітэта КП(б)Б С.Д. Каменштэйн.

Спектр абвінавачанняў быў вельмі шырокі. Людзей прыцягвалі да адказнасці як удзельнікаў антысавецкай дыверсійна-тэрарыстычнай арганізацыі; як членаў розных контррэвалюцыйных арганізацый, за прыналежнасць да антысавецкіх груп; як агентаў польскай разведкі, за шпіянаж на карысць Польшчы, за распаўсюджванне контррэвалюцыйных, правакацыйных чутак; як члена сям'і «ворага народа» і інш.

У гэтыя страшныя часы існавала шмат прычын для арышту: за спазненне і нявыхад на працу, за «лішне» сказанае слова, за сяброўства ці знаёмства з «ворагам народа», за парушэнне тэрмінаў выплаты падаткаў і г.д.

Аналізуючы справы рэпрэсіраваных, можна прыйсці да высновы, што следства праводзілася ў большасці паскорана і спрошчана. Так вяршыліся лёсы нашых землякоў.

Рэпрэсіі не спыняліся і ў апошнія перадваенныя гады. У пасляваенны час раскручаны на поўную магутнасць рухавік рэпрэсій працягваў сваю справу. Да ранейшых абвінавачанняў, такіх як «удзельнік контррэвалюцыйнай

2017©nasledie-sluck.by

Праўленне слуцкага райспажыўсаюза. Справа – Л.Т. Трухан. 1933 г.

арганізацыі», «шпіянаж», дабавіліся новыя – «супрацоўніцтва з нямецка-фашысцкімі акупантамі», «здрадніцтва» і інш. Арыштоўваліся людзі, якія працавалі ў акупацыйных установах, настаўнікі, што працавалі ў школах у гады акупацыі, члены іх сем'яў і інш.

Паводле ацэнак даследчыкаў, ахвярамі сталінскіх рэпрэсій сталі каля 600 тыс. жыхароў Беларусі, а магчыма і болей. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што кожны шосты жыхар Беларусі быў рэпрэсіраваны. Пачынаючы з 1954 г. і да сённяшняга дня працягваецца іх рэабілітацыя.

У гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк» (Кн. 1-я. С. 250–278) змешчаны спіс ураджэнцаў і жыхароў нашага краю – ахвяр рэпрэсій. У ім названа звыш 800 прозвішчаў, але гэта далёка не поўны пералік. Пасля выхаду ў свет кнігі «Памяць» пошукавая праца краязнаўцаў і навуковых супрацоўнікаў музея працягвалася, і як вынік – новыя прозвішчы, новыя факты змрочных часоў сталінскага таталітарызму. Справа вяртання сумленных імёнаў працягваецца.

Літаратура:

1. Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-ых гадоў на Беларусі. – Мінск, 1994.

2. Врублевский А.П., Протько Т.С. Из истории репрессий против белорусского крестьянства. 1929–1934 гг. – Мінск, 1992.

3. Маракоў Л. Рэпрэсіраваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі, 1917–1967. У 2-х т. – Мінск, 2007.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 952. Воп. 4. С. 47. Л. 204.

5. Протько Т. С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.). – М., 2002.

6. Фонды ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей».

В.С. Відлога.

Першы злёт ударнікаў камунальна-жыллёвага будаўніцтва. 1931 г.

2017©nasledie-sluck.by

Ураджэнцы і жыхары Слуцка і Слуцкага раёна, якія падверглiся палітычным рэпрэсіям і пазней былі рэабілітаваны

ГОРАД СЛУЦК

АС Ісер Абрамавіч, н. у 1903 у Слуцку, начальнік сілавых установак дэпо чыг. ст. Казалінск Кзыл-Ардзінскай вобл. Арыштаваны 17.10.1937. Прыгавораны 9.2.1938 да ВМП. Рэабілітаваны 24.4.1997.

АСВЯЦІМСКІ Казімір Аляксандравіч, н. у 1871 у Слуцку, дзе і пражываў, вартаўнік могілак. Арыштаваны 3.11.1937. Прыгавораны 17.11.1937 да ВМП. Расстраляны 27.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 27.4.1989.

АХРАМОВІЧ Васіль Мацвеевіч, н. у 1890 у Слуцку. Асуджаны ў 1933 да 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 24.7.1996.

АХРАМОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. у 1901 у Слуцку, войт. Пражываў у м. Налібокі Стаўбцоўскага р-на. Арыштаваны 21.9.1939. Асуджаны 9.1.1941 на 8 гадоў ППЛ. Вызвалены 8.9.1941. Рэабілітаваны 28.4.1989.

АХРАМОВІЧ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1871 у Слуцку, дзе і пражываў, пячнік. Арыштаваны 3.11.1937. Прыгавораны 22.11.1937 да ВМП. Расстраляны 29.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 27.12.1989.

АЧАПОЎСКІ Нічыпар (Нікіфар) Сямёнавіч, н. у Слуцку. Асуджаны 9.6.1933 з 20 святарамі Слуцкага вікарыяцтва за «контррэвалюцыйную агітацыю». Рэабілітаваны 17.7.1989.

БАРАНОЎСКАЯ Аляксандра Рыгораўна, н. у 1885 у в. Машчыцы, хатняя гаспадыня. Пражывала ў Слуцку. Арыштавана 29.6.1930. Асуджана на высылку, адкуль уцякла. Была вернута зноў на месца адбывання пакарання. Рэабілітавана 22.8.1989.

БАРАНОЎСКІ Канстанцін Юльянавіч, н. у 1893 у в. Вялікія Машчыцы, служачы. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 30.6.1930 як член шпіёнскай арганізацыі. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Лаўрэнцій Фёдаравіч, н. у 1890 у в. Машчыцы, заг. фермы к-са «1 Мая». Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 19.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 20.7.1959.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1876 у в. Вялікія Машчыцы, беспрацоўны. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 30.6.1930 як член шпіёнскай арганізацыі. Асуджаны 14.10.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Пётр Усцінавіч, н. у 1895 у Слуцку, дзе і пражываў, заг. гаспадаркі электрастанцыі. Арыштаваны 15.7.1938 за выдаванне дзяржаўнай тайны. Асуджаны 5.2.1940 на 3 гады ППЛ (Кулойлаг). Рэабілітаваны 10.5.1992.

БАРКОЎСКІ Сцяпан Андрэевіч, н. у 1905 у Слуцку, беларускі крытык, літаратуразнавец, этнограф. У 1926 скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, працаваў у Інбелкульце, Інстытуце гісторыі АН БССР. У лістападзе 1936 арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Працаваў у лагеры горна-металургічнага камбіната ў Краснаярскім краі, на Джыдзінскім вальфрамавым камбінаце. Рэабілітаваны ў 1955. З гэтага часу ў Мінску. Памёр 11.6.1966. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 457).

БРЖАЗОЎСКІ Іван Мітрафанавіч, н. у 1890 у в. Вялікія Машчыцы, выкладчык Слуцкага педтэхнікума. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 30.6.1930 за шпіёнскую дзейнасць на карысць Польшчы. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1906 у Слуцку, машыніст, пражываў у Тульскай вобл., ст. Фаянсавая. Арыштаваны. Прыгавораны да ВМП.

ВАСІЛЕЎСКІ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1914 у Слуцку, мастак у кінатэатрах «Велікан»

2017@nasledie-sluck.by

і «Форум». Пражываў у Ленінградзе. Арыштаваны 1.9.1941. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Яўхім Паўлавіч, н. у 1883 у в. Васілінкі, фурман Слуцкага аддзялення сувязі. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 11.7.1938. Прыгавораны 26.9.1938 да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ВЕЧАР Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1911 у Слуцку. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.10.1937. Пахаваны ў Бутаве Маскоўскай вобл. Рэабілітаваны.

ГАЛАГУЦКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1909 у в. Белічы, сталяр птушкакамбіната. Працаваў у Слуцку. Арыштаваны 23.8.1939 як агент польскай разведкі. Асуджаны на высылку ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ГАХОВІЧ Усевалад Васільевіч, н. у 1881 у Слуцку, урач Цімкавіцкай амбулаторыі. Пражываў у м. Цімкавічы Капыльскага р-на. Арыштаваны 24.8.1937 як агент польскіх разведорганаў. Прыгавораны 11.12.1937 да ВМП. Расстраляны 17.1.1938. Пахаваны ў Оршы. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ГЕЦАЎ Сямён Аронавіч, н. у 1883 у Слуцку, нач. навукова-праграмнага аддзела Акадэміі навук СССР. Пражываў у Маскве. Арыштаваны 29.7.1937 як удзельнік к/р дыверсійнай і тэрарысцкай арганізацыі. Прыгавораны 26.9.1937 да ВМП. Расстраляны 26.9.1937. Пахаваны ў Маскве на Данскіх могілках. Рэабілітаваны 17.11.1956.

ГУЗОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у Слуцку у 1898, пражываў у маёнтку Востраў-Горкі за 10 км ад Слуцка. Арыштаваны 17.12.1919. Асуджаны да зняволення да заканчэння Грамадзянскай вайны. Рэабілітаваны 24.4.1993.

ГУРЫНОВІЧ Ірыней Іванавіч (Ірыней), н. у м. Цырын Навагрудскага пав. (ц. Каралёцкі р-н), архімандрыт (з насельнікаў Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра). Арыштаваны ў Слуцку ў чэрвені 1929 за заклікі да моладзі не ўступаць у клуб бязбожнікаў. Асуджаны 3.9.1929 на 3 гады пазбаўлення права пражываць у 12 населеных пунктах і на Урале. Этапаваны ў Ніжні Ноўгарад. Рэабілітаваны у 1992.

Язэп Дыла

ДОЎБІК Ілья Васільевіч, н. у 1896 у в. Цалевічы, загадчык Слуцкага райана. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 20.10.1933 як член а/с арганізацыі. Асуджаны 26.11.1933 на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены 21.10.1934. Рэабілітаваны 24.9.1996.

ДОЎБІК Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1877 у в. Цалевічы, конюх коннай базы. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 6.8.1937. Прыгавораны 30.10.1937 за шпіянаж да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 1.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ДУБОЎСКІ Міхаіл Сямёнавіч, н. у в. Цясова, пісьмавод Слуцкага камерцыйнага вучылішча. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 4.12.1920 за здраду савецкай уладзе. Прыгавораны 7.1.1921 да ВМП. Расстраляны 9.1.1921. Рэабілітаваны 20.7.1991.

ДЫЛА Язэп (Восіп Лявонавіч), н. у 1880 у Слуцку, беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. У 1930 арыштаваны па справе «Саюз вызвалення Беларусі». Асуджаны 10.4.1931, сасланы на 5 гадоў у г. Кунгур Пермскай вобл. Жыў у Саратаве, дзе ў жніўні 1938 зноў арыштаваны, 10.4.1939 вызвалены. Рэабілітаваны ў 1957. Памёр 4.7.1973. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 2. С. 472).

2017@nasledie-sluck.by

ЗАБРОДСКІ Андрэй Нічыпаравіч, н. у 1894 у в. Замошша, ст. аграном Слуцкай МТС. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 10.11.1933 як член Слуцкага філіяла нацыяналістычнай паўстанцкай дыверсійна-шпіёнскай арганізацыі БНЦ. Асуджаны 26.12.1933 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.11.1960.

ЗАЛЕСКІ Канстанцін Пятровіч, н. у 1902 у Слуцку, ветурач. Пражываў у Ленінградзе. Арыштаваны 3.9.1937. Прыгавораны 22.9.1937 да ВМП. Расстраляны 29.9.1937.

ЗАСІМОВІЧ Савацій Аўксенцьевіч (Савацій), н. у 1863 у в. Пагост, епіскап Слуцкі. У 1-ю сусветную вайну святар палка, адначасова выконваў манастырскія абавязкі пры шпіталі. Узнагароджаны двума ордэнамі Св. Ганны. З 1918 у Слуцку. Арыштаваны 1.4.1933 разам з 20 святарамі Слуцкага вікарыяцтва. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 17.7.1989.

ЗДАНКО Іван Гаўрылавіч, н. у 1901 у Слуцку, служачы. Пражываў у саўгасе «Піянер» Куйбышаўскай вобл. Арыштаваны 7.10.1937 за шкодніцтва. Асуджаны 14.2.1938 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны ў ліпені 1960.

КАЛЯДКА Іван Міхайлавіч, н. у в. Лесуны, цясляр на электрастанцыі. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 3.6.1936 за а/с агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ, 3 гады п/п. Рэабілітаваны 22.11.1989.

КАЛЯДКА Сямён Яфімавіч, н. у 1903 у в. Лесуны, цясляр на электрастанцыі. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 28.4.1936 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.8.1936 на 7 гадоў ППЛ, 5 гадоў п/п. Рэабілітаваны 22.12.1989.

КАРПОВІЧ Аркадзь Георгіевіч, н. у 1912 у Слуцку, дзе і пражываў, шафёр будучастка. Арыштаваны 21.12.1932 за а/с дзейнасць. Асуджаны 10.4.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 1.10.1957.

КОБЕЛЬ Франц Іосіфавіч, н. у 1887 у в. Ленькі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.4.1989.

КОРБУТ Галіна Антонаўна, н. у 1926 у г. Капыль, касір у шавецкай майстэрні. Пражывала ў Слуцку. Арыштавана 2.8.1944. Асуджана 3.10.1944 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.4.1992.

КОТ Васіль Васільевіч, н. у 1883 у м. Леніна, цясляр па найму. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 29.1.1937. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ, 3 гады п/п за а/с агітацыю. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ЛОСІК Васіль Рыгоравіч, н. у 1900 у м. Грэск, шавец 4-й стр. дыв. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 19.11.1937 як член к/р арганізацыі. Прыгавораны 27.12.1937 да ВМП. Расстраляны 24.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 25.8.1956.

ЛЯСУН Антон Іванавіч, н. у 1898 у в. Кляпчаны, машыніст вадакачкі. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 23.11.1937 як член к/р арганізацыі за шкодніцтва. Прыгавораны 20.12.1937 да ВМП. Расстраляны 28.12.1937. Пахаваны ў Бабруйску. Рэабілітаваны 21.11.1960.

МАТУСЕВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1910 у Слуцку, сакратар райвыканкама. Пражываў у м. Старобін. Арыштаваны 18.3.1933 за к/р дзейнасць. Асуджаны на 3 гады, пазбаўлены права пражывання ў асобных месцах. Рэабілітаваны 25.12.1989.

МУРАШКЕВІЧ Антаніна Юльянаўна, н. у 1894 у Слуцку, дзе і пражывала. Арыштавана 3.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораная 17.11.1937 да ВМП. Расстраляна 21.1.1938. Пахавана ў Слуцку. Рэабілітавана 10.4.1989.

НІКАЛАЕВІЧ Міхаіл, н. каля 1890, псаломшчык Слуцкага Мікалаеўскага сабора з 1914. Арыштаваны ў 1933. Высланы на Поўнач, дзе і загінуў.

НОВІК Галіна Адамаўна, н. у 1936 у в. Чыжоўка. Пражывала ў Слуцку. Асуджана 24.9.1945 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 8.2.1996.

НОВІК Ганна Адамаўна, н. у 1941 у в. Чыжоўка. Пражывала ў Слуцку. Асуджана 24.9.1945 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 8.2.1996.

2017@nasledie-sluck.by

НОВІК Ніна Адамаўна, н. у 1939 у в. Чыжоўка. Пражывала ў Слуцку. Асуджана 24.9.1945 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 8.2.1996.

НЯДЗЕЛЬКА Андрэй Ігнатавіч, н. у 1885 у в. Старцавічы (ц. Знамя), рамшчык на млыне «Усход». Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 14.9.1935 за а/с агітацыю. Асуджаны 8.9.1936 на 6 гадоў ППЛ (Белбалтлаг). Рэабілітаваны 11.4.1990.

НЯЧАЙ Мікалай Аляксандравіч, н. у в. Лучнікі, бухгалтар сельгасмайстэрань. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 16.3.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны 7.5.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ПАДЛІПСКІ Прохар Сцяпанавіч, н. у 1884 у в. Сярагі, паліцыянт. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 24.7.1920 за службу ў польскай паліцыі. Прыгавораны 26.7.1920 да ВМП. Рэабілітаваны 20.7.1992.

ПРАТАСЕНЯ Васіль Іванавіч, н. у 1903 у в. Старцавічы (ц. Знамя), рабочы Слуцкай МТС. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 11.12.1933 за шпіёнскую дзейнасць. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1964.

РАГАЛЕВІЧ Адам Іларыёнавіч, н. у 1889 у в. Баслаўцы (ц. Барок), ветфельчар Слуцкай інкубатарнай станцыі. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ППЛ. Пасля вызвалення пражываў у Томскай вобл., працаваў ветурачом. Паўторна арыштаваны 3.11.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ, 5 гадоў паражэння ў правах. Рэабілітаваны: 20.7.1989; 12.5.1960.

РАДЗЮКЕВІЧ Раман Іванавіч, н. у м. Грэск, вартаўнік Слуцкай рамканторы. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 6.1.1945 як здраднік. Справа прыпынена. Памёр у Бабруйскай турме 10.2.1945. Рэабілітаваны 16.9.1997.

РУСЕЦКІ Іван Ануфрыевіч, н. у 1873 у в. Сімакова Навагрудскага р-на, вартаўнік леспрамгаса. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 12.6.1938 за шпіянаж. Прыгавораны 15.11.1938 да ВМП. Расстраляны 29.11.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 8.1.1966.

РЭЗНІК Ашэр Ізраілевіч, н. у 1882 у г. Слуцку, рабочы фабрыкі «Кастрычнік». Пражываў у Мінску. Арыштаваны 13.9.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 28.11.1932 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў асобных месцах. Адбываў пакаранне ў г. Тамбове. Вызвалены ў жніўні 1933. Рэабілітаваны 13.6.1989.

САЛАВЕЙ Іван Антонавіч, н. у 1910 у в. Прошчыцы, выкладчык Слуцкага педвучылішча. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 28.12.1944 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.6.1946 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1989.

САСІНОВІЧ Іван Алімпіевіч, н. у м. Цырын Навагрудскага пав., настаўнік Слуцкай сямігодкі № 1. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 21.7.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ (Уржум). Вызвалены 3.12.1935. Рэабілітаваны 30.1.1956.

САЦУК Аляксандр Тарасавіч, н. у с. Бярозы Кобрынскага пав., рахункавод Слуцкага аддзялення Белдзяржгандлю. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 30.3.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 27.12.1989.

СІНЯГУБ Канстанцін Іванавіч, н. у 1907 у в. Казловічы, цясляр электрастанцыі. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 3.6.1936 за а/с агітацыю як член к/р групы. Асуджаны 23.8.1936 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

СТАШЭЎСКІ Карл Казіміравіч, н. у 1901 у Слуцку, чорнарабочы. Пражываў у Нясвіжы. Арыштаваны 28.9.1937 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 9.12.1937 да ВМП. Расстралляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 9.3.1989.

СТРАЛКОЎСКІ Афанасій Трафімавіч, н. у 1877 у Слуцку, дзе і пражываў, стальмах-саматужнік. Арыштаваны 14.3.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 9.6.1933 на 3 гады высылкі. Вызвалены 14.3.1936. Рэабілітаваны 17.7.1989.

2017©nasledie-sluck.by

СТУКАЛА Мікалай Пятровіч, н. у 1892 у с. Янава (Украіна), святар. Асуджаны ў 1920-я гады. Этапаваны ў Салавецкі лагер асобага назначэння АДПУ (Карэльская АССР). Уцёк. Жыў у Слуцку. Арыштаваны 24.12.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППК. Рэабілітаваны 29.8.1989.

ТАТУР Адам Антонавіч, н. у 1880 у в. Навінкі Чырвонаслабодскага р-на, рахункавод. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 30.6.1930 як агент польскай разведкі. Асуджаны на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ТРУШКО Сямён Пятровіч, н. у 1889 у в. Селішча, каморнік Слуцкага раённага зямельнага аддзела. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 22.8.1937 як член дыверсійна-паўстанцкай арганізацыі «Братство русской правды» за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 27.12.1937 да ВМП. Расстраляны 7.4.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ФЯДЗЮШКА Іосіф Аляксеевіч, н. у 1899 у Слуцку. Пражываў у г. Ліда. Арыштаваны 5.12.1939 як сацыяльна небяспечны элемент. Асуджаны 24.12.1940 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.10.1989.

ХАЦЬКО Цімафей Сямёнавіч, н. у 1894 у в. Селішча, шорнік. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 21.7.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 11.4.1961.

ЦЭЙКА Васіль Якаўлевіч, н. у 1899 у в. Старцавічы (ц. Знамя), тэхнік-будаўнік гарсавета. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 11.12.1933 за к/р шпіёнскую дзейнасць. Асуджаны 24.2.1934 на 10 гадоў ППЛ (Магадан). Вызвалены 24.9.1946. Рэабілітаваны 5.5.1964.

ЧУДОЎСКІ Браніслаў Францавіч, н. у 1872 у Слуцку, вартаўнік касцёла ў г. Бабруйску, дзе і пражываў. Арыштаваны 25.5.1932 як агент Польшчы. Вызвалены 7.9.1932. Рэабілітаваны 7.9.1932.

ЧЫЖ Сямён Аляксандравіч, н. у 1901 у Слуцку. Пражываў у Кустанаі. Арыштаваны 5.11.1937. Прыгавораны 25.11.1937 да ВМП. Рэабілітаваны 6.8.1957.

ШАЛАЙ Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1879 у Слуцку, протаіерэй. Арыштаваны 6.8.1937 у в. Зарэчча Пухавіцкага р-на, дзе пражываў. Прыгавораны 10.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці за к/р агітацыю супраць калгасаў. Сям'я выслана. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ШАЛЮТА Вячаслаў Антонавіч, н. у Слуцку, пас. Сёлкі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «1 Мая». Арыштаваны 10.3.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 3.6.1937 на 5 гадоў ППЛ, 3 гады п/п. Рэабілітаваны 4.4.1990.

ШАРУПІЧ Георгій Мікалаевіч, н. у 1865 у в. Леніна. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 3.11.1937 як член шпіёнскай арганізацыі за а/с дзейнасць. Прыгавораны 22.11.1937 да ВМП. Расстраляны 29.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ШАХЛЕВІЧ Якаў Цімафеевіч, н. у 1896 у в. Старцавічы, аграном к-са імя Будзённага. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 2.11.1933 як член к/р групы, за шкодніцтва. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.8.1956.

ШАХНОВІЧ Яўген Фёдаравіч, н. у 1926 у Слуцку, дзе і пражываў, сталяр. Арыштаваны 11.7.1944 як член а/с арганізацыі. Асуджаны 3.10.1945 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.4.1992.

ШЫДЛОЎСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1877 у в. Бокшыцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 13.2.1930 за а/с агітацыю. Прыгавораны 23.2.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 18.7.1960.

ШЫЛОВІЧ Макар Рыгоравіч, н. у 1915 у в. Міхейкі, бухгалтар сельгасмайстэрань. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 3.8.1944 за супрацоўніцтва з нямецкімі акупантамі. Асуджаны 27.6.1946 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.7.1968.

ШЫШКО Пётр Антонавіч, н. у в. Леніна, настаўнік Слуцкай калгаснай школы. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 16.7.1938

2017©nasledie-sluck.by

як член шпіёнскай арганізацыі. Асуджаны 14.11.1938 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.3.1989.

ЯКІМОВІЧ Мікалай Андрэевіч, н. у 1887 у Слуцку, дзе і пражываў, тэхнік бюро інвентарызацыі гарсавета. Арыштаваны 19.9.1937 за сувязь з агентам польскай разведкі. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 22.10.1959.

ЯНОВІЧ Меланья Сцяпанаўна, н. у 1880 у м. Грозава, утрыманка публічнага дома. Пражывала ў Слуцку. Арыштавана 23.6.1920 за супрацоўніцтва з белапалякамі. Прыгавораная да ВМП. Рэабілітавана 20.6.1992.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДАМОВІЧ Аляксандр Ануфрыевіч, н. у 1878 у в. Селішчы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у Капыльскім р-не, в. Садкі. Арыштаваны 28.2.1930. Высланы. Рэабілітаваны 30.6.1989.

АДАМОВІЧ Антон Казіміравіч, н. у 1884 у в. Астраўляны Віленскай губ., калгаснік. Пражываў у в. Цалевічы. Арыштаваны 2.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.8.1989.

АМБРАЖЭВІЧ Лізавета Лявонцьеўна, н. у 1905 у в. Бязверхавічы, дзе і пражывала, рабочая цагельнага завода. Арыштавана. Асуджана 20.10.1945 на 3 гады высылкі. Рэабілітавана 19.6.1991.

АРАБІН Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1915 у в. Еўлічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны шлях». Арыштаваны 30.4.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 27.5.1938 на 8 гадоў ППЛ (Гарнашорскі ППЛ). Рэабілітаваны 13.4.1989.

БАЛВАНОВІЧ Віктар Пятровіч, н. у 1912 у в. Машчыцы, чырвонаармеец 2-га асобага стр. палка, 82-й стр. дыв. Пражываў у г. Кіраве. Арыштаваны. Асуджаны 30.4.1936 на 3 гады пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 28.6.1994.

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Юльянавіч, н. у 1888 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.2.1930 як член кулацкай групоўкі, за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Іван Васільевіч, н. у 1885 у в. Малыя Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.2.1930 як кіраўнік кулацкай групоўкі. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 13.6.1989.

БАРАНОЎСКІ Іван Пятровіч, н. у 1905 у в. Вялікія Машчыцы, рабочы. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 30.6.1930 за шпіёнскую дзейнасць. Асуджаны 14.10.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Лаўр Фёдаравіч, н. у 1890 у в. Машчыцы, бухгалтар арцелі «Объединенный кондитер». Пражываў у г. Рослаўль Смаленскай вобл. Арыштаваны 27.8.1937. Прыгавораны 12.10.1937 да ВМП. Расстраляны 16.10.1937. Рэабілітаваны 24.3.1959.

БАРАНОЎСКІ Назар Фёдаравіч, н. у 1879 у в. Машчыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Памяць Ільіча». Арыштаваны 21.2.1932 як член кулацкай групоўкі за шкодніцтва. Асуджаны 3.6.1932 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 27.12.1989.

БАРАНОЎСКІ Нікадзім Фёдаравіч, н. у 1872 у в. Машчыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Памяць Ільіча». Арыштаваны 21.2.1932 як член кулацкай групоўкі. Асуджаны 3.6.1932 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 27.12.1989.

БАРАНОЎСКІ Павел Васільевіч, н. у 1878 у в. Машчыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Памяць Ільіча». Арыштаваны 19.11.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 27.11.1937 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 22.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Стэфан Андрэевіч, н. у 1891 у в. Малыя Машчыцы, ляснік. Пражываў у в. Чарніцы Нясвіжскага р-на. Арыштаваны 10.2.1940. Асуджаны да высялення ў Валгаградскую вобл. Вызвалены 15.9.1941 паводле ўказа «Аб амністыі польскіх грамадзян».

2017©nasledie-sluck.by

БАРАНОЎСКІ Фёдар Юльянавіч, н. у 1884 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.2.1930 як член кулацкай групоўкі і за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРОДЗІЧ Сцяпан Сідаравіч, н. у 1906 у в. Еўлічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Асуджаны да высылкі. Рэабілітаваны 26.12.1989.

БРЖАЗОЎСКІ Дзмітрый Іосіфавіч, н. у в. Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 30.4.1933 за бандытызм і а/с агітацыю. Асуджаны 7.6.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1989.

БРЖАЗОЎСКІ Мікалай Мітрафанавіч, н. у 1886 у в. Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 як член кулацкай групоўкі і за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ВАСІЛЕНКА Андрэй Данілавіч, н. у 1910 у в. Еўлічы, рабочы саўгаса «Рачкавічы». Пражываў у пас. Славіна. Арыштаваны 30.9.1937. Асуджаны 24.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1962.

ВЕЧАР Антон Сцяпанавіч, н. у 1893 у в. Малыя Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 як кіраўнік кулацкай групоўкі і за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 5 гадоў ППЛ (Бам. Амур). Вызвалены 22.11.1937. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ВЕЧАР Іван Міхайлавіч, н. у 1895 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ГРЭК Герасім Васільевіч, н. у 1888 у в. Цалевічы, дзе і пражываў, конюх к-са «Чырвоная рэчка». Арыштаваны 3.11.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ГРЭК Пётр Несцеравіч, н. у 1881 у в. Цалевічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ГАПАНОВІЧ Аляксандр Лукіч, н. у 1903 у в. Еўлічы, калгаснік к-са Ботвіна, дзе і пражываў. Арыштаваны 7.10.1932 за а/с агітацыю, раскраданне калгаснай маёмасці. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.5.1963.

ГУРБО Андрэй Восіпавіч, н. у 1888 у в. Бязверхавічы, дырэктар сельмага. Пражываў у в. Трашкевічы Смаленскай вобл. Арыштаваны. Асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 21.1.1959.

ГУРБО Іосіф Фаміч, н. у 1885 у в. Бязверхавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 1.12.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.7.1989.

ДОЎБІК Аляксей Дарафеевіч, н. у 1872 у в. Цалевічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 3.11.1937 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ДОЎБІК Ілья Васільевіч, н. у 1896 у в. Цалевічы, настаўнік СШ в. Машчынкі Смаленскага р-на Заходняй вобл. Арыштаваны 21.8.1937. Прыгавораны 29.10.1937 да ВМП. Расстраляны 5.11.1937. Рэабілітаваны 9.9.1958.

ДОЎБІК Павел Ільіч, н. у 1894 у в. Цалевічы, дзе і пражываў, пажарнік ваенбудучастка (95-ы км). Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 3.12.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.5.1989.

ДОЎБІК Сафрон Яўтропавіч, н. у 1891 у в. Цалевічы, гандляр, меў бакалейную краму. Пражываў у Клецку. Арыштаваны 18.11.1939 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 3.8.1940 да ВМП. Рэабілітаваны 2.6.1992.

ДОЎБІК Яўстрат Іванавіч, н. у 1867 у в. Цалевічы, пражываў у в. Машчыцы. Арыштаваны 3.11.1937 як агент польскай

2017@nasledie-sluck.by

разведкі. Прыгавораны 17.11.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ДОЎБІК Яўтроп Іванавіч, н. у 1866 у в. Цалевічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 1.4.1933 за сувязь з агентам польскай разведкі. Асуджаны на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 6.5.1989.

ДУБОВІК Фёдар Пракопавіч, н. у 1913 у в. Селішча, аб'ездчык Хварастоўскага лясніцтва. Пражываў на х. Вейна Ленінскага р-на Брэсцкай вобл. Арыштаваны 2.11.1950. Асуджаны 12.1.1951 на 25 гадоў ППЛ (Ухтпечлаг). Вызвалены 2.11.1955. Рэабілітаваны 31.3.1993.

ЕСІПОВІЧ Іван Тарасавіч, н. у 1902 у в. Бязверхавічы, ваенны ветурач 3-га ранга 105-га арт. п. 105-га сд. Служыў на Далёкім Усходзе, жыў у п. Канстанцінаўка Прыморскага края. Абвінавачваўся ў распаўсюджванні хвароб сярод коней і як удзельнік контррэвалюцыйнай трацкісцкай арганізацыі ў палку. Прыгавораны 15.9.1937 да ВМП. Рэабілітаваны 2.8.1957.

ЗАБРОДСКІ Іван Данілавіч, н. у 1897 у в. Машчыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Памяць Ільіча». Арыштаваны 3.11.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЗАБРОДСКІ Павел Данілавіч, н. у 1904 у в. Машчыцы, калгаснік. Пражываў у в. В. Страхіны Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 24.8.1937 за шпіянаж на карысць польскіх разведчыкаў. Асуджаны 26.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Рыблаг) Яраслаўскай вобл. Памёр у 1942. Рэабілітаваны 12.5.1958.

ЗУБОВІЧ Пелагея Пятроўна, н. у 1876 у в. Машчыцы, хатняя гаспадыня. Пражывала ў пас. Зарубеж. Арыштавана 24.8.1937 за а/с агітацыю і шкодніцтва. Прыгаворана да ВМП. Расстраляна 24.10.1937. Пахавана ў Слуцку. Рэабілітавана 29.6.1959.

КАЗАК Іосіф Ільіч, н. у 1884 у в. Еўлічы, калгаснік к-са «Новая Зара». Пражываў у Чырвонаслабодскім р-не, в. Ракіні. Арыштаваны 19.4.1933 за садзейнічанне польскім агентам. Асуджаны 17.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.7.1956.

КРУКОЎСКІ Пётр Георгіевіч, н. у 1885 у в. Малыя Машчыцы, выкладчык 46-й Мінскай чыгуначнай школы. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 16.8.1937 як член нацдэмаўскай арганізацыі. Асуджаны 26.4.1940 на 5 гадоў ППЛ (Севвостоклаг). Рэабілітаваны 20.6.1958.

КРУКОЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1901 у в. Машчыцы, эканаміст Мінскай гарадской канторы Таргсіна. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 26.1.1935 за а/с агітацыю. Асуджаны 26.5.1935 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 12.10.1988.

МУРАВІЦКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1905 у в. Селішча, загадчык Бурмакінскай ветлячэбніцы. Пражываў у с. Бурмакіна Яраслаўскага р-на. Арыштаваны 14.9.1949. Асуджаны 26.11.1949 на 25 гадоў, 26.11.1954 тэрмін зніжаны да 6 гадоў. Рэабілітаваны 6.8.1992.

НЯДЗЕЛЬКА Ціхан Міхайлавіч, н. у 1871 у в. Еўлічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў ППЛ (Белбалтлаг). Памёр 7.3.1940. Рэабілітаваны 6.5.1989.

НЯДЗЕЛЬКА Яўфімія Ігнатаўна, н. у 1879 у в. Еўлічы, дзе і пражывала, хатняя гаспадыня. Арыштавана 6.8.1937 за а/с агітацыю. Асуджана 24.9.1937 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 6.5.1989.

НЯРОНСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1905 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.7.1930 за шпіянаж на карысць Польшчы. Асуджаны 14.10.1930 на 5 гадоў ППЛ (заменена на высылку). Рэабілітаваны 31.5.1989.

НЯРОНСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1868 у в. Кажушкі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Вялікія Машчыцы. Арыштаваны 17.6.1930 за шпіянаж на карысць

2017@nasledie-sluck.by

Польшчы. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

НЯРОНСКІ Іван Іванавіч, н. у 1897 у в. Вялікія Машчыцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Гарохаўцы Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 18.6.1930 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 14.10.1930 да 5 гадоў ППЛ, заменена на высылку. Рэабілітаваны 31.5.1998.

НЯРОНСКІ Іван Іванавіч, н. у 1897 у в. Машчыцы, старацель. Пражываў у Кербінскім р-не на прыіску «Бриакан». Арыштаваны 17.2.1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.5.1938. Пахаваны ў г. Нікалаеўск-на-Амуры. Рэабілітаваны 22.12.1961.

ПЕРАГУД Іосіф Усцінавіч, н. у 1901 у в. Малыя Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 да высылкі. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РУДАКОЎСКІ Антон Міхайлавіч, н. у 1890 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.1.1931 за сувязь з к/р арганізацыяй. Асуджаны 7.2.1932 на 5 гадоў ППЛ (Белбалтлаг). Вызвалены 14.1.1934. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РУДАКОЎСКІ Антон Сямёнавіч, н. у 1885 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 як член кулацкай групоўкі, за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РУДАКОЎСКІ Васіль Міхайлавіч, н. у 1901 у в. Вялікія Машчыцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Навінкі Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 12.8.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 7.2.1932 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РУДАКОЎСКІ Іосіф Ігнатавіч, н. у 1898 у в. Хранова (ц. Ветка), дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны маяк». Арыштаваны 29.12.1931 за а/с агітацыю. Асуджаны 3.9.1932 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1990.

РУДАКОЎСКІ Лаўрэнцій Іванавіч, н. у 1879 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 22.2.1933. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РУДАКОЎСКІ Мікалай Лаўрэнцьевіч, н. у в. Машчыцы, выкладчык тэхнікума сувязі. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 25.3.1938 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 22.9.1938 да ВМП. Расстраляны 26.9.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 2.7.1957.

ФРЭЙТАК Іван Сцяпанавіч, н. у 1893 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.1.1931 як член банды. Прыгавораны 7.2.1932 да ВМП. Расстраляны 19.3.1932. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ФЯДЗЮШКА Макар Міхайлавіч, н. у 1883 у в. Селішча, чорнарабочы канторы «Захсплаўлес». Пражываў у пас. Чэпіна Віцебскага р-на. Арыштаваны ў кастрычніку 1937 за дзейнасць у к/р кулацкай групоўцы. Асуджаны 17.10.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.12.1956.

ХАЎСТОВІЧ Варлаам Міхайлавіч, н. у 1871 у в. Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.1.1931 за сувязь з к/р арганізацыяй. Асуджаны 7.2.1932 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ХАЦЬКО Сямён Іванавіч, н. у 1862 у в. Селішча, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.7.1930 за а/с агітацыю, як член к/р арганізацыі. Асуджаны на 3 гады ППЛ умоўна. Рэабілітаваны 11.4.1961.

ХАЦЬКО Сямён Рыгоравіч, н. у в. Селішча, дарожны майстар ДЭУ-921. Пражываў у в. Паськава Горка Старадарожскага р-на. Арыштаваны 26.11.1946 за супрацоўніцтва з нямецкімі акупантамі. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.2.1990.

ХЛЯБКОВІЧ Іван Мацвеевіч, н. у 1906 у в. Еўлічы, рабочы цагельнага заво-

2017@nasledie-sluck.by

да. Пражываў у п. Усход. Арыштаваны 19.11.1937 як член шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ХЛЯБКОВІЧ Павел Ігнатавіч, н. у 1896 у в. Еўлічы. Знаходзіўся ў Карагандзінскай вобл. Арыштаваны 7.8.1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ЦІКАЧ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1913 у в. Цалевічы, ветурач Лідскага райза. Пражываў у г. Ліда Гродзенскай вобл. Арыштаваны 2.3.1946 за здраду Радзіме. Вызвалены 5.8.1946. Рэабілітаваны 20.10.1946.

ШЫЛОВІЧ Фёдар Арцёмавіч, н. у 1888 у в. Міхейкі, калгаснік к-са «Новае жыццё». Пражываў у в. Бязверхавічы. Арыштаваны 30.7.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 25.2.1939 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.4.1990.

ШЫШКО Васіль Яўхімавіч, н. у 1893 у в. Чалевічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Трактар». Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ШЫШКО Сцяпан Кандратавіч, н. у 1895 у в. Еўлічы, калгаснік. Пражываў у в. Цалевічы. Арыштаваны 2.3.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны 21.3.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.8.1989.

ЯНКОЎСКАЯ Марыя Міканораўна, н. у 1911 у в. Машчыцы, дзе і пражывала. Асуджана ў 1930 як член сям'і кулака да высылкі ў п. Воя Комі АССР. Рэабілітавана.

ЯНКОЎСКІ Міканор Іванавіч, н. у 1877 у в. Вялікія Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-адналасобнік. Арыштаваны 7.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.2.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЯНОВІЧ Вікенцій Рыгоравіч, н. у 1902 у в. Малыя Машчыцы, ветурач Арадзежскага райза. Пражываў на сядзібе Васільковічы Арадзежскага р-на Ленінградскай вобл. Арыштаваны 9.8.1937. Расстраляны 3.12.1937. Рэабілітаваны.

ЯНОВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1893 у в. Малыя Машчыцы, дзе і пражываў, селянін-адналасобнік. Арыштаваны 19.3.1933 за к/р дзейнасць. Асуджаны 10.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.5.1989.

ЯНОВІЧ Іосіф Гаўрылавіч, н. у в. Малыя Машчыцы, намеснік загадчыка Кіраўскага райземаддзела. Пражываў у в. Старцы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. Арыштаваны 1.11.1937 за шпіянаж, удзел у к/р арганізацыі. Прыгавораны 17.11.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 5.12.1937. Пахаваны ў Бабруйску. Рэабілітаваны 4.6.1959.

ЯНОВІЧ Міхаіл Гаўрылавіч, н. у 1898 у в. Машчыцы, калгаснік к-са «Новы шлях». Пражываў у п. Язвіна Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 18.9.1937 за к/р агітацыю, шкодніцтва. Асуджаны 24.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Калыма). Рэабілітаваны 25.5.1965.

АМГОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСВЯЦІНСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1911 у в. Старэва, майстар шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у пас. шклозавода Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. Арыштаваны 25.7.1938. Вызвалены 22.3.1939. Рэабілітаваны 22.3.1939.

АСВЯЦІНСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1908 у в. Старэва, майстар шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у пас. шклозавода Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. Арыштаваны 24.7.1938 за шпіянаж. Вызвалены 22.3.1939. Рэабілітаваны 22.3.1939.

БАЛВАНОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1895 у в. Таліца, калгаснік к-са «Хваля». Пражываў у в. Аступішча. Арыштаваны 13.10.1940. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ, 3 гады п/п. Рэабілітаваны 28.1.1994.

БАРАНОЎСКІ Адам Усцінавіч, н. у 1898 у в. Вялікая Баравая, цыркуляршчык цагельнага завода. Жыў у п. Купішча. Арыштаваны 7.1.1938 за а/с агітацыю. Прыгавораны

2017@nasledie-sluck.by

8.1.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 3.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.11.1989.

БЕЛАЗАРОВІЧ Васіль Гаўрылавіч, н. у 1898 у в. Сліўка, конюх. Пражываў у с. Рахункава Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Арыштаваны 23.11.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.4.1958.

БІРУКОВІЧ Антоній Канстанцінавіч, н. у 1889 у в. Амговічы, настаяцель царквы. Арыштаваны 10.1.1933 у в. Павуссе Дзяржынскага р-на. Прыгавораны 5.4.1933 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.1.1959.

ГУТКОЎСКІ Ігнат Пятровіч, н. у 1889 у в. Барок, калгаснік к-са «Гутніцкі». Пражываў у в. Гутніца. Арыштаваны 20.4.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 29.6.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ДУБОВІК Антон Герасімавіч, н. у 1897 у в. Белая Лужа, калгаснік к-са імя Будзённага. Пражываў у в. Краснае. Арыштаваны 18.3.1933. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1989.

КАРПОВІЧ Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1907 у в. Старэва, дзе і пражываў, старшыня к-са «Другая пяцігодка». Арыштаваны 19.9.1937 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 7.12.1937 да ВМП. Расстраляны 23.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.6.1989.

КЛЯЗОВІЧ Антон Андрэевіч, н. у 1902 у в. Вялікі Быкоў, старшыня калгаса «Перамога». Пражываў у в. Стары Гуткоў. Арыштаваны 29.8.1951 за тэрарыстычны намер. Асуджаны на 25 гадоў ППЛ, 5 гадоў п/п з канфіскацыяй маёмасці (Камышлаг, Омская вобл.). Вызвалены ў 1954. Рэабілітаваны 17.11.1992.

КОТ Антон Сцяпанавіч, н. у 1903 у в. Хіполаўка, нач. сельскагаспадарчага сектара. Пражываў у Карэльскай АССР, Мядзведжагорск. Арыштаваны 14.9.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 20.10.1937. Пахаваны на ст. Мядзведжая Гара. Рэабілітаваны 8.12.1956.

КРУКОЎСКАЯ Вольга Мікалаеўна, н. у 1905 на х. Саколінск, дзе і пражывала, сялянка. Арыштавана за садзейнічанне ў а/с дзейнасці. Асуджана 12.7.1929 на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана 24.5.1958.

КРУКОЎСКАЯ Еўдакія Фёдараўна, н. у 1894 у в. Сліўка, сялянка. Пражывала на х. Саколінск. Арыштавана ў чэрвені 1929 за а/с дзейнасць. Асуджана 12.7.1929 на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана 24.5.1958.

МІСКЕВІЧ Іван Конанавіч, н. у 1867 у в. Лапацічы, вартаўнік Кучынскай МТС. Пражываў у в. Каліта. Арыштаваны 22.8.1937 як член дыверсійна-паўстанцкай арганізацыі «Братство русской правды». Прыгавораны 27.12.1937 да ВМП. Расстраляны 24.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 29.4.1958.

МІХАЙЛОЎСКІ Трафім Адамавіч, н. у 1893 у в. Падстарэва, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.10.1932. Асуджаны 2.12.1932 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 13.5.1989.

МІХНЕВІЧ Пётр Аляксандравіч, н. у 1899 у в. Хорашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Шміта. Арыштаваны 7.12.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 3.1.1938 да ВМП. Расстраляны 23.9.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 27.4.1989.

ПЕНЯЗЬ Васіль Пятровіч, н. у 1878 у в. Падлошыца, дзе і пражываў, рабочы саўгаса імя Будзённага. Арыштаваны 13.11.1933 за шкодніцтва. Асуджаны 10.2.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 3.8.1956.

ПЕНЯЗЬ Праскоўя Іванаўна, н. у 1901 у в. Кальчыцы, калгасніца к-са «Краіна Саветаў». Пражывала ў в. Амговічы. Арыштавана 27.4.1946 за а/с агітацыю. Асуджана 23.6.1948 на 7 гадоў ППЛ, 3 гады паражэння ў правах. Вызвалена 6.4.1953. Рэабілітавана 6.4.1967.

ПЕНЯЗЬ Рыгор Пятровіч, н. у 1888 у в. Амговічы, цясляр саўгаса імя Будзённага. Пражываў у в. Падлошыца. Арыштаваны

2017@nasledie-sluck.by

13.11.1933 як член к/р групы, за шкодніцтва. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.8.1956.

САЛАНОВІЧ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1881 у в. Амговічы, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Паўлаўка. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1989.

СТАТКЕВІЧ Вікенцій Рамуальдавіч, н. у 1875 у в. Баравая, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Востраў Старадарожскага р-на. Арыштаваны 22.8.1938 як член к/р арганізацыі за шпіянаж. Прыгавораны 29.9.1938 да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 24.8.1959.

СТАШЭЎСКАЯ Вольга Аляксандраўна, н. у 1903 у в. Каліта, настаўніца, часова не працавала. Пражывала ў в. Усвеча Расонскага р-на Віцебскай вобл. Арыштавана 10.11.1937 як член сям'і ворага народа. Асуджана 28.11.1937 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 18.10.1989.

СТРУКОЎСКІ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1887 у в. Старажоўка Жыткавіцкага р-на, мітраформны протаіерэй. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. З 1919 у в. Амговічы, настаяцель Раства-Багародзіцкай царквы. Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з вікарным епіскапам Слуцкім Мікалаем (Шамяціла) і 20 інш. святарамі на 5 гадоў ППК. Вызвалены ў 1939. У 1945 вярнуўся ў Беларусь. Рэабілітаваны 2.4.1965.

ФІЛІППОВІЧ Вітольд Адамавіч, н. у 1903 у в. Старэва, ст. інжынер Дзіпралестрансу. Пражываў у Ленінградзе. Арыштаваны 1.9.1937. Расстраляны 20.9.1937. Рэабілітаваны.

ЦВІРКО Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1871 у в. Старэва, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.10.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШУБА-ЯБЛОНСКІ Сцяпан Віктаравіч, н. у 1881 у в. Сорагі, служачы Слуцкага леспрамгаса. Пражываў у в. Кучына. Арыштаваны 19.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 25.8.1989.

ШЫЛОВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1890 у в. Харашоўка, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 18.3.1933 за к/р агітацыю. Асуджаны 11.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.8.1989.

ШЫЯН Віргінія Францаўна, н. у 1896 у в. Амговічы, дзе і пражывала, калгасніца к-са «Краіна Саветаў». Арыштавана 27.4.1946 за а/с агітацыю. Асуджана 23.6.1948 на 7 гадоў ППЛ, 3 гады п/п. Вызвалена 27.4.1953. Рэабілітавана 6.4.1967.

БЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДЗЯРЫХА Пётр Сафронавіч, н. у 1911 у в. Белічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.4.1930 як агент польскіх разведорганаў. Асуджаны 16.6.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.4.1989.

БАРАНОЎСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1885 у в. Вялікая Млынка, калгаснік к-са «Пражэктар». Пражываў у в. Пешчанец Любанскага р-на. Арыштаваны 20.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 25.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 17.6.1989.

БАРАНОЎСКІ Рыгор Нічыпаравіч, н. у 1899 у пас. Вялікая Млынка, дзе і пражываў. Арыштаваны 18.4.1931 за сувязь з польскімі агентамі. Асуджаны 7.2.1932 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 28.3.1960.

БАРАНОЎСКІ Якаў Нічыпаравіч, н. у 1884 у в. Вялікая Млынка, эканаміст Прамкаапсавета. Пражываў у г. Свярдлоўску. Арыштаваны 10.1.1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 20.7.1938.

БАРОДЗІЧ Цярэнцій Сцяпанавіч, н. у 1902 у в. Квасынічы, выконваў абавязкі дацэнта Мінскага пединстытута. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 21.7.1938 як агент польскай разведкі. Асуджаны 11.9.1939 на 5 гадоў ППЛ (Удмуртыя). Памёр у 1943. Рэабілітаваны 22.10.1957.

2017©nasledie-sluck.by

БРУЙ Аляксей Антонавіч, н. у 1895 у в. Чыжоўка, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.1.1934 за шкодніцтва. Асуджаны 28.2.1934 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.7.1989.

БРУЙ Ігнат Дзмітрыевіч, н. у 1891 у в. Чыжоўка, пражываў у в. Равецкі Лес на Старобіншчыне, калгаснік к-са «Серп і молат». Арыштаваны 24.8.1937 за дапамогу палякам. Прыгавораны 4.10.1937 да ВМП. Расстраляны 24.10.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 4.4.1989.

БРЫТВІЧ Ганна Андрэеўна, н. у 1895 у в. Млынка, дзе і пражывала. Асуджана ў 1935, саслана з сям'ёй на 10 гадоў у Архангельскую вобл. Рэабілітавана ў 1993.

БРЫТВІЧ Сцяпан Іванавіч, н. у 1887 у в. Млынка, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Асуджаны і сасланы ў 1935 з сям'ёй у Архангельск на 10 гадоў (маёмасць канфіскавана). Рэабілітаваны ў 1993.

ВАСІЛЕЎСКІ Іван Сцяпанавіч, н. у 1894 у в. Млынка, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 7.12.1933. Асуджаны 25.1.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.7.1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Міхаіл Якаўлевіч, н. у в. Млынка, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 7.12.1933. Асуджаны 25.1.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.7.1989.

ВЕЧАР Васіль Іванавіч, н. у 1898 у в. Млынка, дзе і пражываў, загадчык свінафермы к-са. Арыштаваны 30.8.1935 за збор шпіёнскіх звестак. Асуджаны 2.7.1936 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.2.1995.

ВЕЧАР Іван Андрэевіч, н. у 1870 у в. Млынка, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.9.1937 за к/р агітацыю. Асуджаны 3.11.1937 на 10 гадоў ППЛ (Цемлаг). Рэабілітаваны 20.4.1989.

ГАЛАГУЦКІ Андрэй Яўхімавіч, н. у 1892 у в. Белічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны за садзейнічанне правядзенню к/р сабатажу. Асуджаны 12.10.1931 на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.4.1990.

КАМІНСКІ Васіль Аляксандравіч, н. у 1892 у в. Млынка, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Новая Млынка». Арыштаваны 7.12.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Вызвалены ў 1936. Рэабілітаваны 16.7.1989.

КЕРНАЖЫЦКІ Іван Гаўрылавіч, н. у 1876 у в. Балотчыцы, селянін-аднаасобнік, стараста Раства-Багародзіцкай царквы ў в. Прусы Слуцкага пав. Арыштаваны 28.12.1929 у роднай вёсцы, дзе і пражываў. Асуджаны 13.1.1930 на 3 гады высылкі. Вызвалены ў 1931. Рэабілітаваны 13.6.1989.

КОРБУТ Аляксандра (Алеся) Іванаўна, н. у 1909 у в. Квасынічы, сялянка-аднаасобніца. Пражывала ў Старобінскім р-не на х. Задражава. Арыштавана 6.1.1938 за а/с агітацыю. Прыгаворана да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляна 10.3.1938. Пахавана ў Мінску. Рэабілітавана 27.12.1989.

КОРБУТ Васіль Іванавіч, н. у 1888 у в. Квасынічы, прыёмшчык Лістападавіцкага леспрамгаса. Пражываў у Старобінскім р-не на х. Задражава. Арыштаваны 24.8.1937 як агент польскай разведкі. Прыгаворацы 27.12.1937 да ВМП. Расстраляны 24.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

МАРОЗ Антон Патапавіч, н. у 1893 у в. Квасынічы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Ёдчыцы. Арыштаваны 18.10.1939 як агент польскай разведкі. Асуджаны 5.8.1940 на 8 гадоў ППЛ (Печлаг). Рэабілітаваны 21.7.1989.

ТУРЧАНОВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. у 1904 у в. Квасынічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 1.8.1995.

ЦЫБУЛЬКА Рыгор Мікалаевіч, н. у 1904 у в. Белічы, калгаснік к-са «Фундамент сацыялізму». Пражываў на х. Задражава. Арыштаваны 27.8.1938 за шпіянаж. Асуджаны 2.11.1938 на 10 гадоў ППЛ (Севвостоклаг), дзе і памёр 20.7.1940. Рэабілітаваны 31.3.1989.

ЦЫБУЛЬКА Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1889 у в. Белічы, дзе і пражываў, селянін-

2017@nasledie-sluck.by

аднаасобнік. Арыштаваны 29.8.1931 за садзейнічанне к/р сабатажу. Асуджаны на 3 гады ППЛ, 3 гады п/п. Рэабілітаваны 4.4.1990.

ЧАРНУШЭВІЧ Антон Іосіфавіч, н. у 1885 у в. Кажушкі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Млынка. Арыштаваны 18.4.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 7.2.1932 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЧАРНУШЭВІЧ Франц Антонавіч, н. у 1909 у в. Млынка, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 7.12.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 25.2.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.6.1989.

ШПАКОЎСКІ Уладзімір Ануфрыевіч, н. у 1892 у в. Млынка, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Перавалокі Лунінецкага р-на. Арыштаваны 25.6.1937 за шпіянаж. Прыгавораны 22.9.1937 да ВМП. Расстраляны 30.9.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 1.9.1989.

БОКШЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКУЛОВІЧ Георгій Лук'янавіч, н. у 1873 у в. Васілінкі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.7.1935 за а/с агітацыю. Асуджаны 16.1.1936 на 5 гадоў ППЛ (Караганда). Памёр 19.9.1936. Рэабілітаваны 18.4.1990.

АКУЛОВІЧ Мітрафан Лук'янавіч, н. у 1876 у в. Васілінкі, дзе і пражываў, селянін. Арыштаваны 9.3.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 22.7.1938 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.3.1990.

БАРЦЭВІЧ Пётр Міхайлавіч, н. у 1906 у в. Кухты, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 26.5.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 19.6.1989.

ВАСІЛЕВІЧ Фёдар Радзівонавіч, н. у 1889 у в. Гарадзішча, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.7.1929. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 22.11.1991.

ВЕЧАР Васіль Іванавіч, н. у 1898 у в. Бокшыцы, цясляр м. Урэчча. Пражываў у в. Малоткава. Арыштаваны 27.1.1935 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.4.1990.

ГУРЫНОВІЧ Мікалай Андрэевіч, н. у 1888 у в. Гарадзішча, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.3.1934 за шкодніцтва як член к/р групы. Асуджаны 27.3.1934 на 3 гады высылкі ў Паўночны край, Важагодскі р-н. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ГУРЫНОВІЧ Мітрафан Антонавіч, н. у 1905 у в. Прошчыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны ўдарнік». Арыштаваны 14.2.1934 як член к/р групы. Асуджаны на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ГУТКОЎСКІ Лявон Лявонавіч, н. у 1859 у в. Гарохаўка, селянін-аднаасобнік. Жыў у в. Масткі Слуцкага р-на. Арыштаваны 22.3.1931 за к/р сабатаж. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ГУТКОЎСКІ Павел Іванавіч, н. у в. Прошчыцы, калгаснік к-са імя Войкава. Пражываў у пас. Навасёлкі Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 24.8.1937 за садзейнічанне шпіянажу. Асуджаны 26.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Мардоўская АССР). Рэабілітаваны 31.3.1989.

МАРОЗ Самуіл Паўлавіч, н. у в. Міхейкі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоныя Міхейкі». Арыштаваны 17.3.1937 за к/р дзейнасць. Асуджаны 21.7.1937 на 6 гадоў ППЛ, 5 гадоў п/п. Рэабілітаваны 22.12.1989.

МАХЛАЙ Васіль Васільевіч, н. у 1878 у в. Васілінкі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.1.1935 за а/с дзейнасць. Асуджаны 9.9.1935 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.4.1990.

КОРЗУН Фёдар Гаўрылавіч, н. у 1876 у в. Агароднікі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у с. Дубачына Серпухаўскога р-на Маскоўскай вобл. Арыштаваны 17.3.1933. Быў вызвалены. Рэабілітаваны ў лютым 2004.

КОРЗУН Якаў Прохаравіч, н. у 1900 у в. Агароднікі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Рассвет камунізму». Арыштаваны 24.8.1937 за к/р дзейнасць. Асуджаны 3.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.4.1989.

КРЫВАДУБАЎ Дзяніс Кузьміч, н. у 1890 у в. Ячава, бухгалтар. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 10.1.1945 за тое, што ў час ням.-фаш. акупацыі працаваў бухгалтарам гаруправы. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.5.1957.

2017©nasledie-sluck.by

КРЫВАДУБСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1882 у в. Ячава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.8.1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны 2.12.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 29.4.1989.

КРЫВАДУБСКІ Дзям'ян Фёдаравіч, н. у 1878 у в. Лесуны, касір трэста электрасетак. Пражываў у Саратаве. Арыштаваны 11.2.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 14.11.1938 да высылкі ў Казахстан. 10.3.1940 справа была прыпынена ў сувязі з недаказанасцю абвінавачання. Вызвалены.

КРЫВАДУБСКІ Павел Лукіч, н. у 1882 у в. Лесуны, дзе і пражываў, настаўнік пачатковай школы. Арыштаваны 21.6.1946. Асуджаны на 15 гадоў ППЛ (г. Бабруйск). Рэабілітаваны 29.9.1989.

КУРДЗЮК Якаў Дзмітрыевіч, н. у 1898 у в. Вялікая Слива, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.2.1934 як член а/с групы. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Памёр 29.10.1937. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ЛАГУН Мікіта Кандратавіч, н. у 1890 у в. Бандары, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны 8.3.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.8.1989.

ЛАГУН Сцяпан Паўлавіч, н. у 1896 у в. Казловічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоная ніва». Арыштаваны 6.2.1933 як член а/с групы. Асуджаны 14.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 21.7.1964.

ЛЕШЧАНКА Аляксандр Антонавіч, н. у 1903 у в. Замосце, рабочы саўгаса «Некрашы». Пражываў у в. Некрашы. Арыштаваны 26.10.1931 за ўцёкі з месца высылкі. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.5.1989.

МІРОНЧЫК Аляксей Мацвеевіч, н. у 1894 у в. Ячава, дзе і пражываў, качагар Слуцкай электрастанцыі. Арыштаваны 27.1.1938 як член ПАВ. Прыгавораны 25.5.1938 да ВМП. Расстраляны 4.7.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 11.7.1962.

МІРОНЧЫК Іван Цімафеевіч, н. у 1891 у в. Ячава, дзе і пражываў, возчык. Арыштаваны 23.8.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 31.3.1989.

МІРОНЧЫК Кандрат Паўлавіч, н. у 1884 у в. Ячава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 26.3.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.8.1963.

МІРОНЧЫК Кандрацій Паўлавіч, н. у 1885 у в. Ячава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.6.1921 за шпіянаж. Асуджаны 21.10.1921 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.6.1992.

МІРОНЧЫК Лявон Паўлавіч, н. у 1890 у в. Ячава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 26.3.1933 на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены 21.11.1953. Рэабілітаваны 10.8.1963.

МІРОНЧЫК Мікіта Цімафеевіч, н. у 1885 у в. Ячава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.2.1930 як член а/с групы. Асуджаны 8.3.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.8.1989.

МІРОНЧЫК Цімафей Мікалаевіч, н. у 1869 у в. Ячава, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны 9.10.1992.

МІРОНЧЫК Яўхім Мацвеевіч, н. у 1916 у в. Ячава, урач-гінеколаг Зэльвінскай райбальніцы. Пражываў у г. п. Зэльва Гродзенскай вобл. Арыштаваны 12.12.1948 як здраднік Радзімы. Асуджаны 9.4.1949 на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 20.6.1957. Рэабілітаваны 28.5.1957.

РАДЗЮК Іван Трафімавіч, н. у 1883 у в. Лесуны, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Задражава ў Старобінскім р-не. Арыштаваны 24.8.1937 як удзельнік а/с арганізацыі за шкодніцтва. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 17.12.1963.

2017@nasledie-sluck.by

РАДЗЮК Лаўрэнцій Міхайлавіч, н. у 1877 у в. Лесуны, калгаснік к-са «Чырвоная ніва». Пражываў на х. Дуброўка. Арыштаваны 16.9.1937 як удзельнік а/с арганізацыі за шкодніцтва. Прыгавораны 16.9.1937 да ВМП. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 17.12.1963.

РАДЗЮК Лука Трафімавіч, н. у в. Лесуны, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.4.1930 за намер перайсці граніцу. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.5.1989.

РАДЗЮК Лука Трафімавіч, н. у 1905 у в. Лесуны, кравец фабрыкі «Знамя індустрыялізацыі». Пражываў у Віцебску. Арыштаваны 24.8.1937 за дзейнасць у складзе ПАВ. Прыгавораны 22.10.1937 да ВМП. Расстраляны 4.11.1937. Пахаваны ў Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1958.

РАДЗЮК Мітрафан Цімафеевіч, н. у 1911 у в. Лесуны, загадчык сталовай Вяземскага васпгандлю 85-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 27.8.1937. Прыгавораны 21.9.1937 да ВМП. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 26.4.1989.

РУСАК Кацярына Іванаўна, н. у 1918 у в. Ячава, дзе і пражывала, прачка пральнага пункта № 131. Арыштавана 15.8.1946 за здрадніцкія дзеянні ў перыяд акупацыі. Асуджана 14.9.1946 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 28.8.1990.

САВІЦКІ Яўген Васільевіч, н. у 1924 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў. Асуджаны 8.3.1930 як член сям'і рэпрэсіраванага на высылку. Рэабілітаваны 18.1.1995.

САМУСЕВІЧ Аляксей Дзянісавіч, н. у 1878 у в. Слява, дзе і пражываў, селянін. Арыштаваны ў 1935 як удзельнік к/р царкоўнай арганізацыі. Асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Паўночны край (спецпасёлак Зара Халмагорскага р-на). 7.10.1937 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 27.3.1958.

САМУСЕВІЧ Дзяніс Іванавіч, н. у 1882 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.4.1931 як член к/р арганізацыі за к/р агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.8.1989.

САМУСЕВІЧ Іван Гаўрылавіч, н. у 1877 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.4.1931 як член к/р арганізацыі за к/р дзейнасць. Асуджаны 17.5.1931 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 23.8.1989.

САМУСЕВІЧ Малаш Гаўрылавіч, н. у 1888 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.6.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 21.2.1939 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.11.1989.

САМУСЕВІЧ Марк Тарасавіч, н. у 1893 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.2.1933 як член к/р групы за а/с агітацыю. Асуджаны 14.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 21.7.1964.

САМУСЕВІЧ Марыя Іванаўна, н. у 1880 у в. Вялікая Слява, хатняя гаспадыня. Пражывала на х. Радацыны Старобінскага р-на. Арыштавана 13.6.1930 за а/с дзейнасць. Асуджана 13.7.1930 на высылку (Комі АССР). Рэабілітавана 30.5.1989.

САМУСЕВІЧ Раман Дзмітрыевіч, н. у 1911 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1933 як член к/р групы за а/с агітацыю. Асуджаны 14.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.7.1964.

САМУСЕВІЧ Рыгор Тарасавіч, н. у 1890 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.3.1933 як член к/р групы. Асуджаны 14.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены 21.11.1936. Рэабілітаваны 21.7.1964.

САМУСЕВІЧ Сцяпан Мікітавіч, н. у 1892 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.6.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 21.2.1939 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.11.1989.

САМУСЕВІЧ Яфрэм Яфімавіч, н. у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў, селянін.

2017@nasledie-sluck.by

Арыштаваны ў 1935. Асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Паўночны край (спецпасёлак Арлецы Халмагорскага р-на). 7.10.1937 асуджаны на 10 гадоў ППК як удзельнік к/р царкоўнай арганізацыі. Рэабілітаваны 27.3.1958.

СЕМЯНОВІЧ Леанід Каленікавіч, н. у 1899 у в. Агароднікі, калгаснік. Пражываў у в. Доўгае Старобінскага р-на. Арыштаваны 15.9.1937 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 13.11.1937 да ВМП. Расстраляны 24.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 17.8.1960.

ТАРАСЕВІЧ Пётр Сямёнавіч, н. у 1913 у в. Вялікая Слява, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 29.10.1993.

ТРАФІМОВІЧ Варвара Пятроўна, н. у 1889 у в. Бандары, сялянка-аднаасобніца. Пражывала на х. Равецкі Лес Старобінскага р-на. Арыштавана за пасобніцтва ў шпіянажы, за а/с агітацыю. Асуджана на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана 21.2.1992.

ТРАФІМОВІЧ Давыд Трафімавіч, н. у 1905 у в. Бандары, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 25.12.1989.

ТРАФІМОВІЧ Мікалай Данілавіч, н. у 1906 у в. Бандары, рахункавод к-са «Серп і молат». Пражываў на х. Равецкі Лес Старобінскага р-на. Арыштаваны 24.8.1937 за а/с агітацыю, шкодніцтва, тэрарыстычныя намеры. Асуджаны 11.10.1937 на 10 гадоў ППЛ, дзе і памёр 21.10.1938. Рэабілітаваны 24.3.1989.

ТРАХІМОВІЧ Раман Сямёнавіч, н. у 1885 у в. Слява, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930 за к/р дзейнасць. Асуджаны 8.3.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.11.1989.

ЦЯЦЕРНІК Ціхан Фёдаравіч, н. у 1885 у в. Казловічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 30.1.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.12.1989.

ЧАРАТУН Сямён Сцяпанавіч, н. у 1891 у в. Паўстынь, калгаснік к-са імя Красіна. Пражываў у в. Вялікая Слява. Арыштаваны 27.12.1944 за супрацоўніцтва з ням. акупантамі. Асуджаны 6.10.1945 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.8.1990.

ЧЫЖ Аляксандр Максімавіч, н. у 1899 у в. Слява, калгаснік. Пражываў у в. Палічнае Любанскага р-на. Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 30.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Амурлаг), дзе і памёр 18.1.1941. Рэабілітаваны 20.4.1989.

ЧЫЖ Трафім Ермалаевіч, н. у 1895 у в. Вялікая Слява, нам. старшыні к-са «Серп і молат». Пражываў на х. Равецкі Лес Старобінскага р-на. Арыштаваны 24.8.1937 за а/с агітацыю, дэверцірства. Прыгавораны 26.10.1937 да ВМП. Расстраляны 9.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 7.10.1960.

ЧЫЖ Ціхан Піліпавіч, н. у 1888 у в. Вялікая Слява, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Дубнікі. Арыштаваны 15.2.1934 як член к/р групы. Асуджаны 2.3.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 14.6.1989.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АХРАМОВІЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1895 у в. Вялікае Журава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.4.1931. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКАЯ Ганна Іванаўна, н. у 1894 у в. Працавічы, дзе і пражывала, хатняя гаспадыня. Асуджана 7.2.1932 на 3 гады ППЛ за шпіянаж на карысць Польшчы. Рэабілітавана 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1896 у в. Працавічы, дзе і пражываў. Арыштаваны 17.6.1930 як арганізатар шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1910 у в. Працавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.6.1930 як член

2017@nasledie-sluck.by

шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Іван Ільіч, н. у 1899 у в. Новыя Маргі, нам. дырэктара Лутаўскога трэста Наркамзема БССР. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 1.11.1937 як член шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі ПАВ. Прыгавораны да ВМП 19.11.1937. Расстраляны 26.11.1937. Рэабілітаваны 6.10.1958.

БАРАНОЎСКІ Іосіф Васільевіч, н. у 1889 на х. Дашкова Чырвонаслабодскага р-на, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Працавічы. Арыштаваны 17.6.1930 за шпіёнскую дзейнасць на карысць Польшчы. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1899 у в. Працавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.6.1930 як член шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Флор Аляксандравіч, н. у 1874 у в. Цараўцы (ц. Кірава), селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Печышча Старобінскага р-на. Арыштаваны 5.2.1938. Прыгавораны 14.2.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 13.3.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 24.11.1960.

ВАЛЕТКА Іван Цімафеевіч, н. у 1891 у в. Варкавічы, дырэктар Цараўскай няпоўнай сярэдняй школы. Пражываў у в. Цараўцы (ц. Кірава). Арыштаваны 1.2.1935 за к/р дзейнасць. Асуджаны 7.7.1938 на 5 гадоў ППЛ (Ухтпечлаг). Рэабілітаваны 30.6.1989.

ВЕЧАР Вера Міхайлаўна, н. у 1906 у фальварку Працавічы, скончыла БДУ, настаўніца хіміі. Пражывала ў г. Асіповічы. Арыштавана ў сакавіку 1931. Прыгавораная 7.2.1932 да ВМП з заменай на 10 гадоў ППЛ. Адбывала пакаранне на Салаўках, дзе працавала батанікам на сортадаследчай станцыі. 14.10.1937 прыгавораная да ВМП. Расстраляна 1.11.1937. Пахавана ў Карэліі (Сандармох).

ВЕЧАР Надзежда Іванаўна, н. у в. Працавічы, масавік к-са «Новы шлях». Пражывала ў Чырвонаслабодскім р-не, арцель «Малая Альшанка». Арыштавана 16.4.1931 за а/с дзейнасць. Асуджана на 3 гады ІПЛ. Рэабілітавана 31.5.1989.

ВЫСОЦКІ Іосіф Ігнацьевіч, н. у 1890 у в. Цараўцы (ц. Кірава), псаломшчык у царкве в. Ёдчыцы Слуцкага пав. (ц. Клецкі р-н). Арыштаваны 22.7.1945. Асуджаны на 10 гадоў ППК. Вызвалены ў 1954. Рэабілітаваны.

КОРЗУН Фёдар Данілавіч, н. у 1897 у в. Агароднікі Кіраўскага с/с, калгаснік к-са «Балышавік». Пражываў у п. Устрань. Арыштаваны 19.9.1937 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 29.11.1937 да ВМП. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 28.4.1989.

КУЛЕШ Рыгор Юркавіч, н. у 1890 у в. Цараўцы (ц. Кірава), дзе і пражываў, рабочы бойні ў Слуцку. Арыштаваны 26.7.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны 9.9.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЛЮЦКО Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1893 у в. Працавічы, дзе і працаваў, калгаснік к-са «Іскра». Арыштаваны 25.3.1933 за антыкалгасную агітацыю. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 20.7.1959.

ЛЮЦКО Аляксей Ціханавіч, н. у 1904 у в. Працавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 30.6.1930 як агент польскай разведкі. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЛЮЦКО Арцём Піліпавіч, н. у 1889 у в. Працавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 3.6.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 14.1.1932 на 3 гады паражэння ў правах. Рэабілітаваны 27.9.1989.

ЛЮЦКО Фёдар Яфрэмавіч, н. у 1879 у в. Працавічы, конюх торфазавода «Міханавічы». Пражываў у пас. Міханавічы Мінскага р-на. Арыштаваны 20.11.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.5.1989.

2017©nasledie-sluck.by

НОВІК Андрэй Майсеевіч, н. у 1899 у в. Іграева, у 1924 старшыня Ісернскага сельсавета, актыўны ўдзельнік калектывізацыі, старшыня калгаса «Случ». У сакавіку 1933 арыштаваны і сасланы на 3 гады ў г. Сяміпалацінск. З ліпеня 1942 на фронце, загінуў у снежні 1942, пахаваны ў брацкай магіле ў г. Холм Смаленскай вобл. Рэабілітаваны ў 1957.

НОВІК Павел Майсеевіч, н. у 1897 у в. Іграева, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны ў верасні 1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны 10.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 18.10.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ПРАСКАЛОВІЧ Савелій Дзямідавіч, н. у 1896 у в. Навадворцы, дзе і пражываў, селянін. Рэпрэсіраваны ў 1936, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

РАДАКОЎСКІ Аляксандр Кірылавіч, н. у 1876 у м. Лахва (Брэстчына), святар. На Случчыне з 1914, настаяцель Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Івань (Іванаўскія Агароднікі), дзе і пражываў. Арыштаваны 9.2.1930 як кіраўнік а/с арганізацыі. Асуджаны 23.2.1930 на 5 гадоў ППК. Лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РУДАКОЎСКІ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1922 у в. Цараўцы (ц. Кірава), студэнт Магілёўскага пед. ін-та. Пражываў у Магілёве. Арыштаваны 24.6.1941 за а/с агітацыю. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ, дзе і памёр 24.4.1942. Рэабілітаваны 4.10.1958.

РЫТВІНСКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1898 у в. Кляпчаны, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.8.1930 за к/р шпіёнскую работу на карысць Польшчы. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

САКОВІЧ Соф'я Юр'еўна, н. у в. Працавічы, калгасніца. Пражывала ў в. Бухарына Чырвонаслабодскага р-на. Арыштавана 5.8.1930 як член к/р арганізацыі. Асуджана 14.10.1930 на высылку. Рэабілітавана 31.5.1989.

САМУСЕВІЧ Гаўрыіл Лявонцьевіч, н. у 1875 у в. Іграева, селянін. Пражываў у в. Радацыны Старобінскага р-на. Арыштаваны 18.6.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны 13.7.1930 на высылку ў Комі-Пярмяцкую акругу. Рэабілітаваны 30.5.1989.

САМУСЕВІЧ Мікалай Лявонавіч, н. у 1884 у в. Іграева, калгаснік к-са «Камсамолец». Пражываў на х. Радацень Старобінскага р-на. Арыштаваны 23.10.1933 за сувязь з агентамі польскай разведкі. Асуджаны 16.1.1934 на 3 гады ППЛ, заменена на 3 гады высылкі. Вызвалены 23.10.1936. Рэабілітаваны 23.6.1989.

САМУСЕВІЧ Самуіл Сідаравіч, н. у 1881 у в. Цараўцы (ц. Кірава), селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Палічын Любанскага р-на. Арыштаваны 19.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 25.5.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 17.11.1989.

САМУСЕВІЧ Фёдар Сідаравіч, н. у 1873 у в. Цараўцы (ц. Кірава), калгаснік. Пражываў у Любанскім р-не. Арыштаваны 19.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 25.5.1933 на 3 гады ППЛ умоўна. Рэабілітаваны 17.11.1989.

САСІНОЎСКАЯ Варвара Паўлаўна, н. у 1870 у в. Івань, хатняя гаспадыня. Пражывала ў в. Языль Старадарожскага р-на. Арыштавана за а/с дзейнасць як член к/р групы. Асуджана 12.2.1933 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў асобных месцах. Рэабілітавана 29.3.1989.

СКУЦЭНЯ Пракоп Пятровіч, н. у 1898 у в. Працавічы, жывёлавод к-са «Будаўнік». Пражываў у в. Сухая Міля Старобінскага р-на. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 3.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.3.1989.

СУЧОК Іван Сцяпанавіч, н. у 1909 у в. Іграева, дзе і пражываў, малодшы камандзір 5-га стралковага палка 2-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 1.10.1933 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 23.1.1934 да ВМП. Рэабілітаваны 23.6.1989.

2017@nasledie-sluck.by

СУЧОК Павел Мацвеевіч, н. у 1888 у в. Агароднікі, памочнік машыніста цягніка. Пражываў у Казані. Арыштаваны 25.7.1942 як удзельнік паўстанцкай групоўкі. Асуджаны 8.5.1943 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.12.1955.

СУЧОК Цярэнцій Фёдаравіч, н. у в. Агароднікі, калгаснік к-са «Чырвоны баец». Пражываў у в. Замошша Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 5.2.1938 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 14.2.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 13.3.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 13.9.1958.

ТРУХАН Якаў Яўсеевіч, н. у 1895 у в. Працавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.6.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 14.1.1932 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ХАЦЬКО Антон Аляксеевіч, н. у 1899 у в. Іванскія Агароднікі, нач. чыгункі ст. Цімкавічы. Пражываў на ст. Цімкавічы Капыльскага р-на. Арыштаваны 26.8.1937 як член польскай шпіёнскай дыверсійнай арганізацыі на чыгунцы. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.11.1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ХАЦЬКО Мірон Міронавіч, н. у 1891 у в. Іванскія Агароднікі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Хваля рэвалюцыі». Арыштаваны 31.12.1944 за а/с агітацыю. Асуджаны 2.7.1946 на 1 год 7 мес. ППЛ. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ЦІМІНСКАЯ Наталля Ігнатаўна (жонка М.І. Цімінскага), н. у 1882, пражывала ў в. Цараўцы. Арыштавана 26.7.1933. Асуджана 9.9.1933 за а/с агітацыю на 3 гады высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 31.5.1989.

ЦІМІНСКІ Мітрафан Іванавіч, н. у 1877 у в. Нянькавічы Пінскага пав. З 1905 настаяцель Свята-Іаанаўскай царквы в. Цараўцы (ц. Кірава). Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. святарамі на 5 гадоў ППК (заменена высылкай). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989.

ЧЫЖ Андрэй Пракопавіч, н. у 1900 у в. Іграева, ветурач Любанскай ветлячэбніцы. Пражываў у Любані. Арыштаваны 29.5.1929 як член к/р арганізацыі за шпіянаж на карысць Польшчы. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 2.3.1992.

ЧЫЖ Антон Фёдаравіч, н. у 1892 у в. Іграева, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 26.1.1938 як агент польскіх разведорганаў. Прыгавораны 29.3.1938 да ВМП. Расстраляны 26.4.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЧЫЖ Трафім Фёдаравіч, н. у 1890 у в. Іграева, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 27.1.1938 за а/с агітацыю. Прыгавораны 29.3.1938 да ВМП. Расстраляны 25.4.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ЧЫЖ Цярэнцій Захаравіч, н. у 1902 у в. Іграева, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 1.7.1930 як член к/р шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 14.10.1937 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЯКІМОВІЧ Ігнацій Цімафеевіч, н. у 1897 у в. Навадворцы, калгаснік к-са «Асвета». Пражываў у в. Рэчань Любанскага р-на. Арыштаваны 16.3.1933 як член к/р групы. Асуджаны 17.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЯКІМОВІЧ Тарас Ігнатавіч, н. у 1899 у в. Навадворцы, дзе і пражываў, брыгадзір к-са «1 Мая». Арыштаваны 8.3.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 21.6.1938 на 10 гадоў ППЛ, 5 гадоў п/п. Рэабілітаваны 20.3.1990.

ЯРАШЭНЯ Мацвей Мікітавіч, н. у 1895 у в. Малое Быкава, калгаснік к-са «Случ». Пражываў у в. Іграева. Арыштаваны 19.11.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 7.12.1937 да ВМП. Расстраляны 23.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЛЕНІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АТЛІВАНЧЫК Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1888 у в. Раманава (ц. Леніна). Рэпрэсіра-

2017@nasledie-sluck.by

ваны і адбываў пакаранне ў ППЛ (Рыбінскі р-н). Арыштаваны 14.2.1944 паўторна. Рэабілітаваны 9.9.1992.

БАРОДЗІЧ Варвара Сямёнаўна, н. у 1905 у в. Падлессе, машыністка Японскай ваеннай місіі. Пражывала ў Кітаі ў г. Харбін. Арыштавана 9.10.1946. Асуджана 11.1.1947 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана.

ВАНЬКОВІЧ Іосіф Якаўлевіч, н. у 1884 у в. Новыя Маргі, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 14.3.1938 за а/с агітацыю як член ПАВ. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 22.7.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ГАЎРУК Павел Фёдаравіч, н. у 1895 у в. Шалавічы, дзе і пражываў, рахункавод к-са «Звязда». Арыштаваны 19.10.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ГАХОВІЧ Юсцін, н. у 1868 у мяст. Пагост Слуцкага пав. (ц. Салігорскага р-на), протаіерэй. На момант арышту служыў у храме в. Раманава (ц. Леніна). Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 іншымі святарамі на 3 гады пазбаўлення права жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 18.7.1989.

ГОРБАЧ Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1881 у в. Шалавічы, архімандрыт. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. Настаяцель манастыра да 1922, потым служыў у царкве в. Трасцянец Мінскага р-на. Арыштаваны 5.4.1933 у Мінску за а/с агітацыю. Асуджаны 7.6.1933 са святарамі і манашкамі Мінскай епархіі на 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.6.1989.

ДРОБЫШ Якуб Ігнатавіч, н. у 1866 у в. Вынісцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Маргі. Арыштаваны 20.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ у Амурскай вобл. Рэабілітаваны 13.11.1964.

ЛЕМЕШ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1880 у в. Шалавічы, рабочы завода «Руба». Пражываў у Віцебскай вобл., пас. Руба. Арыштаваны 17.7.1937 за к/р агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ (г. Новасібірск). Памёр 9.7.1943. Рэабілітаваны 11.12.1958.

МАХЛАЙ Васіль Васільевіч, н. у 1905 у в. Раманава (ц. Леніна), змазчык дрэваапрацоўчага камбіната. Пражываў у Бабруйску. Арыштаваны 11.2.1935 за сувязь з польскімі разведорганамі. Справа прыпынена, вызвалены 11.3.1935. Рэабілітаваны 11.3.1935.

МАХЛАЙ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1918 у в. Раманава (ц. Леніна), студэнт Бабруйскага лесатэхнікума. Пражываў у Бабруйску. Арыштаваны 11.2.1935 як падазроны ў сувязі з польскімі разведорганамі. Справа прыпынена, вызвалены 11.3.1935. Рэабілітаваны 11.3.1935.

НОВІК Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1915 у в. Раманава (ц. Леніна), машыніст паравой машыны Капыльскага раймаслапрама. Пражываў у Капылі. Арыштаваны 7.7.1949 як здраднік. Асуджаны 28.9.1949 на 10 гадоў ППЛ, 5 гадоў паражэння ў правах. Вызвалены 11.12.1954. Рэабілітаваны 23.1.1976.

НЯРОНСКІ Антон Аляксандравіч, н. у 1873 у в. Кажушкі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.6.1930 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

НЯРОНСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. у 1903 у в. Кажушкі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 30.1.1931 за сувязь з к/р арганізацыяй. Асуджаны 7.2.1932 на 5 гадоў ППЛ, дзе памёр 9.6.1945. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РЫТВІНСКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1897 у в. Кажушкі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 26.7.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 7.2.1932 на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены ў 1935. Рэабілітаваны 31.5.1989.

СТОЦКІ Рыгор Сільвестравіч, н. у 1888 у в. Раманава (ц. Леніна), інжынер Мазырскай ЛПГ. Пражываў у Мазыры. Арыштаваны 26.3.1933 за шкодніцтва ў галіне лясной

2017©nasledie-sluck.by

гаспадаркі. Асуджаны 10.9.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 14.11.1955.

ТУРОВІЧ Міхаіл Дзянісавіч, н. у 1895 у в. Раманава (ц. Леніна), прыказчык лясной гаспадаркі купца Лімановіча. Пражываў у в. Аляхновічы Маладзечанскага р-на. Арыштаваны 29.10.1939 як агент польскай паліцыі. Асуджаны 25.1.1941 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.5.1963.

ТЭРАЎСКІ (Тэрраўскі, Цяраўскі) Уладзімір Васільевіч, н. 23.11.1871 у в. Раманава (ц. Леніна), беларускі харавы дырыжор, кампазітар, фальклярыст. (Больш падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 2. С. 492). У 1921 абвінавачаны ў а/с дзейнасці, арыштаваны, асуджаны да расстрэлу, які заменены 5-гадовым зняволеннем. У 1923 датэрмінова вызвалены. 17.8.1938 паўторна рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957.

УЛАСАВЕЦ Макар Ігнатавіч, н. у 1874 у в. Лапацічы, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Нявязцы. Арыштаваны 22.8.1937 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 22.11.1937 да ВМП. Расстраляны 29.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 10.3.1989.

ЦЯЦЕРСКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1902 у в. Раманава (ц. Леніна), настаўнік школы ў в. Пуцяты, дзе і пражываў. Арыштаваны 4.10.1945 як здраднік Радзімы. Асуджаны 13.3.1946 на 10 гадоў ППЛ, 5 гадоў п/п, з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ЦЯЦЕРСКІ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1891 у в. Раманава (ц. Леніна), настаўнік школы № 1 г. Віцебска, дзе і пражываў. Арыштаваны 1.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 19.11.1937 да ВМП. Расстраляны 30.11.1937. Рэабілітаваны 27.11.1962.

ЧАРНУШЭВІЧ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1886 у в. Кажушкі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Крушнікі. Арыштаваны 19.8.1930 як член шпіёнскай арганізацыі. Асуджаны 14.10.1930 на высылку. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШАРУПІЧ Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1894 у в. Раманава (ц. Леніна), начальнік чыгункі ст. Паздзееўка ў Ромненскім р-не Амурскай вобл. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 11.6.1998.

ШАРУПІЧ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1882 у в. Раманава (ц. Леніна), лесавод Плешчаніцкага райлясгаса. Пражываў у Плешчаніцах. Арыштаваны 23.8.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.12.1937. Пахаваны ў Оршы. Рэабілітаваны 18.8.1958.

ШАХЛЕВІЧ Іван Арцёмавіч, н. у 1874 у в. Шалавічы, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Падрэссе Старадарожскага р-на. Арыштаваны 17.2.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны на высылку (тэрмін не ўказаны). Рэабілітаваны 28.4.1989.

ШАХЛЕВІЧ Іван Мартынавіч, н. у 1888 у в. Шалавічы, дырэктар Языльскай НСШ. Пражываў у в. Языль Старадарожскага р-на. Арыштаваны 6.8.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 10.1.1938. Пахаваны ў Магілёве. Рэабілітаваны 30.12.1961.

ШАХЛЕВІЧ Рыгор Цярэнцьевіч, н. у 1893 у в. Шалавічы, дзе і пражываў, брыгадзір к-са «Звязда». Арыштаваны 19.9.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 9.11.1937 да ВМП. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 21.3.1989.

ШАХЛЕВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1903 у в. Падлессе, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 19.3.1933 як член к/р групоўкі. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 6.5.1989.

ШЫШКО Канстанцін Данілавіч, н. у 1891 у в. Раманава (ц. Леніна), селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Лабкоўшчына. Арыштаваны 18.3.1930 як член шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 14.10.1930 да высылкі. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШЫШКО Данііл Фёдаравіч, н. у 1855 на х. Лабкоўшчына, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.8.1930 як

2017@nasledie-sluck.by

член к/р шпіёнскай арганізацыі. Асуджаны 14.10.1930 на высылку. Рэабілітаваны 31.5.1989.

МАЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНОЎСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1885 у в. Клешава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930 як член банды за а/с дзейнасць. Асуджаны на высылку ў Сібір 18.4.1930. Рэабілітаваны 31.12.1960.

БРАНАВЕЦ Васіль Якаўлевіч, н. у 1892 у в. Хранова, дырэктар спіртзавода «Обаль». Пражываў у Сенненскім р-не Віцебскай вобл. Арыштаваны 16.11.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 16.1.1938. Рэабілітаваны 27.11.1958.

БРАНАВЕЦ Гаўрыла Васільевіч, н. у в. Хранова (ц. Ветка), дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны маяк». Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 7.6.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 19.7.1989.

БРАНАВЕЦ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1885 у в. Хранова (ц. Ветка), інвалід 3-й гр. Пражываў у в. Грозава. Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 15.12.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.4.1989.

БРАНАВЕЦ Пётр Цімафеевіч, н. у 1903 у в. Хранова (ц. Ветка), ветурач Чырвонаслабодскай райветлячэбніцы. Пражываў у Чырвонай Слабадзе. Арыштаваны 24.4.1933 як член а/с шпіёнскай арганізацыі ў сістэме жывёлагадоўлі БССР. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ (Сіблаг). Рэабілітаваны 21.8.1956.

ВЕЧАР Віктар Аляксандравіч, н. у 1911 у в. Шулякі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.11.1929 за к/р агітацыю. Асуджаны 20.1.1930 на 3 гады ППЛ (г. Котлас). Рэабілітаваны 16.5.1989.

ВЕЧАР Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1875 у в. Шулякі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.12.1929 за к/р агітацыю. Асуджаны 20.1.1929 на 3 гады высылкі (Архангельск). Рэабілітаваны 16.5.1989.

ВЕЧАР Сцяпан Паўлавіч, н. у 1892 у в. Шулякі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоная зорка». Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 24.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.3.1989.

ВІТКА Павел Лявонавіч, н. у 1883 у в. Швяды, калгаснік к-са «Прагрэс». Пражываў у в. Хранова (ц. Ветка). Арыштаваны 11.1.1931 за садзейнічанне ўкрывальніцтву забойства. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ (Белбалтлаг). Рэабілітаваны 31.10.1991.

ДУШЭЎСКАЯ Еўдакія Сцяпанаўна, н. у м. Грэск, калгасніца. Пражывала ў в. Дзюдзева (ц. Маяк). Арыштавана разам з дзецьмі: Галіна Іосіфаўна (1940 г. н., Слуцк), Алена Іосіфаўна (1930 г. н., Слуцк), Ігар Іосіфавіч (1940 г. н., Слуцк). Абвінавачваліся як члены сям'і здрадніка. Асуджаны 11.12.1946 на 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 3.4.1991, дзеці – 11.1.1996.

КОРЗУН Адам Мікалаевіч, н. у 1899 у в. Клешава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны Клешаў». Арыштаваны 18.9.1937 за шкодніцтва. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.2.1962.

КОРЗУН Антон Іванавіч, н. у 1888 у в. Клешава, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Дуброўка Слуцкага р-на. Арыштаваны 11.2.1930 як член а/с групы. Асуджаны 8.3.1930 на высылку (тэрмін не ўказаны). Рэабілітаваны 22.6.1989.

КОРЗУН Іван Касьянавіч, н. у 1893 у в. Клешава, урач Сенненскай бальніцы. Пражываў у г. Сянно Віцебскай вобл. Арыштаваны 15.11.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 6.12.1937 да ВМП. Расстраляны 20.12.1937. Пахаваны ў Оршы. Рэабілітаваны 19.5.1958.

КРУКОЎСКІ Антон Андрэевіч, н. у 1899 у в. Шулякі, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны ў жніўні 1938 за прыналежнасць да агентуры польскіх разведорганаў. Прыгавораны 30.9.1938 да ВМП. Расстраляны

2017@nasledie-sluck.by

9.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 19.5.1958.

ЛЯЎКОВІЧ Сцяпан Маркавіч, н. у 1888 у в. Шулякі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоная Зорка». Арыштаваны 18.3.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 19.5.1989. Паўторна арыштаваны 19.9.1937 як удзельнік банды Булак-Балаховіча. Асуджаны 3.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.2.1960.

МІСЬКО Аксіння Пятроўна, н. у 1902 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), дзе і пражывала, хатняя гаспадыня. Асуджана 15.11.1947 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 10.7.1991.

МІСЬКО Ганна Міхайлаўна, н. у 1944 у в. Дзюдзева (ц. Маяк). Асуджана 15.11.1947 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 10.7.1991.

МІСЬКО Емяльян Іванавіч, н. у 1892 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), калгаснік к-са «7-мы з'езд Саветаў». Пражываў у в. Карыцішчы Капыльскага р-на. Арыштаваны 5.11.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 30.12.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.3.1989.

МІСЬКО Іван Ануфрыевіч, н. у 1878 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), калгаснік. Пражываў у Старадарожскім р-не. Асуджаны 30.11.1937 за к/р агітацыю на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.11.1988.

МІСЬКО Іван Міхайлавіч, н. у 1928 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), дзе і пражываў, малатабоец к-са імя Кірава. Асуджаны 15.11.1947 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 10.7.1991.

МІСЬКО Марыя Міхайлаўна, н. у 1931 у в. Лапацічы, дзе і пражывала, не працавала. Асуджана 15.11.1947 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 10.7.1991.

МІСЬКО Міхаіл Савельевіч, н. у 1887 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), дзе і пражываў, каваль к-са імя Кірава. Асуджаны 15.11.1947 на 5 гадоў высылкі з канфіскацыяй маёмасці ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 10.7.1991.

МЯЦЕЛЬСКІ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1918 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), настаўнік НСШ у в. Навасёлкі. Пражываў у в. Навасёлкі Пухавіцкага р-на. Арыштаваны 25.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 27.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.9.1960.

МЯЦЕЛЬСКІ Антон Фёдаравіч, н. у 1905 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), выкладчык сельгастэхнікума ў п. Мар'іна Горка. Пражываў у м. Пухавічы Пухавіцкага р-на. Арыштаваны 19.2.1938 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны 29.9.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 23.7.1959.

МЯЦЕЛЬСКІ Сямён Іванавіч, н. у 1880 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Кірава. Арыштаваны 19.9.1937 за к/р агітацыю. Асуджаны 3.11.1937 на 10 гадоў ППЛ (Цюмень), дзе і памёр у 1939. Рэабілітаваны 15.4.1960.

ПІСАРЫК Дзмітрый Кузьміч, н. у 1897 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Кірава. Арыштаваны 19.9.1937 за к/р прапаганду. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Севвостоклаг). Памёр 28.1.1940. Рэабілітаваны 23.4.1960.

САНЬКО Фёдар Мітрафанавіч, н. у 1891 у в. Дзюдзева (ц. Маяк), заг. крамы. Пражываў у Віцебску. Арыштаваны 29.12.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 20.1.1938 да ВМП. Расстраляны 3.12.1957.

СЕРАДЗІНСКІ Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1894 у в. Шулякі, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоная зорка». Арыштаваны 18.3.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 19.5.1989.

СЕРАДЗІНСКІ Іосіф Мацвеевіч, н. у 1905 у в. Шулякі, ст. пісар 39-га кавалерыйскага палка. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 11.5.1931 за сувязь з польскімі агентамі. Асуджаны 7.2.1932 на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 13.5.1941. Рэабілітаваны 8.4.1958.

СКРЫДЛЕЎСКІ Георгій Паўлавіч, н. у 1883 у в. Хранова (ц. Маяк), дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны

2017@nasledie-sluck.by

29.12.1931 за а/с агітацыю. Асуджаны 3.9.1932 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1990.

СМОЛЬСКІ Канстанцін Феафілавіч, н. у 1883 у в. Шулякі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 19.5.1989.

ТАГАНОВІЧ Мацвей Дамінікавіч, н. у 1884 у в. Леткаўшчына, начальнік пошты. Пражываў у Паўлаўскай Слабадзе Істрынскага р-на Маскоўскай вобл. Арыштаваны. Рэабілітаваны.

ПАЎСТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНОЎСКІ Пётр Фацеевіч, н. у 1885 у в. Ліпнікі, рахункавод к-са імя Ягорава. Пражываў у в. Паўстынь. Арыштаваны 11.3.1933 як член к/р групы за а/с дзейнасць. Асуджаны 2.6.1933 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.8.1961.

ДРОБЫШ Васіль Андрэевіч, н. у 1892 у в. Ленькі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Заграддзе. Арыштаваны 28.3.1930. Асуджаны 15.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ЗАЯЦ Антон Адамавіч, н. у 1894 у в. Ленькі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Заграддзе. Арыштаваны 28.3.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 14.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ЗАЯЦ Васіль Аляксандравіч, н. у 1910, сталяр завода «Дрэваапрацоўчык». Пражываў у Мінску. Арыштаваны 5.11.1932 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.5.1933. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 18.7.1989

КОБЕЛЬ Міхаіл Венядзіктавіч, н. у 1908 у в. Заграддзе, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.6.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 14.1.1932 на 3 гады паражэння правоў. Рэабілітаваны 27.9.1989.

КОБЕЛЬ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1892 у в. Ленькі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Заграддзе. Арыштаваны 28.3.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 15.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 3.5.1989.

ЛАБКОВІЧ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1872 у в. Ленькі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Заграддзе. Арыштаваны 6.2.1938 за а/с агітацыю. Прыгавораны 14.2.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 19.4.1989.

ХАЎСТОВІЧ Мікіта Барысавіч, н. у 1908 у в. Паўстынь, дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Ягорава. Арыштаваны 11.3.1933 як член к/р групы. Асуджаны на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 26.8.1961.

ЧАРАТУН Мікалай Раманавіч, н. у 1891 у в. Паўстынь, дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Ягорава. Арыштаваны 11.3.1933 як член к/р групы. Асуджаны 2.6.1933 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў асобных месцах. Рэабілітаваны 26.8.1961.

ЯСІНСКІ Дамінік Міхайлавіч, н. у 1893 у в. Саўкова, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Заграддзе. Арыштаваны 28.3.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 15.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 3.5.1989.

ПЕРШАМАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКУЛОВІЧ Іван Усцінавіч, н. у 1910 у в. Кальчыцы, бухгалтар рыбснаба. Пражываў у Петрапаўлаўску-Камчацкім. Арыштаваны 3.5.1937. Асуджаны 19.3.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны.

БАРАНОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1895 у в. Таковішча, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930 за а/с агітацыю. Прыгавораны 26.2.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БАРАНОЎСКІ Іван Амбросьевіч, н. у 1895 у в. Таковішча, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 26.2.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Амбросьевіч, н. у 1892 у в. Таковішча, дзе і пражываў, селянін-

2017©nasledie-sluck.by

аднаасобнік. Арыштаваны 17.2.1930 за а/с агітацыю, як член к/р групы. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Венядзіктавіч, н. у 1899 у в. Хорашава, трактарыст Грэскай МТС. Пражываў у в. Апаліны. Арыштаваны 24.8.1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны 10.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 18.10.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ГУТКОЎСКІ Аляксандр Адамавіч, н. у 1894 у в. Таковішча, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930 як член к/р групы. Асуджаны 26.2.1930 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.12.1989.

ГУТКОЎСКІ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1913 у с. Кулікі, бухгалтар Мінскага абласнога зямельнага аддзела. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 17.12.1944 за пасобніцтва нямецкім акупантам. Асуджаны 25.4.1946 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.10.1959.

ГУТКОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у в. Забалаць Старадарожскага р-на, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Макавішча. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 24.8.1989.

ДУБОВІК Антон Лукіч, н. у 1906 у в. Навінкі, загадчык спецчасткі завода імя Молатава. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 19.4.1933 за шпіёнскую дзейнасць. Асуджаны 23.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ДУБОВІК Сцяпан Данілавіч, н. у 1897 у п. Астравок, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 23.8.1937 за хаванне замежнага шпіёна. Прыгавораны 10.11.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 27.7.1959.

ЗЯНЕВІЧ Антон Фёдаравіч, н. у 1892 у в. Баравая, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Сцяг Перамогі». Арыштаваны 4.10.1937 як член а/с арганізацыі. Прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.10.1989.

ЗЯНЕВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1899 у в. Баравая, вартаўнік канторы «Заготскот». Пражываў у в. Сліўка. Арыштаваны 7.12.1937 як член а/с групы, агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 23.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 18.8.1958.

ЗЯНЕВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1915 у в. Баравая, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Сцяг Перамогі». Арыштаваны 4.10.1937 як член а/с арганізацыі. Прыгавораны 2.11.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.11.1989.

КАЗАК Кандрат Ільіч, н. у 1911 у в. Кальчыцы, дзе і пражываў, настаўнік Кальчыцкай НСШ. Арыштаваны 2.12.1948. Асуджаны 24.6.1950 на 25 гадоў ППЛ, замена да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.8.1996.

КАРПОВІЧ Арсеній Арсенцьевіч, н. у 1896 у в. Жылін Брод, дзе і пражываў, калгаснік к-са «8 Сакавіка». Арыштаваны 19.9.1937 як дэзерцір і член к/р групы. Прыгавораны 14.10.1937 да ВМП. Расстраляны 24.10.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 29.6.1959.

КОБЕЛЬ Сцяпан Нічыпаравіч, н. у 1894 у в. Ленькі, брыгадзір к-са «Чырвоны гай». Пражываў у в. Строхава. Арыштаваны 18.9.1937 за падрыўную работу ў калгасе. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.12.1929.

КОРЗУН Казімір Фадзеевіч, н. у 1903 у в. Гольчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.9.1929 за сувязь з Польшчай. Асуджаны 5.3.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.7.1989.

КОРЗУН Фёдар Маркавіч, н. у 1886 у в. Апаліны, бухгалтар «Трэстбудматэрыял». Пражываў у Казані. Арыштаваны 22.12.1932 за паклёп на савецкі лад як былы афіцэр-калчакавец. Асуджаны 27.5.1933 на 3 гады высылкі ў Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 23.1.1960.

ЛАБКОВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1897 у в. Вынісцы, калгаснік к-са імя Варашы-

2017@nasledie-sluck.by

лава. Пражываў у в. Апаліны. Арыштаваны 6.1.1933 за а/с агітацыю. Прыгавораны 25.2.1933 да ВМП. Рэабілітаваны 18.12.1959.

ЛЯНЕВІЧ Іван Дзям'янавіч, н. у 1899 у в. Шантароўшчына, дзе і пражываў, калгаснік к-са «8 Сакавіка». Арыштаваны 7.1.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 21.3.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.7.1989.

ЛЯНЕВІЧ Фёдар Дзям'янавіч, н. у 1893 у в. Шантароўшчына, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.1.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 21.3.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.6.1989.

МАТУСЕВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1904 на х. Роўля, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны гай» (в. Строхава). Арыштаваны 4.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны.

МАТУСЕВІЧ Аляксандр Савельевіч, н. у 1901 на х. Роўля, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны гай» (в. Строхава). Арыштаваны 4.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.5.1989.

МАТУСЕВІЧ Антон Мацвеевіч, н. у 1897 у в. Жылінка, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Роўля. Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны.

МІХНЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1889 на х. Беразінец, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Палікараўка. Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны 11.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.4.1989.

МІХНЕВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1891 у п. Беразінец, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 11.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ПІСАРЫК Аркадзь Мартынавіч, н. у 1910 у в. Таковішча, дзе і пражываў. Арыштаваны 13.11.1933 як член а/с групы. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.8.1956.

ПІСАРЫК Мікалай Канстанцінавіч, н. у 1892 у м. Грэск, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Апаліны. Арыштаваны 6.9.1929 за а/с дзейнасць. Асуджаны 5.3.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.12.1989.

ПІСАРЫК Рыгор Мартынавіч, н. у 1906 у в. Таковішча, дзе і пражываў, рабочы. Арыштаваны 13.11.1933 як член а/с групы. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.8.1956.

РЫМАШЭЎСКІ Сцяпан Іванавіч, н. у 1899 у п. Копань, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 14.3.1930 на 10 гадоў ППЛ (Белбалтлаг). Вызвалены 10.4.1947. Рэабілітаваны 30.4.1989.

РЫТВІНСКІ Сцяпан Паўлавіч, н. у 1886 у в. Дуброўка, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 як член кулацкай групоўкі. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 5.3.1960.

РЫТВІНСКІ Эдуард Сцяпанавіч, н. у 1915 у п. Дуброўка, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.5.1933 як член кулацкай групоўкі. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 5.3.1960.

САКАЛОЎСКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1899 у в. Фадзееўка, дзе і пражываў. Арыштаваны 18.8.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.1.1964.

СЕМЯНОВІЧ Майсей Іванавіч, н. у 1896 у в. Агароднікі, настаўнік. Пражываў у в. Гольчычы. Арыштаваны 5.9.1929 за а/с дзейнасць. Асуджаны 5.3.1930 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1959.

ЦВІРКО Аляксандр Паўлавіч, н. у 1886 у в. Баравая, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Сыраводня. Арыштаваны 7.4.1930 за а/с агітацыю і садзейнічанне бандытам. Асуджаны на высылку. Рэабілітаваны 4.9.1989.

ЦВІРКО Аляксандр Пятровіч, н. у 1905 у в. Старэва, калгаснік к-са «Пралетарская рэвалюцыя». Пражываў у в. Гольчычы. Арыштаваны 24.6.1937 як член к/р арганізацыі, шкоднік і дыверсант.

2017@nasledie-sluck.by

Прыгавораны 14.10.1937 да ВМП. Расстраляны 24.10.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 23.2.1959.

ЦІШКЕВІЧ Мартын Станіслававіч, н. у в. Строхава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.5.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.5.1989.

ЧУЙКО Андрэй Самуйлавіч, н. у 1887 у в. Сярагі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Апаліны. Арыштоўваўся двойчы, 20.9.1930 за ўцёкі з месца высылкі. Прыгавораны 14.10.1930 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.8.1978.

ЧУЙКО Іван Андрэевіч, н. у 1912 у в. Апаліны, дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Варашылава. Арыштоўваўся двойчы, 22.9.1930 за ўцёкі з месца высылкі. Асуджаны 14.10.1930 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.8.1978.

ШЫЛОВІЧ Фёдар Фёдаравіч, н. у 1869 у в. Бярозаўка. Пражываў у в. Кальчыцы. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 27.11.1937 на 10 гадоў ППЛ, адбываў у Слуцкай турме, дзе памёр 16.7.1938. Рэабілітаваны 22.5.1989.

ШЫШКО Пілін Фёдаравіч, н. у 1867 у п. Навінкі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.8.1930 як член к/р шпіёнскай арганізацыі. Прыгавораны 14.10.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЮРЭВІЧ Аляксандр Канстанцінавіч, н. у 1902 на х. Гатны, дзе і пражываў, калгаснік к-са «8 Сакавіка» (калгас быў створаны на базе гаспадарак вёсак Шантароўшчына і Жылін Брод). Арыштаваны 18.9.1937 за к/р агітацыю. Прыгавораны 29.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 1.7.1961.

ЯНОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1890 у в. Кажушкі, цясляр к-са «8 Сакавіка». Пражываў у в. Шантароўшчына. Арыштаваны 18.9.1937 за к/р агітацыю. Прыгавораны 29.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 1.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 29.9.1960.

ПОКРАШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВОЛАТ Адам Казіміравіч, н. у 1893 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 19.9.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 4.6.1959.

ВОЛАТ Аляксандр Казіміравіч, н. у 1895 у в. Замосце, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 12.2.1960.

ВОЛАТ Антон Іосіфавіч, н. у 1899 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 4.11.1937. Прыгавораны 23.11.1937 да ВМП. Расстраляны 11.12.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ВОЛАТ Баляслаў Антонавіч, н. у 1898 у в. Замосце, радавы войска Беларускай рады. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 12.12.1920. Прыгавораны 31.1.1921 да ВМП. Расстраляны 2.2.1921. Рэабілітаваны 21.10.1992.

ВОЛАТ Дамінік Іосіфавіч, н. у 1875(?) у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930. Асуджаны на высылку. Працаваў старацелем у Амурскай вобл. на прыску «Майскі». Арыштаваны. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 20.3.1962.

ВОЛАТ Іосіф Казіміравіч, н. у 1886 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.9.1937. Прыгавораны 29.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 1.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 18.3.1960.

ВОЛАТ Іосіф Міхайлавіч, н. у 1899 у в. Замосце, дзе і пражываў, возчык леспрамгаса. Арыштаваны 4.11.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.12.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 15.2.1960.

ВОЛАТ Яраслаў Паўлавіч, н. у в. Рудня, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 31.12.1960.

2017©nasledie-sluck.by

ДРОБЫШ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1895 у в. Вынісцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Ануфравічы. Арыштаваны 6.4.1930 як член банды Булак-Балаховіча. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 5.6.1989.

ДРОБЫШ Антон Дамінікавіч, н. у 1886 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.8.1936 за а/с агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.11.1959.

ЗАЯЦ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1907 у в. Вынісцы, рабочы электрастанцыі. Пражываў у Бабруйску. Арыштаваны 19.12.1934. Рэабілітаваны 19.2.1935.

ЗАЯЦ Андрэй Адамавіч, н. у 1894 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.1.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЗАЯЦ Антон Васільевіч, н. у 1868 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.11.1937 за а/с дзейнасць. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ЗАЯЦ Антон Васільевіч, н. у 1897 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.12.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.7.1962.

ЗАЯЦ Антон Казіміравіч, н. у 1887 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны пуцілавец». Арыштаваны 11.1.1938. Прыгавораны 26.2.1938 да ВМП. Расстраляны 2.4.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЗАЯЦ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1894 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.3.1936 за к/р дзейнасць і агітацыю. Асуджаны 10.11.1936 на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.11.1959.

ЗАЯЦ Вікенцій Якаўлевіч, н. у 1905 у в. Вынісцы, дзе і пражываў. Арыштаваны 19.12.1934. Вызвалены у 1935. Рэабілітаваны 19.2.1935.

ЗАЯЦ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1872 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.12.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЗАЯЦ Павел Адамавіч, н. у 1894 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.8.1936 за к/р дзейнасць і агітацыю. Асуджаны 10.11.1936 на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.11.1959.

ЗАЯЦ Франц Казіміравіч, н. у 1880 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.11.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ (Севжелдорлаг). Рэабілітаваны 31.5.1989.

КАЗАК Антон Адамавіч, н. у 1897 у в. Рудня, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны Кастрычнік». Арыштаваны 15.6.1938 за а/с агітацыю. Прыгавораны 26.9.1938 да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 10.4.1989.

КАЗАК Антон Стэфанавіч, н. у 1878 у в. Рудня, дзе і пражываў. Арыштаваны 4.11.1937. Прыгавораны 9.12.1937 да ВМП. Расстраляны 22.1.1938. Пахаваны ў Слуцку.

КАЗАК Баляслаў Адамавіч, н. у 1898 у в. Рудня, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 31.12.1960.

КАЗАК Васіль Сцяпанавіч, н. у 1881 у в. Рудня, дзе і пражываў. Арыштаваны 6.9.1929 за сувязь з Польшчай, а/с дзейнасць. Асуджаны 5.3.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.7.1989.

КАЗАК Іосіф Іосіфавіч, н. у 1898 у в. Рудня, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 31.11.1960.

КАЗАК Людвіг Сцяпанавіч, н. у 1895 у в. Рудня, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны Кастрычнік». Арыштаваны 1.6.1933 за а/с агітацыю і шкодніцтва. Прыгавораны 17.3.1933 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 15.5.1959.

2017©nasledie-sluck.by

КАЗАК Мальвіна Васільеўна, н. у 1861 у в. Рудня, дзе і пражывала, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджана 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 29.6.1989.

КАЗАК Мартын Сцяпанавіч, н. у 1878 у в. Рудня (?), селянін-аднаасобнік. Пражываў у Томскай вобл., пас. Табога. Арыштаваны 22.2.1933 як член к/р польскай арганізацыі. Асуджаны 21.5.1933 на 5 гадоў высылкі. Рэабілітаваны ў маі 1961.

КАЗАК Франц Аляксандравіч, н. у 1895 у в. Рудня, дзе і пражываў. Арыштаваны 6.4.1930. Асуджаны на высылку. Рэабілітаваны 31.12.1960.

КАЗАК Франц Антонавіч, н. у 1907 у в. Рудня, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.9.1933 за шпіянаж на карысць Польшчы. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.6.1989.

КАЗАК Франц Мартынавіч, н. у 1899 у в. Рудня, ветсанітар к-са імя Дзяржынскага. Пражываў у Томскай вобл., с. Тагур. Арыштаваны 22.10.1937 як член ПАВ. Прыгаворан 14.12.1937 да ВМП. Расстраляны 8.1.1938. Рэабілітаваны 10.11.1958.

КАЛЯДА Андрэй Дамінікавіч, н. у в. Вынісцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.1.1934 як член а/с групы. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Памёр 9.1.1935. Рэабілітаваны 31.5.1989.

КАЛЯДА Віктар Васільевіч, н. у 1907 у в. Вынісцы, вартаўнік завода. Пражываў на ст. Ліхаборы Маскоўскай вобл. Арыштаваны 24.5.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 9.7.1932 на 2 гады ППЛ. Рэабілітаваны ў студзені 2002.

КАЛЯДА Сцяпан Сяргеевіч, н. у 1896 у в. Ануфрыевічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1935 за а/с агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

КАЛЯДА Ядвіга Казіміраўна, н. у в. Вынісцы, дзе і пражывала, калгасніца к-са «Барацьба». Арыштавана 6.12.1937. Прыгаворана 3.1.1938 да ВМП. Расстраляна 23.1.1938. Пахавана ў Слуцку. Рэабілітавана 20.5.1960.

КОБЕЛЬ Адам Дамінікавіч, н. у 1895 у в. Вынісцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.12.1933 як член а/с групы. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1965.

КОБЕЛЬ Кандрацій Андрэевіч, н. у 1871 у в. Ленькі, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Плюшнікі. Арыштаваны 17.2.1930 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 18.3.1930 на высылку. Рэабілітаваны 30.5.1989.

КОБЕЛЬ Павел Іосіфавіч, н. у 1876 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.12.1937 як член ПАВ. Прыгаворан да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 3.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

КОБЕЛЬ Сцяпан Сцяпанавіч, н. у 1900 у в. Ленькі. Арыштаваны ў 1933. Асуджаны ў 1933 на высылку ў Мурманск. Рэабілітаваны 26.7.2004.

ЛАБКОВІЧ Антон Францавіч, н. у 1914 в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.9.1940 за а/с агітацыю. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ, 3 гады п/п. Рэабілітаваны 13.7.1933.

ЛАБКОВІЧ Вікенцій Сямёнавіч, н. у в. Покрашава, настаўнік Каваліцкай школы. Пражываў у Старадарожскім р-не на х. Дуброўскія. Арыштаваны 10.9.1937 за раскрадание, як член ПАВ. Прыгаворан 17.11.1937 да ВМП. Расстраляны 27.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 14.4.1961.

ЛАБКОВІЧ Ганна Якаўлеўна, н. у 1902 у в. Вынісцы, сялянка-аднаасобніца. Пражывала на х. Язвін Бор. Арыштавана 3.4.1933 за падпал калгаснай пабудовы. Асуджана 7.6.1933 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітавана 15.8.1958.

ЛАБКОВІЧ Іван Адамавіч, н. у 1899 у в. Вынісцы, дзе і пражываў. Арыштаваны 6.12.1937 за к/р дзейнасць. Асуджа-

2017@nasledie-sluck.by

ны 8.10.1937 на 5 гадоў ППЛ (Усольлаг). Рэабілітаваны 6.5.1989.

ЛАБКОВІЧ Караліна Іосіфаўна, пражывала ў в. Ленькі, рэпрэсіравана ў 1930-я гг. з высылкай у Сібір. Рэабілітавана.

ЛАБКОВІЧ (ПАЎЛЮЧЭНКА) Марыя Фабіянаўна, н. у 1910 у в. Ленькі, дзе і жыла з бацькамі, сялянка. Рэпрэсіравана і выслана з бацькамі ў Сібір. Рэабілітавана 4.1.1993.

З успамінаў М.Ф. Лабковіч:

...Пагрузілі нас у таварняк і два тыдні везлі. Заехаў цягнік у Сібір. Тут усю нашу сям'ю раскідалі па розных месцах. Апынулася я сярод татар, кіргізаў і беларусаў. Усяго было каля сарака тысяч чалавек. Мужчыны валілі лес, жанчыны здзіралі з бярвенняў кару, рэзалі строга па патрэбных памерах і адпраўлялі. Наглядзелася я на здзекі, як паміралі і малыя і старыя. Аднойчы, згаварыўшыся з Вандай Чаеўскай, дзяўчынай з-пад Полацка, мы ўцяклі. Блукалі доўга па лясах і балотах, пакуль не выйшлі да чыгункі. Перасядалі з аднаго састава на другі – так і дабраліся да сваіх Ленечак. Хаты ўжо не было, надворных пабудоў – таксама. Свякі далі прытулак. А да раскулачвання мы жылі добра, бацькі былі працавітыя. Быў дом вялікі і прыгожы, гаспадарчыя пабудовы, гумно, варыўня, 3 кані, 5 кароў, 15 авечак, 4 свінні, птушка розная. Лішыліся ўсяго. Але якая была вялікая радасць, калі вярнулася маці – хутка пасля мяне.

Запісаў А. Жогла ў 2004 г.

ЛАБКОВІЧ Стэфан Вікенцьевіч, н. у 1885 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.4.1930 як член банды Булак-Балаховіча. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ЛАБКОВІЧ Сцяпан Адамавіч, н. у 1914 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.7.1940 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.10.1940 на 10 гадоў ППЛ, 5 гадоў п/п. Рэабілітаваны 4.8.1993.

ЛАБКОВІЧ Фабіян Карлавіч, пражываў у в. Ленькі, рэпрэсіраваны ў 1930-я гг. з поўнай канфіскацыяй маёмасці і высылкай усёй сям'і у Сібір. Там і памёр. Рэабілітаваны.

ЛАБКОВІЧ Ядвіга Рыгораўна, н. у 1901 у в. Вынісцы, сялянка-аднаасобніца. Пражывала на х. Язвін Бор. Арыштавана 3.4.1933 за падпал калгаснай пабудовы. Асуджана 7.6.1933 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітавана 15.8.1958.

ЛЕШЧАНКА Адам Людвігавіч, н. у 1894 у в. Замосце, калгаснік к-са «Пуцілавец». Пражываў у в. Покрашава. Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Памёр 28.9.1940. Рэабілітаваны 5.3.1960.

ЛЕШЧАНКА Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1899 у в. Замосце, дзе і пражываў. Калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 22.8.1938 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 11.10.1938 да ВМП. Расстраляны 31.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 15.11.1961.

ЛЕШЧАНКА Аляксандр Людвігавіч, н. у 1897 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 4.11.1989.

ЛЕШЧАНКА Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1876 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.6.1938 як член ПАВ. Прыгавораны 12.11.1938 да ВМП. Расстраляны 29.11.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ЛЕШЧАНКА Антон Антонавіч, н. у 1869 у в. Замосце, дзе і пражываў, цясляр. Арыштаваны 5.8.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 22.10.1937 да ВМП. Расстраляны 1.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 21.7.1958.

ЛЕШЧАНКА Антон Целясцінавіч, н. у 1885 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.1.1934 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1934.

ЛЕШЧАНКА Вікенцій Афанасьевіч, н. у 1908 у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.12.1933 як

2017©nasledie-sluck.by

член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЛЕШЧАНКА Іосіф Андрэевіч, н. у 1878 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны пуцілавец». Арыштаваны 12.1.1938 як член ПАВ за а/с агітацыю. Прыгавораны 14.2.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 13.3.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ЛЕШЧАНКА Іпаліт Адамавіч, н. у 1893 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930 як член к/р арганізацыі за а/с агітацыю. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 29.3.1962.

ЛЕШЧАНКА Іпаліт Адамавіч, н. у 1887 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.2.1930 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 18.3.1930 на высылку. Рэабілітаваны 30.5.1989.

І.А. Лешчанка (злева) з сям'ёй

ЛЕШЧАНКА Казімір Антонавіч, н. у 1883 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.1.1934 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЛЕШЧАНКА Марта Аляксандраўна, н. у 1918 у в. Замосце, дзе і пражывала, калгасніца к-са «Чырвоны будаўнік». Асуджана 1.3.1947 на 5 гадоў высылкі з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітавана 10.6.1991.

ЛЕШЧАНКА Мартын Андрэевіч, н. у 1868 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 4.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 28.11.1937 да ВМП. Расстраляны 5.12.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 31.3.1989.

ЛЕШЧАНКА Міканор Мартынавіч, н. у 1905 у в. Замосце, дзе і пражываў. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 13.5.1933 на 3 гады ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны 9.10.1992.

ЛЕШЧАНКА Міхаіл Пятровіч, н. у 1899 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 19.9.1937 за шпіянаж на карысць Польшчы. Прыгавораны 5.11.1937 да ВМП. Расстраляны 11.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 3.11.1988.

ЛЕШЧАНКА Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1891 у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.12.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЛЕШЧАНКА Нічыпар Мартынавіч, н. у 1905 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 4.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 28.11.1937 да ВМП. Расстраляны 11.12.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 6.7.1959.

ЛЕШЧАНКА Франц Паўлавіч, н. у 1896 у в. Рудня, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930 за а/с

2017©nasledie-sluck.by

агітацыю. Асуджаны на высылку. Рэабілітаваны 31.12.1960.

ЛЕШЧАНКА Юльян Мартынавіч, н. у 1903 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 16.12.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 21.1.1937 да ВМП. Расстраляны 28.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ЛЕШЧАНКА Язэп Казіміравіч, н. у 1915 у в. Покрашава, беларускі паэт (псеўданім Кавыль Міхась), вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме ў Мінску (1930–1933), член «Маладняка». Арыштаваны 23.2.1933 і асуджаны на 3 гады. Адбываў пакаранне на Далёкім Усходзе (4-е аддзяленне Дальлага). У кастрычніку 1935 датэрмінова вызвалены. (Гл. раздзел «Нарадзіліся на Случчыне» ў кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 475–476).

ЛЕШЧАНКА Яраслаў Адамавіч, н. у 1895 у в. Рудня, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Кастрычнік». Арыштаваны 4.11.1937 за шпіянаж. Прыгавораны 7.12.1937 да ВМП. Расстраляны 23.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ЛІСТАПАД Павел Сямёнавіч, н. у 1901 у в. Ленькі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.8.1936. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.11.1959.

МАКОЎСКІ Станіслаў Канстанцінавіч, н. у 1904 у в. Бабовішчы, дзе і пражываў, каваль к-са «Чырвоны пуцілавец». Арыштаваны 24.6.1937 за шпіянаж. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 18.1.1961.

МЯЦЕЛЬСКАЯ Ганна Фёдараўна, н. у 1917 у в. Ануфравічы, калгасніца к-са «Рассвет». Пражывала ў в. Хвастовічы Глускага р-на. Арыштавана 29.11.1944 за ўдзел у к/р кулацкай арганізацыі, здрадніцтва Радзіме. Асуджана на 8 гадоў ППЛ. Вызвалена. Рэабілітавана 24.8.1945.

МЯЦЕЛЬСКІ Якаў Макаравіч, н. у 1893 у в. Ануфравічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за к/р дзейнасць. Асуджаны на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 1.10.1989.

НЯМКОВІЧ Аляксей Рыгоравіч, н. у в. Ануфравічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Перамога». Арыштаваны 13.8.1938 за шпіянаж. Прыгавораны 8.10.1938 да ВМП. Рэабілітаваны 19.11.1997.

НЯМКОВІЧ Дзям'ян Ануфрыевіч, н. у 1891 у в. Ануфравічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1935 за а/с агітацыю. Асуджаны 11.9.1935 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ПАЗНЯКЕВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1892 у в. Замосце, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 20.3.1962.

ПАНЧКОЎСКІ Віктар Гаўрылавіч, н. у 1907 у в. Вынісцы, чорнарабочы. Пражываў у Бабруйску. Арыштаваны 18.7.1937 за ўдзел у к/р паўстанцкай арганізацыі. Прыгавораны 26.8.1937 да ВМП. Расстраляны 7.9.1937. Рэабілітаваны 12.9.1960.

ПАНЧКОЎСКІ Гаўрыла Якаўлевіч, н. у 1886 у в. Вынісцы, вартаўнік дрэваапрацоўчага к-та. Пражываў у Бабруйску. Арыштаваны 18.6.1937 за ўдзел у к/р паўстанцкай арганізацыі. Прыгавораны 26.8.1937 да ВМП. Расстраляны 7.9.1937. Рэабілітаваны 12.9.1960.

ПАНЧКОЎСКІ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1896 у в. Вынісцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.12.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Памёр 23.3.1938. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РАЧКОЎСКІ Сямён Мікалаевіч, н. у 1897 у в. Ануфравічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1935 за а/с агітацыю. Асуджаны 11.9.1935 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

САВІЦКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1904 у в. Паўлаўка, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Случ 1». Арыштаваны 24.8.1937 як агент

2017©nasledie-sluck.by

польскай разведкі. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 2.11.1960.

САНЬКО Лаўрэнцій Якаўлевіч, н. у 1876 у в. Ануфравічы, калгаснік. Пражываў у в. Лесапілка. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Цемлаг), дзе і памёр 23.12.1938. Рэабілітаваны 21.6.1989.

САНЬКО Нічыпар Цімафеевіч, н. у 1881 у в. Ануфравічы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Ляхаўка Любанскага р-на. Арыштаваны 29.9.1932 за а/с агітацыю. Асуджаны 8.12.1932 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.7.1965.

СТАТКЕВІЧ Палікарп Гаўрылавіч, н. у 1905 у в. Адамова, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Случ 1». Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.8.1989.

СУРМАЧЭЎСКІ Пётр Пятровіч, н. у п. Перавалока, дзе і пражываў, старшыня сельсавета. Арыштаваны 28.6.1921 за садзейнічанне бандытам. Прыгавораны 3.10.1921 да ВМП. Расстраляны 14.10.1921. Рэабілітаваны 29.10.1992.

ТАРАСЕВІЧ Адам Дзям'янавіч, н. у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны за а/с дзейнасць. Прыгавораны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 11.1.1990.

ТАРАСЕВІЧ Аляксандр Адамавіч, н. у 1888 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 17.12.1937 як член к/р арганізацыі. Прыгавораны 21.1.1938 да ВМП. Расстраляны 20.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ТАРАСЕВІЧ Аляксандр Дзям'янавіч, н. у 1898 у в. Замосце. Працаваў на прыіску «Малютка» Зейскага р-на Амурскай вобл. Асуджаны на 7 гадоў лагераў. Рэабілітаваны 25.10.1989.

ТАРАСЕВІЧ Ануфрый Адамавіч, н. у 1899 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Будаўнік». Арыштаваны 18.7.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 22.10.1937 да ВМП. Расстраляны 1.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 21.7.1958.

ТАРАСЕВІЧ Іпаліт Адамавіч, н. у 1886 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Будаўнік». Арыштаваны 11.11.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ (Карэлія). Рэабілітаваны 31.5.1989.

ТАРАСЕВІЧ Казімір Восіпавіч, н. у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны ў 1938 за шпіянаж, к/р прапаганду. Прыгавораны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 25.1.1961.

ФЕДАРОВІЧ Адам Антонавіч, н. у 1894 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 27.6.1938 як член ПАВ. Прыгавораны 25.9.1938 да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ФЕДАРОВІЧ Аляксандр Піліпавіч, н. у 1888 у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арышаваны 12.1.1938 як агент польскіх разведорганаў. Прыгавораны 29.3.1938 да ВМП. Расстраляны 25.4.1938. Рэабілітаваны 5.10.1959.

ФЕДАРОВІЧ Даменік Людвігавіч, н. у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 13.9.1938 за садзейнічанне польскім шпіёнам. Прыгавораны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 10.5.1989.

ФЕДАРОВІЧ Ілья Феліксавіч, н. у 1897 у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.4.1933 як член к/р арганізацыі за а/с агітацыю. Асуджаны 20.5.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 30.9.1961.

ФЕДАРОВІЧ Марыя Нічыпараўна, н. у 1907 у в. Покрашава, дзе і пражывала, калгасніца к-са «Пуцілавец». Арыштавана 6.1.1945 за а/с агітацыю. Асуджана 28.11.1945 на 15 гадоў ППЛ, 5 гадоў паражэння ў правах, канфіскацыя маёмасці. Вызвалена 16.10.1955. Рэабілітавана 16.11.1994.

2017©nasledie-sluck.by

ФЕДАРОВІЧ Міхаіл Антонавіч, н. у 1890 у в. Вынісцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.1.1934 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ФЕДАРОВІЧ Павел Паўлавіч, н. у 1883 у в. Покрашава, калгаснік к-са «Кастрычнік». Пражываў у в. Рудня. Арыштаваны 4.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 7.12.1937 да ВМП. Расстраляны 23.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 3.4.1989.

ФЕДАРОВІЧ Сямён Антонавіч, н. у 1885 у в. Покрашава, дзе і пражываў, рабочы спіртзавода. Арыштаваны 4.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 23.1.1938 да ВМП. Расстраляны 23.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 14.9.1959.

ФЕДАРОВІЧ Фларыян Міхайлавіч, н. у 1888 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 16.12.1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 21.1.1938 да ВМП. Расстраляны 28.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 5.10.1959.

ХАЦЬКО Аляксандр Карлавіч, н. у 1885 у в. Замосце, дзе і пражываў. Арыштаваны 11.3.1938 як член ПАВ. Прыгавораны 22.9.1938 да ВМП. Расстраляны 3.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 6.6.1989.

ХАЦЬКО Аляксандра Ануфрыеўна, н. у 1945 у в. Замосце, дзе і пражывала з маці. Асуджана 1.3.1947 як член сям'і здрадніка на 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 18.1.1996.

ХАЦЬКО Іосіф Казіміравіч, н. у 1895 у в. Замосце, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоны будаўнік». Арыштаваны 28.6.1938 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 25.9.1938 да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 25.5.1989.

ХРАМЦЭВІЧ Арцём Канстанцінавіч, н. у 1896 у в. Ануфравічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Перамога». Арыштаваны 11.7.1938 за шпіянаж на карысць Польшчы. Асуджаны 25.9.1938 на 10 гадоў ППЛ, дзе і памёр 29.3.1941. Рэабілітаваны 10.9.1959.

ЦВІРКО Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1874 у в. Адамова, дзе і пражываў. Арыштаваны 16.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.5.1989.

ЦВІРКО Арсеній Іпалітавіч, н. у 1894 у в. Адамова, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны 18.4.1930 на высылку. Рэабілітаваны 31.12.1960.

ЦВІРКО Зянон Рыгоравіч, н. у 1873 у в. Адамова, дзе і пражываў, брыгадзір к-са. Арыштаваны 4.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 14.5.1933 на 3 гады ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЦВІРКО Іосіф Георгіевіч, н. у в. Адамова, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.4.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны на высылку. Рэабілітаваны 31.12.1960.

ЦВІРКО Мацвей Іпалітавіч, н. у 1892 у в. Адамова, дзе і пражываў. Асуджаны 1.2.1930 як кулак на высылку ў Зейскі р-н Амурскай вобл. Рэабілітаваны 28.11.1999.

ЦВІРКО Уладзімір Іпалітавіч, н. у 1905 у в. Адамова, дзе і пражываў, брыгадзір к-са. Арыштаваны 4.4.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 14.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЦВІРКО Юльян Аляксандравіч, н. у 1906 у в. Адамова, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.7.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны 18.9.1930 на 3 гады ППЛ (Севвостоклаг). Рэабілітаваны 19.7.1989.

ЦІШКЕВІЧ Вікенцій Адамавіч, н. у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.4.1933 як член к/р арганізацыі за а/с агітацыю. Асуджаны 20.5.1933 на 3 гады ППЛ. Вызвалены ў 1934. Рэабілітаваны 30.9.1961.

ЦІШКЕВІЧ Іван Адамавіч, н. у 1895 у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 19.3.1933 як член к/р арганізацыі за а/с агітацыю. Асуджаны 20.5.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 30.9.1961.

2017©nasledie-sluck.by

ЦІШКЕВІЧ Іосіф Адамавіч, н. у 1897 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 19.9.1937 за шкодніцтва ў калгасе, а/с дзейнасць. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.3.1964.

ЦІШКЕВІЧ Іосіф Адамавіч, н. у 1896 у в. Покрашава, дзе і пражываў, селянін-адзіаасобнік. Арыштаваны 2.4.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.5.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 30.9.1961.

ЦІШКЕВІЧ Міхаіл Францавіч, н. у 1898 у в. Рудня, дзе і пражываў, селянін-адзіаасобнік. Арыштаваны ў верасні 1929, паўторна ў красавіку 1930 за а/с агітацыю, уцёк з месца высылкі. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.8.1978.

ЦІШКЕВІЧ Франц Паўлавіч, н. у 1866 у в. Рудня, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 29.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.5.1988.

ШКУРСКІ Сцяпан Адамавіч, н. у 1886 у в. Вынісцы, дзе і пражываў, селянін-адзіаасобнік. Арыштаваны 8.11.1933 як член к/р арганізацыі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШПАКОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1876 на х. Дзянісава, калгаснік к-са «Случ». Пражываў у в. Паўлаўка. Арыштаваны 4.11.1937 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 17.12.1937 да ВМП. Расстраляны 21.1.1938. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 9.1.1962.

ШПАКОЎСКІ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1879 у в. Дзянісава Капыльскага р-на, калгаснік. Пражываў у в. Паўлаўка. Арыштаваны 7.1.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 16.2.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ШЧАРБІЦКІ Антон Фёдаравіч, н. у 1875 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 13.3.1938 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 26.5.1938 да ВМП. Расстраляны 22.7.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ШЧАРБІЦКІ Вікенцій (Вінцусь) Іосіфавіч, н. у 1906 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 15.6.1938 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 26.9.1938 да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ШЧАРБІЦКІ Вітольд Іванавіч, н. у 1910 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 13.3.1938 як член ПАВ. Прыгавораны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 29.12.1959.

ШЧАРБІЦКІ Іосіф Браніслававіч, н. у 1911 у в. Покрашава, дзе і пражываў, шафёр к-са «Чырвоны камень». Арыштаваны 4.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 28.11.1937 да ВМП. Расстраляны. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 13.6.1962.

ШЧАРБІЦКІ Мацвей Іванавіч, н. у 1902 у в. Покрашава, дзе пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 16.11.1937 як удзельнік ПАВ за шпіёнскую дзейнасць. Прыгавораны 21.1.1938 да ВМП. Расстраляны 20.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ШЧАРБІЦКІ Палікарп Сцяпанавіч, н. у 1900 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 16.11.1937 як член ПАВ, агент польскай разведкі. Прыгавораны 21.1.1938 да ВМП. Расстраляны 20.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 13.7.1959.

ШЧАРБІЦКІ Стафан (Сцяпан) Адамавіч, н. у 1875 у в. Покрашава, калгаснік к-са «Кастрычнік». Пражываў у в. Рудня. Арыштаваны 5.11.1937 як член ПАВ. Прыгавораны 28.11.1937 да ВМП. Расстраляны 11.12.1937 Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ШЧАРБІЦКІ Франц Сцяпанавіч, н. у 1904 у в. Покрашава, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Пуцілавец». Арыштаваны 13.3.1938 як член ПАВ. Прыгавораны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

2017©nasledie-sluck.by

ШЧАРБІЦКІ Яраслаў Антонавіч, н. у 1909 у в. Покрашава, шафёр. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 20.6.1950 за супрацоўніцтва з ням. акупантамі. Асуджаны 5.9.1950 на 25 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены 18.5.1956. Рэабілітаваны 19.4.1956.

ЮРЭВІЧ Нікадзім Сцяпанавіч, н. у 1867 у в. Адамова, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Трэпет. Арыштаваны 12.12.1929 за к/р агітацыю. Асуджаны 13.2.1930 на 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 28.8.1989.

РАЧКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНОЎСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1893 у в. Танежыцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Кавержыцы. Арыштаваны 17.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 9.4.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.8.1989.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1897 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Майскі прамень». Арыштаваны 18.9.1937 як член банды Булак-Балаховіча, за а/с дзейнасць. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.3.1989.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1879 у в. Чайчыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.11.1929 за а/с агітацыю. Асуджаны 15.12.1929 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 14.8.1991.

БАРАНОЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1876 у в. Танежыцы, калгаснік к-са «Майскі прамень». Пражываў у в. Замошша Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 19.9.1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны 20.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 28.10.1937. Рэабілітаваны 10.4.1989.

БОГДАН Іван Антонавіч, н. у 1884 у в. Малышэвічы, дзе і пражываў, фельчар. Арыштаваны 18.4.1929. Прыгавораны 16.8.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 28.2.1992.

БОГДАН Фама Афанасьевіч, н. у 1850 у в. Рачкавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1930. Асуджаны 5.3.1930 на высылку. Рэабілітаваны 2.3.1965.

БОГДАН Якаў Антонавіч, н. у 1890 у в. Рачкавічы, саставіцель цягнікоў. Пражываў у Томску. Арыштаваны ў 1936. Вызвалены, прыпыненне справы.

БРАНАВІЦКАЯ Стэфаніда Іосіфаўна, н. у 1869 у в. Прошчыцы, хатняя гаспадыня. Пражывала ў в. Чапліцы. Арыштавана 7.1.1933 за а/с агітацыю. Асуджана 8.2.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітавана 28.9.1989.

БРАНАВІЦКІ Аркадзь Якаўлевіч, н. у 1870 у в. Танежыцы, рабочы. Пражываў у в. Чапліцы. Арыштаваны 29.1.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 9.4.1933 на 5 гадоў ППЛ, заменена на 5 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 5.12.1989.

БРАНАВІЦКІ Іосіф Сафронавіч, н. у 1879 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.1.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 5.3.1933 на 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 27.12.1989.

БРАНАВІЦКІ Сцяпан Сцяпанавіч, н. у 1865 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.2.1930 за а/с агітацыю. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 13.5.1989.

БРАНОЎСКІ Сямён Сафронавіч, н. у 1878 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.5.1929 за к/р агітацыю. Асуджаны 21.6.1929 на 3 гады высылкі (Томская вобл.). Рэабілітаваны 28.2.1992.

БРАНЯВІЦКІ Стэфан Юльянавіч, н. у 1893 у в. Танежыцы, планавік-эканаміст Ямскага будаўнічага камбіната. Пражываў у Ленінградскай вобл., ст. Ям. Арыштаваны 29.8.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 8.12.1937.

ВАЙТОВІЧ Цімафей Пятровіч, н. у 1896 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.2.1930 за а/с агітацыю. Асуджаны на высылку. Рэабілітаваны 8.11.1989.

2017©nasledie-sluck.by

ВЕЧАР Аляксандр Адамавіч, н. у 1916 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 31.10.1949 за шпіянаж на карысць Польшчы. Асуджаны 25.2.1950 на высылку ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 12.7.1989.

ВЕЧАР Аляксандр Іванавіч, н. у 1911 у в. Танежыцы, рабочы з-да «Авіяхім» у Маскве. Пражываў у Маскве. Арыштаваны 9.1.1933 за наўмыснае пашкоджанне дзяржаўнай маёмасці. Асуджаны на 1 год і 6 мес. ППЛ. Рэабілітаваны ў чэрв. 1995.

ВЕЧАР Андрэй Адамавіч, н. у 1899 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Майскі прамень». Арыштаваны 8.7.1938 як польскі шпіён. Прыгавораны 25.9.1938 да ВМП. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ВЕЧАР Іван Адамавіч, н. у 1909 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Майскі прамень». Арыштаваны 14.2.1950 як агент польскай разведкі. Асуджаны на 3 гады высылкі (Краснаярскі край). Рэабілітаваны 11.4.1958.

ВЕЧАР Палікарп Васільевіч, н. у 1892 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.5.1929 за к/р агітацыю. Асуджаны 4.6.1929 на 3 гады высылкі (Томская вобл.). Рэабілітаваны 23.2.1992.

ВЕЧАР Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1892 у в. Танежыцы, дзе і пражываў, калгаснік. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.5.1994.

ГАПАНОВІЧ Кандрат Гаўрылавіч, н. у в. Танежыцы, млынар завода «Чырвоная зара». Пражываў у в. Дараганава Старадарожскага р-на. Арыштаваны 22.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 23.9.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.4.1989.

ГАПАНОВІЧ Надзежда Рыгораўна, н. у 1914 у в. Танежыцы, дзе і пражывала, калгасніца к-са «Майскі прамень». Арыштавана 19.12.1944 за а/с агітацыю. Асуджана 20.9.1945 на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 27.2.1990.

ГАПАНОВІЧ Пётр Селіверставіч, н. у 1870 у в. Танежыцы, пражываў у с. Бушуйка Тындзінскага р-на Амурскай вобл. Арыштаваны, прыгавораны 28.6.1931 да ВМП. Рэабілітаваны.

ГАХОВІЧ Анатоль Мікалаевіч, н. у 1879 у в. Славіна, бухгалтар зубапратэзнай майстэрні. Пражываў у Мінску. Арыштаваны як агент польскай, нямецкай разведак. Прыгавораны 22.9.1938 да ВМП. Расстраляны 26.9.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ГІРЭЛЬ Антон Данілавіч, н. у 1888 у в. Бялевічы, загадчык Расонскага райлясгаса. Пражываў у м. Расоны Віцебскай вобл. Арыштаваны ў 1937 як агент польскай разведкі. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.2.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 12.10.1957.

ГІРЭЛЬ Васіль Васільевіч, н. у 1901 у в. Лядна, рабочы 11-га акалодка чыгункі. Пражываў у в. Васільчыцы Капыльскага р-на. Арыштаваны 11.9.1937 як член польскай дыверсійнай арганізацыі на чыгунцы. Прыгавораны 26.11.1937 да ВМП. Расстраляны 10.12.1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ЖЫДОК Іаан Якаўлевіч, н. у в. Бялевічы. У 1919–1921 у радах Чырвонай арміі. Псаломшчык, святар царквы ў в. Раманава (ц. Леніна). Арыштаваны 14.3.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 5 гадоў ППК. Рэабілітаваны 17.7.1989.

ЗАБРОДСКІ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1895 у в. Чапліцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.1.1933. Асуджаны 8.2.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.8.1989.

ЗАБРОДСКІ Павел Фёдаравіч, н. у 1898 у в. Замошша, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Карысць Старобінскага раёна. Асуджаны 3.11.1935 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 12.1.1966.

ЗАБРОДСКІ Пётр Мартынавіч, н. у 1890 у в. Замошша, дзе і пражываў, калгаснік к-са

2017©nasledie-sluck.by

«Чырвоны баец». Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (Севвостоклаг). Памёр у 1938. Рэабілітаваны 20.10.1989.

КОРЗУН Аляксандра Цімафееўна, н. у 1887 у п. Уздрышаў Старобінскага р-на, сялянка-аднаасобніца. Пражывала ў в. Танежыцы. Арыштавана за садзейнічанне ў шпіянажы. Асуджана 26.7.1929 на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана 21.2.1992.

КОРЗУН Рыгор Антонавіч, н. у 1888, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Танежыцы. Арыштаваны 7.5.1929 за к/р агітацыю. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Томскую вобл. Рэабілітаваны 28.2.1992.

САСНОЎСКІ Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1855 у в. Танежыцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Крыжы Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 24.11.1928 як член банды, за а/с дзейнасць. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.3.1992.

САСНОЎСКІ Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1895 у в. Танежыцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Крыжы Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 24.11.1928 як член банды. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.3.1992.

СЯЧКО Піліп Міхайлавіч, н. у 1892 у в. Танежыцы, нарыхтоўшчык сельпо. Пражываў у в. Ложнева Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.1.1959.

ТАРАСЕВІЧ Васіль Якаўлевіч, н. у 1886 у в. Балговічы Грэскага р-на, без пэўных заняткаў. Пражываў у в. Чапліцы. Арыштаваны 15.8.1938 за а/с агітацыю. Асуджаны 19.2.1939 на 10 гадоў ППЛ (г. Бабруйск). Рэабілітаваны 20.3.1990.

ЧЫГІР Рыгор Фёдаравіч, н. у 1888 у в. Рачкавічы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у п. Сталіна Чырвонаслабодскага р-на. Арыштаваны 10.1.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны 8.2.1933 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.8.1989.

ШНЭК Васіль Іванавіч, н. у 1899 у в. Лядна, дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Блюхера. Арыштаваны 23.8.1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны 24.9.1937 да ВМП, канфіскацыі маёмасці. Расстраляны 6.10.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 22.3.1989.

ШНЭК Георгій Сямёнавіч, н. у 1898 у в. Лядна, калгаснік. Пражываў у в. Сукоўчыцы Капыльскага р-на. Арыштаваны 28.6.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны 7.2.1932 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШНЭК Пётр Піліпавіч, н. у в. Бялевічы, дзе і пражываў. Арыштаваны 18.9.1937 за а/с дзейнасць. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.5.1991.

ШУБА-ЯБЛОНСКІ Васіль Мікалаевіч, н. у 1892 у в. Кавержыцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.5.1931 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЮРКЕВІЧ Іван Канстанцінавіч, н. у 1890 у в. Чапліцы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 22.3.1931 за а/с дзейнасць, уцёк з месца высылкі. Асуджаны 17.5.1931 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.6.1989.

ЮРКЕВІЧ Сцяпан Канстанцінавіч, н. у 1905 у в. Чапліцы, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Бялевічы. Арыштаваны 18.6.1930 за а/с дзейнасць, уцёк з месца высылкі. Прыгавораны да высылкі (тэрмін не ўказаны). Рэабілітаваны 10.11.1989.

ЮРКЕВІЧ Сямён Андрэевіч, н. у 1885 у в. Чапліцы, святар. Пражываў у в. Навасёлкі Капыльскага р-на. Арыштаваны 26.10.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.9.1989.

ЯКУБОВІЧ Васіль Сямёнавіч, н. у 1863 у в. Малышэвічы, дзе і пражываў. Арыштаваны 6.8.1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны 10.9.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 17.9.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны .

ЯКУБОВІЧ Георгій Афанасьевіч, н. у 1916 у в. Бялевічы, навучэнец ФЗВ № 214

2017©nasledie-sluck.by

г. Ленінграда. Арыштаваны 30.12.1932 за садзейнічанне ў шпіёнскай дзейнасці. Асуджаны 29.4.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ЯКУБОВІЧ Леанід Іванавіч, н. у 1883 у в. Малышэвічы, кродытор Макушынскага аддзялення Дзяржбанка Курганскай вобл. Арыштаваны 17.1.1938 за а/с агітацыю. Памёр у турме 29.5.1939. Рэабілітаваны 25.2.1992.

ЯКУБОВІЧ Надзежда Афанасьеўна, н. у 1908 у в. Бялевічы, дзе і пражывала, калгасніца к-са «Воля». Арыштавана 20.12.1932 за садзейнічанне ў шпіёнскай дзейнасці. Асуджана 29.4.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітавана 23.6.1989.

ЯКУБОВІЧ Уладзімір Афанасьевіч, н. у 1899 у в. Бялевічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Воля». Арыштаваны 27.12.1932 за садзейнічанне ў шпіёнскай дзейнасці. Асуджаны 29.4.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ЯКУБОВІЧ Хрысціна Сцяпанаўна, н. у 1868 у в. Бялевічы, дзе і пражывала, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 20.12.1932 за садзейнічанне ў шпіёнскай дзейнасці. Асуджана 29.4.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітавана 23.6.1989.

ЯРМАК Сцефаніда (Сцепаніда) Міхайлаўна, н. у в. Бялевічы, калгасніца к-са в. Ракінь Чырвонаслабодскага р-на, дзе і пражывала. Арыштавана 18.11.1937 за шпіянаж на карысць польскай разведкі. Прыгавораная 17.12.1937 да ВМП. Расстраляна 21.1.1938. Пахавана ў Слуцку. Рэабілітавана 12.4.1963.

ЯРОНСКІ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1893 у в. Малышэвічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са «Чырвоная зара». Арыштаваны 23.8.1937 за а/с агітацыю. Прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 19.10.1959.

СОРАГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БЕЛАЗАРОВІЧ Елізавета Антонаўна, н. у 1887 у в. Нізок Уздзенскага р-на, сялянка-аднаасобніца. Пражывала ў в. Рыжыца. Арыштавана 3.6.1933 за а/с агітацыю, шкодніцтва. Асуджана 29.6.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 21.12.1989.

ЗАБЕЛА Андрэй Сямёнавіч, н. у 1899 у в. Рыжыца, калгаснік к-са «Зрух». Пражываў у в. Мелітонава. Арыштаваны 5.6.1933 за а/с дзейнасць. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.12.1989.

ЗЯНЕВІЧ Пётр, н. у в. Сорагі, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны ў 1930-я гг. Далейшы лёс невядомы.

МІНЧЭНЯ Павел Іванавіч, н. у 1903 у в. Горкі Старадарожскага р-на, калгаснік к-са «Зрух». Пражываў у в. Мелітонава. Арыштаваны 5.6.1933 за а/с агітацыю, шкодніцтва. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.12.1989.

НАРУЦКІ Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1874 у в. Волашава, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за к/р дзейнасць. Асуджаны 10.3.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 27.12.1989.

НЯРОНСКІ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1895 у в. Сорагі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Трубяціна Любанскага р-на. Арыштаваны 17.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 5.4.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.5.1989.

РЫМАШЭЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1912 у в. Сорагі, дзе і пражываў, бухгалтар сельсавета. Арыштаваны 19.9.1937 за а/с прапаганду. Прыгавораны 10.11.1937 да ВМП. Расстраляны 16.11.1937. Пахаваны ў Бутаве Маскоўскай вобл. Рэабілітаваны ў лютым 1990.

СТАСЕВІЧ Ігнацій Конанавіч, н. у 1879 у в. Рыжыца, рабочы прыіску «Бриакан». Пражываў у п. Вясенні Кербінскага р-на Хабараўскага края. Арыштаваны 15.11.1937. Прыгавораны 2.3.1938 да ВМП. Расстраляны 7.4.1938. Пахаваны ў г. Нікалаеўск-на-Амуры. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЯЎРУК Андрэй, н. у в. Сорагі, дзе і пражываў, селянін. Арыштаваны ў лю-

2017@nasledie-sluck.by

тым 1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.12.1959.

СЯЎРУК Сяргей Ігнатавіч, н. у в. Волашава, дзе і пражываў, селянін. Асуджаны ў 1938 і прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯЛЬНІЦКІ Канстанцін Рыгоравіч, н. у 1899 у в. Рыжыца, нач. станцыі Татарка Заходняй чыгункі. Пражываў на ст. Татарка. Арыштаваны 21.5.1933 за а/с агітацыю. Вызвалены 21.9.1933. Рэабілітаваны 21.9.1933.

СЯРАЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНЦЫПОВІЧ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1905 у в. Бранавічы, вышэйшая адукацыя, навуковы супрацоўнік Горацкай с/г акадэміі. Пражываў у Магілёўскай вобл., г. Горкі. Арыштаваны 2.9.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.5.1956.

АНЦЫПОВІЧ Анастасія Сцяпанаўна, н. у 1924 у в. Бранавічы, дзе і пражывала, настаўніца Лучнікоўскай школы. Арыштавана 8.10.1944. Асуджана 28.7.1945 на 5 гадоў ППЛ, вызвалена 16.9.1949. Рэабілітавана 25.2.1981.

АНЦЫПОВІЧ Андрэй Навумавіч, н. у 1877 у в. Бранавічы, настаўнік. Працаваў і жыў у м. Беразіно Мінскай вобл. Арыштаваны 12.9.1933. Асуджаны 14.11.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.11.1987.

АНЦЫПОВІЧ Георгій Каленікавіч, н. у 1894 у в. Бранавічы, калгаснік к-са «Рассвет камуны». Пражываў у в. Агароднікі. Арыштаваны 30.12.1944. Асуджаны 12.11.1945 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.9.1966.

АНЦЫПОВІЧ Міхаіл Гаўрылавіч, н. у 1887 у в. Бранавічы, калгаснік к-са «15 гадоў Кастрычніка». Пражываў у п. Камень Старобінскага р-на. Арыштаваны 19.9.1937. Прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 16.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 14.4.1989.

АНЦЫПОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1878 у в. Бранавічы, дзе і пражываў, калгаснік к-са імя Молатава. Арыштаваны 19.11.1937. Асуджаны 27.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.4.1989.

АМБРАЖЭВІЧ Андрэй Мартынавіч, н. у 1835 у в. Сярагі, дзе і пражываў, вознік арцелі інвалідаў «Чырвоная зорка». Арыштаваны 12.10.1937 за сувязь з польскай жандармерыяй. Прыгавораны 13.11.1937 да ВМП. Расстраляны 24.11.1937. Пахаваны ў Слуцку. Рэабілітаваны 30.4.1989.

АМБРАЖЭВІЧ Георгій Мартынавіч, н. у 1899 у в. Сярагі, селянін-аднаасобнік. Пражываў у пас. Вішнёўка Слуцкага р-на. Арыштаваны 30.1.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 1.10.1937 на 10 гадоў ППЛ, вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны 14.5.1964.

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1884 у в. Чарнагубава Бабруйскай акр. Пражываў у п. Манькова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.2.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны 8.3.1930 на высылку (тэрмін не ўказаны). Рэабілітаваны 22.6.1989.

БАРАНОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1894 у п. Манькова, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.2.1930 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 8.3.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 22.6.1989.

БАРАНОЎСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1898 у п. Манькова, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930 за а/с дзейнасць. Прыгавораны 8.3.1930 да ВМП. Рэабілітаваны 22.6.1989.

БАРАНОЎСКІ Павел Данілавіч, н. у 1876 у в. Альшанка Чырвонаслабодскага р-на, селянін-аднаасобнік. Пражываў у п. Манькова. Арыштаваны 8.3.1930 за а/с дзейнасць. Асуджаны на высылку (тэрмін не ўказаны). Рэабілітаваны 22.6.1989.

ВАЛЕТКА Фёдар Арцёмавіч, н. у 1890 у в. Варкавічы, нач. метэастанцыі Тансык. Пражываў ва Усходне-Казахстанскай вобл., ст. Тансык. Арыштаваны 19.6.1940. Асуджаны на 4 гады ППЛ. Рэабілітаваны 25.5.1972.

ГУСАК Арсенцій Пракопавіч, н. у 1903 у в. Сярагі, калгаснік к-са «Чырвонае Ражнова»

2017©nasledie-sluck.by

Вяземскага р-на Смаленскай вобл. Арыштаваны 20.12.1935. Асуджаны 9.7.1936 на 2 гады пазбаўлення волі. 29.3.1938 зноў арыштаваны. Прыгавораны 28.5.1938 да ВМП. Расстраляны 28.5.1938. Рэабілітаваны 11.11.1957; 3.4.1991.

ДУБАЛЕКА Хрысанф Лаўрэнцьевіч, н. у 1900 у в. Лучнікі, дзе і пражываў, старшыня калгаса «Шлях Саветаў» (потым к-с «Ленінскі шлях»). Расстраляны ў 1933. Рэабілітаваны.

ІВАНОВІЧ Прохар Іванавіч, н. у 1887 у в. Бранавічы, дзе і пражываў, селянін, староста царквы. Арыштаваны 17.5.1933 з 20 святарамі Слуцкага вікарыяцтва. Асуджаны 9.6.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 17.7.1989.

КАХАНОВІЧ Міхаіл Ільіч, н. у в. Бранавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930-я гады з канфіскацыяй маёмасці. Адпраўлены на будаўніцтва Маскоўскага канала. Рэабілітаваны.

КЛЕВАНОВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1897 у в. Варкавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.12.1932 за а/с дзейнасць. Асуджаны 16.2.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.5.1989.

КЛЕВАНОВІЧ Сямён Мікалаевіч, н. у 1876 у в. Лучнікі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 10.11.1933 як агент польскай разведкі. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў ППЛ (заменена высылкай на Белбалткамбінат). Вызвалены ў 1936. Рэабілітаваны 23.6.1989.

КОРЗУН Фёдар Міхайлавіч, н. у 1892 у в. Лучнікі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 11.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 26.12.1989.

КРЫВАДУБСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1891 у в. Бранавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.1.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 7.7.1937 на 3 гады ППЛ, 3 гады п/п (Сіблаг). Рэабілітаваны 22.12.1989.

КРЫВАДУБСКІ Ігнат Ігнатавіч, н. у в. Бранавічы. Арыштаваны 14.3.1933 за а/с агітацыю і як член к/р арганізацыі. Асуджаны на 3 гады ППК. Арыштаваны зноў у 1938. Прыгавораны 13.11.1938 да ВМП. Рэабілітаваны 17.7.1989.

КРЫВАДУБСКІ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1888 у в. Бранавічы, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933 за а/с агітацыю. Асуджаны 10.5.1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ЛІСТАПАД Ксенафонт Емяльянавіч, н. у 1897 у в. Варкавічы, калгаснік к-са «Уперад». Пражываў у в. Захараўка Слуцкага р-на. Арыштаваны 19.9.1937. Асуджаны 19.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.3.1989.

ЛІСТАПАД Мікіта Сяргеевіч, н. у 1894 у в. Лучнікі. Пражываў у г. Кізел Уральскай вобл. Арыштаваны 2.11.1930. Асуджаны 23.11.1930. Справа спынена, вызвалены.

ЛІСТАПАД Пётр Іванавіч, н. у 1898 у в. Варкавічы, аграном Слуцкай міжраённай насенняводчай канторы. Пражываў у Слуцку. Арыштаваны 23.4.1933. Асуджаны 8.5.1933 на 3 гады высылкі ў Тэльманскі р-н, пас. № 24 Карагандзінскай вобл. Арыштаваны 19.4.1935. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.7.1958; 18.11.1992.

МАГЛЫШ Навум Дзмітрыевіч, н. у 1893 у в. Варкавічы, настаўнік Чапельскай школы. Пражываў у в. Чапялі Старобінскага р-на. Арыштаваны 13.9.1929 за а/с агітацыю. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 13.7.1989.

ПАДЛІПСКІ Прохар Сцяпанавіч, н. у 1884 у в. Сярагі, паліцыянт польскай паліцыі. Пражываў у Слуцку на новым пляцы дома Рагачоўскага. Арыштаваны 24.7.1920. Прыгавораны 26.7.1920 да ВМП за службу ў польскай паліцыі. Рэабілітаваны 20.7.1992.

ПАДЛІПСКІ Самуіл Іванавіч, н. у в. Лучнікі, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны, сасланы на будаўніцтва Беламорканала. Рэабілітаваны.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1886 у в. Бранавічы, дзе і пражываў, брыгадзір

2017©nasledie-sluck.by

к-са імя Молатава. Арыштаваны 24.8.1937 за шкодніцтва. Асуджаны 27.11.1937 на 10 гадоў ППЛ (Волгалаг). Рэабілітаваны 21.3.1989.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Сцяпан Сямёнавіч, н. у в. Бранавічы, дзе і пражываў, супрацоўнік міліцыі г. Слуцка. Рэпрэсіраваны ў 1930-я г. Рэабілітаваны.

ПРАЖОГА Канстанцін Георгіевіч, н. у 1908 у в. Лучнікі, загадчык Ганцавіцкай райбальніцы. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 20.11.1944, трапіў у палон да немцаў. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.11.1992.

ПЯТРОВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1881(82) у в. Бранавічы, селянін. Арыштаваны 21.2.1931. Асужданы 26.3.1931 за а/с агітацыю на 1 год ППК. Пасля вызвалення служыў у прыпісной царкве ў Асіповічах. Зноў арыштаваны і асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.9.1963; 3.11.1989.

ПЯТРОВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1881 у в. Бранавічы, дзе пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 21.2.1931 за а/с агітацыю. Асуджаны 26.3.1931 на 1 год ППЛ. Рэабілітаваны 3.11.1989.

РАМАНОВІЧ Анастасія Прохараўна, н. у 1910 у в. Бранавічы, дзе і пражывала, хатняя гаспадыня. Арыштавана 8.10.1944 за а/с дзейнасць. Асуджана 1.4.1946 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 26.6.1990.

САВАНОВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1883 у в. Лучнікі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.3.1933. Асуджаны 10.5.1933 на 5 гадоў ППЛ, адпраўлены на будаўніцтва Беламорканала. Рэабілітаваны 30.5.1989.

СЦЕПАНОВІЧ Дзмітрый Трафімавіч, н. у 1902 у в. Варкавічы, дзе і пражываў, рабочы млына «Прагрэс» у Слуцку. Арыштаваны 20.10.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 24.10.1937 на 10 гадоў ППЛ (г. Нарыльск). Рэабілітаваны 30.6.1961.

ФЕДАРОВІЧ Аляксей Іванавіч, н. у 1881 у в. Лучнікі, аднаасобнік. Пражываў у г. Асіповічы Магілёўскай вобл. Арыштаваны 6.8.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.10.1989.

ФЕДАРОВІЧ Яўхім Іванавіч, н. у 1878 у в. Лучнікі, працаваў выканаўцам у «Дальгандаль». Пражываў у г. Благавешчанск. Асуджаны 3.4.1932 на высылку ў Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 18.10.1990.

ЧУЙКО Канстанцін Мікітавіч, н. у 1874 у в. Сярагі, святар царквы ў с. Ільіно Вяземскага р-на Смаленскай вобл., дзе і пражываў. Арыштаваны 29.10.1937. Прыгавораны 20.11.1937 да ВМП. Расстраляны 2.12.1937. Рэабілітаваны 28.9.1957.

ЧУЙКО Сяргей Канстанцінавіч, н. у 1910 у в. Сярагі, студэнт інстытута Савправа. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 19.9.1935 за а/с агітацыю сярод студэнтаў. Асуджаны 4.11.1935 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.8.1956.

ЧУЙКО Фёдар Мікалаевіч, н. у 1902 у в. Сярагі. Пражываў у г. Аральск Кзыл-Ардзінскай вобл. Арыштаваны 8.12.1933. Асуджаны 22.5.1934. Справа была прыпынена. Рэабілітаваны 3.9.1999.

ШАХНОВІЧ Аляксей Пятровіч, н. у 1888 у в. Лучнікі, дзе і пражываў, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 за а/с агітацыю. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ШАХНОВІЧ Максім Лявонцьевіч, н. у 1887 у в. Сярагі, дзе і пражываў, селянін. Асуджаны ў 1934 на 10 гадоў ППЛ. Пакаранне адбываў на будаўніцтве Беламорканала. Тэрмін пакарання быў зніжаны да 5 гадоў. Рэабілітаваны.

ШКЛЯРЭЎСКІ Міхаіл Мікітавіч, н. у 1870 у в. Варкавічы, селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Вешы. Арыштаваны 27.6.1938 як агент польскай разведкі. Прыгавораны 25.9.1938 да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ШПАКОЎСКІ Лявонцій Раманавіч, н. у 1914 у в. Лучнікі, настаўнік Чэрыкаўскай СШ.

2017©nasledie-sluck.by

Пражываў у г. Чэрыкаў Магілёўскай вобл. Арыштаваны 29.9.1937 за а/с прапаганду і агітацыю. Асуджаны 2.11.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.10.1939.

ШЫБАЛОВІЧ Іван Савельевіч, н. у 1885 у в. Бранавічы. Пражываў у Карагандзінскай вобл. Арыштаваны 9.10.1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 24.5.1989.

ШЫБАЛОВІЧ Міхаіл Хрыстафоравіч, н. у 1913 у в. Бранавічы, грузчык на таварнай станцыі чыгункі. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 5.11.1932 за неданясенне аб шпіёнскай дзейнасці. Асуджаны 10.4.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ЯРОТА Васіль Георгіевіч, н. у 1894 у в. Сярагі, дарожны майстар 3-га акалодка Зах. чыгункі ст. Калодзішчы, дзе і пражываў. Арыштаваны 19.7.1938 за шпіянаж, шкодніцтва. Прыгавораны 7.10.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 17.11.1938. Пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны 15.9.1964.

НЕКАТОРЫЯ СКАРАЧЭННІ

АА НКУС – асобы аддзел народнага камісарыята ўнутраных спраў
а/с – антысавецкі (ая)
Белбалтлаг – Беламорска-Балтыйскі ППЛ (ст. Мядзведжая Гара)
БНЦ – Беларускі нацыянальны цэнтр
ВМП – вышэйшая мера пакарання
Волгалаг – Волжскі ППЛ і будаўніцтва гідратэхнічных вузлоў (Яраслаўская вобл., г. Рыбінск)
Дальлаг – Далёкаўсходні ППЛ (г. Хабараўск)
к/р – контррэвалюцыйны (ая)
к-са – калгаса
м. – мястэчка
п. – пасёлак
ПАВ – польская арганізацыя вайсковая
Печлаг – Пячорскі ППЛ (г. Пячора)
п/п – паражэння правоў, права перапіскі
ППК – папраўча-працоўная калонія
ППЛ – папраўча-працоўны лагер
Рыблаг – Рыбінскі ППЛ (Рыбінск)
Севвостоклаг – Сібірскі ППЛ (г. Магадан)
Ухтпечлаг – Ухціна-Пячорскі ППЛ (Комі АССР, пас. Чыб'ю)
ц. – цяпер
Цемлаг – Цемнікаўскі ППЛ (Мардоўская вобл., Цемнікаўскі р-н)

Спісы складзены на падставе фондаў ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей» і www.lists.memo.ru

Падрыхтавалі В.С. Відлога, І.І. Васілевіч.

О раскулачивании на Слутчине (Из истории застенка Працевичи) З успамінаў А.А. Новіка, былога партызана і настаўніка

К 27 июня мы были уже в районе наспех подготовленной линии обороны Омговичи – Калита – Уречье. Подразделение, которым я командовал, занимало позицию южнее Уречья. А в 15–20 км от него – родная деревня Волошево и престарелые родители. На линии обороны, которую организовал полковник Тутаринов, мы продержались недолго. Потом были Мозырь, форсирование Припяти, большая потеря людей в районе п. Прилуки, где две недели выходили из окружения…».

Раніцай 26 чэрвеня рубеж абароны Слуцка праходзіў па рацэ Лакнеі паміж вёскамі Бязверхавічы і Агароднікі, за пяць кіламетраў на захад ад Слуцка. Але пасля атакі варожай авіяцыі і танкавай, вораг прарваў абарону 55-й стралковай дывізіі. Перад самым ужо горадам на яго заходнім ускрайку фашыстаў спыніў мотастралковы полк 30-й танкавай дывізіі палкоўніка С.І. Багданава. Кароткім быў загад камандзіра: «Задержать врага на сутки до прихода наших частей, дать им возможность занять оборону». Гітлераўцы кінулі на часці 30-й дывізіі 12 танкаў, некалькі бронетранспарцёраў, за імі ішлі аўтаматчыкі. Каля самага Слуцка пачаўся бой. Савецкія танкі, што стаялі ў засадзе, далі агонь па ворагу. Загарэліся два нямецкія танкі, потым былі падбіты яшчэ тры. Чырвонаармейцам удалося адсекчы нямецкую пяхоту ад танкаў. Атака была адбіта. Тры разы гітлераўцы атакавалі нашы пазіцыі і адыходзілі назад. Вялікія страты панеслі тут гітлераўцы, але і ў 30-й танкавай дывізіі таксама былі велізарныя страты. Камандаванне адвяло яе на ўсход ад Слуцка, выставіўшы на заходняй ускраіне горада два атрады 14-га механізаванага корпуса.

26 чэрвеня з 11 гадзін раніцы нямецкія танкі і бронетранспарцёры з салдатамі паказаліся на заходняй ускраіне Слуцка. На вуглу вуліц Пралетарская і Валадарскага яны былі сустрэты адважнымі савецкімі воінамі. (Падрабязна гл. ў кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён». Т.1. С. 303–304).

Генерал-палкоўнік 2-й танкавай групы Г. Гудэрыян паспяшыў далажыць у Генеральны штаб сухапутных войскаў

Гітлераўцы вядуць агонь па Слуцку. Чэрвень 1941 г.

2017©nasledie-sluck.by

Германіі, што 26 чэрвеня ў 14 гадзін 15 хвілін Слуцк узяты часцямі яго 3-й танкавай дывізіі. Але гэта было не так. На працягу ўсяго дня 26 чэрвеня фашысцкая 3-я танкавая дывізія пры падтрымцы авіяцыі некалькі разоў атакавала савецкія войскі ў Слуцку, але горад захапіць не змагла. Толькі раніцай 27 чэрвеня нашы войскі адступілі і гітлераўцы поўнасцю захапілі горад.

Да 10 ліпеня нямецкая армія прасунулася на заходнім напрамку на глыбіню 450–600 км, захапіла амаль усю Беларусь. Становішча на тэрыторыі рэспублікі ў час абарончых баёў складвалася няпростае. Былі разбураны вузлы сувязі і транспарту, многія прадпрыемствы, склады і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці. Па дарогах рухаліся сотні бежанцаў і калоны адступаўшых воінаў Чырвонай арміі. Сярэднясутачная колькасць загінуўшых і параненых савецкіх воінаў на беларускай зямлі складала ў перыяд з 22 чэрвеня да 9 ліпеня 1941 г. да 23 210 чалавек. Цяжкае становішча было і на іншых франтах, але Чырвоная армія не была разбіта і аказвала ўпартае супраціўленне праціўніку. З усходу СССР падцягваліся новыя фарміраванні, якія мужна ўступалі ў бой з ворагам. Планы «маланкавай вайны» Гітлера ламаліся. Да пачатку жніўня 1941 г. нямецкія танкавыя дывізіі 2-й і 3-й танкавых груп страцілі да 60 % сваёй тэхнікі і больш за 30 % асабовага складу.

Чорныя дні акупацыі

На акупіраванай тэрыторыі Случчыны, як і на ўсёй Беларусі, захопнікі ўвялі «новы парадак» – дзяржаўную сістэму палітычных, эканамічных і ваенных мер, якія былі накіраваны на ліквідацыю нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, рабаўніцтва і знішчэнне людзей. Перавага арыйскай расы над усімі іншымі народамі і неабходнасць завявання «жыццёвай прасторы» для немцаў – гэта складала аснову ідэалогіі «новага парадку». Калі план «Барбароса» вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, то генеральны план «Ост» – праграму каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і ліквідацыі народаў Усходняй Еўропы. Былі падрыхтаваны карты рэйхскамісарыятаў з адзначанымі месцамі пасяленняў немцаў-каланістаў, іх колькасць і колькасць мясцовых жыхароў, якія, як рабы, павінны абслугоўваць арыйцаў, нават былі вызначаны памеры зямельных надзелаў у залежнасці ад ваенных заслуг. Па першапачатковых разліках, беларусаў павінна было застацца не болей як 25 %. Яны падлягалі анямечванню і выкарыстанню на самых нізкакваліфікаваных работах. Астатняя частка насельніцтва на працягу 30 гадоў павінна была быць часткова знішчана, часткова пераселена ў іншыя рэгіёны. Яўрэі і цыгане падлягалі поўнай ліквідацыі.

Пасля ўсталявання «новага парадку» быў распрацаваны цэлы шэраг інструкцый, загадаў, метадычных парад і іншых дакументаў. Гэта сведчыць аб тым, што гітлераўцы старанна і загадзя рыхтаваліся да вайны.

Вытрымкі з мемарандума Бормана «Аб нацыянал-сацыялістычнай акупацыйнай палітыцы ў Расіі» (16 ліпеня 1941):

«…Важнее всего, чтобы мы не выдавали нашу цель всему миру. В этом нет никакой необходимости. Главное, чтобы мы сами знали, чего хотим. Ни в коем случае не осложнять себе собственный путь излишней болтовней…

2017©nasledie-sluck.by

…Итак, мы будем снова подчеркивать, что были вынуждены захватить ту или иную область, чтобы навести там порядок и обеспечить безопасность. Мол, в интересах населения этой страны мы должны позаботится о спокойствии, продовольственном снабжении, транспорте и т.п., а отсюда и предпринятое нами урегулирование. Ни в коем случае не надо показывать, что это сделано навсегда. Тем не менее все необходимые меры: расстрел, переселение и т. п. – мы все равно сможем и будем осуществлять и дальше.

Однако мы не хотим без необходимости и раньше времени наживать себе врагов. Поэтому надо делать вид, будто мы осуществляем какой-то мандат. Но нам самим должно быть ясно, что из этих областей мы уже не уйдем никогда».

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі была вызначана структура ваенных паліцэйскіх, акупацыйных улад. (Падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2000. Т. 1. С. 289–292).

Акупанты для ўтрымання пад кантролем тэрыторыі Беларусі мелі тут ваенна-паліцэйскія сілы колькасцю да 160 тыс. чалавек – гэта без уліку франтавых часцей, якія выкарыстоўваліся ў барацьбе супраць партызан. Яны стварылі сістэму турмаў і канцэнтрацыйных лагераў, дзе знаходзіліся дзясяткі тысяч людзей. Больш за 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў (для ваеннапалонных, цывільнага насельніцтва, штрафныя, жаночыя, перасыльныя лагеры СС, гета) дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі. Самым буйным не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй захопленай савецкай зямлі быў Трасцянецкі лагер смерці, дзе знішчана больш за 206 тыс. чалавек.

У Слуцку ў перыяд акупацыі было створана два гета, а ў канцы вуліцы К. Лібкнехта (Віленскай) – лагер савецкіх ваеннапалонных. (Падрабязна гл. у кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён». 2000. Т. 1. С. 292, 313–316, 417, 418). З 1942 г. у канцлагер пачалі паступаць мірныя жыхары не толькі з іншых гарадоў Беларусі, але і акупіраваных абласцей Расіі: Арлоўскай, Бранскай, Калінінскай (Цвярской), Калужскай, Курскай, Пскоўскай, Смаленскай. Цэлымі сем'ямі ў таварных вагонах іх вывозілі фашысты ў Слуцк. У асноўным гэта былі жанчыны, дзеці і састарэлыя. Аб умовах, у якіх яны знаходзіліся ў Слуцкім лагеры ў палоне, яскрава сведчаць успаміны тых, хто застаўся ў жывых.

З успамінаў жыхаркі Гомеля Кацярыны Азараўны Дзегцяровай:

«Мяне з мамай са Смаленскай вобласці немцы вывезлі ў Слуцк. Везлі ў вагонах для жывёлы, было холадна і голадна, нават вады не было, мы выходзілі з вагонаў, бралі і разагравалі снег. У канцлагеры размясцілі нас за калючы дрот, на трох'яруснья нары. Кармілі супам з мёрзлай гнілой бульбы і капусты, ад яго быў такі смурод, што страшна было і да рота падносіць. А потым пачалі хварэць на тыф. Некалькі жанчын і мая мама пайшлі да дроту, рукамі падкапалі зямлю, каб выйсці ў вёску. Назбіралі ў мясцовых жыхароў кускоў хлеба, бульбы варанай, блінцоў… Я памятаю, калі яны дабраліся да лагера, на іх кінуліся галодныя людзі і ўсё адабралі. Маці ляжала і не варушылася. Вельмі я спужалася, думала, памерла, але яна павярнула галаву і сказала, каб я не плакала, за пазухай яна зберагла для мяне крыху ежы.

…Кожны дзень паміралі шмат людзей. Жанчыны хадзілі капаць яму, каб пахаваць тых, хто памёр. Бывала, трупы на нарах ляжалі доўга, бо не было сіл капаць мёрзлую зямлю.

2017©nasledie-sluck.by

Не магу ўспамінаць усё без болю і слёз, як толькі мы гэта змаглі вынесці. Колькі гэты жах працягваўся, не памятаю, але ведаю, калі вызвалілі, то беглі мы куды вочы глядзяць. Доўга ішлі, ехалі, начавалі, урэшце дабраліся да вёскі Малыя Князікоўцы Гродзенскай вобласці. Там і засталіся жыць, пакуль не вярнуўся бацька з партызанаў».

З успамінаў малалетняга вязня Слуцкага лагера палонных Віктара Мікалаевіча Палікарпава, жыхара Слуцка:

«Нашу сям'ю немцы разам з іншымі расіянамі прывезлі ў эшалоне з Ржэва. Лагер быў фільтрацыйным, у яго звозілі людзей як з Беларусі, так і з Расіі, Украіны. Здаралася, што вязняў набіралі да сотні тысяч. Працаздольных немцы адбіралі, сартавалі і адпраўлялі ў канцлагеры ў Польшчу, Прыбалтыку, Германію. У Слуцку заставаліся ў большай частцы хворыя, слабыя, шмат з іх гінулі ад холаду і голаду. Хавалі памёршых тут жа, на тэрыторыі. Некалькі такіх месцаў я добра памятаю…».

У лагер фашысты адпраўлялі і мясцовых жыхароў: каго за сувязь з партызанамі, як, напрыклад, Антаніну

Былыя вязні Слуцкага лагера М.П. Палікарпаў і А.Ф. Палікарпава

В.М. Палікарпаў

Пятроўну Гурбо з в. Бязверхавічы, каго за парушэнне «нямецкага парадку» і іншыя правіннасці. Так, зімой 1944 г. з вёскі Вялікая Сліва фашысты забралі 9 дзяўчат для адпраўкі ў Германію, а ў гэты момант партызанамі была ўзарвана чыгунка на Баранавічы. Дзяўчаты аказаліся ў канцлагеры.

У адпаведнасці з Актамі камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Слуцку ад 18.09.1944 г., 19.09.1944 г. у лагеры палонных загінула 14 790 чалавек. Сярод іх больш за 10 тыс. ваеннапалонных, якія былі расстраляны, каля 600 чалавек, якія хварэлі на сыпны тыф, былі спалены разам з баракам. Так лічылася да 2003 г.

У 1990-я гг. неаднойчы да ўлад звярталіся жыхары вёсак Кляпчаны і Журава, сведкі тых жудасных дзён акупацыі, якія сцвярджалі, што на тэрыторыі былога лагера ёсць яшчэ пахаванні вязняў. Створаныя камісіі абследавалі ўказаныя месцы, рабіліся шурфоўкі, аднак вынікаў не было. І вось зноў у 2003 г. былі праведзены дадатковыя даследаванні і раскопкі 52-м асобным спецыяльным пошукавым батальёнам. Было знойдзена месца пахавання ваеннапалонных і мірных жыхароў. Людзі ва ўзросце ад 2 да 80 гадоў загінулі

2017©nasledie-sluck.by

Расстрэл мірных грамадзян

ад куль, голаду і эпідэмій. На глыбіні паўтара метра ў 2 ямах-магілах было пахаванне мінімум у пяць слаёў. Трупы проста скідваліся адзін на адзін і прысыпаліся зямлёй.

Для ўдакладнення абставін на месцы пахавання была створана спецыяльная камісія, якая прапанавала спыніць раскопкі, а ў памяць аб загінуўшых на гэтым месцы ўстанавіць помнік, што і было зроблена.

У сувязі з раскопкамі 2003 г. удакладнілася колькасць загінуўшых вязняў Слуцкага канцлагера – больш за 28 тыс. чалавек.

Трэба адзначыць, што лагер выконваў ролю і перасыльнага пункта. Вядома, што многія вязні са Слуцка адпраўляліся ў іншыя лагеры.

У апошнія гады з'явіліся звесткі аб тым, што на тэрыторыі Слуцкага раёна былі яшчэ два лагеры палонных. Адзін з іх каля в. Лядна. Успамінаючы, мясцовыя жыхары гаварылі, што быў ён, канечне, не такі вялікі, абнесены дротам і знаходзілася там больш за 300 чалавек ваеннапалонных, а можа і больш за 500. Аб гэтым у сваіх успамінах адзначала і былая партызанка Марта Захараўна Данілава.

Другі лагер знаходзіўся непадалёку ад в. Волашава, з левага боку па дарозе на вёску Рыжыца. Хутчэй за ўсё гэта былі падраздзяленні (філіялы) Слуцкага лагера палонных.

Генацыд супраць яўрэйскага насельніцтва атрымаў назву Халакост – масавае знішчэнне нацыстамі яўрэйскага насельніцтва Еўропы ў гады Другой сусветнай вайны. Акупацыйныя ўлады выдавалі загады і распараджэнні, якія забаранялі свабоднае перамяшчэнне яўрэяў, уводзілася працоўная павіннасць, а таксама яны павінны былі рэгістравацца па месцы жыхарства і насіць знакі адрознення – белыя нашыўкі з зоркай Давіда ці жоўтыя павязкі. Яўрэі нават не мелі права хадзіць па тратуарах.

Наступным этапам вырашэння «яўрэйскага пытання» на акупіраванай тэрыторыі было стварэнне гета. Умовы ў ім нагадвалі рэжым канцэнтрацыйных лагераў.

Ужо ў ліпені ў Слуцку была поўнасцю праведзена пашпартызацыя жыхароў горада. У картках адзначаліся неабходныя звесткі: узрост, спецыяльнасць, пол – гэта выкарыстоўвалася для рассялення жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. На паўднёвай ускраіне горада ў канцы вуліцы Валадарскага (цяпер М. Багдановіча) на тэрыторыі 10-га ваеннага гарадка было арганізавана «нерабочае» гета. Сюды былі сагнаны непрацаздольныя яўрэі – састарэлыя, жанчыны з малалетнімі дзецьмі, інваліды. Другое называлася «Школішчы», па назве аднаго са старэйшых раёнаў горада, дзе пражывала ў асноўным яўрэйскае насельніцтва. У яго склад уваходзіла дамоў 400, і знаходзілася яно на былых вуліцах Школьная, Бычковая, 1-я Трудавая (цяпер Парыжскай Камуны), Рэспубліканская, Канановіча, раён СШ № 6, захоплівала частку Капыльскай і паў-

2017©nasledie-sluck.by

ночную частку вуліцы Манахава (гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 1. 2000. С. 292, 316, 318–233; там жа аб колькасці загінуўшых у гета).

З успамінаў Барыса Іосіфавіча Фалевіча, жыхара Слуцка:

«В 1941 г. мне было 12 лет. Нашу семью отправили в гетто. В комнаты деревянных бараков загоняли по 6–7 семей. Взрослых гоняли на работы. Чтобы люди не умерли от голода, выдавали карточки, по которым отпускали мизерное количество продуктов, и то не регулярно.

Мы голодали, и мне приходилось ходить по городу в поисках овощей, оставшихся на заброшенных огородах. А так как внешностью я не был похож на типичного еврейскаго мальчика, то выходил в город без нашитых звезд, и меня никто ни разу не задержал… Просить милостыню или торговать запрещалось под угрозой расстрела… До нас доходили слухи о жутких подробностях преследования евреев в Польше. Во время одного из выходов в город от взрослых узнал, что немцы за городом расстреляли 15 еврейских мужчин…

У мамы в гетто оказался хорошо знакомый полицейский, который не раз предупреждал о вывозе на расстрел и пропускал нас через проходную, а мы несколько дней ночевали у Константина Войниловича. Потом с помощью этого же полицая мы попали в рабочий барак, из которого пока на расстрел никого не вывозили. Но самые страшные дни настали в октябре. 27-го числа меня и еще 10–12 мальчиков из гетто повели в 14-й военный городок на работу. Где-то к полудню мы услышали команду: «Всем построиться!» Нас повели в город, а там крики, плач, стрельба. Я выжил случайно. Помог тот же полицейский. Он пропустил меня в рабочий барак, где находилась и мать. Нас и еще несколько человек не тронули. Бабушку и самого младшего братишку бросили в машину и отвезли в Гореваху. Говорили, что в тот день расстреляли пять тысяч человек».

Сведкам кастрычніцкіх падзей быў і былы партызан Аляксей Андрэевіч Новік, які 27 кастрычніка знаходзіўся ў Слуцку на заданні і бачыў, як жыхароў гета выганялі на вуліцу, строілі ў калону па чатыры чалавекі: спачатку мужчын і хлопчыкаў, за імі жанчын і дзяўчынак. Пад аховай іх вялі па галоўнай вуліцы горада ў заходнім напрамку. Старых і хворых грузілі ў аўтамашыны і адпраўлялі ўслед за калонамі. Як аказалася, іх гналі на месца расстрэлу ва ўрочышча Гараваха. Расстрэлы працягваліся і 28 кастрычніка…

У гета «Школішчы» трагедыя разыгралася 8 лютага 1943 г. Частка жыхароў яго была расстраляна, астатнія спалены жывымі. Жудасныя крыкі, страляніна, чорны дым і пах паленых людзей наводзілі жах на насельніцтва. Тры дні дагарала гета. Загінула больш за тры тысячы чалавек. Праз некалькі дзён па загаду акупантаў забітых і рэшткі спаленых вывезлі ў поле і скінулі непадалёку ад Сёлак, дзе жыло некалькі сем'яў. Жыхарка Сёлак Раіса Аляксандраўна Шалюта расказвала: *«…Іх не дазвалялі адразу пахаваць. Трупы ляжалі замарожаныя і прыпарушаныя снегам амаль да вясны. Калі пачаў раставаць снег, усё поле было пакрыта вараннём, якое расцягвала па ваколіцах часткі чалавечых цел… Стаяў смурод. І толькі тады дазволілі пахаваць няшчасных…».*

Галоўным сродкам насаджэння і падтрымання «новага парадку» быў масавы тэрор, які ажыццяўлялі войскі вермахта, ахоўныя войскі СС, службы бяспекі (СД), тайная паліцыя і інш.

2017©nasledie-sluck.by

Для ліквідацыі людзей ствараліся спецыяльныя падраздзяленні паліцыі і СД – айнзацгрупы, айнзац- і зондэркаманды.

Генеральны план «Ост» прадугледжваў поўную ліквідацыю камандзіраў, камісараў, партыйных і савецкіх работнікаў і «камуністычнай інтэлігенцыі», часткі мірных жыхароў. І гэты план пачаў паспяхова выконвацца ўжо з першых дзён акупацыі, аб чым сведчыць вытрымка з дзённіка нямецкага оберяфрэйтара Ш. Гердэра:

«…25 августа. Мы бросаем ручные гранаты в жилые дома. Дома очень быстро горят. Огонь перебрасывается на другие избы. Красивое зрелище! Люди плачут, а мы смеемся над слезами. Мы сожгли таким образом деревень десять.

29 августа. В одной деревне мы схватили первых попавшихся 12 жителей и отвели на кладбище. Заставили их копать себе просторную и глубокую могилу. Славянам нет и не может быть никакой пощады. Проклятая гуманность нам чужда».

У першыя дні акупацыі за Слуцкам на Брэсцкім напрамку было расстраляна 18 чалавек партыйна-савецкіх работнікаў, у жніўні – 140 камуністаў, у гэтым жа 1941 г. ў бальнічным садзе па вуліцы Манахава – 849 чалавек, у 1941–1942 гг. ва ўрочышчы Гараваха расстраляна і забіта 8712 чалавек, непадалёку ў сіласнай яме в. Селішча спалена каля 3 тыс. савецкіх грамадзян… Гэты пералік дапаўняюць спаленыя вёскі разам з жыхарамі, загінуўшыя ў лагеры палонных і гета. А колькі было знішчана асобных сем'яў! Толькі ў пачатку кастрычніка 1943 г. у Грэскім раёне было расстраляна 90 сем'яў, больш за 300 душ мужчын, жанчын і дзяцей (у м. Грэск – 67 сем'яў, у в. Ленькі – 9, в. Покрашава – 7, в. Ануфравічы – 7). (Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 1. 2000. С. 290–292, 305–322). Такога вынішчэння яшчэ не ведала гісторыя.

Турмамі і шыбеніцамі, агнём і мячом, гвалтам і жорсткай эксплуатацыяй акупанты імкнуліся аслабіць нарастаючае супраціўленне народа, але разам з тым пачалі прыбягаць да розных палітычных манеўраў, замаскіроўваючы свае сапраўдныя мэты. У гэтым напрамку актыўна працавалі аддзелы гебітскамісарыята: прапаганды, працы, гандлю, фінансаў і інш.

Камандаванне тылу групы армій «Цэнтр» пад асаблівым кантролем трымала матэрыяльнае і харчовае забеспячэнне франтавых часцей і вайсковых, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. У адпаведнасці з загадам эканамічнага штаба «Ост» у ліпені 1941 г. было створана цэнтральнае гандлёвае таварыства «Усход» па падрыхтоўцы і збыту прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. Насельніцтва абкладвалася падаткамі ў грашовай і натуральнай форме. Былі вызначаны нормы здачы збожжа, бульбы, мяса, яек, малака, фуражу. За іх здачу выдаваліся талоны, якія можна было атаварыць у спецыяльных магазінах ЦГТ (цэнтральнага гандлёвага таварыства). У Слуцку адзін з іх быў адчынены на базары. Як успамінаюць жыхары навакольных вёсак, у ім можна было набыць у асноўным гаспадарчы тавар – плугі, косы, сярпы, вёдры і інш. У верасні 1941 г. акупантамі была праведзена аграрная рэформа: калгасы былі рэарганізаваны ў абшчынныя гаспадаркі. Аднак яны хутка развaліліся.

Каб выжыць, людзі дабравольна ці прымусова працавалі на прадпрыемствах і ва ўстановах, работа якіх была адноўлена і якія знаходзіліся пад кантролем акупацыйных улад.

2017©nasledie-sluck.by

Асабістае пасведчанне жыхаркі в. Чаплицы А. Юркевіч, жыхара в. Васілінкі П. Саковіча і жыхаркі в. Падлужжа Грэскага раёна Т. Русаковіч, выдадзенае акупацыйнымі ўладамі. 1942 г.

Працоўнай сілай былі не толькі гараджане, але і сяляне з навакольных вёсак: Лучнікі, Бранавічы, Ячава, Агароднікі і інш. Атрымоўвалі за працу капейкі. Была ўведзена карткавая сістэма.

Рабочаму прадпрыемства па норме выдавалася ў дзень 300 грамаў хлеба, на члена сям'і – 240, а мяса 20 грамаў у суткі, але яго практычна ніколі не выдавалі.

Галоўнай задачай аддзелаў працы і прапаганды гебітскамісарыята былі вярбоўка і адпраўка моладзі ў Германію на работы. Пачалася яна са снежня 1941 г. Фашысты расхвальвалі ўмовы працы і жыцця, якія будуць прадстаўлены жадаючым выехаць, але насельніцтва не праяўляла інтарэсу. Са студзеня 1942 г., калі ўсё больш пачаў паглыбляцца крызіс германскай эканомікі, германскае кіраўніцтва паставіла задачу шырокага прымусовага выкарыстання дадатковай працоўнай сілы «остарбайтэраў» («усходніх рабочых»).

Прымусовы вываз ішоў пастаянна. Асабліва актыўна праводзіўся вясной і летам 1942 г., з другой паловы 1943 г., калі пачалі вывозіць працаздольных 1925–1926 гг. нараджэння; з восені 1943 г. і ў першай палове 1944 г., калі пачалося адступленне ворага.

У Слуцку сістэмным стала правядзенне аблаў у месцах масавага знаходжання людзей: на базары і ў кінатэатры. Толькі праз аддзел працы са Случчыны было вывезена на катаржныя работы 4 500 чалавек.

Асабліва жахлівым злачынствам фашыстаў быў вываз дзяцей у якасці працоўнай сілы і донараў крыві для вермахта.

Жорсткі нацыст гаўляйтэр В. Кубэ надаваў вялікую ўвагу ідэалагічнай рабоце. Ён спрабаваў сыграць на спадзяваннях асобных беларусаў, што можна будзе адрадзіць нацыянальную дзяржаву і культуру пад эгідай Германіі. Дзейнасць адукацыйна-асветных і культурных устаноў, інфармацыйна-прапагандысцкіх органаў атрымала беларускую афарбоўку. Пачала выкарыстоўвацца беларуская нацыянальная сімволіка – бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня».

2017©nasledie-sluck.by

Прапаганда нацыстаў забяспечвалася рознымі сродкамі, адным з якіх было радыё. Асабістыя радыёпрыёмнікі былі канфіскаваны, насельніцтву дазвалялася калектыўна слухаць толькі нямецкія радыёперадачы. Выходзіла «Газэта Случчыны», у горадзе працаваў кінатэатр. Абавязковай у яго рэпертуары была нямецкая кінахроніка пра перамогі нямецкай арміі, пра шчаслівае жыццё ў Трэцім рэйху. Перад пачаткам дэманстрацыі фільмаў у фае іграў аркестр у складзе яўрэяў з гета. У горадзе да 1943 г. існавала тэатральная трупа з часткі былых артыстаў калгасна-саўгаснага тэатра. Працавалі ў тэатры і савецкія ваеннапалонныя. Вядома, што мастаком быў С. Бакаеў, ваеннапалонны, які амаль адразу ўстанавіў сувязь з падпольна-камуністычнай групай А. Фаміна і выконваў розныя заданні. Потым, калі было небяспечна заставацца ў горадзе, стаў партызанам атрада. (Пасля вайны С. Бакаеў стаў прафесійным мастаком, членам Саюза мастакоў СССР. У Слуцкім краязнаўчым музеі знаходзіцца шэраг яго работ, прысвечаных сябрам-партызанам).

Для насельніцтва афармляліся інфармацыйныя вітрыны, праводзіліся розныя масавыя мерапрыемствы. На базарнай плошчы на імправізаванай сцэне чыталіся вершы, выконваліся песні на беларускай мове пра вялікае адраджэнне «беларускасці», якое здзейсніцца пры «новых парадках».

Увага надавалася школьнай справе. Для ўсіх дзяцей школьнага ўзросту з 7 да 14 гадоў, акрамя яўрэйскіх, уводзілася абавязковая адукацыя. Нават у кастрычніку 1941 г. быў выдадзены «Часовы школьны статут». Для падрыхтоўкі моладзі па сельскагаспадарчых і працоўных прафесіях ствараліся прафесійныя школы. У Слуцку была рамесная сталярная школа для падлеткаў. Нават быў аб'яўлены набор быццам бы ў школу лётчыкаў. Як успамінаў жыхар горада Аляксандр Якаўлевіч Лысы: *«...школа лётчиков выпилась в работы по подвешиванию бомб на аэродроме»*. Аб гэтым яму расказаў адзін з былых навучэнцаў ужо пасля вайны.

Немцы імкнуліся стварыць бачнасць іх клопату аб беларусах, міраж развіцця беларускай культуры і адукацыі, але ў рэальнасці іх палітыка была зусім іншай.

Барацьба ў тыле ворага

Нягледзячы на жорсткасць акупацыйнага рэжыму, арышты і расстрэлы, патрыятычны рух беларускага народа супраць нямецкіх захопнікаў узрастаў і пашыраўся. Гісторыя не ведае такога масавага супраціўлення народа акупантам, як барацьба супраць германскіх рабаўнікоў, якая разгарнулася на тэрыторыі Беларусі. З першых дзён акупацыі пад кіраўніцтвам пакінутых партыйных, савецкіх і камсамольскіх кадраў, а таксама вайскоўцаў, што выходзілі з акружэння, ствараліся партызанскія групы і атрады. Часта яны ўзнікалі стыхійна і пад кіраўніцтвам актывістаў падпольных груп і арганізацый. Але ж баяздольнасць партызан і падпольшчыкаў была невысокай: недахоп зброі і боепрыпасаў, складаныя зімовыя ўмовы, адсутнасць медыкаментаў, адступленне Чырвонай арміі. Частка створаных летам і восенню 1941 г. атрадаў і груп была разгромлена, некаторыя самі распаліся, другія выйшлі ў савецкі тыл, іншыя перайшлі на паўлегальнае становішча. Так, жыхар в. Лучнікі Геор-

2017©nasledie-sluck.by

гій Гаўрылавіч Кухта расказваў, што 23 чэрвеня на вялікім пляцы педвучылішча (цяпер тэрыторыя кансервавага завода) былі сабраны прызыўнікі. Раптам у небе з'явіліся нямецкія самалёты. Адна з бомб упала на пляц. Было шмат раненых, былі і забітыя. Пачалася паніка, мітусня, людзі пачалі разбягацца. Групу, што засталася і ў якой знаходзіўся і ён, ваенныя вывелі з горада з мэтай далучыцца да воінскіх часцей. Аднак поўная адсутнасць інфармацыі і хуткае наступленне нямецкіх войскаў перашкодзілі гэта ажыццявіць. Без зброі і ежы, праблукаўшы па лясах некалькі тыдняў, людзі разышліся. Група распалася.

Сёння можна сцвярджаць, што першым партызанскім атрадам, сфарміраваным на Случчыне, быў атрад у складзе 100 чалавек, які ўзначальваў начальнік УНКДБ Мінскай вобласці капітан дзяржбяспекі Арцемій Яўгенавіч Васілеўскі. Дзейнічаў ён ужо з першых дзён вайны. Байцы былі апрануты ў форму супрацоўнікаў НКДБ (менавіта гэта з часам выклікала павышаны інтарэс у германскіх спецслужб, і яны пачалі актыўны пошук). Толькі што сфарміраванаму атраду па просьбе камандзіра 20-га механізаванага корпуса генерала А. Нікіціна, сумесна з Чэрвеньскай аператыўнай групай, давялося прыкрываць пераправу часцей Чырвонай арміі цераз р. Беразіну. Узброеныя вінтоўкамі, рэвальверамі і пісталетамі партызаны не маглі супрацьстаяць рэгулярным часцям групы армій «Цэнтр». З вялікімі стратамі атрад вымушаны быў адступіць на Магілёўшчыну. У хуткім часе атрад папоўніўся новымі байцамі, і месцам яго дыслакацыі стаў балоцісты лес на мяжы Крупскага, Чэрвеньскага і Бялыніцкага раёнаў.

Пачалася актыўная баявая дзейнасць атрада А. Васілеўскага, але лёс камандзіра склаўся трагічна... Здрада, акружэнне карнікаў, сур'ёзная хвароба. Пры ўсім гэтым Арцемій Яўгенавіч змог вывесці атрад з акружэння, разбіў яго на групы, якія накіраваліся да фронту. Разам з начальнікам сакратарыята і ад'ютантам Уладзімірам Лявошкам прынялі няроўны бой. Гэта быў лістапад 1941 г. Адбіваліся да апошняга, пакуль гітлераўцы не закідалі гранатамі. Абставіны гібелі чэкістаў і месца сталі вядомымі пасля вайны ў час суда над здраднікам, былым бургамістрам Нарчуком, які ва ўсім прызнаўся. І толькі ў жніўні 1999 г. у выніку пошукавых работ было знойдзена месца апошняга бою. Астанкі А. Васілеўскага і У. Лявошкі былі пахаваны ў 2000 г. на Усходніх могілках Мінска.

Але ж вернемся да падзей ваеннага часу. З ліпеня 1941 г. на тэрыторыі Случчыны дзейнічалі дзве партызанскія групы з ліку воінаў Чырвонай арміі, якія трапілі ў акружэнне і выходзілі на ўсход. Камандзірам адной з іх быў генерал-маёр Міхаіл Пятровіч Канстанцінаў (пазней – генерал-палкоўнік, Герой Савецкага Саюза), другой – лейтэнант Фурманаў. Група Канстанцінава дзейнічала на тэрыторыі былога Грэскага раёна. У кастрычніку 1941 г. перайшла на Старобіншчыну і злучылася з партызанамі В.І. Казлова. Група Фурманава дзейнічала да восені, а потым у кастрычніку 1941 г. пайшла на ўсход, каб прабіцца да лініі фронту.

У раёне в. Жылін Брод дзейнічала партызанская група старшага палітрука Курганава, звязаная з падпольнай групай Грэскай бальніцы. У баі каля в. Пераходы ў кастрычніку 1941 г. Віктар Сцяпанавіч Курганаў загінуў.

Невялікі партызанскі атрад быў арганізаваны нашым земляком,

2017©nasledie-sluck.by

ураджэнцам в. Рабак Віктарам Іванавічам Гурыновічам, оперупаўнаважаным ваеннай контразведкі 407-га палка 108-й стралковай дывізіі Заходняга фронту. Выйшаўшы з акружэння і дабраўшыся да родных мясцін, разам з чатырма братамі падаўся ў лес. За кароткі тэрмін змаглі аб'яднаць вакол сябе змагароў і забяспечыць іх зброяй. (Пра баявую дзейнасць В.І. Гурыновіча гл. у артыкуле «Сталин информировал Черчилля…»).

З ліпеня 1941 г. дзейнічаў асобны Слуцкі атрад з партыйна-савецкага актыву Слуцкага і Капыльскага раёнаў, кіраўніком якога быў Ф. Пашун. У снежні 1941 г. група выйшла за лінію фронту.

У горадзе і раёне ствараліся падпольныя антыфашысцкія групы.

Вялікую ролю ў актывізацыі і пашырэнні патрыятычнага руху ў Беларусі адыграла бітва пад Масквой. Разгром немцаў у ёй узняў маральны настрой патрыётаў. Рады партызан пачалі павялічвацца. Асабліва вясной – летам 1942 г. Колькасць народных мсціўцаў у Беларусі павялічылася больш як на 23 тыс. чалавек, а да пачатку 1943 г. перавысіла 56 тыс. Барацьбу супраць захопнікаў вялі 56 брыгад, якія аб'ядноўвалі 220 атрадаў. Акрамя таго, 292 атрады дзейнічалі самастойна. У тым ліку на тэрыторыі Слуцкага і былога Грэскага раёнаў баявую дзейнасць вялі каля 30 атрадаў і груп. Да 1943 г. колькасць падпольных антыфашысцкіх груп на Случчыне вырасла да 53. (Аб партызанскіх фарміраваннях, якія дзейнічалі на тэрыторыі раёна, і падпольным руху гл. у кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён». Т. 1. 2000. С. 325–349).

30 мая 1942 г. быў створаны ваенна-аператыўны орган – Цэнтральны штаб партызанскага руху пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага на чале з першым сакратаром ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкам, а ў верасні гэтага ж года – Беларускі штаб партызанскага руху на чале з другім сакратаром ЦК КП(б)Б П.З. Калініным. Гэта спрыяла ўдасканаленню арганізацыі і кіраўніцтва партызанскімі сіламі, іх узаемадзеянню з Чырвонай арміяй, забеспячэнню зброяй, радыёсувяззю, узрыўчаткай, камандным кадрамі і г. д.

У 1942 г. на акупіраваную тэрыторыю Беларусі было накіравана 14 партызанскіх атрадаў і 92 арганізатарскія групы колькасцю 2600 чалавек, якія былі падрыхтаваны на Асобым беларускім зборы – спецкурсах для падрыхтоўкі кадраў для партызанскіх фарміраванняў.

Акрамя гэтага, яшчэ 4 спецшколы займаліся падрыхтоўкай кадраў: падрыўнікоў – на базе аператыўна-вучэбнага цэнтра Заходняга фронту; радыстаў, сувязных разведчыкаў і падрыўнікоў – спецшколы ЦШПР. У 1942 г. імі было падрыхтавана і накіравана ў тыл ворага 175 дыверсійных груп колькасцю 2077 чалавек.

Так, у сакавіку і красавіку 1943 г. у тыл ворага ў раён Слуцка былі скінуты на парашутах групы Жарыкава і Скалабана з рацыямі, што дало магчымасць трымаць сувязь з партызанскім камандаваннем.

Летам гэтага ж года з-за лініі фронту прыбыла група Івана Фядотавіча Арцёменкі, сфарміраваная ў Маскве. Галоўнай мэтай яе была арганізацыя партызанскага атрада ў Грэскім раёне. У хуткім часе група аб'ядналася з партызанамі Івана Васільевіча Арастовіча і стала ротай у партызанскім атрадзе імя М.В. Фрунзе. Неўзабаве з роты вырас атрад імя С.М. Кірава, камісарам якога стаў І.Ф. Арцёменка.

2017©nasledie-sluck.by

І.Ф. Арцёменка

М.К. Купрыянаў

6 верасня 1942 г. была закінута ў Грэскія лясы спецыяльная разведгрупа Заходняга фронту на чале са старшым палітруком Мікалаем Канстанцінавічам Купрыянавым (Коганам). Галоўным яе заданнем было: збіраць звесткі аб перамяшчэнні праціўніка па Маскоўска-Варшаўскай шашы, а таксама аб змяненнях у раёне Слуцк – Грэск – Старыя Дарогі. У склад групы ўваходзілі радыстка Клава Сафронава (Зорка), Варвара Спірыдонава (Стрэлка), юны разведчык Уладзімір Фралоў (Снягір), сувязны Анатоль Гужаў (Орлік). (Аб дзеянні членаў групы гл. у кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён». 2000. Т. 1. С. 409–410, 366–367).

Пасля правалу групы ў канцы 1942 г. разведчыкі былі адкліканы са Слуцка і прадоўжылі сваю дзейнасць на базе партызанскага атрада імя М.В. Фрунзе, які актыўна пачаў займацца разведкай. Купрыянаў атрымліваў новыя заданні: вывучыць праціўніка ў Слуцку, устанавіць колькасны склад гарнізона, рух аўтатранспарту, размяшчэнне штабоў ворага і г.д. У выніку ў штаб Заходняга фронту паступалі радыёграмы: «В Слуцке разместилась109-я пехотная дивизия, штаб дивизии и ее 101-й полк в Минске… Гитлеровцы сконцентрировали в Слуцке до 10 тысяч солдат» і г.д.

Разведвальная і баявая дзейнасць М. Купрыянава прадаўжалася. Аднак у час блакады партызанскай зоны гітлераўцамі 2 чэрвеня 1944 г. ён загінуў непадалёку ад в. Шантароўшчына.

Важнай крыніцай папаўнення партызанскіх сіл сталі ваеннапалонныя Чырвонай арміі. Слуцкія падпольшчыкі групы П. Маглыша неаднойчы арганізоўвалі ім уцёкі, а потым перапраўлялі ў атрады. Каля 130 вязняў сталі партызанамі. У 1942 г. падпольная група А.Дз. Фаміна абмундзіравала і ўзброіла звыш 20 ваеннапалонных са Слуцка і пераправіла ў атрад В.З. Каржа Пінскага партызанскага злучэння.

Са жніўня 1941 г. па снежань 1942 г. у Слуцку на вузле сувязі дзейнічала партыйна-камсамольская група Мікалая Відзякіна – Дзмітрыя Каўшова. Большую частку яе складалі разканваіраваныя ваеннапалонныя. Відзякін М.І., былы лётчык, уцёк з лагера і жыў тайна пад прозвішчам Бакаленкаў. У складзе групы было каля 20 чалавек. (Гл. кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён». 2000. Т. 1. С. 341–342).

У 1942–1943 гг. прыток людзей у партызанскія атрады яшчэ больш павялічыўся: у іх улівалася моладзь, якой пагражаў прымусовы вываз на працу ў Германію, а таксама вясковае насельніцтва, напалоханае пагрозай карных аперацый.

У справаздачы Слуцкага падпольнага райкама КП(б)Б Мінскаму абкаму КП(б)Б адзначалася: «*…Только за один август месяц влилось в ряды народных мстителей в партизанские отряды бригады № 64 им. Чкалова 259 чел. граждан Слуцкого района. Крестьяне, рабочие и служащие в партизанские отряды уходят не только в одиночку, но и группами, и такие факты являются не единичными. 5 августа 1943 г. из гор. поселка*

2017©nasledie-sluck.by

А. Кровіна

Б.І. Багданавіч, камандзір партызанскага атрада імя Астроўскага брыгады Суворава

В.Г. Новік, партызан брыгады імя Чкалава

Ф.І. Усольцаў, партызан атрада імя Даватара брыгады імя Чкалава

Уречье только в один день ушло более 100 чел., принеся с собой 17 винтовок, много патронов и гранат. 22 августа 1943 г. из Исернского сельсовета ушло в партизаны 33 чел., захватив с собой 8 винтовок...».

На бок партызан, у атрад імя Астроўскага, у жніўні 1943 г. перайшла група салдат – чэхаў, якія праявілі сябе смелымі байцамі. Антон Кровіна стаў камандзірам аддзялення атрада. У верасні 1943 г. да партызанскага атрада імя К.К. Ракасоўскага далучыліся славакі на чале з паручнікам Менгарам Тарабашам, які быў назначаны камандзірам узвода.

З ростам партызанскіх сіл памнажалася і іх баявая актыўнасць. Усё часцей партызанамі праводзіліся буйныя аперацыі, узмацняліся ўдары па камунікацыях, гарнізонах і іншых аб'ектах захопнікаў. Толькі за перыяд са студзеня па 1 мая 1943 г. партызанамі былі пушчаны пад адхон 7 нямецкіх эшалонаў на ўчастку чыгункі Слуцк – Асіповічы. Партызанамі брыгады імя В.П. Чкалава ў маі 1943 г. поўнасцю выведзены са строю ўчастак чыгункі Слуцк – Урэчча, рух па якой быў спынены да канца года. Партызанамі атрада «25 лет Октября» 22 кастрычніка 1943 г. была разгромлена Сяражыцкая валасная ўправа, 26 кастрычніка перарэзана тэлефонная сувязь на шашы Слуцк – Грэск у раёне вёсак Хранова і Васілінкі працягласцю 3,5 км. Групай Казырына 64-й партызанскай брыгады імя В.П. Чкалава 1 снежня 1943 г. была ўзарвана Слуцкая ўправа і г. д.

Партызанамі атрада імя С.М. Кірава 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе было пушчана пад адхон 16 варожых эшалонаў, пашкоджана 62 кіламетры тэлефоннай сувязі – гэта за адзін толькі 1943 г.

Партызаны атрада імя М.В. Фрунзе ў маі 1943 г. трымалі бой з гарнізонам, які ахоўваў Ленькаўскі мост, наступалі па дарозе Варшава – Масква каля вёсак Стары Гуткоў і Муравішчына, спалілі і разбурылі торфазавод «Энергія» Слуцкага раёна, мост на гравійнай дарозе Слуцк – Мінск у в. Бокшыцы і г. д.

Шмат дыверсій было здзейснена слуцкімі падпольшчыкамі. Групай П. Маглыша былі ўзарваны аўтарамонтныя майстэрні, спалены нямецкі гараж з аўтамашынамі, абрабаваны слуцкі банк. Падпольшчыкамі групы М. Відзякіна – Дз. Каўшова ўзарваны вузел сувязі, выведзена са строю электрастанцыя.

Група, якая дзейнічала на масласырзаводзе ў складзе яе работнікаў:

2017©nasledie-sluck.by

Асвяцімскага, Шышкіна, Сідарэнкі, Калацілкінай, Курасава, Лічмана і Падымавай, па заданні кіраўніцтва партызанскай брыгады імя А.В. Суворава і Слуцкага падпольнага райкама партыі вясною 1943 г. падрыхтавала дыверсію на заводзе. У выніку было знішчана тэхналагічнае абсталяванне і запасы прадукцыі. Немцы не змаглі аднавіць завод да канца акупацыі. Гэта далёка не поўны пералік баявых дзеянняў партызан і падпольшчыкаў…

Партызанскі і падпольны антыфашысцкі рух прымушаў захопнікаў вылучаць значныя сілы для аховы сваіх тылоў і барацьбы з народнымі мсціўцамі. У канцы зімы і вясной 1944 г. фашысты правялі некалькі карных аперацый. Каб пранікнуць у партызанскую зону, гітлераўцы ў лютым сканцэнтравалі паўтары тысячы сваіх салдат і афіцэраў у Слуцку і пачалі наступленне. Але іх планы не ажыццявіліся. У выніку жорсткага бою з партызанамі брыгады імя М.В. Фрунзе вораг адступіў. У сакавіку фашысты зноў спрабавалі прарвацца ў партызанскую зону, але і на гэты раз карная аперацыя не ўдалася. У красавіку 1944 г. гітлераўцы сканцэнтравалі да 500 салдат жандармерыі і паліцыі. Падраздзяленні былі добра ўзброены мінамётамі, гранатамётамі, кулямётамі, тэхнікай, мелі рацыі. Раніцай 19 красавіка вораг перайшоў р. Случ і з трох напрамкаў зноў пачаў наступленне ў раёне в. Пераходы, дзе знаходзіўся ў засадзе партызанскі атрад імя К.К. Ракасоўскага. У бой уступіў і атрад імя М. Астроўскага. Немцы не вытрымалі націску партызан і адступілі з вялікімі стратамі. Асабліва вызначыліся ў гэтым баі камандзір атрада імя К.К. Ракасоўскага Аляксандр Дзмітрыевіч Фамін і камісар атрада Віктар Дзмітрыевіч Родчанка, якія былі ўзнагароджаны камандаваннем брыгады асабістай зброяй. Асобныя партызаны за мужнасць і адвагу былі прадстаўлены да баявых узнагарод.

У гэтым жа месяцы каля в. Панічы адбыўся цяжкі бой байцоў атрада імя 14 слуцкіх партызан з гітлераўцамі, якія таксама былі разбіты. Аднак у гэтым баі загінуў камандзір атрада Мікалай Данілавіч Бялько, пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

У канцы мая 1944 г. фашысты зноў спрабавалі блакіраваць партызанскія зоны ў трохкутніку Мінск – Слуцк – Асіповічы. Жорсткія баі вялі брыгады імя А.В. Суворава, М.В. Фрунзе, а таксама злучэнне С.А. Ваўпшасава (Градава). У гэты час злучэнне якраз атрымала падмогу з Масквы – спецатрад Кузняцова колькасцю 40 аўтаматчыкаў. Яны прыкрывалі пераправу цераз р. Пціч, пакуль адыходзілі партызаны і мясцовыя жыхары ад карнікаў. Вытрымаўшы 12 атак, аўтаматчыкі пайшлі на прарыў блакады. І тут гітлераўцы не вытрымалі ўдара і адступілі. Так быў адбіты апошні націск ворага ў партызанскай зоне…

2017©nasledie-sluck.by

НА ФРОНЦЕ І Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

З успамінаў А.Д. Фаміна

ФАМІН Аляксандр Дзмітрыевіч (1911–1986), адзін з кіраўнікоў партыйна-камсамольскай падпольнай групы ў Слуцку. З лістапада 1942 г. камандзір партызанскага атрада імя К.К. Ракасоўскага партызанскай брыгады імя М.В. Фрунзе. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, медалямі. (Падрабязныя біяграфічныя звесткі гл. у кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён». Т. 1. С. 249, 336–337).

…Война застала нас на учениях штаба корпуса со штабами входящих в него частей между Старыми Дорогами и Бобруйском. 22 июня 1941 года, прекратив учения, мы прибыли на свои места, а в 12 часов дня слушали выступление по радио Молотова.

Что делать? Звоню в штаб дивизии. Отвечают: «Занимайтесь по плану, проводите работу по укомплектованию». Из приписанных автомашин в полк ни одна не прибыла, своих же было только три. Вечером 23 июня по сигналу боевой тревоги двинулись пешком в направлении Пуховичи – Шацк, затем прибыли в деревню Шищицы, штаб дивизии размещался в Воробьевском лесничестве. Я был уже помощником начальника штаба 658-го артиллерийского полка по разведке. 25 июня мы перехватили девять 76-миллиметровых пушек на машинной тяге, заменили их расчеты своими. Зная, что на станции Тимковичи есть воинские склады, в том числе со снарядами, направили туда на трех автомашинах командира батареи старшего лейтенанта Пискунова с группой солдат. Две машины вернулись без груза, а ехавший на первой машине Пискунов и шофер были убиты на станции Тимковичи. Тела сумели привезти, и утром мы их похоронили на окраине Шищиц. Днем 25 июня на поляне Воробьевского лесничества приземлился самолет, летчик из штаба округа вручил командиру дивизии генералу Пархоменко служебную записку от командующего округом Павлова. Он требовал, чтобы к исходу дня дивизия заняла оборону города Слуцка. Командир дивизии сказал пилоту: «Приказ не выполним. Оборонять город нечем, да и добраться до города невозможно».

Поток беженцев все нарастал и нарастал: ехали женщины с детьми; ехали летчики, потерявшие на аэродромах самолеты; шли группы красноармейцев – все ехали и шли на восток. Рано утром мы расположились на Покрашевской горе, ведя наблюдение за городом Слуцком.

Вскоре показались две бронемашины противника. Начальник разведки дивизии приказал мне встретить врага огнем из стоявших на развилке дорог двух 45-миллиметровых пушек 644-го мотострелкого полка. Подпустив врага метров на 300, я приказал командиру орудия открыть огонь. Первым же снарядом один броневик был подбит, а второй – удалился в сторону Слуцка. Из броневика мы вытащили раненого немецкого офицера и доставили в штаб дивизии.

По приказу командира 20-го мехкорпуса 26 июня дивизия отошла к Валерьянам, а через день вела бой в деревне Лоша. Немцев выбили из деревни, заставили их отступать с большими потерями. Сказалась хорошая выучка бойцов – бывших кавалеристов. Поскольку у нас было 9 пушек, а снарядов к ним – мало, мы смогли поставить на стрельбу прямой наводкой только одно

2017©nasledie-sluck.by

орудие. Находясь рядом с этим орудием, я видел, как мужественно вели огонь артиллеристы под обстрелом минометной батареи противника. У орудия осталось всего два бойца, и то раненые, но они не покидали его без приказа. Снаряды кончились. Орудие после прямого попадания мины вышло из строя.

Дивизия начала отходить на Шацк – Пуховичи, а мне было приказано с двумя 45-миллиметровыми пушками прикрыть отход. На опушке леса метрах в 200 восточнее Валерьян мы оборудовали огневую позицию. Вскоре увидели два тяжелых немецких танка. Подпустили их примерно метров на 200 и открыли огонь. Но было слышно, как снаряды отскакивали от брони. Приостановившись, танки произвели выстрелы, подбив обе пушки, но расчеты в окопах остались невредимы

…Когда 27 июля пал Могилев, огромная лавина немецких войск двигалась по всем дорогам, даже проселочным. Перейти линию фронта было невозможно даже одному. Решил двигаться в Осиповичский район, где раньше стояла наша часть. Переплыл Днепр и направился к деревне Хоново, в которой у своего отца остановилась жена политрука Семена Чечко. Она сказала, что ее муж в плену в Могилеве, и она завтра, взяв с собой чужих детей, поедет выручать его. Я вышел к полотну железной дороги и по нему пошел в сторону Осиповичей. Питался старым картофелем, кормовой свеклой...

Ночью 1 сентября 1941 года я, худой, обросший, пришел в Слуцк, к теще. С ней была ее младшая дочь, а где были еще три дочери, в том числе и моя жена, она не знала. Теще я сказал, что на учет в комендатуру не пойду, несмотря на то, что подвергаю и ее опасности. Утром теща привела своего родственника Василия Чухольского, который сбрил мне бороду и усы.

Прошло пять дней. Всё пока в порядке. Теща принесла фиктивную справку, что я – Машкевич и работаю учителем в деревне Великая Слива. За стенкой квартиры жила семья Василия Дубинки, который предложил пойти в деревню Летковщина, где остановился его шурин Антон Леопольдович Липницкий, бывший работник Вилейского облисполкома. Я познакомился с Липницким. Он сказал, что скоро сюда приедет к фельдшеру Володя из Гацука, так как он болеет ревматизмом, а до войны он работал заведующим военным отделом Гресского райкома партии. Володя (Владимир Иванович Заяц) приехал и сказал, что имеет задание ЦК КП(б)Б организовать подпольную работу в Гресском и Слуцком районах. Предложил нам сотрудничать. Я охотно согласился. Это было в первой половине сентября 1941 года.

Как-то я был в деревне Новодворцы. И узнал, что туда прибыл из Могилевского окружения бывший сержант Максим Богунов. Нашел я его. Он очень обрадовался. Правда, очень резко оценил причину столь тяжелой трагедии, в том числе и нашего соединения. Я успокоил его, что в такой обстановке кого-то обвинять бесполезно, борьба еще не закончилась, а только разворачивается. Договорились, что Богунов будет подбирать надежных людей.

Напротив дома тещи жил с женой Григорий Сотников. Он оказался смелым человеком. Был знаком с Дмитрием Ковшовым, который работал у немцев на радиоузле и у которого было много радиоприемников, сданных населением по приказу немцев. Григорий спросил, можно ли познакомить меня с ним. Подумав, я сказал: «Не надо. А ты продолжай знакомство с ним и отбери для себя

2017@nasledie-sluck.by

радиоприемник». Он выполнил это задание. Ночью мы приняли радостные вести из Москвы, что она держится, а немцы несут большие потери. Дело в том, что немецкая пропаганда постоянно твердила о взятии Москвы, о разгроме Красной Армии. Я от руки размножил сообщение Совинформбюро и передал копии Богунову. Он сообщил, что у него уже есть два человека из Новодворцев – Константин Станкевич и Василий Кадыш.

В Слуцке меня нашел военнослужащий нашей части Василий Хромушин, он поселился в деревне Уланово. В деревенском клубе сохранился радиоприемник, правда, без питания. Василий принес его мне, а я передал приемник Липницкому.

Наступала зима. Связь с Зайцем прекратилась, впоследствии я узнал, что он с группой генерал-майора Константинова перебрался в Любанский район. Я пошел в деревню Великая Слива к Григорию Машкевичу. Он пригласил на беседу ко мне врача Великосливской больницы Екатерину Кирпичникову. В свое время она служила в одном из полков 8-й стрелковой дивизии, которая сменила нас на границе с Восточной Пруссией. Кирпичникова спросила меня, что не может быть, чтобы в Слуцке райком партии не оставил кого-либо для руководства подпольной работой. Я сказал, что мы искали таких людей, но не нашли. Нам надо самим организовываться, готовить надежных людей к партизанской борьбе.

Из Великой Сливы я пошел в Новодворцы, полем это не очень далеко. В Новодворцах Богунов познакомил меня с Константином Станкевичем и его семьей. Решили, что их квартира будет центром конспиративной связи, так как расположена очень удобно – почти на окраине Слуцка. Потом я встретился с Василием Кадышем, тоже согласившимся на ведение подпольной работы.

В декабре 1941 года на квартире Борковского я встретился с Петром Маглышем. Он мне сообщил, что сбежал из плена, а до начала войны служил в Белостоке, в мотоциклетном полку 25-й танковой дивизии. Видно было, что передо мной стоял мужественный человек, готовый к борьбе с немцами. Он устроился на работу в бывшую Слуцкую МТС, где шофером был Климент Баер. Там работали 25 военнопленных. Я сказал Маглышу, что надо приглядеться к пленным и найти надежных людей, которых можно увести в леса для партизанской войны.

Борковский устроился на работу в военные мастерские по ремонту автомашин, там тоже было много военнопленных. Ему было предложено вести с ними подобную работу.

В деревне Козловичи я узнал, что завхозом школы работает старший лейтенант Константин Тарасов, сменивший свою фамилию на Лобанов. С ним я тоже встретился, но впечатление от этой встречи было неприятное. Но договорились, что в начале весны 1942 года позовем его с собой в лес.

В конце декабря 1941 года я побывал в деревне Исерно, зная, что там живет Федор Федорович Шаплыко – в 1939 году командир взвода гаубичной батареи, которой я командовал. В преданность его я верил. В его доме я прожил семь дней, в течение которых повстречался с подпольщиками группы Белько, имел с ним беседу. Впечатление осталось хорошее.

...Я понимал, что надо усилить подпольную деятельность в городе и районе и готовиться к уходу в лес для открытой вооруженной борьбы. Но уходить надо не одному, а подготовить для этого как можно больше людей. Лучшим по-

2017©nasledie-sluck.by

полнением были бы военнопленные, уцелевшие от массового уничтожения в слуцком лагере. Из 14 тыс. их осталось около 150 человек, которых немцы использовали в качестве рабочих. Некоторые из них работали на восстановлении водопровода, в мастерских по ремонту автомашин, в бывшей Слуцкой МТС и на продовольственных складах в Новодворцах. Я поручил Богунову установить связь с военнопленными в Новодворцах, Петру Маглышу – в МТС, где он работал, в автомастерских – Борковскому, который там же и работал.

В подпольную работу вовлекалось все больше людей. В типографии стал работать подпольно Александр Прохоров, в больнице – медсестра Сысунович, в Михейках – Василий Пихтеров, на электростанции – Петр Хорин, в водопроводной сети – Александр Коник, Григорий Орел, Семен Семенюта, в деревне Козловичи – А. Трофимович, К. Лобанов, в Великой Сливе – Кирпичникова, Лазаренко, в Исерно – Ф. Шаплыко, входивший в группу Белько, в Летковщине – группа коммуниста А. Липницкого. Мы установили связь с партизанским отрядом В.З. Коржа.

В июле 1942 года Богунов познакомил меня с Ходасовым А.Н., который жил в Слуцке, а работал кузнецом в деревне Середняки. Договорились, чтобы он уходил в лес и других готовил. Из деревни Долгое приехала врач Кучинская-Соколова за медикаментами. Остановилась она у Маглыша. В это время Александр Шауло привез свежую газету «Известия», где говорилось об установлении орденов Александра Невского, Ушакова, Богдана Хмельницкого.

Через пару дней я был у Богунова, который мне представил молодого парня – это был Николай Радюк. Я проинструктировал Радюка, чтобы при представлении начальнику полиции он сказал, что был раскулаченным, а сейчас хочет помогать немцам устанавливать новый порядок. Начальник полиции сказал ему: «Такие нам нужны», Радюка приняли в полицию, а он вовлек туда своих товарищей Соколовича и Кохана, и все попали во взвод капрала Врублевского, который также согласился нам помогать.

Потым нас пагналі ў першы ваенны гарадок. Там да нас былі ваеннапалонныя. Калі мы зайшлі на яго тэрыторыю, карціна была жудасная. Па лагеры, у казармах ляжалі, як шкілеты, трупы ваеннапалонных. На тэрыторыі самі ж палонныя выкопвалі ямы. На шынялях, на анучах мы зносілі трупы людзей у гэтыя ямы і прысыпалі іх.

Са мною ў лагер трапілі тата, мама, сястра і два браты...

Спалі мы на нарах, накрываліся тым, што засталося ад ваеннапалонных. Харчаванне было, ну якое там харчаванне: стаялі ў чарзе за баландай, маглі і не дачакацца... Мясцовыя людзі падавалі, што маглі. У лагеры была эпідэмія тыфу, мае брат і сястра хварэлі, былі пры смерці. У лагер прыязджалі немцы, адбіралі моладзь і гналі ў Германію. Сярод старост быў чалавек родам з Ржэва, ён і падказваў бацьку, калі збіраліся прыехаць немцы, а бацька ноччу падкопваў зямлю, і я хавалася. Так засталася з сям'ёй.

З-пад дроту прыстасаваліся хадзіць жабраваць... Раніцай на гэтым дроце людзі віселі: не пашанцавала ім, ахоўнікі заўважылі, расстралялі. Потым збіралі іх і хавалі. Аднойчы мама з адной настаўніцай пайшлі жабраваць. Настаўніца на Ячаўскім мосце наступіла на міну, ёй адарвала нагу, маму моцна параніла ў грудзі і твар. Іх падабралі на падводу, на якой везлі малако ў Ячаўскую бальніцу. Весткі пра гэта дайшлі ў лагер, і мы зразумелі, што гэта наша мама. Ноччу бацька вывеў мяне за тэрыторыю лагера, я дабралася да бальніцы. Галоўны ўрач (яго прозвішча Мурашка) выслухаў мяне, паклікаў санітарак, мяне памылі, упершыню змянілі бялізну. Мурашка паведаміў мне, што немцы думаюць, што мама – яўрэйка, бо прозвішча наша Абрамавы. Спытаў, як звязацца з лагерам, і я расказала ўсё, што ведала. Назаўтра сказаў, што маму не расстраляюць і што я застануся з ёю.

Пасля вызвалення бацька ўладкаваўся працаваць у КЭЧ. Нам далі пакой у першым гарадку. Я працавала ў шпіталі, потым з ім жа і пайшла за фронтам праз Брэст у Еўропу. Нас бамбілі, я атрымала моцныя раненні, пасля выздараўлення вярнулася ў Слуцк да сям'і. Тут выйшла замуж, так і засталася ў Слуцку.

З успамінаў Ніны Гаварковай, жыхаркі г. Арзамас Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі

До Великой Отечественной войны я жила в городе Ржеве с отцом, мамой, двумя братьями и сестрой, которая была замужем и растила двух дочерей. Город бомбили, бросали зажигательные бомбы, горели дома, а 14 ноября 1941 года в Ржев вошли гитлеровцы. До Москвы оставалось 250 километров. Нашим надо было захватить город, потому что он имел стратегическое значение.

В этом сражении много погибло наших и немцев. Мы видели целые поля убитых, когда ходили в деревни, чтобы добыть зерна, что-то обменять из одежды. Зима 1941/1942 года была очень суровая, температура доходила до 40 градусов мороза. Немцы замерзали, а наши были одеты в теплые валенки, и немцы снимали их с мертвых русских, разрезая. Они ходили по домам, забирали одеяла, половики, валенки, снимая с людей прямо на улице, отрезали меховые воротники с пальто.

В конце января 1943 года нас выгнали из дома, загнав в церковь, обсыпали каким-то вонючим порошком (как

2017©nasledie-sluck.by

оказалось, это был порошок от паразитов). Все были истощены, больны, на то время у нас в доме не было никакой еды. Нас погрузили в товарный вагон, в котором можно было только сидеть. Ехали без еды и воды, только когда останавливался поезд, открывали дверь, люди, кто располагался поближе к двери, успевали выпрыгнуть из вагона набрать снега.

Сколько мы ехали, я не помню. Поезд остановился, открыли дверь и крикнули выходить. Нас погнали, кто не мог идти, повезли на повозке. Когда подходили к воротам, нас встречали люди и даже знакомые, которые были раньше угнаны. Они рассказали, что это – лагерь, окруженный колючей проволокой в три ряда, из которого нельзя выходить. Мы зашли в помещение, где почти не было света. По сторонам стояли нары, черные печки, которые не топились. Так мы оказались в Слуцке. На следующий день нам дали небольшой кусок хлеба и жидкую кашу, но мы и этому были рады. Всех страшно мучили вши, которые заводились даже в меховых воротниках верхней одежды. Кормили нас один раз в день. Мы умудрялись убегать из лагеря, перелезая через проволоку благодаря тому, что люди тесали столбы, на которых была закреплена проволока, чтоб согреть воды для питья. Мы вставали очень рано, когда было темно и полицейские еще отдыхали. Мы накидывали одежду на проволоку, помогали друг другу. Но однажды не успели и когда перелезли, поднялась пурга. Был слышен свист пуль. Мы старались бежать от лагерных огней, а когда утихла пурга и стало светло, мы оказались в поле, кругом не видно селений. Позже мы набрели на жилые дома, где нам подавали картошку, хлеб, я впервые попробовала колбаски, которые обменяла на мамин шелковый праздничный платок. Вскоре мама умерла. Женщины завернули ее в простыни, и мы отвезли ее за колючую проволоку, где выкопали для захоронения большую яму.

Когда мы пришли обратно в лагерь, нам надо было проходить через проходную, где у нас все отобрали и отправили на лагерную кухню. Еще не раз приходилось уходить, нас избивали. Картошку мы варили во дворе в самоварах, которые успели прихватить с собой люди. Однажды приехал какой-то начальник, увидел это и порубил топором все самовары.

Мы видели, как горели еврейские дома вместе с людьми. Тогда мы ждали, что и с нами может произойти такое. Потом нас стали вывозить в Польшу, Германию целыми семьями. Людей в лагере оставалось все меньше. Многие умирали. Нас забирали работать у хозяина-поляка. Мы сажали овощи, убирали сено, работали на кухне.

Мы поселились в дощатом ларьке, где до войны торговали хлебом. Там стоял большой хлебный ларь, в котором можно было прятаться, когда по ночам немцы проводили проверку. Он был недалеко, где сейчас находится музей, а в то время там находилось гестапо и тут же через дорогу от нас – тюрьма. Потом ее разрушили. Сколько страданий перенесли люди в ее стенах! Было страшно по ночам, когда подъезжали машины. Люди плакали, а утром мы опять слышали, как увозили людей за город и расстреливали. Жители Майского Посада слышали стрельбу в овраге. Это место за лагерем, в котором мы находились. До нас там был лагерь наших военнопленных. По ночам немцы в касках с автоматами и большими бляхами на груди, на которых было написано «Полевая жандармерия», про-

2017©nasledie-sluck.by

веряли, нет ли партизан. Сестра пряталась в лагере. Мы, дети, спали на полу. Я маскировалась под мальчика, одевая кальсоны.

В городе действовали подпольщики. Часто были слышны взрывы. Взорвали тогдашнюю биржу труда, чтобы спасти молодежь, которую должны были угнать в Германию.

Немцы устраивали облавы на рынке, окружали кольцом, подгоняли машины и везли людей в тюрьму. В одну из облав попала моя сестра. Она бегала, просила выпустить, говорила, что у нее маленькие дети, и один из полицаев – житель Слуцка – выпустил ее. Мы жили в постоянном страхе. Ходили слухи, что немцы покидают город, что наши уже близко. Люди стали уходить из города, боялись, что немцы просто так не покинут город. Так и получилось. Немцы стали поджигать дома огнеметами. Горели дома по всей центральной улице. Город пустел, мы спрятались в подвале разрушенного дома. 30 июня 1944 года я пробралась к отверстию, которое выходило на главную улицу. В отверстие я увидела людей на лошадях и не могла понять, кто это. Потом послышался шум моторов. Это подъезжали танки к нашему подвалу. Мы боялись выходить, но когда послышалась русская речь – вышли и увидели наших солдат. Все плакали от радости.

После освобождения я пошла искать работу. Там, где была больница, расположился прифронтовой госпиталь. Нас просили носить воду в баню, где мыли раненых, а потом ухаживать за ними. Многие умирали, им даже не успевали делать операции. Потом солдат отправляли санитарным поездом в тыл. Госпиталь переехал ближе к фронту. На его место прибыл другой, и в нашей помощи уже не нуждались.

Слуцкі край. 2010. 7 мая.

З успамінаў Кандрація Іванавіча Кляузава, ураджэнца Смаленшчыны

Разместили нас в вагоны (в поселке городского типа Сычевка Смоленской области) и повезли в неизвестном направлении. В итоге мы попали в город Слуцк. Нас выгоняют из вагонов, выбирают тех, кто старше 12 лет. Их участь – прямой путь в Германию. Повсюду – плач детей, женщин. Нас же, маленьких детей с матерями и стариков, гонят на окраину города, где подготовлены места для нашего пребывания. Это были хранилища какого-то хозяйства и коровники, огражденные колючей проволокой в три ряда, со сторожевыми будками. Внутри этих помещений были поставлены нары.

Немцы остановили нас около двухэтажного здания. Эта была школа, из которой доносились крики. Оказалось, в этом здании были собраны евреи. Фашисты на наших глазах здание подожгли, показав, что и нас может ожидать подобное.

Итак, мы в концлагере. Зима, морозы. Казармы забиты людьми. Кормили нас какой-то баландой. Хлеба давали крохи, да и то такого, что трудно было назвать его хлебом. Начался повальный мор. В центре лагеря был выкопан ров, куда бросали замороженные трупы...

Надо было как-то выживать. Я знал молитвы. И мне пришла идея пойти на проходную, прочитать «Отче наш» и попросить, чтобы полицаи выпустил меня за пределы лагеря. Этим я пользовался

2017©nasledie-sluck.by

Р.С. Левая (Жукома), вязень Слуцкага лагера

К.С. Левы, вязень Слуцкага лагера, партызан атрада імя Лаза брыгады імя Чкалава, з жонкай. 1943 г.

А.Р. Гусева (Жарыкава), былая вязень Слуцкага лагера

Былы непаўналетні вязень Слуцкага лагера С.А. Сбрусь

В.А. Гусеў, былы вязень Слуцкага лагера

А.Ф. Працэвіч (Гіль), вязень Слуцкага лагера

Адкрыццё памятнага знака на месцы былога лагера палонных

Каля памятнага знака на месцы былога лагера палонных

2017©nasledie-sluck.by

потом не один раз. Когда вернулся с подаяниями (брюквой, свеклой, кислой капустой, зерном и другим), полицаи поверили мне и стали пропускать. Так я спасал родных и чужих от голодной смерти. Кто же пытался сделать подобное нелегальным способом, тех расстреливали или травили собаками.

В лагере мы пробыли до конца весны. Оставшихся в живых опять построили и погнали на железнодорожную станцию. Отбирали только тех, кто мог работать. Дальше нас повезли в сторону Германии, но не довезли. Остановились на станции Юратишки, что недалеко от города Лиды. На платформе нас ожидали люди, жители окрестных хуторов. Они и разобрали нас, как рабочую силу. Мы звали их панами.

Когда наступали наши войска, фашисты пытались замести следы своих злодеяний и на территории лагеря все сравняли с землей.

Слуцкі край, 2006. 21 чэрвеня.

ГАВОРАЦЬ СВЕДКІ СПАЛЕНЫХ ВЁСАК

Беларускія Хатыні… Гэта тая рэальнасць, практыка, якую фашызм рыхтаваў цэлым краінам і кантынентам, але распачаць шырока паспеў толькі тут. Велізарнымі ахвярамі наш народ заплаціў за тое, каб іншыя народы не зведалі соцень і тысяч сваіх Хатыняў. Пераходаў… Пра гэта павінны ведаць усе.

З успамінаў Любові Іванаўны Амбражэвіч (Статкевіч), 1927 г.н., в. Адамова, жыхаркі в. Сярагі

Наша семья – папа, мама, три брата, три сестры и я жили во втором застенке (поселке) Адамово. Первый застенок за мостами через реку Случь был сравнительно небольшим – всего 15 домов. В нашем застенке было значительно больше домов и жителей. До войны я ходила в школу в деревню Поликаровка, но окончить ее не удалось – война проклятая помешала. Тот день, вторник, когда сожгли Адамово, 23 февраля 1943 года, я не забуду никогда. Утром мама говорит: «Собирайся, в первом Адамово немцы, будут забирать людей на каторгу в Германию. Уходи скорее в лес либо дождись, пока я не сообщу, что каратели ушли из деревни».

Позже я узнала, что в первом застенке Адамово жителей загнали в большой дом на окраине и сожгли заживо. Чудом удалось спастись и убежать только Евгению Соловью и Зине Довнар (теперь Климович). Мы не знали, что каратели ограбят и сожгут дома, соберут молодежь и увезут на каторгу. Таких облав еще не было.

Я побежала в лес. Было тяжело передвигаться – зима очень снежная, к тому же во время оттепели под снегом стояла вода. Когда вбегала в лес, то услышала – что-то свистит и стучит по деревьям. Оказывается, это пули свистели вокруг меня. Каратели открыли огонь по убегающим. Но нам все-таки удалось добежать до леса и скрыться. Нас было пятеро из Адамово: двое мужчин и три девчонки. Долго мы ждали, когда за нами кто-то придет, но никто не звал нас в деревню... Тогда мужчины залезли на деревья и увидели, что Адамово

2017©nasledie-sluck.by

горит. Решили заночевать в лесу, а утром пошли в застенок. Идем, смотрим – Адамово нашего нет.

На пожарище родного дома я увидела, как бродят по пеплу две куры, а недалеко от этого места лежит обгоревший подсвинок. В тот день погибли 213 жителей Адамово, среди погибших – одиннадцать родных душ, среди которых – папа, мама, две сестры, три брата, семья тети... Только косточки остались. Как хоронить, в чем хоронить? Не осталось ни дома, ни сарая, ни построек, догорали заборы...

Пошла я в деревню Павловка к родной тете. И пошли мы с ней хоронить то, что осталось от моих родных. Тетя взяла лопаты и наволочки. Выкопали на огороде могилу, куда снесли собранные кости и пепел, оставшиеся от моих родных и близких людей. Уже после войны я перезахоронила их на кладбище и поставила памятник...

...Я пошла жить в Павловку к тете, но немцы не давали нам спокойно жить и дальше. В лесу на болоте построили шалаши. Как только партизаны сообщали, что готовится блокада, жители Павловки уходили в заранее построенные гражданские лагеря, а имущество прятали в сараях. Продукты закапывали в сундуках ночью. Однажды закопали вещи на кладбище, но кто-то нашел их. Приходилось жить на болоте неделями. Как только сообщат партизаны, что каратели ушли, – возвращаемся домой, в Павловку. Так было несколько раз до прихода Красной армии.

Особенно длительной была фашистская карательная блокада «Марафон». Это было в июне 1944 года. Было страшно. Я уже жила в Вербищино у другой тетки. Партизаны и жители, оставшиеся в гражданских лагерях, уходили в Воробьевские болота. Немцы шли за нами с собаками. Это были части, снятые с фронта, и эсэсовцы. Мы убежали на болото, я сумела спрятаться под выворот большого дерева: как увижу фашистов – в воду погружаюсь. Те люди, которые выходили на острова, попадали под пулеметную очередь. Вокруг понаставили карателей, мины. Видела детей, которых бросали родители, чтобы спастись самим в болоте, со мхом во рту. Позже мы выносили их, уже умерших, из болота в лес и хоронили... Многих каратели забрали с собой, вывезли в Германию.

Помню, возвращаюсь я из Вороничского болота в Павловку после блокады, вижу – что-то белое на ветках висит. А я иду босиком. Запуталась в этих белых нитках. Оказалось, это кишки человеческие. Страшно...

Пробираюсь босая по лесу, смотрю – на дорожке стоят два сапожка, да такие красивые, что я не могла решить: подойти взять или пройти мимо. Ведь я босая. Смущало то, что когда-то партизаны предупреждали, что немцы таким образом ловушки расставляют. Три раза к ним возвращалась, но взять все-таки побоялась. Позже партизаны нашли в этих сапожках замаскированную мину-ловушку. Так я уцелела. Видимо, Бог сберег, чтобы жила и всем рассказывала, что творили фашисты с нашими людьми в годы оккупации. После окончания блокады еще жила у тети в Павловке. Помогали нам партизаны, продукты давали – сало, хлеб. Предупреждали нас, когда уходить в лесные лагеря.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Зінаіды Зенаўны Клімовіч (Цвірко), 1925 г.н., в. Адамова, дзе жыве і цяпер

Калі карнікі раніцай акружылі Адамова, маці яшчэ не паліла печ, у хаце гарэла лучына. Мы ўсе рашылі, што немцы прыехалі, каб адабраць моладзь для адпраўкі яе ў Германію на катаргу. Мама сказала: «Куды цябе, Зіначка, схаваць, пака не сыйдуць карацелі? Адзявайся і ідзі за мной у склеп». Сюды прыйшлі і мае сяброўкі – Соня Бранавіцкая і Маня Корзун. Праз некаторы час прыбегла да нас мама і кажа: «Карнікі з абознікамі амаль каля хаты, сядзеця ціхенька і не высоўвайцеся. Паесці не паспела вам прынесці, але пацярпіце. Як толькі яны з Адамова, я вас пазаву».

Мы сядзелі ціхенька, як мышкі, і пачулі разгавор маей браціхі з паліцаямі. Яна прасіла іх, каб пашкадавалі дачку. Чулі, як выгналі карову, як выносілі хатнія рэчы і ўкладвалі іх на сані. Раптам пачулі выстралы і ўсё стала ціха.

Праз некаторы час пачулі, што хтосьці з карнікаў падпаліў каноплі і кінуў у наш склеп… Паваліў дым, я схваціла пылаючы факел, затаптала яго нагамі і выкінула на снег.

Сядзелі мы з дзяўчатамі доўга, чулі крыкі і страляніну. Сядзелі і чакалі. Чакалі доўга, да тых пор, пакуль не зайшоў да нас Мікалай Корзун, брат Мані. Ён сказаў, што ні паліцаяў, ні немцаў у засценку няма, як няма і самога Адамова – толькі адны каміны ад печаў стаяць… Жудасна, балюча і цяжка было ўсё гэта бачыць, але яшчэ цяжэй адчуваць, што страчаны родныя і блізкія людзі.

Мы ўсе пайшлі спачатку на Рудню, а потым у Апаліны – суседнюю вёску. Вельмі хацелася есці. Па дарозе не сустрэлі ніводнага чалавека. Жыхары суседніх вёсак пакінулі свае сядзібы, даведаўшыся пра расправу над жыхарамі Адамова.

У гэты дзень я страціла матулечку, бацьку, брата і яго жонку, пляменніцу… У жывых засталася старэйшая сястра Соф'я, якая з сям'ёй жыла ў Пухавіцкім раёне.

Фашысты знішчылі ўсю маю сям'ю, нашу хату. Душа была паранена, і гэтыя раны ніколі не зажывуць. У гэты дзень з маімі роднымі ў вялізнай пуні вёскі Адамова загінула 213 яе жыхароў… Ці ж такое можна забыць і дараваць? Не, ніколі і нікому!

З успамінаў Яўгена Сямёнавіча Салаўя, 1927 г.н., в. Адамова, жыхара в. Ленькі

З лютага 1943 г. партызан атрада імя Ф.Э. Дзяржынскага партызанскай брыгады імя М.В. Фрунзе, з 1944 г. змагаўся на 1-м Беларускім фронце. Быў цяжка паранены і застаўся інвалідам. Узнагароджаны ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны I і II ст., медалямі «Партызану Вялікай Айчыннай вайны», «За перамогу над Германіяй». Пасля вайны звыш 40 гадоў працаваў на Гацукоўскім торфабрыкетным заводзе. Цяпер жыве ў в. Ленькі Покрашаўскага сельсавета.

У 1942 годзе мяне, сямнаццацігадовага хлопца, унеслі ў спіс на адпраўку моладзі ў Германію на катаржныя работы. Я не хацеў ехаць і хаваўся днём ад паліцаяў у лесе, а ноччу тайком

2017©nasledie-sluck.by

вяртаўся дамоў. У студзені 1943 года паліцаі мяне усё ж такі вылавілі, збілі і загадалі, каб на наступны дзень прыбыў у Грэскую ўправу. Туды я не прыйшоў і зноў стаў хавацца ў лесе. У адзін з лютаўскіх дзён, калі я быў у сваёй хаце, мама прыйшла з вуліцы і сказала: «Чаго ты сядзіш? Немцы ўжо на мостах каля вёскі. Бяжы ў лес». Покуль я збіраўся, карнікі акружылі вёску. Трое паліцаяў зайшлі ў хату і загадалі: «Збірайцеся, паедзеце ў Германію. Тут у вас адзін бандытызм, а там пападзяце ў рай».

Толькі мы падышлі да суседняга дома, як у нас аднялі ўсё, што было з сабой. Мяне, сястру, брата і маму загналі ў памяшканне. Туды прыгналі і астатніх жыхароў нашага засценка (пасёлка). Дзверы забілі, а паліцэйскі залез на дах і падпаліў хату. Малыя дзеці кінуліся на другую палавіну, дзе было сена. Людзі пачалі крычаць, кідацца. Каля мяне аказалася мама, якая сказала: «Спасайся хоць ты, сынок». Задыхаючыся ад дыму, людзі разбівалі вокны, стараючыся выскачыць на вуліцу, але карнікі білі іх прыкладамі і ўпіхвалі ў палаючую хату. Якімсьці цудам мне ўдалося выскачыць і дабрацца да агародчыка. Потым я устаў і пабег да ўскрайку леса. Мяне заўважылі, паліцэйскі выстраліў, але не папаў. З суседняга засценка па мне стаў страляць кулямётчык. Свісталі кулі, паднімаючы снег і дзёран. На мне гарэла ватоўка і валёнак. Дабраўшыся да лесу, скінуў яго, а нагу заматаў парцянкай. З цяжкасцю ўдалося затушыць ватоўку. Забраўся на дрэва і прасядзеў там да ночы. З вёскі даносіліся жудасныя крыкі.

Я.С. Салавей

У другім пасёлку, Адамова, карнікі палілі людзей у калгасным амбары. Ужо к вечару засталіся ад вёскі адны каміны. Каля нашай хаты хадзіў наш кот з абгарэўшым бокам і жаласліва мяўкаў. Яшчэ ў лесе я сустрэў аднавяскоўца Юліка Акуліча. Яму таксама цудам удалося выратавацца. Разам мы бачылі, як вёску пакідаюць абознікі, якія гналі скаціну і вязлі нарабаванае дабро. А крыху пазней у Грэск накіраваліся карнікі і паліцаі. Яны былі п'яныя і пад гармошку гарланілі песні. Раніцай наступнага дня ў спаленую вёску прыйшла і яе жыхарка Вольга Статкевіч, якая адсутнічала ў час карнай аперацыі. Утрох мы разбіралі астаткі людзей на папялішчы спаленай хаты. Я знайшоў абгарэлыя целы мамы, браціка Вовы, сястрычкі Вольгі. Злажыў іх у посцілку, збіў трунку і пахаваў у двары сваёй хаты. Астанкі іншых людзей мы пахавалі ў братэрскай магіле непадалёку ад месца гібелі.

У хуткім часе я і Юлік падаліся да партызан. Пачалося партызанскае жыццё.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Надзеі Антонаўны Алісевіч (Ліневіч), ураджэнкі в. Беразінец, жыхаркі Слуцка

У маіх бацькоў Антона Рыгоравіча і Марыі Венядзіктаўны, акрамя мяне, было двое сыноў: Аляксандр і Віктар. Маці працавала ў мясцовым калгасе «8-е Сакавіка», куды ўваходзілі і жыхары вёскі Жылін Брод. Колькі сябе памятаю, раслі без бацькі. Перад вайной старэйшы брат Аляксандр працаваў у Грэску на пошце шафёрам, Віктар жыў і працаваў у Мінску. А я пасля заканчэння вучобы ў школе ўладкавалася на працу ў ашчадную касу і адначасова вучылася на бухгалтарскіх курсах, а жыла на кватэры ў Грэску.

Вайна абарвала ўсе жыццёвыя планы, рыхтаваліся да эвакуацыі. У гэты час прыйшла маці і запрасіла жыць да сябе ў Беразінец. Нас на машыне брат Аляксандр давёз амаль да вёскі, а сам павёз супрацоўнікаў пошты на ўсход.

Першы раз нямецкія салдаты прыехалі ў Беразінец летам 1941 года на матацыклах. Маладыя, загарэлыя, рукавы рубашак закатаныя, вясёлыя, на маю мамку кажуць: «Нясі млека, яйкі». У хуткім часе акупанты распусцілі калгасы, нашай сям'і дастаўся бык. Здаровы, вялізны, але страшэнны гультай, прыйшлося абмяняць яго на каня. Аднойчы зімой 1943 года ў Беразінец на санях прыехалі паліцаі, пасля таго як партызаны разбілі нямецкую калону каля вёскі Жылін Брод. Яны сабралі ўсіх жыхароў вёскі Беразінец і папярэдзілі, каб мы не дапамагалі партызанам, бо інакш будзе тое самае, што і з гэтымі бандытамі. І паказалі нам чатырох забітых маладых хлопцаў-партызан, якія ляжалі на санях.

З Мінска ў Беразінец вярнуўся брат Віктар. Мы задумалі ў хаце зрабіць рамонт. Пераклалі падлогу, сусед Сасіноўскі зрабіў нам шафу, у якой мы размяшчалі адзенне. Новае адзенне і бялізну схавалі ў вялікі куфар, які закапалі. Раніцай 23 лютага 1943 года мама паехала з Мікалаем Булынка, з суседняй вёскі Задоўба, у Слуцк штосьці прадаць і купіць солі. Праз некаторы час к нам у хату забег суседскі хлопчык Яська Цвірка і гаворыць: «Беразінец акружаюць немцы, і іх вельмі шмат». Я вельмі баялася нямецкай катаргі і падалася ў лес. На вясковай вуліцы да мяне падбегла Анечка Ёдка, якой было пяць гадоў, і стала прасіць і плакаць, каб я яе забрала з сабой. Я яе не забрала, аб чым шкадую і цяпер. У суседняй вёсачцы Задоўба я зайшла да сяброўкі – Булынка Насці: «Насця, пайшлі хавацца ў лес ад карнікаў, бо яны ўжо ў Беразінцы і хутка будуць тут». Пака гутарылі, над лесам з'явіўся чорны дым. Гэта гарэла хата Бранішэўскіх у Жылін Бродзе. І мы пабеглі ў лес. Там сустрэлі брата Віктара, які распаліў вогнішча, бо сцямнела. Да нас падышоў Бранавіцкі Сцяпан. Ён вяртаўся з Сялецка да сваіх у Палікараўку. Мы яму расказалі пра карную аперацыю, і ён адразу пайшоў у бок Палікараўкі. Каля вогнішча сабралася моладзь з Беразінца. Хлопцы пайшлі ў Беразінец паглядзець, што стала з роднымі. Назад яны вярнуліся з Ганнай Лісоўскай, якая расказала, як карнікі распраўляліся з жыхарамі вёскі. Сама яна была паранена і выпаўзла з палаючай хаты, калі немцы пакінулі вёску. Брат Віктар знайшоў у лесе запрэжанага каня і мы вярнуліся ў Беразінец. Дамы спаленыя, замест людзей галавешкі. Вялікі рост – дарослыя, маленькія – дзеці. Мы адкапалі куфар і хавалі забітых у прасцінах і навалачках. Усіх

2017©nasledie-sluck.by

загінуўшых жыхароў Беразінца пахавалі ў чатырох агульных ямах.

Мы прынялі рашэнне пераехаць на жыхарства ў вёску Шулякі. Сусед Смольскі данёс на нас, як на партызан, у Грэскую ўправу. Даведаўшыся аб гэтым, пераехалі ў вёсачку Старына, што недалёка ад Грэска. Сям'я Акінчыцаў прыняла нас як родных, хоць і былі мы ім чужыя. Аднойчы ў вёску заглянулі грэскія паліцаі, хтосьці з жыхароў сказаў, што мы не мясцовыя. Нашу сям'ю забралі ў паліцэйскі ўчастак, пасадзілі ў камеру, дзе мы сядзелі без яды і вады. Я думала: калі нас будуць расстрэльваць, як станавіцца – спіною к катам ці тварам да іх. Рашыла – буду глядзець у вочы. Брата Віктара пазнаў знаёмы паліцэйскі Сеўрук з вёскі Ульянаўка і расказаў пра нас начальніку грэскай паліцыі, што мы не партызаны. Той прыняў рашэнне – адпусціць нас. І мы вярнуліся ў Старыну.

Пасля вайны выйшла замуж за Францa Алісевіча, у нас нарадзіліся двое дзетак. Спачатку жылі ў Старыне, а ў 50-х гадах мінулага стагоддзя купілі пляц са старэнькай хатай у Слуцку і сталі будавацца. Я і муж працавалі ў УП «Ямпаль».

З успамінаў Ядвігі Пятроўны Ліпніцкай (Міхневіч), ураджэнкі в. Беразінец, жыхаркі в. Покрашава

Ужо ў першы месяц вайны мясцовыя актывісты пайшлі ў партызаны. Летам яны былі ў лагерах, а зімой «стаялі» ў вёсках. У кастрычніку 1942 года партызаны разбілі калону нямецка-фашысцкіх захопнікаў, зброю забралі, а машыны спалілі. Карнікі не прымусілі доўга сябе чакаць: спалілі 40 дамоў у Жылін Бродзе і адзін у Беразінцы – наш дом. Таму мы вымушана пераехалі да сястры бацькі, дзе і пражылі да 23 лютага 1943 года. Менавіта ў гэты дзень у вёску прыйшлі паліцаі, эсэсаўцы, абознікі. Яны забіралі ў вяскоўцаў жывёлу, збожжа, цёплае адзенне. А потым пачалі паліць дамы, забіваць людзей. Мая сястра Зіна разам з сяброўкамі пабегла ў суседнюю вёску Задоўба. Я сядзела ў хаце, зірнула ў акно: ідзе да нас немец, а ў суседзяў гарыць дом. Раптоўна на вуліцы з'явіліся паліцаі, яны схапілі маю сяброўку Іру Цвірка, падкінулі яе ўверх, стрэлілі, а потым кінулі ў агонь. Я выбегла ў двор. На прызбе сядзеў бацька, ён быў разгублены і нічога не разумеў, цётка Аляксандра стаяла на каленях перад карнікам і прасіла выратаваць дзяцей. Немец зжаліўся, прапанаваў запрэгчы каня і нічога з сабой не браць, толькі дзеда (майго бацьку) не забыць. Немец вывеў нас з вёскі. На дарозе ляжалі забітыя людзі. Ніколі не забуду, што ўбачыла ў Палікараўцы: вяскоўцаў жывымі палілі ў калгасным свірне, людзі жудасна крычалі, мне здавалася, што свет перавярнуўся. Мы даехалі да мамы і накіраваліся ў Шышчыцы да бацькавых сваякоў. Мы хвалявaліся за Зіну, але праз пэўны час яна прыйшла да нас і расказала, як хавалі ў вёсках Беразінец, Крушнік, Палікараўка і іншых спаленых і забітых жыхароў.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Ніны Аляксандраўны Сасіноўскай, ураджэнкі в. Беразінец, жыхаркі в. Жылін Брод

Как только произошел бой в районе нашей деревни Жилин Брод, мне свекровь и говорит: «Беги к мужу в Василинки (он там плотничал) и предупреди, чтобы домой сегодня не приходил, а не то его немцы по дороге убьют».

Встретила мужа, и мы заночевали в Василинках, а наутро отправились домой. Уже издали увидели зарево огня и клубы дыма. Муж сказал: «Не иначе, как Жилин Брод горит». Домой возвращаться не решились. Пешком пошли в Греск, чтобы узнать о дальнейшей судьбе наших родных. Уже на подходе увидели, как жилинбродцев колонной гнали немцы и полицейские. Их построили возле школы, а напротив расставили пулеметы. Подходили офицеры и пулеметчики, что-то говорили, а потом всех загнали в школу… Мы с мужем три дня пробыли в Греске: ночевали, где придется, питались тем, что подадут люди. А потом узнали, что всех их отпустили. Вернувшись в Жилин Брод, увидели, что деревня сожжена. От нашего дома остался лишь погреб с полуобгоревшей картошкой. Часть жителей перебралась к родственникам и знакомым в другие деревни. Моя мама поселилась у старшей дочери в Березинце. А мы с мужем ходили от села к селу. Он был хорошим плотником, этим и зарабатывал на хлеб. Устав от скитаний, в феврале 1943 года, за пять дней до карательной операции, мы тоже пришли в Березинец и поселились вместе с мужем в доме моей родной сестры Михневич Александры Александровны. В это время я ждала ребенка…

…Рано утром 23 февраля 1943 года мой муж увидел приближающихся к мостику возле деревни Березинец карателей (немцев и полицаев). Он зашел в дом и сказал: «Немцы, уходим в лес».

В лес уходила только молодежь, а пожилые люди и женщины с детьми остались дома. Я тоже ушла с мужем в соседнюю деревню Задовба, а затем мы спрятались в лесу.

З успамінаў Аляксандры Аляксандраўны Міхневіч, сястры Н.А. Сасіноўскай

Когда немцы подожгли соседний дом, у меня были одни мысли, как спасти моих мальчиков. Сама брошусь в колодец, а куда деть детей? Стою во дворе, и вдруг заходит немец. Я ему говорю: «Пан, я вернусь домой и возьму хлеба». А он отвечает: «Матка, алес капут». Я упала перед ним на колени и стала просить, чтобы пожалел детей. Немец был пожилым, забрал детей и приказал мне идти за ним. Отвел нас в обоз, где стояли лошади, а на санях лежало добро местных жителей. Детей посадили в сани, и он не отходил от нас до Жилин Брода, куда каратели ушли после того, как расправились со всеми жителями Березинца. В Жилин Броде каратели сожгли уцелевший с осени 1942 года дом и стариков Бранишевских, с ними и семью Карповича. В Березинце чудом выжила Лисовская Анна. Она была ранена в своем доме и лежала без сознания как будто убитая, затем очнулась и выползла в

2017©nasledie-sluck.by

огород перед тем, как рухнула крыша дома, и наблюдала, как горят дома в Березинце. Точно так же спаслась и выжила в д. Переходы Степанида Дардынская, одна из немногих уцелевших в тот злополучный для наших земляков день...

В деревне погибло 116 жителей из 136...

З успамінаў Анастасіі Мікалаеўны Шык (Булынка), 1924 г.н., в. Беразінец, жыхаркі Мінска

Мои родители: папа – Булынко Николай Мартинович, 1902 года рождения, мама – Булынко Федора Гавриловна, 1902 года рождения. Я окончила три класса начальной школы в деревне Жилин Брод, потом – семь классов Поликаровской неполной средней школы. Восьмой и девятый классы заканчивала в деревне Гольчицы Первомайского сельсовета. В 1940 году поступила в двухгодичный учительский институт в городе Могилеве. Пошли разговоры, что обучение будет платным (а у родителей, кроме меня, был еще сын Вячеслав – 1929 года рождения). Поэтому я, с разрешения родителей, накануне дня Великой Октябрьской социалистической революции вернулась домой. Весной 1941 года меня приняли на работу ученицей бухгалтера в сельпо в деревне Поликаровка, а через три месяца началась война. В нашей деревне Березинец было примерно 14 дворов. Одна улица, но красивая – на поляне стояла, а кругом – лес, в километре от нас – Жилин Брод. Поскольку изба наша была старая, то правление колхоза «8 Сакавіка» разрешило нам переехать в пустующий дом (возможно, его хозяева были куда-то высланы) в деревню Переходы. Прожили мы там около года, потом родители купили подворье на хуторе Задовба, было это в 1935–1936 годах. Там мы прожили до начала войны. С хутора было решено переселяться в центральные усадьбы колхозов. Мои родители начали строиться в деревне Жилин Брод. Весной 1941 года они построили пятистенок, и мы надеялись к зиме перебраться в новый дом. Помню 22 июня 1941 года, воскресенье, я – в деревне, гуляю, родители работали на стройке (хотя и старались тогда в воскресенье не работать). Вдруг кто-то приехал из Поликаровки (там был центр сельсовета) и сообщил, что началась война. Мама спросила: «А с кем война?». Я сказала: «Немцы начали войну». Мама говорит: «Если немцы, то всех нас убьют».

К осени мы перевезли из Задовбы сарай для скота и помещение для хранения овощей и других продуктов. Сами заселились в половине новой избы, где была печь. А весной 1942 года я заболела сыпным тифом. Врачей не было, не было и лекарств, но благодаря уходу родителей я выздоровела и никто в семье этой болезнью больше не заболел.

На хуторе Задовба было шесть дворов. Был еще один хутор с таким же названием – Задовба, на расстоянии около километра или полтора от нас, с тремя дворами. С этого хутора в Жилин Брод переехала семья Афанасия Коляды. Деревни наши, или застенки, как их тогда называли, были небольшие, кругом стоял лес. Вскоре мы стали партизанской зоной. Немцы и полицаи приезжали сюда только с карательной целью или за дровами. Небольшой полицейский гарнизон в Поликаровке разгромили партизаны.

2017©nasledie-sluck.by

Осенью 1942 года партизаны узнали, что фашисты будут ехать через Жилин Брод то ли за дровами в Круглое, то ли грабить местное население, и сделали засаду около Жилин Брода. Я не знаю, прорвались ли оккупанты или нет, но бой был. Тогда или во второй раз, когда партизаны побили карателей уже возле деревни Фадеевка, жители деревни фашистами были жестоко наказаны. Оккупанты сожгли деревни Фадеевка и Жилин Брод (осталась одна или две избы). Все, что можно было забрать, оккупанты перед карательной операцией забрали – скот, зерно, картофель. Жителей сожженных деревень тогда не убили.

Наша семья вернулась в Задовбу, но жить в нашей избе было нельзя, не было печи. Поэтому корову поставили в избу, а сами поселились у моей тети Стасевич Елены Мартиновны, папиной сестры. Кроме нашей семьи, у тети Лены поселилась семья из Жилин Брода Карповича Петруся: его жена и двое детей. Так и жили мы до 23 февраля 1943 года.

Помню, это был вторник. Я была простужена и лежала в постели, когда мама пришла со двора и говорит: «Вставай, наверное, немцы идут, стрельба слышна».

Я поднялась, стала быстро собираться, боялась, что каратели заберут в Германию на каторгу. Через некоторое время к нам зашли несколько человек из Березинца, чтобы идти дальше в лес прятаться от фашистов. Пришли моя двоюродная сестра Булынко Мария Мартиновна, моя подружка Леневич Надежда Антоновна, ее брат Виктор, Лисовский Тодик. По-моему, были и Коледа Александра со своей младшей сестрой Анной. С нами ушел в лес Петрусь Карпович, Стефа Чигорская. Мы видели дым над Жилин Бродом – это горела последняя изба деревни, уцелевшая с осени 1942 года.

Мы отошли от хутора примерно на километр. Только зашли в лес, как началась стрельба в Задовбе. Из-за оттепели много воды было. Перебирались от кочки до кочки. Мы надеялись, что немцы побоятся воды и не пойдут в Задовбу, но они, на беду людей, не побоялись.

Перед заходом солнца все стихло, мы пошли дальше в лес. Затем вернулись к хутору, на опушку леса выглянули и поняли, что Задовбы больше нет. Мы своей группой подошли к нашему пожарищу – никого, подошли ближе и стали окаменев, не веря своим глазам. Виктор Леневич наконец говорит: «Боже мой, сожгли людей заживо».

После этих слов мы очнулись и заплакали. Увидели лежащие на пожарище обгорелые трупы. Мы пошли в Березинец. Там было то же самое, что и в Задовбе. Жена Тодика Лисовского была в положении и поэтому не пошла с ним, осталась. Теперь она лежала полуобгоревшая на пороге своего дома. Через улицу от дома Лисовских стоял новый сруб, с покрытой крышей и вставленными окнами. Немцы его подожгли, но он не загорелся. Вдруг слышим, там кто-то стонет. Мы зашли в него и увидели раненую Анну – мать Тодика Лисовского. Дальше был дом папиного брата Булынко Мартина Мартиновича. Он сам, его жена Ольга, сын Миша и младшая дочь, не помню ее имени, лежали убитые в своем дворе. Наверное, они выносили вещи из своего дома и складывали их на повозку, чтобы убежать от фашистов. Некоторые их вещи были разбросаны возле колодца, здесь же лежали и мои убитые родственники. Две дочери дяди

2017©nasledie-sluck.by

Мартина спаслись: Мария была со мной в этот день, а Надя спаслась вместе с тетей в деревне Крушник. Эту деревню фашисты также сожгли с людьми (фамилия тети из Крушника – Тригубович).

Мой папа и мама Нади Леневич поехали с утра в Слуцк – раздобыть соли и мыла, а когда вернулись в Березинец, все уже было сожжено.

В нашей бывшей усадьбе в Березинце жила семья Коляды Афанасия. Они переехали после октября 1942 года из Жилин Брода. Когда мы подошли к ней, то увидели пожарище. Жена Афанасия вынесла из дома вещи и сложила их недалеко от дома, но уйти сама не успела. Фашисты убили ее возле дома. Мы здесь, нагоревавшись, заночевали, а утром разошлись хоронить своих родных, близких и односельчан.

Мама лежала рядом с братиком, и когда я дотронулась до их трупов, то они рассыпались пеплом. Тетю долго не могли найти в доме, ее завалило штукатуркой. На пороге лежал обгоревший труп, кто-то из Задовбы сказал, что это из соседней Задовбы женщина пришла в нашу Задовбу, перед самым приходом немцев. Наверное, это и был ее труп. А там, где стоял стол, сидели в углу мертвые Зося со своими дочками. Старшая Валя была убита, младшую, Анютку, Зося держала на руках. Видимо, когда мать убили, то она упала на Анютку и девочка задохнулась под ее телом, так как тельце ребенка было не обгоревшее.

Мы с ее отцом выкопали яму, а завернуть пепел и косточки не было во что. Тогда мы отодрали кору от печных колод и выложили этой корой дно ямы и там захоронили дорогих и близких нам людей. Так хоронили погибших на всех пожарищах нашей многострадальной Слутчины. Сверху могил мы установили кресты. Жить нам было негде, одежда, обувь были только те, что на нас. Все «недогарки», как мы себя называли, собрались в лесу, решали, как жить дальше. На пожарище мы нашли топоры, лопаты, картофель, сало. Построили из елок шалаши, стелили на землю елки. Мужчины постарше сутки жгли костер, и мы все обогревались, варили еду.

Раненую Аню Лисовскую положили на сани, где было сено, укрыли одеждой, перевязали, накормили, переодели. Она выжила и рассказала нам, как каратели жгли Березинец. Папа разыскал своего брата Булынко Андрея Мартиновича, проживавшего в Адамово. Эту деревню каратели также сожгли вместе с жителями. Андрей Булынко остался в живых. На счастье, его не оказалось дома 23 февраля 1943 года. Из шести его детей (четыре сына и две дочери) в живых осталась старшая дочь Саша, 1923 года рождения. Когда каратели жгли Адамово с людьми, она спряталась в склеп. Склеп тоже подожгли. У Саши прогорел платок, немного подгорели волосы, но она чудом осталась жива. До войны Саша окончила педагогический техникум и работала учительницей. Она рассказала, что брат Миша уехал в лес, каратели его застрелили. Четверо остальных – братья, сестры и мама были заживо сожжены карателями. Дядя Андрей договорился с жительницей небольшой уцелевшей деревни Смолярня (недалеко от Адамово), чтобы она приняла его с дочерью – жить в ее доме. Хозяйка сама воспитывала двоих несовершеннолетних сыновей. Она согласилась и приняла не только его, но и нас с папой и двумя дочерьми погибшего дяди Мартина. Так мы вдевятером стали жить в Смолярне.

2017©nasledie-sluck.by

В скором времени дядя Андрей с моим папой ушли в 95-ю партизанскую бригаду им. М.В. Фрунзе, отряд им. С.М. Кирова. Мы в Смолярне остались жить всемером, были как одна семья. У меня, дяди Андрея и нашей хозяйки остались коровы, так что было что есть. Папа с дядьями помогли посеять хлеб, убрать его в скирды, обмолотить. Через некоторое время дядя женился на хозяйке. Я и две мои двоюродные сестры ушли жить в землянку между Жилин Бродом и Переходами, где уже жили трое взрослых и малолетние дети. Спали на нарах, сеяли картофель, ячмень. Овощи были, но не было соли и жиров. Там и дождались прихода Красной армии. Сколько было в тот день радости и слез!

4 июля 1944 года мой отец ушел на фронт. Проходил службу в 883-м стрелковом полку на 2-м Белорусском фронте. Мы втроем переехали в Смолярню в колхоз «Случь». Так как все деревни вокруг были сожжены и жить было негде, то поселились мы у стариков Быстримовичей. Восстанавливали колхозы, подсчитывали убытки, которые принесла оккупация Слутчине.

Поликаровка – центр сельсовета, до войны здесь был центр колхоза им. Сталина. Находились неполная средняя школа, почта, сельпо, сельмаги, машинно-тракторная станция. Все это было сожжено фашистами вместе с жителями. Всех жителей Поликаровки сожгли в амбаре в конце деревни. Перед дверями поставили пулемет, из него стреляли внутрь помещения: кто-то был убит сразу, кого затоптали. Все сгорели, т.к. двери закрыли и амбар подожгли. По рассказам тех, кто чудом выжил, в живых остались те, кто сумел убежать по дороге на Слуцк, погонщики скота, и те, кого вели для отправки в Германию. Фашисты во время этой акции пили спиртное, горланили песни. А заживо горевшие жители Поликаровки дико кричали и выли, а немцам и полицаям, этим нелюдям, было весело и смешно.

После освобождения стала налаживаться жизнь. Восстановили сельсовет, центр колхоза им. Сталина, лесничество, сельпо, школу, почту. Были открыты три магазина: в Поликаровке, Селецком и Первомайском сельсоветах. Я после непродолжительной работы учетчицей в колхозе перешла работать в сельпо бухгалтером. Нужно было строиться, пострадавшим от оккупантов выделяли бесплатно строевой лес. Для распиловки и вывозки леса были сформированы женские бригады. Мы с двоюродными сестрами построили дом в Адамово. Я же прожила на Слутчине до августа 1951 года. Потом переехала в Минск.

З успамінаў Соф'і Міхайлаўны Багдановіч, 1926 г.н., в. Гондарава

У 1943–1944 гг. сувязная партызанскага атрада

Было гэта ў 1943 годзе. Аднойчы маці выйшла ў двор за вадой і ў небе ўбачыла самалёт, які кружыўся ўдалечыні над гондараўскім полем і скідваў белыя «мяшкі». Самалёт яна прыняла за вялікую птушку, вакол якой мітусілася нешта белае. А дзядзька Віця, які падышоў у гэты час да яе, адразу зразумеў, што самалёт нямецкі, а белыя «мяшкі» – парашутысты.

…Неяк у вёсцы начавалі два партызаны – Айлараў і Бачурын. Немцы іх схапілі. Гэта ўбачылі мы з сястрой Нінай, у якой на руках было малое дзіця. Мы падышлі да іх і, паказваючы на Айларава, сказалі, што гэта Нінін муж,

2017©nasledie-sluck.by

а Бачурын мой брат. Немцы паверылі і не сталі іх забіваць. Партызаны пераначавалі і назаўтра пайшлі.

На другі дзень да нас у Гондарава вярнуліся немцы і паліцаі. У адзін дзень спалілі вёскі Лявішча, Красную Старонку і наша Гондарава. У гэты час я знаходзілася ў стозе сена і ўсё бачыла сваімі вачамі. Людзей забівалі на вуліцы, у хатах. І сёння стаіць перада мной карціна, як фашыст нанізаў на штык ружжа паўтарагадовага браціка маёй стрыечнай сястры, а потым кінуў у палаючую хату…

Страшэнныя зверствы тварылі фашысты. Калі нас, маладых, якіх пакінулі ў жывых для адпраўкі на катаргу ў Германію, вялі па сялу, выбегла мая мама з крыкам: «Куды ты, Зонька?». Да яе падышоў фашыст з медальёнам у выглядзе чэрапа на грудзях, схапіў, завёў у сарай і застрэліў. У гэты час у хаце знаходзіліся двухгадовая пляменніца Валя, старэйшы мой брат Міша. Немец застрэліў Мішу. Калі выйшаў з хаты і завярнуў за сарай, мой брат Ваня, які схаваўся там, кінуўся бегчы да лесу, застрэліў і яго. А Мікалай, таксама мой брацік, схваціў з зямлі замерзшы кавалак конскага навозу і шпурлянуў у фашыста. Той паслізнуўся, упаў і стукнуўся аб лёд галавой. Пакуль немец апомніўся, Мікалай ужо бег да лесу праз калгасны двор. Немцы адкрылі агонь. Колю паранілі ў абедзве нагі. Поцемкамі дабраўся да Старэва, а там на варце стаяў уласавец. Пытаецца ў Мікалая, адкуль ён, увесь у крыві. А той і кажа, што з Гондарава, дзе немцы паляць вёску і забіваюць людзей. Уласавец, пакачаўшы галавой, сказаў: «Дзіцятка, ты ж папаў з агню ды ў полымя, бо заўтра і Старэва паліць будуць». Брат пайшоў і папярэдзіў людзей. Разам з імі падаўся ў лес. Там ужо пераначавалі. Раніцой Колю пераправілі ў Ціхань, а адтуль завезлі ў Амговічы да цёткі Стэфы. Яна ўгаварыла аднаго спагадлівага паліцая адвезці пляменніка ў бальніцу і сказаць, што гэта яго сын. Так і зрабілі. Паклалі Мікалая ў слуцкую бальніцу як параненага бандытамі сына паліцая… А пасля ён папаў у Старэва. Пабудавалі зямлянку і сталі жыць усе Багдановічы, хто застаўся ў жывых.

Пасля зверскіх распраў над жыхарамі нашых вёсак я трапіла ў турму, дзе мяне агледзела доктарша. Сястра мая, якая жыла ў Слуцку, дала ёй грошай колькі змагла, і мне паставілі дыягназ, з якім не бралі на работу ў Германію. Так мне ўдалося пазбегнуць катаргі. Жыць давялося ў Старэва, у зямлянцы. Крыху пазней я стала партызанскай сувязной.

З успамінаў Ганны Афанасьеўны Браткоўскай, ураджэнкі в. Жылін Брод, жыхаркі в. Шантароўшчына

26 кастрычніка разведгрупа палітрука Мікалая Купрыянава і партызаны атрада імя Фрунзе ўстроілі засаду на шашы Асіповічы – Бабоўня, непадалёку ад Жылін Брода. Па іх даных, па дарозе павінна была рухацца нямецкая калона, а разам з ёю і аўтамабіль грэскага каменданта Лібермана. Напярэдадні бою партызаны папярэдзілі жыхароў нашай вёскі, каб не выходзілі з хат. Мы сядзелі па хатах у трывожным чаканні.

Праз нейкі час пачулі гул машын. Раптам раздаўся моцны выбух, з боку дарогі паваліў чорны дым, пачуліся выстралы, кулямётныя чэргі. Пазней

2017©nasledie-sluck.by

нам стала вядома, што партызаны знішчылі тры аўтамашыны і каля паўсотні нямецкіх салдат і афіцэраў. Адзін з іх цудам вырваўся з засады і даехаў да Грэскага гарнізона, на матацыкле. Калі к немцам прыбыла падтрымка, партызан ужо і след прастыў. Яны забралі зброю і скрыліся ў лесе. На наступны дзень у нашай вёсцы з'явіўся атрад карнікаў. Людзей выганялі з хат і збіралі каля дарогі. Ва ўсіх хатах праводзіўся вобыск, але зброі немцы не знайшлі. Нас пагналі ў Грэск, дзе некалькі дзён дапытвалі, хацелі дазнацца, ці не звязаны хто з партызанамі. На допытах прысутнічаў той афіцэр, які ўцалеў. Але, як расказвалі людзі, ён сцвярджаў, што мірныя жыхары ў нападзе ўдзелу не прымалі. Праз некалькі дзён нас усіх адпусцілі дамоў. Праўда, ісці не было куды. Вёска была разрабавана і спалена. Уцалеў толькі дом Бранішэўскіх. Яны там працягвалі жыць, а мы рассяліліся па навакольных вёсках. Мая сям'я перабралася ў в. Беразінец, дзе і жылі мы да 23 лютага 1943 года.

Зналі б жыхары Жылін Брода, куды яны перасяляюцца са спаленай роднай вёскі! 23 лютага 1943 года ў ходзе карнай аперацыі Erntefest яны былі знішчаны разам з жыхарамі вёсак Адамова, Задоўба, Крушнік, Пераходы, Беразінец…

Трэба адзначыць, што сярод жыхароў бытавала думка, што немцы могуць забраць скаціну, маёмасць, адправіць моладзь у Германію, спаліць вёску, расстраляць за сувязь з партызанамі, але ніхто не мог падумаць, што карнікі будуць забіваць і паліць жыўём жанчын, дзяцей і старых…

З успамінаў Віктара Паўлавіча Чыгорскага, 1931 г.н., в. Задоўба, жыхара в. Кулікі

Мой бацька быў брыгадзірам у калгасе «8-е Сакавіка» (в. Жылін Брод). Маці ўпраўлялася з гаспадаркай, глядзела чацвярых дзяцей, акрамя мяне – дзве сястры Ніна, Тамара і брат Фёдар. Жылі мы нядрэнна, у сваім доме. Акрамя нас у засценку Задоўба жыло яшчэ пяць сем'яў. Так было да 23 лютага 1943 года. У гэты страшны дзень загінулі амаль усе. У жывых засталіся Булынка Мікалай і яго дачка Ліда, 1926 г. нараджэння. Багушкевіч Ліда, адна з усёй сям'і Багушкевічаў, таксама засталася ў жывых, бо ў гэты дзень не была дома.

Мы з бацькам 22 лютага паехалі да сястры маёй маці ў в. Кошыца, павезлі на санях ёй дровы, ды й заначавалі. Вярнуліся ў вёску 24 лютага, а роднай Задоўбы ўжо няма, так як не стала Пераходаў, Крушніка, Жылін Брода, Беразінца, Палікараўкі, Фадзееўкі, Адамова. На пажарышчах знайшлі абгарэўшыя костачкі мамы, браціка Федзі, сястрычак Ніны і Тамары.

Пасля гэтага мы з бацькам пайшлі ў лес, жылі ў шалашы да вясны 1944 года, а потым перабраліся ў вёску Барок. Калі немцы спалілі Барок, жылі ў зямлянцы каля Палікараўкі. А калі спалілі Палікараўку, пасяліліся ў партызанскім лагеры каля в. Задоўба за Жылін Бродам. Пасля вызвалення нашага краю ад ворагаў мы з бацькам жылі ў зямлянцы партызанскай газеты «Народный мститель». Потым пабудаваліся ў в. Кулікі.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Лідзіі Макараўны Шахновіч (Багушкевіч), 1927 г.н., в. Задоўба, жыла ў в. Лучнікі

Жылі мы ў Задоўбе. Бацька мой да вайны працаваў у лясніцтве, трагічна загінуў у час валкі лесу, маці працавала ў калгасе «8-е сакавіка» жывёлаводам і пасля смерці бацькі выхоўвала нас адна: мяне, сястру Марыю, 1930 года нараджэння, браціка Мішу (1934) і малодшанькую Аляксандру. У час нямецкай акупацыі нам жылося вельмі цяжка. У Міхейках жыла родная сястра мамы, Соф'я Бадыль. Я часта там бывала, заставалася начаваць, дапамагала цётцы па гаспадарцы. Сябравала з суседскай дзяўчынкай.

Помнік на месцы спаленай в. Задоўба

У Задоўбе мы жылі на ўскрайку. Сама ж вёсачка, ці як гаварылі, засценак, была маленькая – усяго 4 хаты: сем'яў Багушкевічаў, Аленскіх, Чыгорскіх, адзінокай Стасевіч Алены.

22 лютага 1943 года я пайшла ў Міхейкі дапамагчы па гаспадарцы цёткі Соф'і, ды заначавала. На наступны дзень даведалася, што карнікі спалілі нашу вёсачку разам з жыхарамі і таксама суседнія: Пераходы, Беразінец, Крушнік… Цётка мяне адну не адпусціла, і пайшлі разам у Задоўбу.

На пажарышчы мы ўбачылі двух нашых суседзяў – Чыгорскага Паўла і Аленскага Міхаіла (Павел цяпер жыве ў в. Кулікі, а Міхаіл жыў у Грэску і памёр пасля вайны). Чыгорскага немцы якраз перад гэтым жудасным днём забралі гнаць жывёлу ў Слуцк, але яму нейкім чынам удалося збегчы ад фашыстаў. Так і застаўся ў жывых.

Цяпер непадалёку ад таго месца, дзе была наша хата, стаіць помнік нашай вёсцы Задоўба, якая так і не аднавілася пасля вайны. А каму яе аднаўляць? Загінулі ўсе, акрамя нас траіх.

З успамінаў Надзеі Гедыёнаўны Берасневіч, ураджэнкі в. Краснае

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы было 5 дамоў. Тут жылі сем'і Астрэйкаў, Дубовікаў, Галахоўскіх, Гарбачовых і наша – Матусевіч. Вёска знаходзілася непадалёку ад Палікараўкі. Гэта была партызанская вёска. Мясцовыя жыхары дапамагалі партызанам, пяклі для іх хлеб, перадавалі харчаванне.

2017©nasledie-sluck.by

У той дзень, 23 лютага 1943 года, фашысты прыйшлі ў Краснае з боку Сялецка (Пухавіцкі раён), сярод іх не было ніводнага паліцая, або, як іх усе называлі, «сабачніка». Усіх жыхароў карнікі сагналі ў адзін дом, дзверы якога былі адчынены. Насупраць дома паставілі кулямёт. Спачатку людзей адабралі ў Грэск і ў Германію. Мы ўсе плакалі, бо былі ўпэўнены, што нас застрэляць ці спаляць жывымі, як жыхароў Палікараўкі. Аднак у той дзень немцы вёску не кранулі. Але ўсе жыхары Краснага пакінулі вёску, пайшлі ў лес дапамагаць партызанам: выраблялі аўчыны, шылі кажухі. Пустыя дамы стаялі ў вёсцы яшчэ доўга, а восенню 1943 года фашысты спалілі і Краснае, але без жыхароў.

З успамінаў Алены Іванаўны Барысавец (Корзун), ураджэнкі в. Крушнік

Падчас вайны ў Крушніку разам з бацькамі ў адной хаце жыла сям'я майго старэйшага брата Толіка. Раніцай 23 лютага 1943 года бацька адправіў Толю ў лес за дрывамі, але той хутка вярнуўся і паведаміў, што з боку вёскі Палікараўка чутны крыкі і стрэлы. Праз гадзіны дзве мы ўбачылі, як па дарозе ад сыпанкі да нас ідуць карнікі. Бацька загадаў мне і брату Толіку бегчы ў лес: баяўся, каб нас не адправілі ў Германію. Разам з намі ў лесе хаваліся і некалькі іншых маладых аднавяскоўцаў. Мы з Толем чакалі бацьку, але ён не прыходзіў. Тады я з суседкай Нінай пайшлі ў бок вёскі. Добра памятаю, што снег на падыходзе да вёскі быў чорны, пакрыты сажай. Мы спужаліся і павярнулі назад.

З успамінаў Эдуарда Іосіфавіча Дабрынеўскага, 1933 г.н., в. Крушнік, жыве ў в. Старына

Мы жылі сям'ёй: матуля, бацька, два браты і я. Сям'я была сялянская. Вырошчвалі збажыну, дастаўлялі ў Грэск зерне, здавалі там як прадналог.

Аднойчы восенню 1942 года немцы і паліцаі на трох машынах у суправаджэнні матацыклістаў ехалі за вёску Жылін Брод у Круглае за дрывамі на зіму. Гэтыя дровы былі загатаваны людзьмі яшчэ да вайны. Многа лесу было вырублена. Для таго, каб даставіць дровы ў Грэск, немцы ўзялі шмат падвозчыкаў на санях, якіх і суправаджала нямецкая ахова на грузавіках. Напярэдадні фашысты прыехалі ў Жылін Брод на разведку,

Помнік жыхарам в. Фадзеева

2017©nasledie-sluck.by

праверыць дарогу, і загадалі людзям, каб адрамантавалі мост цераз раку Вясейку. Хтосьці з жыхароў паведаміў аб гэтым партызанам. На наступны дзень партызаны сустрэлі немцаў у засадзе, паміж Фадзееўкай і Беразінцом. Абстралялі і перабілі ўсіх фашыстаў, застаўся толькі адзін паранены афіцэр. Гэта было ў канцы кастрычніка 1942 года.

Назаўтра карнікі з Грэска і Слуцка спалілі Фадзееўку, два дамы ў Беразінцы і Жылін Бродзе, праўда, без жыхароў. Той нямецкі афіцэр, што застаўся ў жывых, сказаў, што жыхароў у час абстрэлу не было. Таму вяскоўцаў немцы не чапалі. Пасля гэтага жыхары Жылін Брода і Фадзееўкі перасяліліся да нас у Крушнік і Пераходы.

З успамінаў Надзеі Пятроўны Ліневіч, ураджэнкі в. Крушнік, жыхаркі Слуцка

Дзень 23 лютага 1943 года назаўжды застанецца ў маёй памяці. У гэты дзень не стала роднай вёскі Крушнік, яна была знішчана – спалена карнікамі разам з жыхарамі. Удалося ўцалець нямногім, у тым ліку і мне. Як сёння, памятаю раніцу аўторка 23 лютага. Немцы з паліцаямі з Грэска падводамі спачатку заблакіравалі ўсе выезды з вёскі. Тыя, хто паспеў збегчы, схаваліся на балоце паміж вёскамі Пільня і Крушнік. Мы бачылі, як карнікі рабавалі жыхароў, забіралі жывёлу, вывозілі маёмасць. Стала зразумела – нас будуць забіваць у хатах. У гэты час знаёмы паліцай памагаў сваёй сваячцы, нашай суседцы, загружаць маёмасць на сані. Пасадзіў сярод клункаў і хатніх рэчаў яе з дзецьмі, каб вывезці гэтую сям'ю з асуджанай на гібель вёскі. Мая матуля ўпрасіла яго і суседку дазволіць нам ісці побач з імі. Паліцай маўчаў, а суседка сказала: «Ідзіце побач. Астановяць немцы, то вернуць назад, а не астановяць – будзеце выратаваны». Так мы дабраліся да Палікараўкі, дзе якраз ішла расправа над яе жыхарамі. Фашысты палілі людзей прама ў будынку пажарнага дэпо і ў суседнім доме, бо ўсе палікараўцы, а іх было больш за сотню чалавек, не памясціліся ў адным памяшканні.

Назаўжды запомніла, як немцы палілі хаты, а людзі спрабавалі ўратаваць хаця б дзетак. З палаючага будынка выбегла маленькая дзяўчынка, а фашысты схвацілі яе і жывую кінулі назад, у агонь. Потым застракатаў кулямёт.

У суседняй вёсцы Пераходы загінуў мой родны брат Мікалай, якога немцы смяротна ранілі, калі ён спрабаваў збегчы. Памёр ён праз суткі і пахаваны ў былой вёсцы Пераходы. Там цяпер знаходзіцца мемарыяльны комплекс усім спаленым 23 лютага 1943 года жыхарам і знішчаным вёскам Случчыны, а таксама партызанам і воінам Савецкай арміі, загінуўшым у часы Вялікай Айчыннай вайны.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Алімпіяды Ільінічны Ясімчык, ураджэнкі в. Крушнік, жыхаркі в. Палікараўка

У нашай вёсцы, дзе я нарадзілася і жыла, было ўсяго 18 двароў. Непадалёку ад яе знаходзіўся хутар Кабыліна Балота, дзе было ўсяго два двары.

Я вельмі добра помню 23 лютага 1943 года… Гэта быў аўторак. Зранку матуля адправіла мяне да суседкі ткаць палатно для царквы. Перад абедам зайшоў у хату гаспадар і сказаў: «Немцы ідуць у Крушнік з боку Жылін Брода. Бяжыце, дзяўчаты, у лес, а то забяруць вас у Германію фрыцы». Я адзела ватоўку і пабегла да сваёй хаты. Там мяне сустрэла матуля са словамі: «Дачушка, бяры рэчы і бяжы ў Піленскі лес!». Аднак я не паспела, акупанты былі ўжо ў Крушніку. Яны заходзілі ў кожны двор і ўсіх адпраўлялі ў хату, што стаяла на ўскрайку.

Помнік жыхарам спаленай в. Крушнік

З маёй сям'і ўдалося ўцячы толькі малодшаму брату. У хаце, дзе нас сабралі, немцы праводзілі адбор: каго – гнаць скаціну, а нас з Доўнар Леакадзіяй – адправіць у Германію. Пры гэтым загадалі ўзяць самае лепшае адзенне і ежу.

Пасля паліцаі павялі нас у Палікараўку. Ужо на дарозе мы чулі выстралы і бачылі, як над хатамі Крушніка ўзняўся дым. Гэта карнікі распраўляліся з вяскоўцамі і палілі нашу вёсачку. Калі вечарам прыгналі нас у Шышчыцы, ужо сцямнела. Мы з Леакадзіяй папрасіліся на начлег да мясцовага жыхара, які раніцой нам сказаў: «Дзяўчаты, сядзіце ў хаце і не выходзьце, я вас папярэджу, калі можна будзе выйсці». І толькі к вечару дазволіў нам пакінуць яго хату.

Мы вярнуліся ў Крушнік. Вёскі не было. Вакол былых хат ляжаў толькі чорны рыхлы снег. Я з жыхарамі, хто застаўся ў жывых, прыняла ўдзел у пахаванні сваіх блізкіх, родных, суседзяў… Менавіта гэты дзень стаў пераломным у маім лёсе. Я страціла ўсіх сваіх родных. Толькі майму брату і мне ўдалося выжыць. Хацелася думаць, што гэта страшэнны сон, але ж гэта была жорсткая рэальнасць.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Міхаіла Іванавіча Макава, 1925 г.н., в. Палікараўка, жыхара г. Капыля

Партызан атрада імя В.П. Чкалава брыгады імя А.В. Суворава, з 1944 г. на фронце

Да вайны наша вёска Палікараўка была цэнтрам сельсавета. Тут жа знаходзіліся кантора калгаса імя Сталіна, няпоўная сярэдняя школа, фельчарскі пункт, сельпо, сельмаг, таргсін, машынна-трактарная станцыя, пошта, пажарнае дэпо. Хаты на вуліцах Палікараўкі ў асноўным былі новыя, моцныя. Перад вайной многія хутары і засценкі былі знесены, а хаты перавезены на цэнтральную сядзібу сельсавета. Так іх жыхары сталі палікараўцамі.

Я паспеў да вайны скончыць няпоўную сярэднюю школу. Жыў у бацькоўскай хаце з маці Марыяй Іванаўнай і сёстрамі Костай і Надзеждай. Калі пачалася вайна, да нас прыехала са Старых Дарог з сынам старэйшая сястра Цвірко Лена, якая была замужам за афіцэрам.

Немцы і паліцаі адразу сталі гаспадарамі ў нашых лясных краях. Першае, што яны зрабілі, – правялі перапіс насельніцтва. Выдалі дакументы – «аўсвайсы», распусцілі калгас, раздзялілі калгасную маёмасць. Нашай сям'і, разам з суседам Паўлам Дземідовічам, дастаўся конь з вупражжу, возам і санямі. Араць я яшчэ не ўмеў, бо быў малы, таму сёстры дапамагалі жонцы Дземідовіча ўпраўляцца на полі, а ён – араў і сеяў нам. Так і жылі.

У канцы 1942 года, пасля таго як партызаны зрабілі налёт на фашыстаў і разбілі іх дзве калоны на дарозе Шышчыцы – Асіповічы, нямецкія карнікі спалілі вёскі Фадзееўка і Жылін Брод. Жыхароў на гэты раз не чапалі, але людзі засталіся без жылля ў халодную пару года. Пагарэльцы рассяліліся ў Палікараўцы, Беразінцы, Крушніку і Пераходах. Гэта быў пачатак вялікай агульнай бяды.

23 лютага 1943 г. я буду памятаць вечна – гэты дзень перавярнуў усё маё жыццё. Раніцай мы з суседам Паўлам рэзалі сечку для жывёлы і раптам пачулі выстралы з боку вёскі Адамова. Як аказалася, карнікі расстрэльвалі ўсіх, хто сустракаўся ім на дарозе Шышчыцы – Асіповічы. Потым мы ўбачылі, што ў Палікараўцы ходзяць немцы з паліцаямі. Іх было занадта шмат. Яны «адсеклі» жыхарам адыход да лесу, зайшлі ў вёску не з боку дарогі, а з поўдня, з боку Крушніка.

Я з суседам у гэты час знаходзіўся на яго сядзібе. Заходзіць у двор немец і загадвае ўсім выйсці на вуліцу з «аўсвайсамі» для праверкі дакументаў. На вуліцы яны раздзялілі нас: моладзь, чалавек 16, у іх ліку аказаўся і я, выстраілі на адзін бок вуліцы, а астатніх пагналі ў пажарнае дэпо. У гэты час забіралі жывёлу, грузілі на сані прадукты, хатнія рэчы і іншае нарабаванае дабро.

Насупраць уваходу ў дэпо стаяў кулямёт. У памяшканне загналі чалавек сто. Сярод іх былі і мае родныя. Калі нас, моладзь, вялі пад канвоем па вёсцы, мы чулі, як крычалі людзі, бачылі, як пад прыцэлам паліцаі разам з немцамі трымалі нашых бацькоў, сясцёр, суседзяў… Нас павялі па дарозе на Адамова. Мы пачулі кулямётныя чэргі, убачылі чорны дым над Палікараўкай і зразумелі – вёску паляць.

Адзін з паліцаяў змог выратаваць некалькі сем'яў сваіх сваякоў і знаёмых. Перад тым як вяскоўцаў пагналі на смерць, ён вывез іх на санях з вёскі.

2017©nasledie-sluck.by

Немцы дазволілі яму. Другім сяльчанам ён моцна гаварыў, што больш не можа ўзяць людзей. Ведаю яго прозвішча – Аленскі, з вёскі Апаліны.

А мы ішлі па дарозе на Шышчыцы. Пачынала цямнець. На нас немцы ўжо не звярталі пільнай увагі. Вельмі многа людзей і машын ішло ў накірунку Слуцка. Выкарыстаўшы гэта, нам удалося ўцячы.

К раніцы мы дабраліся да Палікараўкі. Калі ўбачылі, што засталося ад нашых блізкіх, акамянелі і доўга не маглі прыйсці да сябе. Рэшткі чалавечых цел, аддзельна рукі, ногі, галавы… І костачкі, костачкі, костачкі…

Знайшлі рыдлёўкі, выкапалі магілу, дасталі з хованак посцілкі, прастынкі, услалі імі яму і пачалі хаваць тое, што засталося ад жыхароў нашай Палікараўкі. У гэты час праязджалі на санях паліцаі, якія абстралялі нас. Мы пабеглі ў лес. Была адліга, снег мяшаўся пад нагамі, і доўгі кажух перашкаджаў мне бегчы. Я скінуў яго… Толькі пасля таго, як паліцаі пакінулі вёску, нам удалося закончыць пахаванне нашых блізкіх людзей.

З успамінаў Фёдара Іосіфавіча Жураўскага, 1927 г.н., в. Пераходы, жыве ў Калінінградскай вобл.

…Успамінаецца раніца 23 лютага 1943 года, калі нашу вёску акружылі немцы з паліцаямі. Жывёлу зганялі ў адзін канец вуліцы, а жыхароў расстрэльвалі і спальвалі прама ў хатах. Разам з малодшым братам Віктарам мы выйшлі з хаты. Каля скаціны знаходзілася некалькі чалавек з жыхароў вёскі. Мы пайшлі да іх, нас ніхто не астанавіў. Маці, сястра і ўсе блізкія сваякі, якія сабраліся ў нас, засталіся ў хаце. Нас акупанты заставілі гнаць скаціну. Адзін паліцай вёз на санях сваю сваячку з дзецьмі. Я папрасіў, каб яна ўзяла з сабою малодшага брата. Жанчына пагадзілася. Гналі па дарозе на Шышчыцы. Навокал была жудасная карціна: усе вёскі па дарозе былі спалены, ляжалі забітыя людзі…

Калі мы перайшлі мост паміж Адамова і Шышчыцамі, пачало цямнець. Увайшлі ў лес, скаціна пачала разбягацца. У цемры нам траім – мне, Галяс Лідзіі, Рубскаму Андрэю – удалося ўцячы ў лес.

Лесам нам пашчасціла вярнуцца дамоў. Але дома ўжо не было…

Помнік жыхарам спаленых вёсак Случчыны. Устаноўлены на месцы былой вёскі Пераходы

2017©nasledie-sluck.by

Вёска была спалена да тла… Разам з жыхарамі.

У гэты час бацька, які быў у партызанах, з яшчэ адным разведчыкам пад'ехалі да вёскі на конях. Ноччу забраў мяне з братам. Нейкі час мы жылі ў лесе, у зямлянцы. Пасля вызвалення бацька пайшоў на фронт і загінуў пад Варшавай у Польшчы. У снежні 1944 г. ва ўзросце 16 гадоў брата адправілі ў дзіцячы дом. Так склаўся лёс, што мы з братам Віктарам сталі вайскоўцамі, праслужылі да самай адстаўкі разам і жывём у адным горадзе.

З успамінаў Івана Арсенцьевіча Ліневіча, 1929 г.н., в. Пераходы, жыве ў Карэліі ў г. Аланец

О начале войны я узнал, возвращаясь в родные Переходы из школы после сдачи последнего экзамена за курс начальной школы. Через несколько дней у нас появились отступающие красноармейцы, а за ними и немцы, так что свидетельство о начальном образовании получить не успел. Сперва в наших краях было тихо, но большой проблемой стал поиск пропитания, ведь отец, ветеран гражданской войны, лишился работы в лесхозе. Выживали тем, что собирали в лесу грибы и ягоды и меняли их в Слуцке на зерно.

Немцы колхоз не распустили, но требовали платить налог продуктами и сеном. Очень скоро дали о себе знать и партизаны. Естественно, по их требованию, налог немцам практически не выплачивался, да и нечем было. Во время одной из попыток немцев собрать с населения продовольствие партизаны совершили нападение на их обоз. Были и другие столкновения. Словом, тучи над нами сгущались. Мы, деревенские жители, ждали арестов, угона молодежи в Германию, но чтобы немцы уничтожили всю деревню вместе с жителями, об этом и подумать никто не мог.

Рано утром 23 февраля 1943 года по деревне проехали немцы и полицейские на санях, блокировав все выезды из Переходов. В хату зашел один немец, оглядывая, покрутил меня и вышел. Позже дошло, что он подбирал погонщиков скота, но ростом я был мал и, видно, не подошел. Мне уже было четырнадцать лет, и родители боялись, что могут угнать в Германию. Поэтому спрятали меня на печке под тряпками, а пять младших сестер сидели на ее краю.

Тут в дом вошли фашисты и, не говоря ни слова, открыли огонь из автоматов. Одна из сестер мертвая упала на меня. Я был ранен в левую ногу. Когда стрельба прекратилась и каратели вышли, приподнялся и осмотрелся. В живых был только тяжелораненый отец. Теряя последние силы, он благословил меня и приказал: «Беги, сынок!»

Я схватил шерстяное одеяло и ползком добрался до хранилища овощей во дворе. Дом в это время уже вовсю горел. Сколько находился в своем убежище, не знаю. Опомнился, когда увидел соседскую девушку. Немцев уже не было. Она достала откуда-то чулки, я перевязал раненую ногу. Пошли по деревне в поисках оставшихся в живых.

Прислонившись к забору, стоял раненный в руку и спину мой двоюродный брат Николай. Мы его отвели в яму, где хранилось сено, прикрытое досками и землей. Всего живых набралось шесть человек. Ночевали в той же яме с сеном, а на следующий день хоронили убитых.

Приехали родственники погибших жителей Переходов из других деревень,

2017©nasledie-sluck.by

партизаны. Я из тайника достал простыни и покрывала, в них и похоронил свою семью.

Тела родителей и сестер были сильно обгоревшими. Раненого двоюродного брата его отец, Алесь Амбражевич, он был в партизанах, увез в Шанторовщину, но тот по дороге умер.

Впоследствии довелось пережить блокаду партизанской зоны, скрываться на Воронецких болотах. А когда она закончилась и я вместе с мирными жителями возвращался домой, то увидел по дороге разведотряд Красной армии. Так пришло освобождение. В деревне восстановили колхоз, а меня назначили бригадиром. Одновременно местную молодежь обучали военному делу в Замостье. Осенью 1944 года призвали в армию. Был курсантом-минометчиком, обучался автомобильному делу, служил в Пружанах, Боровичах Новгородской области, опять в Белоруссии, затем в Петрозаводске. В 1951 году присвоили офицерское звание.

Через некоторое время попал под хрущевское сокращение армии. Ушел служить начальником ГАИ в городе Олонец. В 1974 году вышел на пенсию. Часто думаю, какое счастье, что чудом выжил в горящих Переходах.

І.А. Ліневіч

А ведь как бы счастливо могла сложиться судьба моих погибших односельчан, если бы не та проклятая война...

З успамінаў Валянціна Аляксандравіча Кісяля, 1927 г.н., в. Старына, жыхара в. Маяк

З 1943 г. партызан атрада імя С.М. Кірава брыгады імя М.В. Фрунзе, удзельнік баёў з Японіяй. Працаваў у калгасе

Мае бацькі жылі ў в. Старына, а ў 1939 г. купілі хату ў в. Лазараў Бор. Прыгожая маленькая вёсачка з васьмі хат знаходзілася ў лесе. Калі пачалася вайна, было спачатку спакойна. Праз некаторы час з'явіліся акружэнцы, потым партызаны і члены разведгрупы, закінутыя з Вялікай зямлі. Паступова мы аказаліся ў партызанскай зоне. Да нас з Паўлаўкі пераехала мая родная сястра Броня з сынам Валодзем, бо яе муж пайшоў у партызаны.

2017©nasledie-sluck.by

У час карнай аперацыі немцы з'явіліся і ў нас. Гэта было 23 лютага 1943 года. Спачатку рабавалі, зганялі жывёлу, а потым пастроілі жыхароў у дзве калоны. Я аказаўся сярод тых, каму загадалі гнаць жывёлу ў Слуцк. Калі мы адышлі на некалькі кіламетраў ад вёскі, то ўбачылі, што над ёю падняўся чорны дым. Апанавала пачуццё бяды і страху – там жа засталіся бацькі, старэйшая сястра.

У гэты момант ад стада адбілася карова і пайшла ў бок лесу. Немец-канваір загадаў мне дагнаць яе. Калі я дагнаў карову, то не стаў вяртацца. Учапіўся ёй за хвост і спужаная жывёліна пацягнула мяне ў лес. Але тут не падвязло: сустрэўся другі нямецкі атрад, што суправаджаў абоз з нарабаваным дабром. Прыгналі нас у в. Малая Сліўка. Начавалі мы ў памяшканні школы. Раніцой з'явілася мая выратавальніца: жанчына з вёскі Ціхань; прыйшла выручаць сваю дачку ад угону ў Германію. Яна дала нямецкаму афіцэру залатыя царскія чырвонцы і мяне заадно назвала сваім сынам. Так нас і адпусцілі. Мабыць, патрэбна было мне жыць. Разам мы дабраліся да спаленага ўжо Лазарава Бору. З жыхароў у жывых засталіся жанчыны, якіх у момант карнай аперацыі не было дома. Яшчэ адна жанчына, параненая, выпаўзла з хаты. Яе расказ я запомніў на ўсё жыццё. Аказваецца, калі мы пагналі жывёлу ў Слуцк, застаўшымся загадалі разысціся па хатах. Потым туды заходзілі карнікі і расстрэльвалі людзей. Хаты падпалілі, а параненых дабівалі, страляючы праз вокны.

Хаваў я костачкі сваіх родных на наступны дзень у прасцінах, якія маці схавала на агародзе.

Забрала мяне да сябе ў Ціхань мая выратавальніца. Неўзабаве прыехаў і забраў да сябе родны дзядзька Кісялеўскі Станіслаў Іосіфавіч. У яго было сваіх пяцёра дзяцей. Пагэтаму, калі я сустрэўся з Казімірам Цыганеліусам, сябрам дзяцінства па Лазараву Бору, і ён прапанаваў пайсці да партызан помсціць за смерць бацькоў, я адразу згадзіўся.

Так у 16 гадоў я стаў байцом партызанскага атрада. Пасля вызвалення па ўзросту мяне не ўзялі ў армію. Тады запісаўся ў знішчальны атрад – лавілі па навакольных лясах паліцаяў і немцаў. У 17 гадоў прызвалі ў армію. Аказаўся ў г. Калуга, дзе праходзіў курс маладога байца. Там і сустрэў Дзень Перамогі. А потым – паўвостраў Мечнікава… удзельнічаў у баях з японскай арміяй. Хадзілі на тарпедных катерах выбіваць японцаў з астравоў… Вось такое было маё жыццё ў гады ваеннага ліхалецця…

Хачу яшчэ сказаць, што за гады майго жыцця мянялася маё прозвішча. Сапраўднае яно Кісялеўскі – па бацьках, продкі якіх былі каталікамі. У 1943 годзе маё пасведчанне аб нараджэнні разам з іншымі дакументамі згарэла. Калі ж прызвалі ў армію, то ў васнкамаце, не прыслухоўваючыся да мяне, выдалі салдацкую кніжку на імя Кісялёва Валянціна. З гэтым рускім прозвішчам я жыў да 1951 года. Калі вярнуўся на радзіму, то працэдура выдачы пашпарта вылілася ў спор з пашпартысткай. Я настойваў, каб дакументы былі выдадзены на Кісялеўскага. Яна адказала, што нам польскае прозвішча не патрэбна, як і рускае Кісялёў. І настаяла на тым, што я буду насіць беларускае. Так я стаў жыць з новым прозвішчам Кісель.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Алены Іванаўны Цагойкі, ураджэнкі в. Старэва, жыхаркі Слуцка

Жили мы в Старево в новом доме, который отец построил накануне зимы. Пришедшие в феврале немцы выгнали нас в старый дом и приказали ждать там распоряжений. Отец в это время находился в слуцкой больнице. Сперва каратели разграбили деревню. Все ценные вещи заставляли собирать в мешки и выставлять на улицу. Согнали в одно место и скотину. Мой дед был уверен, что никого убивать не будут, а вот мама накануне узнала, что жителей Старево собираются переселять, как говорили немцы, в еврейские дома. Она поняла, что деревню сожгут. Уговаривала деда уйти вместе, но тот не послушал и остался. Ночью нам вместе с соседом удалось выбраться в лес. Помню, что прятались там долго, потом попали в деревню Тихонь, затем в Набущево и, наконец, оказались в Слуцке.

А нашу деревню сожгли вместе с людьми. Их загнали в сарай, каратели через небольшие окна стреляли из пулеметов, а потом подожгли. Уцелели только мальчик и женщина, они, раненные, чудом смогли выбраться из огня.

З успамінаў Зінаіды Трафімаўны Цвірко, ураджэнкі в. Хорашава, жыхаркі Слуцка

Моя мама родом из Гондарево. После замужества переехала в Хорошево. Жизненные обстоятельства сложились так, что я с сестрой жила в Гондарево у бабушки и дедушки. В начале войны я снова переехала к родителям. Хорошо помню, как зимой 1943 года в дом вошел встревоженный отец, приказал всей семье собираться и взять теплую одежду. Оказывается, он услышал выстрелы, влез на высокое дерево и увидел, что немцы жгут Гондарево, а людей убивают.

Мою сестру и брата он успел забрать оттуда за несколько дней до трагедии.

Папа запряг лошадь, посадил нас и маму в сани и отвез в лес. Там, на поляне, расчистил место для костра, около которого мы и грелись.

В Гондарево были убиты мои дедушка и бабушка. Родители через несколько дней ездили туда хоронить их останки. По рассказам папы, остались от них только обгоревшие косточки. Такая же судьба постигла и других жителей.

А Хорошево наше уцелело, но беда пришла в августе. Во время блокады партизанской зоны немецкие самолеты бомбили деревню, и она вся сгорела. Нам пришлось жить в лесу в шалаше. После освобождения Слутчины деревня Хорошево возродилась, а на месте Гондарево так и остались только памятники, которые поставили люди своим родным после войны.

2017©nasledie-sluck.by

З успамінаў Надзеі Аляксандраўны Няглюй, былой жыхаркі в. Чырвоная Старонка

…А немцы акружылі нас дзярэўняю, і ўжо нікуды не пускаюць. Мужчын, каторыя маладыя былі, узялі скот гнаць. Жанчын ніводнай не ўзялі, толькі мужчын. Мужчыны збіраюцца скот гнаць, а мы ўжо знаем, што з намі будзе... Я ўжо баялася куды-нібудзь ад дзяцей бегчы, у мяне іх чацвёра. Каб мяне ўжэ дзе на вуліцы не забілі, а каля дзяцей забілі. Ну, і так сядзімо мы. Мужчыны скот павыганялі, гэтых мужчын адправілі ўжэ з засценка. А мы кажам:

– Паночкі, што вы рабіць будзеце з намі? Беце нас, толькі дзяцей нашых не беце. Павыкідайце ва двор, і ўсё.

А мароз такі быў, зіма такая была... Гэтыя немцы прыдуць у хату, а мы на колінцы пастанем і просім, каб нашых дзяцей не білі.

За што іх біць, што яны там вінаватыя? Старэйшаму хлопчыку было 12 год. А меншай дзевачцы было пяць, самай меншай. Ну, а яны ўсе адно да нас, не панімаюць, смяюцца...

А потым уваходзяць біць... Адзін наган вынімае, а другі з аўтаматам. Мы пападалі, а яны пачалі нас біць ляжачых...

Успамін запісаны В.В. Цішкевічам, навуковым супрацоўнікам ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей».

У ВАЕННАЕ ЛІХАЛЕЦЦЕ

Свята вёскі Амговічы, якое нядаўна адзначылі яе жыхары, супала ў гэтым годзе са знамянальнымі датамі: Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і Днём вызвалення нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

...Наша вёска перажыла ваеннае ліхалецце. Загінулі многія яе жыхары… Мяне запрасілі расказаць пра той жахлівы час, пра змаганне мірных людзей з ненавісным ворагам. Я расказала жыхарам вёскі пра падпольную групу для барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі, арганізатарам якой выступіла моладзь. У яе склад уваходзілі арганізатар Пётр Сямёнавіч Жук, Фёдар Іосіфавіч Прахарэвіч, Мікалай Цімафеевіч Шулякоўскі, Мікалай Іванавіч Простак. Яны адшукалі радыёпрыёмнік і слухалі зводкі з Масквы, перадавалі іх людзям. Галоўнае, што падымала веру, – Масква змагаецца, і немцам не ўдалося за два тыдні, як яны таго хацелі, захапіць сталіцу СССР. Верылася, што перамога будзе за намі. Група збірала зброю, якой было шмат у лесе, і складвала ў патаемным месцы, у хляве Ганны Цімафееўны Добрынай. Жанчына расказвала мне, што ў яе там былі вінтоўкі, пісталеты, гранаты і нават кулямёты. Гэту зброю перадалі ў партызанскі атрад.

Мой бацька Іван Іванавіч Простак і брат Мікалай былі сувязнымі атрада імя Фрунзе 225-й брыгады імя Суворава. Нядобрыя людзі высачылі іх і заявілі ў паліцыю. Нашу сям'ю арыштавалі. Пасля экзекуцыі бацьку вывелі на двор і расстралялі каля брамкі. Вечарам ён крыху ачуняў, дапоўз да лесу, пакінуўшы за сабою крывавы след, і памёр. Назаўтра забралі брата, скруцілі

2017©nasledie-sluck.by

яму дротам рукі і павялі на расстрэл на могілкі. Недалёка быў лес, але ззаду – «жалезны канвой» карнікаў, паліцаяў. Пра апошнія хвіліны жыцця свайго брата я даведалася ад Лізаветы Герасімаўны Нячай і Васіля Мікалаевіча Ажэўскага. Яны ў той дзень знаходзіліся на бульбяным полі каля самых могілак і бачылі, як у перадсмяротнай агоніі білася цела 18-гадовага юнака.

У вёсцы жыць станавілася усё небяспечней. Днём арудавалі паліцаі. Уначы прыходзілі партызаны. Аднойчы ноччу пад выглядам партызан прыйшлі пераапранутыя паліцаі да жыхаркі вёскі Вольгі Шукала, пачалі дапытваць, што яна знае пра паліцэйскі ўчастак. А назаўтра яе з дачкою арыштавалі і расстралялі на могілках.

Можна многа расказваць пра ваеннае жыццё, пра нямецкія бамбёжкі, аблавы карнікаў, пра ўцёкі ад нямецкіх аўчарак, бачыць начны веер трасіруючых куль, хавацца ад іх свінцовага дажджу з варожых самалётаў, ва ўспамінах тануць у Вароніцкіх балотах… Мы ведаем, што такое вайна, і хочам, каб маладое пакаленне ведала аб ёй толькі па расказах, кнігах і фільмах.

Г. Простак.
Слуцкі край. 2008. 8 жніўня.

МЫ – ДЗЕЦІ ВАЙНЫ

«З поўным правам нас можна назваць дзецьмі вайны», – так гавораць пра сябе жыхары вёскі Лучнікі Ларыса Сцяпанаўна і Анатолій Мікалаевіч Гурыновічы і маюць рацыю – дзіцячыя гады абодвух прыпалі якраз на перыяд Вялікай Айчыннай вайны: яны – 1938 і 1935 гадоў нараджэння адпаведна. Ды не толькі ў гадах нараджэння справа, а ў тым, што кожнаму з іх у дзяцінстве давялося перажыць, і ў тых уражаннях, перажываннях, адчуваннях, якія засталіся ў іх на ўсё жыццё.

Сям'я Сцяпана Іванавіча Шашкова і Соф'і Адамаўны Лабковіч з дачкой Ларысай да Вялікай Айчыннай вайны жыла ў Оршы. Акалічнасці таго, як яны там апынуліся, наўрад ці можна цяпер устанавіць. Сцяпан Іванавіч нарадзіўся ў Барысаве, а Соф'я Адамаўна была родам з вёскі Крушнік Палікараўскага сельсавета Грэскага раёна. Там жылі яе маці, сёстры Франя і Ядзя і браты Павел і Віктар.

– Мама прывезла мяне ў Крушнік да бабулі. Маміны сёстры ўгаварылі яе пакінуць мяне ў вёсцы, – успамінае Ларыса Сцяпанаўна. – Мама паехала ў Оршу, а праз некалькі дзён пачалася вайна. Старэйшага мамінага брата Паўла адразу прызвалі ў армію, адправілі на фронт. Але далёка ён не адышоў, на калону прызыўнікоў каля Мінска наляцелі фашысцкія самалёты, пачалі бамбіць. Амаль усе загінулі, толькі праз некалькі дзён дамоў вярнуўся адзін чалавек з Жылін Брода, якога пазней гітлераўцы расстралялі.

У першыя дні вайны Сцяпана Іванавіча Шашкова прызвалі ў армію, і з той пары пра яго ў сям'і не было ніякіх звестак. А Соф'і Адамаўне не давала спакою думка пра дачку, і яна вырашыла ехаць да яе. На цягніку даехала да станцыі Пухавічы, а далей чыгунка была разбіта фашысцкімі бомбамі. Двое сутак праз палі, лясы дабіралася Соф'я Адамаўна да вёскі Крушнік. І вось –

2017©nasledie-sluck.by

яе родная вёска, мама, сёстры, брат і яе крывіначка – дачка Ларыса! Што і казаць, радасць ад сустрэчы мамы з дачкой была бязмежнай.

Ларыса Сцяпанаўна і цяпер неяк шчымліва ўспамінае шырокую вуліцу ў Крушніку і рабіну каля бабулінай хаты. Як ёй памятаецца, гады мо з два пасля пачатку вайны ў вёсцы было ціха: паліцэйскія часта прыязджалі, пра нешта дапытваліся, але людзей не чапалі. Праўда, у адзін з дзён арганізавалі набор моладзі для адпраўкі ў Германію, куды трапіла і Ларысіна цётка Франя, дамоў яна вярнулася толькі пасля вайны. Многія жыхары Крушніка дапамагалі партызанам, Соф'я Адамаўна, напрыклад, пякла для іх хлеб. А цяпер дадзім слова Ларысе Сцяпанаўне Гурыновіч:

«23 лютага 1943 года нашу вёску акружылі гітлераўцы і паліцэйскія, сагналі жыхароў у крайнюю хату і закрылі на замок, вакол паставілі кулямёты. Праз нейкі час нас адпусцілі па дамах, чаму – не ведаю. Паліцэйскія забіралі жывёлу ў вяскоўцаў, у пагоншчыкі ўзялі майго дзядзьку Віктара, не ведаю чаму, але з імі пайшла і мая цётка Ядзя. Памятаю, што мае мама і бабуля ўзялі запрэжанага ў калёсы каня, які стаяў на вуліцы, пасадзілі мяне і паехалі за гуртом жывёлы. Коней і кароў гналі ў бок Палікараўкі, але ў лесе яны пачалі разбягацца. Паліцэйскія пачалі ганяцца за жывёлай, а ў гэты час людзі паразбягаліся хто куды. Калі мы ехалі на возе, то я ўбачыла, што наша вёска гарыць! Намнога пазней я даведалася, што ў той дзень акупанты спалілі 14 вясковых двароў, загубілі 15 жыхароў вёскі Крушнік».

Толькі выпадковасць выратавала жыццё Ларысе, яе маме і бабулі. Яны даехалі да Шышчыц, там пераначавалі, а потым дабраліся да вёскі Ленькі, дзе іх прытуліў стрыечны мамін брат Альберт Сцяпанавіч Лабковіч. Праз нейкі час ён пайшоў у партызаны і пры выкананні аднаго з заданняў трапіў у лапы паліцэйскіх. Тыя збілі яго, пасадзілі на падводу, далі ў рукі аўтамат і везлі па вёсцы, гарлапанячы: «Палюбуйцеся, камсамолец едзе!». Потым вывезлі за Грэск і расстралялі. Паліцэйскія выселілі крушнікоўцаў з хаты Альберта Сцяпанавіча, яго сястра Браніслава Сцяпанаўна пасяліла іх у сябе, дзе яны і жылі да 1956 года.

Не можа без хвалявання ўзгадваць пра гады Вялікай Айчыннай вайны і Анатолій Мікалаевіч, які з бацькамі жыў у пасёлку Чырвоная Горка каля Кухтаў. Не хапае сіл яму стрымаць слёзы пры ўспамінах, як немец абстраляў групу дзяцей, якія гулялі каля адной з вясковых пабудоў, і аднаго з хлапчукоў параніў, або як паліцэйскія хацелі расстраляць яго бацьку, ды ўмяшаўся нейкі нямецкі начальнік, калі ехаў з Ленек на аўтамашыне, адправіў яго дамоў: «Нах хаўс, нах хаўс».

– Не дай Бог перажыць яшчэ раз такое, што было ў вайну, – гаворыць Ларыса Сцяпанаўна Гурыновіч. – Ужо столькі гадоў пасля яе мінула, а з памяці не знікаюць страшныя карціны вайны. Няхай жа такое ніколі не паўторыцца!

А. Жук.

2017©nasledie-sluck.by

Незагойныя раны ваеннага дзяцінства Зінаіды Іванаўны Мяцельскай

Акупацыя

На стале – Пахвальная грамата, якую Зінаіда Іванаўна дастала з матчынага куфэрка: яна датавана 13 чэрвеня 1941 года, за выдатныя поспехі і прыкладныя паводзіны ўручана вучаніцы чацвёртага класа школы вёскі Дзюдзева (цяпер – Маяк) Зінаідзе Мяцельскай 17 чэрвеня 1941 года. А 22 чэрвеня грымнула вайна. Яе адчулі адразу: вечарам і ноччу кружылі самалёты. У вясковага хлопца якраз было вяселле, на якім ігралі музыканты з Капыльшчыны, па іх прыехалі, сказалі – мабілізацыя. Хутка з'явіліся немцы.

– Яны размясціліся па гумнах, а дзеці слухалі, як яны «гергечуць» па-свойму. Да восені мая матуля і бабка Мацвеіха ратавалі двух чырвонаармейцаўукраінцаў, якія пры адступленні адсталі ад сваёй часці. Днём яны хаваліся ў метровым праёме паміж дамамі, а начаваць ішлі ў хату. Ім знайшлі абутак, далі адзенне, прыносілі ежу, стараліся ўладкаваць справы так, каб на вочы вяскоўцам салдаты не траплялі. Нас папярэджвалі: хаця ж, дзеткі, не прагаварыцеся нікому пра іх – смерці не міне ніхто. Так да позняй восені яны і туліліся, а потым падаліся ў партызаны. Калгасы расфарміравалі, мы – чацвёра дзяцей і мама з татам – хадзілі на работы ў поле: палолі збожжавыя, акучвалі бульбу. У першыя восеньскія дні дзеці яшчэ спрабавалі пайсці ў школу, але партызаны павыбівалі ў будынку вокны, заняткі адмянілі, – узгадвае З.І. Мяцельская. – Магазіна прамтаварнага не было, нашы мамы пралі, ткалі, мы стараліся ў іх чаму-небудзь навучыцца. Вечарам збіраліся з дзяўчынкамі на вячоркі, працавалі пры лучыне ці газовачцы, днём ішлі ў папрадухі. Ткалі палатно для партызан. Пра іх я даведалася глыбокай восенню 1942 года, калі мы з сястрой спалі ў сенцах і пачулі, як з гасцямі з лесу размаўляў тата. Двум статным мужчынам у камсаставаўскім адзенні, падпяразаных рамянямі, ён даў свой гадзіннік, бялізну, сала.

Немцы абклалі вяскоўцаў падаткамі: бульбу і зерне вазілі ў Грэск, бацьку Зінаіды – Івана Іосіфавіча – разам з іншымі мужчынамі паліцаі прымушалі вывозіць лес. Вельмі ж лютаваў немец Лідэрман: катаваў людзей, не было таго дня, каб ён кагосьці не набіў.

– Аднойчы мы жалі жыта, і да нас дайшлі чуткі, што партызаны забілі гэтага Лідэрмана. Мы закрычалі «ўра» і пайшлі святкаваць, – нават праз столькі гадоў вочы Зінаіды Іванаўны пры гэтых успамінах свецяцца гордасцю. – Ніхто не выдаў немцам і сем'і Вольгі Кіршчэня і Марыі Нямковіч – іх мужы, камуністы, былі на фронце.

Страты

Жыць было страшна, даходзілі чуткі пра зверствы фашыстаў, а 5 лютага 1943 года ў Дзюдзева наляцеў атрад карнікаў. Зінаіда Іванаўна ўзгадвае, як яе сястру і яшчэ пяць маладых людзей забралі ў Германію. Бацькі спрабавалі знайсці яе, паехалі на кані ў Слуцк, але да турмы, куды сагналі моладзь, іх не падпусцілі. У вёсцы Хранова (цяпер – Ветка) маладая настаўніца Ніла Мікалаеўна Навумовіч, якая да вайны працавала ў школе, падчас вярбоўкі ў Германію паспрабавала ўцячы – не ўдалося, у полі яе дагнала куля...

– Да канца 1943 года перастрэлак не было, але аднойчы ноччу на нашай

2017@nasledie-sluck.by

вуліцы перад домам настаўніцы Соф'і Астроўскай спыніўся абоз: да паловы дзявятай раніцы паліцаі выносілі дабро і грузілі на падводу. Нас апанаваў жах. Калі абоз паехаў, мы пабеглі да бабулі Домны распытаць, што здарылася, – зноў перажывала падзеі Зінаіда Іванаўна. – Аказалася, што Міхаіл Клебановіч, які жыў з Соф'яй, быў падпольшчыкам, ноччу яго і іншых памочнікаў партызан расстралялі ў Грэску ў кар'еры. Маці падпольшчыка Ульяна выжыла цудам. Параненая, яна прыбегла ў Дзюдзева, каб папярэдзіць нявестку. І тая паспела ўцячы. Уцалеў і яе маленькі сын Васілёк. Мы тады перапалохаліся не на жарт. Але напярадзе нас чакалі яшчэ горшыя выпрабаванні. Партызаны сталі наведваць нас часцей. Прыходзілі да таты, бо ён быў надзейны чалавек: удзельнік Грамадзянскай вайны, актывіст, да вайны працаваў брыгадзірам. Мы былі рады кожнаму візіту, але знайшоўся здраднік, які данёс у Грэск у паліцыю, што народныя мсціўцы – у нашай вёсцы.

Мы з матуляй былі на вуліцы, калі немцы і паліцаі пачалі страляніну па Дзюдзева. Партызаны адстрэльвацца не сталі, каб не наклікаць бяды на вяскоўцаў. Пабеглі мы, але насупраць суседскага дома разрыўной куляй забіла матулю, мне навылет прабіла руку. Што рабіць? Я пабегла далей, на сваім парозе атрымала яшчэ чатыры раненні. Штосьці ў хаце загарэлася, мы патушылі пажар і пападалі на падлогу. Кулі прабівалі сцены, я сцякала крывёю. Ручнікамі перавязалі мае раны, мёртвую матулю (Ганне Сямёнаўне было 38 гадоў) унеслі ў хату...

Побач з нашым гарэў суседскі дом, вакол былі крык, гвалт. Галаварэзы гэтыя зайшлі ў хату, паглядзелі – і выйшлі, ніякай дапамогі не аказалі. Паліцаі зайшлі да родных матулі ў Грэску і расказалі, што ў нас адбылося. Мне не хацелася жыць, так я перажывала самую вялікую страту. Але мяне ўгаварылі паехаць у Грэскую бальніцу, каб там залячыць раны. Бінтоў і лякарстваў не было – тата з дому вазіў палатно. Памятаю сваю мучыцельку – медсястру па прозвішчы Беласлюд. Ну і нацярпелася ж я! Ды не толькі я – да ўсіх яна ставілася жорстка, падчас перавязкі як ірване бінт – аж заходзішся ад болю. А ў мяне вырашыла праверыць, ці не засталося ў руцэ асколкаў, парола па жывому ў палец і далонь, зацiснуўшы мне рот, каб не крычала ад болю. Губы ў кроў раздушыла, я думала, не вытрываю. Нада мной медсястра Серафіма Місюк потым стаяла і плакала, гаварыла, што маіх пакут ніколі не забудзе. А я таксама не забуду, як хадзіла да сваёй бабулі ў Грэск, дапамагала цёткам па гаспадарцы, і на тым месцы, дзе зараз абеліск, часта бачыла трупы забітых. Як мы чакалі вызвалення! Тата суцяшаў: партызаны сказалі, што вось-вось немцаў прагоняць.

Вызваленне

Падчас адступлення немцаў Грэск палаў у пажарах, варожыя абозы ішлі праз Дзюдзева, а жанчыны з дзецьмі стаялі на каленях перад крыжам у канцы вёскі. Пашанцавала – не падпалілі паліцаі хаты, знішчылі толькі гумно са збожжам у мусіцкім напрамку. Чырвонаармейцаў мы сустракалі з радасцю і слязьмі, узгадваючы тых, хто не дажыў да светлага дня. Мужчын мабілізавалі, засталіся калекі ды старыя, жанкі з дзецьмі і касілі, і аралі, і будавалі. Восенню дзеці пайшлі ў школу. А пасля ўрокаў ішлі коней карміць, ураджай убіраць. Дзень ціха ў сяле, на

2017©nasledie-sluck.by

друті – галосяць, заломваюць рукі жанчыны – пахавальны ліст атрымалі.

– Трох сыноў страціла баба Зося – Сафія Санько. Калі яна памерла, помнік зрабілі, на якім маці – у акружэнні трох сыноў... Вось дзе сустрэла сваіх дзетак, – працягвае аповед Зінаіда Іванаўна. – Як вынесці было такое? Тату нашага ў гаспадарчую частку ў армію ўзялі. Я ў школу ў шосты клас пайшла, здольная была да вучобы.

Перамога

Калі дачакаліся весткі пра яе, аж сэрцы ад радасці і болю разрываліся. Родныя сталі вяртацца з фронту, з прымусовых работ. Вярнуліся тата, сястра Зінаіды Іванаўны. Пачалося мірнае жыццё – галодныя, цяжкія пасляваенныя гады. У восьмы клас Грэскай школы Зінаіда не пайшла – вырашыла стаць урачом і з сяброўкай паехала паступаць у Пінскую фельчарска-акушэрскую школу. На даху таварнага цягніка дабраліся да Баранавіч, потым – да Лунінца і Пінска. Паспяхова здалі экзамены і вучыліся добра, жылі па 30–40 чалавек у халодным памяшканні інтэрната. Ежу варылі на вогнішчы ў кансервавых бляшанках, накапаную ў полі бульбу хавалі пад ложкамі – так і выжылі. Ды яшчэ і на танцпляцоўку паспявалі збегаць – маладыя былі, прага жыцця брала над усім верх.

Праца ў імя міру

Бог ведае, колькі разоў даводзілася і пехатой, і на спадарожным транспарце трапляць у 13 населеных пунктаў загадчыцы Маяцкага фельчарска-акушэрскага пункта Зінаідзе Іванаўне Мяцельскай. Амаль за чатыры тысячы чалавек несла адказнасць медыцынскі работнік. Пастукаюць ноччу ў шыбу – хапае чамаданчык з медыцынскім інструментам і прэпаратамі ды бяжыць да хворага. Дарогі былі – ні праехаць, ні прайсці, пра тэлефон і гаворкі не вялі – адзін на ўсю вёску ў праўленні калгаса. Аднойчы да яе звярнуўся па дапамогу адзін з тых здраднікаў, якія данеслі паліцаям на партызан. «Бачыш, як у жыцці бывае – вораг я табе, а ты мне дапамагаеш», – вінавата схіліўшы галаву, толькі і вымавіў ён за ўвесь час прыёму ў медработніка. І ў мірны час угатаваны былі гэтай кволай, але моцнай духам жанчыне цяжкія выпрабаванні: невылечная хвароба выявілася ў дзевяцігадовага сыночка Валерачкі. Адчайна змагаліся за яго і медыкі, і бацькі, але выратаваць не змаглі. Ад страшных пакут і змрочных думак адцягвала работа і клопат пра траіх дзяцей. 48 гадоў верай і праўдай адслужыла святой справе, года праводзілі на заслужаны адпачынак двойчы «Выдатніка аховы здароўя СССР».

В.В. Ражанец.

БЫЛА ВАЙНА...

Успамінаюць:

Таццяна Іванаўна Голуб,
ураджэнка в. Камора

Вайна не абмінула і маленькую вёсачку, якая раздзяліла лёс усіх вёсак, што знаходзіліся непадалёку ад лесу. Хто з маладых разгубіўся і не пайшоў у партызаны, немцы прымушалі ісці ў «самаахову», хто спрабаваў збегчы – кідалі ў турму. Многія хлопцы пазней нямецкі прымус змывалі крывёю на фронце...

З сынам Колем мы ледзь не загінулі. Ля шашы стаяў нямецкі бункер, якому

2017©nasledie-sluck.by

часта дапякалі партызаны. То сувязь сапсуюць, то слупы спілуюць. Тады карнікі пачыналі сваю чорную справу. У Махортах дзетак аб колы забівалі, лютавалі ў Набушаве. А пасля адной партызанскай аперацыі пачалі засыпаць снарадамі і трасіруючымі кулямі і нашу лясную вёсачку. Разам з сынам мы ляглі ў разору ў агародзе, іншыя людзі таксама з хат паўцякалі. Снарад трапіў у сенцы хаты, а ў суседскую хату – прама ў печ. Згарэлі толькі тры хаты. Жыхары вёскі дзякавалі Богу, што абараніў астатнія хаты. Засталіся мы без жытла, вопраткі і іншых рэчаў. Добра, што карову завяла ў Вясею, а то немцы і яе забралі б. Неяк пайшла па справах у Слуцк, а вярнулася, дык і свінкі не стала…

Жылі з сынам і сястрой у гаражы, потым з недагаркаў, што з хаты засталіся, хатку зляпілі, а пасля вайны лесу далі і пабудавалі новую хату.

Запісала Н. Селязнёва.

Стэфаніда Філімонаўна Макоўская, жыхарка в. Каліта

Да вайны мы вучыліся ў Амговічах. Быў наш выпускны, гармонік граў, ліхтарыкі на дрэвах віселі.

Тут дзядзька прыбег з сельсавета, кажа: «Вайна!». Мы, хто з Каліты, хуценька пайшлі дадому. Ідзём па сцежцы скрозь жыта, і раптам у небе – фашысцкія самалёты, давай па нас страляць. Быў вечар, кулі маланкамі вакол нас паветра рэжуць. Адзін хлапец пачаў ад іх бегаць праз сцежку, то ў адзін бок кінецца, то ў другі. А мы з яго пасмейваемся: «Які ж ты ваяка будзеш!..». Смерці не адчувалі.

За вёскай ужо бамбілі, там МТС была. Так прайшла ноч, а раніцай пачаўся бой. Нашы ваенныя часці, што не паспелі адысці, у лесе стаялі. Немцы і пайшлі на іх танкамі. Жыхары вёскі свае хаты пакідалі, на другі канец лесу пабеглі.

Мама з маленькімі дзецьмі схавалася ў зямлянцы ў нашым садзе. Яна была цяжарная, а як пачалі страляць, дык ад страху мёртвае дзіця і радзіла на тую пору.

Я ж маладая, смелая, думаю, ні за што не пайду са сваёй хаты! З бацькам у ёй і засталася. Бачу, немцы – на танках, а нашы салдацікі супраць іх з вінтоўкамі: хто з-за дрэў адстрэльваецца, а хто да вёскі пабег. Тут немцы развярнулі гарматы ў бок двароў. Як сыпануць снарады чорным градам! Полымя ўгару ўзнялося. Я гляджу, у суседа кузня гарыць. Мы з бацькам выскачылі за парог, давай тушыць, а потым глядзім – гарыць усё сяло. Мы назад у хату. З усёй Каліты, а вёска вялікая была, 84 двары, толькі пяць хат і засталося. І бацькава сярод іх. Такі быў для мяне «выпускны баль», мой першы дзень вайны.

Тамара Ісакаўна Бараноўская (Бялькевіч), ураджэнка в. Новы Гуткоў

Прыйшлі фашысты ў наша сяло, давай людзей па вуліцах і дварах лавіць, да школы гнаць. Ля сцяны выстраілі, аўтаматамі лязгаюць. Схапілі і мяне, я на той час на агародзе была, у гурт кінулі. Мне тады 11 гадоў споўнілася. Стаю, дрыжу ўся. А немцы крычаць: «Шнэль, шнэль». А потым паміж сабой пачалі гаварыць, ды ў крык. Раптам сцішыліся. «Усе па дамах», – раздаецца каманда. Людзі заплакалі і пабеглі. Так Гасподзь нас памілаваў.

Ева Сямёнаўна Корбут, ураджэнка в. Гутніца

Калі вайна пачалася, мне было 22 гады. Як немцы прыйшлі, то адра-

2017©nasledie-sluck.by

зу пачалі рабаваць, збіраць моладзь у Германію – і ад нас, і з Хінолаўкі, і з Чырвонай Старонкі. Многія вяскоўцы ў лесе хаваліся, дома не жылі. У 1943 годзе ў акрузе партызаны дзейнічалі. Немцы пачалі катаванні, расстрэлы. Першым з Гутніцы загінуў Пётр Матусевіч, наш сусед, за сувязь з партызанамі. Потым расстралялі хлапцоў з сямей Янкоўскіх і Жаўрыкаў.

Аднойчы глядзім: з боку Старэва чорны дым валіць. Хутка даведаліся, што паліцаі акружылі вёску, хаты разам з людзьмі палілі, дзяцей у агонь кідалі. Праз нейкі час – зноў дым узнімаецца, ужо ад вёсак Лявішча, Падстарэва... Кожны дзень людзей палілі. Потым немцы з паліцаямі да нас у Гутніцу прыйшлі. Гэта якраз была пятніца перад Вялікаднем. Акружылі сяло. Жанок – у адзін хлеў, мужчын у другі. Кароў выганяюць, хаты пачалі падпальваць.

У майго старога дзядзькі Аляксандра Ванкевіча хата не загаралася. Тады адзін паліцай як крыкне: «Кідай яго, гніду старую, самога ў полымя!». А другі адгукнуўся: «Ды што з яго, парахні, возьмеш? Хай ідзе». Так дзядзька і выратаваўся.

А мы, жанкі, стаім з дзецьмі ў хляве, лямантуем, крычым. Раптам нейкі рух сярод паліцаяў, каманда. Потым яны нечакана вароты расчынілі, з лаянкай прэч нас пагналі. Цудам засталіся жыць. А вёску нашу тады ўшчэнт і знішчылі.

Рыгор Паўлавіч Бараноўскі,
жыхар в. Стары Гуткоў

У той час было мне 14 гадкоў. Памятаю, пры наступленні немцы ішлі па шашы – танкі, машыны, і адразу ў лес зварочвалі. Там знаходзілася наша пяхота, што не паспела адысці. Спачатку была стральба, а потым на рагу лесу, якраз насупраць нашай хаты, завязаўся рукапашны бой. Але што ты зробіш вінтоўкай супраць танка? І таму ішлі на верную смерць. Нехта з салдат пабег да вёскі. Тады немцы пачалі з танкаў расстрэльваць нашы хаты.

Я стаяў ля акна, крычу: «Мама, Статкевічы гараць!» – «Хай гараць». – «Мама, кароўнік гарыць!» – «Хай гарыць». – «Мама, мы гарым!» – А яна: «Хай гарым». Ад адчаю абыякавай стала. Сабрала нас усіх, пяць душ, і пабеглі мы пад кулямі і снарадамі ў лес хавацца.

Зранку маці ў печ паставіла абед варыцца, а ўдзень нічога ад нашай хаты не засталося: ні печы, ні сцен. Адзін попел. Вось такое чалавечае жыццё.

Васіль Цімафеевіч Мяцельскі,
жыхар в. Маяк

…Я вучыўся ў сёмым класе «нямецкай школы». Настаўнікі былі тыя ж, што і да вайны, і прадметы тыя ж. Толькі дырэктар быў другі. Нехта Акуліч… І вось аднойчы прыносяць на ўрок бланкі заяў. Гэта было ў маі 1942 года.

– У нас сёння тэма ўрока «Напісанне заявы», – аб'явіў настаўнік. Пасля раздаў кожнаму па экзэмпляру. – Вы павінны ўпісаць сюды сваё прозвішча, імя па бацьку, адказаць пісьмова на ўсе пытанні, паставіць подпіс і дату.

Мы ўсё гэта выканалі. Ніхто з нас, падлеткаў, і не падумаў, што гэта заява-просьба – згода ехаць у Германію…

Як высветлілася, некаторыя бацькі вучняў разнюхалі, чым гэта пахне, і цішком забралі ў дырэктара заявы. А мне, стрыечнаму брату Мяцельскаму Вячаславу, Гладкай Ніне ні родныя, ні блізкія нічога не падказалі. І выклікалі нас павесткаю ў Грэскую ўправу раз, а на другі раз – у Слуцк, у былы гарсавет на медыцынскую ўжо камісію

2017©nasledie-sluck.by

перад адпраўкаю ў Германію. Паехалі мы з бацькамі. Камісія па ўсіх правілах: аналізы, агляд дактароў сур'ёзны і т. д. А да дзвярэй цэнтральнага пад'езда ўвесь час падыходзяць крытыя грузавікі. Задні борт адкрываецца, нямецкія салдаты (паліцэйскіх не было) падводзяць дзяцей. Мамы вісяць у дзяцей на руках і плячах, абхватваюць – абдымаюць іх, не пускаюць. Немцы нікога не білі і не крычалі, а ціха і хутка адрывалі няшчасных мам ад дачок ці сыноў і запіхвалі апошніх у машыны, куды ўскоквалі па два аўтаматчыкі, і задні борт мігам закрываўся, машына ад'язджала. Пад'язджала чарговая.

Мяне нейкім цудам адпусцілі да «маткі». Я рос малым, вельмі шчуплым і худым. Хлопцы-равеснікі прычоскі насілі, а мяне бацька стрыг машынкаю. Можа, за гэтым адпусцілі, было, моў, шмат лепшых. Ды і што з мяне высеш, колькі тае крыві ў мяне! Казалі, што немцам тэрмінова было патрэбна шмат донарскай крыві.

Але і на гэтым не скончылася. Выклікалі трэці раз у Грэскую ўправу. Ды тут тата мой быў ужо нагатове. Ён звязаўся з членам падпольнай групы Грэска доктарам Жогла. І на аглядзе мяне прызналі з 1929 года нараджэння другой палавіны. Вось мой выгляд кажана і недарасля і спатрэбіўся…

Слуцкі край. 2005. 5 чэрвеня.

Міхаіл Масюк, жыхар Слуцка

Я нарадзіўся ўжо пасля вайны, у 1946 годзе, але на ўсё жыццё запомніў успаміны сваіх родных пра цяжкія гадзіны Вялікай Айчынай вайны.

Першыя дні вайны ў вёскі Мялешкі, Папоўцы нашага раёна амаль не прынеслі вялікай бяды. Яна грукацела залпамі гармат, выбухамі бомбаў дзесьці далей. Праз вёскі праязджалі абозы немцаў, шнырылі паліцаі на веласіпедах. Некалькі разоў рабілі аблавы для адпраўкі маладых людзей на працу ў Германію. Пасля таго як партызаны ўзарвалі некалькі мін, зрабілі «налёт» на драўляны мост, разбілі нямецкі абоз, забілі двух немцаў, у вёскі наехала немцаў і паліцаяў.

Моцны грукат у дзверы і вокны хаты дзеда Сямёна Шыловіча ў Мялешках... Бабуля Аўдоля кінулася адчыняць дзверы. Паліцаі вывелі яе ў двор, білі, каб яна расказала пра сыноў і дачок, якія знаходзіліся ў партызанах: Івана, Адама, Веру, Марыю з мужамі і дзецьмі. Бабуля атрымала шмат цяжкіх траўм, але нічога не сказала паліцаям, сярод якіх быў і аднавясковец Сыцька. Сусядзі амаль нежывую ўнеслі яе ў хату. Каля года лячылі яе мазямі з гліны, зёлкамі. Ачуняла бабуля, але здароўе ўжо было падарвана. Потым усе здраднікі атрымалі пакаранні, а некаторыя іх сем'і і сам Бог пакараў.

Мая маці Вольга Сямёнаўна, даведаўшыся пра цяжкі стан сваёй матулі, з Папоўцаў з дзецьмі накіравалася да бацькоў. Узяла з сабой дзесяцігадовую дачку Шуру, сямігадовага сына Валодзю і сына Івана, якому споўнілася два з паловай гады. На вуліцы іх спынілі немцы. Маці сказала дзецям, каб яны не плакалі, узяліся за рукі і пайшлі да дзеда. Пажылы немец фельдфебель і малады рыжаваты павялі маці ў канец Папоўцаў да высокага ветрака. Там яна стала на калені і шаптала словы малітвы, хрысцілася. Яна малілася і плакала, у думках звярталася да сваіх родных і дзяцей. Малады немец узняў аўтамат, а пажылы спыніў яго. Дастаў з кішэні іконку і фотакартку, перахрысціўся, прыпадняў маці. Праз слёзы мама разгледзела на фотаздымку жанчыну і траіх дзяцей. Потым немец

2017©nasledie-sluck.by

выстраліў угару і паказаў маці на дарогу: «Шнэль, матка, шнэль, кіндар». Мама перахрысцілася, перахрысціла і немцаў, цяжкімі нагамі пайшла на дарогу...

Вятрак той стаяў пасля вайны яшчэ гадоў 13–15, спраўна працаваў. Мне некалькі разоў давялося разам з бацькам паднімацца на таямнічы млын. Калі ён не працаваў, мы, вясковыя хлопчыкі, гулялі каля яго. Нярэдка да млына падыходзіла мая маці. Яна хрысцілася і расказвала пра той страшны 1943 год. Тады ёй было 35 гадоў…

У 1946 годзе нарадзіўся я. Маці не цуралася працы: добра шыла, ткала, даглядала хатнюю гаспадарку, выходзіла ў калгас на розныя работы. Была ўдзельніцай Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве ў 1954 годзе. Дапамагала мужу-лесніку садзіць дрэвы. Больш за 50 гадоў растуць на Случчыне «бацькоўскія» сосны, сярод іх і тыя, што пасадзіў я. І ўжо новае пакаленне садзіць новыя лясы і сады, каб зрабіць наш край яшчэ больш прыгожым, зялёным, шчаслівым. Міру, далейшага табе росквіту, родная Случчына!

Слуцкі край. 2010. 5 сакавіка.

Вера Кірылаўна Гурэева (Мірончык), ураджэнка в. Ячава

Я, Вера Кирилловна Гуреева (Мирончик), родилась в деревне Ячево 14 августа 1925 года в семье колхозника. Отец работал бригадиром в дорожной организации, а мама выращивала лен. Она заболела астмой, а отец оставил нас в 1938 году. Мы с братом Степаном (он 1930 года рождения) и больной матерью жили трудно, недоедали, дров не было – собирали, где что найдем на растопку. 22 июня 1941 года председатель сельсовета приехал в Ячево и объявил о том, что началась война, призвал всех военнообязанных явиться в военкомат. 22 июня в 23 часа от бомбежки в Слуцке даже у нас повылетали оконные стекла. 23 июня над призывным пунктом в Слуцке неожиданно появились немецкие самолеты, сбросили бомбы, и все смешалось с землей. Там был и наш дядя Николай Тимофеевич Мирончик – красивый, образованный мужчина. Работал он инспектором по школам, а его жена Александра Федоровна – корректором в типографии. У них было трое детей – двое сыновей и дочь, жила с ними и мама Миколы. Во вторник тетя Шура пошла искать дядю Миколу. Сотни женщин искали своих мужей и сыновей. Им сказали, что раненых увезли в больницу – там нашла погибшего дядю тетя Шура. И осталась она с тремя детками и старенькой свекровью...

Через несколько дней Слуцк оккупировали немцы, в город вошли их танки. Мы с соседями вырыли у нас в саду землянку шириной и длиной метра два, в которой спасались от немцев.

Начались тяжелые дни. Депутатов, председателей, коммунистов немцы убили. В городе согнали в гетто евреев, организовали лагерь военнопленных, в котором в августе 1941 года находилось более 10 тыс. человек.

Многие жители Ячево стали уходить в партизаны семьями: Мартын Русак, Мария Илюкевич, Мороз. В августе всех связанных с партизанами забрали и убили. Мария с сыном и ее мама остались в живых. Сестра тети Шуры тоже ушла в партизаны, а к ней приходила под видом нищей – приносила листовки. Рискуя своей жизнью и жизнью детей, тетя Шура расклеивала их в Слуцке и в Ячево. Она часто брала меня с собой, но ни во что не посвящала, боялась, чтобы я не попалась немцам.

2017©nasledie-sluck.by

Голодное было время: питались овощами да картошкой – тем, что в огороде росло. Партизаны ночью приходили, чтобы взять каких-нибудь продуктов. Если их ловили немцы, суд был на месте – казнь через повешение, на груди – доска с надписью «Враг», «Партизан», «За связь с партизанами». Староста нашей деревни тоже был связан с партизанами. На воротах нашего дома была надпись на немецком языке: «Здесь живет больная туберкулезом женщина». И немцы боялись к нам заходить. Прошло три года оккупации. Начало 1944 года было очень страшным – ловили молодых людей и отправляли в Германию. Молодежь уходила в леса. Возле Козлович был «дзот» – мы там прятались, а родители оставались дома в Ячево. И вот 29–30 июня 1944 года нас освободила Красная Армия. Командир спросил, где есть немцы, мы ему указали на 11-й и 13-й городки. И он сказал: «Идите на окраину леса и посмотрите, как стреляет наша «Катюша».

В этот день немцы сожгли нашу хату и еще шесть домов – тушить было некому, все сгорело дотла. 1 июля мы вернулись в деревню и пошли жить к тете. А в августе я начала работать финансовым агентом, кассиром в карточном бюро, а потом – в открывшемся магазине в Ячево. Вышла замуж за Николая Прокофьевича Гуреева, стали обустраивать небольшую хатенку. Взяли кредит на маму, но в 1948 году она умерла. Все было по карточкам: по рабочей карточке выдавали 500 граммов хлеба, служащим – по 400 граммов, иждивенцам – по 300, детям – по 250. Зарплаты у нас (муж работал завхозом в горсовете, я в магазине) были маленькие, кредит выплачивать было нечем. Мы уехали к мужу на родину, где и сейчас живем. Николай Прокофьевич освобождал Сталинград, Украину, Белоруссию, Восточную Пруссию, дошел до Берлина. Сейчас мужу 92 года, мне – 85. Мы вырастили троих детей, у нас семеро внуков, пять правнуков. Это наше главное богатство.

Слуцкі край. 2010. 2 ліпеня.

Не дрогнули перед врагом великосливцы

З успамінаў Мікалая Фёдаравіча Леановіча, жыхара г. Слуцка

Днем 22 июня 1941 года жители деревни Великая Слива группами стояли на улицах и смотрели в сторону Слуцка, над которым кружились немецкие самолеты и откуда доносились взрывы бомб и пулеметные очереди. Около деревни Новый Двор гитлеровцы подбили советский самолет, пилот которого выпрыгнул на парашюте. Немецкий самолет кружил над ним и стрелял, но выжил ли летчик – не знаю. К вечеру со стороны Погоста в Слуцк по деревне проехали автомашины с красноармейцами. А ночью снова бомбили Слуцк, несколько бомб упало между деревнями Великая Слива и Лесище на помещение по содержанию овец. Таким запомнился мне первый день Великой Отечественной войны.

Через несколько дней в Великой Сливе появились немцы – человек тридцать – на велосипедах, лошади тянули пушку. Разместились они в центре деревни, никого не трогали, отдавали пустые пачки от папирос с золотистой и серебристой фольгой. Назавтра немцы ушли в сторону Погоста. Как-то я с мамой был в поле между Великой Сливой и Нежевкой.

2017©nasledie-sluck.by

Видим – мимо поля прошло много гитлеровцев, некоторые что-то выкрикивали, но не остановились. В это время в поле пряталось несколько красноармейцев. Немало их осталось в Великой Сливе, некоторые создали семьи.

Точная дата не запомнилась, когда в нашей деревне появились староста и полицаи, которые выслеживали коммунистов, сельских активистов, бывших красноармейцев, арестовывали их, а иногда сразу и убивали. Зимой 1941/1942 года в деревню начали приходить партизаны, брали у сельчан продукты, переодевались, рассказывали о событиях на фронтах, расспрашивали о немцах и полицаях. Если в доме было много людей, мужчин по одному вызывали на улицу, беседовали, уходя, предупреждали, чтобы в течение часа не выходили.

Запомнилось, как в начале войны на лугу между Великой Сливой и Козловичами из-за нехватки горючего приземлился советский самолет. Вскоре из него исчезли три пулемета, около трех тысяч патронов, шесть бомб, которые позже оказались у подпольщиков. Подпольем в Великой Сливе руководили бывший председатель колхоза коммунист Федор Чижик, бывший летчик Василий Голец, учитель Вячеслав Перковский. В начале 1942 года в деревне открыли школу, читали немецкие журналы, решали задачки. Школьникам внушали радости жизни в Германии. Но потом партизаны выбили окна, поломали парты, а учителей прогнали. Немцев мы боялись меньше, чем полицаев. Немцы приезжали в деревню, меняли сахар, соль, еще что-то на кур, яйца, соль, колбасу. Как-то я подошел к месту обмена в летчицкой пилотке со звездочкой. Один из немцев взял винтовку, подошел ко мне и сказал на ломаном русском языке: «Кинь кепель, а то запщелю». Я сунул пилотку в карман – и ходу.

В 1942 году В.Ф. Перковского арестовали, посадали в полицейский участок в здании школы в деревне Царевцы (Кирово). Его сильно били, но в одну из ночей Вячеславу Филипповичу удалось сбежать, переплыть реку, спрятаться в сарае в Великой Сливе, а потом уйти в партизанский отряд в районе деревни Старево. Туда вскоре ушла и его жена подпольщица А.П. Лазаренко. К весне 1943 года в партизаны ушло немало молодых мужчин и женщин нашей деревни. И не зря: в это время немцы начали угонять людей в Германию, арестовывали подпольщиков и семьи партизан. Был арестован и Василий Голец с семьей. Он соскочил с машины и с возгласом «Всех не перестреляете!» бросился бежать.

Около магазина его убили. Тогда же арестовали восемь семей, детей отпустили, а взрослых расстреляли. Позже арестовали еще 18 семей. Около домов семей партизан ночью стояли полицейские, а утром сельчан приводили в центр деревни. Там немцы проводили митинг, сказали, что людей выводят из партизанской зоны, чтобы они спокойно жили и работали. Люди собрали вещи, и под конвоем их увезли, как потом узнали – в тюрьму, а через некоторое время расстреляли. Приусадебные участки, принадлежавшие семьям партизан, позже полицейские засеяли овсом и гречкой.

Весной 1944 года партизаны проводили, если можно так сказать, мобилизацию молодых мужчин и переправляли за линию фронта. Да и вообще чувствовалось приближение фронта, все чаще возникали разговоры, что скоро придут наши. Немцы брали молодых людей для строительства укреплений в деревне Козловичи, на ночь отпускали

2017©nasledie-sluck.by

домой. И вот как-то вечером один из немцев сказал, чтобы завтра не приходили: вас увезут или убьют. Конечно же, мы не пошли.

Перед обедом в один из июньских дней 1944 года в деревне показались советские танки. Оставшиеся в живых сельчане вышли на улицу, не могли сдержать свою радость. Красноармейцы начали из Козлович «катюшами» обстреливать Слуцк. От странного сильного воя сельчане испугались и бросились прятаться кто куда. Вскоре через деревню в сторону Погоста прошли наши войска, красноармейцы забрали пасшихся на лугу лошадей. Через несколько дней началась мобилизация в армию, призвали и моего отца, Федора Зиновьевича Леоновича, который с боями дошел до Берлина. А в Великой Сливе был день, когда плакала чуть ли не вся деревня: в сельские дома 1 сентября 1944 года пришло 11 похоронок. Такой ценой заплатили мои земляки за свободу и независимость нашей Родины. Пусть же память об этом живет в веках.

Нявольнікі са знакам «ОСТ»

На чацвёрты дзень вайны, 26 чэрвеня, фашысцкія захопнікі паказаліся на заходняй ускраіне Слуцка. Захапіўшы горад, фашысты ўстанавілі ў ім свой «новы парадак» – рэжым рабства, тэрору і насілля.

Зусім другім стаў Слуцк. Замест прыгожых дамоў – развалiны, папялішчы. Фашысты рабавалі жыхароў горада і раёна. Вывозілі ў Германію лес, абсталяванне, жывёлу. Па-зверску знішчалі ні ў чым не павінных людзей. Планам «Ост» прадугледжвалася 75 % беларусаў знішчыць і выселіць, а астатніх ператварыць у паслухмяных рабоў. З фашысцкіх захопнікаў была знята адказнасць за крывавыя расправы над савецкімі людзьмі. У памятцы нямецкага салдата гаварылася: «У цябе няма сэрца, нерваў, на вайне яны не патрэбны. Забівай усякага рускага, савецкага, не спыняйся, калі перад та-

Працоўная карта былой вязніцы Е.М. Васільевай

З.Ф. Валетка, вязень канцлагера ў Дортмундзе

2017©nasledie-sluck.by

бой стары ці жанчына, дзяўчына ці хлопчык, – забівай». На Нюрнбергскім працэсе над галоўнымі нямецкімі ваеннымі злачынцамі было зачытана данясенне каменданта Слуцка ад 20 кастрычніка 1941 года, у якім гаварылася: «В городе везде слышались выстрелы и на улицах валялись грудами трупы расстрелянных...».

У ліку фашысцкіх злачынстваў асаблівае месца займае вываз савецкіх людзей на катаржныя работы ў Германію. У Слуцку была створана фашысцкая «ўстанова», названая «Акруговая біржа працы». На справе гэта была не біржа працы, а біржа ганебнага ашуканства насельніцтва Случчыны, біржа прымусовай пастаўкі рабоў на катаржныя работы ў Германію. Фашысты выяўлялі фізічна здаровых людзей, заносілі іх у спіскі і накіроўвалі ў паліцыю і пры яе дапамозе вылоўлівалі моладзь па базарах, у царкве, на вуліцах і адпраўлялі ў Германію. Першым прыёмным пунктам няшчасных людзей, якіх адпраўлялі ў фашысцкую няволю, была слуцкая турма. Тут нявольнікі праходзілі каранцін. Затым іх адпраўлялі на машынах пад аховай у Мінск для пагрузкі ў вагоны. У вёсках таксама адбіралі маладых людзей і гналі ў Германію. Толькі за 1943 год адправілі са Слуцкага раёна 2400 хлопцаў і дзяўчат.

З успамінаў Алены Казіміраўны Камінскай з в. Ціхань: *«Нас выгналі на вуліцу, ціханцаў выстраілі ў рад, паставілі з аднаго боку кулямёт і з другога боку кулямёт. Ішоў афіцэр з салдатам і адбіраў маладых у Германію. А мы з дзецьмі так і засталіся ў гэтым радзе. Потым загадалі нам сабраць падушачку, коўдру, на тры дні есці, і паліцаяў паставілі ў калітках, каб гэтыя ўжо не заходзілі, каго ў Германію адабралі. Ну, мы вынеслі ім на вуліцу есці, усё сабралі. Іх пагналі, маладых, у Германію...».*

У Слуцку фашысты часта вывешвалі аб'явы: «Вербовка рабочей силы в Германию». Абяцалі маладым людзям, якія паедуць у Германію, работу, хлеб, кватэры, багатае і шчаслівае жыццё. На самай жа справе тыя, хто трапляў у Германію, працавалі, як рабы, паміралі ад голаду і хвароб, і мала хто вярнуўся на Радзіму. Тых, хто ўхіляўся ад адпраўкі, расстрэльвалі. Іх везлі ў перапоўненых да адказу і наглуха зачыненых таварных вагонах. Па многу дзён яны не атрымлівалі ні ежы, ні вады і тысячамі паміралі ў дарозе. Непасільную катаржную працу на заводах і рудніках, цяжкія бытавыя ўмовы, здзекі цярпелі тыя, хто заставаўся ў жывых. Яны былі пазбаўлены сваіх імён, ім нашывалі нагрудныя знакі «ОСТ». Спецыяльныя знакі былі ўведзены для рускіх, украінцаў і беларусаў.

З успамінаў случчаніна Васіля Несцерава: *«У германскую няволю мяне забралі прымусова. Мы ехалі тыдзень. Вагонаў ніхто не адчыняў. Харчаванне не давалі. Толькі калі нявольнікі, разламаўшы вагон, уцякалі, тады ў вагон, як звяры, урываліся немцы і білі да паўсмерці тых, хто застаўся. Нас завезлі ў горад Хэмнес. У лагеры ўжо было 9 тыс. мужчын, жанчыны былі ў другім лагеры. Ён быў агароджаны калючым дротам, вакол стаялі кулямёты, ноччу лагер асвятлялі пражэктарамі. Спалі на сырой зямлі ў сваім адзенні. У 5 гадзін раніцы ўсіх паставілі ў калону і пад канвоем пагналі на работу – работа працягвалася да 7 гадзін вечара. Абяссіленыя, збітыя гумавымі палкамі, пад вартай вярталіся мы ў лагер. Па дарозе многія гублялі сілы, падалі і больш не ўставалі: іх прыстрэльвалі. Увесь час галадалі. На суткі выдавалі 230 грамаў*

2017©nasledie-sluck.by

Працоўная карта былога вязня М.Я. Шыманскага

Сям'я Анучфрыевых, былыя вязні канцэнтрацыйнага лагера Равенсбрук

хлеба, спечанага з сушаных буракоў і бульбянога шалупіння, і конаўку гарачай вады. Ад такой працы штодзён паміралі 50–70 чалавек. З рызыкай для жыцця мне ўдалося ўцячы з фашысцкай няволі, каб са зброяй у руках знішчаць праклятага ворага за зверскія здзекі над нашым народам».

У зале краязнаўчага музея захоўваецца працоўная картка Шыманскага Мікалая Якаўлевіча, жыхара Слуцка, вывезенага фашыстамі ў Германію. У 1944 годзе ён уцёк з няволі і далучыўся да чэхаславацкіх партызан. Разам з імі змагаўся супраць фашыстаў. Удзельнічаў у многіх дыверсіях і разгроме адступаючых нямецкіх часцей. А 3 мая 1945 года ўліўся ў рады Чырвонай арміі і вярнуўся на Радзіму.

«Не будзьце мяккія і сентыментальныя» – гаварылася ў «Дванаццаці запаветах паводзін немцаў на Усходзе».

...Гэта адчула, зведала і Фядзяева Еўдакія Міхайлаўна, яна была сувязной партызанскага атрада імя Жалезняка брыгады імя Чкалава з кастрычніка 1942 года па красавік 1944 года. Потым трапіла ў фашысцкі палон і была вывезена ў Германію.

За час акупацыі з Беларусі было вывезена 380 тыс. чалавек, у тым ліку больш за 24 тыс. дзяцей. Часта дзеці выкарыстоўваліся для лячэння параненых нямецкіх салдат. Вярнулася ж дамоў з няволі каля 120 тыс. чалавек.

Крывашэй Зінаіда Іванаўна (дзявочае прозвішча Аксёнава) з вёскі Навадворцы ў 1941 годзе разам з маці і старэйшай сястрой жыла ў акупіраваным Слуцку. Усе яны былі арыштаваны за сувязь з партызанамі і пасаджаны ў слуцкую турму. А ў студзені 1944 года былі вывезены фашыстамі на катаржныя работы ў Германію. Жылі яны ў лагеры, працавалі на металургічным заводзе, выконвалі цяжкую мужчынскую працу. Увесь час галадалі, цярпелі холад, здзекі, не было ніякай медыцынскай дапамогі.

З успамінаў Зінаіды Іванаўны: *«Аднойчы мая маці, Фёкла Пятроўна, ёй тады было 54 гады, моцна захварэла і не выйшла на работу. Яе маглі расстраляць ці адправіць у другі лагер. І я ўвесь час плакала і не магла працаваць. Немцы заўважылі гэта і моцна мяне збілі, а потым адправілі ў цёмную і сырую*

2017©nasledie-sluck.by

камеру на доўгі час. Немка-наглядчыца пашкадавала тады мяне, распытала пра ўсё і загадала вярнуць на рабочае месца. Маці не працавала і паёк ёй не давалі. Я дзяліла свой паёк з маці. Яна выжыла. Нашы салдаты вызвалілі нас 23 красавіка 1945 года, і мы вярнуліся на Радзіму».

Пасля вайны Зінаіда Іванаўна працавала ў калгасе «1-е Мая» разам з мужам. Нарадзіла дзвюх дачок. Вялікае гора напаткала яе на старасці гадоў – старэйшая дачка Святлана рана памерла. Ёй давялося дапамагаць двум унукам. Дачка Галіна жыве ў Слуцку. Слуцкаму краязнаўчаму музею Зінаіда Іванаўна перадала даведку Камітэта дзяржаўнай бяспекі аб тым, што яна знаходзілася на катаржных работах у Германіі, копію пасведчання непаўналетняга вязня фашысцкіх канцлагераў, шмат паштовак з віншаваннямі да дня Перамогі і вызвалення Беларусі, нават ад нашага Прэзідэнта А.Р. Лукашэнкі.

Другая сусветная вайна прайшлася бязлітасным катком па лёсах мільёнаў ні ў чым не вінаватых беларускіх людзей, пакуты і страты іх былі непамернымі. І гэтыя раны будуць балець яшчэ доўга.

Г.А. Макарэвіч.

Доўгая дарога з няволі

У тэлефонным званку з вёскі Сяргі ад майго колішняга аднапалчаніна па службе ў войску Сяргея Дзмітрыевіча Шахновіча, да пенсіі – старшыні мясцовага сельсавета, прагучала падказка тэмы: «Прыедзь да нас, хачу, каб ты сустрэўся з пенсіянеркай – Вольгай Мікітаўнай Чуйка. У свае пятнаццаць гадоў яна з сяброўкай Алёнай Антонаўнай Басалыга трапілі ў Слуцку ў аблаву немцаў для вывазу ў Германію, у дарозе выскачылі з таварнага вагона і пешкі, зімой, адолеўшы не адну сотню кіламетраў па нямецкіх тылах, дабраліся дамоў».

І вось на ўскрайку Сяргі, у невялічкім дамку, мяне сустракае Вольга Мікітаўна. У свае 82 гады яна пры добрай памяці і ясным розуме, добразычлівая. У хаце чысценька, утульна, на покуці – ікона Міколы Цудатворца, на століку – Біблія, свечкі.

– Зімой 1943 года маці дала ў торбачку на продаж мо дзясятак яек, пару бруской сыру. Толькі паспелі прадаць на Слуцкім рынку прынесенае, як пачулі крыкі: «Аблава!» – пачала свой расказ суразмоўніца. – Уцякаць ужо было позна – вакол базара стаялі ў ланцуг паліцаі і немцы, людзей хапалі і саджалі ў стаяўшыя непадалёку грузавікі. І нас з Алёнай заштурхнулі, нягледзячы на наш узрост. Завезлі ўсіх у слуцкую турму, тры дні трымалі ў вялікай камеры, не давалі ні есці, ні вады, людзей было як селядцоў у бочцы, мужчын і жанчын. Нават па патрэбе не выводзілі, паставілі ў кутку нейкі цабэрак. Мужчыны сказалі, што ўсіх чакае адпраўка ў Нямеччыну. Бацька мой, праведаўшы, дзе я, бо ў камеру трапіла і шасцёра нашых вясковых мужчын, прынёс мне сёе-тое з ежы.

Хутка ўсіх пасаджалі ў адкрытыя грузавікі, для канваіраў над кабінай быў нейкі казырок. Даехалі да Баранавіч. Мы з Алёнай не вельмі мерзлі, а многія былі апрануты не па-зімоваму, мучыліся ад холаду. У Баранавічах звадзілі ўсіх да калодзежа і далі папіць вады. Потым загналі ў вагоны-цялятнікі, чалавек па сорак у кожны,

2017©nasledie-sluck.by

падчапілі да паравоза (наперадзе яго было тры платформы з пяском). І ахова ў двух вагонах ехала, сачылі ў дарозе за людзьмі. Пра пабег ніхто і не думаў. Холадна было, праўда, у мяне і Алёны на плячах былі аўчынныя кажушкі, на нагах – сшытыя маім дзядулем на адну нагу боты, у Алёны яны былі гумавыя.

На наша шчасце, у вагоне акно было адкрытае, і па ходу поезда халодны вецер даймаў усіх. Ноччу цягнік рухаўся паволі, гэта было чуваць па перастуку колаў на стыках рэек. Мужчыны ў вагоне гавораць нам: «Дзяўчаткі, лезьце ў акно і прыгайце, то мо ацалееце». Падсабілі нам пралезці ў тое акно. Я першая скокнула, разбіла калена, у боце пачула цёплую макроту ад крыві, былі драпіны на руках, плячы. Алёна скокнула пазней, мо метраў за дзвесце ўперадзе. Упала на кучу пяску ўзбоч дарогі, атрымала вялікі сіняк пад вокам і вялікую пухліну на тым месцы, кроў сачыла з рук. Калі поезд знік, мы сталі ўголас маліць Бога, дзячыць яго за наша выратаванне. Хутка настаў дзень, і мы ўзбоч чыгункі пайшлі на ўсход, хаваліся ў кустах пры з'яўленні новага стрэчнага цягніка.

Натрапілі на хутар непадалёку ад чыгункі. Мужчына, паляк, чэрпаў у студні ваду, дазволіў нам зайсці ў хату. Мы памыліся, жонка яго дала ручнічок, напаіла кавай з чорным хлебам, перавязала мне бінтам рану на каленцы. Паслала на падлозе коўдру, і мы праспалі да раніцы нібы забітыя. Раніцай гаспадар дому вывеў нас на прасёлкавую дарогу, што вяла, па яго словах, да станцыі Кнышын. У дарозе нямецкія патрулі не раз спынялі, рабілі вобыск і адпускалі. Мы гаварылі ім па-свойску, што абое – дзеці бежанцаў, адбіліся ад сем'яў.

На блок-пасту, ля станцыі Асавец, на Алёну нечакана ззаду напала аўчарка, яе спусціў з павадка нямецкі патрульны. Сабака толькі паставіў ёй на плечы лапы і прабурчэў, не кусаў, але дзяўчына вельмі спалохалася. Нас завялі ў памяшканне, за сталом сядзелі поруч немцы і паліцаі. Усчалі допыт, Алёна стала на калені і пачала маліцца, прасіць, каб нас адпусцілі. Паліцай, паляк, моўчкі вывеў нас і паказаў дарогу. Нацярпеліся толькі страху.

У дарозе шукалі для начлегу хату пабяднейшую – і рэдка калі іх жыхары адмаўлялі. Давалі паесці, пераспаць на падлозе пад коўдрай на дваіх, раніцай кармілі тым, што мелі, нават нярэдка на дарогу па кавалку хлеба совалі ў кішэні. Неяк адна гаспадыня падала на сняданак талерку з духмянымі бублікамі. Мы паласаваліся, а я адну ўпотай прыхапіла на дарогу, то яе падзялілі папалам, бо абеду, як правіла, не было – толькі дарога да стомы.

Пасля Слоніма, дзе нам наладзілі строгую праверку, дайшлі без асаблівых прыгодаў да Баранавічаў. Там мае боты разваліліся ўшчэнт, нельга было ўжо і кроку ступіць. То выручыла мяне жанчына-бежанка з Вялікіх Лукаў, дала лазовыя лапці з аборамі, анучы, у іх даклыпала да сваіх Сярагаў, дзе нас з Алёнай ужо не чакалі.

Колькі было радасці, слёз у мамы, бацькі, сясцёр, самі ледзь не млелі ад шчасця вяртання да роднага дому.

2010 г. М.А. Тычына.

2017©nasledie-sluck.by

Маладосць сясцёр Мароз

Іх адносна спакойнае, па тым часе, дзяцінства скончылася ў адзін дзень 2 мая 1944 года. На трох падводах у Бярозаўку прыехалі са Слуцка паліцаі. Па бацьку – з арыштам. Лявон Мароз трымаў сувязь з партызанамі, перадаў ім некалькі вінтовак, падабраных у кустах у першыя дні вайны, торбу солі. Ды і ляскныя салдаты заходзілі ў яго дом як у свой.

Вясковы «стукач», што прыслужваў акупантам, данёс на Мароза. Двойчы паліцаі прыязджалі па яго, але Лявона не было дома, і яны не сталі чакаць. Жонка папярэджвала, прасіла пахавацца некалькі дзён, а Лявон у той злашчасны дзень пайшоў сеяць лён. І яго ўзялі. Разам з сямнаццацігадовай дачкой Марыляй. Праз два дні арыштавалі і адвезлі ў слуцкую турму жонку Лявона – Антаніну і чатырнаццацігадовую дачку Надзю. Васьмігадовага Федзьку пакінулі бабулі. «Гэта вам на памяць», – сказаў старшы з паліцаяў.

Мужа і жонку Марозаў праз тыдзень расстралялі. Гэтую вестку перадаў бабулі вясковец Кандрат Беразоўскі, які працаваў пры турме вартаўніком і бачыў, як на досвітку Лявона, Антаніну і яшчэ некалькі вязняў пасадзілі ў машыну і павезлі за горад. Назад машына вярнулася пустой.

Ад таго Кандрата бабуля даведалася, што ўнучак Марылю і Надзю адправяць у Нямеччыну і вельмі своечасова перадала на дарогу сёе-тое з прадуктаў.

Цэлы тыдзень яны ехалі ў перапоўненым жанчынамі і дзяўчатамі «цялячым», з кратамі на вокнах, вагоне. Завезлі іх у Баварыю, у невялікі горад Нэчкаў. Завялі ў драўляны з двух'ярусным нарамі барак, чалавек на сто пяцьдзесят. І сказалі: «Тут будзеце жыць, адсюль хадзіць на работу, без ведама каменданта за дзверы барака – ні кроку».

Былі там не толькі беларускія дзяўчаты, а і ўкраінкі, рускія, палячкі. Выдалі кожнаму брэзентавыя курткі-робы з нашыўкамі на спіне «Ост» і нумарамі. У Марыі ён быў 138, у яе сястры – 139.

Камендантам барака ўлады прызначылі крутую норавам, грубую і крыклівую немку. У шэсць гадзін раніцы яна заходзіла ў барак, пляскала ў ладкі і крычала: «Аўфштэйн! Шнэль, русіш швайнэ!» Жанчыны хуценька ўсхопліваліся, выпівалі чашку кіпеню, замест чаю, з кавалкам хлеба, і беглі ў двор на пастраенне, каб ісці пад канвоем на работу.

«Я ў першыя дні шыла рукавіцы ў нейкай майстэрні, – успамінае Марыя Лявонаўна. – Побач працавалі і немкі. Надзю, як малалетку, ды яшчэ ростам яна была не вельмі, камендантша пакінула ў бараку – мыць падлогу, пасуду, разносіць абед хворым няволькам. А кармілі нас так, каб не памерлі з голаду. На абед давалі міску баланды з бручкі і мучной заціркі. І ўсё. Хлеба давалі на тыдзень два кіло. Хочаш – увесь з'ядай адразу, хочаш – раскладвай па днях. На вячэру была салата са шпінату і фасолі. Мы з Надзяй такія худзюшчыя сталі – нібы былінкі. Асабліва востра даймаў голад, калі мяне перавялі ў нейкі машыназборачны цэх, даводзілася цэлы дзень круціць гайкі, насіць метал.

Амерыканскія самалёты рабілі налёты на Нэчкаў. З зімы 45-га нас сталі даволі часта ўзнімаць ноччу па трывозе і заганяць у падвалы стаяўшага паблізу цаглянага дома – бамбасховішча. Не раз паблізу грымелі выбухі бомбаў,

2017©nasledie-sluck.by

калаціліся сцены падвала, але ў наш дом не трапіла ні адна. Усе мы ў такія хвіліны малілі Бога, каб уратаваў нас.

Амерыканскія салдаты ў красавіку 45 года на танках пад'ехалі да барака, немцы з аховы пахаваліся, кудысьці збегла і наша камендантша, і мы кінуліся насустрач сваім збавіцелям. У аднаго амерыканца паявіўся ў руках акардэон ці гармонік, ён зайграў, і дзяўчаты ад радасці пайшлі ў скокі. Затым нас пачаставалі добрым абедам. З месяц мы жылі як людзі – сытыя і свабодныя. Потым паступіла каманда садзіцца ў грузавікі і нас павезлі ў савецкую зону акупацыі, да сваіх. Правяралі там кожнага: адкуль прыехаў, па сваёй волі ці прымусова, хто застаўся дома. Мы з Надзяй усё расказалі. І нас адправілі на машынах на Усход – на Радзіму».

2000 г. М.А. Тычына.

Вайна без зброі

У кожнага была свая вайна. Адны прайшлі яе франтавымі дарогамі, іншыя – ляснымі партызанскімі сцежкамі. Адны працавалі ў савецкім тыле, іншыя перажылі страшны час акупацыі. А вось ураджэнцу Случчыны Дзмітрыю Казлоўскаму давялося весці сваю вайну. Тры з паловай гады ён знаходзіўся ў палоне, аднак у кагорце пераможцаў яму па праву належыць пачэснае месца.

Ураджэнец вёскі Бранавічы Слуцкага раёна Дзмітрый Іванавіч Казлоўскі сустрэў Вялікую Айчынную вайну капітанам медыцынскай службы на пасадзе старшага палкавога ўрача 38-й танкавай дывізіі 13-й арміі. За плячыма 30-гадовага афіцэра ўжо былі сямігодка, прафтэхвучылішча, работа токарам на заводзе, вучоба ў Мінскім медыцынскім інстытуце, які скончыў з адзнакай. У 1938–1939 гадах дзевяць месяцаў праслужыў на Балтыцы ўрачом брыгады падводных лодак. Быў звольнены ў запас і зноў мабілізаваны ў сакавіку 1940 года, на гэты раз у танкавыя войскі. Баранавічы, паход у Прыбалтыку, Беласток, Барысаў. З першых дзён вайны полк накіравалі на абарону шашы Слуцк – Мінск, потым з баямі адступаў да Магілёва. 26 ліпеня 1941 года палкавы ўрач трапіў у палон. Пачалася яго лагерная эпапея.

Спачатку – лагеры ў Слуцку і Баранавічах, потым – Седлец у Польшчы і «афлаг XIII-D» Хамельбург у Баварыі. Хамельбург быў адзіным афіцэрскім лагерам для каманднага складу Чырвонай арміі, створаным у гады вайны. Праз яго прайшло каля 18 тыс. савецкіх афіцэраў. У розныя часы тут утрымлівалі генералаў Дз. Карбышава і Р. Зусмановіча, герояў абароны Брэсцкай крэпасці маёра П. Гаўрылава і капітана І. Зубачова. Лагер быў інтэрнацыянальны. Разам з савецкімі ваеннапалоннымі знаходзіліся французы, сербы, англічане, чэхі. Такое суседства некалькі аблягчала лёс савецкіх людзей. Замежнікі забяспечваліся значна лепш, яны атрымлівалі харчовыя пасылкі, часта перадавалі прадукты сваім «рускім» таварышам па няшчасцю. Рабіць гэта было няпроста. «Рускі» лагер знаходзіўся ізалявана ад астатніх, быў абнесены калючым дротам і моцна ахоўваўся. У асобным будынку жылі прадстаўнікі Міжнароднага Чырвонага Крыжа, прысутнасць якіх некалькі абмяжоўвала самаўпраўства гітлераўцаў.

Восенню 1941 года ў лагеры лютавала эпідэмія сыпнога тыфу. Казлоўскага

2017©nasledie-sluck.by

як доктара адправілі ў санітарны барак, так званы «рэвір», дзе пастаянна ўтрымлівалася звыш ста чалавек. Сярод іх – людзі з адкрытай формай туберкулёзу, дызентэрыяй, сыпным тыфам, кішэчнымі хваробамі, траўмамі і гэтак далей. Абнесеныя калючым дротам баракі стаялі пасярод лагера. Памяшканні не ацяпляліся, хворыя ляжалі на двух'ярусных ложках на тонкіх папяровых матрацах. Амаль поўная адсутнасць медыкаментаў, кепскае харчаванне, невыкананне элементарных гігіенічных нормаў хутка зводзілі людзей у магілу. Сведка прыгадваў: «Ноччу невыносна крычалі ад болю «кішэчнікі», якія трапілі сюды пасля ўжывання баланды з пяском. Тут смерць лічылася звычайнай з'явай. Усе яе чакалі, да яе рыхтаваліся».

Казлоўскі выконваў свой абавязак нават у такіх умовах. Ён наладзіў сувязь з сербскім урачом Бортнікам, які мог рухацца без канвою. Праз яго атрымліваў медыкаменты і прадукты, якія размяркоўваў сярод хворых. Акрамя таго, ён аказваў суайчыннікам значную маральную падтрымку. Былы вязень Хамельбурга Рыгор Сыркоў прыгадваў сваю першую сустрэчу з доктарам: «У рэвір мяне ўцягнулі, сам я рухацца не мог. Я быў падобны на шкілет. Важыў усяго 40 кілаграмаў. Хворыя займаліся хто чым: хто моўчкі сядзеў з заплюшчанымі вачыма, хто рамантаваў вопратку. Да нас зайшоў урач у поўнай савецкай ваеннай форме. Мяне здзівіла, што яго гімнасцёрка падпяразана шырокім афіцэрскім рэменем з начышчанай латуннай пяціканцовай зорачкай. У пятліцах – капітанскія «шпалы». Гэта быў Дзмітрый Іванавіч Казлоўскі». Адзін выгляд савецкага афіцэра ў чыстай, акуратнай форме даваў людзям надзею на лепшае, пераконваў, што нават у такіх цяжкіх умовах можна заставацца чалавекам. Ахова не раз адбірала ў капітана спражку з зоркай, але праз некалькі дзён палонныя выраблялі новую і прыносілі яе ўрачу.

Нягледзячы на актыўную работу гестапаўскай агентуры, у Хамельбургу ўзнікла падпольная афіцэрская арганізацыя, да якой далучыўся і «казак» (такую мянушку далі Казлоўскаму з-за густых вусоў). У пачатку 1943 года арганізацыя была раскрыта, многія яе ўдзельнікі загінулі. Але дзякуючы строгай канспірацыі значную іх частку не кранулі. А праз некалькі месяцаў паўстала новая патрыятычная група – Камітэт ваеннапалонных (КВП). Дз. Казлоўскі ўвайшоў у яго склад, як і Аляксей Бязверхі, Рыгор Сыркоў, Канстанцін Воўк, Сцяпан Серада. Непасрэдна ў рэвіры працавалі фельчары Іван Бондараў і Кацярына Пуцанкова. Рэвір стаў адным з важнейшых цэнтраў падполля. Немцы заходзілі сюды рэдка, баяліся падхапіць хваробу. Тут падпольшчыкаў хавалі, лячылі, а потым накіроўвалі ў патрэбныя рабочыя каманды для дыверсій. Палонныя псавалі станкі і заводскае абсталяванне, выпускалі бракаваную прадукцыю. Дарэчы, выкарыстанне палонных афіцэраў на прымусовых работах супярэчыла міжнародным нормам. У бальнічных бараках захоўвалі лістоўкі, у складанні якіх «казак» браў актыўны ўдзел. Інфармацыяй аб становішчы на франтах дзяліліся сербы, якія мелі радыёпрыёмнік. У 1943 годзе сябры КВП распрацавалі план узброенага паўстання. Загадам па падполлю Казлоўскага прызначылі начальнікам медыцынскай службы, ён пачаў падбіраць кадры на выпадак выступлення.

Яшчэ адным важным кірункам была работа па зрыву вярбоўкі ва ўласаўскую

2017©nasledie-sluck.by

армію. Сярод афіцэраў Хамельбурга гітлераўцы падбіралі кадры для так званых «добраахвотных усходніх фарміраванняў», «Рускай вызваленчай арміі» і іншых. Менавіта сюды даставілі ваеннага інжынера генерал-лейтэнанта Дз. Карбышава, якога немцы спадзяваліся ператварыць у саюзніка. Казлоўскі неаднаразова сустракаўся з Карбышавым, які далучыўся да КВП, гутарыў з ім. Як потым прыгадваў, паводзіны генерала, яго патрыятызм, адмова супрацоўнічаць з ворагам аказалі моцны ўплыў на палонных. У аўтабіяграфіі Дзмітрый Іванавіч пісаў: «Я паставіў сваёй мэтай тлумачыць палонным, што радзіма ёсць радзіма, яна адна, а мы – яе воіны, згодна прысязе павінны быць ёй вернымі ў любых умовах. Вядома, лекцый чытаць не даводзілася. Аднак размова вялася ў кожным выпадку, калі тое дазваляў настрой палоннага. Гутарылі тонка, асцярожна, інакш лёгка маглі трапіць на шыбеніцу, пад кулю або ў паласаты халат канцлагера на доўгую пакутніцкую смерць. Дзе б я ні быў, я стараўся падтрымліваць у людзях дух патрыятызму». Змест некаторых гутарак Казлоўскага стаў вядомы лагернаму начальству. Не маючы непасрэдных доказаў яго ўдзелу ў падполлі, немцы абмежаваліся пераводам доктара ў працоўны лагер Амберг.

Тут былі горназдабываючая шахта і завод па выплаўцы чыгуну. Самыя цяжкія работы ў шахце выконвалі палонныя. Доктар «казак» і тут застаўся верным сабе. Будучы ўрачом, у чые абавязкі ўваходзіў медагляд рабочых, ён пачаў вучыць іх сімуляваць хваробу і такім чынам на доўгі тэрмін вызваляў ад працы. Як сам піша: «У такі спосаб я адрываў ад немцаў працоўны час, а гэта было хоць нейкай, хоць маленькай дапамогай нашай Радзіме». Такіх выпадкаў было шмат. Некаторыя сцвярджаюць, што «дзякуючы» Казлоўскаму немцы страцілі звыш тысячы працоўных чалавека-дзён. Не спыняў ён і антыўласаўскай агітацыі. Усё гэта не засталося без увагі.

Неўзабаве доктару паведамілі, што немцы збіраюцца выслаць яго ў канцлагер, і ў таго з'явілася думка аб уцёках. Ранейшыя спробы палонных збегчы з лагера не прыносілі поспеху. Ды і куды было ўцякаць, знаходзячыся ў «сэрцы» Германіі? Тут не даводзілася разлічваць на спагаду і падтрымку мясцовых людзей. Але на календары ўжо была вясна 1945 года. З захаду чулася артылерыйская канада, пачасціліся налёты амерыканскай авіяцыі. Немцы спешна капалі акопы вакол лагера, але іх дзеянні здаваліся нейкімі нервовымі і няўпэўненымі. Па ўсім было відаць, што чакаць прыходу саюзнікаў засталося нядоўга. Скарыстаўшы момант, Казлоўскі з групай сяброў уцёк падчас чарговага авіяналёту. За імі выслалі пагоню, якая вярнулася ні з чым. Неўзабаве Амберг занялі амерыканцы. У горадзе арганізавалі зборны пункт для савецкіх ваеннапалонных і ўсходніх работнікаў. Праз нейкі час Дзмітрыя Іванавіча перадалі прадстаўнікам савецкага камандавання.

Пакуль ішла спецправерка, Дз. Казлоўскі служыў у Ленінградскай ваеннай акрузе. Праверка не выявіла ніякага кампрамату, і былога вязня нават прадставілі да ўзнагароджання медалём «За перамогу над Германіяй». У лістападзе яго звольнілі з арміі і, разам з тым, пазбавілі афіцэрскага звання. Чалавек, які нават у палоне насіў капітанскія знакі адрознення, пайшоў з войска радавым. Толькі праз пяць гадоў яму прысвоілі званне

2017©nasledie-sluck.by

старшага лейтэнанта медслужбы, а ў 1961 годзе – капітана, цяпер ужо запасу. Дзмітрый Іванавіч прыехаў у Слуцк і ўладкаваўся на даваеннае месца працы – у хірургічны кабінет паліклінікі, а праз год пераехаў у Клецк. Тут і правёў усё астатняе жыццё. Быў дэрматавенералагам, галоўным урачом санітарнай станцыі, інфекцыяністам, санітарным урачом. Працягваў працаваць нават пасля выхаду на пенсію. Усяго ён прысвяціў медыцыне звыш сарака гадоў свайго жыцця.

А. Блінец. Слуцкі край. 2011. 6 мая.

«…Проявил мужество и смелость»

Просматривая как-то архивные материалы о деятельности спецгруппы НКГБ БССР «Южные», действовавшей в районе Слуцка с октября 1943 года вплоть до соединения с частями Красной Армии летом сорок четвертого, я был немало удивлен, встретив в числе членов группы профессиональных разведчиков и подрывников сугубо мирного человека, доцента-философа, преподавателя и ученого. Хотя те, кто знал Петра Федоровича Протасеню, скажут, конечно, что удивляться тут нечему – не мог такой человек, как он, не быть на переднем крае борьбы с фашистами.

Выходец из крестьянской семьи, рано потерявший отца, он с детства познал цену труду. Способный и напористый, Петр с успехом окончил Белорусский государственный университет и аспирантуру и в двадцать два года защитил кандидатскую диссертацию. В предвоенные годы преподавал в вузах Минска, вел научную работу. Но начавшаяся война, что кованым сапогом прошлась по судьбам миллионов людей, растоптав и уничтожив то, что было дорого и свято, опалила своим дыханием и жизнь Петра Федоровича.

В те далекие июньские дни сорок первого, отходя с семьей по Могилевскому шоссе, он неожиданно оказался в тылу врага – танки гитлеровцев рвались на восток, оставляя далеко позади охваченные страхом колонны беженцев. Возвращаться в занятый фашистами Минск коммунист и нештатный инструктор Минского горкома партии Протасеня не мог. Его там слишком хорошо знали. А потому всей семьей, с детьми на руках пришлось пробираться в родную деревню, рассчитывая на помощь матери и сестры. Судьба не баловала их, как и тысячи других белорусских семей, однако примерно на второй месяц войны они достигли деревни Басловцы Слуцкого района, где и поселились у родственников. Суровую зиму сорок первого пережили впроголодь. Конечно же, Протасеня мог затаиться и переждать военные годы, как, кстати, поступили многие, посвятив себя заботам о семье и хлебе насущном. Но оставаться в такое время в стороне, наблюдая за страданиями своего народа, Петр Федорович не мог и не хотел – не позволяли совесть и боль за родную землю.

П.Ф. Протасеня

2017©nasledie-sluck.by

И он начал действовать. На собственный страх и риск, не имея каких-либо установок на случай нахождения в тылу противника, ни связи с партизанами, создал свою первую подпольную группу. Возможно, их успехи покажутся кому-то скромными, но это было только начало. Договорившись с бывшим завучем Слуцкого техникума Павлом Дубовиком и сыном судьи Коржевича, Протасеня сумел организовать подачу оккупационным властям ложной информации при проведении переписи людей и имущества в окрестных селах. Из списков, где по договоренности со старостами, а где под угрозой, исключались активисты и по возможности трудоспособная молодежь – на случай репрессий или вывоза в Германию, а вместо них включались умершие. По инициативе Петра Протасени группа осуществила выведение из строя всего конского поголовья в округе накануне мобилизации лошадей немцами, выпускала листовки с призывами к населению саботировать акции оккупационных властей.

Но вскоре над группой стали сгущаться тучи. Опасаясь ареста и репрессий по отношению к родственникам, Дубовик и Коржевич уходят в партизаны, а Протасеня перебирается в местечко Уречье, где по заданию партизан устраивается приемщиком картофеля на ЦТО и вновь создает подпольную группу.

Неровные строки написанных карандашом отчетов о работе подпольщиков, сохранившиеся в архивах, доносят до нас лишь сухие цифры. Они не отражают опасности, которой подвергались члены группы, пользовавшиеся своим положением в учреждениях так называемой гражданской администрации для ведения разведки и вредительства.

Тем не менее группа Протасени нанесла немалый урон фашистам. Уничтожались или приводились в негодность сотни тонн продуктов, предназначенных для отправки в немецкую армию. Немалую помощь оказывали подпольщики крестьянам, выписав на сотни тонн ложных квитанций о якобы сданных продуктах. После установления постоянной и надежной связи было организовано снабжение продуктами со складов ЦТО партизанской бригады Т.Г. Гуляева (101-я бригада им. Александра Невского).

Несмотря на постоянную опасность разоблачения, группа продолжала действовать, оказывая активную помощь партизанским соединениям. Так, в 64-ю партизанскую бригаду им. В.П.Чкалова подпольщики переправили добытый ими ящик пулеметных стволов, револьверные патроны, печатную машинку и агитационный материал. Работая связными у партизан, Петр Федорович и его товарищи Н. Гурский и И. Пятницкий снабжали их необходимой разведывательной информацией. Однако с каждым днем положение группы становилось все более шатким. Оккупанты обнаружили недогрузку вагонов, что, наряду со слухами о том, что де «на Уречьском ЦТО – хозяйничают бандиты из леса», появившиеся из-за плохой конспирации в партизанской и крестьянской среде, усилило подозрения. В конце июля 1943 года на Уречье были произведены массовые аресты. В лапы фашистов попали Пятницкий и семья Гурского. Пытаясь спасти семью, Гурский сдался немецким властям, но фашисты лишь посмеялись над его порывом. Арестованными оказались также супруга Протасени и двое его сыновей – четырех и восьми лет. На следующий день все они были расстреляны...

Лишь по счастливой случайности Петр Федорович избежал тогда ареста –

2017@nasledie-sluck.by

он не был дома. Хотя о каком счастье можно говорить, когда безжалостная судьба одним росчерком лишает человека самого дорогого? Что остается в его душе, кроме боли, опустошения и бесполезных уже терзаний? В три дня, прошедшие после трагедии, Протасеня поседел и постарел. А ведь примерно за полтора месяца до налета жандармов предпринималась попытка эвакуировать его семью за линию фронта, о чем свидетельствовал запрос секретаря ЦК КП(б)Б П.К. Пономаренко. Безразличие или простое нежелание заняться этим вопросом побудили Хилько – начальника особого отдела 64-й партизанской бригады им. В.П. Чкалова прекратить своим распоряжением подготовку к вывозу семьи Петра Федоровича, сославшись на отсутствие указаний, останется тайной. Лишь позднее в разговоре с самим Протасеней он, потупившись, признается:

– Да, был запрос Пономаренко, но мы не знали...

Оставаться на прежнем месте после провала группы и гибели семьи Протасеня не мог. С этого момента он вступает на путь вооруженной борьбы с врагом, а к полыхавшей в его душе ненависти к захватчикам прибавилась боль и жгучее желание покарать палачей, лишивших его самых дорогих людей, растоптавших его жизнь и любовь. После непродолжительного, в общем-то, пребывания начальником разведки отряда им. Лазо 64-й партизанской бригады Петр Федорович в октябре 1943 года был принят в состав спецгруппы НКГБ БССР «Южные» (руководитель Н.К. Левых), что действовала в Слуцком, Копыльском, Иресском и Стародорожском районах Минской области. С этого момента начался новый этап в его боевой биографии.

Спецгруппа «Южные» НКГБ БССР начала формироваться в Москве в октябре 1943 года и, в том же месяце, была заброшена в тыл гитлеровцев с заданием вести разведывательную и диверсионную работу. Связные группы внедрялись в немецкие гарнизоны и администрацию, действовали на транспорте и предприятиях. Через них выявлялись данные о дислокации воинских частей и полицейских гарнизонов, их передвижении, численности и оснащении. Добывались сведения о подготовке карательных акций, о пособниках СД и полиции. В этой непростой работе Петр Федорович оказывал большую помощь руководителю группы Н. Левых «капитану Корневу», как называли его тогда. Как вспоминали впоследствии участники группы, «всю разведывательную работу вели «Корнев» и Протасеня». Неудивительно, что, учитывая отличное знание местных условий и обширные личные связи, «Корнев»-Левых поручил ему руководить всей разведработой по Слуцку и Слуцкому району. И разведчик-самоучка Петр Протасеня успешно справился с этим заданием.

Не менее важным было и проведение диверсионных актов, хотя это не являлось основной задачей «Южных». Под руководством Петра Федоровича 10 января 1944 года после нескольких вредительских акций была выведена из строя Слуцкая электростанция – многие предприятия и почти все учреждения оккупантов остались без электроэнергии. Любопытен способ, которым, опять же под руководством Протасени, было подорвано два воинских эшелона врага и бронепоезд – взрывчатка была «упакована» в брикеты торфа, что шел на топливо для паровозов. Участвовал он и в проведении акта возмездия

2017©nasledie-sluck.by

над начальником Копыльской полиции Лобаном.

Не раз ему приходилось рисковать жизнью в стычках с фашистами и их приспешниками. Был случай, когда не отличавшегося хорошим зрением Протасеню от смерти спасло лишь обоняние, позволившее уловить едва различимый запах табака, исходивший от притаившихся в засаде карателей, как случилось 19 января 1944 года у деревни Закальное. Впрочем, не всегда везение шло рука об руку с разведчиками. В первых числах июля сорок четвертого, перед самым соединением группы с частями Красной армии, возвращаясь после выполнения очередного задания, Протасеня с напарником натолкнулись на группу власовцев, переодетых в советскую форму, и были арестованы якобы для выяснения личности. Лишь когда «советские» солдаты, заведя их в лес, подняли автоматы, стало ясно, с кем разведчики столкнулись. Им удалось вырваться и убежать прямо из под огня, но три пули все же настигли Петра Федоровича. Тяжело раненный, он с трудом добрался до ближайшей деревни, а там был отправлен в Слуцк в госпиталь.

Находясь в составе спецгруппы «Южные», Петр Протасеня действовал смело и находчиво, о чем красноречиво говорит его характеристика, написанная в августе сорок четвертого руководителем группы, а также боевые награды. За свои ратные заслуги он был представлен к награждению орденом Красной Звезды, хотя по неизвестным сейчас причинам вместо этого был награжден медалями «За отвагу» и «Партизану Отечественной войны» I степени. Возможно, кому-то все это покажется более чем скромным. Но, не умаляя подвигов тех, кто сражался на фронте, скажу – легче идти в атаку, зная, что впереди враг, чем сражаться с ним в его тылу, не рассчитывая на поддержку танков и артиллерии.

Так закончилась боевая служба Петра Федоровича Протасени. Вернувшись в 1944 году в Минск, он активно включился в восстановление того, что было разрушено войной. В течение ряда лет Петр Федорович работал заместителем директора по учебной и научной работе Минского педагогического института, заведующим кафедрой философии Республиканской партийной школы и Белорусского политехнического института. В 1970–71 годах читал курс лекций для научных работников вузов Словакии, за что был награжден золотой медалью Кошицкого университета. С 1975 года он – профессор кафедры философии АН БССР. И даже после ухода на пенсию в 1986 году он не оставлял научной и преподавательской работы. Всего же им опубликовано свыше шести десятков научных работ, подготовлено более двадцати кандидатов и девять докторов наук. Его ратный и мирный труд отмечены орденом Отечественной войны I степени, одиннадцатью медалями и многочисленными грамотами.

Но время неумолимо. 5 июня 1987 года Петра Федоровича не стало.

Он похоронен в скромной могиле на Северном кладбище Минска. Профессор и рядовой боец, ученый и подпольщик-разведчик. Как человек, действительно знавший цену жизни и смерти, он до конца своих дней не любил бравады и помпезных маршей, как не афишировал и своего военного прошлого. Так пусть же эти строки станут данью нашей памяти ему и всем тем, кто, не щадя своей жизни, отстоял в битве с фашизмом жизнь и счастье будущих поколений.

И.С. Ивановский.

2017©nasledie-sluck.by

Кроўю свайго сэрца

З успамінаў М.А. Нікольскага, былога партызана атрада імя М.М. Громава партызанскай брыгады № 64 імя В.П. Чкалава

...В партизанском отряде мне довелось быть рядовым. Потом, после окончания кратковременных курсов, подрывником-разведчиком. Пригодился опыт фронтовых будней, когда воевал в саперном батальоне в первые месяцы войны. Помню, как в деревне Живунь (там тогда стоял наш отряд) создавались добровольные комсомольско-молодежные диверсионные группы. Преподавал подрывное дело специалист из Минского штаба партизанского движения по фамилии Шимченок. Он учил нас ставить заряды тола с капсюлями-взрывателями, пользоваться предохранителями при постановке мин под железнодорожными шпалами и рельсами, на шоссейных дорогах для подрыва автомашин. На огороде одного из сельчан был установлен трехметровый участок железнодорожного полотна в натуральную величину. Шимченок учил нас ставить нажимные, натяжные (которые взрываются при контакте со шнуром) и особенно опасные мины, капсюли которых взрывались от контакта с батарейкой карманного фонаря. Такие мины очень трудно разминировать.

М.А. Нікольскі

После учебы в разное время с группами партизан мне трижды приходилось устанавливать мины по железной дороге Слуцк – Осиповичи на участках

Палітінфармацыя ў 64-й партызанскай брыгадзе імя Чкалава. 1943 г.

2017©nasledie-sluck.by

К.С. Фурсаў

между Повстынью и Уречьем, между Уречьем и Аточкой, между Верхутином и разъездом Пасека. Эшелоны с военной техникой и живой силой противника были пущены под откос. В этих операциях принимали участие мои друзья Костя Фурсов, Степан Вдовин, Хусаин Вахитов и другие.

Однажды летом сорок третьего года я поставил мину на дороге между Уречьем и деревней Рабак, километра за два от нее. Потому что если мина взрывалась близко от деревни, то фашисты расстреливали местных жителей и сжигали их дома. Мину мы ставили ночью. По дороге, где оставались следы от протектора колес машины, я разостлал плащ-палатку, на нее выгребалась земля из ямки под ящик с толом-миной. Ящик опустили в ямку, установили капсюль с предохранителем. Ящик сверху накрывался крышкой с таким расчетом, чтобы с дороги не был заметен боек-взрыватель капсюля мины. Закрытый ящик мы аккуратно засыпали песком с плащ-палатки. Чтобы это место не так бросалось в глаза, песок брызгали водой и куском покрышки с протектором делали отпечаток, как будто недавно прошла машина. Остальной песок с палатки уносили в сторону, чтобы не осталось никаких следов.

Мы остались в засаде напротив поставленной мины. Примерно в 10 часов утра со стороны Уречья послышался шум мотора. Через несколько минут показалась огромная крытая машина. Как только левое переднее колесо наехало на мину, раздался взрыв. Мотор отбросило метров на пять вперед по дороге. Колесо отлетело в сторону засады метров на 10, кузов опрокинулся в кювет, но машина не загорелась. Из нее начали выскакивать немцы. Завязалась перестрелка. Из разбитого кузова выбрались арестованные фашистами советские военнопленные и убегали в лес. Несколько человек из них позже встретились с партизанами из нашей группы и присоединились к отряду. Они рассказали, что гестаповцы арестовали их всех в Любанском районе, держали в тюрьме, пока шли допросы, а потом в той самой машине, что мы взорвали, отправили в Старые Дороги для погрузки в вагоны и отправки на каторжные работы в Германию.

…Однажды Хусаин Вахитов взял в разведку меня и Костю Фурсова. Предстояло узнать об изменениях во вражеском гарнизоне Слуцка, передать подпольщикам и связным из города очередные задания командования и доставленные самолетом с Большой Земли свежие номера «Правды», «Комсомольской правды», листовки и бригадную газету «Народный мститель», орган Слуцкого подпольного райкома партии.

В деревнях вокруг Слуцка было немало связных и подпольщиков, у которых можно было передневать, не показываясь на улицу, встретиться со связным из Слуцка. Некоторые из них рвались в партизаны, но им говорили: «Пока вы здесь нужнее, в отряд не опоздаете».

В деревне Большая Слива нашим связным был Василий Голец, ему по-

2017©nasledie-sluck.by

могали молодая жена Татьяна и родная сестра Анастасия, а также соседка по дому, жена советского офицера-чекиста, «тетя Дуся», которая вынуждена была устроиться здесь, эвакуировавшись из Баранович с двумя дочками. С их помощью мы получали сведения о вражеском гарнизоне, которые помогали нам при проведении операций.

…Сціснуўшы моцна зубы ад болю і крыўды, ляжалі ў кузаве «газіка» раненыя. Тут была і ваенфельчар Ірына Гардзееўна Каліноўская. Фашысты загадалі рухацца ў напрамку Слуцка. Везлі ўсіх у лагер для ваеннапалонных. Ля Шышчыц грузавік затармазіў.

– Рухавік загрукаў. Адрамантую і дагонім, – растлумачыў шафёр.

Як толькі аўтамашыны схаваліся за ўзгоркам, «няспраўная» палутарка крутнула ў вёску. Вечарэла. У канцы вуліцы машына спынілася. Яе акружылі мясцовыя жыхары, адразу здагадаліся аб усім. Хто нёс бохан хлеба, кавалак сала, збанок малака, корч цыбулі.

І.Г. Каліноўская

За ноч усіх пераапранулі ў цывільнае адзенне і на падводах адправілі ў Грэскую бальніцу. З вялікай цяжкасцю ўтаварыла І.Г. Каліноўская галоўнага ўрача ўзяць на лячэнне хворых. Сама згадзілася бясплатна даглядаць іх. Было гэта ў пачатку ліпеня 1941 года.

Ірына Гардзееўна адчула, што ў Грэскай бальніцы працуюць свае, савецкія людзі. Бачыла яна, з якой увагай адносяцца да пераапранутых параненых байцоў медсёстры Феня Тарасевіч, Ліда Кавалёва, Ганна Сабалеўская, Марыя Пяткевіч. Сярод падпольшчыкаў была і З.І. Маскалевіч. Яны аддавалі ім свой апошні кавалак хлеба…

Ю.Г. Войчык быў арганізатарам падпольшчыкаў бальніцы. Ён адразу зразумеў, з якой мэтай прыехала І.Г. Каліноўская. Аднойчы запрасіў яе на кватэру, папярэдзіў, каб прыйшла незаўважанай. Там ужо сабраліся падпольшчыкі. Юрый Георгіевіч звярнуўся да І.Г. Каліноўскай:

– Будзем змагацца разам з праклятым ворагам. У нас надзейныя людзі. Толькі патрэбна асцярожнасць.

– Усё зразумела, – ціха сказала Ірына Гардзееўна.

Тут жа дамовіліся, што, перш за ўсё, патрэбна трывала паставіць на ногі раненых чырвонаармейцаў, здабыць зброю і адправіць іх у партызаны. Юрый Георгіевіч пазнаёміў І.Г. Каліноўскую з Іванам Клебановічам. Калі даведалася, што ён працуе ў фашысцкай управе, крыху збянтэжылася.

– Нічога, там таксама ёсць нашы, – заўважыў Ю.Г. Войчык…

2017©nasledie-sluck.by

…А праз тры дні ў дамоўленым месцы Ірына Гардзееўна атрымала ад Івана Клебановіча невялікі скрутак папер. Там былі незапоўненыя бланкі, дакументы, звесткі пра планы акупантаў. Ва ўправе працаваў і брат Івана Клебановіча – Аляксей. Ён таксама даваў многа каштоўных звестак. Усё гэта І.Г. Каліноўская перапраўляла партызанам. Яна ў вольны ад работы час больш ціхімі дарогамі спяшала ў лясную зону, дзе ўжо дзейнічалі партызаны. Там сустракалася з людзьмі, якія ведалі дарогу да народных мсціўцаў. Ірына Гардзееўна перадавала ім дакументы, лякарствы. Назад на дне кошыка, напоўненага грыбамі ці ягадамі, несла разабраную зброю…

Ноччу на кватэру І.Г. Каліноўскай прыходзілі з бальніцы раненыя. Яны з разабраных частак складвалі зброю. Да світання былі гатовы вінтоўкі, аўтаматы.

– У мяне на кватэры была цэлая майстэрня для зброі, – успамінае Ірына Гардзееўна. – Рыхтавалі людзей у партызаны. Не адправіш жа іх у лес з пустымі рукамі…

…І вось лістападаўскай ноччу 1941 года Ю.Г. Войчык моцна паціснуў на развітанне руку першым байцам, якія залячылі раны. Група з 10 чалавек адправілася ў партызаны. Іх праводзіла І.Г. Каліноўская. Групу ўзначаліў В.С. Курганаў. Потым з Грэска яшчэ пераправілі 6 чалавек. Арганізаваўся невялікі бальнічны атрад. Так яго спачатку называлі. У адным з баёў загінуў В.С. Курганаў. Астатнія байцы далучыліся да партызанскага атрада генерала М.П. Канстанцінава.

У пачатку кастрычніка 1941 года акупанты прывезлі ў Грэскую бальніцу цяжка параненага партызана М.М. Лебянкова. Ён вадзіў узвод партызан на заданне. Каля вёскі Канюхі трапілі на засаду. Вялі жорсткі бой. Калі патроны былі на зыходзе, М.М. Лебянкоў даў заданне партызанам адступаць, сам прыкрываў іх. Куля трапіла яму ў руку, прабіла грудзі. Страціў прытомнасць. Фашысты акрываўленага партызана ўзялі у палон. Хацелі ў Грэску расстраляць. Ю.І. Войчык кінуўся да каменданта, папрасіў пакінуць «бандыта» для эксперыменту выпрабавання на ім лякарства. Той доўга маўчаў, а потым махнуў рукой.

Калі Лебянкоў паправіўся, яго пераправілі ў атрад генерала М.П. Канстанцінава…

Аднойчы, калі І.Г. Каліноўская вярталася з задання ў Грэск, Ліда Кавалёва папярэдзіла:

– Табе, Ірына, нельга ісці на кватэру. Там учора былі гестапаўцы…

І.Г. Каліноўская зайшла да знаёмых, а калі сцямнела, накіравалася ў партызанскую зону… Разам з лясны мі салдатамі працягвала барацьбу з ворагам…

Фашысты напалі на след грэскіх падпольшчыкаў. У чэрвені 1942 года яны арыштавалі Юрыя Георгіевіча Войчыка. Катавалі, дапытвалі пра ўдзельнікаў падполля. Нікога не выдаў адважны патрыёт. Сонечны летні ранак быў апошнім для Юрыя Георгіевіча. Яго расстралялі.

Фашысцкія кулі прабілі маладыя сэрцы Ліды Кавалёвай, Івана Клебановіча. Цудам выратаваўся Аляксей Клебановіч. Ён загінуў у баях з ворагам у 1944.

Многія не дажылі да свята Перамогі. Але памяць аб іх будзе жыць, перадавацца з пакалення ў пакаленне…

М. Крываль.
У. Цішкевіч.
Шлях Ільіча. 1976. 3, 10 ліпеня.

2017@nasledie-sluck.by

Связная Ёлка, Вам задание

Война для 17-летней комсомолки Вали Янович из слуцкой деревни Волошево началась в то памятное утро 22 июня 1941 года, когда упали первые немецкие бомбы на военный аэродром, который находился недалеко от деревни. «По шоссе днем и ночью двигалась военная техника, шли солдаты с винтовками. Колонны бомбили и обстреливали немецкие самолеты. Мы, прячась за придорожные деревья, все это видели», – вспоминает Валентина Ивановна.

Оккупанты появились в деревне на седьмой день войны – после жестокого боя у д. Кучино.

Зимой 1941 года немцы объявили об отправке молодежи в Германию. В Волошево из разных деревень согнали ребят и девчат. «Женщин с детьми в Германию не отправляли, поэтому молодая женщина, Анастасия Войцехович, которая пришла в деревню пешком из Брестской крепости, дала мне на руки своего годовалого сына, а сама осталась со старшими детьми, – рассказывает Валентина Патоцкая. – Но я не стала рисковать жизнью этой женщины и вернула ребенка.

Потом нас погрузили в грузовой автомобиль и повезли в сторону Слуцка. Проехав пару километров, я пробралась ближе к заднему борту и приоткрыла брезент. На меня зашипели: «Не вылезай – убьют!». Я не послушалась и выпрыгнула. Кубарем скатилась в кювет. Придя в себя, выбралась на дорогу и увидела, что немцы из Старого Гуткова гонят скот. Решила идти на Калиту, а там и до Подлошицы рукой подать. В той деревне жили мои родственники – Луцевичи. Как я позже узнала, они с первых дней стали поддерживать связь с партизанами».

Как-то ночью к Луцевичам в окно постучали. Это были партизаны. Они принесли листовки и свежие сводки Совинформбюро. «Я переписывала их до самого утра, – рассказывает Валентина Ивановна. – Один из партизан подарил мне сборник стихов, написанный от руки. Одно стихотворение я запомнила на всю жизнь:

Разявіў Гітлер пасць шырока:
Ён хоча ўвесь свет праглынуць.
Хоць бачыць бандыцкае вока,
Ды воўчыя зубы неймуць...».

С той самой ночи и стала Валентина Патоцкая партизанской связной. Для конспирации ей даже подпольную кличку придумали – Ёлка. Много различных заданий партизан выполнила связная Ёлка, а за одно из них ее даже наградили. «В 1943 году командир спецотряда партизанской бригады Локонцева Николай Куприянов вручил мне значок парашютиста-десантника и сказал: «Это, Валя, награда за хорошо выполненное задание!». Я хранила этот значок вместе с комсомольским билетом, который в 1940-м выдал мне Слуцкий райком комсомола. Его номер 12253717». Валентина Ивановна без запинки, по памяти, назвала номер билета. Удивительная память!

«Тогда, в 1943 году, – продолжает Валентина Ивановна, – партизанскую зону, располагавшуюся в районе деревень Хорошево, Гутница, Лазарев Бор, Ямное, окружили немцы. Группа партизан, в основном женщины, в тот момент по воле злого рока оказалась в д. Ямное. С ними была и я. Чтобы избежать перестрелки в деревне, мы двинулись в сторону Гутницы. Уже за околицей оккупанты стали настигать нашу группу. Пуля, про-

2017©nasledie-sluck.by

свистев рядом с моей головой, ударила в дерево. И тут я споткнулась и упала».

Лежа на земле, связная Ёлка видела убегающих партизан. Вот пробежал кто-то с винтовкой, следом за ним, перетянутая портупеей, с наганом в руке – жена комбрига Арестовича, красавица Жанна. Рядом с ней – жена командира отряда им. Кирова Макаревича. Валентина достала из кармана комсомольский билет и вместе со значком, подаренным дядей Колей, завернула в платок и сунула в расщелину под ель.

«Спрятав самое дорогое, что у меня было, я поднялась и побежала за партизанами, ведь я давала клятву – и комсомольскую, и партизанскую. Я должна быть вместе с ними.

В том бою погибло много партизан. Погиб дядя Коля Куприянов, жены командиров Крутликова и Макаревича, жена комиссара и другие».

...Долго искала связная Ёлка свой комсомольский билет. И нашла. И сохранила. «Поеду в Слуцк, снимусь с учета, – смеется Валентина Ивановна. – Я честно все эти годы исполняла комсомольскую клятву. Вырастила четырех детей, всем им дала путевку в жизнь. Один из сыновей сейчас в Москве, служит в космических войсках. Полковник. Остальные тоже при деле. Образованные».

Вот такая она – бывшая связная партизанского отряда Ёлка, Валентина Ивановна Янович (Патоцкая). Для нее долг и клятва были не пустым звуком, а комсомольский билет не просто книжицей, в которую вклеивали членские взносы.

М.М. Тарасевич.

Феерверк у Грэску

Летам 1943 года партызаны брыгады № 27 імя Чапаева расшыралі зону сваёй барацьбы з акупантамі, падыходзілі да суседніх раённых апорных цэнтраў – да Грэска, Нясвіжа, Стоўбцаў, Дзяржынска.

У роце Георгія Колакалава атрада імя Чапаева было шмат хлопцаў з вёсак, якія суседнічалі з Грэскам, бывалі там раней, многія ведалі размяшчэнне пастоў, падыходы да котлішча. Камандзір роты рашыў зрабіць вылазку да асінага гнязда, але партызан заўважылі гітлераўцы. Увесь гарнізон падняўся на ногі, засеў у дзотах і акопах і прастрэльваў падыходы. Прыйшлося адступіць без страт.

– Разграміць грэскі гарнізон ротай мы не зможам, сіл у немцаў шмат. А з малой групай я змагу пранікнуць туды і зрабіць дыверсію, падсмажыць іх, – сказаў Грыша Забелін.

– Правільна. Можна спаліць пякарню. Хай абгарэлыя скарынкі грызуць. Да яе дарогу добра ведаю, правяду, – азваўся Мікалай Ліннік. Яго падтрымалі вяскоўцы Антон Дарашэвіч і Мікалай Дарашэвіч.

– Думка добрая, – згадзіўся Колакалаў.

– Нам толькі газы дастаць трэба, – сказаў Забелін.

– І бязгучка не памяшае, – дабавіў Ліннік. – Я трапна страляю. Паставы стаіць на мосціку недалёка ад пякарні.

Камандзір адобрыў план дыверсіі. Знайшлі ў вёсках і газы. Хоць па шклянцы прасілі ў сялян, але назбіралі каля чатырох літраў.

– Хопіць для феерверка, – усміхнуўся камандзір. – Мы будзем чакаць вас у заставе каля Грозава. Калі пагоняцца за вамі – сустрэнем, прыкрыем. У добры шлях, хлопцы!

Чатыры смельчакі рушылі ў варожы гарнізон. Над імі сюд-туд віселі асвят-

2017©nasledie-sluck.by

ляльныя ракеты, паказвалі шлях, каб не збіцца, бо хлопцы ішлі не дарогай, а нацянькі полем, кустамі.

Падкрадваліся ўжо да першых будынкаў, як з аднаго двара да іх кінуўся сабака з раз'юшаным брэхам. Ускінуў Ліннік бязгучку і выстраліў.

Брэх абарваўся, зноў наступіла цішыня.

– Прабач, сабачка, што на табе прыйшлося правяраць бязгучку, яна дапаможа нам справіцца з паставым. Нам цішыня патрэбна, – сказаў Мікалай.

Хлопцы зноў асцярожна рушылі ўперад. Вось і невялікі раўчук у нізіне, з мосцікам і паставым.

– Чакайце, – шапнуў Ліннік сябрам. Сам папоўз абочынай насыпу, пільна пазіраючы перад сабой. Убачыў поручні мосціка, цёмную фігуру паставога. Прыцэліўся Мікалай. Выстрал. І паставы падае, стук яго вінтоўкі парушае начную цішыню. Ліннік махае рукой сябрам, яны тут жа падбягаюць да яго, ля паставога падымаюць вінтоўку і спяшаюцца да пякарні. На яе двары тупае вартаўнік. Ён пачуў крокі і крыкнуў:

– Стой! Хто ідзе?

– Праверка. Не заснуў часам? – адзываецца Антон Дарашэвіч.

– Голас твой незнаёмы, – насцярожваецца вартаўнік.

– З паліцыі я. Новенькі. На пасты не ставяць, а пасылаюць правяраць цывільных вартаўнікоў. Каб не спалі! – гаворыць Антон і падыходзіць да мужчыны, заціскае яму рот далонню і папярэджвае:

– Не крычы, калі жыць хочаш. Марш у будку! – і вядзе туды вартаўніка, замыкае будку. – Сядзі ціха!

Партызаны ўскочылі ў пякарню. Запахла свежым хлебам, ажно слінкі пацяклі. Але трэба спяшацца. З пляшак па памяшканнях выліваюць газу, падпальваюць шматок пакулля, змочанага бензінам, і кідаюць на падлогу. Агонь тут жа бяжыць з пакоя ў пакой доўгай паласой, шугае ўвысь, ліжа сцены, вырываецца з будынка.

Хлопцы выскакваюць з пякарні і выбіраюцца з райцэнтра, бяруць кірунак на Слуцк, дзе, ведаюць ад папярэдняй разведкі, меншпастоў і аховы, асноўныя сілы ворага прыкрываюць падыходы да Грэска з захаду.

Убачылі пажар паставыя ў цэнтры. Тут жа заварушыўся ўвесь гарнізон. Некалькі салдат прыбеглі да пякарні, выпусцілі вартаўніка і запыталі, хто падпаліў.

– Узброеныя былі. Партызаны, вядома.

– Партызаны ў Грэску! – панеслася па вуліцах. Загаварылі кулямёты аховы, адна за адной узляталі ў неба ракеты. Крыкі каманд, стрэлы, трасіруючыя чэргі над умацаваннямі, мітусня. Да самай раніцы над гарнізонам бушаваў вогненны феерверк. А партызаны зрабілі добры крук і накіраваліся на месца сустрэчы з ротай. Там рашылі адпачыць.

Світала. Спыніліся на ўзлеску. Адтуль праглядалася дарога з Грозава ў Грэск.

– Падвода едзе. На возе – жанчына, – убачыў Мікалай Дарашэвіч.

– Трэба запытаць, ці не бачыла дзе паліцаяў, – сказаў Ліннік.

Спынілі падводу. Жанчына везла ў бітонах малако ў Грэск.

– Паварочвайце ў Старыцу! Партызаны дзякуй скажуць! – сказаў Забелін.

– Не затрымлівай мяне, Колечка, – прасілася знаёмая Лінніку жанчына. – Два паліцаі запрагаюць каня, у Грэск збіраюцца ехаць. Яны вам лепш спатрэбяцца, чым малако.

– Дзякую, цётачка Калядзіха, за патрэбную навіну. Пра нашу сустрэчу не

2017@nasledie-sluck.by

гаварыце нікому. Я вас не бачыў, а вы – мяне. З паліцаямі ў нас будзе іншая гаворка. Паганяйце каня!

Жанчына махнула пугай, конь пабег па дарозе. Хлопцы прытаіліся ў кустах, сталі чакаць. Неўзабаве паказалася павозка з паліцаямі. Не агледзеліся яны, як трапілі ў палон. І павозка палявымі дарогамі неўзабаве далучылася да роты.

– Што з паліцаямі рабіць будзем? – запытаў Забелін.

– У лагер павядзём. Хай асобы аддзел разбіраецца з імі, – сказаў Колакалаў.

Паліцэйскія прасіліся, што немцы сілай прымусілі ім служыць.

– Не скавычыце, здраднікі! Вашыя бобікавы справы ўзважаць на дакладных вагах. Што заслужылі, тое і атрымаеце, – гаварыў камандзір роты. – А вам, хлопцы, тройчы дзякуй: за начны феерверк над Грэскам, за двух палонных «языкоў», за тры трафейныя вінтоўкі. Дзякуй! Дзякуй! Дзякуй!

– Адну вінтоўку мне дайце, – папрасіў Ліннік.

– Навошта? У цябе ж ёсць, – здзівіўся Колакалаў.

– Брат Толя, малодшы за мяне на два гады, просіцца ў партызаны. Яму занясу, – сказаў Ліннік.

Па дарозе ў лагер ён забег дадому, а выйшаў з хаты з братам. Крыху пазней і брат Іван, шаснаццацігадовы падлетак, стаў чапаеўцам.

– Цэлае аддзяленне Ліннікаў можна арганізоўваць, – жартаўліва гаварыў камандзір атрада Іван Грыб. У атрадзе былі ўжо Мікалай, Анатолій, Іван, Павел, Аляксандр, другі Іван.

– Калі палічыць усіх маіх родзічаў, вяскоўцаў, сяброў – роту можна стварацъ, – адказаў Мікалай.

Праз 60 гадоў пасля Перамогі сустракаўся я з Мікалаем.

– З Ліннікаў я і брат Іван засталіся толькі, – сумна сказаў Мікалай.

– І чапаеўцаў лічаныя былыя партызаны жывуць, – дабавіў я. – А ты, дружа, трымайся! Яшчэ шмат старонак барацьбы з фашыстамі не апісаны намі для нашчадкаў.

В. Гурскі.
Слуцкі край. 2006. 4 красавіка.

І стаў партызанам кандуктар з Вены

Вёска ў той сонечны чэрвеньскі дзень 43-га года жыла ў клопатах па падрыхтоўцы сена, мужчыны амаль усе былі на сенажацях. Малодшыя хлапчукі гулялі на вуліцы ў клёна. Пад абед у вёску заехала павозка, на якой сядзеў знаёмы сяльчанам партызан Вахітаў з вінтоўкай. Побач – нямецкі салдат з завязанымі за спіной рукамі. Ездавым быў невядомы мужчына сярэдніх гадоў. Неўзабаве паблізу павозкі сталі збірацца дзеці, падышлі дзве жанчыны, дзядуля Якуб. Ён спытаў у партызана:

– Дзе гэта ўпаляваў немца?

– Ён аўстрыец, затрымалі яго ў вёсцы Малая Сліва, а двух другіх з бункера застрэлілі. Гэтага павязём у атрад.

Хлапчукі глядзелі на няголенага, пахмурнага тварам палоннага з не меншым здзіўленнем, чым папуасы Новай Гвінеі на падарожніка Міклуху-Маклая пасля яго высадкі на бераг. Два гады запар мы бачылі немцаў у вёсцы на матацыклах, аўтамашынах, нават на веласіпедах – сытых, з густымі чубамі пад пілоткамі, летам з закасанымі да локцяў рукавамі шэра-зялёных курток, самаўпэўненымі і бадзёрымі. Гэты

2017©nasledie-sluck.by

ж палонны быў увасабленнем адчаю і пакорлівасці, таму што не ведаў, што яго чакае далей. Партызан, які суправаджаў яго, папрасіў адну жанчыну прынесці чаго перакусіць. Тая вярнулася з хаты са збаном кіслага малака і дзвюма ладнымі лустамі хлеба, падала драўляныя лыжкі. Спярша паеў партызан, рэшту перадаў палоннаму.

А пад вечар у вёску зайшло чалавек пяць партызан, і яны з тым аўстрыйцам накіраваліся ў бок вёскі Паўстынь, каб прыцемкамі перайсці чыгунку і крочыць далей, на Любаншчыну.

Дзён праз колькі ў вёску завітаў усім даўно знаёмы партызан Міхаіл Нікольскі, на гэты раз у новенькай нямецкай форме, з нашыўкамі оберяфрэйтара і з выявай арла на правым баку салдацкай форменнай курткі. З трафейным карабінам на рамяні. Высокі ростам, стройны. Тварам, колерам валасоў – ну, выліты немец. Вяскоўцы пыталіся, ці не баіцца ён, што свае ж партызаны з іншага атрада могуць яго падстрэліць у гэтай форме. То ён пасмейваўся і адказваў, што не баіцца сваіх, а форма спатрэбіцца ў правядзенні рызыкоўных аперацый.

Надвячоркам Нікольскі паклікаў мяне і загадаў праводзіць да вёскі Паўстынь. Пакуль ішлі да Барэцкага лесу, Нікольскі, па маёй просьбе, паведаў, як ён з таварышамі па атраду, Вахітавым і Фурсавым, правялі аперацыю ў Малой Сліве. Ад мясцовага сувязнога яны ўжо ведалі, што з раніцы з размешчанага непадалёку ад чыгуначнага моста праз рэчку Слівянку бункера прыходзяць у вёску немцы купляць малако і яйкі. Разлічваліся з жанчынамі акупацыйнымі маркамі. Так яны зрабілі і ў той ціхі чэрвеньскі дзень. Не ведалі, што ў адным з гумнаў затаіліся трое партызан. Убачыўшы праз шчыліну ў сцяне, як адзін немец з трыма салдацкімі флягамі для малака і кошыкам з яйкамі крочыць паблізу, Вахітаў ціхенька адчыніў дзверы і выйшаў. Ударам прыклада па галаве і плячы Вахітаў аглушыў немца, выхапіў з ножнаў шырокі штык ад вінтоўкі, а з-за пояса – ручную гранату на драўлянай ручцы. «Вядзі яго ў гумно хутчэй», – падаў каманду Нікольскі, убачыўшы, што немец ачомаўся і можа ісці. Палоннаму звязалі вяроўчынай рукі за спіной і загадалі маўчаць. Той узмаліўся: «Іх аўстрыяк, кандуктар трамвая, Вена, нікс шыссен!». На пытанне, як клічуць яго, палонны адказаў – «Андрэас». Можа таму, што салдат быў немалады, гадоў за сорак, да ўсяго – аўстрыец, не немец, то Нікольскі рашыў даставіць яго ў атрад у ролі «языка».

Тым часам з вёскі данеслася некалькі вінтовачных стрэлаў, а неўзабаве ў гумно зайшлі з трафеямі – пісталетам, ручнымі гранатамі – Вахітаў з Фурсавым. Яны сказалі, што прыстрэлілі двух немцаў, з аднаго знялі салдацкую форму і боты. Разумеючы, што на бункеры хопяцца прапаўшых, партызаны з палонным хуценька шмыгнулі за вёску і па заросшаму густым хмызняком балоту накіраваліся ў вёску Казловічы, да якой было кіламетраў тры. Там спыніліся ў знаёмага сувязнога, пераначавалі, а раніцой гаспадару загадалі запрагаць каня. У павозку селі палонны, партызан Вахітаў за канваіра. І паехалі. Нікольскі з Фурсавым пайшлі на новае заданне.

…У атрадзе імя Громава брыгады імя Чкалава, куды прывялі палоннага, на яго спярша глядзелі з недаверам, але Нікольскі ўпрасіў камандаванне пакінуць Андрэя – так сталі клікаць яго па-руску – на базе, для работы на кухні. Андрэй калоў дровы, чысціў бульбу, коней, і яму ўсе давяралі. У час

2017©nasledie-sluck.by

адной з зімовых блакад, калі брыгада мусіла змяніць месца дыслакацыі, Андрэй адбіўся ад атрада, блукаў па лесе і нечакана сустрэўся з незнаёмымі яму партызанамі. Тыя, пачуўшы яго не рускую гамонку, палічылі за шпіёна і маглі прыстрэліць на месцы. Але і на гэты раз Андрэю павязло – з бярэзнічку ўзбоч дарогі выйшаў з двума партызанамі Міхаіл Нікольскі. Убачыўшы іх, Андрэй з радасным воклічам пайшоў насустрач. «Гэта наш партызан, не чапайце яго, ён нам патрэбен», – заявіў Нікольскі.

Аднак вясной 1944 года Андрэя разам са славакам Юрыем, які летам 43-га года добраахвотна перайшоў на бок партызан, немцы ўсё ж захапілі ў палон і адвезлі ў турму г. Старыя Дарогі. Адтуль іх у канцы чэрвеня вызвалілі воіны Чырвонай арміі. Па рэкамендацыі Нікольскага Андрэю выдалі даведку, што ён быў партызанам брыгады імя Чкалава. З ёю шчаслівы аўстрыец займеў давер у мясцовай улады і яго прызначылі нейкім начальнікам у лагеры для нямецкіх ваеннапалонных паблізк Бабруйска. Пасля перамогі Андрэй выехаў на радзіму ў Вену.

М. Тычына.

Хлеб партызанскі

Бохан жытняга хлеба на стале, накрыты белым ручніком, у нашай хаце быў нават у гады Вялікай Айчыннай вайны. Маці ніколі не хавала яго. Памятаю, што партызаны з вясны 1943 года часта наведваліся ноччу ў вёску і па аднаму заходзілі ў кожную хату, але хлеба ніхто з іх чамусьці не прасіў.

Тады мне, падлетку, і не наўме было, што ў месцах дыслакацыі партызанскіх брыгад хлеб выпякалі, бо луста жытніка ў запазусе ці рэчавым мяшэчку нярэдка была сутачнай пайкай чалавека. Пра партызанскіх хлебапёкаў мне стала вядома ад настаўніцы – пенсіянеркі Іны Антонаўны Міхнюк, жыхаркі Слуцка.

У 1943 годзе ў лясную вёску Шантароўшчына, вакол якой гуртавалася партызанская брыгада імя Суворава, Сафія Фёдараўна Куніэвіч, яе маці, з сяброўкай Фаінай Пятроўнай Басалыга (абедзве былі настаўніцамі) пад восень прыйшлі са Слуцка, бо мелі сувязь з партызанамі. Іне Антонаўне тады было сем гадоў, сыну Фаіны Пятроўны – тры гадкі.

Жанчынамі зацікавіўся асобы аддзел брыгады, бо пра іх сувязь з партызанамі ніхто з начальства не ведаў, на іх глядзелі падазрона, як на засланых шпіёнак. Усё магло скончыцца трагічна, калі б Сафія Фёдараўна не пераканала асабіста, каб ён накіраваў у партызанскі атрад Грэскай зоны пасыльнага, які б пачуў пацвярджэнне іх сувязі з тамтэйшым атрадам, што той і зрабіў, чым адвёў падазрэнне ад жанчын. Ім далі заданне – выпякаць хлеб у партызанскай пякарні, якая знаходзілася ў хаце мясцовай жыхаркі Вольгі Іванаўны Яновіч. Жыхары вёскі на той час амаль усе выбраліся ў лес, жылі ў зямлянках. Утраіх жанчыны сталі хлебапёкамі. Мукі хапала, а вось дражджэй не было. Уменне і вопыт гаспадыні хаты перадаліся і гарадскім жанчынам – таксама сялянскага паходжання. Іна Антонаўна Міхнюк успамінала:

– У вялікай дзяжы замешвалі цеста, потым на драўляную лапату клалі дубовыя лісты, паверх іх – макраваты бохан і адпраўлялі ў напаленую печ. Выпякалі не менш за дванаццаць круглых чорных

2017©nasledie-sluck.by

боханаў, выкладвалі іх на лаву, папярэдне папырскаўшы вадою, – і па пякарні разносіўся водар спечанага жытніка. Пад вечар заходзілі партызаны, забіралі хлеб. Нам пакідалі таксама. А назаўтра жанчыны зноў шчыравалі ля дзяжы, замешвалі цеста, напальвалі добра печ, браліся за драўляную лапату. І так – дзень пры дні.

У Шантароўшчыну немцы прыязджалі зімой 1944 года, жанчыны-хлебапёкі з дзецьмі загадзя выбраліся ў лес, балазе ён быў за агародам. Партызаны немцаў не чапалі, самі падаліся глыбей у лес. І вёска ацалела. 30 чэрвеня 1944 года туды зайшлі чырвонаармейцы, людзі плакалі ад радасці, частавалі іх, чым маглі. Жанчыны-хлебапёкі вярнуліся ў Слуцк. Сафія Фёдараўна пайшла працаваць у 10-ю школу, будынак якой ацалеў у вайну, пазней перайшла ў 1-ю сярэднюю, дзе працаваў і муж, які дэмабілізаваўся з арміі. Фаіна Пятроўна Басалыга выйшла замуж і з мужам выехала ў Крым. Іна Антонаўна скончыла педагагічны інстытут і таксама працавала да пенсіі ў школе.

2010. М. Тычына.

Газета – баец, патрыёт

«Редактору Слуцкой подпольной районной газеты «Народный мститель» т. Достанко.

Получил №№ 41, 42 «Народного мстителя», очень понравилось, исключительная газета (в условиях вражеского тыла). Хорошо сделана как с точки зрения техники, так и содержания.

Выражаю благодарность от областного комитета КП(б)Б всему коллективу редакции. Желаю самых лучших пожеланий в работе органа, который сплачивает всех лучших сынов Слутчины на окончательную борьбу с немецкими варварами и полное освобожденне Белоруссии от немецких захватчиков.

С приветом секретарь Минского областного комитета КП(б)Б Н.С. Бельский. 2.11.1943 г.»

Такое пісьмо атрымаў рэдактар газеты «Народный мститель» Мінскага партызанскага злучэння. А пачынаўся выпуск газеты так.

У гарадской друкарні акупіраванага немцамі Слуцка працаваў падпольшчык Прохараў. Паціху ён змог вынесці адтуль 20 кг шрыфту, паперу, фарбы. І летам 1942 года на базе партызанскай брыгады імя Чкалава, на Любаншчыне, сярод балот і лясоў была створана паходная друкарня.

Вось адзін з прыкладаў яе дзейнасці. Зімою 1942 года ўвесь народ з трывогай чакаў вынікаў Сталінградскай бітвы. І радасную вестку аб перамозе Чырвонай арміі для жыхароў вёсак Случчыны і Любаншчыны прынеслі партызаны. 1 студзеня ў партызанскай друкарні на разгорнутых лістах школьных сшыткаў было надрукавана 150 лістовак «Весткі з фронту».

Хатка, дзе размяшчалася падпальная друкарня

2017©nasledie-sluck.by

М.Е. Дастанка, рэдактар газеты «Народный мститель»

Група работнікаў падпальнай друкарні Слуцкага РК КП(б)Б

А першага красавіка 1943 года выйшаў першы нумар «Народного мстителя». Выпуск газеты сведчыў аб актыўнай дзейнасці партызан і падпольшчыкаў, іх маральнай моцы, упэўненасці і жаданні хутчэйшай перамогі. Журналісты М. Дастанка, В. Плешавеня, І. Хатэнка, работнікі друкарні Л. Куляшова, Л. Шэўчык, Н. Порхаў, У. Канановіч працавалі дзень і ноч, партызаны А. Залаты, А. Бяляеў рабілі малюнкі і выразалі на дрэве кліше для ілюстрацый.

Газета пісала аб праўдзівым становішчы на франтах, аб баявых дзеяннях партызан. Так, другая старонка выходзіла пад агульнай назвай «Яшчэ мацней ударым па варожых тылах». Часта, напрыклад, у рэдакцыю пасля баёў заходзіў камісар атрада імя Громава А. Чорны, і газета з першых вуснаў друкавала артыкулы аб баявых поспехах партызан, імёны тых, хто вызначыўся ў баях з захопнікам.

Гітлераўцы неаднаразова спрабавалі знішчыць партызан, блакіравалі партызанскую зону. Калі вынесці друкарню ў бяспечнае месца не было магчымасці, яе хавалі, але газету выпускалі з дапамогай падпольнай друкарні Глускай падпольнай газеты. А ў красавіку 1944 года з акружэння друкары выбіраліся праз раку Арэсу. Разам са зброяй яны вынеслі і друкарскае абсталяванне і ў час блакады працягвалі выпуск газеты на астравах Арэхава, Зыслаў, Горнае, каля вёсак Новыя Цярушкі, Рак.

У партызанскай друкарні Анатоль Астрэйка ў 1943 годзе выпусціў зборнік вершаў «Слуцкі пояс». Паэт у вершах захапляўся Случчынай, выказваў упэўненасць, што наш народ пераможа ворага. Экземпляр зборніка вершаў пастаянна насіў з сабой друкар Уладзімір Канановіч. У сутычцы з гітлераўцамі партызан загінуў, а ў музеі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску гэты ўнікальны, прабіты кулямі, зборнік экспануецца і зараз.

А вось што пісала ў жніўні 1943 года газета «Савецкая Беларусь», якая выходзіла ў Маскве: «Народный мститель» – газета-баец. У яе магутны голас. Газета дапамагае партыі падымаць масы на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, на бой за вызваленне роднага краю».

...У ваенны час газета «Народный мститель» выйшла 77 разоў агульным тыражом 37 000 экземпляраў.

І.А. Мурашка.

2017©nasledie-sluck.by

У гонар героя

Да сярэдзіны 70-х гадоў мінулага стагоддзя на тэрыторыі Ісернскага сельсавета была вёска Каты. Але потым ёй далі іншую назву – Гуляева – у гонар Героя Савецкага Саюза Д.Ц. Гуляева, былога камандзіра 101-й партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, якая змагалася з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Дзмітрый Цімафеевіч Гуляеў нарадзіўся ў 1916 годзе ў сяле Іванаўка, што ў цяперашняй Кіраваградскай вобласці Расіі. Скончыў сямігодку, вучыўся ў Чаркаскім дарожна-будаўнічым тэхнікуме. Пасля прызыву ў армію юнак быў накіраваны на вучобу ў Маскоўскае ваенна-палітычнае вучылішча, пасля заканчэння якога служыў у адной з воінскіх часцей у Бабруйску.

Помнік партызанам атрада Д.Ц. Гуляева

У жніўні 1941 года ён і яго таварышы апынуліся на захопленай ворагам тэрыторыі, сталі партызанамі атрада А.І. Далідовіча. Дзмітрый Цімафеевіч у хуткім часе быў прызначаны камісарам атрада. У маі 1943 года Д.Ц. Гуляева назначаюць камандзірам партызанскай брыгады з месцам дыслакацыі ў Старобінскім раёне.

У пачатку верасня 1943 года камандаванне брыгады вырашыла знішчыць варожы гарнізон у Пагосце. Але да самой гэтай вёскі партызаны не дайшлі. Жорсткі бой са шматлікім атрадам паліцаяў, якімі камандаваў начальнік Старобінскай паліцыі Логвін-Далматовіч, адбыўся каля вёскі Панічы Слуцкага раёна, дзе ў гэты дзень паліцэйскія грабілі і пачалі спальваць вёску.

5 верасня 1943 года ў тым баі партызанскі камбрыг загінуў смерцю храбрых. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 года за мужнасць і гераізм Д.Ц. Гуляеву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны астанкі партызана былі перапахаваны ў гарадскім пасёлку Старобін.

Успамінаюць жыхары вёскі Панічы.

Вольга Рыгораўна Васілеўская: *«У час бою 5 верасня 1943 года паліцаі спалілі амаль усю вёску, забілі мясцовага жыхара Алеся Галіна, у агонь кінулі Аляксандру Верабей, якую потым доўга выратоўвалі медыкі і народныя лекары. Жыхары вёскі выратаваліся дзякуючы партызанскім атакам, рашучасці іх камандзіра Гуляева».*

Зінаіда Фёдараўна Стрыгельская: *«У тым баі многіх паліцаяў партызаны заманілі ў лес, дзе ў большасці і знішчылі.*

2017©nasledie-sluck.by

Гэта і дазволіла вяскоўцам разбегчыся з вёскі хто куды. Сама я збегла ў вёску Ісерна. Дамоў, на папялішча, вярнулася на другі дзень. Жылі з мамаю ў зямлянцы. Адбудаваліся толькі пасля вайны».

Успамінаюць жыхары вёскі Гуляева.

Соф'я Андрэеўна Струнеўская: *«Старобінскія паліцаі былі ў нашай вёсцы на другі дзень пасля бою каля Паніч. Яны прымусілі нашых мужчын везці сваіх загінуўшых у Старобін. У нас яны забілі двух жыхароў».*

Яўгенія Віктараўна Струнеўская: *«На наступны дзень пасля таго бою паліцаі рабілі вобыскі ў дамах, шукалі, мо дзе будуць параненыя партызаны, забіралі прадукты, іншыя рэчы. Адзін з паліцаяў быў і ў нашай хаце, патрабаваў пляшку самагону. У нас яго не было, дык нават хацеў мяне за гэта забіць. Але выратавала суседка Суклюта Зажэўская, якая і дала паліцаю бутэльку, пасля чаго той ад нас паехаў».*

В. Цішкевіч.

Апошняя засада

У канцы вясны 1944 года партызанская разведка данесла, што ворагу падышло падмацаванне жывой сілай і тэхнікай, што намячаецца аперацыя па ліквідацыі партызанскіх атрадаў. Данясенне пацвердзілася: праз два дні карнікі пачалі акружаць лес. Наш атрад імя Кірава заняў абарону каля вёскі Тарасаўка. Двое сутак партызаны стрымлівалі націск ворагаў, а на трэці дзень вымушаны былі адступіць. Нашай групе было загадана прыкрыць адыход асноўных сіл. Толькі мы занялі абарону, як з'явіліся фашысты. Завязаўся няроўны бой. Доўга стрымлівалі ворага, а потым адступілі.

Пасля таго як мы выйшлі з акружэння, блакады карнікаў, зрабілі пераход з урочышча Окраў праз дарогу Асіповічы – Бабоўня, спыніліся ў лесе. Нашай роце, якой камандаваў т. Крыўчанка, было дадзена баявое заданне: зрабіць засаду і сустрэць агнём фашыстаў, якія павінны ехаць у лагер для зняволеных у Шчыткавічах. Там былі мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці. Іх вывозілі на катаргу ў Германію.

Зрабілі засаду каля лясной дарогі. Паказалася калона фашысцкіх аўтамашын. Адна падарвалася на міне: партызаны адкрылі агонь. 9 аўтамашын запалалі факеламі. Было знішчана 18 карнікаў. Яны не даехалі да лагера, каб забраць людзей у фашысцкую няволю.

Гэта была апошняя партызанская засада. Неўзабаве мы непадалёку ад вёскі Гольчыцы сустрэліся з чырвонаармейцамі. Гэта была радасная, незабыўная сустрэча. Партызаны шчыра, па-сяброўску абніміліся з танкістамі. Многія тут жа садзіліся на танкі і ехалі далей гнаць ворага.

А. Кур'яновіч,
былы партызан атрада імя Кірава.

2017©nasledie-sluck.by

Дакументы сведчаць

Пісьмо невядомай камсамолкі

В далёкий край товарищ улетает,
За ним родные ветры вслед летят

Здравствуй Саша

Теперь я пишу тебе ежедневно. Пока есть возможность буду писать. Саша, к твоему отъезду я отношусь очень хладнокровно. В суровые дни нашей Родины я взяла боевое оружие, чтобы громить банду палачей.

Я тебя понимаю, что тебе тяжело без меня, тебя некому даже было проводить на фронт.

Саша, я отчасти тебе завидую, хорошо тебе, будешь с товарищами, если придётся погибнуть так тебя видят твои товарищи, ранен будешь, сестра вынесет с поля боя.

Я в противоположность тебе, моя работа совершенно другая, трусы не могут работать. Враг хитер, коварен, надо суметь его перехитрить, так чтоб он не замечал, что я всей душой его ненавижу. Если разоблачит меня, беспорная вещь, по головке не погладит. Я должна буду под любой пыткой молчать, какие б эти телесные издевательства для меня не были тяжелы. Легче б было б умирать если б знал, что о твоей смерти узнают. И её расценят с той или другой стороны, а то будет обидно, что твои товарищи и знать ничего не будут как ты примешь смерть.

Саша, если после войны не приеду домой, разыскивай меня по адресу Москва ЦК ВЛКСМ. Только они будут знать мою судьбу, а пока война не кончится можете быть за меня спокойны.

Целую тебя крепко, крепко. Нюся.

15/VIII – 42 г.

Фонды ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей».
Падрыхтавала Л.У. Шкурская.

З пратакола пасяджэння Грэскага падпольнага райкама КП(б)Б Мінскай вобл. аб святкаванні 1 Мая і правядзенні вясенняй пасяўной кампаніі ў 1943 г.

16 красавіка 1943 г.

Присутствовали: секретарь РК КП(б)Б тов. Пузевич, члены РК Разувакин и Юдицкий.

I. СЛУШАЛИ: О праздновании 1 Мая.

Второй год белорусский народ будет отмечать праздник 1 Мая в условиях гитлеровского террора, грабежа и насилия...

В этом году 1 Мая в тылу противника провести под лозунгом: «Больше помощи фронту, шире ряды народных мстителей-партизан. Сделаем шоссейные и железные дороги непроходимыми для противника».

В целях лучшего проведения 1 Мая РК КП(б)Б постановляет: 1. Во всех населенных пунктах Селецкого, Первомайского, Поликарповского и частично Покрошевского сельсоветов провести собрания с докладами «1 Мая и текущий момент». 2. Комиссарам отрядов выделить для этой цели лучших агитаторов-коммунистов и комсомольцев, списки которых дать в РК КП(б)Б к 18 апреля 1943 г. ... 4. На собраниях поставить вопрос о сборе средств на построение самолетов трудящимися Гресского и Слуцкого районов.

2017@nasledie-sluck.by

II. СЛУШАЛИ: О весенне-посевной кампании.

22 месяца народ временно оккупированной территории томится под фашистским ярмом. Гитлеровцы за это время в целом ряде деревень подвергли сожжению и уничтожению население (Поликарповка, Адамово, Рудновка, Переходовка, Фадеевка и др.). Только некоторым семьям удалось спастись от фашистского террора. И у людей не осталось ни кола, ни двора, ни коровы, ни лошади. Чтобы засеять землю, населению требуется сейчас помощь в тягловой силе, требуется и вооруженная защита, поскольку фашисты и их прихвостни – полиция угрожают новым террором. Насколько своевременно прилесные сельсоветы проведут посевную кампанию, будет зависеть и обеспеченность продуктами питания [партизанской] бригады, а отсюда и боеспособность ее. А посему принять все меры, чтобы население Поликарповского, Первомайского и Селецкого сельсоветов засеяло землю.

Для этого:

1. Командирам и комиссарам на время посевной кампании сократить обоз до минимума, оставив только необходимое количество лошадей для разведки, хозяйства и под тачанки. Остальных лошадей дать во временное пользование населению.
2. Ответственность за правильное распределение лошадей по деревням возложить на командиров и комиссаров отрядов.
3. Считать необходимым бригаде на время посевной кампании разместиться ближе к Поликарповскому и Первомайскому сельсоветам.

Секретарь Гресского (подпольного)
райкома КП(б)Б ПУЗЕВИЧ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3958. Воп. 1. Спр. 1. Л. 1, 2.
Падрыхтавала В.С. Відлога.

Са справаздачы камандавання 225-й партызанскай брыгады імя А.В. Суворава Мінскаму падпольнаму абкаму КП(б)Б аб баявой дзейнасці брыгады і зборы сродкаў у фонд абароны краіны ў жніўні 1943 г.

6 верасня 1943 г.

В августе бригадой уничтожено на шоссейных дорогах Слуцк – Бобруйск, Слуцк – Минск телеграфно-телефонной линии 12 676 м. Взорвано 4 моста местного значения, уничтожено 3 автомашины и проведен ряд других диверсий. В течение месяца на сторону партизан перешло 27 полицейских и «добровольцев» и 2 словака из 102-го пехотного словацкого полка.

Бригада за август выросла в личном составе на 166 чел. Личный состав бригады состоит из 1224 чел. В вооружении – на 2 станковых пулемета, 1 ручной пулемет, 61 винтовку и 1 автомат.

Собрано в фонд обороны страны: облигаций – на сумму 33 135 руб., советских знаков – 12 200 руб., серебра – 9 руб. 50 коп., звонкой монеты – 14 руб. 60 коп.

Изъято у Слуцкого окружного комиссара из банка до килограмма золота, часы, кольца, браслеты, цепочки и другое и десять руб. (10) царской чеканки.

Командир бригады АРЕСТОВИЧ
Комиссар бригады ЗАЯЦ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 183. Л. 7.
Падрыхтавала В.С. Відлога.

2017@nasledie-sluck.by

Загад № 64 камандавання 225-й партызанскай брыгады імя А.В. Суворава Мінскай вобл. аб захаванні насельніцтва ад угону ў няволю, хлеба і жывёлы ад грабяжу працаўнікам, падрыхтоўцы рэзерву для Чырвонай арміі і правядзенні масава-палітычнай работы ў населеных пунктах у сувязі з наступленнем Чырвонай арміі

Грэскія лясы **26 верасня 1943 г.**

В связи с успешным наступлением Красной Армии и отступлением немецких войск, в целях сохранения населения, деревень от уничтожения противником и расширения партизанского движения в районе дислокации нашей бригады и проведения политико-массовой работы с населением приказываю:

От каждого отряда подготовить группы в количестве 15 чел. во главе с командиром и политруком группы с задачей: 1) сохранить от угона в рабство в Германию наше население; 2) все население, способное носить оружие, взять на учет и готовить как резерв для Красной Армии; 3) сохранить хлеб и скот, а также и имущества от ограбления противником; 4) из среды нашего населения проводить пополнение личного состава местных отрядов, тщательно подходя к вопросу приема в отряды; 5) изыскивать оружие среди гражданского населения для отрядов; 6) выделенные группы подчиняются в своей работе непосредственно командирам и комиссарам своих отрядов, которые непосредственно несут ответственность за выделенные группы и за результат их работы.

Командирам, комиссарам и уполномоченным особых отделов отрядов к подбору людей в группы отнестись со всей серьезностью. За каждого выделенного в группы партизана командиры, комиссары и уполномоченные отрядов несут персональную ответственность.

Отряды выделяют группы в следующие сельсоветы: им. Кирова – Старевский, им. Дзержинского – Омговичский, им. Фрунзе – Гольчицкий, им. Суворова – Труханович-ский, им. Чкалова – Гацуковский и Трухановичский, им. Буденного – Пуковский, Грозовский и Шищицкий. Отряды им. Островского и им. Рокоссовского работают на своих направлениях.

Командирам и комиссарам отрядов к 27 в 12.00 представить в штаб бригады списки групп с указанием командиров и политруков выделенных групп.

Командир бригады АРЕСТОВИЧ
Комиссар бригады политрук ЗАЯЦ
Нач. штаба бригады ПРЫГУНОВ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3785. Воп. 1. Спр. 1. Л. 18, 19. Падрыхтавала В.С. Відлога.

Са справаздачы камандавання 200-й партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага Мінскай вобл. штабу Мінскага партызанскага злучэння аб баявой дзейнасці, забеспячэнні ўзбраеннем, боепрыпасамі, харчамі і адзеннем партызан брыгады за снежань 1943 г.

31 снежня 1943 г.

В основу работы в декабре 1943 г. был положен приказ за № 309 Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза тов. Сталина и указания штаба соединения партизанских отрядов Минской обл.

Политико-моральное состояние бригады вполне удовлетворительное. Настроение бойцов-партизан и командиров хорошее.

2017@nasledie-sluck.by

Разведработа проводится круглосуточно как войсковая, так и агентурная. Войсковая в радиусе 15–25 км, агентурная в радиусе 30–50 км.

По отряду им. Дзержинского

26 декабря 1943 г. на шоссе Слуцк – Минск, на 42-м км, взорвана грузовая машина. Убито 2 и ранено 3 немца.

28 декабря 1943 г. на шоссе Слуцк – Минск, на 38-м км, взорвана грузовая автомашина.

Добыто через местное население 5 винтовок, 230 винтовочных патронов, 3 нагана, ППД, граната, 5 дисков к СВТ.

В основном бригада как продуктами, так и обмундированием обеспечивается за счет ресурсов местного населения Дзержинского района. Состояние делопроизводства – удовлетворительное.

Бригада укомплектована как командным, так и политсоставом полностью, составляет боевую единицу, которая в соответствии с вооружением и боеприпасами может выполнять боевые операции, поставленные командованием штаба соединения.

Командир бригады лейтенант БАРАНОВ
Комиссар бригады политрук МАРТЫСЮК
Нач. штаба бригады ЕГОРОВ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 1. Л. 4–6. Падрыхтавала В.С. Відлога.

Са справаздачы камандавання 200-й партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага Мінскаму падпольнаму абкаму КП(б)Б аб баявой дзейнасці брыгады за кастрычнік 1943 г.

не раней за 30 кастрычніка 1943 г.

Диверсионная работа по партизанскому отряду «25 лет Октября»

...22 октября 1943 г. Разгромлено Серяжское волостное управление Слуцкого района, изъяты документы и конфисковано имущество.

26 октября 1943 г. На шоссе Слуцк – Греск в районе дер. Хреново, Василинки порезана телефонная связь расстоянием 3,5 км (порезаны столбы и провода)...

По партизанскому отряду им. Дзержинского

10 октября 1943 г. На шоссе Минск – Слуцк (на 43 км) путем минирования взорвана 1 автомашина. При этом убит водитель и 2 немецких солдата.

12 октября 1943 г. На шоссе Минск – Слуцк (на 38 км) взорван автобус. При этом убито 4 связиста-гитлеровца.

13 октября 1943 г. На шоссе Минск – Слуцк (на 42 км) подорвана грузовая автомашина. Количество убитых не установлено.

24 октября 1943 г. На шоссе Слуцк – Минск, на 40 км, подорвана грузовая автомашина, везущая немецких солдат. При этом убито 8 солдат и 4 ранено.

23 октября 1943 г. На шоссе Минск – Слуцк, на 43 км, подорвана грузовая автомашина, которая везла мотоциклы в сторону Минска. При этом убито 2 гитлеровца...

Командир бригады лейтенант БАРАНОВ
Командир бригады политрук МАРТЫСЮК
Нач. штаба бригады ЕГОРОВ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 181. Л. 9–11. Падрыхтавала В.С. Відлога.

2017@nasledie-sluck.by

З данясення камандавання партызанскай брыгады імя В.П. Чкалава Мінскай вобл. камандзіру Мінскага партызанскага злучэння В.І. Казлову аб баявой дзейнасці брыгады за перыяд з 21 лістапада па 2 снежня 1943 г.

8 снежня 1943 г.

Доношу, [что] группой отряда «Железняк» 30 ноября 1943 г. на дороге Слуцк – Козловичи подорвана автомашина с живой силой, в результате убито 5 и ранено 2 немца. Старш[ий] Леонович Степан.

Группой отряда им. Громова (старш[ий] Беляев А.) 5 декабря 1943 г. в немецко-полицейском гарнизоне дер. Маковичи Стародорожского района заминированным патефоном подорвано 4 полицейских, из них нач. полиции, командир полицейского взвода и 2 рядовых полицейских.

Группой отряда им. Громова (старш[ий] Черный) 25 ноября 1943 г. на дороге Слуцк – Уречье, в р[айо]не дер. Ячево подорвана автомашина-цистерна, при этом автоцистерна сгорела, убито 2 немца.

Той же группой 30 ноября 1943 г. миной подорвана автомашина на шоссейной дороге Москва – Варшава, в р[айо]не дер. Леньки, при этом убито 2 немца.

Группой отряда им. Громова (старш[ий] Кузнецов) 24 ноября 1943 г. в 19.30 на ж. д. Лунинец – Барановичи, в р[айо]не между Бостынь – Люща, подорван эшелон противника с живой силой и техникой, в результате крушения выведен из строя паровоз, разбито 15 вагонов, из них один классный, повреждено 20 вагонов, при этом убито 50, ранено 30 немцев.

Группой Казарина того же отряда 1 декабря 1943 г. в 14.00 произведен взрыв Слуцкой городской управы...

Группой тов. Обласова того же отряда 1 декабря 1943 г. на шоссейной дороге Уречье – Таль подорвана повозка. Убито 5 полицейских, ранено 2.

Группой отряда им. Громова (старш[ий] Дмитриенко) 1 декабря 1943 г. на минах подорваны 2 автомашины, одна из них легковая. Подрыв был произведен на шоссейной дороге Москва – Варшава, в районе д. Весея. При этом убито 4 немца.

Той же группой 2 декабря 1943 года на гравийной дороге Ячево – Козловичи на мине подорвана подвода. Убито 2, ранен 1 немец.

Группой отряда им. Лазо, в ночь с 21 по 22 ноября 1943 г., на электростанции гор. Слуцка выведено из строя миной котловое отделение электростанции.

Командир бригады им. Чкалова СМИРНОВ
Комиссар бригады КОНОНОВИЧ
Нач. штаба бригады ВОРОТНИКОВ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4051. Воп. 1. Спр. 8. Л. 24. Падрыхтавала В.С. Відлога.

2017©nasledie-sluck.by

СВЕДЕНИЯ

о боевом и численном составе отряда им. С.М. Кирова 95-й партизанской бригады им. М.В. Фрунзе на 1 июня 1944 г.

Личный состав	
Командир отряда	1
Комиссар отряда	1
Нач. штаба	1
Уполномоченный О.О.	1
Врачей	1
Командиров роты	2
Политруков роты	2
Командиров взводов	6
Командиров отделений	20
Рядовой состав	225
Прочие	5
Всего	265
Вооружение	
ПТР	2
Станк. пулемет	2
Ручной пулемет	7
Автоматов	15
Револьверов и пистолетов	20
Винтовок	151
Боеприпасы	
Патрон ПТР	156
Винтовочный патрон	10 300
Патрон ППД и ППШ	8 000
Конский состав	
Обозных	14
Верховых	18
Транспорт	
Повозок	10
Седел	17

Фонды ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей».
Падрыхтавала Н.Г. Серык.

2017©nasledie-sluck.by

СПІС

асабістага складу групы, сфарміраванай у Маскве і пасланай у глыбокі тыл ворага для фарміравання партызанскага атрада з ліку мясцовага насельніцтва і вядзення барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Старшы групы – Арцёменка Іван Фядотавіч.

Група ў складзе 16 чалавек (13 мужчын і тры дзяўчыны) фарміравалася ў Маскве і Арэхаўцы Горкаўскай вобласці, прайшла адлаведную падрыхтоўку ў складзе Усебеларускага Збору і накіравана ў тыл праціўніка пешшу 20 ліпеня 1942 г.

Група 1 жніўня 1942 г. перасякла лінію фронту і ў цяжкіх умовах за 66 сутак прайшла звыш адной тысячы кіламетраў, дасягнула лясоў Слуцкага, Старадарожскага, Грэскага, Пухавіцкага і інш. раёнаў.

№	Ф. И. О.	Год рожд.	Нац.	Партийность	Где родился	Образован.	Военное образован.	Военное звание	Место работы до войны
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1.	Артёменко Иван Федотович	1901	русск.	чл. ВКП(б)	с. Шумиловка.	среднее	погран. школа	ст. лейтенант	Любанский РК КП(б)Б, зав. отделом пропаганды и агитации
2.	Макаревич Николай Иванович	1920	бел.	канд. ВКП(б)	Минск. обл., Руденский р-н, д. Сергеевичи	среднее		лейтенант	командир взвода учебн. батальона
3.	Андриянов Андрей Федорович	1907	русск.	канд. ВКП(б)	Смоленская обл., Глинковский р-н, д. Марьино.	5 кл.	полковая школа	ст. сержант	Витебск, вагоно-рем. депо
4.	Амбросов Николай Исакович	1910	бел.	б/п	Минск. обл., Крупский р-н, д. Худовка	4 кл.		в/служ., рядовой	в/служ.

2017arasadle-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
5.	Бочарова Анна Ивановна	1925	русск.	чл. ВЛКСМ		3 кл.			г. Егорьевск, швея
6.	Бусел Владимир Павлович	1920	бел.	чл. ВЛКСМ	Полесская обл., Паричский р-н, д. Дубровка	7 кл.	полковая школа	сержант	Пом. командира взвода, 586 С. Б. 107 С.-Д.
7.	Зуевская Вера Карловна	1920	бел.	чл. ВЛКСМ	Минск	3 курса пединститута			
8.	Кругликов Афанасий (Николай) Кирсанович	1906	бел.	б/п	Могилевск. обл., Костюковичский р-н, д. Видуйцы	нач.			Погиб в бою по дороге 17.VIII.1942
9.	Метлушко Александр Иосифович	1919	бел.	канд. ВКП(б)	Полесская обл., Калинковичский р-н, д. Дудичи	7 кл.		сержант	690 С. П. 126 КСД
10.	Подобед Иван Никифорович	1909	бел.	б/п	Минский р-н, д. Белица	5 кл.			Колхоз «Ленинский путь», Минский р-н
11.	Романенко Мария (Жанна) Киреевна	1923	русск.	чл. ВЛКСМ	Орловская обл., Суражский р-н, п. Закат	8 кл.			г. Магнитогорск, токарь завода
12.	Савенок Иван Филиппович	1913	бел.	б/п	Гомельская обл., Тереховский р-н, д. Уть	4 кл.		сержант	г. Гомель, слесарь электротехн. завода

2017@nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
13.	Сальников Николай Дмитриевич	1910	русск.	б/п	Днепропетровская обл., г. Мариуполь	средн.	полковая школа	сержант	г. Минск, техник-строитель
14.	Сурдо Аркадий Николаевич	1922	бел.	чл. ВЛКСМ	Витебская обл., Толочинский р-н, ст. Славное	средн.			учащийся
15.	Траханов Андрей Дмитриевич	1904	бел.	б/п	Могилевская обл., Хотимский р-н, д. Конава	2 кл.			
16.	Урбан Петр Иванович	1918	бел.	чл. ВЛКСМ	Витебская обл., Дриссенский р-н, д. Погулянка	9 кл.	полковая школа	сержант	Ленинградское арт. училище
По дороге примкнули 2 чел. из группы Степанова, которая также была направлена в Белоруссию из Москвы									
17.	Целуйко Пелагея Герасимовна	1914	бел.	б/п		5 кл.			г. Гомель, раб. ф-ки 8-е Марта
18.	Загитова Рита Галиевна	1923	татарка	чл. КПСС	Казань	н. высш.			студентка

Фонды ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей».
Падрыхтавала Н.Г. Серык.

2017@nasledie-sluck.by

СПИСОК

агентов отряда, тесно связанных с отрядом и оказывающих беспрерывную связь и помощь партизанскому отряду Кирова, с начала прибытия группы из-за линии фронта

1. Плиско Агей Яковлевич, проживает в д. Тарасовка, Старевский с/совет, Слуцкий район. Связан с отрядом с октября 1942 года, с дня прибытия группы по заданию ЦК КП(б)Б. Достал и сдал в отряд ручной пулемет, пять винтовок, свыше тысячи патронов. Систематически в течение 1942 г. и января 1943 г. занимался разведкой в Слуцком и Стародорожском районах, доставляя в отряд ценные сведения. По сегодняшний день т. Плиско занимается разведкой Старевского с/совета, всех его прослоек и оказывает помощь по раскрытию сетей шпионажа.

Огненный вихрь разметал по фронтовым дорогам наших земляков. Но где бы они ни находились – в окопе, танке, у пушки, за баранкой автомобиля или за штурвалом самолета – везде проявляли выдержку, мужество и отвагу.

Друкуецца ў скарачэнні па кн.: Видлога В.С. Земля отцов – земля святая. Лучники: история, люди, события, факты. Минск, 2009. С. 60–65.

З дзённіка ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны Георгія Паўлавіча Гардзея, (1910–1993), узнагароджанага ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За перамогу над Германіяй», былога жыхара в. Леніна

27.6.1944 г. Носяцца самалёты па 30 штук і больш. На ўсходзе – артылерыйская стральба. Ідуць чуткі, што Бабруйск узяты Чырвонымі войскамі. У Слуцк прыбываюць параненыя нямецкія салдаты і з'явіліся бежанцы з Бабруйска. Ноччу бамбёжка ў Слуцкім раёне. Ноч у Раманаве спакойная. На поўначы паветраная ілюмінацыя.

28.6.1944 г. Раніцай ездзіў у Слуцк з Пашай мяняць ячмень на муку, але не памяняў. На шашы цяжка было праехаць з-за машын і бежанцаў, якія рухаліся на захад. Машыны з нямецкімі салдатамі ішлі на ўсход.

Атрыманы быў загад аб эвакуацыі Раманава. Начуем дома з трывожным настроем. Ноч прайшла спакойна.

29.6.1944 г. Раманаўцы пачалі эвакуіравацца хто куды: хто ў Шумінкі, хто ў Вуглы. Я з сям'ёй – у Перавоз. Мама яшчэ засталася дома. У Раманава няшмат немцаў прыбыло на машынах. Гарыць Капыль, Семежава, Грэск. Начуем у Перавозе. Пакуль што спакойна. Мама начуе ў Раманаве.

30.6.1944 г. На ўсходзе грыміць артылерыя, лятаюць самалёты. Паша хадзіла ў Раманава. Хутка вярнулася. Начавалі ў Раманаве бежанцы і паехалі. Удзень у Перавозе было неспакойна. З'явіліся матацыкл, потым дзве санітарныя машыны. Хацелі выйсці ля дарогі на шашы, а людзі думалі, што хапаюць людзей на работы – і ходу ў поле хавацца. Ноч спалі спакойна.

1.7.1944 г. Уцякаюць з Саўкова раманаўскія людзі. Чуткі: быццам немцы заявілі, што фронт будзе каля Саўкова.

Капаем ямы для ўкрыцця ад куль і іншага. Пасвім скаціну і назіраем за савецкімі самалётамі. Па баках усё гарыць ад бою. Ноч праводзілі на двары. Дзеці спяць у доце. Грыміць кананада блізка ад Раманава. У дзве гадзіны ночы пачалася асада Раманава...

2.7.1944 г., нядзеля. Раніцай не спалася на двары ад кананады. Гараць вуліцы Паддубная і Слуцкая ад савецкіх снарадаў, што кідалі з самалётаў на немцаў, якія былі у Раманаве. Да ўсходу сонца Раманава было занята. Бой вядзецца па адступаючаму працiўніку... Леніна вызвалена ад немцаў раніцай.

Падрыхтавала Г. Шышко.

2017©nasledie-sluck.by

ІМ ДАВЯЛОСЯ ЖЫЦЬ НА ТОЙ ЗЯМЛІ, ЯКУЮ АДВАЁЎВАЛІ

Пасля вызвалення Случчыны войскі Чырвонай арміі з баямі рушылі далей, на захад. Кожны дзень, крок за крокам, набліжаў перамогу. Ці хто з байцоў думаў, што праз нейкі час лёс заставіць вярнуцца асобных з іх зноў у Слуцк, у той горад, што давялося вызваляць ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў? Мусіць, не. А тым часам на свабоднай ад пакут зямлі ладзілася мірнае жыццё. Пасля перамогі вярталіся ў родныя мясціны былыя байцы. У Слуцк, які да пачатку вайны вылучаўся шматлікімі ваеннымі гарадкамі, накіроўваліся воінскія часці для далейшага праходжання службы. Таму многія былыя ўдзельнікі баёў за Случчыну ў розныя часы зноў апынуліся тут – А.А. Гуленін, М.В Башкатаў, А.І. Дубовік, М.У. Масленікаў, П.І. Малышаў, Д.С. Рудэнка і іншыя.

Сярод іх быў і Павел Пятровіч Лук'янцаў, які добра памятаў баі за Слуцк: «Огонь не прекращался ни на минуту. Было тяжело двигаться из-за огня и дыма. Отступая, немцы жгли дома. Упорный бой развернулся в центре города на площади Ленина... Чтобы вернуть площадь, немцы обрушили на нее мощный артиллерийский огонь и бросили в атаку дополнительные силы. Но умелые действия танкистов и казаков дали возможность подавить основные огневые позиции немцев. Не менее тяжелый бой шел в районе СШ № 5. Несмотря на ожесточенное сопротивление врага, город был взят. В штурме Слуцка, кроме нас, танкистов, участвовали артиллеристы, партизаны и казаки, которых мы неоднократно встречали на улицах города».

М.М. Нікалаеў

П.П. Лук'янцаў

А.І. Дубовік

М.В. Башкатаў

П.І. Башкатава

А.І. Дубовік

Так здарылася, што старшаму лейтэнанту П.П. Лук'янцаву ў тым жа 1944 г. давялося служыць пад камандаваннем Г.К. Жукава, бо 69-я бронетранспарцёрная рота ўвайшла ў склад аховы штаба 1-га Беларускага фронту. Прымаў удзел Павел Пятровіч і ў ахове ўдзельнікаў Патсдамскай канферэнцыі. Да 1947 г. служыў у Германіі, а потым быў пераведзены ў Слуцк. Так капітан-растаўчанін звязаў свой лёс назаўжды з нашым горадам. Пасля службы працаваў інжынерам МТС, але большая частка працоўнай біяграфіі – педагагічная дзейнасць. Многія былыя вучні добра памятаюць гэтага сціплага чалавека. П.П. Лук'янцаў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй» і інш.

Жыхар Слуцка палкоўнік у адстаўцы Аляксей Іванавіч Пацалуенка часты госць у краязнаўчым музеі. Любіць сустракацца з моладдзю, яму ёсць што расказаць і ўспомніць: «К Слуцку

2017©nasledie-sluck.by

А.І. Пацапуенка (першы злева) з саслужыўцамі. 1956 г.

П.І. Малышаў

А.І. Пацапуенка з жонкай Марыяй Васільеўнай, удзельніцай Вялікай Айчыннай вайны. 1955 г.

мы подошли со стороны Новодворцев. К тому времени я был капитаном, командиром стрелковой роты 152-го гвардейского полка 50-й гвардейской дивизии. Фашисты встретили нас огнем. С боями мы брали высоты, там, где сейчас первый городок. К нам в подкрепление подошел кавалерийский эскадрон. Вместе и бились. С наступлением темноты получаем приказ: обойти высоты слева и двигаться по направлению к железнодорожной станции. К утру вышли к месту назначения. Поступает второй приказ: идти вдоль шоссе по направлению Барановичей... Были тяжелые бои за Каменку, севернее Бреста... ранение... госпиталь.

Но вот война закончилась. В 1961 году моя семья переехала в Слуцк. Так довелось жить на той земле, которую у врага отвоевывал. А в 1991 году, через 47 лет после боя под Каменкой, узнал, что еще в то военное время удостоили меня за него высокой награды. На торжественном собрании в честь 110-летия В.И. Ленина в Доме культуры подходит ко мне один из ветеранов, спрашивает: «Не тебя ли орден Красного Знамени ищет? Я в газете прочел». А тогда во многих изданиях печатали рубрику «Награда ищет своего героя». Я на этого человека смотрю, не могу прийти в себя. Пошел в совет ветеранов, подняли там подшивку, и правда, в газете – мое имя. И место рождения, и год рождения, и в каком бою участвовал, и где – все про меня. Собрал я документы, оформил их, и вручили мне эту награду, орден Красного Знамени».

Гэта быў другі ордэн Чырвонага Сцяга, які далучыўся да баявых узнагарод ветэрана.

Цяжка ўявіць, што за пачуцці могуць быць у чалавека, які з вызваленчымі баямі падыходзіў да роднай хаты, пры гэтым за ўсю вайну не атрымаўшы ніводнай вестачкі ад сям'і. Розныя думкі, ад якіх стыла кроў і калацілася сэрца, апаноўвалі мужнага і смелага танкіста лейтэнанта Сяргея Пятровіча Махуна з вёскі Леніна. Франтавыя дарогі яго пачыналіся на Случчыне, каля в. Амговічы. Менавіта тут была зведана горыч адступлення, а потым... жорсткія баі пад Вязьмай і Можайскам... Смаленшчына, бітва за Маскву... І вось насталі дні, калі на баявой машыне Т-34 разам з другімі воінамі наш зямляк рухаўся на захад. На гімнасцёрцы зіхацелі ўзнагароды, два ордэны – Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені, медалі «За абарону Масквы», «За абарону Каўказа».

30 чэрвеня Слуцк быў атакаваны з трох напрамкаў. У баях за родны горад, які стаў непазнавальным, удзельнічаў

2017©nasledie-sluck.by

С.П. Махун

М.У. Масленікаў

і С.П. Махун. 1 ліпеня выбівалі гітлераўцаў з Селішч. Тут быў жорсткі бой, у якім мужнасць і стойкасць праявілі танкісты. Супраціўленне ворага было зламана. За ноч фашысты былі выбіты яшчэ з некалькіх населеных пунктаў. Наперадзе была в. Леніна, а там – рака Морач, забалочаная мясцовасць. Каля вёскі немцы занялі раней падрыхтаваную абарону і аказалі танкістам супраціўленне, але пасля кароткага жорсткага бою яна была вызвалена. Калі на танку пад'ехаў Сяргей Пятровіч да роднай хаты, яго акружылі аднавяскоўцы, а сярод іх – жонка з дзіцём на руках. Кароткай, але радаснай была сустрэча. Трэба было рухацца наперад, да перамогі.

Пасля вайны С.П. Махун узначаліў родны калгас, пазней працаваў у школе.

На жаль, ужо многіх мужных і адважных сваіх сыноў праводзіла Случчына ў апошні шлях, але памяць пра іх ратныя подзвігі назаўжды застанецца ў сэрцах нашчадкаў, у гісторыі краю.

В.С. Відлога.

Служили два товарища...

Письмо из Казахстана «открыло» имена еще двух воинов, участвовавших в освобождении Слуцка от немецко-фашистских оккупантов

«Уважаемые белорусские друзья! Обращается к вам сын участника Великой Отечественной войны, офицера, танкиста, участника освобождения Белоруссии от немецко-фашистских захватчиков Абжая Рушановича Салиева... Мой отец добросовестно воевал, за что был награжден орденами и медалями, имел 17 благодарностей Верховного Главнокомандующего Сталина. Отец с теплотой вспоминал и много рассказывал о братской республике – Белоруссии, о городах, которые освобождал от врага, – Минске, Могилеве, Слуцке... Мой отец был командиром танка Т-34 151-го отдельного танкового полка 9-й гвардейской казачьей кавалерийской Кубанской дивизии 1-го Белорусского фронта, особо отличился при освобождении вашего города от фашистских оккупантов в июне 1944 года».

Это письмо пришло из Казахстана от Абая Абжаевича Салиева. Мы читали его с великим волнением: через 70 лет стали известны имена еще двух героев, которые освобождали Слуцк от немецко-фашистских захватчиков.

«В бою за город Слуцк 30.6.1944 года, создавая замешательство в рядах противника, тов. Салиев первым проскочил мост через реку Случь. Несмотря на попытки немцев возвратить прежнее положение, тов. Салиев, героически сражаясь на своем танке, удержал переправу до подхода главных сил. В этом бою тов. Салиев огнем из танковой пушки сжег один средний танк противника, две пулеметные точки и уничтожил до 30 гитлеровцев...» – написано в наградном листе Абжая Рушановича Салиева.

2017©nasledie-sluck.by

Копию этого документа сын отважного танкиста прислал в Слуцк. За мужество и отвагу, проявленные при освобождении нашего города и других населенных пунктов Минской области, Абжай Салиев был представлен командованием дивизии к званию Героя Советского Союза. В суматохе того времени наградить героя позабыли, но, как пишет Абай Салиев, «была жестокая война, и о почете, наградах никто не думал, все думали о Победе».

Из Казахстана получили копию еще одного наградного листа, который датирован июлем 1944 г., – на друга и товарища Абжая Рушановича Салиева, также воевавшего в составе 151-го отдельного танкового полка, Михаила Степановича Молокина. В наградном листе (по представлению Молокина к награждению орденом Отечественной войны I степени) написано, что в боях за Слуцк он *«показал образец мужества. Преодолев переправу под сильным артиллерийским огнем противника, повел свой взвод по центральной улице города, огнем и гусеницами танка уничтожая живую силу и технику противника, в результате чего первым овладел западной окраиной города и удерживал в течение двух часов до прихода казаков»*. В этом бою взвод Молокина уничтожил 3 танка, 2 противотанковых орудия, 3 миномета, 50 гитлеровцев. Танк Михаила Степановича Молокина был подбит, экипаж легко ранен. Командиру удалось вывести танк из-под обстрела, привести его в порядок и снова вступить в бой.

М.С. Малокін

Копии наградных листов, фотографии геройских танкистов находятся теперь в Слуцком краеведческом музее. Там есть о них и другие материлы. Например, известно, что Абжай Салиев и Михаил Молокин с боями прошли Беларусь, Украину, Молдавию, участвовали в освобождении Румынии, Венгрии, Чехословакии. Победу встретили в Праге. Гвардии лейтенант Абжай Салиев награжден орденами Красного Знамени, Отечественной войны I степени, Красной Звезды, медалями «За оборону Сталинграда», «За взятие Будапешта», «За освобождение Праги», «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941–1945 годов» и другими; капитан Михаил Молокин – орденами Красного Знамени, Александра Невского, двумя орденами Отечественной войны I степени, двумя орденами Красной Звезды, боевыми медалями.

После окончания Великой Отечественной войны уроженец Казахстана Абжай Рушанович Салиев работал в органах прокуратуры, суда и юстиции

А.Р. Салиеў

2017©nasledie-sluck.by

(более 60 лет). В 1985 г. ему было присвоено воинское звание капитан. Он был награжден юбилейной медалью «60 лет освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков». Сын Абжая Салиева написал, что отец мечтал приехать в Беларусь к местам боев, но из-за ранения и контузии, полученных во время войны, сделать этого не смог. Абжай Рушанович Салиев умер в 2012 г.

Не стало и Михаила Степановича Молокина (уроженца России). После войны он продолжил службу в армии, работал начальником штаба гражданской обороны одного из предприятий в Калининской области.

От слутчан – искренняя благодарность славным танкистам-освободителям. И вечная память. Перед ней – бессильно время...

Н. Селезнёва.

«ПЕРАМОГА ДАСТАЛАСЯ НЯЛЁГКА...»

З успамінаў Д.С. Рудэнкі, ветэрана 54-й стралковай дывізіі, жыхара г. Слуцка

«...Для разгрому ворага ў Беларусі былі прыцягнуты 1-ы Прыбалтыйскі, 1-ы, 2-і і 3-і Беларускія франты. План вызваленчай аперацыі «Баграціён» заключаўся ў тым, каб моцнымі ўдарамі франтоў разграміць асноўныя сілы групы армій «Цэнтр». У склад 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерала К.К. Ракасоўскага ўваходзіла 54-я гвардзейская стралковая дывізія. Я нёс службу ў 163-м стралковым палку дывізіі, якім камандаваў падпалкоўнік В.К. Кананоўіч.

Сваё першае баявое хрышчэнне прыняў у Сталінградскай вобласці. З баямі прайшоў па Украіне: Варашылаўград (Луганск), Данецк, Макееўка, Запарожжа, Мікалаеў. Нашу моцна «патрапаную» дывізію перакінулі на перафарміраванне пад горад Унеча Бранскай вобласці. Дывізія папоўнілася людзьмі і тэхнікай. Нас накіравалі на 1-ы Беларускі фронт. Прарыў нямецкіх войскаў 54-я стралковая дывізія пачала з Парыцкага (цяпер – Светлагорскага) раёна Гомельскай вобласці. Наступленне пачалося ў 6 гадзін раніцы з артылерыйскай падрыхтоўкі, якая доўжылася паўтары гадзіны. Пасля прарыву нямецкай абароны нашы войскі ўзялі кірунак на горад Бабруйск. У баях пад гэтым горадам было знішчана і ўзята ў палон многа фашыстаў, іх баявой тэхнікі. 54-я стралковая дывізія накіравалася да горада Асіповічы, пасля вызвалення якога мы рушылі ў напрамку Старых Дарог.

Д.С. Рудэнка

2017@nasledie-sluck.by

Памятаю, як вызвалялі Случчыну. Фашысцкія акупанты замацаваліся ў вёсцы Лядна. Паведамілі пра гэта камандзіру палка. Хутка палкі дывізіі пачалі штурм. Бой быў нядоўгім, але гарачым. У тым баі за Лядна загінула многа салдат. Быў цяжка паранены і мой баявы таварыш, разведчык, сібірак Андрэй Мікалаевіч Паўтоў, з якім я прызываўся ў армію ў пачатку студзеня 1943 года ў горадзе Омску. Потым дывізіяй былі вызвалены гарады Клецк, Баранавічы, Слонім, Гродна і Брэст. За 30 дзён Беларусь была вызвалена ад фашыстаў. Я таксама ваяваў у Польшчы, Усходняй Прусіі, дайшоў да Прагі і Берліна. 9 мая 1945 года сустрэў у славацкім горадзе Бела. Вярнуўся ў Беларусь, дзе праслужыў у арміі яшчэ пяць гадоў. Дэмабілізаваўся ў 1951 годзе».

За баявыя заслугі Дзмітрый Сямёнавіч Рудэнка ўзнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, іншымі ўзнагародамі.

Прайшло 70 гадоў. Усё менш і менш застаецца ветэранаў, але памяць людзей аб подзвігах воінаў жыве. У вёсцы (цяпер аграгарадок) Лядна ўстаноўлены помнік воінам, якія вызвалялі гэты населены пункт. Ведае аб подзвігах сваіх продкаў і моладзь. І гэта вельмі добра!

ПЕРАМОЖНЫЯ КРЫЛЫ «НАРМАНДЫІ – НЁМАН»

Кароткія радкі хронікі франтавых падзей, датаваныя 4 ліпеня 1944 года: «За период с 23 июня по 4 июля четыре воздушные армии и авиация дальнего действия совершили более 55 тыс. самолето-вылетов. Прочно удерживая господство в воздухе, они уничтожили до 300 вражеских самолетов».

Нават і сёння без хвалявання нельга чытаць гэтыя кароткія радкі і ўглядацца ў строгія лічбы, за якімі стаяць людскія лёсы. За сем дзён чэрвеня і чатыры дні ліпеня ў неба над зямлёй пяцьдзесят пяць тысяч разоў узляталі адважныя сокалы – па пяць тысяч кожны летні дзянёк, па гадзінах набліжаючы светлы дзень вызвалення. І кожны салдат, кожны мірны жыхар, убачыўшы чырвоныя зоркі на крылах самалётаў, уплятаў у грозны гул мататаў свой радасны покліч: «Нашы! Нашы імчаць!»

І далёка не кожны ў тыя гарачыя і крывавыя дні і ночы лета сорак чацвёртага ведаў, што там, у высі, у самалётах, што нясуць вызваленне беларускаму краю ад фашысцкай навалы, гучыць і французская мова. І, мабыць, пачуўшы яе ў сваіх шлемафонах, здзіўленыя фашысцкія лётчыкі на нейкі міг траціліі духоўную раўнавагу, разгублена азіралі блакітную прастору наўкол сябе, і гэтае імгненне разгубленасці не на іхнюю карысць вырашала зыход маланкавага паветранага бою.

Пра смеласць, мужнасць і кемлівасць пілотаў-французаў са знішчальнай эскадрыллі «Нармандыя – Нёман», што ваявала ў небе Беларусі ў дні пераможнага наступу нашых войскаў улетку сорак чацвёртага, вельмі прафесійна, займальна і праўдзіва напісаў у сваім рамане «Дарогі без слядоў» выдатны беларускі празаік Антон Алешка, якога, на вялікі жаль, сёння з намі ўжо няма.

Пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Балотчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці і прайшоў усю Вялікую Ай-

2017©nasledie-sluck.by

чынную вайну, ад першага і да апошняга дня, да поўнай і велічнай нашай перамогі. У той год, калі гітлераўцы па-зладзейску напалі на нашу краіну, ён скончыў Ваенна-медыцынскую акадэмію імя С.М. Кірава, а далей франтавы лёс звёў яго са знішчальнай авіяцыяй, у прыватнасці, са знішчальнай эскадрыллі, якую складалі кадравыя, вопытныя французскія лётчыкі, якія ў сябе на радзіме не маглі сядзець склаўшы рукі, бо добра разумелі, што на прасторах Расіі вырашаецца не толькі лёс рускай зямлі, але і будучыня роднай ім Францыі.

У блакітнай прасторы над зямлёй Беларусі ім, перакананы, бачыўся вольны ад гітлераўскага цемрашальства прыгожы і мілы сэрцу Парыж.

Антон Алешка моцна пасябраваў з адважнымі французскімі лётчыкамі, якіх прывялі ў знішчальную эскадрыллю «Нармандыя – Нёман» цяжкія і пакручастыя сцежкі вайны. Ён праводзіў у бой кожнага, з трывогай глядзеў, як знікаюць у паветранай прасторы імклівыя «Ілы», і ад душы радаваўся, калі бачыў, як яны выныраюць з той жа прасторы і садзяцца на зялёнае поле прыфрантавога аэрадрома, з пастрэленымі крыламі і фюзеляжамі. Ён кратаў рукамі меціны ад фашысцкіх куль, і яму было балюча, быццам былі пастрэлены яго ўласныя плечы. Таму гэтак і здзівіў, усхваляваў чытача раман пісьменніка, кніга, у якой адкрылася новая і яркая старонка жахлівай бяды, што сілілася скарыць зямлю і народ Беларусі.

Назву кнігі падказала пісьменніку неба. Аднойчы, ужо ў мірны час, мы сядзелі з ім на ўзлеску, стомленыя грыбной праходкаю ў сасновых гаях на ўсход ад Мінска. Сядзелі на трафейнай нямецкай, у зялёныя і карычневыя плямы, плашч-палатцы, якую ён прывёз з вайны. Аблокі плылі па небакраі, а высь над соснамі была жнівеньская – густая і сіняя, – і ў ёй дужа высока праляцеў самалёт. Антон Алешка – мы з ім доўга і добра сябравалі – паглядзеў на неба і прамовіў ціха і ў захапленні: глядзі, дружа, праляцеў і знаку няма – дарога без слядоў. А потым дадаў, як гавораць пра нешта завершанае і вырашанае: а што, маўляў, неблагая назва для кнігі. Ёмкая!

Так нарадзіўся загаловак рамана, над якім ён працаваў. Грыбы не вельмі і цікавілі яго ў тых вандроўках па сасновых барах – ён жыў успамінамі пра радасці і горкія страты, што выпадалі на долю вялікіх і малых франтавых аэрадромаў, кожнай эскадрыллі, у тым ліку і французскай, аэрадромаў, у высі над якімі ніякіх дарог не было пазначана.

Неба вайны і неба мірнае – дарога, сапраўды, без слядоў. Але гэта толькі на першы погляд. Сляды з той блакітнай высі анікуды не знікаюць, іхні адбітак кладзецца на дарогі зямныя і на іх застаецца назаўжды, калі след той пакідае мужнае і смелае сэрца, і з тых слядоў і складваецца тая вялікая дарога, на якой сумленны чалавек страчае сваю будучыню.

У нашай роднай Беларусі дарога гэтая светлая і шырокая, і ад думак пра гэта ў душы заўсёды свята.

Друкуецца па кн.: Наша перамога. Хронікі Вялікай Айчыннай вайны. Мінск, 2004. С. 201–204.

2017©nasledie-sluck.by

Дакументы сведчаць

Извлечение из оперативных сводок №№ 182 (1220), 183 (1221), 184 (1222) Генерального штаба Красной армии

28 июня 1944

Конно-механизированная группа овладела г. Старые Дороги и в течение дня продолжала наступление в направлении г. Слуцк. К исходу 28.6 данных о положении группы не поступило. Остальные армии фронта занимали прежнее положение.

29 июня 1944

44-я гвардейская стрелковая дивизия, следуя за частями подвижной группы по дороге на Слуцк, подошла передовыми отрядами к нп Весея (8 км сев.-вост. г. Слуцк).

193-я стрелковая дивизия передовыми отрядами вышла к р. Оресса в районе Верхутина.

Конно-механизированная группа, наступая в направлении г. Слуцк, вела бой на рубеже Збудище (10 км сев.-вост. г. Слуцк) – Весея – Козловски (8 км юго-вост. г. Слуцк) – Кутнево, ее 9-я гвардейская кавалерийская дивизия одним полком вела бой на юго-восточной окраине г. Слуцк.

на 8:00 30.6.44 г.

Войска 1-го Белорусского фронта частью сил вели бои по уничтожению остатков окруженной группировки противника и, сломив ее сопротивление, овладели городом и железнодорожным узлом Бобруйск – мощным опорным пунктом обороны немцев на минском направлении. Одновременно войска фронта продолжали успешное наступление в западном и сев.-западном направлениях и, преодолевая слабое сопротивление разрозненных групп противника, продвинулись вперед до 30 км и завязали бои на окраине г. Слуцк.

на 8:00 1.7.44 г.

Войска 1-го Белорусского фронта, продолжая успешное наступление в западном и сев.-западном направлениях, овладели районными центрами Минской области городом и крупной железнодорожной станцией Слуцк, г. Любань и районными центрами Полесской области гг. Копаткевичи и Петриков. Одновременно войска фронта частью сил вели бои по уничтожению остатков окруженной группировки противника в районе Бобруйска.

18-й стрелковый корпус частями 69-й стрелковой дивизии, прикрывая Осиповичи с сев.-запада, занимал прежний рубеж. 37-я гвардейская стрелковая дивизия передовыми отрядами достигла нп Шищицы, главными силами к исходу дня проходила мост (5 км вост. нп Шищицы). 15-я стрелковая дивизия, имея пункт обеспечения в районе Дюдево (14 км сев.-зап. г. Слуцк), главными силами достигла района Леньки. 44-я гвардейская стрелковая дивизия вышла в район г. Слуцк.

28-я армия, прикрываясь частью сил с юга, главными силами продолжала наступление в западном направлении.

3-й гвардейский стрелковый корпус, совместно с частями **конно-механизированной группы**, к исходу дня овладел г. Слуцк и сосредоточился в районе г. Слуцк.

20-й стрелковый корпус передовыми отрядами достиг рубежа Томилова Гора – Чижевичи – Теслино, главными силами к исходу дня продолжал переправу через р. Случь на участке Погост (20 км юго-вост. г. Слуцк) – Зажевичи.

2017@nasledie-sluck.by

Конно-механизированная группа, совместно с частями **28-й армии**, овладела г. Слуцк, захватив при этом мост через р. Случь исправным, до 12 складов с разным имуществом и другие трофеи. К исходу дня части группы вышли и закрепляются на рубеже Захаровка – Серяги – Варковичи – Лучники – Огородники (6 км зап. г. Слуцк) – Журово – Новодворцы – Новый Двор – Дубники.

65-я армия, развивая наступление в западном направлении, главными силами к исходу 1.7 вышла на рубеж южн. окр. нп Заболотье (10 км вост. нп Лоша) – Белая Лужа – Буда Гресская – Греск – Старина – Уланово – Василинки, имея передовые отряды в районе Жуки.

28-я армия, продолжая преследовать противника, к исходу дня вела бой на рубеже:

3-й гвардейский стрелковый корпус – Подлипцы – Селище – Чижовка (все пункты 10 км зап. г. Слуцк);

20-й стрелковый корпус – при подходе к нп Октябрь (7 км вост. нп Красная Слобода) был контратакован противником силою до двух батальонов пехоты при поддержке 25 танков и самоходных орудий из района Танежицы.

128-й стрелковый корпус к исходу дня сосредоточился в районе Заградье – свх. Некраши – Крупейник – Уречье – Чабусы.

Конно-механизированная группа. 4-й гвардейский кавалерийский корпус из района г. Слуцк к 23:00 1.7 главными силами вышел: 30-я кавалерийская дивизия – Рымаши, 10-я гвардейская кавалерийская дивизия – Жаулки, 9-я гвардейская кавалерийская дивизия – Бобовня – Ржавка; 1-й механизированный корпус в 13:00 1.7 выступил из района г. Слуцк и продолжал марш в район Синявка.

Друкуецца ў скарачэнні па кн.: Операция «Багратион». Освобождение Беларуси. М., 2004 (Серия «Архив»). С. 128, 149, 152, 157, 158.

ЯНЫ ВЯРНУЛІСЯ ПЕРАМОЖЦАМІ

Пад такой назвай быў надрукаваны ў 2-й кнізе гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк», выдадзенай у 2001 годзе, спіс ураджэнцаў і жыхароў горада і раёна – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія дайшлі да Перамогі. Але, на жаль, не ўсе прозвішчы былых воінаў трапілі ў яго. Па-за спісам, напрыклад, засталіся тыя ўдзельнікі вайны, якія пасля яе сканчэння змянілі месца жыхарства, тыя, хто не дачакаўся першай пасляваеннай узнагароды (1965) і пра якіх мы ўвогуле нічога не ведаем, паколькі ў архівах звестак пра іх няма. Шкада, што занадта позна пачалі складацца такія спісы.

Пасля з'яўлення 2-й кнігі выдання ў камісію па стварэнні хронікі звярнуліся блізкія і родныя тых удзельнікаў вайны, чые прозвішчы не былі ўключаны ў спіс.

З нагоды стварэння 3-га, дапоўненага, тома хронікі ў працу ўключыліся і асобныя жыхары раёна. Праявілі ініцыятыву супрацоўнікі Лучнікоўскай бібліятэкі-філіяла: яны зрабілі падваровы абход вёсак зоны іх абслугоўвання з мэтай збору звестак аб удзельніках вайны, якія тут нарадзіліся, але пражывалі ці пражываюць у іншых мясцінах.

Прыведзены ніжэй спіс падрыхтаваны паводле матэрыялаў Слуцкага

2017@nasledie-sluck.by

райваенкамата і новых збораў Дзяржаўнай установы «Слуцкі краязнаўчы музей». Да ўвагі былі прыняты прапановы і заўвагі ўраджэнцаў і жыхароў Случчыны. Але пра паўнату яго і цяпер гаварыць не даводзіцца з-за напластаванняў часу і розных абставін. Няхай выбачаюць за гэта ветэраны і іх родныя. Усім ім – хто дажыў да нашых дзён, хто пайшоў з жыцця, хто названы і не названы тут – нізкі паклон і вялікая ўдзячнасць нашчадкаў.

ГОРАД СЛУЦК

АЖЭЎСКІ Іван Пятровіч, н. у 1910, на фронце з ліпеня 1944 па сакавік 1945, 162-і стралк. полк, 28-я армія.

АЛЕЙЧЫК Валянціна, урач, у партызанскім атрадзе імя Будзённага брыгады імя М.В. Фрунзе з 1943 па 1944, з 1944 на фронце.

АЛЕШКА Дзям'ян Фёдаравіч, н. у 1899, радавы, на фронце з верасня 1944 па красавік 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Варшавы».

АЛЫХАЎ Віктар Самойлавіч, н. у 1923, на фронце з красавіка 1943 па май 1945.

АНАНЧУК Леў Іосіфавіч, н. у 1925, на фронце са студзеня па ліпень 1944.

АРЛОЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1918, радавы, кулямётчык, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй».

АС Берта Яфімаўна, н. у 1906, партызанка атрада імя Жданава брыгады Баранавіцкага абкама са жніўня 1942 па ліпень 1944.

АС Леў Хацкелевіч, н. у 1895, партызан атрада імя Жданава брыгады Баранавіцкага абкама са жніўня 1942 па ліпень 1944.

АС Эля Хацкелеўна, н. у 1900, партызанка атрада імя С.М. Кірава брыгады Баранавіцкага абкама з сакавіка 1942 па ліпень 1944.

АСТРЭЙКА Васіль Фёдаравіч, н. у 1927, яфрэйтар, удзельнік вайны з Японіяй.

АТРОШЧАНКА Мікалай Рыгоравіч, н. у 1920, на фронце, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

БАГДАШЫЧ Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1925, сувязны партызанскага атрада імя М.М. Грамава 64-й брыгады імя В.П. Чкалава, радавы, кулямётчык, на фронце з 1944 па 1945, узнагароджаны ордэнамі Славы III і II ступені, Айчыннай вайны I ступені, медалём «За адвагу».

БАГОЎСКІ Андрэй Васільевіч, н. у 1920, інструктар, на фронце з 1941, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Севастопаля», «За абарону Каўказа», «За перамогу над Германіяй».

БАРАДЗЬКО Ганна Андрэеўна, н. у 1922, медсястра, радавая, на фронце з мая 1943 па май 1945, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БАРЫСАВЕЦ Яўген Антонавіч, н. у 1920, радавы, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалём «За вызваленне Варшавы».

БАТАЛКА Іван Якаўлевіч, н. у 1914, радавы, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна».

БАХАНОВІЧ Іван Герасімавіч, н. у 1895, намеснік начальніка санітарнага аддзела Беларускага штаба партызанскага руху, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (у мірны час – гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 436).

БІРЫЧ Васіль Афанасьевіч, н. у 1913, на фронце з ліпеня 1944 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна».

БОРТНІК Леанід Мацвеевіч, н. у 1925, радавы, на фронце з ліпеня па лістапад 1944.

БОХАН Браніслаў Васільевіч, н. у 1908, яфрэйтар, на фронце са жніўня 1944 па красавік 1945.

2017©nasledie-sluck.by

БОХАНАВА Алёна Сідараўна, н. у 1911, партызанка атрада «Непераможны» Мінскай брыгады № 3 з верасня 1943 па ліпень 1944.

БРАГІН Аляксандр Ігнатавіч, н. у 1920, ст. сяржант, камандзір аддзялення, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй».

БРАНЯВІЦКІ Пётр Сямёнавіч, н. у 1891, генерал-маёр (1940), з 1941 камандзір вучэбнага атрада, камендант астравоў Паўночнага флоту, удзельнік абароны Савецкага Запаляр'я, узнагароджаны ордэнам Леніна (двойчы), трыма інш. ордэнамі і медалямі.

БРОДСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1913, начальнік асобага аддзела партызанскага атрада імя В.І. Чапаева, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БРУЙ Канстанцін Анісімавіч, н. у 1918, старшына роты, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

БУЗУН Васіль Андрэевіч, н. у 1926, радавы, на фронце з верасня 1944 па сакавік 1945.

ВАЙТОВІЧ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1906, радавы, на фронце са жніўня 1944 па май 1945.

ВАЛАБУЕЎ Кузьма Раманавіч, н. у 1915, капітан.

ВАЛАТОВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1922, радавы, на фронце з кастрычніка 1944 па май 1945, узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

ВАЛОГІН Рыгор Іванавіч, н. у 1919, партызан атрада № 755 брыгады імя І.В. Сталіна з верасня 1942 па ліпень 1944.

ВАСІЛЕВІЧ Іван Андрэевіч, н. у 1913, партызан атрада «25 гадоў Кастрычніка» брыгады імя К.К. Ракасоўскага з чэрвеня 1943 па ліпень 1944.

ВЕВЯЛЕЎ Зяма Усролавіч, на фронце з 1941.

ВЕВЯЛЕЎ Ісак Усролавіч, н. у 1923, скончыў ваеннае вучылішча ў 1941, лейтэнант, на фронце з 1942 па 1945, узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, многімі баявымі медалямі.

ВЕРНІКОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1917, сяржант 96-га кав. палка 5-й кав. дывізіі, на фронце з ліпеня 1941 па май 1945.

ВОЛКАЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1915, на фронце са снежня 1944 па май 1945.

ГАЛАГУЦКАЯ Марыя Сцяпанаўна, н. у 1918, у складзе эвакашпіталя № 1929 з верасня 1943 па сакавік 1944.

ГАЛАГУЦКІ Раман Фёдаравіч, н. у 1904, радавы, на фронце са студзеня па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна».

ГАЛЕНСОН Ізраіль Барысавіч, н. у 1901, радавы, на фронце з кастрычніка 1942 па сакавік 1945.

ГАЛУЗА Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1925, партызан атрада «Патрыёт Радзімы» брыгады імя К.Я. Варашылава. (Заслужаны будаўнік Беларусі. Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 431).

ГАРАДНІЧЫ Павел Майсеевіч, н. у 1925, на фронце з сакавіка па май 1945.

ГАРАЖАНКА Уладзімір Аляксеевіч, н. у 1925, мал. сяржант, на фронце са снежня 1944 па студзень 1945, узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

ГАРБАЧОЎ Васіль Майсеевіч, н. у 1908, ст. лейтэнант, на фронце з 1941 па 1945.

ГАРКАВЕНКА Анастасія Пятроўна, н. у 1915, партызанка атрада імя М. Астроўскага 225-й брыгады А.В. Суворава з чэрвеня 1943 па чэрвень 1944.

ГІЛЬ Міхаіл Фаміч, н. у 1919, старшына, на фронце з верасня 1942 па май 1945.

ГІТЭЛЬМАН Сроль Іцкавіч, н. у 1923, афіцэр, камандзір батарэі, на фронце з кастрычніка 1942 па май 1945.

ГЛІНІСТЫ Аркадзь Фёдаравіч, н. у 1913, сяржант, у складзе 595-га асобнага батальёна 14-й паветранай арміі, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

ГУК Антон Рыгоравіч, н. у 1897, сяржант, на фронце з верасня 1944 па май 1945.

2017@nasledie-sluck.by

ГУРКО Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1923, на фронце з чэрвеня 1942 па май 1945.

ГУТЦАЙТ Майсей Хацкелевіч, н. у 1898, радавы, на фронце са жніўня 1941 па 1945.

ДАБРОЎ Рыгор Аляксандравіч, н. у 1926, сяржант, на фронце са жніўня 1944 па май 1945, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

ДАВІДОВІЧ Леанід Пятровіч, н. у 1904, яфрэйтар, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

ДАВЫДЧЫК Мікалай Елісеевіч, н. у 1919, удзельнік сав.-фінляндскай вайны, ст. сяржант, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

ДАЙНЕКА Мікалай Аляксеевіч, н. у 1918, старшына, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

ДАЙНЯК Міхаіл Васільевіч, н. у 1912, радавы, на фронце са жніўня 1944 па люты 1945.

ДАРАСІНСКАЯ Сара Лазараўна, н. у 1912, партызанка атрада імя К.Я. Варашылава 161-й брыгады імя Катоўскага з мая 1942 па ліпень 1944.

ДЗМІТРЫЕЎ Віктар Міхайлавіч, н. у 1925, радавы, на фронце з верасня 1943 па май 1945.

ДЗЯЛЕНДЗІК Сяргей Міхайлавіч, н. у 1911, на фронце са снежня 1944 па май 1945, узнагароджаны медалём «За адвагу».

ДУБІНКА Вольга Кандрацьеўна, н. у 1918, медсястра эвакашпіталя са жніўня 1944 па май 1945, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

ДУБОВІК Арсеній Сідаравіч, н. у 1909, старшына, на фронце са жніўня 1941 па лістапад 1944.

ДУБОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1924, старшына, на фронце з кастрычніка 1942 па люты 1943.

ДУБРОЎСКАЯ Вольга Паўлаўна, н. у 1914, партызанка атрада імя М. Астроўскага 225-й брыгады імя А.В. Суворава з верасня 1943 па ліпень 1944.

ДУДЗІН Яўхім Іванавіч, н. у 1915, капітан, удзельнік вайны з Японіяй.

ДУХІН Якаў Маркавіч, н. у 1904, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

ЕРМАЛІЦКІ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1926, на фронце з ліпеня 1944 па май 1945.

ЖАЎРЫД Аляксандр Восіпавіч, н. у 1915, радавы, на фронце з 1943.

ЖГУН Мікалай Якімавіч, н. у 1927, радавы, на фронце з красавіка 1945.

ЖДАНОВІЧ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1912, ст. сяржант, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

ЖДАНОВІЧ Рыгор Дзмітрыевіч, н. у 1914, партызан атрада імя І.В. Сталіна Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы з мая 1943 па ліпень 1944.

ЖЛУКТЭНКА Уладзімір Афанасьевіч, н. у 1922, радавы, на фронце з верасня 1943 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна». (Заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 431).

ЖУК Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1921.

ЖЫЛІЧ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1923, радавы, на фронце са студзеня 1941 па май 1945.

ЗАБАГРЫН Вадзім Міхайлавіч, н. у 1922, капітан, на фронце з 1941 па 1945, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Ленінграда».

ЗАБЕЛА Міхаіл Хрысанфавіч, н. у 1907, яфрэйтар, на фронце з ліпеня 1941 па май 1945.

ЗАБРОДСКІ Антон Канстанцінавіч, н. у 1923, мал. лейтэнант.

ЗАЛАТЫ Аляксандр Іванавіч, н. у 1918, партызан, пам. нач. штаба 94-й партызанскай брыгады імя В.П. Чкалава з 1941 па 30.7.1944, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны».

ЗІНЕВІЧ Яўген Іванавіч, н. у 1922, партызан атрада імя Аляксандра Неўскага з чэр-

2017©nasledie-sluck.by

веня 1943 па ліпень 1944, мал. лейтэнант, на фронце са снежня 1944 па май 1945.

ЗЫК Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1923, партызан атрада імя С.М. Кірава 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе.

ІВАНІШЧАВА Вольга Антонаўна, н. у 1924, партызанка атрада імя Дз.Ц. Гуляева 101-й брыгады імя Аляксандра Неўскага з ліпеня 1943 па ліпень 1944.

ІВАХНЕНКА Пётр Іванавіч, н. у 1921, старшына, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

ІВАШКА Аляксандр Ігнатавіч, н. у 1902, радавы, на фронце са студзеня па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна».

ІЦКІН Макс Сямёнавіч, н. у 1902, генерал-маёр медыцынскай службы (1943), намеснік нач. санітарнага ўпраўлення Паўночна-Заходняга і Бранскага франтоў, нач. санітарнага ўпраўлення 2-га Прыбалтыйскага фронту, узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга (двойчы), Чырвонай Зоркі (двойчы), Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі. (Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 439).

КАЗАК Казімір Віктаравіч, н. у 1921, радавы асобага аддзела НКУС 237-й дывізіі 55-й арміі, на фронце з чэрвеня 1941 па верасень 1941.

КАЗЛОЎ Віктар Аляксеевіч, н. у 1926, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі. (Беларускі дзяржаўны дзеяч. Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 456).

КАЛЯДА Ганна Юльянаўна, н. у 1923, партызанка атрада імя А.В. Суворава з мая 1943 па ліпень 1944.

КАМАРОЎ Міхаіл Міронавіч, н. у 1914, радавы, шафёр, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За абарону Масквы», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

КАРАСЁЎ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1920, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАРЖЫНСКІ Іван Нічыпаравіч, н. у 1901, афіцэр, на фронце з чэрвеня 1942 па люты 1945.

КАРЭЦКІ Аляксей Іванавіч, н. у 1911, лейтэнант, на фронце з ліпеня 1941 па май 1945.

КАСПЯРОВІЧ Іван Пятровіч, н. у 1916, на фронце з верасня 1944 па люты 1945.

КАСТРАМІЦІНАЎ Анатоль Афанасьевіч, н. у 1915.

КЕНДЫШ Васіль Антонавіч, н. у 1926, радавы, санінструктар, на фронце з верасня 1944 па май 1945, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі».

КЛІМОВІЧ Пётр Васільевіч, н. у 1904, ст. сяржант, на фронце з 1942 па май 1945.

КЛЫГА Іван Канстанцінавіч, н. у 1916, партызан атрада Дунаева 27-й брыгады імя В.П. Чапаева з сакавіка 1944 па ліпень 1944.

КЛЯВЕЦ Адам Лук'янавіч, н. у 1899, радавы, на фронце з кастрычніка 1944 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна».

КОДЗЕ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1912, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945.

КОМЛІК Геральд Іосіфавіч, н. у 1927, старшына II стацці.

КОНЬШЫН Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1923, на фронце з красавіка 1943 па жнівень 1944.

КОРЗУН Павел Рыгоравіч, н. у 1899, радавы, на фронце – жнівень 1944.

КОСБЕРГ Ізраіль Арыевіч.

КРОТ Міхаіл Іванавіч, н. у 1912, партызан асобага атрада «Мясцовыя» (кам. Ваўпшасаў) з жніўня 1943 па ліпень 1944.

КРУК Васіль Васільевіч, н. у 1919.

КРЫЛОЎ Анатоль Фёдаравіч, н. у 1926, старшына, на фронце з чэрвеня 1944 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Кёнігсберга».

КУДЗЁЛКА Мікалай Мацвеевіч, н. у 1912, старшына, на фронце з ліпеня 1944 па май 1945.

2017©nasledie-sluck.by

КУЛІКОЎСКІ Гаўрыіл Яўстаф'евіч, н. у 1923, радавы, на фронце з 1944 па 1945.

КУМЕДКА Рыгор Навумавіч, н. у 1902, старшына, на фронце са жніўня 1944 па май 1945, узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

КУНЦЭВІЧ Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1920, яфрэйтар, на фронце з 1944.

КУПРЫЯНАВА Зінаіда Гаўрылаўна, н. у 1922, партызанка атрада імя М. Астроўскага 225-й брыгады імя А.В. Суворава з мая 1943 па чэрвень 1944.

КУР'ЯНОВІЧ Вільгельм Іванавіч, н. у 1922, афіцэр, на фронце з чэрвеня 1941 па верасень 1944, узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

КУТУМАЎ Аляксандр Аляксеевіч, н. у 1925, ст. лейтэнант, камандзір аўтароты, на фронце з ліпеня 1943 па май 1945, узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі» і інш.

ЛЕБЕДЗЕЎ Аляксандр Іванавіч, н. у 1915, ст. сяржант, тэлеграфіст-марзіст, камандзір аддзялення, на фронце з ліпеня 1941 па май 1945, узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй», знакам «Выдатны сувязіст» (1944).

Г.Я. Кулікоўскі

ЛІСТАПАД Цімафей Іванавіч, н. у 1899, радавы, на фронце з ліпеня 1944 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Кёнігсберга».

ЛОГІНАВА (ШКУРСКАЯ) Ядвіга Сцяпанаўна, н. у 1922, са жніўня 1944 па верасень 1945 у складзе эвакашпіталя № 1174.

ЛОГІНАЎ Сяргей Аляксеевіч, н. у 1923, партызан з верасня 1943 па ліпень 1944.

ЛОЙКА Пётр Іосіфавіч, н. у 1900, партызан атрада імя Ф.Э. Дзяржынскага брыгады імя М.В. Фрунзе з ліпеня 1943 па ліпень 1944.

ЛОПАНАВА Лідзія Барысаўна, на фронце з верасня 1943 па май 1945.

ЛУК'ЯНЕНКА Васіль Іванавіч, н. у 1925, старшына, на фронце з кастрычніка 1944 па май 1945, узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна».

ЛЮЦКО Яўхім Васільевіч, н. у 1920, радавы, на фронце з ліпеня 1944 па май 1945.

ЛЯВІЦІН Сёмха Міхілевіч, н. у 1919, на фронце, узнагароджаны медалямі «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй».

ЛЯМЕШЧАНКА Сяргей Дзмітрыевіч, н. у 1910, старшына, на фронце з лістапада 1942 па май 1945 (Герой Сацыялістычнай Працы. Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 422).

ЛЯТКОЎСКІ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1901, радавы, на фронце са жніўня 1944 па май 1945.

МАКАЕД Марыя Мікалаеўна, н. у 1925, прачка 35-га вясна-дарожнага атрада, на фронце са жніўня 1944 па май 1945, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

2017©nasledie-sluck.by

Вайна Марыі Макаед

… У 1939 годзе брат пайшоў служыць у армію. З Баранавіч у красавіку 1940 года прыслаў фотакартку: «На памяць роднай сястры Мані ад брата Мікалая ў час службы ў радах рабоча-сялянскай Чырвонай арміі». Там і сустрэў пачатак Вялікай Айчыннай вайны…

– З васямнаццаці хлопцаў, якіх забралі ў армію з нашай вёскі, вярнуўся толькі адзін Мікалай Давыдчык. «Коля, – плакала я, – скажы, дзе мой брат?» «Неўмацаваныя былі нашы рубяжы, – разважаў ён, – на пяць байцоў пяць куль выдавалі, як было выстаяць»… Так і не ведаю, дзе мой брацік ляжыць, ніякай вестачкі…

– Нашы Лядныя і ў пачатку вайны з двух бакоў палалі, і падчас вызвалення ў агні былі, – успамінае жанчына. – Дзетачкі, як страшна было!

Немцы абцягнулі вёску калючым дротам, ваеннапалонных гналі па дарозе – знясіленых, параненых. Бабулі нам гаварылі: «Дзеткі, занясіце ім хоць малака». І мы неслі. Выскачым да шашы, малако ў глячках паставім, хлеб пакладзём – і ўцякаем. З хлявоў праз шчыліны глядзім: салдацікі нагінаюцца, каб харчы ўзяць, а фашысты б'юць іх прыкладамі... Гітлераўцы трымалі ў вёсцы каля 280 савецкіх ваеннапалонных. Колькі ім, гарэтным, пакут выпала! Многае забыла, але той калючы дрот, той смурод ад здохлых коней, якімі кармілі вязняў, памятаю як сёння. Палонных чалавек па 10 выводзілі і расстрэльвалі… Моладзь вясковую прымусова забіралі ў Германію. І мне загадалі прыбыць у Семежава на зборны пункт, але дырэктар школы заступіўся за мяне (ён за перакладчыка быў), сказаў, што я сірата. У Заняведамцы мая цётка жыла, я да яе цішком бегала. Яе сын, мой дваюрадны брат, быў у партызанах, незадоўга да наступлення нашых войскаў перадаў, што вось-вось вызваленне будзе, так што жылі мы чаканнем і надзеяй. Памятаю, як самалёты ляцелі, бомбы падалі. Аднавяскоўцы крычаць: «Ура! Нашы!» Калі я даведалася, што набіраюць на фронт, папрасіла брыгадзіра: «Цётка Волька, пішыце мяне!» Яна расплакалася: маўляў, не падымаецца рука сіраціну запісаць. А я настойвала: хто ж, як не я, за брата адпомсціць, – мужна варушыць памяць Марыя Мікалаеўна. – У Баранавічах прысягу прымалі. Прачкай я была ў сапёрным батальёне. Трэба ж было некаму і бялізну мыць, чысціню наводзіць, ад паразітаў ратаваць. Адпачынку не было: баі, выбухі снарадаў, бомбаў. Рукі параз'ядае содай – мне салдацік дапамагае, а я тады на кухню памочніцай іду. Аднойчы везлі абед байцам на другі бераг, а тут паветраны бой паміж нашымі і нямецкімі самалётамі пачаўся, бомбы пасыпаліся – адна побач з намі ўпала, але, на шчасце, не разарвалася – хтосьці з нас шчаслівы быў. Прага, Одэр, Берлін – гэта не проста геаграфія для мяне, а цэлае жыццё.

З даведкай пра тое, што тэрмін яе службы ў воінскай часці ў якасці дарожнага рабочага скончыўся 30 чэрвеня 1945 года, Марыя Мікалаеўна дабралася да родных мясцін. Але пабыла на Случчыне нядоўга: спачатку «завербавалася» ў Свярдлоўск – працавала ў Верхпышме, потым – на бетонным заводзе ў Архангельску. Да медаля «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», ордэна Айчыннай вайны II ступені, медалёў

2017©nasledie-sluck.by

Жукава і «Ветэран вайны» далучыўся медаль «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна»...

Так склаўся лёс: вярнулася Марыя Мікалаеўна ў Слуцк, працавала ў будаўнічай арганізацыі, да многіх аб'ектаў «прыклала руку»...

В. Ражанец.
Друкуецца ў скарачэнні.
Слуцкі край. 2010. 2 красавіка.

МАЙЗЕЛЬ Зэлік Файвелевіч, н. у 1901, афіцэр медыцынскай службы, на фронце з 1943 па 1944.

МАНДЗІЧ Іван Емяльянавіч, н. у 1919, мал. сяржант, на фронце з 1941 па 1945 у 146-й гарматна-артылерыйскай брыгадзе, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

МАРГУН Пётр Уласавіч, н. у 1922, ст. лейтэнант, на фронце з кастрычніка 1941 па люты 1945.

МАРОЗАЎ Васіль Кузьміч, н. у 1919, мал. тэхнік-лейтэнант, на фронце з чэрвеня 1941 па май 1945, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За ўзяцце Кёнігсберга».

МАРУГАВА Антаніна Фёдараўна, н. у 1925, старшына, на фронце з лютага 1943 па май 1945, узнагароджана медалём «За ўзяцце Будапешта».

МАРЫН Ілья Афанасьевіч, н. у 1918, старшына, на фронце са жніўня 1941 па ліпень 1943.

МАСАРСКІ Абрам Давыдавіч, н. у 1901, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалём «За адвагу» і інш.

МАСКАЛЁЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1926, партызан 4-га атрада брыгады Дзячкова, 2-й Беларускай партызанскай брыгады імя П.К. Панамарэнкі з 1943 па 1944, з 1944 на фронце ў складзе зенітна-артылерыйскага палка, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Ад'ютант камандзіра

Жыхару нашага горада, Фёдару Іванавічу Маскалёву, было ўсяго 15 гадоў, толькі скончыў сямігодку, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Чацвёра яго старэйшых братоў пайшлі абараняць Радзіму, а ён з бацькамі застаўся дома, у роднай вёсцы Фралова Віцебскай вобласці.

– Ужо ў тым узросце я разумеў, што нельга мірыцца з ворагам, сядзець склаўшы рукі, – успамінае Фёдар Іванавіч. – Таму ўсялякімі шляхамі спрабаваў папасці ў партызаны. Праз два тыдні мяне забралі капаць процітанкавыя рвы, а потым адправілі дамоў. Праз нашу вёску адступала Кіраваградская дывізія, вайскоўцы пакінулі свае падводы. Я знайшоў боепрыпасы, але не разгубіўся, схаваў іх у надзейнае месца. Там было шмат вінтовак, скрынак з патронамі, гранатамі.

У канцы 1941 года ў Беларусі разгарнуўся партызанскі рух. Партызаны грамілі нямецкія і паліцэйскія гарнізоны, знішчалі камендатуры, пускалі пад адхон эшалоны, мініравалі дарогі. Фёдар як мог дапамагаў ім і разведчыкам. Праз некаторы час аддаў і прыхаваную зброю. За гэта яму паабяцалі, што возьмуць у партызанскі атрад. І толькі ў 1943 годзе, калі фашысты блакіравалі Шчалбоўскія лясы,

2017©nasledie-sluck.by

дзе знаходзілася вялікая партызанская база, Фёдара залічылі ў 4-ы атрад брыгады Дзячкова. Колькі ў яго было радасці калі за плячамі з'явіўся карабін! Падчас адной з разведвальных аперацый разам з сябрам Аляксеем наткнуліся на адпачываючых немцаў. Іх увагу прыцягнулі коні, якія пасвіліся непадалёку. Хлопчыкі апрануліся ў адзенне вясковых дзяцей і кожны дзень хадзілі даглядаць жывёл. А праз некаторы час на самых лепшых конях паскакалі ў свой атрад.

– Нямецка-фашысцкія захопнікі бязлітасна распраўляліся з мірным насельніцтвам. Зганялі людзей у хлявы і палілі іх. На працягу двух тыдняў партызаны вялі цяжкія баі, – працягвае Ф.І. Маскалёў.

Колькі разоў яму, хлопчыку, прыходзілася здымаць шапку перад трупамі суайчыннікаў! Ён сталеў, станавіўся больш жорсткім. Асабліва калі ў адным з лясоў, дзе прайшлі карнікі, знайшоў свайго забітага бацьку.

Праз некаторы час брыгада Дзячкова была расфарміравана. Федзю залічылі ў 2-ю Беларускую партызанскую брыгаду імя П.К. Панамарэнкі. Мужнага хлопца назначылі ад'ютантам камандзіра 4-га атрада. Нягледзячы на свой юны ўзрост, ён быў добрым памочнікам, не сядзеў без справы: удзельнічаў у баях, хадзіў у разведку, пранікаў у нямецкія гарнізоны і здабываў каштоўныя звесткі.

У верасні 1943 года партызанскія атрады напалі на буйны нямецкі гарнізон у вёсцы Дуброва. Але не ўсе атрады своечасова занялі свае пазіцыі, а карнікі сустракалі партызан агнём. 4-ы атрад пад ліўнем куль падняўся ў атаку. Федзю раніла, а камбрыга – кантузіла. «Не бойся тых куль, што ляцяць, а бойся тых, што шыпяць», – гаварыў камандзір брыгады свайму ад'ютанту, якога любілі не толькі партызаны, але і мясцовыя жыхары.

Напрыканцы 1943 года атрад злучыўся з часцямі Чырвонай арміі. Спачатку Федзю назначылі байцом знішчальнага атрада райкама партыі. Але ён рваўся на фронт. У 1944 годзе ў складзе зенітна-артылерыйскага палка абараняў Рыгу ад бамбёжак, быў залічаны на адзін з караблёў Балтыйскага флоту. Там жа і скончыў электрамеханічную школу. У 70-х гадах мінулага стагоддзя рашэннем ЦК камсамола Беларусі за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, залічаны ганаровым членам «батальёна» беларускіх арлянят.

І. Каваленка.

МАСКВІН Мікалай Пракофьевіч, н. у 1925, сяржант, удзельнік вайны з Японіяй, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Японіяй».

МАТУСЕВІЧ Савелій Іванавіч, н. у 1912, партызан атрада імя Аляксандра Неўскага 25-й брыгады імя П.К. Панамарэнкі.

МАЦВЕЕВА Марыя Якаўлеўна, н. у 1924, ст. стрэлачнік з ліпеня па кастрычнік 1944.

Не думаў, што гэта была наша апошняя сустрэча. Як потым людзі расказвалі, Анціка прывезлі ў Грэск, у нямецкую (ці паліцэйскую) камендатуру і аббінавацілі ў карыстанні радыёпрыёмнікам, што строга забаранялася. Усе радыёпрыёмнікі людзі павінны былі здаць нямецкім уладам. Анцік жа карыстаўся ім. Прыёмнік быў хітра схаваны ў сабачай будцы, а дрот, па якім бегаў сабака, служыў антэнай. Пасля допыту Анціку сказалі:

– Можаш ісці.

Анцік павярнуўся і пачаў спускацца па ступеньках з другога паверху. І тут яму ў спіну выстралілі. З гарачкі Анцік кружануўся, зверам прыгнуў уверх па ступеньках і схапіў паліцэйскага за горла. Але падскочыў другі паліцай і рэзкім ударам пісталета па галаве абвалiў Анціка на падлогу. І пачалося дабіванне. Так расказвалі самі паліцаі ў Грэску, а людзі пераказалі нам. І не стала майго вернага друга Анціка.

Слуцкі край. 2005. 4 чэрвеня.

2017©nasledie-sluck.by

ПАЎСТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КУБЛІШЧА

МАХНОВІЧ Любоў Уладзіміраўна, н. у 1942, расстраляна 17.6.1943 разам з дарослымі, якія не выканалі загад нямецкіх улад па хлебанарыхтоўках і грашовых падатках.

РАМАНЕНЯ Ніна Іванаўна, н. у 1942, расстраляна 17.6.1943 разам з дарослымі, якія не выканалі загад нямецкіх улад па хлебанарыхтоўках і грашовых падатках (Спіс расстраляных гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 1. С. 430–431).

ВЁСКА РАБАК

ЧЫРСКІ Аляксандр Арцёмавіч, н. у 1925, партызан атрада імя С.М. Кірава, загінуў 17.6.1944 у в. Шчыткавічы.

ЯКАЎЛЕЎ Арфей (Арафей) Цімафеевіч, н. у 1892, партызан атрада імя С.Г. Лазо 64-й брыгады імя В.П. Чкалава, загінуў 27.8.1943, пахаваны ў в. Рабак.

ПЕРШАМАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БЛОХАЎСКІ ЛЕС

ІВАНОВІЧ Іван Кузьміч, н. у 1922, партызан атрада імя Ф.Э. Дзяржынскага 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе, загінуў 17.2.1944, пахаваны ў Блохаўскім лесе.

КУЗНЯЦОЎ Міхаіл Пятровіч, н. у 1910 у Добрынскім раёне Разанскай вобласці, партызан атрада імя С.М. Кірава 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе з лістапада 1942, загінуў 9.6.1944 (падарваўся на міне на шашы Асіповічы – Бабоўня).

ТАРАН Міхаіл Васільевіч, н. у 1919, партызан атрада імя Ф.Э. Дзяржынскага 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе, загінуў 18.1.1944 у Блохаўскім лесе, дзе і пахаваны.

ВЁСКА АСТРАВОК

ШАРЭШЫК Аляксей Паўлавіч, партызан, загінуў.

ШАРЭШЫК Рыгор Паўлавіч, партызан, загінуў.

«У Вёсцы Астравок жыла Матрона Іосіфаўна Шарэшык. Яна выгадавала і выхавала дзесяць дзяцей. Пры вялікай сям'і вельмі многа складаецца цяжкасцей. Усіх трэба накарміць, абуць, адзець. І вось грымнула Вялікая Айчынная вайна. Узялі зброю, сталі на абарону Радзімы шасцёра дзяцей Матроны Шарэшык. З іх чацвёра былі ў партызанах.

Чатыры браты не вярнуліся ў бацькоўскі дом. Загінулі Аляксей, Рыгор, Іван і Уладзімір Шарэшыкі. Апошнія двое загінулі пры вызваленні Польшчы ад фашысцкіх захопнікаў».

І. Арцёменка, былы камісар партызанскага атрада імя С.М. Кірава.

ВЁСКА БЕРАЗІНЕЦ

БУЛЫНКА Хвядора Гаўрылаўна, н. у 1902, спалена з іншымі жыхарамі вёскі 23.2.1943 у час карнай аперацыі.

КАЛЯДА, расстраляна 23.2.1943 у час карнай аперацыі.

ВЁСКА ГОЛЬЧЫЦЫ

ІВАШКЕВІЧ Януш, н. у 1879, расстраляны фашыстамі 6.8.1944 у Варшаве (Гісторык, прафесар. Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 446).

ВЁСКА ЖЫЛІН БРОД

АСТАПАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1919, партызан атрада імя М.А. Астроўскага 225-й брыгады імя А.В. Суворава, загінуў 5.3.1944 каля х. Трэпы, пахаваны ў в. Жылін Брод.

КАЛЬЦЕНСОН, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў брацкай магіле.

ЛЯХ Дзмітрый Мітрафанавіч, н. у 1918, партызан атрада імя М.А. Астроўскага 225-й брыгады імя А.В. Суворава, загінуў 5.9.1943, пахаваны ў в. Жылін Брод.

СВІНЦІЦКІ Рыгор, партызан групы «Іваныча» 225-й брыгады імя А.В. Сувора-

2017©nasledie-sluck.by

Скульптура партызана ў в. Жылін Брод на партызанскіх могілках

ва, загінуў у 1943, пахаваны ў брацкай магіле каля в. Жылін Брод.

ВЁСКА КАЛЬЧЫЦЫ

СТРАХОВІЧ Аляксандр Герасімавіч, н. у 1927, партызан атрада імя М.В. Фрунзе 225-й брыгады імя А.В. Суворава, загінуў 29.2.1944, пахаваны ў в. Кальчыцы.

ВЁСКА ПАЛІКАРАЎКА

ГАПОН Генадзь Іванавіч, н. у 1926, партызан атрада імя М.В. Фрунзе 225-й брыгады імя А.В. Суворава, загінуў 29.11.1943 (29.2.1944), пахаваны ў в. Палікараўка.

ЦВІРКО Іосіф Лук'янавіч, н. у 1922, партызан атрада імя М.В. Фрунзе 225-й брыгады імя А.В. Суворава, загінуў 29.2.1944, пахаваны ў в. Палікараўка.

ВЁСКА ПЕРАХОДЫ

АМБРАЖЭВІЧ Мікалай, смяротна паранены фашыстамі ў час карнай аперацыі 23.2.1943, памёр ад ран.

БЕРАЗОЎСКІ Ігнат Ігнатавіч, н. у 1924, радавы, партызан атрада імя С.М. Кірава 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе, загінуў 17.6.1944 у разведцы ў в. Шчыткавічы, пахаваны ва ўрочышчы Клетнае Старадарожскага раёна.

ГАЛЯС Аляксандр Барысавіч, н. у 1911, партызан атрада імя С.М. Кірава, загінуў 13.8.1943, пахаваны ў в. Румашова Уздзенскага раёна.

ВЁСКА СТРОХАВА

НАРОНСКІ Аляксандр, загінуў 10.9.1941, пахаваны на вясковых могілках.

ЦІШКЕВІЧ Аляксей Васільевіч, забіты ў снежні 1942.

ВЁСКА ШАНТАРОЎШЧЫНА

ГАЛАВЕНКА Сяргей Піліпавіч, н. у 1921, партызан атрада імя К.К. Ракасоўскага 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе, загінуў 10.5.1944, пахаваны ў лесе каля в. Шантароўшчына.

ПАРОНІН Іван Екіндзеевіч, н. у 1906, партызан атрада імя К.К. Ракасоўскага 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе, загінуў 19.4.1944, пахаваны ў лесе каля в. Шантароўшчына.

ПОКРАШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АДАМОВА

БУЛЫНКА (жонка Андрэя Мартынавіча БУЛЫНКІ), спалена карнікамі разам з дзецьмі 23.2.1943.

БУЛЫНКА, сын.

БУЛЫНКА, сын.

БУЛЫНКА, сын.

БУЛЫНКА, дачка.

БУЛЫНКА Міхаіл Андрэевіч, расстраляны карнікамі 23.2.1943.

2017©nasledie-sluck.by

КАЗЮЧЫЦ Васіль Раманавіч, н. у 1901, партызан, загінуў 21.12.1943, пахаваны ў лесе каля вёскі.

ЦВІРКА Анастасія Баляславаўна.

ЦВІРКА Ніна Сцяпанаўна.

ШАШОК Пётр Ісакавіч, н. у 1923, партызан, загінуў у 1944, пахаваны ў лесе каля вёскі.

ВЁСКА АНУФРЫЕВІЧЫ

КОБЕЛЬ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1913, партызан атрада імя С.М. Кірава, загінуў у баі з карнікамі 11.3.1944 каля в. Застарычы, пахаваны на брацкіх могілках ва ўрочышчы Клетнае Старадарожскага раёна.

ВЁСКА ЗАМОСЦЕ

МУКАСЕЙ Самуіл, загінуў у гета ў Капылі.

МУКАСЕЙ Сара, загінула ў гета ў Капылі (дзядуля і бабуля вядомага разведчыка, прафесара Акадэміі праблем бяспекі, абароны і правапарадку РФ М.І. Мукасея).

ВЁСКА ЛЕНЬКІ

ЗАЯЦ Віктар Міхайлавіч, н. у 1914, у раёне в. Ленькі 8.8.1941 узяты ў палон, з кастрычніка 1941 перамешчаны ў шталаг 13Б, дзе выкарыстоўваўся ў рабочай камандзе Флосенбург, у верасні 1942 пераведзены ў лагер палонных Маўтхаўзен Гузен (Аўстрыя), дзе і памёр 22.10.1942.

РАЧКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЯДНА

ДАВЫДЧЫК (ДАВЫДЧАНКА) Уладзімір Макаравіч, н. у 1910, узяты ў палон 5.5.1942 у час правядзення паліцэйскай акцыі, памёр 17.2.1943 у лазарэце шталага 1Б (Хохенштайн, лагер знаходзіўся ў в. Крулікага, цяпер г. Альштынак Вармінска-Мазурскага ваяв., Польшча). Пахаваны на інтэрнацыянальных могілках у в. Судва за 2,5 км ад самога лагера.

ВЁСКА ТАНЕЖЫЦЫ

БАБАРЫКА Васіль Трафімавіч, расстраляны 23.10.1943 за сувязь з партызанамі.

КАНАВАЛАЎ Валянцін Іванавіч, мал. лейтэнант, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

КУНЧЭЎСКІ Міхаіл Іванавіч, нам. дырэктара па палітычнай частцы Танежыцкай МТС, расстраляны за сувязь з партызанамі вясной 1942 па дарозе ў Чырвоную Слабаду.

ВЁСКА ЧАПЛІЧЫ

МАСЛЯНСКАЯ Любоў, н. у 1936.
МАСЛЯНСКАЯ Моталь, н. у 1914.
МАСЛЯНСКАЯ Роза, н. у 1939.
МАСЛЯНСКАЯ Фіра, н. у 1938.
МАСЛЯНСКІ Зяма, н. у 1936.
МАСЛЯНСКІ Ісраэль, н. у 1912.
ОНГЕЙБЕРГ Ася, н. у 1888.
ОНГЕЙБЕРГ Малка, н. у 1913.
ОНГЕЙБЕРГ Міхаэль, н. у 1880.
ОНГЕЙБЕРГ Моталь, н. у 1878.
ОНГЕЙБЕРГ Сіма, н. у 1927.
ОНГЕЙБЕРГ Соф'я, н. у 1922.
ОНГЕЙБЕРГ Хайм, н. у 1917.
УНХАБЕР.

СОРАГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВОЛАШАВА

АНОЦКІ Андрэй Майсеевіч, н. у 1908.

БАЛВАНОВІЧ Аляксандр І., н. у 1890.

ЖЫГАЛКОВІЧ Генадзь Вікенцьевіч, н. у 1888.

КАВАЛЬСКІ Баляслаў Пятровіч, партызан, загінуў у 1941, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

ЛОБАН Макар Сафронавіч, партызан, загінуў у 1941, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

МАНЦУР Стэфан Васільевіч, н. у 1905.

ПАШКЕВІЧ Уладзімір Раманавіч, партызан, загінуў у 1941, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

2017©nasledie-sluck.by

ХАЎСТОВІЧ Канстанцін Палікарпавіч, партызан, загінуў у 1941, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

ВЁСКА КРУГЛАЕ

ЛАПКОЎСКАЯ Любоў Ал., н. у 1934.

ВЁСКА СОРАГІ

БАРСУК Міхаіл, у лютым (?) 1943 быў схоплены фашыстамі і знаходзіўся ў слуцкай турме, потым адпраўлены ў Германію на прымусовыя работы, па дарозе каля Варшавы быў забіты пры здзяйсненні ўцёкаў.

ДУБОВІК Аляксандр, у лютым (?) 1943 быў схоплены фашыстамі і знаходзіўся ў слуцкай турме, потым адпраўлены ў Германію на прымусовыя работы, па дарозе каля Варшавы здзейсніў уцёкі, прапаў без вестак.

КАПЦЭВІЧ Міхаіл, у лютым (?) 1943 быў схоплены фашыстамі і знаходзіўся ў слуцкай турме, потым адпраўлены ў Германію на прымусовыя работы, па дарозе каля Варшавы быў забіты пры здзяйсненні ўцёкаў.

СЯРАЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРАНАВІЧЫ

КРЫВАДУБСКІ Іван Іванавіч, н. у 1902, загінуў пры адступленні немцаў у чэрвені 1944.

КРЫВАДУБСКІ Парфілій Захаравіч, н. у 1867, загінуў пры адступленні немцаў у чэрвені 1944.

КРЫВАДУБСКІ Пётр Пятровіч, н. у 1931, загінуў пры адступленні немцаў у чэрвені 1944.

ЛІСТАПАД Мацвей, н. у 1902.

ВЁСКА ЛУЧНІКІ

КОРЗУН Андрэй, н. у 1880, загінуў пры адступленні немцаў у чэрвені 1944 года.

САВАНОВІЧ Сямён Пятровіч, н. у 1924.

САВАНОВІЧ Ларыса Рыгораўна, н. у 1942, загінула пры адступленні немцаў у чэрвені 1944.

Падрыхтавала В.С. Відлога.

Воіны Чырвонай арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні Слуцка і Слуцкага раёна і пахаваны на іх тэрыторыі

ГОРАД СЛУЦК

АНІКЕЕЎ Ягор Міхайлавіч, н. у 1919, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле на гарадскіх могілках.

БАРАЎКО, механік-вадзіцель (1-ы механізаваны корпус), загінуў у баі за вызваленне Слуцка на паўднёвай ускраіне горада 29 (30) (?) чэрвеня 1944.

ГАВЕНКА Сямён Іванавіч, н. у 1902, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле на гарадскіх могілках.

ВЯРШЫНІН Мікалай Васільевіч, н. у 1905, капітан, загінуў у 1941.

ДАЛАБЕШКІН Іван Сямёнавіч, н. у 1919, радавы, загінуў у 1944.

ДЗЕВАНХАДЖАЕЎ Ахрам, радавы, загінуў у 1944.

ДЗЕМЧАНКА Канстанцін Мікалаевіч, інтэндант 3-га рангу мотастралковага палка 113-й СД, служыў у Слуцку, прапаў без вестак у 1941.

ЗАВАЛУНОЎ Ільязар Рахманавіч, н. у 1924, радавы, загінуў 29.6.1944.

ІВАНЕНКА Рыгор Фёдаравіч, н. у 1913, загінуў у 1944, пахаваны на гарадскіх могілках ў брацкай магіле.

ІВАНОЎ Мікалай Пятровіч, н. у 1915, капітан, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле на гарадскіх могілках.

КОЛІУХ Іван Паўлавіч, ст. сяржант, загінуў у 1944.

2017©nasledie-sluck.by

КОШАЛЕЎ, камандзір дывізіёна, загінуў у канцы чэрвеня 1944.

КРЫНІЦКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1921 у в. Прыхідзькі Піpацінскага р-на Палтаўскай вобл. У 1939–41 служыў у Слуцку ў 1-й роце 1-га бат. 228-га стралковага палка. Прапаў без вестак у 1941.

ЛУКІЕНКА Андрэй Парфенцьевіч, н. у 1908, радавы, загінуў у 1944.

МАРФІЯНСКІ Мікалай Кузміч, н. у 1924, радавы, загінуў у 1944.

НАБОТКІН Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1920, радавы, загінуў у 1944, пахаваны на гарадскіх могілках у брацкай магіле.

НУРДАС Павел Паўлавіч, радавы, загінуў у 1944, пахаваны на гарадскіх могілках у брацкай магіле.

ПАНКРАТАЎ Васіль Мікітавіч, н. у 1919, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле на гарадскіх могілках.

ПАРЦІХАЎ Мікалай, загінуў у 1944, пахаваны на гарадскіх могілках у брацкай магіле.

РАМАНЬКО Фёдар Палікарпавіч, н. у 1912, радавы, загінуў у 1944, пахаваны на гарадскіх могілках у брацкай магіле.

САРАХУНЯН, механік-вадзіцель самаходкі «Аляксандр Матросаў» (1-ы механізаваны корпус), загінуў у баі за Слуцк на паўднёвай ускраіне горада 29 (30) (?) чэрвеня 1944.

СУРЭНКАЎ Іван Андрэевіч, н. у 1902, загінуў у 1944, пахаваны на гарадскіх могілках у брацкай магіле.

ФРАНКО, танкіст (1-ы механізаваны корпус), загінуў у баі за Слуцк на паўднёвай ускраіне горада 29 (30) (?) чэрвеня 1944.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА СЕЛІШЧА

БЕДРОЎ А.П., лейтэнант, пахаваны ў брацкай магіле.

ЗЯЦЕЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1924, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле.

Помнік воінам-вызваліцелям на могілках в. Амговічы

ХАРЫБІН А.М., ст. сяржант, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле

АМГОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АМГОВІЧЫ

БОРШЧ Іван Фёдаравіч, радавы, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

ВЁСКА ГУТНІЦА

АРАНОВІЧ Аляксандр Казіміравіч, пахаваны на вясковых могілках.

ВЁСКА НОВЫ ГУТКОЎ

КУДРАШОЎ, загінуў у 1944, пахаваны на могілках у в. Новы Гуткоў у брацкай магіле.

2017©nasledie-sluck.by

ГАЦУКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕЛАЯ ЛУЖА

ЕЎСЦІГНЕЕЎ А., ст. лейтэнант, загінуў, пахаваны ў в. Белая Лужа на вясковых могілках.

ЖОГАЛЕЎ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1923, старшына, загінуў 1.4.1944, пахаваны ў брацкай магіле.

ЯЧНІКАЎ А., загінуў, пахаваны ў брацкай магіле.

ГРЭСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ШЫШЧЫЦЫ

ПІСКУНОЎ, ст. лейтэнант, камандзір батарэі 658-га арт. палка, загінуў 25.6.1941, пахаваны на ўскрайку в. Шышчыцы.

ЗНАМЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРОК

СІРОЦІН Павел, чырвонаармеец, загінуў у 1941, пахаваны ў в. Барок на вясковых могілках.

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЯ СЛІВА

РУСАКОЎСКІ Андрэй, радавы, загінуў, пахаваны на вясковых могілках.

ВЁСКА ДАЛЬНІЯ БАНДАРЫ

Воіны 37-й механізаванай брыгады, якія былі цяжка паранены ў баях за вызваленне Случчыны і памерлі ад ран у 558-м асобным медыка-санітарным батальёне. Пахаваны ў в. Дальнія Бандары.

АРАКЧЭЕЎ Уладзімір Васільевіч, радавы, памёр 2.7.1944.

БУРЛАКОЎ Васіль Іванавіч, радавы, памёр 3.7.1944.

ЕГУПАЎ Іван Іванавіч, мал. камандзір, памёр 6.7.1944.

ДЗЕРГАЧОЎ Мікалай Аляксеевіч, радавы, памёр 6.7.1944.

КАПАКОЛЬЦАЎ Іван Цімафеевіч, радавы, памёр 2.7.1944.

СМІРНОЎ Мікалай Сяргеевіч, мал. камандзір, памёр 7.7.1944.

ВЁСКА ПАДЗЕРСКІЯ АГАРОДНІКІ

ШМЯЛЁЎ Пётр Ільіч, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КІРАВА

АСТАПЧУК Емяльян Раманавіч, н. у 1924, загінуў у 1944.

БАРОЎСКІ Аляксандр Кірылавіч, н. у. 1916, ст. лейтэнант, загінуў у 1944.

ЛЕНІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЕНІНА

ТРУСЕВІЧ Ігар Іванавіч, н. у 1925, сяржант 37-й мех. брыгады, загінуў 2.7.1944.

ПЕРШАМАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЖЫЛІН БРОД

АСТАПАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1919, загінуў у 1944.

АСТРОЎСКІ Іван Пятровіч, н. у 1913, загінуў у 1944.

ПОКРЫШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЕНЬКІ

ВАСІЛЬЕЎ Л.І.

ГРЭБНЕЎ І.А., н. у 1910, памёр ад ран у 1945.

ВЁСКА ЯЧАВА

ЗДЗЯРУК Васіль Мітрафанавіч, н. у п. Пескі Данецкай вобл., памёр ад ран 1.7.1944, пахаваны ў в. Ячава.

2017©nasledie-sluck.by

Маці В.М. Здзерука на магіле загінуўшага сына ў в. Ячава. Фота 1967 г.

Магіла В.М. Здзерука ў в. Ячава. Фота 1960-х гадоў

РАЧКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯЛЕВІЧЫ

САХНЕНКА А.С., загінуў у 1944, пахаваны ў в. Бялевічы на вясковых могілках.

ВЁСКА КАВЕРЖЫЦЫ

ІЛЬНІЧУК Іван Якаўлевіч, радавы, загінуў у 1944.

ВЁСКА ЛЯДНА

АТРАКОЎ Павел Піліпавіч, радавы, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле каля дарогі Слуцк – Брэст.

БАНДАРЭНКА Сямён Фёдаравіч, н. ў 1913, ст. лейтэнант, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле каля дарогі Слуцк – Брэст.

БАНДУРА Аляксандр Васільевіч, мал. сяржант, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле каля дарогі Слуцк – Брэст.

КАЛМЫКОЎ Цімафей Дзмітрыевіч, н. ў 1910, радавы, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле каля дарогі Слуцк – Брэст.

КУРАПЕЙ Давыд Пейсахавіч, загінуў у 1941, пахаваны ў в. Лядна на вясковых могілках.

ФУРСАЎ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1922, мал. лейтэнант, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле каля дарогі Слуцк – Брэст.

ХОСЫД Яфім Нісанавіч, загінуў у 1941, пахаваны ў в. Лядна на вясковых могілках.

ЯНЧУР Мікалай Паўлавіч, н. у 1907, лейтэнант, загінуў у 1944, пахаваны ў брацкай магіле каля дарогі Слуцк – Брэст.

ВЁСКА МАЛЫШЭВІЧЫ

ГАЯК А.Х., загінуў пры вызваленні вёскі ў 1944, пахаваны на вясковых могілках.

2017©nasledie-sluck.by

Воіны-землякі, якія загінулі або прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў нямецкіх лагерах смерці

ГОРАД СЛУЦК

АЛЕШКА Яўтен Сцяпанавіч, н. у 1919, загінуў 18.12.1941.

АРТАМОНАЎ Рыгор, н. у 1926, загінуў у канцлагеры Дахау.

БАЛЬШАКОЎ Васіль Іванавіч, н. у 1911, ст. палітрук у складзе 387-й стралк. дыв., прапаў без вестак 14.8.1942 у с. Мяднінцава Ульянаўскага р-на Арлоўскай вобл.

БІРЫЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1919, загінуў.

БЛОХ Фран Ігнатавіч, н. у 1911 (магчыма, у Слуцкім р-не), ст. лейтэнант, ваенны лётчык, загінуў 12.9.1943 у катастрофе самалёта Р-39 «Аэракобра» пры перагонцы самалётаў «Аляска – Сібір», пахаваны ў с. Тамтор Аймяконскага улуса (Якуція). На месцы пахавання ўстаноўлены помнік.

БУРНІСТРАЎ Георгій Іванавіч, н. у 1903, афіцэр, прапаў без вестак у 1941.

ВІСЛАУСАЎ Іван Мікітавіч, н. у 1909, ст. лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

ГАЛІНСОН Давід Кардухавіч, н. у 1918, лейтэнант, прапаў без вестак 15.7.1941.

ГАРШАВЕНКА Аляксей, загінуў.

ГЕРМАН Лейба, н. у 1911, загінуў у палоне (№ 469536).

ГІНТАЎТ Іван Міхайлавіч, радавы 46-га гв. сп., загінуў 22.1.1945, пахаваны ў г. Чарняхоўск.

Я.С. Алешка

В.І. Бальшакоў

ГІНТАЎТ Іван Міхайлавіч, радавы, загінуў, пахаваны ў г. Азерск.

ГІНТАЎТ Мікалай Іванавіч, н. у 1911, радавы 291-га гв. сп., загінуў 25.10.1944, пахаваны ў пас. Бабушкіна Несцераўскага р-на.

ГІРЭЛЬ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1914, радавы 152-га гв. сп., загінуў 16.1.1945, пахаваны ў пас. Фурманава Гусеўскага р-на.

ГЛАДКІ Георгій Вячаслававіч, н. у 1922, лейтэнант, загінуў 17.7.1943.

ГУРЫНОВІЧ Юрый Арсенавіч, н. у 1914, тэхнік-інтэндант 1-га рангу, загінуў 10.9.1942.

ГУСЕЎ Аляксей, афіцэр-пагранічнік, загінуў у 1941.

ДАЛМАТОЎСКІ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1923, мал. лейтэнант, загінуў 28.12.1943.

ЁРШ Генадзь Іванавіч, н. у 1925, загінуў у палоне 14.11.1941 (№ 490839, Auschwitz).

2017©nasledie-sluck.by

ЗАЯЦ Уладзімір Пятровіч, н. у 1918, радавы, загінуў у палоне 23.2.1942 (Зарау).

КАЛАТУХІН Аляксандр Нікічыпавіч, н. у 1916, мал. лейтэнант, прапаў без вестак у 1943.

КАЛПІЧУК Рыгор Селіверставіч, н. у 1911, загінуў у палоне (№ 470096).

КАНДРАЦЕНКА Рыгор Юр'евіч, н. у 1913, лейтэнант, прапаў без вестак 1.7.1942.

КІПРЫЯНОВІЧ (КУПРЫЯНОВІЧ) Пётр, н. у 1910, загінуў у канцлагеры Дахау.

КЛІМАНАЎ Дзмітрый Сцяпанавіч, н. у 1910 (?), лейтэнант, на фронце з 1941, загінуў 6.10.1944 у Літве (Акляны).

КЛЯЗОВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1916, чырвонаармеец, трапіў у палон у г. Баранавічы ў ліпені 1941, загінуў у палоне 17.11.1941 (№ 395985), пахаваны ў Вайтхайме.

КЛЯШЭВІЧ Мікалай Мітрафанавіч, н. у 1905, капітан, нам. начальніка АА НКУС 1-й мех. брыгады 1-й ТА Варонежскага фронту, прапаў без вестак у 1943.

КОТ Аляксандр, н. у 1923, загінуў у канцлагеры Дахау.

КОТ Сідар, н. у 1924, загінуў у канцлагеры Дахау.

КРЫЖ Іван Піліпавіч, н. у 1917, лейтэнант, загінуў 10.11.1943.

КУПРУСЬ Васіль Мікалаевіч, н. у 1919, трапіў у палон 2.7.1941 у раёне нас. пункта Мір, памёр 1.12.1941 (№№ 22302, 134756 шталаг 18А, Вольфсберг, Аўстрыя).

ЛАЎЧАНКА (ЛЕЎЧАНКА) Васіль Лаўрэнцьевіч, н. у 1919, мал. лейтэнант, загінуў у 1943.

ЛІВАЎ Барыс Лявонавіч, н. у 1908, загінуў у палоне (№ 470223).

МАКАРЧАНКА Мікалай Піліпавіч, н. у 1906, мал. лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

МАКАРЭВІЧ Барыс Васільевіч, н. у 1911, ст. лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

МАЛЕВІЧ Іван Аляксандравіч, н. у 1914, мал. палітрук, загінуў 23.8.1941.

МІСЕЕЎ Каленік, н. у 1909, лейтэнант, прапаў без вестак.

МЫШКОЎСКІ Піліп Пятровіч, н. у 1913, лейтэнант, прапаў без вестак 15.9.1942.

МЯЦЕЛЬСКІ Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1912, лейтэнант, ст. разведчык 3-га аддзялення УНКДБ Баранавіцкай вобласці, загадам НКДБ БССР № 199 ад 17.8.1945 прызнаны прапаўшым без вестак з 22.6.1941.

НОВІК Васіль Мікалаевіч, н. у 1919, сяржант, памёр ад ран 8.9.1943.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Андрэй Сямёнавіч, н. у 1907, загінуў у палоне 13.10.1941 (№ 611726, Deblin).

ПЯТРОВІЧ Васіль Іосіфавіч, н. у 1909, загінуў у палоне (№ 446576).

РАДЗЮКЕВІЧ Мікалай Ціханавіч, н. у 1922, лейтэнант, загінуў 13.12.1942.

РАШЭТНІКАЎ Васіль Пятровіч, н. у 1914, загінуў у палоне ў г. Арле.

РУДЭНЯ Іван Мікалаевіч, н. у 1920, мал. палітрук, загінуў 6.3.1942.

САЛАВЕЙ Васіль Ціханавіч, н. у 1919, лейтэнант, загінуў у 1941.

СНЕТКА Іван Пятровіч, мал. лейтэнант, загінуў 21.2.1942.

СОБАЛЬ Аляксандр Якаўлевіч, партызан з 1941 па 1944, радавы, на фронце з 1944, загінуў 15.7.1944, пахаваны на поўдзень ад с. Канюхі Алітускага р-на, Літва.

СУКАЛА Валянцін Міхайлавіч, н. у 1920, загінуў у палоне (№ 469082, 469760).

СЫСАЎ Васіль Пятровіч, н. у 1908, загінуў у палоне 16.11.1941 (№30604, Торн).

ЦЭЙКА Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1902, капітан, прапаў без вестак у 1941.

ЧАРНІЦКІ Пётр Цімафеевіч, н. у 1919, сяржант, паветраны стралок, загінуў 4.9.1942 у Велікалуцкім р-не Пскоўскай вобл.

У рэдакцыю газеты «Слуцкі край» звярнуўся жыхар горада Масквы Міхаіл Закрацкі з такой просьбай: «Необходима помощь в поиске вашего земляка Черницкого Петра Тимофеевича. Мой дядя Иванов Михаил Андреевич и Черницкий Петр Тимофеевич в составе экипажа бомбардировщика «Ил-4» громили врага и погибли (по тогдашним данным – пропали без вести) в Великолукском

2017@nasledie-sluck.by

районе Псковской области. Они вместе взлетели на боевое задание, а по прошествии 68 лет их души также вместе успокоились».

Па словах Міхаіла Закрацкага, у час Вялікай Айчыннай вайны прыйшло паведамленне, што яго бацька прапаў без вестак. І вось стала вядома пра лёс М.А. Іванова і яго саслужыўцаў дзякуючы намаганням членаў пошукавага атрада Музея баявой славы Пскоўскай вобласці.

Як гэта адбылося, у газеце «Новый день в Псковской области» напісаў Канстанцін Завітоўскі. Яму кіраўнік пошукавага атрада Міхаіл Раманаў расказаў: «У нас была інфармацыя, што ва ўрочышчы Шышы Чарпескай воласці Велікалуцкага раёна ў час Вялікай Айчыннай вайны разбіўся самалёт. Прыехалі, усю акругу абследавалі, але нічога не знайшлі. Аднак мясцовыя жыхары сцвярджалі, што самалёт усё-такі ёсць! Паляўнічы Генадзій Сакалоў пераканаў нас прыехаць яшчэ раз і нават прывёў на патрэбнае месца».

У лютым 2009 года члены пошукавага атрада, працуючы па пояс у ледзяной балотнай вадзе, знайшлі самы каштоўны экспанат – металічную пласцінку з серыйным нумарам самалёта: 8418. Яна і дала магчымасць устанавіць, што «Ил-4» лятаў у складзе 4-га авіяпалка 3-й авіядывізіі далёкага дзеяння. У апошні баявы вылет самалёт адправіўся 4 верасня 1942 года. Магчыма, у час палёту яго падбілі фашысты, самалёт упаў на зямлю і падарваўся на ўласным боекамплекце, бо дрэвы ва ўрочышчы пасечаны асколкамі. Удалося ўстанавіць імёны членаў экіпажа самалёта:

Іваноў Міхаіл Андрэевіч, старшы лейтэнант, лётчык, 1916 года нараджэння (горад Мыцішчы Маскоўскай вобласці);

Шаўцоў Мікалай Васільевіч, старшы сяржант, штурман, 1921 года нараджэння (вёска Лысь Растоўскай вобласці);

Цеслер Мацвей Іосіфавіч, старшы сяржант, паветраны стралок-радыст, 1918 года нараджэння (горад Адэса, Украіна);

Чарніцкі Пётр Цімафеевіч, сяржант, паветраны стралок, 1919 года нараджэння (горад Слуцк, Беларусь).

8 мая 2010 года на плошчы перад будынкам адміністрацыі Чарпескай воласці ўрачыста быў адкрыты мемарыял у памяць аб загінуўшых героях-лётчыках. Заказаў выраб помніка і даставіў яго ў Чарпесы Міхаіл Закрацкі. Як ён сказаў, ва ўстаноўцы помніка дапамагалі кіраўніцтва раёна і воласці, мясцовыя жыхары. І цяпер можна сказаць, што лётчыкі вярнуліся са свайго апошняга баявога задання.

Асобнай размовы заслугоўвае тое, як удалося адшукаць сваякоў М.А. Іванова і М.В. Шаўцова. Пошукі родных М.І. Цеслера і П.Ц. Чарніцкага працягваюцца. Магчыма, у нашым горадзе ці ў сельскіх населеных пунктах раёна жывуць сваякі П.Ц. Чарніцкага або людзі, у якіх ёсць звесткі пра сям'ю Чарніцкіх, калі ласка, адгукніцеся. У другім томе кнігі «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк» (старонка 242) узгадваецца ўраджэнец Слуцка Мікалай Цімафеевіч Чарніцкі, ён нарадзіўся ў 1901 годзе, прапаў без вестак у верасні 1944 года. Ці не браты яны – Мікалай Цімафеевіч і Пётр Цімафеевіч Чарніцкія?..

А. Жук. Слуцкі край. 2011. 14 студзеня.

ЧАРНЫШЭВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1913, загінуў у палоне 6.1.1943 (№ 562222, Bathorn).

ЧАРНЫШЭВІЧ Мікалай Еўдакімавіч, н. у 1906, загінуў у палоне (№ 463397).

ШУЛЬГА Ілья Рыгоравіч, афіцэр, прапаў без вестак.

ШУСЦЕРМАН Лазар Ісаакавіч, н. у 1902, капітан, начальнік 2-га аддзела УНКДБ Крымскай вобл., загінуў 5.1.1942 у Еўпаторыі.

ШЫДРОЎ Вульф Барысавіч, н. у 1913, тэхнік-інтэндант 3-га рангу, прапаў без вестак.

ЯКІМОВІЧ Нічыпар Якаўлевіч, н. у 1905, загінуў у палоне (№ 468735).

ЯРХА Цяўе Шаявіч, танкіст, прапаў без вестак.

2017©nasledie-sluck.by

ЯРХА Шая Залманавіч, прапаў без вестак.

ЯРХА Якаў Шаевіч, н. у 1926, радавы, загінуў 19.4.1945 у Польшчы пры вызваленні г. Кюстрына.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКЦЯБР

ГАПАНОВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1921, загінуў у палоне 4.1.1942 (№ 315382, Kerms–Gneixendorf, Waldfriedhof).

ВЁСКА БЯЗВЕРХАВІЧЫ

ВАЙТОВІЧ Пётр Пракопавіч, н. у 1916, следчы УНКДБ Беластоцкай вобласці БССР, прапаў без вестак 1.9.1941.

ВЁСКА ЕЎЛІЧЫ

БЯЛЬКЕВІЧ Яўген Сцяпанавіч, н. у 1922, загінуў у палоне 6.11.1942 (№ 310609, Heydekrug).

САКОВІЧ Віктар Аляксандравіч, н. у 1922, загінуў у палоне (№ 612887).

ВЁСКА МАШЧЫЦЫ

ВЕЧАЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1913, загінуў у палоне (№ 583289, Nuemberg).

ВЁСКА СЕЛІШЧА

ГІЛЬ Цімафей Фаміч, н. у 1910, радавы, памёр ад ран 10.1.1945 у шпіталі ва Усходняй Прусіі. Быў пахаваны ў н.п. Гаджын, потым перапахаваны ў Несцераўскім р-не Калінінградскай вобл.

КУРЛОВІЧ Рыгор Карнеевіч, н. у 1893, радавы, у будаўнічым батальёне, на фронце з 1944, прапаў без вестак у лютым 1945.

АМГОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ (з 31.10.2009 у складзе Сорагскага сельсавета)

ВЁСКА АМГОВІЧЫ

САРАГАВЕЦ Мікіта, н. у 1907, афіцэр, загінуў у Польшчы ў 1944.

М.М. Трафімовіч

ВЁСКА ДВОРЫШЧА

ТРАФІМОВІЧ Міхаіл Макаравіч, н. у 1910, загінуў у 1941.

ВЁСКА КРАСНАЕ

САРАГАВЕЦ Мікіта Майсеевіч, загінуў.

ВЁСКА ЛАЗАРАЎ БОР

КІСЕЛЬ Віктар Аляксандравіч, н. у 1920, загінуў у 1943 каля в. Мар'іна пры прарыве блакады Ленінграда ў ходзе аперацыі «Іскра». Пахаваны ў г. Кіраўск на Мар'інскіх грамадзянскіх могілках у брацкай магіле.

ВЁСКА СТАРЭВА

АЖГІРЭЙ Павел Паўлавіч, н. у 1923, партызан атрада імя С.М. Кірава 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе з лістапада 1943 па ліпень 1944, радавы, на фронце з ліпеня 1944, загінуў.

ВЁСКА ХІНОЛАЎКА

ВАНІСЛАЎСКІ Казімір Вікенцьевіч, н. у 1906, партызан 95-й брыгады імя М.В. Фрунзе, радавы, на фронце з 1944, загінуў 18.2.1945 у Польшчы, дзе і пахаваны.

БЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАЛОТЧЫЦЫ

ДУЛЯ Сяргей Іванавіч, н. у 1922, чырвонаармеец, прапаў без вестак 9.8.1942.

ЖУК Максім Сававіч, н. у 1906, загінуў у палоне 4.8.1942 (№ 489095, Proskurow/Rakowa).

2017©nasledie-sluck.by

КОТ Іван, н. у 1915, загінуў у палоне 28.1.1942 (№ 579900, Люблін).

КОТ Сямён Фёдаравіч, н. у 1907, радавы 73-й кулямётнай групы 28-й Арміі 3-га Беларускага фронту, на фронце з 1941, загінуў 9.2.1945 пад г. Гумбінен (цяпер Гусеў Калінінградскай вобл.).

ВЁСКА БЕЛІЧЫ

БРУЙ Іван Купрэевіч, на фронце з 1941, памёр ад ран у 1943 у Смаленскай вобласці.

ЦЫБУЛЬКА Мікалай Захаравіч, н. у 1914, лейтэнант, оперупаўнаважаны АКР «Смерш» 30-й мсд 2-га Прыбалтыйскага фронту, загінуў 13.8.1943 у в. Яхантава Шаблыкінскага р-на Арлоўскай вобл.

ВЁСКА ЧЫЖОЎКА

ХАЎЧАР Валянцін Афанасьевіч, н. у 1919, загінуў у палоне (№ 468328).

БОКШЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАСІЛІНКІ

МАХЛАЙ Іван Іосіфавіч, н. у 1919, загінуў у палоне 4.6.1942 (№ 1137, Берлін).

ВЁСКА ГАРОХАЎКА

ЗАБЕЛА Васіль Хрысанавіч, н. у 1903, радавы, загінуў у кастрычніку 1942 пад Сталінградам.

ВЁСКА ЗАБАЛАЦЬ

ШЧАКОВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1917, загінуў у палоне (№ 468474).

ВЁСКА МІХЕЙКІ

БАДЫЛЬ Гаўрыла Максімавіч, н. у 1905, капітан, прапаў без вестак у 1941.

БАНДАРЭЦ Іван Васільевіч, н. у 1907, мал. лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

ВЁСКА ПРОШЧЫЦЫ

ЦІМАФІЕНКА Іван Максімавіч, н. у 1915, загінуў у палоне 27.7.1943 (№ 391800, Zeithain (Friedhof III)).

ВЁСКА УЛАНАВА

МАРОЗАЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1916, загінуў у палоне 30.3.1942 (№ 389852, Darniza).

ВЯСЕЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БОРКІ

МАЛЕВІЧ Пётр Іосіфавіч, н. у 1901, радавы, загінуў у 1942 пад Сталінградам.

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

ШРАЛОВІЧ Сцяпан Кузьміч, н. у 1908, загінуў у палоне (№ 468105).

ВЁСКА ВЯСЕЯ

БАНДАРЭВІЧ Уладзімір Раманавіч, н. у 1921, радавы, загінуў у палоне ў сакавіку 1944 (шталаг X-D(310), Вітцэндорф, Ганновер, Германія).

ДРЭН (ДРЭНЬ) Іосіф Сямёнавіч, н. у 1918, загінуў у палоне 1.6.1944 (№ 592547, 12042, Strassburg).

ФУРС Мацвей Андрэевіч, н. у 1902, загінуў у палоне (№ 467672).

ВЁСКА ЛІПНІКІ

БАЛВАНОВІЧ Сяргей Міхайлавіч, н. у 1919, загінуў у палоне 2.3.1942 (№ 128512).

ГУРЫНОВІЧ Ігнат Фёдаравіч, н. у 1903, загінуў у 1944.

ВЁСКА НАБУШАВА

НЯРОЎСКІ Ануфрый Ануфрыевіч, н. у 1916, загінуў у палоне (№ 467622).

ВЁСКА ПАПОЎЦЫ

ПАЛЯШЧУК Пётр Мартынавіч, н. у 1925, загінуў у палоне 12.7.1944 (№ 568241, Bathorn).

ПАХАМОВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1909, загінуў у палоне 29.4.1943 (№ 388030, Skrobow).

2017@nasledie-sluck.by

ГАЦУКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗЯРЦЫ

БУРАК Уладзімір Мікалаевіч, загінуў.
КАЗЮЧЫЦ Васіль Раманавіч, загінуў.

ВЁСКА БУДА ГРЭСКАЯ

ДРАБУШЭВІЧ Павел Пятровіч, н. у 1921, памёр ад ран у 1942.

ДУБОВІК Міхаіл, загінуў у 1945 у Германіі.

ЗАЯЦ Генадзь Якаўлевіч, прапаў без вестак.

КАЛЯДА Аляксандр Юзубавіч, н. у 1910, прапаў без вестак.

НЯМКОВІЧ Павел Андрэевіч, н. у 1897, радавы, загінуў 27.2.1942.

ВЁСКА КРЫВАЯ ГРАДА

КРЫЖАНОЎСКІ Аляксандр Цімафеевіч, загінуў 20.8.1944 у Польшчы.

ГРЭСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГРЭСК

ВІТКО Васіль Цімафеевіч, н. у 1907, загінуў у палоне 14.12.1941 (№ 319617, Neuhammer)

КЛЕБАНОВІЧ Аляксей Васільевіч, н. у 1914, член Грэскай падпольнай групы да студзеня 1943, партызан атрада імя А.В. Суворава са студзеня 1943 па чэрвень 1944, радавы, на фронце з 1944, загінуў пад Кёнігсбергам.

Биография учителя А.В. Клебановича краткая, как и его замечательная жизнь, и обыкновенная, как и многих советских людей, отдавших свою жизнь за Родину.

Родился в 1914 г., в семье крестьянина в селе Гресск. Учился прилежно. Окончил в 1931 г. Гресскую семилетку, а в 1934 г. Слуцкое педагогическое училище. Любил и хорошо знал историю, литературу, сочинял сам стихи, читал задушевно и не скрывал их от своих товарищей, как это иногда делают учащиеся в юношеские годы.

Алексей Васильевич был членом Ленинского комсомола и высоко ценил свою принадлежность к нему. С 1934 г. и до самого начала Великой Отечественной войны работал преподавателем русского языка и литературы семилетней школы в селе Дюдево (это в четырех километрах от Гресска). Любил А.В. Клебанович литературу и язык великого русского народа, а еще больше любил Алексей Васильевич детей и жизнь, а сердца подростков отвечали ему взаимностью.

Но вот началась война. Фашисты стали устанавливать свои порядки. Была создана Гресская управа при немецкой комендатуре. В управе было районо, его заведующим стал А.В. Клебанович. В управе секретарем был родной брат Иван. Братья «служили» немцам по заданию подпольного Гресского РК КП(б)Б. По заданию партизан они вели разведку, давали важную информацию.

Как-то в д. Шведы был убит партизан. Полицаи обнаружили у него записку-задание для Клебановичей. Оно не было зашифровано, и эта записка открыла карты фашистам. Началась слежка за всеми членами семьи.

В доме отца, Клебановича Василия Семеновича, 23 января 1944 г. собрались сыновья Алексей, Иван, Михаил и еще трое подпольщиков на совещание. В этот момент они были окружены и схвачены. Оружия не было, сопротивление было подавлено. Полицаи связали всех находящихся в доме, в том числе женщин и детей, и на машине увезли за Гресск, по Грозовской дороге, расстреливать. В пути следования Алексею Васильевичу удалось развязать руки, прыгнуть с машины и под оружейными выстрелами скрыться в кустах. Вскоре он был уже в партизанском отряде имени 25 лет Октября.

Мать чудом осталась живая среди трупов. Проверив и убедившись, что самые близкие и родные ее сердцу люди мертвы, Ульяна Григорьевна выбралась из карьера и добрела

2017@nasledie-sluck.by

до д. Дюдево, где жила семья погибшего сына Михаила. Вместе с невесткой Софьей Степановной Островской и внуком они ушли в партизанский отряд. Там встретились с оставшимся в живых Алексеем.

После освобождения Гресского района Алексей Васильевич Клебанович некоторое время работал в органах госбезопасности. Но вскоре ушел на фронт. В боях под Кёнигсбергом погиб.

КЛЕБАНОВІЧ Павел Васільевіч, на фронце з 1941, загінуў пры абароне Ленінграда.

ЛАГВІНОВІЧ Сцяпан Юлісавіч, н. у 1907, загінуў у палоне (№ 467500).

ЛОСІК Мікалай Андрэевіч, н. у 1926, мал. сяржант, загінуў 14.1.1945, пахаваны ў г. Макуў-Мазавецкі Мазавецкага ваяводства (Польшча).

МІХНЕВІЧ Раман, н. у 1902, загінуў у палоне 11.8.1944 (№ 593206, Luckenwalde).

МЯЦЕЛЬСКІ Іван Дзмітрыевіч, н.у 1909 (пас. Навінка), радавы пры штабе 15-й СД, на фронце з ліпеня 1944, прапаў без вестак 21.8.1944.

Помнік загінуўшым землякам у в. Казловічы

А.У. Гудкоўскі

ВЁСКА ЗАБЕЛЫ

ГУДКОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1916, лейтэнант, камандзір узвода 14-га стралк. палка 10-й гв. арміі, загінуў 8.3.1944 у в. Малое Цімоніна Пустышкінскага р-на Калінінскай вобл.

ВЁСКА ШВЯДЫ

ВІТКО Ануфрый Сямёнавіч, н. у 1910, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ВЁСКА ШЫШЧЫЦЫ

СІВЕЦ Васіль Мікаповавіч, н. у 1914, загінуў 2.12.1941 у палоне (№351727, Neuhammer).

ЗНАМЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАНЬКОЎШЧЫНА

РАДКЕВІЧ Франц Сцяпанавіч, н. у 1908, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ВЁСКА СЯРЭДНІКІ

БАРОДЗІЧ Раман Сцяпанавіч, н. у 1917, лейтэнант, прапаў без вестак 23.1.1943.

ГАПАНОВІЧ Леанід Рыгоравіч, н. у 1920, загінуў у палоне 15.5.1942 (№563678, Ostrow (Lagerfriedhot)).

ХАТЭНКА Пётр Якаўлевіч, н. у 1905, загінуў у палоне 16.11.1941 (№391014, Wietzendorf).

ЯНІЦЭВІЧ Пётр Якімавіч, н. у 1910, радавы, на фронце з 1941, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

2017©nasledie-sluck.by

ІСЕРНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ІСЕРНА

ЛЮЦКО Іван Сцяпанавіч, н. у 1919, загінуў у палоне 6.1.1945 (№ 559270, Bathorm).

ВЁСКА МАЛОЕ БЫКОВА

СТОЦКІ Піліп Мікітавіч, н. у 1914, загінуў у палоне (№ 469092).

ВЁСКА НЕЖАЎКА

ТАГІЛЬ Іван Мікалаевіч, н. у 1915, загінуў у палоне 22.9.1941 (№ 232818, Weitzendorf).

ТАГІЛЬ Сяргей Афанасьевіч, н. у 1921, загінуў у палоне (№ 467696).

ТАГІЛЬ Цімафей Дзянісавіч, н. у 1908, загінуў у палоне (№ 467690).

ВЁСКА ПРАЦАВІЧЫ

ДАБРАЛЁТ Іларыён Сяргеевіч, н. у 1914, загінуў у палоне 9.12.1942 (Hardikirhen/Oberdohau).

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАЛАТЫ

КАЧУР Павел Ігнатавіч, н. у 1915, ст. сяржант, камандзір аддзялення 2-га падрыўнога батальёна мініравання асобнага мотастралковага батальёна асобага назначэння, прапаў без вестак у ліпені 1943.

ВЁСКА ВЯЛІКАЯ СЛІВА

КОЗЕЛ Міхаіл Яўхімавіч, н. у 1921, загінуў у палоне 8.10.1941 (№ 322762, Hammerstein (neuer Friedhof)).

САМУСЕВІЧ Пётр Мікалаевіч, н. у 1924, загінуў 10.9.1942 у палоне (№ 564353, Neubrandenburg).

САМУСЕВІЧ Цімафей Сцяпанавіч, н. у 1920, радавы, памёр ад ран 5.12.1944., пахаваны ў п. Ясная Паляна Несцераўскага р-на Калінінградскай вобл.

ТРУХАН Тарас Емяльянавіч, н. у 1909, загінуў 12.11.1941 у палоне (№ 390856, Aulenbach).

ВЁСКА КАЗЛОВІЧЫ

ЛАГУН Павел Архіпавіч, н. у 1920, загінуў у палоне (№ 467522).

ЛАГУН Пётр Васільевіч, н. у 1919, загінуў у палоне (№ 175313).

ВЁСКА МАЛАЯ ПАДЗЕР

ШАЎЦОЎ Сямён Юр'евіч, н. у 1911, загінуў у палоне (№ 467950).

ВЁСКА НЕКРАШЫ

ЛЯДЗІНСКІ Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1902, чырвонаармеец, стралок 635-га стралк. палка 143-й стралк. Канатопска-Корасценскай дывізіі, загінуў 14.10.1944. Пахаваны ў Польшчы.

ВЁСКА ЯЧАВА

КРЫВАДУБСКІ Іван Пракопавіч, загінуў.

ПУЖЭВІЧ Канстанцін Сямёнавіч, н. у 1923, загінуў у палоне (№ 470089).

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АГАРОДНІКІ

ГУР Пётр Рыгоравіч, н. у 1902, капітан, нач. штаба 20-га пагран. палка, расстраляны фашыстамі ў 1941 у г. Барыспаль, Украіна.

Пра лёс нашага земляка ніякіх звестак не было. І вось вясной 2011 г. у Слуцкі ваенкамат прыйшло пісьмо з Пасольства Рэспублікі Беларусь ва Украіне. Вось асобныя радкі з яго:

«Сообщаем, что, по информации представителей Всеукраинской общественной организации «Закончим войну», при проведении строительных работ на окраине г. Борисполь (Киевская обл. Украины) весной текущего года было обнаружено массовое захоронение (более 400 человек) советских

2017©nasledie-sluck.by

граждан (военных и гражданских лиц) периода Великой Отечественной войны.

Среди найденных останков обнаружен солдатский медальон, согласно записке в котором, в указанном месте погиб капитан Красной Армии Гур Пётр Григорьевич, 1902 года рождения...».

Советник Ю.О. Слука.

ЛУКАШОЎ Аляксандр, н. у 1914, лейтэнант, загінуў.

ВЁСКА ІВАНСКІЯ АГАРОДНІКІ

СКЛЯР Уладзімір, н. у 1915, загінуў у палоне (№ 454781).

ХАЦЬКО Пётр Карпавіч, н. у 1914, загінуў у палоне 1.11.1941 (№ 064091, Wolfsderg (Friedhof St Johann)).

ВЁСКА ІГРАЕВА

КУЛЕШ Васіль Ільіч, н. у 1921, радавы, на фронце з 1941, трапіў у палон, расстраляны каля г. Гродна пад час уцёкаў.

НОВІК Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1921, радавы, на фронце з 1941, загінуў у 1942 у баях за Сталінград.

САМУСЕВІЧ Уладзімір Ільіч, н. у 1921, радавы, на фронце з 1941, трапіў у палон у 1941, уцёк з палону, памёр ад голаду і хвароб.

ВЁСКА КІРАВА

АКСЁНАЎ Піліп Данілавіч, н. у 1919, загінуў у палоне 19.5.1942.

КУЛЕШ Фёдар Мікітавіч, ст. лейтэнант, загінуў 30.7.1941, пахаваны ў в. Петруханава Ленінградскай вобл.

МЯЛЕШКА Андрэй Анікеевіч, н. у 1916, чырвонаармеец, загінуў у палоне 27.8.1942.

МЯЛЕШКА Малаш Рыгоравіч, н. у 1910, загінуў у палоне 12.5.1942 (№ 354559, Ostrowiece).

МЯЛЕШКА Фёдар Ціханавіч, н. у 1920, загінуў у палоне (лагер Цайтхан ?).

ВЁСКА МАЛАЯ ПАДЗЕР

СТАРАСТОВІЧ Сяргей Пятровіч, н. у 1922, загінуў у палоне (№ 468044).

ВЁСКА НОВЫ ДВОР

МЕРЗЕНЕЎ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1919, загінуў 9.2.1942 у палоне (№ 567897, Auschwitz).

ВЁСКА ПРАЦАВІЧЫ

КІСЕЛЬ Рыгор Логвінавіч, н. у 1909, радавы, на фронце з 1941, у ліпені 1941 каля Ваўкавыска трапіў у палон, быў пераведзены ў Беласток, адтуль – у лагер палонных у Аўстрыю, дзе і памёр у лістападзе 1942.

КІСЕЛЬ Якім Логвінавіч, н. у 1907, мал. лейтэнант 2-га санітарнага батальёна, у маі 1942 трапіў у палон каля Лазовенкі (Украіна), памёр у шпіталі 9.3.1943.

ШЫРЫН Сцяпан Іванавіч, н. у 1915, старшына аддзельнага мотастралковага бата-

Помнік загінуўшым землякам у в. Падлессе

2017©nasledie-sluck.by

льёна асобага назначэння, загінуў 10.7.1942, пахаваны ў в. Брыцалавічы.

ЛЕНІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЖУШКІ

БОРТНІК Сямён Пракопавіч, загінуў.

ВЁСКА ПАДЛЕССЕ

КАНАНОВІЧ Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1922, загінуў у палоне (№ 444766).

МАЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КЛЕШАВА

КОРЗУН Іван Антонавіч, н. у 1915, загінуў у палоне 13.1.1942 (№ 331720, Grossbeeren).

КОРЗУН Павел Пятровіч, н. у 1892, генерал-маёр, генерал-лейтэнант (1942), на фронце з 1941, камандзір корпуса, камандуючы 47-й арміяй, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, загінуў у верасні 1943, пахаваны ў г. Гадзяч (Украіна). (Гл. артыкул «Генерал-лейтэнант з вёскі Клешава» ў кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. С. 42).

ПЕРШАМАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГОЛЬЧЫЧЫ

БОЙКА Цімафей Гаўрылавіч, н. у 1910, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ГУЗІК Мацвей Максімавіч, н. у 1910, радавы, загінуў у палоне 12.6.1942.

КРОТ Іван Сяргеевіч, н. у 1922, радавы, трапіў у палон у г. Майкоп, загінуў 5.12.1942.

КРОТ Цімафей Нічыпаравіч, н. у 1905, загінуў у палоне 6.6.1942 (№ 563063, шталаг XIIE).

ВЁСКА ЖЫЛІН БРОД

БРАНІШЭЎСКІ Казімір Баляслававіч, н. у 1910, загінуў у палоне 2.11.1941 (№ 138441, Unklar).

ВЁСКА КАЛЬЧЫЦЫ

АКУЛОВІЧ Аляксандр, н. у 1914, загінуў у палоне 21.1.1943 (№ 617073, Forellkrug).

АКУЛОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1911, загінуў у палоне 26.1.1944 (№ 371288, Bergen-Belsen).

ЛЯХ Аляксей Іванавіч, н. у 1918, радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

СОБАЛЬ Аляксандр Пракопавіч, н. у 1915, загінуў у палоне (№ 469124).

ЧУМАК Пётр Кузьміч, н. у 1922, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ВЁСКА КРУШНІК

ЛАБКОВІЧ Віктар Адамавіч, н. у 1922 (?), загінуў.

ЛАБКОВІЧ Павел Адамавіч, н. у 1917, загінуў у 1941 пад Мінскам.

ВЁСКА ПЕРАХОДЫ

ЖУРАЎСКІ Іосіф, партызан, радавы на фронце з ліпеня 1944, загінуў у 1944 пад Варшавай.

ВЁСКА РЖАЎКА

МЕЛЯШКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1904, загінуў у палоне 16.3.1942 (№ 328019, Hamburg-Rothenburg).

ПОКРАШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АДАМОВА

МЫСЛІЦКІ Павел Уладзіміравіч, н. у 1913, загінуў у палоне 23.10.1941 (№ 342509, Aulenbach).

ВЁСКА АНУФРАВІЧЫ

ХРАМІЦЭВІЧ Сцяпан Канстанцінавіч, н. у 1905, загінуў у палоне 26.3.1944 (№ 559955, Wietmarschen).

ВЁСКА ЗАМОСЦЕ

ЛЕШЧАНКА (ЛІШТЭНКА) Іван Казіміравіч, н. у 1919, загінуў у палоне (№ 467505).

2017©nasledie-sluck.by

М.М. Заяц

ЛЕШЧАНКА Леанід Селіверставіч, н. у 1910, загінуў у палоне 19.7.1942 (№ 564176, Klein-Dexen).

ХОЦЬКА Лук'ян Лук'янавіч, н. у 1915, загінуў у палоне 9.11.1941 (№ 374823, № 4937, шталаг 312), пахаваны на ваенных могілках у пас. Глінкі каля г. Торунь, Польшча.

ВЁСКА ЛЕНЬКІ

ЗАЯЦ Віктар Міхайлавіч, н. у 1914, загінуў у палоне ў 1942.

ЗАЯЦ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1918, загінуў на Волхаўскім фронце.

РАЧКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

НЭЙМАН Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1919, загінуў у 1941 пад Смаленскам.

ВЁСКА БЯЛЕВІЧЫ

ГАРКАВЫ Лазар Яўхімавіч, н. у 1911, загінуў у палоне 4.1.1943 (№ 312310, Lamsdorf).

ВЁСКА ЛЯДНА

ЗАЛАМАЙ Уладзімір Васільевіч, н. у 1919, загінуў у палоне (№ 43991).

МАКАЕД Мікалай Мікалаевіч, радавы, на фронце з 1941, загінуў.

ВЁСКА ТАНЕЖЫЦЫ

КАРАБА Міхаіл, н. у 1921, загінуў у палоне (№ 441278).

Помнік загінуўшым землякам у в. Лучнікі. Фота 1980-х гадоў

2017©nasledie-sluck.by

ВЁСКА ЧАПЛІЦЫ

ВЯРШЭНЯ Іван Сямёнавіч, н. у 1901, загінуў у палоне 22.9.1942 (№ 559389, № 94716 шталаг 2А), пахаваны ў брацкай магіле ў г. Нойбрандэнбург, Германія.

ЖАЎРЫД Іван Андрэевіч, радавы, загінуў у 1944 каля Варшавы.

МАСКАЛЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1921, загінуў у палоне 11.5.1943 (№ 564976, Zamosc).

РАГАЎНІЧЫ Рыгор Кузьміч, н. у 1918, загінуў у палоне 1.10.1941 (№ 621301, Берлін).

СОРАГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА СОРАГІ

ПРАХАРОВІЧ Іван Паўлавіч, н. у 1915, загінуў у палоне (№ 468778).

ШУБА Ігнат Адамавіч, н. у 1900, старшына, узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі», памёр ад ран 6.9.1943, пахаваны ў брацкай магіле ў саўгасе «Металіст» (Данецкая вобл.).

СЯРАЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРАНАВІЧЫ

КАЗЛОЎСКІ Андрэй Андрэевіч, н. у 1908, загінуў у палоне 26.9.1942 (№ 8027, Bocholt).

КАЗЛОЎСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1917, загінуў у палоне 1.2.1942 (№ 272457, Гродна).

КАХАНОВІЧ Андрэй Кандратавіч, н. у 1905, загінуў у палоне 15.10.1941 (№ 614279, Deblin).

САВАНОВІЧ Іван, н. у 1912, загінуў у палоне 23.3.1942 (№ 617684, Darnitza).

ВЁСКА ВАРКАВІЧЫ

СЦЕПАНОВІЧ Іван Яўсеевіч, н. у 1919, загінуў у палоне (№ 469071).

ВЁСКА ЛУЧНІКІ

ДУБАЛЕКА Анастасій Піліпавіч, н. у 1920, загінуў у палоне (№ 467876).

ВЁСКА ПАДЛІПЦЫ

ПУНЧЫК Канстанцін Фёдаравіч, н. у 1921, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЁСКА СЯРАГІ

БАСАЛЫГА Кандрат Піліпавіч, н. у 1911, лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

ШАХНОВІЧ Рыгор Упасавіч, н. у 1906, загінуў у палоне (№ 597648).

Спісы складзены на падставе фондавых матэрыялаў слуцкіх дзяржаўных устаноў – занальнага архіва і краязнаўчага музея; асобных публікацый раённай газеты «Слуцкі край», звестак, прадастаўленых роднымі загінуўшых.

Падрыхтавала В.С. Відлога.

Бьём фашистов крепко

Во 2-й книге «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк» на стр. 264 есть скупые строки о погибшем земляке Яцуке Иване Даниловиче. Как оказалось, сохранились его письма, присланные с фронта в родные Василинки к матери и сестре Вере, к племянникам...

Суббота,
2 сентября 1944 года.

Здравствуйте, дорогие родители, мама, Вера и дети Геня, Валя и Инна!!!

В первых строках своего письма хочу сообщить, что я жив-здоров, чего и желаю в вашей жизни. Из госпиталя я уже

2017@nasledie-sluck.by

выписался. 5 августа меня ранило в левую руку ниже локтя. Пуля прошла насквозь, немного задев кость. Сейчас рана зажила. Правда, пальцы хорошо еще не действуют, выпрямить и сжать в кулак не могу... Меня выписали из госпиталя 30 августа и дали освобождение еще на 10 дней. В госпитале жилось очень хорошо. Кормили прекрасно, в свободное время – гуляй в шахматы, шашки.

Напишите, нет ли писем от отца и Степана. Если есть, то напишите их адреса...

10/IX-44. Воскресенье.

Здравствуйте, дорогие родители!

...Живу по-старому. Подготавливаемся к боям. 5 сентября подал заявление в ВЛКСМ и в тот же день был принят в его ряды. Хочу комсомольцем сражаться и бить врага...

Рука в основном зажила, правда, поднять что-либо еще не могу... Прошу вас, пишите мне свои новости. Что слышно про отца, Степу, Федю и вообще про всех, которых не было 3 года...

Суббота,
4 ноября 1944 года.

Здравствуйте, дорогие мои родители!!!

Время попало как раз свободное и я решил написать вам это письмо. Сейчас перерыв наших занятий – изучали радиостанцию. Не очень давно я получил письма: от Степы, Коли С. и Саши С. Всем им дал ответ...

Дорогие родители! Прошу вас, не скучайте и не плачьте. Недалек тот час, когда покончим с подлыми фашистами и вернемся домой целы и невредимы. Пишите побольше мне писем, буду очень рад. Описывайте все подробно.

Привет из Польши.
30 ноября 1944 г. Пятница.

Здравствуйте, дорогие родители!!!

Сегодня я получил от вас два заказных письма, бумагу, 20 рублей денег и письмо от Гени, за все это очень и очень благодарен... Живу сейчас неплохо. Работаю на «максиме». В этом месяце получил комсомольский билет, его я оправдаю (клянусь вам) в предстоящих боях.

10 января 1945 года.

Здравствуйте, дорогие родители!

...Нахожусь на фронте. И вот сейчас все время слышу очень близко разрывы мин и снарядов да треск автоматов. Вы меня извините, что плохо и неразборчиво пишу: знаете, руки немного озябли да и карандаш очень маленький. Жить вообще неплохо. Кушать хватает и одеты хорошо, по-зимнему. Находимся в окопах. И это письмо мое примите из самого переднего края. Вчера и сегодня видел ребят из Заболоти. Алеши и других василинковских пока никого не видел.

12/I-45 года.

Привет с фронта!!! Как я уже писал, нахожусь на фронте. Живем в блиндажах. Кушать хватает. Вы пишете, может мне надо денег. Нет, пока не надо. Скоро будет много трофеев. А деньги на фронте – это лишний груз. Лучше я возьму несколько десятков патронов. Я знаю, деньги у вас не лишние, а мне всего вдоволь. Особо не волнуйтесь обо мне, что я на фронте. Я уже знаю, как болят раны, и мне ничего не страшно. Самое главное – смотрите за собой и детьми. Мне очень хотелось бы увидеть их...

Привет с фронта
(из Германии), 9/II-45 года.

....Живу сейчас я пока неплохо. Со мной вместе Крот Федор, Сукач Василь (из Молотково) и Чигорский. Крот Федор награжден медалью «За отвагу». В этих боях я пока еще цел и невредим (не ранен). Вообще могу сказать, бьем фашистов крепко, и мои эпизоды войны – как останусь жив и вернусь домой, все расскажу...

2017©nasledie-sluck.by

Не обижайтесь, что долго не писал, знаете, фронтовая жизнь – не тыловая. На фронте нет времени заниматься личными делами. Нужно бить немцев и скорее кончать войну...

27 февраля 1945 года.

Здравствуйте, дорогие родители!

Пишу вам из госпиталя. Ранен в правую руку выше локтя. Ранило осколком от недалеко разорвавшейся мины. Но рана небольшая, кость не задета. С левой рукой хуже. Она все еще побаливает, особенно в сырую погоду. За эти бои получил благодарность от т. Сталина. Со мной здесь лежит один парень из Михеек – Басалыга Федор Афанасьевич (Кузёмков свояк).

Письмо из Вольденберга,
10/III-45 года.

...Живу все еще в госпитале. Рана очень медленно заживает и еще течет...

30/III-45.

Здравствуйте, дорогие родители!!!

Из госпиталя вышел уже давно. Сейчас пока еще не на фронте. Жить хорошо, но не так, как на фронте. На фронте было гораздо лучше. Со мной вместе Крот Федор и Шелег Саша (из Молотково). Сукач Василь убит. Я слыхал, что Красуцкий Коля тоже убит, а Алексей наш тяжело ранен. Напишите, верно ли это...

Письмо из Германии,
3/IV-1945 г.

Здравствуйте, дорогие родители, мама, Вера, Федя и дети Геня, Валька и Инка...

Я уже выслал вам очень много писем, но ответа не могу дождаться. Живу сейчас неплохо. Рана на правой руке зажила совсем, даже ее не чувствую. С левой рукой дело обстоит немножко похуже. Она еще и сейчас временами болит. Нахожусь сейчас пока не на фронте.

Прошу вас, пишите побыстрей, не медля ни одной минуты. Меня очень интересует и волнует, как сейчас здоровье Феди. Напишите, как учится Геня, ведь скоро конец учебного года. Вообще пишите все-все...

3/IV-45.

Здравствуйте, дорогие родители!

Посылаю вам чистосердечный привет и желаю всего наилучшего в вашей жизни. Сегодня до обеда я выслал вам письмо. Это посылаю другое. Минут пять назад я получил еще две благодарности от т. Сталина, которые и посылаю в этом письме. Прошу вас, храните эти документы...

***

В этот период стала застраиваться новая улица в Лучниках – Циково, а позже нынешняя Центральная, которую в то время называли Нанавоз. Это неофициальное название просуществовало до 60-х годов XX в. Возникло оно оттого, что улица стала формироваться по обе стороны пешеходной тропинки между огородами улиц Старые и Новые Лучники, в конце которых находились кучи навоза, подготовленные для удобрения почвы. Новые постройки возводились на обрезанных участках земли жителей этих улиц, т.е. это были сотки, выделенные на «навозе». Отсюда и название. Первым застройщиком на новой улице был Соловей Спиридон.

Постепенно колхозы добивались некоторых результатов в производстве сельскохозяйственных продуктов, но животноводство по-прежнему находилось в тяжелейшем состоянии. В колхозе им. Молотова имелось лишь 39 рабочих лошадей, на молочно-товарной ферме – 23 коровы и 4 телки. Еще хуже обстояли дела в колхозе «Ленинский путь». Доведенные планы по животноводству и птицеводству в 1945 г. не были выполнены. Так, в колхозе «Шлях Саветаў» (Лучники) имелось: лошадей – 80 (при

Наведвальнікі раённай сельскагаспадарчай выставы аглядаюць экспанаты калгаса імя Молатава

Малодшыя калгаснікі калгаса «Ленінскі шлях». 1950-я гг.

2017©nasledie-sluck.by

Цэнтральная сядзіба калгаса «Ленінскі шлях» у в. Лучнікі. 1987 г.

плане 73), крупного рогатого скота – 75 (85), овец – 4 (25), свиней – 4 (30), кур – 103 (340), водоплавающей птицы – 60.

Ветеран колхозного движения участник Великой Отечественной войны Антон Евдокимович Дубалеко из д. Лучники вспоминал: «…Когда закончилась война, мне было 44 года. По возвращении с фронта домой на меня, первого в деревне ветеринара, правление колхоза возложило обязанности руководителя животноводством. Восстановили фермы, которые сразу были небольшими: коровник, овчарню и птицеферму. Стали закупать телят и ягнят у колхозников, поросят – на слуцком базаре. Они и стали основой колхозного животноводства…».

Друкуецца ў скарачэнні па кн.: Видлога В.С. Земля отцов – земля святая. Лучники: история, люди, события, факты. Минск, 2009. С. 74–79.

Даяўнікі калгаса «Ленінскі шлях», 1978 г.

2017©nasledie-sluck.by

Путь в 90 лет: Первомайский сельсовет

Первомайский сельсовет – один из восемнадцати в составе Слуцкого района, а образован он в 1921 г. как Гольчицкий на территории Греской волости Слуцкого уезда. С созданием в Беларуси в 1924 г. районов он вошел в состав Греского района.

В 1931 г. Гольчицкий сельсовет был переименован в Первомайский. На его территории находились деревни Гольчицы, Кальчицы, Вынисцы, Копань, Борок, Кошище, Нива, Ржавка, Жилинка, Таковищи, Кулики, в которых в 1930-х гг. были организованы колхозы «Заря», «Кастрычнік», «Борок», «Беднота», имени Блюхера, «Чырвоная змена», имени Калинина, имени Буденного, имени Дзержинского, «Пролетарская нива».

После изгнания из Беларуси немецко-фашистских захватчиков на первом заседании Греского райисполкома 20 июля 1944 года председателем Первомайского сельского Совета депутатов был утвержден Григорий Иосифович Соловей, членами исполкома – Александр Иосифович Лапец, Михаил Сергеевич Филипович, Ирина Гавриловна Бойко, Анна Драгун. На заседании исполкома 4 января 1945 года (первый послевоенный протокол, сохранившийся и поступившийся на хранение в архив) рассматривались вопросы восстановления колхозных ферм, отстройки домов колхозников, ход молотьбы и засыпки страховых фондов. Одним из приоритетных вопросов работы сельского Совета депутатов было укомплектование колхозных ферм. Начинать нужно было практически с нуля, плановые показатели приходилось во многом выполнять за счет изъятия у колхозников скота, приобретенного ими в период немецкой оккупации. В 1947 году колхозы сельсовета полностью освоили довоенные посевные площади и собрали в основном довоенный урожай. Весенняя посевная кампания 1948 года прошла на хорошем для того времени уровне. Яровые зерновые культуры были посеяны к 1 мая, к 15 мая посажен картофель, кроме этого, колхозам доводился план по посеву льна, махорки, гречихи.

Решением Греского райисполкома от 17 июня 1950 года колхозы имени Калинина, имени Кирова и «Пролетарская революция» были объединены в один колхоз имени Калинина в деревне Гольчицы, колхоз «Пролетарская нива» влился в колхоз имени Дзержинского в деревне Боровая. В 1951 году председателем сельского Совета депутатов был назначен Василий Григорьевич Соловей. За указанный год имеются сведения о выплате зарплаты работникам сельсовета и подведомственных организаций. Председатель сельсовета получал 360 рублей, секретарь – 285, заведующий избой-читальней – 360, завхоз школы – 350, делопроизводитель школы – 300, библиотекарь – 205, школьные техработники – по 200 рублей. В 1951 году на территории сельсовета значилось 612 хозяйств с общим числом жителей 2559 человек.

На контроле у сельского Совета депутатов была работа медпункта, избы-читальни, почтового отделения, школ. Сельский Совет депутатов отмечал, что лечебная работа медработников была поставлена неплохо, однако указывалось на недостаточную лечебно-просветительскую работу, недостаточный контроль за санитарно-гигиеническим

2017©nasledie-sluck.by

состоянием жилого фонда, источников водоснабжения. На территории сельсовета имелось 248 колодцев, 27 из них были неисправны. Отсутствовали общественные ведра, не проводилась периодическая чистка колодцев. Магазины на территории сельсовета не отвечали элементарным санитарным требованиям. В колхозах отсутствовали бани.

В июле 1954 г. к территории Первомайского сельсовета был присоединен колхоз имени Ворошилова с центральной усадьбой в деревне Новинки, ранее относящийся к упраздненному Поликаровскому сельсовету, и деревни Шантаровщина, Поликаровка, Аполины, Строхово. На 1 января 1956 г. на территории сельсовета располагались населенные пункты: Гольчичи, Заря, Кошище, Борок, Мойчево, Кастричник, Ленин, Ляды, Копань, Макавище, Нива, Дубровка, Каменистая, Хмелище, Кальчицы, Новины, Заплесье, Подсадок, Островок, Кулики, Боровая, Старая Нива, Красный Пахарь, Бондарево, Большое Таковище, Малое Таковище, Ржавка, Жилинка, Дзержинск, Поликаровка, Жилин Брод, Шантаровщина, Строхово, Новинки, Пильня, Аполины, Нивище, Бачко, в которых было 964 двора и проживали 3495 человек. Указом Президиума Верховного Совета БССР от 17 декабря 1956 г. Греский район был упразднен, его Греский, Мусичский, Покрашевский, Трухановичский и Первомайский сельсоветы вошли в состав Слуцкого района.

На сессии Первомайского сельского Совета депутатов 6 марта 1957 г. председателем сельисполкома был избран Иван Акимович Драгун, заместителем председателя – Владимир Демьянович Янович, секретарем – Мария Демьяновна Лях. Сессия определила состав постоянных комиссий сельского Совета депутатов: сельскохозяйственной, культурно-просветительной, бюджетной и заготовительной, дорожного строительства и благоустройства, социалистической законности и охраны общественного порядка. На сессии в повестке дня стоял вопрос встречи 40-й годовщины

Удзельнікі семінара назіраюць за сяўбой кукурузы. 1950-я гг.

2017©nasledie-sluck.by

Група перадавікоў кукурузаводаў Слуцкага раёна. 1956 г.

Великой Октябрьской социалистической революции. Обсуждалось обращение смоленских тружеников по вопросу сдачи продуктов животноводства в счет колхозов. Многие депутаты сельского Совета депутатов поддержали этот почин. Депутат Гришков обязался сдать в счет колхоза 150 литров молока, депутаты Ермак и Осипов решили сдать по 40 кг мяса и 100 литров молока в счет колхозов.

На сессии сельского Совета депутатов 26 июня 1957 г. были подведены итоги социалистического соревнования между Покрашевским и Первомайским сельсоветами. Отмечалось, что колхозы Первомайского сельсовета добились успехов в развитии всех отраслей колхозного производства…

Однако отмечалось, что колхозы недостаточное внимание уделяли производству кукурузы как основы прочной кормовой базы. В вину руководству колхозов было поставлено и то, что на территории сельсовета не построено ни одной бани. Среди колхозов сельсовета лучших производственных показателей и в 1957 г. добился колхоз имени Дзержинского. В этом же году колхоз имени Ворошилова стал называться колхозом имени Хрущева. В 1959 г. колхоз имени Калинина переименовали в колхоз «Россия».

Выполняя Указ Президиума Верховного Совета БССР по организации быта населения, на территории Первомайского сельсовета была проведена следующая работа: весной 1960 г. высажено 1340 штук плодовых и декоративных растений, отремонтировано 4,5 км дорог, построено 3 и отремонтировано 7 мостов, построено 7 цементных общественных колодцев, возведен магазин в деревне Шантаровщина, завершалось строительство бани в колхозе имени Дзержинского. В 1963 г. начато строительство 40 домов, в том числе 8 домов и Строховская начальная школа – из кирпича. Помощь в строительстве индивидуальных домов

2017©nasledie-sluck.by

Слуцкая дэлегацыя на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Масква, 1954 г.

застройщикам оказывали правления колхозов, выдав деньги авансом.

Решением Слуцкого райисполкома в 1963 г. колхоз имени Дзержинского стал носить название «Родина», а колхоз имени Хрущева – «Мир». На территории сельсовета в этот период проживали 3546 человек, насчитывалось 997 дворов. В 1964 г. на пост председателя исполкома Первомайского сельского Совета депутатов вступила Анна Степановна Дубовик.

В результате напряженной работы в 1966 г. колхозы сельсоветов достигли некоторых успехов по сравнению с 1965 г. Получена урожайность картофеля в колхозе «Россия» – 120,8 центнера с гектара, в колхозе «Родина» – 129, в колхозе «Мир» – 103,9, кукурузы соответственно – 262, 189 и 101 центнер с гектара. Все планы закупа продуктов от населения и колхозов выполнены полностью.

Хорошо был организован закуп молока у населения: при плане 30 тонн к 10 августа было закуплено 46 тонн. Колхозы сельсовета успешно выполняли планы продажи зерна государству. В 1970 г. колхозы успешно провели весеннюю посевную и уборочную. В два раза перевыполнили госплан производства зерна, выполнили план по картофелю, сену, обеспечили себя семенным и фуражным фондом. Валовой сбор зерна в колхозе «Россия» составил 10 940 центнеров, в колхозе «Родина» – 4502, в колхозе «Мир» – 6265 центнеров. В том же году колхозники построили 14 домов, строили еще 38 домов, капитально отремонтированы 45 домов, газифицированы 43 квартиры. На территории сельсовета числились: 2 лесничества, мехустановка, 2 фельдшерско-акушерских пункта, участковая больница, 6 школ, 2 библиотеки, 4 клуба, приклубная библиотека, 2 почтовых отделения, 2 стационарные киноустановки, 9 магазинов, столовая в деревне Кальчицы.

Т. Ефремова.
Слуцкі край. 2012. 12 студзеня.

2017©nasledie-sluck.by

Сводная ведомость актов по учету ущерба, причиненного гражданам немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками. Республика БССР. Бобруйская обл. Слуцкий район

Наименование сельсоветов	К-во инд. актов	Сумма ущерба по индивидуальным актам	Акты списки			Общая сумма ущерба по индивидуальным актам-спискам
			Кол-во листов	Кол-во хозяйств	Сумма ущерба по актам-спискам в рублях	
1	2	3	4	5	6	7
Бокшицкий	36	11 743 350	3	77	1 183 300	2 357 650
Белицкий	12	1 828 000	–	–	–	1 828 000
Велико-Сливский	26	1 240 400	2	35	2 112 100	3 352 500
Доросинский	30	4 535 332	12	359	14 551 620	19 086 952
Исернский	39	7 380 287	–	–	–	7 380 287
Ив. Огородницк.	73	2 214 130	10	244	64 753 976	66 968 106
Кировский	25	5 269 704	5	209	9 742 270	15 011 974
Козловицкий	10	1 048 317	1	11	1 263 750	2 312 067
Лучниковский	11	295 270	6	140	60 458 658	60 753 928
Ленинский	8	729 200	13	396	13 416 330	14 145 530
Мелешковский	24	4 064 442	–	–	–	4 064 442
Омговицкий	39	2 378 211	13	394	51 838 722	54 216 933
Октябрьский	15	968 899	6	237	6 302 326	7 271 255
Прощицкий	25	3 050 140	8	270	33 587 620	36 637 760
Серажский	9	1 810 249	–	–	–	1 810 249
Сороговский	19	2 197 040	2	60	7 962 190	10 159 230
Старевский	64	4 128 854	3	65	29 111 140	33 239 994
Середняковский	46	9 171 630	–	–	–	9 171 630
Тельмановский	9	837 580	–	–	–	837 580
Уреческий	24	3 823 450	13	497	41 151 819	44 975 269
По заявлениям эвакуиров. гр-н через обл. комиссию	6	481 156	–	–	–	481 156
Всего по ведомости	570	58 626 641	97	2994	337 435 821	396 062 462

сентябрь 1944 г. Председатель исполкома (подпись)

Фонды Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Слуцку

2017©nasledie-sluck.by

Дакументы сведчаць

Вытрымкі з рашэнняў выканаўчага камітэта Слуцкага гарадскога Савета дэпутатаў за 1944–1947 гг.

1944 год

8 августа

…Утвердить списки на 7912 человек на получение продовольственных и промтоварных карточек на август 1944 г.

11 августа

…В целях разрешения трудностей в коммунально-квартирном вопросе в размещении рабочих и служащих города, исполком городского Совета депутатов трудящихся устанавливает следующие мероприятия по г. Слуцку. Провести уплотнение коммунальных квартир и квартир частных граждан, проживающих в г. Слуцке. Вместо существующих норм 9 кв. м на человека эту норму сократить до 5 кв. м на жильца. При размещении рабочих и служащих в частных квартирах установить плату для последних по ставкам отдела коммунального хозяйства города. Оплата за жилплощадь частных домов должна вноситься домовладельцу.

29 августа

…Ввести с 1 сентября 1944 года единую форму карточек на хлеб и другие продукты и промтовары. Обеспечить в первую очередь организации и лиц, находящихся полностью на гособеспечении (детские дома, дома инвалидов, спец. дома), а также столовые, больницы, ясли, детсады. В первую же очередь обеспечить рабочих промышленности, транспорта и приравненных к ним и служащих.

26 октября

…Одобрить инициативу рабочих маслосырзавода г. Слуцка по вопросу восстановления города и вовлечения в эту работу всего трудоспособного населения. Установить для рабочих и служащих с 8-ми часовым рабочим днем и вольнонаемного состава воинских частей – 30 часов в месяц, для рабочих и служащих с удлиненным рабочим днем, студентов и учащихся – 15 часов в месяц, для граждан, не работающих на предприятиях и учреждениях, – 60 часов в месяц. К работам привлекать в нерабочее и вне учебное время. Работы оплачиваются предприятиями, для которых они производятся, по существующим сдельным расценкам. Руководителям обеспечить обязательное участие автогужевого транспорта: машины – 5 поездок в месяц, лошади – 15 поездок в месяц. Работы начать 29 октября 1944 года.

5 декабря

…Согласно существующему распоряжению Слуцкого горисполкома, обязать директора хлебокомбината не позже 6 декабря 1944 г. организовать выпечку хлеба с применением картофеля.

1945 год

9 марта

…В целях упорядочения электроснабжения города и решительной борьбы с расточительностью электроэнергии установить следующие лимиты потребления: для учреждений, квартир, столовых, магазинов, зрительных залов – 3 ватт на кв. метр площади, для учебных заведений, детских садов и лечебных учреждений – 4 ватт на кв. м, для кухонь, складов, лестничных клеток, коридоров и других вспомогательных учреждений – 0,5 ватт на кв. м, для парикмахерских 25 ватт на рабочее место. Запретить пользоваться электронагревательными приборами (утюгами, чайниками, плитками). Запретить пользоваться электроосвещением с 3 часов 30 минут до 18 часов.

2017©nasledie-sluck.by

12 мая

…Принять к сведению заявление начальника радиоузла, что полностью принимаются и выполняются заявки граждан города на радиофикацию квартир. В порядке подготовки к 1 мая радиофицированы окраины города – улицы 1 Августа и 11 Июля.

25 июня

…За выполнение положительного количества рабочих часов по восстановлению города занести на Доску почета в июне месяце коллектив сельхозмастерских, 10 СШ, мельницы «Прогресс».

23 июля

…Проект планировки и реконструкции города, сделанный в 1936–1938 гг., пропал во время войны. Вся центральная часть города полностью разрушена. Из 1894 домов общей площадью 89 543 кв. м осталось 752 дома площадью 22 535 кв. м.

…Учитывая, что существующий в городе кинотеатр работает с большими перебоями из-за отсутствия электроэнергии и не получает в плановом порядке горючее для работы имеющегося локомобиля, что не дает возможности обслужить трудящихся города и воинские части киносеансами, исполком решил разрешить дирекции кинотеатра до начала работы электростанции приобретать в неплановом порядке горючее из расчета 2 кг на киносеанс и обеспечить бесперебойную работу кинотеатра.

26 декабря

…Санитарно-эпидемическая станция города провела значительную работу по борьбе с инфекционными заболеваниями, в результате чего имеется резкое снижение инфекционных заболеваний по городу и району. При станции имеется баклаборатория, транспорт и в достаточном количестве дезсредства. Наряду с этим в работе имеется ряд недочетов: санпропускник не работает и не принято никаких мер к его ремонту. Лаборатория не обеспечена полностью реактивами и оборудованием. Недостаточно уделяется внимания санитарному состоянию Слуцкого хлебозавода и сам завод не удовлетворяет минимальным санитарным требованиям.

1946 год

21 февраля

…По городу Слуцку и прилегающим селам установлено 720 радиоточек, из них сельских – 40.

22 мая

…На основании постановления правительства установить скидки по квартирной плате для орденоносцев по городу Слуцку на 1946 год при месячной зарплате орденоносца до 75 руб. – 50 %. От 75 до 100 руб. – 40 %, от 100 до 150 руб. – 30 %, от 150 до 200 руб. – 20 %, более 200 руб. – 10 %.

В связи с тем, что единственным местом отдыха трудящихся города является парк культуры и отдыха, основные работы в котором заканчиваются, и для обслуживания парка требуется оркестр, просить Бобруйский облисполком разрешить приобретение комплекта музыкальных инструментов.

3 июня

…Исполком отмечает, что со дня освобождения города на станции Слуцк почти не проводилось никакой работы по восстановлению и отстройке. Сохранившееся здание вокзала совершенно пришло в негодность, в настоящее время разрушено и закрыто, дальнейшая эксплуатация его невозможна. Отсутствие вокзала не дает возможности обслуживать пассажиров, оборот которых на вокзале до 1 тыс. в сутки. Помещения кассы, буфета нет. Не ведутся работы по ремонту существующих помещений. Просить Бобруйский облисполком начать постройку вокзала на станции Слуцк и одного 8-ми квартирного жилого дома.

2017©nasledie-sluck.by

13 июля

…В связи с предстоящей отменой карточной системы на хлеб, крупу и макароны обязать торгующие организации города до 1 сентября 1946 г. дополнительно построить 8 магазинов.

25 июля

…Лечебными учреждениями города проведена 3-кратная профилактическая прививка против брюшного тифа, дизентерии и холеры – 2632 человека, против сыпного тифа – 645 человек, против оспы – 9113 человек и против дифтерии – 1330. Захлорировано 158 колодцев.

23 августа

…Индивидуальное жилищное строительство недостаточно. Из выданных в 1945–1946 гг. 350 участков застроено только 125.

1947 год

13 мая

…Обязать руководителей всех учреждений, предприятий, организаций и частных лиц зарегистрироваться в Слуцком горкомхозе, получить соответствующие номера на велосипеды, гужтранспорт, а также для собак с 15 мая по 1 июня 1947 года. Отпущенные супы-концентраты для города Слуцка по решению Облисполкома от 4 мая 1947 г. в количестве 4 центнеров распределить для улучшения питания следующим организациям: педучилище – 87 банок, отдел благоустройства – 42 банки, ремконтора – 32 банки, зеленхоз – 15 банок.

25 августа

…Выдать согласно прилагаемого списка организациям, предприятиям города соль по 4 кг на основного работника для засолки овощей.

13 сентября

…Удовлетворить ходатайство Слуцкого зеленхоза и разрешить иметь при питомнике опытный участок в 1 га по разведению винограда и других субтропических культур.

Падрыхтавала Т. Яфрэмава.

Фонды Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Слуцку.

2017©nasledie-sluck.by

АД ДНЯ ЎЧАРАШНЯГА ДА ДНЯ СЁННЯШНЯГА

З гісторыі прадпрыемстваў Случчыны

На 1.1.2014 г. у раёне налічвалася 24 прамысловыя прадпрыемствы. Буйнейшыя з іх – ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат», ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», ААТ «Слуцкі мясакамбінат», ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў», якія з'яўляюцца бюджэтаўтваральнымі.

Асноўныя галіны прамысловасці – харчовая і перапрацоўчая – налічваюць 9 прадпрыемстваў, на долю якіх прыпадае 90 % усёй прадукцыі, што выпускаецца. 15 прадпрыемстваў вырабляюць нехарчовыя тавары.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі цукраварафінадны камбінат».

Уведзены ў эксплуатацыю ў 1965 г. Гэта самае маладое прадпрыемства цукровай прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь. Першапачатковая праектная магутнасць камбіната складала 3000 тон перапрацоўкі цукровых буракоў у суткі. У 1992 г. прадпрыемства стала арэндным. У гэтым жа годзе ў сувязі з рэспубліканскай праграмай «Цукар» пачалася актыўная замена абсталявання з адначасовым павелічэннем магутнасці. У снежні 1996 г. прадпрыемства пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства. У 2006 г. камбінат выйшаў на магутнасць 6400 тон перапрацоўкі цукровых буракоў у суткі.

Вялікая ўвага надаецца мадэрнізацыі вытворчасці. За перыяд 2005–2010 гг. пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю сіласны склад бястарнага захоўвання цукру на 20 000 тон, цэх па сушцы і грануліраванні жамерын, склад фасаванага цукру на 10 000 тон, галерэя вываду сырых жамерын з ліній падачы буракоў на завод, поўнасцю зменена схема падрыхтоўкі і дазіроўкі матачнага утфелю і г. д. Як вынік – у 2006–2009 гг. камбінат штогод з'яўляўся пераможцам прэстыжнага Рэспубліканскага конкурсу «Прадукт года» ў намінацыі «Цукар». Працэс мадэрнізацыі прадаўжаецца і ў цяперашні час. Поўнасцю заменена

2017©nasledie-sluck.by

цеплавая схема прадпрыемства, устаноўлены два новыя выпарныя апараты, новы дыфузійны апарат калоннага тыпу магутнасцю перапрацоўкі 10 000 тон цукровых буракоў за суткі. Пабудавана фабрыка, дзе змацніраваны фасовачныя лініі вытворчасці нямецкай кампаніі «Фавема» для фасоўкі цукру ў папяровыя пакеты па аднаму кілаграму, 900 грамаў, укладка ў паддоны (палеты) групавой упакоўкі ад 10 і болей кілаграмаў да тоны, а таксама прасаванага цукру і фасоўкі ў біг-бэгі – для прамысловых патрэб. Магутнасць фабрыкі – да 500 тон фасоўкі цукру за суткі. Толькі ў 2013 г. на мадэрнізацыю выкарыстана каля 200 млрд рублёў.

Асноўная прадукцыя камбіната – цукар з цукровых буракоў і цукар-сырэц, пабочныя – бурачныя жамерыны, патака мелас, вапна, дэфекат.

Пакупнікамі слуцкага цукру з'яўляюцца Расія, Казахстан і іншыя краіны блізкага і далёкага замежжа.

ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» мае даччынае прадпрыемства «Аграсэрвіс ССК». У 2012 г. камбінат

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі цукраварафінадны камбінат»

папоўніўся новай структурнай – Старадарожскім кансервавым заводам.

Калектыў камбіната налічвае 750 чал.

Адкрытае акцыянернае прадпрыемства «Слуцкі сыраробны камбінат».

У 1932 г. у Слуцку пачалося будаўніцтва масласырзавода, які ўвайшоў у эксплуатацыю ў 1935 г. Колькасць працаўнікоў на ім была ўсяго 35 чалавек, а ў год перапрацоўвалася 2000 тон

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі сыраробны камбінат»



2017©nasledie-sluck.by

малака. Магутнасць павялічвалася з кожным годам, і ў 1941 г. ужо складала 2500 тон. У гады Вялікай Айчыннай вайны на заводзе дзейнічала падпольная група. У маі 1943 г. у выніку дыверсіі падпольшчыкаў быў узарваны. Адноўлены ў 1944 г., першую пасляваенную прадукцыю даў у 1945 г. Паступова завод развіваўся: у 1948 г. штат павялічыўся ў два разы, перапрацоўка малака складала 8000 тон у год, былі пабудаваны новыя цэхі па вытворчасці масла, сыру, кефіру, смятаны, тварагу, марожанага.

Развівалася ў краіне жывёлагадоўля. Толькі ў Слуцкім раёне было каля 100 малочнатаварных ферм, што патрабавала павелічэння магутнасці прадпрыемства, увядзення вытворчых плошчаў, новых тэхналогій. У 1978 г. пачалося будаўніцтва новага высокапрадукцыйнага прадпрыемства па перапрацоўцы малака, якое ўступіла ў строй у 1981 г. і пачало называцца «Слуцкі сыраробны камбінат». Прадпрыемства было агульнадзяржаўнага значэння і адпраўляла прадукцыю ў розныя куткі былога СССР.

Перамены, якія адбываліся ў пачатку 1990-х гг., адбіліся на жыцці камбіната і патрабавалі ад кіраўніцтва і калектыву новага падыходу да арганізацыі вытворчасці. У выніку камбінат быў пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае прадпрыемства. У гэтыя часы вялікая ўвага надавалася ўдасканаленню вытворчасці, яе мадэрнізацыі, укараненню інвестыцыйных праектаў. У 2006 г. была ўстаноўлена новая імпартная лінія, якая дала магчымасць перапрацоўваць да 300 тон малака ў дзень і значна павялічыць вытворчасць сычужных сыроў. У выніку кожны дзясяты кілаграм сыру, які вырабляецца ў Беларусі, – слуцкі. У 2010 г. рэканструяваны цэх натуральнамалочнай прадукцыі, цэх па вытворчасці масла і марожанага, казінага малака і г.д.

2011 г. стаў для камбіната знамянальным: быў атрыманы экалагічны сертыфікат, які сведчыць, што сістэма кіравання навакольным асяроддзем вытворчасці прадукцыі адпавядае ўсім міжнародным патрабаванням. Акрамя гэтага, маюцца і іншыя сертыфікаты, неабходныя для прамысловых прадпрыемстваў, каб пастаўляць сваю прадукцыю ў замежныя краіны. У пераліку камбіната больш за 160 назваў выпускаемай прадукцыі, якую ведаюць спажыўцы не толькі ў Беларусі, Расіі і іншых краінах СНД, але і ў Літве, Польшчы, Германіі, Францыі, Галандыі, Японіі, Маўрытаніі, Сінгапуры, Канадзе, ЗША… Асноўная спецыялізацыя камбіната – вытворчасць сычужных сыроў, але, акрамя іх, на экспарт ідуць смятана, масла, сухое абястлушчанае малако, тварог, казеін, сыроватка і іншая прадукцыя.

ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» прымае актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках, конкурсах, кірмашах. Аб поспехах сведчаць шматлікія Гран-пры, дыпломы, медалі. Сёння прадпрыемства з'яўляецца холдынгам, які аб'ядноўвае шэраг заводаў па перапрацоўцы малака (Пухавіцкі, Старадарожскі, Уздзенскі), сельскагаспадарчыя калектывы, Слуцкі кансервавы завод. У холдынгу працуюць каля 3,5 тыс. чалавек.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў».

Адно са старэйшых прадпрыемстваў раёна. У 1912 г. купцом Фёдарам Мышалавым быў пабудаваны паравы млын магутнасцю 30 конскіх сіл. Першапачаткова было перапрацавана 150 пудоў збожжа. Пасля рэвалюцыі млын стаў дзяржаўнай уласнасцю і атрымаў назву «Прагрэс».

2017@nasledie-sluck.by

У 2-й палове 1920-х гг. была праведзена рэканструкцыя прадпрыемства з заменай абсталявання. Вытворчасць мукі ўзрасла да 50 тон у суткі. У 1930-я гг. былі пабудаваны новыя склады, падведзена чыгуначная ветка, набыты новыя станкі, вытворчасць млына стала складаць 100 тон стандартнай мукі ў суткі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны прадпрыемства было разбурана і аднавіла работу ў жніўні 1947 г. Магутнасць складала 45 тон мукі ў суткі. Другая яго чарга ўступіла ў эксплуатацыю ў 1949 г., поўнасцю адноўлена – у 1953 г., вытворчасць мукі ў суткі складала 120 тон. З 1955 па 1958 г. пабудаваны камбікормавы завод праектнай магутнасцю 150 тон у суткі. У 1958 г. прадпрыемства перайменавана ў «Млынкамбінат № 6» упраўлення хлебапрадуктаў.

У 1968 г. разам з іншымі прадпрыемствамі горада млынкамбінат перайшоў на новыя ўмовы планавання і матэрыяльнага стымулявання. Датэрмінова да 7 лістапада 1970 г. калектыў выканаў пяцігадовае заданне. Млынкамбінат № 6 стаў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў»

народнай гаспадаркі СССР у Маскве за лепшае ўкараненне ў вытворчасць новай тэхнікі і тэхналогій. У хуткім часе млынкамбінат атрымаў новую назву – камбінат хлебапрадуктаў.

У 2000 г. прадпрыемства акцыянiравана і пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў». Сёння гэта – сучаснае збожжаперапрацоўчае прадпрыемства, у склад якога ўваходзяць: элеватар, млын, камбікормавы цэх, лінія па

2017©nasledie-sluck.by

вытворчасці ячных і манных круп, цэх па перапрацоўцы рапсу, сельскагаспадарчыя філіялы «Белая Русь» і «Агра-Замосце». У яго складзе – уласная птушкаферма (каля 8 тыс. курэй), пчальнік (50 сем'яў пчол), вялікая сетка крам.

У год прадпрыемства выпускае 25 тыс. тон – каля 20 відаў мукі і круп, штосутачна вырабляецца 650 тон рассыпных і 300 тон грануляваных камбікармоў – усяго каля 30 відаў гэтай прадукцыі для розных узроставых груп жывёл, птушкі і рыбы. Прадукцыя, якую выпускае прадпрыемства, канкурэнтаздольная і карыстаецца вялікім попытам на рынках Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы… Гэта пацвярджаецца шматлікімі дыпломамі, граматамі, медалямі, атрыманымі на выстаўках, конкурсах: рэспубліканскім конкурсе «Лепшая прадукцыя года – 2013» (мука, грэчка, манка, паўфабрыкаты мучных вырабаў) – залатымі медалямі, Міжнароднай выставе «Продэкспо-2013» у Маскве (мука аржаная хлебапякарная абдзірная) – сярэбраным медалём і дыпломам лаўрэата конкурсу «Лучший продукт – 2013» і г.д.

На прадпрыемстве працуе каля 1200 чалавек.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі мясакамбінат».

Заснаваны ў 1932 г. Першапачаткова гэта была забойная пляцоўка, якая забяспечвала горад мясам і мяснымі прадуктамі. У змену перапрацоўвалася 15 галоў жывёлы. У 1944 г. бойня, ужо будучы на базе міжрайканторы

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі мясакамбінат»

2017©nasledie-sluck.by

«Птушкапрама», атрымала назву «Птушкакамбінат». З ліпеня 1966 г. перайменаваны ў мясакамбінат. Тры гады – з 1973 па 1976 – будаваўся новы камбінат. У снежні 1976 г. дзеючы і зноў узведзены аб'яднаны ў адзіны мясакамбінат на плошчы 18 гектараў. Праектная магутнасць за змену складала: па мясу – 120 тон, каўбасных вырабах – 20 тон, паўфабрыкатах – 8,7 тоны. Магутнасць халадзільнікаў – 27 777 тон адначасовага захоўвання. Гэтыя магутнасці былі асвоены ў 1983 г. Сыравінай забяспечвалі гаспадаркі Слуцкага, Салігорскага, Любанскага, Старадарожскага, Капыльскага, Клецкага і Уздзенскага раёнаў. Колькасць працуючых – 1250 чалавек.

У 1995 г. камбінат пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае прадпрыемства. Кіраўнікам камбіната ўдалося не толькі захаваць традыцыйныя тэхналогіі вытворчасці мясной прадукцыі, але абнавіць і пашырыць асартымент, прыстасавацца да рыначных умоў гаспадарання.

У 2000 г. свінатаварны комплекс былога калгаса імя Дзяржынскага быў далучаны да мясакамбіната. За 11 гадоў тут удалося павялічыць пагалоўе свіней ад 4 да 21 тыс. У 2004 г. мясакамбінату быў выдадзены сертыфікат адпаведнасці, які пацвярджае, што сістэма менеджменту якасці ААТ «Слуцкі мясакамбінат» адпавядае сусветным стандартам. Акрамя комплексу камбінат мае тры сельскагаспадарчыя філіялы: «Наша Ніва», «Леткаўшчына» і «Грэск».

Сёння ААТ «Слуцкі мясакамбінат» – адно з буйнейшых прадпрыемстваў мясной галіны ў Беларусі. Галоўным напрамкам работы з'яўляецца выпуск сыравэнджаных сухіх каўбас і далікатэснай прадукцыі, ялавічыны і свініны, розных каўбасных вырабаў (сасіскі, сардэлькі, вараныя каўбасы і інш.), мясных паўфабрыкатаў, пельменяў, мясных і мясараслінных кансерваў. Асартымент налічвае звыш 300 пазіцый. Мясныя вырабы карыстаюцца вялікім попытам у пакупнікоў, экспартуюцца ў Расію, Азербайджан, скуры – у Італію, Польшчу, Літву і на Кіпр. Пашыраецца сетка фірменнага гандлю на тэрыторыі Беларусі (Слуцк, Салігорск, Мінск, Жыткавічы і інш.).

Аб дасягненнях прадпрыемства яскрава сведчаць медалі, дыпломы, прэстыжныя ўзнагароды рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, выставак, кірмашоў: конкурс «Лучшие товары Республики Беларусь», «Прадукт года», «Густ», «Лучшая продукция Беларуси в Москве» і г.д.

На прадпрыемстве працуюць звыш 1300 чалавек.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі хлебазавод».

Дата заснавання прадпрыемства – снежань 1953 г. Да гэтага, у розныя часы, гараджан хлебам забяспечвалі невялікія пякарні, якія размяшчаліся ў розных частках горада. Першай прадукцыяй новага завода быў чорны (жытні) і белы хлеб. Працавалі дзве печы, якія выпякалі да 15 тон хлеба ў суткі. У пачатку 1954 г. пашырыўся асартымент: пачалі выпякаць булачныя і кандытарскія вырабы. Да 1970-х гг. завод перастаў задавальняць патрэбы случчан свайго прадукцыяй. Для пашырэння асартыменту патрабавалася новае абсталяванне і тэхналогіі. Таму і паўстала пытанне будаўніцтва новага завода. У 1975 г. яно было пачата і закончана аж у 1980 г. Былі ўстаноўлены 2 лініі з печамі для выпуску хлеба магутнасцю 60 тон у суткі і адна лінія для булачных вырабаў магутнасцю 12 тон у суткі. У 1983 г. пачалі выпускаць здобныя сухары.

2017©nasledie-sluck.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі хлебазавод»

У 1996 г. прадпрыемства было пераўтворана ў ААТ «Слуцкі хлебазавод». З 2005 г. пачала праводзіцца вялікая работа па абнаўленні тэхнічнага абсталявання, укараненні новых тэхналогій, аўтаматызацыі і камп'ютарызацыі вытворчых працэсаў і ўліковых аперацый. Кантроль якасці ажыццяўляе вытворча-тэхналагічная лабараторыя, якая акрэдытавана на тэхнічную кампетэнтнасць з 2003 г.

Сёння ААТ «Слуцкі хлебазавод» – сучаснае прадпрыемства са сваёй гандлёвай маркай «Слуцкі каравай» – добра вядома ў краіне. Мае 7 гандлёвых кропак у Слуцку і павільён у г. Старыя Дарогі. Асартымент уключае каля 100 назваў прадукцыі: розныя па саставу хлябы, у т. л. заварныя з мукі жытняй грубага памолу, з жытняй сеянай, пшанічнай 1-га гатунку з прымяненнем дабавак арэхаў, зярнят сланечніку, разынак, курагі і інш., булачныя вырабы, пірагі, тоставыя вырабы, сухары, сушкі, сухары паніровачныя, квас сухі жытні. Сярод кандытарскіх вырабаў – торты, пірожныя, кексы, пернікі, пячэнне, слодычы мучныя, паўфабрыкат слоены замарожаны і інш. Ёсць арыгінальныя распрацоўкі, напрыклад, пернік «Новинка». Ён гатуецца па тэхналогіі, якой у Беларусі ніхто не валодае. Увага надаецца выпуску прадукцыі лячэбна-прафілактычнага прызначэння: з фруктозай, вотруб'ем, аўсянымі шматкамі, ёдаказеінам і інш. Кожны год асартымент прадукцыі абнаўляецца на 40–45 %. У суткі вырабляецца звыш 20 тон хлеба, 8 тон булачных вырабаў, 2 тоны абаранкаў і сухароў, 500 кг кандытарскіх вырабаў.

За якасць вырабаў прадпрыемства мае шэраг узнагарод.

На прадпрыемстве працуюць звыш 300 чалавек.

2017©nasledie-sluck.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі льнозавод».

Льнозавод пачаў будавацца ў 1955 г. і з перапынкамі ўзводзіўся да канца 1960 г. Перапрацоўку льнотрасты на заводзе пачалі са студзеня 1961 г., але датай нараджэння прадпрыемства лічыцца 1 сакавіка 1961 г., калі былі выраблены 100 тон валакна. Ужо ў першы год работы завод перапрацаваў 3478 тон ільнотрасты і вырабіў 924 тоны льновалакна, у т.л. 440 тон – доўгага.

Пазней завод нарыхтоўваў па 15–16 тыс. тон трасты – столькі перапрацаваць было немагчыма, таму частка прадавалася ў іншыя вобласці. Прадпрыемства нарошчвала магутнасці, замест адной пачалі працаваць тры паточныя лініі, выхад валакна складаў да 3000 тон. З 1972 г. пачаўся выраб кастрапліт з кастрыцы. Перыяд росквіту прадпрыемства выпаў на савецкія гады. Завод неаднойчы выходзіў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод прадпрыемстваў горада, тройчы – рэспубліканскага і атрымаў Чырвоны сцяг на вечнае захоўванне.

З 1991 г. пачаўся спад ільнаводства. Зменшыліся плошчы пасеваў, знізілася ўраджайнасць (з 10 ц/га ў 1991 г. да 2,1 ц/га, а ў асобных гаспадарках да 1,2 ц/га ў 1999 г.).

У жніўні 1995 г. прадпрыемства стала адкрытым акцыянерным таварыствам «Слуцкі льнозавод», заснавальнік – Мінскі аблвыканкам.

З 2000 г. з'явіліся станоўчыя моманты ў вырошчванні льну. На заводзе працавала каля 400 чалавек. У 2004 г. у сыравінную зону ўваходзілі гаспадаркі Слуцкага, Салігорскага, Старадарожскага і Капыльскага раёнаў. Агульная плошча пасеваў складала 1750 га, у т.л. у Слуцкім – 1100 га. Пры гэтым асноўная частка – 760 га – прыпадала на пасевы

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі льнозавод»

2017©nasledie-sluck.by

самога завода на арандаваных у сельскагаспадарчых вытворчых кааператывах (СВК) землях. Было атрымана амаль 5000 тон ільнотрасты.

З 1 студзеня 2010 г. прадпрыемства рэарганізавана ў філіял «Слуцкі льнозавод» ААТ «Валожынскі льнокамбінат», але з 2012 г. зноў стала ААТ «Слуцкі льнозавод». У цяперашні час завод працуе двума патокамі ў дзве змены, штосутачна вырабляе 5 тон кароткага і доўгага валакна, якое з'яўляецца асноўнай прадукцыяй і выкарыстоўваецца для вытворчасці натуральных льняных тканін. На прадпрыемстве таксама атрымоўваюць льносемя (выкарыстоўваецца ў якасці рэпрадуктыўнага матэрыялу, прыгодна для вытворчасці алею) і кастрыцу, якая ідзе на вытворчасць для атрымання цеплавой энергіі.

На заводзе праводзіцца вялікая работа па развіцці і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, укараненні новых тэхналогій. Пабудаваны новы цэх, дзе да пачатку перапрацоўкі ўраджаю 2014 г. установлена высокапрадукцыйная лінія па выпуску доўгага валакна.

На прадпрыемстве працуюць 149 чалавек.

Падрыхтавала В.С. Відлога.

ГІСТОРЫЯ ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Па старонках раённай газеты «Слуцкі край»

2001 год

17 лютага

У Слуцкай узбуйненай друкарні сярод рознай прадукцыі друкуюцца 11 газет. З іх пяць – дзяржаўныя: «Слуцкі край», «Салігорскі веснік», «Шахцёр», «Голас Любаншчыны» і «Навіны Стародарожчыны». Агульны разавы тыраж усіх газет – 52 100 экзэмпляраў.

***

Кніжны фонд цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада складае 257 931 экзэмпляр, за мінулы год ён павялічыўся на 738 экзэмпляраў. Бібліятэкі горада наведваюць 20 655 чытачоў, у тым ліку цэнтральную – 10 229 чалавек, дзіцячую – 5603.

***

У сістэме аховы здароўя раёна працуюць 2218 чалавек, з іх урачоў – 268, сярэдняга медперсаналу – 1137, іншых работнікаў – 813. Не хапае сямі ўрачоў-педыятраў участковых, шасці ўрачоў-тэрапеўтаў, шасці ўрачоў-стаматолагаў.

30 чэрвеня

КАЛІ ЛАСКА, У ФІЛІЯЛ МУЗЕЯ

На аднапавярховым будынку (вул. Леніна, 153), які мае цікавае гістарычнае мінулае – колісь тут быў гасціны двор, з'явілася шыльда «Філіял краязнаўчага музея «Побыт сялян XIX – пач. XX ст.». Днямі адбылося ўрачыстае адкрыццё філіяла…

Экспанатаў у гарадскім музеі накапілася багата і пачалі з'яўляцца нязручнасці пры захаванні асобных з іх, а таксама пры правядзенні масавых школьных экскурсій. Настала неабходнасць стварэння філіяла… Пачаўся рамонт і пераабсталяванне будынка пад філіял музея. Было вырашана ў філіяле размясціць экспазіцыю «Побыт сялян XIX – пач. XX ст.», адначасова ствараючы базу для правядзення ўрокаў гісторыі для школьнікаў горада і раёна, якія могуць знаёміцца з сялянскім побытам не толькі па падручніках.

…Сялянскі побыт… бабулін кут… Тут і жорны, ступа з таўкачом, калаўрот,

2017@nasledie-sluck.by

валак і качалка, цяжкія вугалёвыя прасы, саматканкі, самаробныя шуфлікі, глякі, бязмены, бойкі для вырабу масла, дзежкі для цеста, хамуты… Адчуваецца, што ўсё гэта рабілася з любоўю, бо ўсё дабротнае і прыгожае, здаецца, што і сёння ад гэтых прылад, убораў вее цяплом і дабрынёй…

Н. Селязнёва.

11 жніўня

УРУЧАНЫ ДЫПЛОМЫ

У мінулы аўторак у гарадскім Доме культуры прайшла ўрачыстая цырымонія ўручэння дыпломаў аб вышэйшай адукацыі першым 24 выпускнікам вочнага аддзялення Слуцкага цьютарскага пункта дыстанцыйнага навучання Сучаснага гуманітарнага інстытута. …

Дырэктар Слуцкага ЦПДН Сучаснага гуманітарнага інстытута І.В. Гвоздзь вітаў выпускнікаў, усіх прысутных. Ён адзначыў, што на працягу чатырох гадоў студэнты аддзялення авалодалі спецыяльнасцямі юрыстаў і эканамістаў, выкарыстоўвалася дыстанцыйная тэхналогія навучання. Вучоба хоць і платная, але праводзіцца па ўсёй строгасці, па самых сучасных праграмах з улікам патрабаванняў сённяшняга дня. І гэта зразумела. Сучасны гуманітарны інстытут мае брытанскі сертыфікат адпаведнасці.

Н. Громава.

22 верасня

«НІВА» – ЗА ДОБРУЮ РАБОТУ

Абласны выканаўчы камітэт узнагародзіў Слуцкі лясгас аўтамабілем «Ніва» за дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, стабільнае эканамічнае становішча, высокі санітарны стан лясоў, добраўпарадкаванне лясоў у рэкрэацыйных мэтах (для адпачынку).

Ганаровымі граматамі аблвыканкама і грашовымі прэміямі ўзнагароджаны дырэктар лясгаса А.Р. Жылко і вадзіцель Ю.М. Бузун, а ляснік Вераб'ёўскага лясніцтва Д.К. Гудвіловіч і намеснік дырэктара лясгаса заслужаны лесавод Я.А. Гурыновіч – Ганаровымі граматамі Мінскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання.

29 верасня

СЛУЧЧАНЕ НА ДАЖЫНКАХ

Удзел у рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2001», які праходзіць у Мазыры, прымае дэлегацыя случчан. У яе складзе – старшыня раённага выканаўчага камітэта З.К. Ломаць, яго намеснік, начальнік управлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Ю.П. Саўчанка, старшыня калгаса «Ленінскі шлях» М.І. Васілевіч, камбайнеры Б.М. Сініца і І.Г. Шусцер (калгас імя Арджанікідзе), якія на камбайне «Мега-218» намалацілі 2011 тон зерня, М.У. Далгалевіч і М.В. Рогаль (калгас імя Чкалава, іх намалот – 1503 тоны на камбайне Е-525), вадзіцелі У.А. Кулеш (калгас «Ленінскі шлях», ГАЗ-5314) і А.В. Долбік (калгас імя Чкалава, ЗІЛ-555), якія перавезлі адпаведна 1294 і 1451 тону збожжа.

У рэспубліканскім спаборніцтве па ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур у 2001 годзе сярод маладых вадзіцеляў, занятых на адвозцы збожжа ад камбайнаў, па I групе транспарту першае месца заняў Уладзімір Анатольевіч Кулеш, а на II групе транспарту таксама першае месца заняў Аляксандр Віктаравіч Долбік. Кожны ўзнагароджаны Ганаровай граматай і халадзільнікам.

Камбайнеры-случчане атрымалі трэція прэміі, а ў падарунак – тэлевізары.

5 снежня

УЗНАГАРОДЫ АБАРОНЦАМ УКРАІНЫ

30 лістапада ў аблвыканкаме прайшло ўручэнне медалёў «Абаронца Айчыны» ветэранам, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі

2017@nasledie-sluck.by

Украіны. Уручаў узнагароды Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь А. Дронь. Сярод тых, хто ўзнагароджаны ў адпаведнасці з указам прэзідэнта Украіны Л.Д. Кучмы, – і случчане Дзмітрый Пятровіч Белаводскі, Пётр Аляксеевіч Дзевяцерыкоў, Аляксей Іванавіч Пацалуенка, Сямён Ізраілевіч Аўрушчанка.

Ветэранаў – абаронцаў украінскай зямлі павіншавалі намеснік старшыні аблвыканкама С.С. Паўлюкевіч.

27 снежня

БУДУЮЦЦА КВАТЭРЫ

За 11 месяцаў інвестыцыі ў асноўны капітал у Слуцку склалі 8277 мільёнаў рублёў (147,3 % да адпаведнага перыяду 2000 года). Уведзена ў эксплуатацыю 215 кватэр агульнай плошчай 17 122 кв. метры супраць 79 кватэр плошчай 7074 кв. метры ў 2000 годзе.

У раёне інвестыцыі ў асноўны капітал склалі 2757 мільёнаў рублёў (93 % да мінулагодняга). 72 кватэры агульнай плошчай 8193 кв. метры прынялі жыльцоў, за 11 месяцаў 2000 года было здадзена 67 кватэр на 6831 кв. метр агульнай плошчы.

П. Жук, начальнік гарадскога аддзела статыстыкі.

2002 год

12 лютага

ПІТОМНІК ВЫСОКАЙ КУЛЬТУРЫ

Па выніках работы ў 2002 годзе лясному пітомніку Слуцкага лясгаса прысвоена званне «Лясны пітомнік высокай культуры». Такое рашэнне прынялі калегія Камітэта лясной гаспадаркі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў лесу і ўзнагародзілі случчан Ганаровай граматай. Лясны пітомнік лясгаса створаны ў 1967 годзе на тэрыторыі Вераб'ёўскага лясніцтва і цяпер займае 30,8 гектара плошчы. Летась у ім вырошчвалася 18 відаў дрэў і кустоў. Акрамя саджанцаў сасны і елкі, у пітомніку вырошчваюцца лекава-тэхнічная сыравіна, пладовыя дрэвы і кусты, ягаднікі. У мінулым годзе асвоілі метад вырошчвання хвойных парод чаранкамі ў цяпліцы. Колькасць саджанцаў забяспечвае аблясенне 300 гектараў высечаных плошчаў штогод і рэалізацыю пасадачнага матэрыялу на два мільёны рублёў…

Я. Гурыновіч.

16 кастрычніка

НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

Гасцінна запрашаюць вяскоўцаў Случчыны 40 культустаноў, з іх – раённы цэнтр народнай творчасці, 34 сельскія Дамы культуры і сельскія клубы, два цэнтры культуры, народны дом, дом фальклору, цэнтр рамёстваў. Сельская дзетвара развівае свае таленты ў сямі музычных школах і школах мастацтваў. У 297 аматарскіх клубных фарміраваннях займаюцца 3463 чалавекі, з якіх 2372 – у гуртках мастацкай самадзейнасці. 10 мастацкім калектывам раёна прысвоена ганаровае званне «народны».

Вяртае моладзь да самабытных промыслаў іх бацькоў Квасыніцкі цэнтр рамёстваў, у якім працуюць майстэрні па лозапляценні, ткацтве, роспісе па дрэве, лепцы з гліны, інкрустацыі саломкай, беларускай лялькі. …Сюды прыязджаюць для абмену вопытам аматары народных промыслаў з іншых вёсак і раёнаў, тут праводзяцца выстаўкі работ народных умельцаў.

19 кастрычніка

ПРЫЯРЫТЭТ – САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ

17–18 кастрычніка на базе Мінскай вобласці прайшоў семінар кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў. У ім прыняў удзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. На семінары разгледжана тэма

2017©nasledie-sluck.by

«Вядучыя галіны сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь: стан і актуальныя сферы развіцця». Практычныя заняткі семінара праходзілі ў рэгіёнах Мінскай вобласці, у тым ліку ў Слуцку і Слуцкім раёне.

2 лістапада

ПАМЯЦЬ ПАТРЭБНА ЖЫВЫМ

У Слуцку на тэрыторыі першага гарадка працуюць ваеннаслужачыя 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сіл рэспублікі. У гады Вялікай Айчыннай вайны на гэтай і навакольнай мясцовасці нямецка-фашысцкія захопнікі арганізавалі канцэнтрацыйны лагер. Зараз вядуцца тут раскопкі месцаў пахавання яго вязняў.

Салдаты батальёна дзейнічаюць згодна з планам правядзення пошукавых работ. Спачатку б'юць шурфы ў намечаных месцах, потым праводзяць раскопкі. Яны ўжо знайшлі астанкі больш сарака чалавек, у тым ліку і дзяцей. Праз некалькі дзён байцы спыняць работу, але ў наступным годзе з пачаткам сезона (май) пошукі будуць працягнуты. Кіруе работамі камандзір пошукавай роты старшы лейтэнант Д. Суржко.

М. Сярко.

23 лістапада

Зараз на Случчыне 19 фермерскіх гаспадарак (шэсць гадоў таму было 16), у якіх 776 га зямлі, у тым ліку ворнай – 666 га. Пяць фермерскіх гаспадарак існуюць ужо больш за 10 гадоў: М.М. Сарагаўца (арандуе землі ў калгасе «1-е Мая»), У.Г. Грэскага (эксперыментальная база «Танежыцы»), І.С. Галоціка (калгас «1-е Мая»), Л.Д. Шуба (калгас «III Інтэрнацыянал»), Ю.С. Даманскага (калгас «Прамень камуны»). У мінулым годзе ўдзельная вага фермерскіх гаспадарак у агульнараённым продажы сельгаспрадукцыі дзяржаве склала: збожжа – 1 %, малака – 0,1 %, цукровых буракоў – 0,4 % ад раённага продажу.

21 снежня

У Слуцку для забеспячэння тэлефоннай сувяззю зманціраваны і працуюць сем аўтаматычных тэлефонных станцый па прадастаўленні паслуг арганізацыям і насельніцтву. Манціраваная ёмістасць станцый – 25 202 нумары, задзейнічаная – 24 59 нумароў.

2003 год

11 студзеня

«ЭМАЛЬПАСУДА» – ЛІДЭР У КАНЦЭРНЕ

Новых сур'ёзных дасягненняў у павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці – на 4,5 % – плануюць у гэтым годзе дасягнуць на РУП «Слуцкі завод «Эмальпасуда». Як сведчаць вынікі работы прадпрыемства за 2002 год, падставы для гэтага ёсць. На 6,1 % узрос аб'ём таварнай прадукцыі ў супастаўных цэнах у параўнанні з папярэднім годам, 116 % склаў аб'ём экспарту (у цэлым завод у сваёй галіне вытворчасці дабіўся найбольш высокіх паказчыкаў сярод прадпрыемстваў канцэрна «Белмясцпрам»). А поспехі на РУП «Слуцкі завод «Эмальпасуда» сталі магчымымі таму, што тут рэгулярна абнаўляюць асартымент прадукцыі, займаюцца тэхнічным пераўзбраеннем вытворчасці.

М. Баравы.

26 лістапада

УРУЧАНЫ БІЛЕТЫ

У апошні час папаўняецца гарадская арганізацыя БРСМ новымі членамі. Прыемна, што ў маладзёжную арганізацыю паступае школьная моладзь. Днямі ў першым ваенным гарадку ў пакоі Баявой Славы адбылося ўрачыстае ўручэнне білетаў членаў БРСМ 19 вучням СШ № 12 і 37 школьнікам СШ № 2. Не менш урачыста праходзіла ўручэнне членскіх білетаў у краязнаўчым музеі вучням СШ № 8 (28 чалавек) і СШ № 11 (29 чалавек).

2017@nasledie-sluck.by

У музеі баявой славы і ў краязнаўчым музеі да рабят звяртаўся з добрымі пажаданнямі старшыня камітэта садзейнічання пры Слуцкім ваенкамаце, намеснік старшыні савета ветэранаў 29-й танкавай дывізіі І.С. Саніковіч, работнікі ГК ГА БРСМ. Многія вучні сярэдняй політэхнічнай школы № 3 таксама сталі членамі БРСМ, ім уручаны білеты ва ўрачыстых абставінах. Цяпер у пярвічнай арганізацыі гэтай школы налічваецца 312 членаў маладзёжнай арганізацыі…

І. Міснік.

3 снежня

ЮБІЛЕЙНЫЯ МЕДАЛІ З МАСКВЫ

У сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння вядомага ва ўсім свеце канструктара, які ўнёс дастойны ўклад у развіццё айчыннай касманаўтыкі, ураджэнца г. Слуцка С.А. Косберга Федэрацыяй касманаўтыкі Расіі выпушчаны юбілейны медаль.

У гэтыя дні ў Слуцку пабывалі нашы знакамітыя землякі – член Савета ветэранаў касманаўтыкі У.М. Дудко, член-каррэспандэнт Расійскай акадэміі навук, намеснік старшыні камісіі па эканамічнай бяспецы Дзяржумы Расіі А.А. Куніцкі. Яны па даручэнні Федэрацыі касманаўтыкі Расійскай Федэрацыі ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі юбілейныя медалі, якіх удастоены старшыня гарвыканкама А.А. Сайко, старшыня гарсавета дэпутатаў (былы дырэктар музея) В.С. Відлога і краязнаўчы музей за ўвекавечанне памяці С.А. Косберга на яго малой радзіме. Госці з Масквы таксама ўручылі музею ад імя генерал-палкоўніка І.А. Мураўёва карціну і дакументы аб укладзе нашых землякоў у развіццё касманаўтыкі.

20 снежня

ВІНШУЕМ, СЫРАРОБЫ!

Упершыню прадукцыя ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» была прадстаўлена на рэспубліканскім грамадскім конкурсе «Лепшая прадукцыя года – 2003». Дэбют случчан быў паспяховым. Дырэктар камбіната А.М. Сцяцко расказаў, што ў конкурсе прымалі ўдзел звыш 200 прадпрыемстваў Беларусі розных форм уласнасці – малочнай і мясной галіін, кансервавыя заводы, прадпрыемствы па вытворчасці рыбных і кандытарскіх вырабаў і іншыя. Конкурс праводзіўся ў два этапы. Першы – лабараторныя даследаванні прадукцыі на гарантаванасць якасці, карыснасці для спажыўцоў… Другі этап – дэгустацыя прадукцыі… Шэсць назваў прадукцыі ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», якія былі прапанаваны на конкурс, атрымалі станоўчую ацэнку

Узнагароды за лепшую прадукцыю ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат»

2017©nasledie-sluck.by

журы і спажыўцоў, а чатыры найменні – сыр «Пашахонскі», масла «Аматарскае» салодка-кісласметанковае, сыр плаўлены каўбасны «Слуцкі» і сыр плаўлены вэнджаны «Асобы» ўдастоены дыпломаў конкурсу «Лепшая прадукцыя года – 2003». Немалая заслуга ў поспеху прадпрыемства галоўнага тэхнолага Н.М. Малышка, тэхнолагаў Н.М. Сыцько, Н.В. Місючэнка, начальніка лабараторыі Т.І. Савановіч, інжынераў-хімікаў Н.М. Шклярэўскай, С.А. Федаровіч, начальнікаў сырцэха – А.А. Кобель, маслацэха – Т.М. Пацыкайлік, цэха плаўленых сыроў – А.С. Козак, інжынера-мікрабіёлага А.Д. Алікевіч, усяго калектыву камбіната.

Слуцкі сыраробны камбінат сярод галіновых прадпрыемстваў Мінскай вобласці атрымаў на конкурсе найбольшую колькасць дыпломаў…

Н. Анатольева.

2004 год

14 студзеня

У Слуцкім раёне шмат гадоў працуюць сем дзіцячых музычных школ, пяць з іх рэарганізаваны ў школы мастацтваў. У гэтых школах вучацца ад 600 да 700 дзяцей хлебаробаў больш як з 60 вёсак.

Н. Селязнёва.

14 лютага

ЗА МЕЖАМІ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

У нашым горадзе і раёне жыве 361 былы воін-інтэрнацыяналіст. 337 удзельнічалі ў баях у Афганістане, 24 чалавекі выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Егіпце, В'етнаме, Паўночнай Карэі, Венгрыі, Анголе, Сірыі, Бангладэш. Усе гэтыя былыя вайскоўцы, ад радавога да палкоўніка, былі ў тых краінах простымі стралкамі і танкістамі, артылерыстамі, сувязістамі, ракетчыкамі і інш.

Сапраўдным месцам праяўлення мужнасці і адвагі, гераізму стаў для нашых землякоў Афганістан. Кожны з іх знаходзіўся ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у гэтай краіне ад аднаго да трох гадоў. Многія былі там два разы, многія маюць па аднаму, а то і некалькі раненняў. Практычна ўсе «афганцы» ўзнагароджаны баявымі ордэнамі ці медалямі. На жаль, дзесяць случчан загінулі. Восем з іх пахаваны на могілках горада і раёна, два – у Расіі.

Слуцкая гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» сваю галоўную задачу сёння бачыць у патрыятычным выхаванні моладзі, каб будучыя абаронцы Айчыны былі адданымі сынамі народа, любілі Радзіму, сваю зямлю, сваю Случчыну, сталі сапраўднымі патрыётамі Беларусі. Шырока і актыўна гэту работу праводзяць А.А. Курловіч, А.М. Гнаявых, Я.І. Рубцоў, Б.Ц. Шкут, С.І. Рэбрык, І.М. Жаркоўскі, С.А. Гаргун, А.І. Вяргейчык і многія іншыя.

В. Белавусаў.

28 лютага

Згодна з рашэннем Камітэта па справах воінаў-інтэрнацыяналістаў пры Савеце кіраўнікоў урадаў дзяржаў – удзельніц СНД каля 70 былых воінаў-афганцаў Беларусі ўзнагароджаны памятным медалём «15 гадоў вываду савецкіх войскаў з Афганістана». З нашай вобласці медалі ўручаны шасці чалавекам. Сярод узнагароджаных і прадстаўнік слуцкіх «афганцаў», старшыня гарадской арганізацыі БСВВА падпалкоўнік у адстаўцы В.Д. Белавусаў. Узнагароджанне прайшло ў Мінску, яго праводзілі прадстаўнікі Камітэта.

С. Міхайлаў.

24 красавіка

У горадзе Бітола (Македонія) праходзіў конкурс «Малы Бітольскі Маммарт – 2004», на які прадставілі работы выхаванцаў Слуцкай мастацкай школы. Нядаўна з

2017©nasledie-sluck.by

гэтага экзатычнага горада прыйшла вестка: работы вучня чацвёртага класа Іллі Падалкі высока ацэнены, і гэта дае права на ўдзел юных мастакоў і педагога школы ў адкрыцці выстаўкі ў г. Бітола.

Работа Іллі ўдастоена дыплома «Залатая палітра». Гэта вельмі вялікая ўзнагарода, вышэй толькі Гран-пры.

Н. Міхайлава.

15 мая

У пачатку мая маладыя жыхары Гацукоўскага сельсавета па ініцыятыве РК ГА БРСМ пасадзілі сквер з 62 дрэўцаў (клёны, ліпы, рабіны, бярозкі) каля помніка загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны. Тут жа адбыўся мітынг… А яшчэ ў гэты дзень 14 школьнікаў сталі членамі БРСМ.

І. Кляшчук.

2005 год

15 студзеня

У дзіцячым санаторыі «Сонейка» актыўна выконваюць праграму Пастаяннага Камітэта Саюзнай Дзяржавы па аздараўленні дзяцей з тых зон, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У мінулым годзе Дэпартамент сацыяльнай палітыкі Пастаяннага Камітэта Саюзнай Дзяржавы выдзеліў сродкі на лячэнне 40 дзяцей, якія знаходзіліся ў нашым санаторыі. Адна група дзяцей у колькасці 19 чалавек прыбыла з Гомеля, другая, 21 чалавек, – з Салігорска. …

У канцы снежня мінулага года ў санаторыі працавалі спецыялісты кафедры педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі – прафесар І.В.Васілеўскі, дацэнты М.В. Кабанава, В.Д. Юшко, якія курыруюць працу ўстановы.

Л. Крыпак.

30 красавіка

З пачатку гэтага тыдня ў гонар 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне па ініцыятыве адміністрацыі, прафсаюзнай арганізацыі, членаў БРСМ ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў» пасаджаны яблыневы сад.

Урачыста прайшло гэта мерапрыемства, на якое запрасілі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў прадпрыемства – В.В. Рымашэўскага, В.І. Янечка, К.І. Яновіч, М.Д. Міцкевіча, воіна-афганца А.М. Даніловіча. На тэрыторыі падсобнай гаспадаркі пасаджана 200 дрэўцаў. У акцыі прыняла ўдзел старшыня райкама Слуцкай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Л.А. Янук.

А. Жогла.

14 мая

6 мая на тэрыторыі 307-й асобнай чыгуначнай брыгады, якая размешчана ў нашым горадзе, быў адкрыты помнік Герою Савецкага Саюза Пятру Іванавічу Купрыянаву. Гэтага звання яфрэйтар стралковай роты ўдастоены пасмяротна. У адным з баёў на тэрыторыі Латвіі ў вёсцы Ліэльдзэльда ён паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава – закрыў сабою амбразуру варожага дота, цаной жыцця забяспечыў таварышам поспех у наступленні.

На ўрачыстасць сабраліся ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, воіны чыгуначнай брыгады, моладзь, рабочыя і служачыя горада… Адкрыць помнік было даручана ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Івану Сафронавічу Сала, які ваяваў у складзе 29-га танкавага корпусу, як і Пётр Іванавіч Купрыянаў.

А. Жогла.

18 мая

Адбылося адкрыццё абноўленай Рэспубліканскай Дошкі гонару. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, на яе занесены працоўныя калектывы, асобныя рэгіёны-пераможцы спаборніцтва за дасягненне найлепшых вынікаў у сацыяльна-эканамічным

2017©nasledie-sluck.by

развіцці за 2004 год. Сёлета з 36 новых намінантаў Дошкі гонару восем прадстаўляюць Міншчыну. Сярод іх – і Слуцкі раён, які заняў другое месца ў спаборніцтве сярод раёнаў.

11 чэрвеня

ГОРАД МЯНЯЕ ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД

Да правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005» калектыву ААТ «Салігорскпрамбуд» даручана ўзвядзенне, рэканструкцыя і добраўпарадкаванне 27 аб'ектаў у горадзе Слуцку. ...Гэта аб'екты ў цэнтральнай частцы горада: Дом Саветаў, цэнтр дзіцячай творчасці, гарадскі Дом культуры, гарадская бібліятэка, Дом гандлю, рэстаран «Зара», гарадскі стадыён і парк культуры і адпачынку, а таксама цэнтральная плошча горада. ...Акрамя гэтага – 16 гандлёвых кропак, тры жылыя дамы. ...На гэтых аб'ектах працуюць каля 500 рабочых прадпрыемства.

М. Балванові́ч.

16 ліпеня

Меліяратары амаль першымі пачалі работы па падрыхтоўцы горада да рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005» і, магчыма, аднымі з першых завершаць свой участак работ. Арганізацыяй, ад якой амаль цалкам залежыць канчатковы выгляд поймы Случы, з'яўляецца адкрытае акцыянернае таварыства «ПМК-71» з Грэска. ...

Дзень за днём Случ, нібы тая папялушка, ператвараецца з заросшай і абмялеўшай ракі ў прыгожае месца для адпачынку. Цяжка ўжо ўявіць сабе горад без працуючых экскаватараў і экскаватаршчыкаў. Яны сталі неад'емнай часткай слуцкага будаўнічага пейзажу. ...

Здаецца, зусім нядаўна меліяратары прыступілі да работы, а ўжо на левым беразе ракі высаджваюцца кветнікі, па правым – пракладваюцца тратуарныя дарожкі.

Праз некалькі метраў, ля «Чортавага мосціка», пачалі будаваць падпорнае збудаванне, якое будзе рэгуляваць узровень вады ў Случы.

С. Шульга.

23 ліпеня

Да рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005» на вуліцы Леніна ў Слуцку запланавана ўстанавіць шэсць сучасных газетных кіёскаў. Тры з іх (каля аптэкі № 80, прадуктовага магазіна № 58 і дзіцячай паліклінікі) ужо радуюць вока прыхільнікаў перыядычных выданняў. Астатнія тры кіёскі будуць устаноўлены ў тэрмін да 1 верасня. Таксама будзе зроблены новы газетны павільён у будынку Дома Саветаў.

С. Шульга.

6 жніўня

НА ВАКЗАЛЕ – ПА-НОВАМУ

Мяняецца аблічча тэрыторыі чыгуначнага вакзала, мяняюцца рэйкі, шпалы, укладваецца тратуарная плітка, карацей кажучы, чыгуначнікі па-сапраўднаму рыхтуюцца да фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005». У адрамантаваным вакзале будзе ўстаноўлена новая сістэма «Экспрэс-3» для выдачы білетаў пасажырам. Гэта ліквідуе чэргі, і пасажыры без праблем змогуць купіць білет у патрэбным накірунку. Чыгуначнікі сёлета за паўгода перавезлі звыш 176 тысяч пасажыраў – на 6 працэнтаў больш, чым за такі ж час мінулага года. На чыгуначнай станцыі «Слуцк» пагружана 159 204 тоны народнагаспадарчых грузаў і разгружана 6370 вагонаў. Дзякуючы стараннай працы калектыву добрым паказчыкам станцыя выходзіла пераможцам у спаборніцтве па Магілёўскім аддзяленні Беларускай чыгункі ў першым і другім кварталах гэтага года.

А. Жогла.

2017©nasledie-sluck.by

***

ХРОНІКА ЎБОРКІ

• Па стану на 5 жніўня ў гаспадарках раёна збожжавыя і зернебабовыя культуры зжаты на плошчы 14 919 гектараў (з 40 000 гектараў па плану), у тым ліку за мінулы тыдзень – на 1750 гектарах (прырост убраных плошчаў склаў 4,4 %). За дзень, 4 жніўня, механізатары СДУП «Саўгас «Рачкавічы» выдалі з бункераў сваіх камбайнаў 866 тон зерня, ААТ «Слуцкі Аграсэрвіс» – 660 тон, СВК «Аграфірма «Лучнікі» – 621, «Наша Ніва» – 482, «Знаменскі» – 466, «Вясейскі Пакроў» – 405 тон зерня.

• Са збожжавых культур найбольш ураджайная – ячмень, якога намалочваюць у сярэднім па раёне па 48,2 цэнтнера з гектара (уборачная плошча – 13 388 гектараў, убрана ўжо 5515 гектараў). У СВК «Вітка-Агра» ячменю намалочваюць у сярэднім па 62,1 цэнтнера з гектара, у СВК «Аграфірма «Лучнікі» – па 60,3 цэнтнера. А пшаніца найбольш урадзіла у СВК «Аграфірма «Лучнікі» – 57,3 цэнтнера з гектара і ў СВК «Рамана-ва» – 53,4 цэнтнера.

• Сем гаспадарак займаюцца плюшчаннем зерня, якога ў раёне нарыхтавана 3776 тон. У ААТ «Крывая Града» маюць 865 тон плюшчанага зерня, у СВК «Белічы» – 823, «Казловічы» – 731, «Грэск-Агра» – 710 тон.

• 4 жніўня працавалі на палетках гаспадарак 209 з 217 збожжаўборачных камбайнаў, 8 – не выйшлі ў поле па тэхнічных прычынах.

• У 13 гаспадарках раёна засыпана насення азімых культур 958 тон, яравых культур – 946 тон.

10 жніўня

З КАНАДЫ – З БРОНЗАЮ

Упершыню за ўсю гісторыю правядзення Сусветных спартыўных гульняў сярод ветэранаў беларускі цяжкаатлет узышоў на п'едэстал. Бронзавы медаль у катэгорыі да 62 кг заваяваў неаднаразовы прызёр еўрапейскіх і сусветных спаборніцтваў случчанін Васілій Шуманскі.

С. Шульга.

12 кастрычніка

КРЫЛАТАЯ ПЕСНЯ ДАЖЫНАК

Дзевяты рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2005» адбыўся! Грандыёзнае свята асобным радком упісана ў гісторыю нашага краю, надоўга запомніцца кожнаму, хто быў яго ўдзельнікам….

Свята рэспубліканскіх «Дажынак» для случчан пачалося яшчэ 6 кастрычніка, калі ў гаспадарках раёна ўшаноўвалі і ўзнагароджвалі пераможцаў сёлетняга раённага працоўнага спаборніцтва на ўборцы збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы кармоў. Ну, а наступным днём Случчына гасцінна сустракала шаноўных гасцей – дэлегацыі хлебаробаў, прадстаўнікоў іншых сфер дзейнасці ўсіх абласцей рэспублікі, а таксама дэлегацыі з-за мяжы. Па афіцыйных даных, гэта больш за 3,5 тысячы чалавек.

Быццам сама прырода падрыхтавала для свята падарунак – дзень 7 кастрычніка выдаўся сонечным, пяшчотным, поўны залатога восеньскага хараства. Наш горад было не пазнаць: упрыгожаны плакатамі з разнастайнай «дажыначнай» сімволікай, флажкамі, яркімі шарамі і аэрастатамі. Па абодвух баках вуліц Леніна і Капыльскай размясціліся шматлікія гандлёвыя павільёны і міні-кафэ. Зранку Слуцк патануў у песнях, музыцы, танцах – на сямі канцэртных пляцоўках выступалі аматарскія калектывы Мінскай вобласці. Свята пачыналася…

У 14 гадзін на цэнтральнай плошчы пачалося ўрачыстае адкрыццё

2017@nasledie-sluck.by

Святочнае шэсце IX рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2005» у Слуцку

рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005». Вядучыя Алена Спірыдовіч і Аляксандр Аверкаў запрасілі на сцэну членаў рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы сёлетняга фестывалю-кірмашу, у тым ліку старшыню райвыканкама А.А. Драко. Свята адкрыў намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь І. М. Бамбіза…

Затым праходзіла ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы кармоў (другія і трэція месцы). Узнагароды ўручалі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі І.М. Бамбіза і міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Л.В. Русак. У розных намінацыях хлебаробы, калектывы гаспадарак узнагароджаны дыпломамі, прэміямі, бытавой тэхнікай. У ліку пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва і случчане – СВК «Аграфірма «Лучнікі» (старшыня М.І. Васілевіч), камбайнавыя экіпажы С.І. Шуманскага і А.У. Пенязя (СВК «Наша Ніва»), Б.М. Сініцы і С.М. Лістапада (СВК «Вясейскі Пакроў»), маладзёжны камбайнавы экіпаж М.А. Калядкі і А.В. Серадзінскага (СВК «Казловічы»); вадзіцелі на адвозцы зерня В.Ю. Іваноў і У.У. Сугак (СВК «Аграфірма «Лучнікі»), С.В. Савановіч (СВК «Вясейскі Пакроў»), маладыя вадзіцелі А.А. Алешка (ААТ «Слуцкі Аграсэрвіс»), М.Л. Русовіч (СВК «Казловічы»). Пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва ў нарыхтоўцы кармоў стаў С.М. Гаўрыленка (РСУП «Саўгас «Слуцк»). У ліку пераможцаў рэспубліканскага агляду-конкурсу «Землекарыстанне высокай культуры земляробства, добраўпарадкаванне машынных двароў, жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў» сярод раёнаў і Слуцкі раён (старшыня райвыканкама А.А. Драко), сярод сельгаскааператываў – СВК «Вясейскі Пакроў» (старшыня гаспадаркі Л.М. Савановіч).

У гэты дзень афіцыйная частка «Дажынак» была завершана…

2017@nasledie-sluck.by

На святочным канцэрце рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2005»

Раніца наступнага дня, 8 кастрычніка, была асаблівай – жыхары Случчыны, удзельнікі свята, госці нашага раёна з хваляваннем чакалі прыезду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі. На цэнтральнай плошчы Слуцка сабраліся некалькі дзесяткаў тысяч чалавек. На самой плошчы, якая на час «Дажынак» стала глядзельнай залай, знаходзіліся дэлегацыі абласцей, ганаровыя госці фестывалю. Па прыездзе ў Слуцк А.Р. Лукашэнка разам са старшынёй Мінскага аблвыканкама М.Ф. Дамашкевічам, старшынёй райвыканкама А.А. Драко, іншымі кіраўнікамі органаў улады наведаў новую галерэю мастацтваў, азнаёміўся з яе экспазіцыяй. Прэзідэнт падарыў галерэі прыгожую карціну і сказаў, што дуб, які намаляваны на ёй, як бы сімвалізуе моцную Беларусь. А юная выхаванка Слуцкай мастацкай школы Алена Леановіч падарыла Аляксандру Рыгоравічу сваю карціну – гарадскі пейзаж.

Бурнымі апладысментамі на цэнтральнай плошчы Слуцка сустракалі кіраўніка дзяржавы ўсе прысутныя. А.Р. Лукашэнка выступіў з прамовай, падвёў вынікі жніва-2005, акрэсліў некаторыя напрамкі работы сельскай гаспадаркі на бліжэйшую будучыню. Потым праходзіла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва (першыя месцы). Кіраўнік дзяржавы ўручыў абсалютным лідэрам жніва ганаровыя дыпломы. Вельмі радасна, што ў ліку пераможцаў спаборніцтва сярод раёнаў – і Слуцкі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка наведаў новую галерэю мастацтваў і азнаёміўся з яе экспазіцыяй

2017©nasledie-sluck.by

раён. Старшыня раённага выканаўчага камітэта А.А. Драко атрымаў дыплом з рук Прэзідэнта. А яшчэ хлебаробы, спецыялісты, калектывы гаспадарак і раёны ўзнагароджаны прэміямі, камп'ютэрамі, машынамі…

…Крылатая песня ляцела над горадам. Гэта праходзіў канцэрт майстроў мастацтваў Рэспублікі Беларусь і творчых калектываў Мінскай вобласці «Вітаем вас, гаспадары зямлі». Нароўні з прызнанымі зоркамі беларускай эстрады, народнай творчасці ў канцэрце прымаў удзел і наш зямляк Ян Цыбулька. Вельмі прыемна, што на свята ў Слуцк прыехалі госці з Расійскай Федэрацыі – народныя артысты Расіі Сяргей Захараў і Людміла Сенчына. Канцэрт атрымаўся на славу. Прэзідэнт пад «Белы танец» у выкананні Людмілы Сенчынай нават закружыўся ў вальсе з госцяй з Севастопаля Алай Гарэлікавай. Пасля канцэрта А.Р. Лукашэнка ўсклаў кветкі да помніка загінуўшым у Вялікай Айчыннай вайне, правёў прэс-канферэнцыю для журналістаў беларускіх і расійскіх сродкаў масавай інфармацыі.

А свята ў горадзе працягвалася: музыка, песні, танцы, усмешкі людзей, цікавыя сустрэчы. У неба ўзляталі пухнатыя шары, і было вельмі хораша на душы – ад еднасці акружаючых, ад прыгажосці горада, ад цудоўнага восеньскага вечара. Але было і крышку сумна: фестываль-кірмаш «Дажынкі» ў хуткім часе пакідаў старажытную слуцкую зямлю. І мы яму гаварылі: «У добры шлях! Прымай эстафету, Бабруйск!»

Н. Селязнёва

***

Галоўным спартыўным мерапрыемствам на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2005» у Слуцку стала адкрыццё абноўленага гарадскога стадыёна. З прывітальным словам на ўрачыстым мерапрыемстве выступіў

Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў спаборніцтва на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2005»

старшыня райвыканкама А.А. Драко, ганаровымі гасцямі былі міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь А. Грыгараў, выканаўчы дырэктар прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці Г. Кецко і іншыя…

Спартыўная праграма… пачалася ў 9 гадзін раніцы. На поле гарадскога стадыёна выйшлі ветэраны футбольнага клуба «Дынама» (Мінск) і ветэраны футбольнага клуба «Случ» са Слуцка. Упартая была барацьба, але перамагло майстэрства: сустрэча скончылася з лікам 6:4 на карысць мінчан. Выклікалі цікавасць паказальныя выступленні гарадошнікаў, байцоў групы спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь, ветэранаў коннага спорту і коннікаў вышэйшай школы верхавой язды Рэспубліканскага цэнтра конегадоўлі і коннага спорту…

С. Шульга.

26 лістапада

У панядзелак, 22 лістапада, у Ірэску ўрачыста запалілі факел прыроднага газу. З гэтага моманту газаправод высокага ціску Слуцк – Ірэск лічыцца

2017@nasledie-sluck.by

здадзеным у эксплуатацыю. Ва ўрачыстым мерапрыемстве прынялі ўдзел намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама па будаўніцтву і жыллёва-камунальнай гаспадарцы М.П. Пенязь, генеральны дырэктар УП «Мінскаблгаз» А.В. Жылко, дырэктар міжраённага вытворчага ўпраўлення «Слуцкміжрайгаз» В.І. Якаўлеў, галоўны інжынер прадпрыемства М.В. Качалоўскі, начальнік ВТА Э.Ю. Серадзінскі, старшыня Грэскага сельскага Савета дэпутатаў М.М. Мяцельскі, жыхары Грэска. Пад гучныя апладысменты ганаровае права запаліць газавы факел было прадастаўлена М.П. Пенязю.

Газаправод Слуцк – Грэск пачаў будавацца ў маі 2005 года. У рабоце газавікам дапамагалі калегі са Стаўбцоўскага, Салігорскага і Барысаўскага ўпраўленняў, Дзяржынска. Амаль за пяць месяцаў газавікі ўклалі 18 кіламетраў труб. Каштарыс праекта складаў 750 мільёнаў рублёў, але выключна дзякуючы таму, што асноўныя работы вяліся сваімі сіламі, кошт будаўніцтва ўдалося зменшыць да 250 мільёнаў рублёў. Праектаванне і пракладка газаправода ажыццяўляліся згодна з праграмай інавацыйнага фонду Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь. Нагадаем, што дзякуючы гэтай праграме прыродны газ у жніўні гэтага года прыйшоў у вёску Селішча, а ў верасні – у Квасынічы і Казловічы. Да 2010 года прадугледжваецца будаўніцтва газаправода да вёсак Гацук і Вежы.

Што датычыцца Грэска, то жыхары шматкватэрных дамоў, якія належаць ПМК-71, ужо карыстаюцца ўсімі зручнасцямі прыроднага блакітнага паліва, да газаправода будзе падключаны і прыватны сектар. Як паведаміў старшыня Грэскага сельскага Савета дэпутатаў М.М. Мяцельскі, «восеннюю будучага года большасць жыхароў Грэска будуць з газам». З гэтай мэтай у вёсцы ўжо створаны два будаўнічыя кааператывы, ад дзейнасці якіх, а таксама ад своечасовага фінансавання з боку адпаведных дзяржаўных устаноў залежыць і хуткасць агульнай газіфікацыі Грэска.
С. Шульга.

28 снежня

Падведзены вынікі VIII рэспубліканскага конкурсу прадуктаў харчавання «Прадукт года – 2005». У ліку іншых беларускіх і замежных прадпрыемстваў пераможцам было аб'яўлена і ААТ «Слуцкі хлебазавод». Прадпрыемства ўзнагароджана дыпломам «За шырокі асартымент і якасць хлебабулачных вырабаў».

***

У нядзелю 25 снежня ўрачыста адкрылася новая слуцкая лазня. Гэтай падзеі прыхільнікі знакамітай слуцкай пары чакалі восем месяцаў. І вось здзейснілася… Традыцыйную чырвоную стужку перад уваходам у будынак перарэзаў старшыня Слуцкага райвыканкама А.А. Драко. Выступаючы перад шматлікімі жыхарамі, якія сабраліся, ён адзначыў самаадданую працу будаўнікоў, вялікія арганізатарскія намаганні працаўнікоў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, іншых службаў…
С. Шульга.

Узнагароды ААТ «Слуцкі хлебазавод»

2017©nasledie-sluck.by

Экспазіцыя Слуцкага краязнаўчага музея

2006 год
21 студзеня

МУЗЕЮ – ДЫПЛОМ

Упраўленне культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагародзіла дыпломам і грашовай прэміяй дзяржаўную ўстанову «Слуцкі краязнаўчы музей». Гэта ўстанова прызнана пераможцай абласнога агляду-конкурсу, прысвечанага 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, у намінацыі «Выдавецкая работа».

7 чэрвеня

КУБАК СНД – У СЛУЦКУ!

Юнакам, якія займаюцца ў Слуцкім цэнтры тэхнічнай і прыкладной творчасці навучэнцкай моладзі ў гуртку па суднамадэлізму, проста пашчасціла. Свой вялікі вопыт ім перадае майстар на ўсе рукі – Віктар Васільевіч Патоцкі, які ўжо больш за трыццаць гадоў працуе ў цэнтры... Зусім нядаўна, у сярэдзіне мая, выхаванцы В.В. Патоцкага занялі першае месца ў абласных спаборніцтвах па суднамадэльнаму спорту. І ўжо з 28 па 31 мая яны прымалі ўдзел у рэспубліканскіх спаборніцтвах у Магілёве, дзе прадстаўлялі Мінскую вобласць разам з маладзечанцамі. Спаборніцтвы праходзілі ў два этапы... У выніку Мінская вобласць заняла першае агульнакаманднае месца. Міша Шыловіч, Гена Стрэж, Саша Нікіфараў са сваімі мадэлямі занялі другое месца.

Наперадзе іх чакаў Кубак Садружнасці Незалежных Дзяржаў, дзе яны сустрэліся з дзвюма камандамі з Расіі і адной – з Украіны. Але і тут юнакі не ўпусцілі свайго шансу, занялі другое месца. А ў скарбонку Мішы Шыловіча дабавіліся яшчэ чатыры медалі: ён заняў трэцяе, два другія і першае месца. У Слуцк юнакі прывезлі не толькі граматы і медалі, а і Кубак СНД.

І. Кавалёнка.

12 жніўня

ЖЫЛЛЁ – ВЯСКОЎЦАМ

Актыўна ажыццяўляецца праграма будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці. Згодна з планам, у гэтым годзе там трэба пабудаваць 145 дамоў агульнай плошчай 10 150 м². За першае паўгоддзе ў эксплуатацыю здадзены 66 дамоў плошчай 5008 м². У тым ліку ў СВК «Рассвет-Ленькі» – 10 (737 м²), «Аграфірма «Лучнікі» – 10 (744 м²), «Вясейскі Пакроў» – 7 (762 м²), «Вітка-Агра» – 5 (372 м²), ААТ «Крывая Града» – 7 (516 м²) і г.д. Сярэдні кошт аднаго дома – 82, 4 мільёна рублёў.

2017©nasledie-sluck.by

26 жніўня

ЗОЛАТА МЕРЫДЫ – У СЛУЦКУ

Наша Случчына прынесла Беларусі свой выключны падарунак – «золата» з XVIII Міжнароднай алімпіяды для школьнікаў па інфарматыцы ў горадзе Мерыда (Мексіка). Гэту бліскучую перамогу прывёз выпускнік гімназіі № 1 Мікіта Леснікаў, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэта алімпіяда ва ўсім свеце лічыцца найвышэйшым інтэлектуальным выпрабаваннем. Перамога на ёй у многіх краінах свету прыраўноўвасцца да перамогі ў Сусветных Алімпійскіх спартыўных гульнях. Адсюль – упартая барацьба, самая жорсткая канкурэнцыя. У алімпіядзе ўдзельнічалі юнакі з 85 краін, кожную з якіх прадстаўлялі 4 чалавекі. Апошні раз беларусы з гэтай алімпіяды прывезлі «золата» ў 1996 годзе. І вось цяпер упершыню на Случчыне, упершыню ў Мінскай вобласці – залатая ўзнагарода самай прэстыжнай у свеце алімпіяды па інфарматыцы знаходзіцца ў Слуцку!

Л. Салодкіна.

22 лістапада

НОВЫ ПОМНІК МАРШАЛУ

Рашэннем Мінаблвыканкама да 110-й гадавіны з дня нараджэння Маршала Савецкага Саюза Г.К. Жукава ў Слуцку на скрыжаванні вуліц Леніна – 14 Партызан – 1 Жніўня будзе ўстаноўлены новы помнік знакамітаму палкаводцу. Работы па ўстаноўцы помніка, зробленага скульптарам А. Я. Арцімовічам, выконваюць брыгады ААТ «Гурт» і МПМК-225. Яго адкрыццё намечана на 1 снежня – дзень нараджэння маршала. Плануецца, што помнік, які знаходзіцца на вуліцы Жукава, па просьбе ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны будзе перанесены на тэрыторыю воінскай часці ў першым вясенным гарадку.

М. Сяркo.

***

СУСТРЭЧА Ў МУЗЕІ

У мінулую нядзелю, у Дзень ракетных войскаў і артылерыі, у музеі баявой славы былой 29-й танкавай дывізіі сустрэліся ветэраны-артылерысты 1940–1980-х гадоў. У музеі сабраліся старшыня савета ветэранаў дывізіі маёр у адстаўцы М.І. Калыхан, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны – палкоўнік у адстаўцы Г.П. Кафка, падпалкоўнікі ў адстаўцы А.Я. Барышаў, С.П. Вераб'ёў, артылерысты мірнага часу – палкоўнік у адстаўцы М.Я. Кочатаў, падпалкоўнік у адстаўцы А.А. Данілаў і інш. Ветэраны гаварылі аб артылерыі розных часоў, яе ролі ў войнах, асабліва ў Вялікай Айчыннай, узгадвалі сваіх аднапалчан.

А. Букін.

9 снежня

УНІКАЛЬНАЕ ВЫДАННЕ

У краязнаўчым музеі адбылася прэзентацыя альбома-даследавання «Слуцкія паясы». Гэты праект ажыццяўляўся амаль 30 гадоў. Нарэшце кніга, якую так чакалі, убачыла свет. Да стварэння альбома былі далучаны лепшыя творчыя сілы рэспублікі, актыўны ўдзел прыняла Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Хутка альбом «Слуцкія паясы» (Мінск, 2006) стане бібліяграфічнай рэдкасцю: яго тыраж – усяго 585 экзэмпляраў.

На прэзентацыю альбома ў Слуцк прыехалі дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі П.С. Хацько, складальнік альбома і аўтар прадмовы кандыдат мастацтвазнаўства М.М. Яніцкая, галоўны рэдактар выдавецтва «Асобны» Я.В. Пічугін, аўтар дызайнерскай распрацоўкі мастак В.С. Ляунін. Яны расказалі аб гісторыі стварэння кнігі, падкрэслілі, што ў гэта выданне ўвайшлі фотаздымкі тых слуцкіх паясоў, якія раней нідзе не друкаваліся. Прамоўцы

2017@nasledie-sluck.by

адзначылі сусветнае значэнне гэтага феномена беларускай культуры. Падчас прэзентацыі гучала беларуская музыка і вершы, была адкрыта выстаўка твораў мастакоў, якіх натхнілі матывы слуцкіх паясоў. На выстаўцы ў дзень прэзентацыі кнігі дэманстраваўся рэлікгавы слуцкі пояс з запаснікаў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. Цудоўна выдадзены альбом «Слуцкія паясы» можна набыць у краязнаўчым музеі.

Л. Уладзімірава.

27 снежня

КНІГІ ДЛЯ БІБЛІЯТЭК

У гэтым годзе кніжны фонд раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы папоўніўся на 6564 кнігі і склаў больш за 530 тысяч экзэмпляраў. З іх 144,5 тысячы – у цэнтральнай раённай бібліятэцы, астатнія – у філіялах, якія знаходзяцца пры ўстановах культуры ў раёне. З кніг, сёлета набытых для бібліятэк на 13,8 мільёна рублёў, 4900 – мастацкія выданні, астатнія – галіновыя, з мастацкіх амаль 57 % – на беларускай мове.

2007 год

7 лютага

…У гэты дзень у вёсцы Вясея Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі асвячаў узведзены храм у гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы… Свята-Пакроўская царква, упрыгожаная жывымі кветкамі, узвышаецца сярод вёскі, быццам імянінніца. Яе па цаглінцы будавалі жыхары Вясеі і навакольных вёсак з 1993 года. Нездарма ж кажуць, што шлях да ісціны – вузкі, з перашкодамі. Але людзі пераадолелі іх, і вось вынік – стаіць храм, красуецца.

…Мітрапаліт Філарэт ушанаваў Лілію Міхайлаўну Савановіч, старшыню СВК «Вясейскі Пакроў», за руплівасць і працу ўзнагародай Беларускай праваслаўнай царквы – медалём свяціцеля Кірылы Тураўскага…

Л. Салодкіна.

14 чэрвеня

…З 8 па 10 чэрвеня ў нашым горадзе праходзіла духоўна-асветніцкая праграма «Сям'я – яднанне і любоў!», арганізаваная Мінскім абласным выканаўчым камітэтам, Слуцкім раённым выканаўчым камітэтам, Мінскай епархіяй Беларускай Праваслаўнай царквы…

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі благаславіў удзельнікаў свята. На ўрачыстасці з віншавальнымі словамі выступілі кансультант упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.В. Цвілік, першы намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама М.П. Кулеш…

14 ліпеня

Совместное открытое акционерное общество «Слуцкий уксусный завод» –

ААТ «Слуцкі воцатны завод»

2017©nasledie-sluck.by

одно из старейших и ведущих предприятий по производству уксуса спиртового пищевого натурального (по этому профилю завод осуществляет свою деятельность с 1959 года). За предыдущие несколько лет предприятие коренным образом реконструировано, усовершенствованы технологии производства, освоен выпуск уксуса в ПЭТ-бутылках, с добавлением натуральных специй. В ближайшее время на заводе начнут производство яблочного уксуса. Производственная мощность предприятия составляет свыше 300 тысяч дал уксуса в год…
Н. Селезнёва.

24 ліпеня

Абноўлены пасля рэканструкцыі аўтавакзал стаў яшчэ адным упрыгажэннем нашага горада. Цяпер і звонку, і ўнутры ён адпавядае еўрапейскаму ўзроўню – проста люба-дорага.

Больш зручнай і камфортнай стала зала чакання, яна аснашчана інфармацыйным электронным табло з «бягучым радком», камп'ютэрызаванымі білетнымі касамі, у якіх у будучым можна будзе разлічвацца за білеты і пластыкавымі карткамі, АРМ-дыктарскай сістэмай абвяшчэння. На аўтавакзале з'явіўся ўтульны пакой маці і дзіцяці, банкамат «Белаграпрамбанка», газетны і аптэчны кіёскі размешчаны ў асобных памяшканнях… Дыспетчарская вакзала аснашчана сістэмай відэаназірання, уведзена праграма аўтаматычнага кантролю за рухам часткі гарадскіх аўтобусаў. На рамонт і рэканструкцыю станцыйнага збудавання зрасходавана больш за тры мільярды рублёў – у асноўным з абласнога бюджэту. Гэтыя работы выканалі ДУП «СПМК-98» (генпадрадчык), «СПМК-99», «СПМК-122», а таксама «ПМК-126» горада Мінска, прыватныя фірмы.

У мінулую пятніцу адбылося ўрачыстае адкрыццё Слуцкага аўтавакзала, які атрымаў сваё другое нараджэнне…
Н. Селязнёва.

11 снежня

Футбольная каманда «Слуцкцукар» у гэтым годзе адзначыла дзесяцігоддзе

Урачыстае адкрыццё Слуцкага аўтавакзала

2017©nasledie-sluck.by

У гульні футбальная каманда «Слуцкцукар»

з дня свайго заснавання. За гэтыя гады змяніўся яе склад, былі няўдачы, але больш – поспехаў. Цяпер яна налічвае 25 чалавек ва ўзросце ад 16 да 41 года на чале з галоўным трэнерам Юрыем Міхайлавічам Кратом і капітанам каманды Алегам Мікалаевічам Каранеўскім. Усе футбалісты – маладыя, спрытныя і рухавыя хлопцы. Сярод іх – лепшы вартар Вячаслаў Быкоўскі, лепшы абаронца Максім Пракапеня, паўабаронца Аляксандр Карпіенка, нападаючы (за адзін сезон забіў 15 галоў) Яўген Барысевіч, ветэран каманды (у камандзе 10 гадоў) Андрэй Кутышэнка.

Сёлета па выніках рэгулярных гульняў чэмпіянату Мінскай вобласці каманда заняла першае месца, стала абсалютным чэмпіёнам. Зразумела, не абышлося тут і без падтрымкі кіраўніцтва ААТ «Слуцкі цукровараф інадны камбінат»: і выдзяленне транспарту, і закупка спортінвентару, і многае іншае…

Н. Грамыка.

2008

5 студзеня

У Мінскай вобласці мінулы год адзначаны, акрамя ўсяго іншага, уводам у лік дзеючых шэрагу сацыяльна значных аб'ектаў. Адзін з іх – сельскі Дом культуры – пабудаваны ў аграгарадку Вежы нашага раёна. 30 снежня адбылося яго ўрачыстае адкрыццё.

25 сакавіка

20 сакавіка наш раён наведала здымачная група расійскага канала «ОРТ» праграмы «Время» і зняла сюжэт аб спаленых у гады Вялікай Айчыннай вайны вёсках Случчыны. …Здымачная група наведала мемарыяльны комплекс, адкрыты ў 1972 годзе на месцы былой вёскі Пераходы, 116 жыхароў якой (з іх 46 дзяцей) 23 лютага 1943 года былі зажыва спалены фашыстамі. Успамінамі з тэлевізіёншчыкамі падзяліўся сведка страшных падзей – жыхар вёскі Ленькі, ураджэнец спаленай вёскі Адамова (адноўлена пасля вайны), ветэран

2017@nasledie-sluck.by

Вялікай Айчыннай вайны, інвалід II групы Яўген Сямёнавіч Салавей.

У суботу, 22 сакавіка, сюжэт быў паказаны ў праграме «Время».

Н. Грамыка.

27 мая

БУДЗЕ Ў СЛУЦКА ФЛАГ

22 мая адбылася дзесятая пазачарговая сесія раённага Савета дэпутатаў. У яе рабоце, акрамя дэпутатаў, прынялі ўдзел член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н.В. Блахіна, кіраўнікі некаторых аддзелаў і служб райвыканкама.

Першым на парадку дня сесіі стаяла пытанне аб зацвярджэнні праекта флага горада Слуцка і Слуцкага раёна і праекта герба горада Слуцка і Слуцкага раёна. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Л.Г. Дабравольская праінфармавала ўдзельнікаў сесіі аб тым, што прапанаваныя эскізы флага і герба, праекты палажэнняў аб флагу і гербе горада Слуцка і Слуцкага раёна разгледжаны на пасяджэнні райвыканкама. Зацвярджэнне геральдычных сімвалаў мае на мэце прапаганду і захаванне ў грамадскай свядомасці гістарычнай і культурнай спадчыны. Флаг і герб закліканы адлюстроўваць нацыянальныя карані і гістарычныя традыцыі, пераемнасць пакаленняў. У 2001 годзе быў зарэгістраваны герб горада Слуцка з выявай Пегаса на шчыце (ён вядомы з XVII стагоддзя). У сакавіку 2005 года Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Слуцк і Слуцкі раён аб'яднаны ў адну адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку – Слуцкі раён. У сувязі з гэтым райвыканкам лічыць мэтазгодным выкарыстоўваць герб горада Слуцка на тэрыторыі Слуцкага раёна. Эскіз флага горада Слуцка і Слуцкага раёна ўяўляе сабой прамавугольнае палотнішча (суадносіны бакоў 1:2) з блакітнай (верхняй) і зялёнай (ніжняй) палосамі, ніжняя паласа складае 1/5 шырыні флага. Па цэнтры флага – выява белага Пегаса.

Пасля абмеркавання пытання раённы Савет дэпутатаў рашыў зацвердзіць эскіз флага горада Слуцка і Слуцкага раёна і яго апісанне, праекты палажэнняў аб флагу і гербе горада Слуцка і Слуцкага раёна. Пасля гэтага эскіз флага і неабходныя дакументы будуць разгледжаны рэспубліканскай геральдычнай камісіяй і пры яе адабрэнні – зацверджаны ва ўстаноўленым парадку.

***

Краязнаўчы музей 24 мая праводзіў ноч слуцкага пояса. Падзея адбывалася ў плыні агульнапрынятых еўрапейскіх традыцый. Такога яшчэ ў нашым раёне не было!

У той вечар у 19 гадзін цікаўнасць прывяла да ступеняў музея нямала людзей, і гэта – нягледзячы на зацяжны, праліўны дождж. Музейныя дзверы былі насцеж расчынены, з дынамікаў гучала старажытная беларуская музыка. Адбывалася таямнічая сустрэча стагоддзяў…

На адну толькі ноч этнаграфічны музей Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і абласны краязнаўчы музей прадставілі Слуцку свае шэдэўры, якія маюць сусветнае значэнне, – слуцкія паясы. Пад шклом вітрын яны іскрыліся, пераліваліся багатым, тонкім колерам шоўку, залатых і срэбных нітак.

Прыгажосць паясоў, якія ў выставачнай зале знаходзіліся сярод жывапісных палотнаў і графічных твораў, нагадвала пра спадчыну, пакінутую нам знакамітымі княжацкімі родамі Алелькавічаў і Радзівілаў, пра слуцкую мануфактуру Маджарскіх…

…У гэту ноч у краязнаўчы музей ішлі дзеці і дарослыя, моладзь і пажылыя, рабочыя і сяляне, навучэнцы

2017©nasledie-sluck.by



Прыгажосць слуцкіх паясоў

школ і каледжаў, спецыялісты розных кірункаў, госці горада… у першыя дзве гадзіны пасля адкрыцця выстаўкі музей наведала 700 чалавек…

Л. Салодкіна.

6 чэрвеня

НЕ СТАРЭЮЦЬ ДУШОЙ ВЕТЭРАНЫ

Пад такой назвай прайшоў IX Рэспубліканскі фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў. У ім прыняў удзел і народны хор ветэранаў гарадскога Дома культуры са Слуцка.

Сёлета калектыў адсвяткаваў 20-годдзе з дня свайго заснавання…

20 харавых калектываў і асобныя выканаўцы прынялі ўдзел у фестывалі… З нашых харыстаў дасягнулі вяршыні Ніна Мікалаеўна Бойка, Вольга Міхайлаўна Скіба, Васіль Іванавіч Іваноў… А нас, народны хор ветэранаў, дэлегавалі на рэспубліканскі фестываль… Салістка хору Валянціна Іванаўна Баравік праспявала песню «Людзі, яднайцеся супраць вайны», прысутныя ў глядзельнай зале стоячы слухалі ў выкананні хору песні «Беларусачка» і «Рускія бярозы». Прыемна было пачуць: «Слуцк, брава!». Салісты і кіраўнік хору атрымалі дыпломы лаўрэатаў фестывалю і падарункі. Наш слаўны калектыў узнагародзілі тэлевізарам «Гарызонт» і DVD, а кожнага ўдзельніка – памятным

2017©nasledie-sluck.by

падарункам… (Фестываль праходзіў у Палацы прафсаюзаў 9 мая.)
Я. Мурашка.

2 ліпеня

На мінулым тыдні ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Слуцкі мясакамбінат» прыступілі да ўводу ў эксплуатацыю новай лініі па вытворчасці пельменяў «DOMINIONI». Мантаж італьянскага і нямецкага абсталявання зрабілі работнікі ўнітарнага прадпрыемства «Ламінар» з Мінска. Паводле слоў прадстаўніка гэтага прадпрыемства А.В. Адамовіча, прадукцыйнасць лініі – 500 кілаграмаў пельменяў за гадзіну, значна вышэйшая за прадукцыйнасць дзеючага абсталявання.

Новая лінія – поўнасцю аўтаматызаваная. Замешванне цеста і фаршу, раскатка цеста, фарміраванне пельменяў, іх замарожванне, фасоўку і ўпакоўку праводзяць аўтаматы… А яшчэ – «DOMINIONI» – энергазберагаючае абсталяванне, якое забяспечвае якасны тэхналагічны працэс за максімальна кароткі час.

…На нашым мясакамбінаце цяпер мы вырабляем каля 60 назваў паўфабрыкатаў, у тым ліку 25 – пельменяў…
І. Васіленка.

12 снежня

СЛУЦК – СІСІЯН

Важная падзея адбылася ў мінулы аўторак у жыцці Случчыны – падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж горадам Сісіян Рэспублікі Арменія і Слуцкім раёнам.

З сяброўскім візітам 9 снежня Слуцк наведаў мэр горада Сісіян Агасі Маміконавіч Акабджанян. Армянскі госць сустрэўся з кіраўніцтвам раённага выканаўчага камітэта… Ва ўрачыстай абстаноўцы А.М. Акабджанян і выконваючы абавязкі старшыні райвыканкама

Слуцкія пельмені

В.П. Статкевіч падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж горадам Сісіян і Слуцкім раёнам. У ім агавораны ўмовы супрацоўніцтва ў розных сферах, у тым ліку гандлёва-эканамічнай, культурнай, рэкламнай, турыстычнай і іншых.
Н. Селязнёва.

2009 год

23 студзеня

СЛУЦКІ МУЗЕЙ – ЛЕПШЫ

Падведзены вынікі абласнога этапа рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшы музей па патрыятычнаму выхаванню моладзі, прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З 20 музеяў Мінскай вобласці да ўдзелу ў конкурсе былі дапушчаны восем. Сярод удзельнікаў конкурсу лепшыя вынікі ў намінацыі «Навуковыя даследаванні музея па ваенна-патрыятычнай тэматыцы»

2017©nasledie-sluck.by

паказалі Слуцкі краязнаўчы музей і Мінскі абласны краязнаўчы музей. Яны сталі пераможцамі.

Тэма навуковага даследавання нашага музея – «Нямецка-фашысцкі генацыд на Случчыне 1941–1944 гг.». Даследаванне складаецца з трох вялікіх раздзелаў: «Нашчадкі вогненных вёсак», «Трагедыі слуцкага гета», «Лагер смерці»… Гэта калектыўная праца музейных супрацоўнікаў мае выключнае значэнне для патрыятычнага выхавання моладзі…

Л. Салодкіна.

6 лютага

МАДЭЛЬ КАНЧАТКОВЫХ ВЫНІКАЎ

Вынікі дзейнасці за 2008 год на мінулым тыдні падвялі ва ўстанове аховы здароўя «Слуцкая цэнтральная раённая бальніца»… У Слуцкай ЦРБ працуюць 2209 чалавек, у тым ліку – 278 урачоў, 3 правізары, 3 фармацэўты, 1116 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу, малодшага медыцынскага персаналу – 492 чалавекі, 317 – іншых работнікаў. Укамплектаванасць па ўрачэбных кадрах па занятых пасадах складае 95 %, а па фізічных асобах – толькі 74 %, каэфіцыент сумяшчальніцтва складае 1,35. Гэта значыць, звыш за 70 % урачоў працуюць больш чым на стаўку. Разам з тым амаль на 100 % укамплектаваны стаўкі сярэдняга і малодшага медперсаналу… Амаль кожны пяты ўрач – пенсіянер (53 з 278)…

Колькасць насельніцтва, якое абслугоўвае цэнтральная раённая бальніца, – 96 500 чалавек, у тым ліку 60 972 гараджаніны, 35 528 вяскоўцаў. Дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў і падлеткаў – 18 544. У 2008 годзе паказчык нараджальнасці склаў 9,69 на 1000 насельніцтва,

Слуцкая цэнтральная раённая бальніца

2017©nasledie-sluck.by

смяротнасці – 15,4 на 1000 насельніцтва. Нарматыў бюджэтнай забяспечанасці расходаў на аднаго жыхара – 303,4 тысячы рублёў (запланавана не менш за 295,4 тысячы рублёў)…

В. Ражанец.

14 ліпеня

ВРУЧЕНЫ МЕДАЛИ

Юбилейные медали «65 лет освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков» были вручены ветеранам Великой Отечественной войны Слутчины. А всего ветеранов в районе – 569 человек. В связи с тем, что некоторые из них находятся на лечении в учреждениях здравоохранения за пределами района и республики, не вручены девять медалей.

Слуцкий районный военный комиссариат выражает благодарность за содействие и непосредственное участие в мероприятиях по награждению ветеранов председателю Слуцкого районного исполнительного комитета А.А. Драко, его заместителю по вопросам социальной сферы и идеологической работе П.Б. Довгучицу, начальнику Слуцкого военного гарнизона А.С. Будько, директору ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» Н.П. Пруднику, директору ОАО «Слуцкпромбурвод» Н.В. Белому, начальнику филиала ДРСУ-125 А.В. Баранову, директору ДУП «Автобусный парк № 2» Н.Н. Валетко, исполняющему обязанности директора филиала «Слуцкие электросети» РУП «Минскэнерго» А.В. Храмцевичу, главному лесничему ГЛХУ «Слуцкий лесхоз» Р.С. Ожигару, начальнику СУ-55 ОАО «Стройтрест № 3 ордена Октябрьской революции» В.С. Немковичу, начальнику филиала ДЭУ-64 В.Я. Палазнику, директору СУП «Агросервис-ССК» А.А. Кунцевичу, директору ОАО «АТЭП № 5 Слуцк-Газ» С.И. Семеновичу и др.

С. Жаўрыд.

17 ліпеня

ДОРОГА К ХРАМУ

14 июля, в день святых бессребреников Космы и Дамиана, в Риме пострадавших, в Свято-Космо-Дамиановском храме прошли торжества. По случаю окончания третьего этапа реконструкции церкви на престольный праздник прибыл Его Высокопреосвященство Митрополит Минский и Слуцкий Филарет, Патриарший Экзарх всея Беларуси.

К этому празднику лежал путь длиной в пять долгих лет. Особое напряжение сил потребовалось в последние три года. За это время была проделана большая работа: в церкви заменили иконостас, в котором помещается около двадцати икон, написанных мастерами лучшей иконописной школы Беларуси… Произвели и внешний ремонт. Обновили купола, крышу, стены, возвели фронтоны, на которых в старинной иконописной технике – фреске – написаны иконы Господа нашего Иисуса Христа «Спас Нерукотворный» и Матери Божией «Знамение». Расширена и реконструирована колокольня….

По окончании Богослужения Владыка Филарет преподнес храму триптих – иконы Спасителя нашего Иисуса Христа, Матери Божией, Святителя Николая Угодника. Произнес приветственное слово, глубоко поблагодарил тех, кто участвовал в обновлении храма. Орденом Креста святой Евфросинии Полоцкой – наградой Белорусской Православной Церкви – был отмечен Л.Ф. Крупец, который Свято-Космо-Дамиановскому храму подарил иконы Спасителя и Матери Божией.

…Митрополит Филарет за усердные труды по восстановлению храма, за дела во славу Божию настоятелю Свято-Космо-Дамиановского храма протоиерею Николаю Коржичу вручил орден

2017©nasledie-sluck.by

святителя Кирилла Туровского первой степени. Знаменательно, что ордена святой преподобной Евфросинии Полоцкой удостоилась и жена настоятеля – матушка Надежда Федоровна….

Л. Салодкіна.

25 верасня

ГЕРОІ «ДАЖЫНАК-2009»

Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Аграфірма «Лучнікі» – адна з лепшых сельгасарганізацый вобласці і краіны. Сёлета старшыня сельгаскааператыва Мікалай Ільіч Васілевіч выходзіў на сцэну падчас рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі» чацвёрты раз: «Аграфірма «Лучнікі» заняла трэцяе месца ў рэспубліканскім спаборніцтве сярод сельскагаспадарчых і іншых арганізацый (іх філіялаў) па нарыхтоўцы травяністых кармоў.

У СВК «Аграфірма «Лучнікі» вытворчасці кармоў заўсёды надаюць вялікую ўвагу, бо ад гэтага залежыць добры вынік у жывёлагадоўчай галіне. Тут штогод нарыхтоўваюць амаль двухгадовы запас кармоў…

І. Каваленка.

30 кастрычніка

АПЛАДЫСМЕНТЫ – «ЯЧАЎСКІМ ВЯЧОРКАМ»!

Ёсць на Случчыне жамчужына – народны фальклорны ансамбль «Ячаўскія вячоркі», якому спаўняецца 30 гадоў. З першых дзён свайго існавання калектыў заявіў пра сябе як пра яскравае сузор'е талентаў. У 1992 годзе ансамбль «Ячаўскія вячоркі» ўдастоены пачэснага звання «народны». У рэпертуары «Ячаўскіх вячорак» – народныя абрадавыя песні, танцы, прыказкі, пастаноўка беларускіх абрадаў. Колькі любві, святла нясуць «Ячаўскія вячоркі»! Якія невычэрпныя крыніцы народнай творчасці адкрываюць!.. Самадзейныя артысты выступаюць на вясковых і гарадскіх святах, вечарах ушанавання жывёлаводаў і хлебаробаў, на палетках і фермах. Удзельнічаюць у раённых, абласных, рэспубліканскіх, міжнародных фестывалях, конкурсах, аглядах мастацкай самадзейнасці. За 30 гадоў артысты народнага ансамбля далі тысячы канцэртаў. Яны – нястомныя працаўнікі на ніве народнага мастацтва…

Народны фальклорны ансамбль «Ячаўскія вячоркі»

2017©nasledie-sluck.by

Немагчыма пералічыць усе дасягненні творчага калектыву – іх вельмі шмат. Але вылучым галоўныя. Народны ансамбль «Ячаўскія вячоркі» – лаўрэат Другога і Трэцяга Усесаюзных фестываляў народнай творчасці, а таксама Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці (1987–1992). Узнагароджаны дыпломам сакратарыята праўлення Беларускага саюза кампазітараў пад старшынствам народнага артыста СССР Ціхана Хрэннікава (1992). У 1990 годзе прымаў удзел у Днях культуры Беларусі ва Узбекістане, у 1994 годзе – у святкаванні Дня горада Ганновера (Германія)…

У 2006 годзе калектыў стаў дыпламантам і прызёрам Першага абласнога фестывалю «Фальклорная талака», у 2007 годзе – пераможцам Усерасійскага фестывалю народнай творчасці «Ты, Россия, и сердце, и песня моя», атрымаў у падарунак хатні кінатэатр. У 2009 годзе ўдзельнічаў у Днях Мінскай вобласці ў Маскве. Але самая галоўная ўзнагарода артыстаў «Ячаўскіх вячорак» – усенародная любоў сваіх суайчыннікаў. Нездарма калектыў з гонарам носіць званне «народны»…

Л. Салодкіна.

4 снежня

АДЗНАЧАНЫ МЕДАЛЯМІ

Блакада Ленінграда падчас Вялікай Айчыннай вайны – найбольш трагічны перыяд у гісторыі горада. Для людзей старэйшага пакалення, сведкаў тых жудасных падзей, – гэта частка жыцця, якую забыць нельга.

У панядзелак намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Львовіч Алікевіч ад імя губернатара Санкт-Пецярбурга Валянціны Іванаўны Матвіенка ўручыў сямі жыхарам Случчыны медалі «У гонар 65-годдзя поўнага вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады». Узнагароды атрымалі Валянціна Іванаўна Шарына, Таццяна Васільеўна Палікарпава, Генадзій Хамзевіч Багданаў, Віктар Мікалаевіч Жданаў, Генадзій Яфрэмавіч Разумоўскі, Сяргей Лазаравіч Смальгоўскі, Барыс Рыгоравіч Мядзведзеў. Гэтыя людзі перажылі ўсе цяжкасці блакады, пра якія ўспамінаюць са слязамі на вачах. Яны добра ведаюць, што такое голад, холад… і Перамога…

– Нам цяжка гаварыць пра блакаду. Асабліва калі прыязджаем у Санкт-Пецярбург, то малюнкі з мінулага паўстаюць перад вачыма, – адзначыў Г.Х. Багданаў. – Мне было тады толькі восем гадоў. Немцы пастаянна бамбілі горад, не было паліўных запасаў, вады і прадуктаў. Людзі паміралі. Мой бацька – Герой Савецкага Саюза, быў камандзірам танкавай дывізіі. У 2007 годзе выйшла ў свет пра яго кніга «И рядовой, и генерал»…

І. Кавалёнка.

2010 год
16 лютага

МЕДАЛІ ЗА МУЖНАСЦЬ

З нагоды Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў у краязнаўчым музеі адбылася сустрэча, падчас якой ушанавалі ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане. Вітаў прысутных старшыня Слуцкага райвыканкама Уладзімір Віктаравіч Даманеўскі: «Падчас вайны ў Афганістане савецкія ваеннаслужачыя мужна і самаахвярна выконвалі інтэрнацыянальны абавязак. Каля 15 тысяч вайскоўцаў, якія праходзілі службу ў 40-й арміі, у выніку ваенных дзеянняў загінулі. Не вярнуліся і 10 случчан. Памяць аб іх назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах… Прыемна, што воіны-інтэрнацыяналісты актыўна ўдзельнічаюць у ваенна-патрыятычным выхаванні маладога пакалення, праводзяць урокі мужнасці».

За заслугі перад Айчынай, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выкананні воінскага абавязку, удзел у ветэранскім

2017©nasledie-sluck.by

руху, арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на патрыятычнае выхаванне моладзі, У.В. Даманеўскі ўручыў «афганцам» медалі «Ветэран баявых дзеянняў». Медаль зацверджаны рашэннем Камітэта па справах воінаў-інтэрнацыяналістаў пры Савеце кіраўнікоў урадаў дзяржаў – удзельніц СНД. Сярод узнагароджаных – Віктар Фёдаравіч Долбік, Ігар Мікалаевіч Жаркоўскі, Міхаіл Віктаравіч Жаўрыд, Аляксандр Васільевіч Куніцын, Валерый Аляксандравіч Карпіеня і іншыя…
І. Каваленка.

19 лютага

СЛУЧЧАНКА – НА «ЕЎРАБАЧАННІ-2010»

З 13 па 16 лютага 2010 года прайшоў пяты юбілейны міжнародны фестываль-конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці «Акно ў Еўропу».

Вікторыя Бародзіч – вучаніца Слуцкай дзіцячай музычнай школы па класу мандаліны – стала лаўрэатам трэцяй ступені гэтага фестывалю-конкурсу. Спецыяльным дыпломам фестывалю – «Лепшы канцэртмайстар» узнагароджана Алена Уладзіміраўна Кожух, Ксенія Леанідаўна Вечар-Кавалеўская – падзячным лістом за высокія прафесійныя якасці, праяўленыя пры падрыхтоўцы канкурсанткі. Таксама ўдзельнікі конкурсу-фестывалю «Акно ў Еўропу» адзначаны спецыяльным дыпломам за зберажэнне нацыянальнай культуры.

23 лютага 2010 года адбудзецца паўфінал конкурсу маладых музыкантаў-інструменталістаў – «Еўрабачанне-2010», у якім прыме ўдзел В. Барадзіна.
Н. Сапелкіна.

30 красавіка

АЛЕЯ ПАМЯЦІ

Набліжаецца вялікае свята – 65-я гадавіна Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Па ініцыятыве праўлення сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Вясейскі Пакроў» сумесна з Вясейскім сельвыканкамам было прынята рашэнне пасадзіць Алею памяці ў аграгарадку Вясея. Спецыялісты сельгасарганізацыі, сельвыканкама, Дома культуры, бібліятэкі, работнікі і вучні школы дружна ўзяліся за справу. У пасадцы дрэў прынялі ўдзел ветэран Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Сцяпанавіч Губчык, работнік тылу Уладзімір Рыгоравіч Бойка. Працавалі актыўна і з душой. Пройдуць гады, жыццё напоўніцца новымі падзеямі, а памяць аб гэтым застанецца ў сэрцах людзей. Падтрымалі акцыю і работнікі жывёлагадоўчай галіны сельгасарганізацыі. Яны пасадзілі дрэвы і кусты на тэрыторыях фермаў вёсак Вясея, Бярозаўка, Ізбудзішча, Муравішчына…
Т. Пенязь.

14 верасня

ВУЧОНЫЯ – У ВЕЖАХ…

Прадстаўнічую дэлегацыю на чале з акадэмікам намеснікам старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Рыгоравічам Гусаковым у мінулы чацвер сустракалі ў раённым сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Саўгас «Слуцк».

У рамках праграмы восьмай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Развіццё аграпрамыслоўвага комплексу ў кантэксце забеспячэння харчовай бяспекі» слуцкую сельскагаспадарчую арганізацыю наведалі прадстаўнікі навуковай грамадскасці Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Польшчы, Малдовы, Літвы, Венгрыі, ЗША. Гасцей на слуцкай зямлі сустрэлі старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Аляксеевіч Ражанец і дырэктар РСУП «Саўгас «Слуцк» Васілій Міхайлавіч Ачапоўскі.

2017@nasledie-sluck.by

Случчане ўмеюць прыемна здзівіць нават такіх дасведчаных і спрактыкаваных вучоных мужоў – прафесараў, дактароў і кандыдатаў навук. Пабываўшы на жывёлагадоўчым комплексе па дарошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы ў вёсцы Вежы, дзе атрымліваюць сярэднясутачнае прыбаўленне жывёлы ў вазе больш за кілаграм, расійскія госці проста разводзілі рукамі: для некаторых фермераў, сельгасвытворцаў у Расіі гэта пакуль недасягальны ўзровень. Шмат пытанняў члены дэлегацыі задавалі дырэктару саўгаса Васілію Міхайлавічу Ачапоўскаму, яго намесніку па жывёлагадоўлі Вользе Лявонцьеўне Вітко, галоўнаму ветурачу Арцёму Сяргеевічу Анціфееву пра тэхналогію кармлення жывёлы, перавагі беспрывязнога ўтрымання рагуль, узнаўленне статка, прадукцыйнасць галштынафрызскай пароды. Бадай, найбольшыя ўражанні ў вучоных пакінула наведванне малочнатаварнай фермы ў вёсцы Шышчыцы: абсталяваныя па апошняму слову навукі даільная зала, лабараторыя, халадзільнае абсталяванне, зімовыя домікі для цялятак… Госці пазнаёміліся таксама з агратэхнікай вырошчвання збожжавых культур у сельгасарганізацыі, а даведаўшыся, што ў пераважнасці на меліяраваных і не надта багатых на гумус землях тут атрымліваюць збожжавых 30–45 цэнтнераў з гектара, хтосьці з гасцей адзначыў, што і кіраўнік, і спецыялісты РСУП «Саўгас «Слуцк» штогод здзяйсняюць працоўны подзвіг…

Н. Селязнёва.

3 верасня

ДРУГОЕ «НАРАДЖЭННЕ» ПОКРАШАЎСКАЙ КРЫНІЦЫ

Крынічку ў невялікім гаі каля вёскі Покрашава добра ведаюць сельскія жыхары і гараджане. Вада ў ёй – чыстая, можна сказаць, крыштальная, і заўсёды халодная, нават у «субтрапічную» спёку, як сёлетнім летам. Знайшоўся чалавек з нераўнадушным сэрцам, які вырашыў крыніцу «акультурыць» – зрабіць яе больш даступнай для людзей, каб яна акрамя сваёй прамой карысці прыносіла і эстэтычную радасць. Дырэктара сумеснага адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі воцатны завод» Аляксандра Валянцінавіча Рыбака падтрымалі ў раённым выканаўчым камітэце.

…А ў мінулую нядзелю адбылася яшчэ адна адметная падзея ў гісторыі жыхароў вёскі Покрашава і крынічкі: яе асвячэнне…

Сабралася шмат вяскоўцаў, прыехалі госці са Слуцка, у тым ліку прадстаўнікі слуцкага казацтва, з Мінска і нават Азербайджана. На цырымоніі асвячэння крыніцы прысутнічалі старшыня Слуцкага раённага выканаўчага камітэта Уладзімір Віктаравіч Даманеўскі, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Мінаблплодаагароднінагандаль» Ігар Віктаравіч Кур'янаў, намеснік старшыні райвыканкама па пытаннях сацыяльнай сферы і ідэалагічнай рабоце Пётр Барысавіч Даўгучыц. Асвячэнне крыніцы праводзіў Благачынны Слуцкай акругі, настаяцель Свята-Міхайлаўскага сабора протаіерэй Міхаіл Вейга, іншыя свяшчэннаслужыцелі праваслаўнай царквы, у тым ліку айцец Аляксандр, пад началам якога знаходзіцца прыход Храма Ражства Прасвятой Багародзіцы ў Грэску. Айцец Аляксандр унёс годны ўклад у падрыхтоўку цырымоніі асвячэння крыніцы. У ёй удзельнічаў і ксёндз Віктар Рымска-каталіцкага прыхода Святой Барбары ў Замосці…

Н. Селязнёва.

24 верасня

НОЧЬ СРЕДИ КНИГ

«Библиотека – территория для всех» – под таким девизом 17 сентября 2010 года

2017©nasledie-sluck.by

в Слуцкой районной центральной библиотеке прошел праздник «Ночь в библиотеке».

– Это – инновационный проект, приуроченный ко Дню библиотек. И мы первые в области организовали такой праздник, – отметила в своем выступлении начальник отдела культуры Слуцкого райисполкома Елена Михайловна Камоцкая во время торжественного открытия мероприятия.

Прежде чем во всю ширь распахнуть двери библиотеки, ведущие праздника Екатерина Анатольевна Баранова и Роман Владимирович Корженевский рассказали собравшимся об истории Слуцкой городской центральной библиотеки, о творческих достижениях трудолюбивого коллектива. Библиотека не раз становилась победителем областных и республиканских конкурсов. В нынешнем году библиотека награждена дипломом третьей степени на областном фестивале библиотечного творчества «Сэрцам да подзвігу дакраніся», заняла первое место в республиканском конкурсе «Бібліятэка – аслродак нацыянальнай культуры» в номинации «За инновации в области библиотечного дела».

К. Никитина.

12 кастрычніка

ЦЯПЕР ЯНЫ – КАДЭТЫ

1 верасня 2010 года ў Слуцку для 135 выхаванцаў адкрыла свае дзверы ўстанова адукацыі новага тыпу – Мінскае абласное кадэцкае вучылішча. Суботнім ранкам 9 кастрычніка 2010 года адбылася ўрачыстая цырымонія пасвячэння ў кадэты, на якую завіталі ганаровыя госці, бацькі і сябры выхаванцаў вучылішча, навучэнцы Мінскага ваеннага суворaўскага вучылішча.

На пляцоўцы каля кадэцкага вучылішча было надзвычай шматлюдна. Роўнымі, прыгожымі шарэнгамі стаялі выхаванцы вучылішча разам са сваімі выхавацелямі. Гэтага дня яны чакалі больш за месяц, з яго пачынаецца новая старонка іх жыцця – кадэцтва.

Начальнік Мінскага ваеннага суворaўскага вучылішча генерал-маёр Мікалай Вітальевіч Скобелеў уручае пагоны выхаванцам Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча

2017©nasledie-sluck.by

Віншавальныя словы з нагоды ўрачыстасці выказаў выхаванцам кадэцкага вучылішча першы намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай Парфір'евіч Кулеш. Ён нагадаў, што ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі № 54 ад 28 студзеня 2010 года «Аб кадэцкіх вучылішчах» у гэтым годзе ў краіне створаны тры вучылішчы – у Мінску, Полацку і Слуцку. «Сённяшнія выхаванцы вучылішча першымі будуць насіць ганаровае званне – кадэты», – гаварыў М.П. Кулеш…

Дырэктар Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча Сяргей Віктаравіч Мяцельскі даў каманду прыступіць да прынясення клятвы. Вось ён – доўгачаканы і ўрачысты для выхаванцаў вучылішча момант. Клятву чытаў выхаванец першага ўзвода трэцяга курса Максім Карпейчык… Пасля таго як выхаванцы вучылішча прынеслі клятву, ваенны камісар Мінскай вобласці палкоўнік Пётр Пятровіч Літаш, першы намеснік начальніка Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Іван Аркадзьевіч Гардзейчык, начальнік Мінскага ваеннага суворaўскага вучылішча генерал-маёр Мікалай Вітальевіч Скобелеў і ветэраны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь уручылі кадэтам пагоны. Першыя пагоны ў іх жыцці!

Н. Жук.

27 кастрычніка

З ЯПОНІІ – З ПЕРАМОГАЙ

У наступным годзе адкрываць міжнародны конкурс і фестываль выканаўцаў-мандаліністаў у японскім горадзе Осака будзе твор пераможцы VI міжнароднага конкурсу і фестывалю твораў для мандаліннага аркестра беларускага кампазітара случчанкі Ксеніі Вечар-Кавалеўскай. 9–10 кастрычніка твор Ксеніі «Quo vadis?» (у перакладзе з лацінскага «Куды ідзеш?») прызнаны пераможцам конкурсу і адзначаны дыпломам другой ступені…

…Пасля заканчэння музычнай школы Ксенія паступіла ў ліцэй пры Беларускай акадэміі музыкі, а ў 2007 годзе скончыла факультэт народных інструментаў Беларускай акадэміі музыкі па класу домры і мандаліны. Але на гэтым не спынілася, у той жа год стала студэнткай акадэміі факультэта кампазіцыі. Як педагог Ксенія, безумоўна, таленавітая. Яна – наватар. Як толькі прыйшла працаваць у музычную школу – адкрыла клас мандаліны і ў гэтым навучальным годзе ў яе – першы выпуск.

Н. Жук.

28 снежня

СЕРЕБРО ДОРОЖЕ ЗОЛОТА

Уходящий 2010 год, безусловно, запомнится болельщикам футбольной команды «Слуцксахар». Она прошла долгую дорогу к победе, которую в Слуцке ждали давно. 13 ноября 2010 года в Клецке «Слуцксахар», разгромив местный «Клеческ» – 3:0, завоевал не только серебро чемпионата Республики Беларусь по футболу во второй лиге сезона-2010, но и право выхода во второй футбольный дивизион страны – первую лигу. Месяц спустя футболисты «Слуцксахара», руководство команды и любители футбола собрались в городском Доме культуры молодежи, чтобы еще раз поздравить друг друга с победой на чествовании команды… На счету у слутчан 25 красивых, уверенных, волевых побед и 6 ничьих. В итоговой турнирной таблице «Слуцксахар» второй, но это серебро дороже золота. Ведь именно слутчане единственные из 18 команд второй лиги привезли домой победу из Городеи… Директор открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный

2017@nasledie-sluck.by

комбинат» Николай Павлович Прудник, поздравляя ребят, отметил, что футбольная команда «Слуцксахар» с выходом в первую лигу выходит из-под юрисдикции сахарорафинадного комбината и приобретает новый статус – профессиональный футбольный клуб, городская команда. А это значит, что поддержка руководства района, ведущих предприятий команде для достижения результатов необходима. Это также означает и то, что команда «Слуцксахар» станет футбольным клубом «Слуцк»…
Н. Жук.

31 снежня

АДКРЫТА АДДЗЯЛЕННЕ ГЕМАДЫЯЛІЗУ

Апошнія дні 2010 года для калектыву ўстановы аховы здароўя «Слуцкая цэнтральная раённая бальніца» былі адзначаны не толькі паўсядзённай работай па аказанні медыцынскай дапамогі тым, хто мае ў гэтым патрэбу, але і клопатамі пра адкрыццё яшчэ аднаго структурнага падраздзялення. Маю на ўвазе аддзяленне гемадыялізу для лячэння хворых, якія пакутуюць ад ныračнай недастатковасці, рашэнне аб арганізацыі работы якога было прынята напрыканцы мінулага года. За гэты час падабрана і адрамантавана памяшканне, закуплена і ўстаноўлена неабходнае абсталяванне, сфарміраваны калектыў аддзялення.

29 снежня 2010 года з удзелам прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, медыцынскіх работнікаў, кіраўнікоў некаторых прадпрыемстваў і арганізацый, якія аказалі дапамогу ўстанове аховы здароўя, каго-нікаго з будучых пацыентаў адбылося адкрыццё аддзялення гемадыялізу Слуцкай цэнтральнай раённай бальніцы.

…Удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з размяшчэннем новага аддзялення бальніцы, яго абсталяваннем, створанымі ўмовамі для пацыентаў, арганізацыяй работы медыцынскага персаналу, пра што расказалі У.П. Наўрась і загадчык аддзялення гемадыялізу А.У. Кошын. У аддзяленні ўстаноўлены і падрыхтаваны да работы шэсць апаратаў штучнай ныркі, яшчэ адзін апарат – у якасці запаснога. У паслугах аддзялення гемадыялізу маюць патрэбу 24 жыхары Слуцкага раёна, акрамя іх тут будуць лячыцца два хворыя са Старадарожскага раёна, якія праходзілі курс лячэння ў асноўным у бальніцы Салігорска…
А. Жук.

***

ПОБЕДЫ-2010 СЛУЦКОГО МЯСОКОМБИНАТА

«Слуцкий мясокомбинат» – крупнейшее мясоперерабатывающее предприятие Беларуси – постоянно работает над поддержанием конкурентоспособности

Вырабы і ўзнагароды Слуцкага мясакамбіната

2017©nasledie-sluck.by

своей продукции. Высококвалифицированные технологи предприятия разрабатывают новые виды продуктов, регулярно пополняя ассортимент, в котором уже насчитывается более трехсот наименований… Только в 2010 году Слуцкий мясокомбинат принял участие в пяти конкурсах. Три продукта: колбаса сыровяленая «От бабушки», балык «Ажурный», консервы мясные «Свинина тушеная» были отмечены дипломами как лучшие продукты на конкурсе-дегустации «Густ-2010». Консервы мясные «Свинина тушеная» и «Говядина тушеная» оценили также и россияне, присудив им золотые медали на конкурсах «Лучшая продукция Беларуси в Москве – 2010» и «Агрорусь-2010». А колбаса сыровяленая «От бабушки» «получила» также золотую медаль и всеобщее признание на международной выставке «Питерфуд-2010» в Санкт-Петербурге…

Высокое качество и доступные цены продукции Слуцкого мясокомбината привлекают покупателей не только в Беларуси, но и России, Азербайджане, Казахстане, других странах СНГ и дальнего зарубежья…

И. Харламенкова.

2011 год
14 студзеня

З КАМФОРТАМ – У ЕЎРОПУ

Кіраўніцтва дачынага ўнітарнага прадпрыемства «Аўтобусны парк № 2» клапоціцца пра бяспеку і камфорт пасажыраў, таму абнаўленню аўтобуснага парка надае асаблівую ўвагу. Новы год толькі пачаўся, а прадпрыемства ўжо набыло новы турыстычны аўтобус IVECO Irisbus Domino італьянскай вытворчасці. Аўтобус такога класа – першы на Случчыне.

Турыстычны лайнер адпавядае высокім патрабаванням па экалогіі, якія прад'яўляюцца да аўтамабіляў у Еўропе. Ён аснашчаны рухавіком Eura 5.

Новы турыстычны аўтобус IVECO Irisbus Domino

2017©nasledie-sluck.by



Новая лінія па перапрацоўцы рапсу на ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў»

– З набыццём такога аўтобуса мы будзем аказваць турыстычныя паслугі грамадзянам пры паездцы не толькі ў краіны СНД, але і ў Еўропу, – адзначыў дырэктар прадпрыемства Мікалай Мікалаевіч Валетка. – Мы актыўна супрацоўнічаем з турыстычнымі фірмамі горада, спадзяёмся, што сучасная тэхніка паспрыяе ўстанаўленню новых партнёрскіх сувязяў… За рулём турыстычнага лайнера будуць вопытныя вадзіцелі Міхаіл Юр'евіч Марозаў і Валерый Аляксандравіч Бачароў, якія добра зарэкамендавалі сябе ў рабоце падчас паездак у Чарнагорыю, Крым.

І. Каваленка.

21 студзеня

БУДЗЕ З РАПСУ АЛЕЙ

Заканчэнне 2010 года для калектыву адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў» можна назваць адметным: на вытворчых плошчах рэалізацыйнай базы прадпрыемства адкрылі цэх па перапрацоўцы алейных раслін.

Начальнік рэалізацыйнай базы камбіната Аляксандр Міхайлавіч Васілевіч не без гордасці адчыніў дзверы новага цэха, дзе размешчана двухузроўневая кампактная лінія чэшскай вытворчасці «Farmet» па перапрацоўцы алейных культур. Лінію ўжо праверылі на справе, перапрацаваўшы каля 600 тон насення рапсу. Прадукцыю гэтай вытворчасці – рапсавы алей і сухую гранулеваную макуху (жмых) – выкарыстоўваюць у якасці дабавак пры вырабе камбікармоў. Як адзначыў А.М. Васілевіч, не выключана верагоднасць, што лішкі алею камбінат будзе прадаваць для вытворчасці біяпаліва і іншай прадукцыі. Плануецца, што ў 2011 годзе ў новым цэху перапрацуюць 16 700 тон насення рапсу новага ўраджаю. Яго будуць дастаўляць з сельскагаспадарчых арганізацый Слуцкага, Салігорскага, Любанскага, Капыльскага, Старадарожскага, Уздзенскага і іншых раёнаў…

Н. Селязнёва.

11 лютага

БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ – СЯРОД ПРЫЯРЫТЭТАЎ ПЯЦІГОДКІ

Паляпшэнню жыллёвых умоў жыхароў нашага раёна надаецца асаблівая ўвага.

2017©nasledie-sluck.by

Лічбы аб гэтым гавораць самі за сябе. За мінулую пяцігодку на Случчыне было пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю за кошт усіх крыніц фінансавання 2365 жылых дамоў і кватэр агульнай плошчай 195,9 тысячы квадратных метраў, што складае 118,9 % да плана, прадугледжанага праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна на 2006–2010 гады. За адзначаны перыяд у сельгасарганізацыях раёна ўведзена 51,8 тысячы квадратных метраў жылля, жыллёва-будаўнічыя кааператывы – 66,5 тысячы квадратных метраў, за кошт асабістых сродкаў грамадзян пабудавана 62,6 тысячы квадратных метраў жылля, бюджэтных сродкаў – 15 тысяч квадратных метраў.

Багатым на ўвядзенне жылля быў 2010 год. У сельгасарганізацыях пабудавалі 117 дамоў. У саўгасе «Рачкавічы» для работнікаў увялі ў эксплуатацыю 19 аднакватэрных дамоў сядзібнага тыпу, «Вясейскім Пакрове» – 15, «Вітка-Агра» і «Слуцкай Ніве» – па 10 дамоў, у «Рассвеце Ленькі» і «Аграфірме «Лучнікі» – па 9, «Вялікай Сліве» – 7, ПСГ «Наша Ніва» мясакамбіната – 16, ПСГ мясакамбіната – 12 і іншыя. У горадзе завяршылі будаўніцтва 400 кватэр шэсць жыллёва-будаўнічых кааператываў: «Сахарник» (100 кватэр), «Культработник» (80), «Варя» (60), «МВД-Слуцк» (40), ЖБК-30 (60), ЖБСК-32 (60). Для адсялення грамадзян са старых і аварыйных дамоў Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь ўведзена 50 кватэр агульнай плошчай 2,66 тысячы квадратных метраў. 94 індывідуальныя дамы пабудавалі грамадзяне за асабістыя сродкі…

Па стану на 1 лютага 2011 года на ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, – 4681 жыхар раёна, з іх 4415 – гараджане, 266 – вяскоўцы. З агульнай колькасці тых, хто стаіць на ўліку, – 111 мнагадзетных сем'яў, 27 воінаў-інтэрнацыяналістаў, 254 дзіцяці-сіраты, якія засталіся без апекі бацькоў. У спісах на атрыманне зямельных участкаў для будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў зацверджаны 423 чалавекі, 121 з іх зямельныя ўчасткі прадастаўлены.

У адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна на

Жыллёвая забудова ў Слуцку

2017©nasledie-sluck.by

2011–2015 гады за кошт усіх крыніц фінансавання запланавана ўвесці ў эксплуатацыю 226,8 тысячы квадратных метраў жылля. Працягнецца далейшае будаўніцтва шматкватэрных дамоў, з'явяцца дом сацыяльнага карыстання і дом для адсялення са старога і аварыйнага жылля, атрымае далейшае развіццё індывідуальная жылая забудова ў мікрараёне геолагаразведачнай экспедыцыі, Навадворцаў, у 3-м завулку Урыцкага. Адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці – сельскае будаўніцтва, за кошт ільготных крэдытаў за пяць гадоў будзе ўведзена каля 32 тысяч квадратных метраў жылля. Таксама з'явяцца аб'екты для патрэб случчан, сярод якіх – дзіцячы сад на вуліцы Чэхава, піцэрыя і іншыя.

М. Пенязь.

25 лютага

«СЛУЦКАМУ КРАЮ» – ДЫПЛОМ ПЕРШАЙ СТУПЕНІ

У Міністэрстве абароны і Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу сярод сродкаў масавай інфармацыі на лепшае асвятленне пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і патрыятычнага выхавання насельніцтва. Для ўдзелу ў конкурсе былі пададзены 59 заявак, што на 10 працэнтаў больш, чым у 2010 годзе.

18 лютага ў Цэнтральным Доме афіцэраў у Мінску прайшло ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў і прызёраў конкурсу… Вынікі конкурсу падведзены па чатырох групах яго ўдзельнікаў: друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, тэлебачанне, радыё, інфармацыйныя агенцтвы. Найбольш шырока былі прадстаўлены друкаваныя сродкі масавай інфармацыі – у першую чаргу рэспубліканскія і раённыя газеты. Сярод іх дыпломам першай ступені і грашовай прэміяй у намінацыі «Цеснае і плённае супрацоўніцтва» ўзнагароджана рэдакцыя газеты «Слуцкі край» за «актыўны ўдзел творчага калектыву друкаванага СМІ ў асвятленні мерапрыемстваў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл, а таксама пытанняў патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь».

А. Жук.

13 мая

АТРЫМАЛІ ДЫПЛОМЫ ЗА СУПРАЦОЎНІЦТВА

12 красавіка 2011 года грамадскасць адзначыла 50-годдзе з дня першага палёту ў космас Юрыя Гагарына. Сярод тых, хто дапамагаў пракладваць дарогу да гэтай значнай падзеі ў жыцці чалавецтва, ёсць нашы землякі – знакаміты астранам В.К. Цераскі, генерал-палкоўнік начальнік касмадрома Байканур К.В. Герчык, Герой Сацыялістычнай Працы С.А. Косберг. Случчане памятаюць славутых землякоў і прымаюць удзел у міжнародных грамадска-навуковых Гагарынскіх чытаннях, іншых мерапрыемствах, якія арганізоўвае федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Расіі.

Вучні гімназіі № 1 горада Слуцка два гады запар удзельнічаюць у Гагарынскіх чытаннях. Іх работы адзначаны дыпломамі пераможцаў. У Сорагскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школе-садзе імя К.В. Герчыка традыцыйна праводзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя памяці Канстанціна Васільевіча Герчыка, на якіх прысутнічаюць прадстаўнікі федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі.

Савет федэральнай аўтаноміі беларусаў Расіі выказаў удзячнасць кіраўніцтву ўпраўлення адукацыі, аддзелу адукацыі Мінаблвыканкама, Слуцкага райвыканкама, гімназіі № 1 горада Слуцка і Сорагскай школы-сада імя

2017©nasledie-sluck.by

К.В. Герчыка за высокі ўзровень правядзення мерапрыемстваў па патрыятычнаму выхаванню і памяць пра славутых землякоў. Начальнік аддзела адукацыі райвыканкама І.А. Дзерман, дырэктар Сорагскай школы-сада імя К.В. Герчыка І.М. Юрэвіч і настаўніца фізікі гімназіі № 1 Т.Я. Максіменка адзначаны дыпломамі Федэрацыі касманаўтыкі Расіі за патрыятычнае выхаванне моладзі, асабісты ўклад у папулярызацыю дасягненняў Савецкага Саюза ў асваенні космасу і ў сувязі з 50-годдзем палёту ў космас Юрыя Гагарына.

Н. Жук.

24 мая

ПЕРШЫ КОНКУРС «ВУЧАНЬ ГОДА – 2011» ПРАЙШОЎ НА СЛУЧЧЫНЕ

Гэта быў сапраўдны трыумф ведаў, кемлівасці, аптымізму, знаходлівасці, як і вызначалася ў эмблеме інтэлектуальных спаборніцтваў. Раённы конкурс «Вучань года – 2011» прайшоў 21 мая 2011 года ў актавай зале сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 11 горада Слуцка. За тытул лепшага ў фінальную барацьбу ўступілі сем старшакласнікаў са школ Случчыны. Шкада, што немагчыма прадставіць у газеце партфоліа хоць бы аднаго з канкурсантаў: у табелях – дзявяткі і дзясяткі, сярод захапленняў – музыка, спорт, літаратура, дакладныя навукі, паэзія, а таму – і мноства дыпломаў за перамогі ў алімпіядах і конкурсах.

Вызначыць пераможцу дапамаглі вынікі чатырох этапаў конкурсу: творчая самапрэзентацыя «Візітная картка», «Інтэлектуал» (у ім, як у тэлеперадачы «Разумнікі і разумніцы», кожны са школьнікаў стаяў на сваёй «дарожцы», адказваў на пытанні), хатняе заданне «Будучае Радзімы – маё будучае», конкурс прамоўцаў «Твой зорны час».

– Конкурс апраўдаў чаканні, – адзначыў пры падвядзенні вынікаў старшыня журы намеснік начальніка аддзела адукацыі райвыканкама Аляксандр Мікалаевіч Шыловіч. – Мы ўпэўніліся ў галоўным: у нас ёсць, была і будзе крэатыўная і таленавітая моладзь.

Дыпломы атрымалі: у намінацыі «Творчая адоранасць года» – вучаніца 11 класа СШ № 4 Ксенія Мацвейчык, «Інтэлект года» – васьмікласнік гімназіі № 1 горада Слуцка Павел Багушэвіч, «Патрыёт сваёй краіны» – дзевяцікласніца СШ № 5 Анастасія Русакевіч (ёй спецыяльны салодкі прыз уручыў і першы сакратар райкама БРСМ Міхаіл Лабковіч), «Талент і натхненне» – дзесяцікласніца СШ № 10 імя С.Ф. Рубанава Паліна Ражанец. Дыпломамі лаўрэатаў узнагароджаны вучаніца 10 класа СШ № 2 Вікторыя Валатовіч і вучаніца 11 класа СШ № 8 Марына Міхайлоўская. А «Вучнем года – 2011» адзінагалосна названа выпускніца Падлескай СШ-сада Кацярына Гаўрук…

В. Ражанец.

5 ліпеня

У ДОБРЫ ШЛЯХ, «СЛУЦК TV»!

1 ліпеня 2011 года ў 19.30 многія жыхары Слуцка «прыніклі» да экранаў сваіх тэлевізараў: прапусціць гістарычны момант – першы выпуск тэлепраграмы «Слуцк TV» – было б недаравальна. Прэзентацыя слуцкага тэлебачання адбылася напярэдадні – 30 чэрвеня ў будынку адкрытага акцыянернага таварыства «СлуцкАблГарант»…

З'яўленне ў Слуцку «свайго» тэлебачання – падзея для горада сапраўды гістарычнага маштабу. Як адзначыла рэдактар тэлепраграмы «Слуцк TV» Валянціна Вітальеўна Ражанец, інфармацыйныя выпускі праграмы будуць расказваць пра актуальныя падзеі ў жыцці Случчыны і случчан…

Н. Селязнёва.

2017©nasledie-sluck.by

9 верасня

«ЭЛІАПІГ АРМАТА»: ПА ІТАЛЬЯНСКАЙ ТЭХНАЛОГІІ

Каля аграгарадка Грэск вядзецца падрыхтоўчая работа да будаўніцтва свінагадоўчага комплексу на 24 000 галоў жывёлы. Па меркаваннях спецыялістаў адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі мясакамбінат», гэта будзе найсучасная аўтаматызаваная вытворчасць, якой дагэтуль не было на Случчыне, – з дыстанцыйным кіраваннем, біягазавай установкай. Тэндар на будаўніцтва комплексу выйграла вядомая італьянская кампанія «Эліапіг».

Гэта адзін з глабальных інвестыцыйных праектаў, якія цяпер рэалізуюцца ў раёне, – коштам больш за 14 мільёнаў еўра. Вытворчасцю канструкцый для новага жывёлагадоўчага аб'екта Случчыны зойменцца беларуска-італьянскае прадпрыемства – сумеснае таварыства з дадатковай адказнасцю «Эліапіг Армата», размешчанае на плошчах сельскага будаўнічага камбіната… Сумеснае прадпрыемства «Эліапіг Армата» будзе вырабляць сценавыя панэлі і пліты перакрыццяў для будынкаў свінагадоўчага комплексу на Случчыне. У Слуцк ужо прыбылі італьянскія «формы» для вырабу сценавых панэляў, плануецца, што ў хуткім часе «прыедзе» іншае абсталяванне. Яго ўстаноўкай і наладкай будуць займацца спецыялісты з Італіі…

Н. Селязнёва.

30 верасня

«СЛУЦК. ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ»

…На мінулым тыдні ў гарадскім Доме культуры моладзі адбылася прэзентацыя фотаальбома «Слуцк. Падарожжа ў часе». Гэты фотаальбом – падарунак роднаму гораду да яго 895-годдзя ад Слуцкага краязнаўчага музея і адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі цукровараф інадны камбінат».

Вынікам карпатлівай працы двух калектываў-супрацоўнікаў – краязнаўчага музея і цукровараф інаднага камбіната – стаў цудоўны фотаальбом, у якім сабраны больш за 200 унікальных фотаздымкаў Слуцка і случчан розных часоў ад пачатку XX стагоддзя. Знаёмства з выданнем – своеасаблівы ўрок гісторыі роднага краю. Дзякуючы фотаальбому «Слуцк. Падарожжа ў часе», можна прасачыць, як з цягам часу мяняліся вуліцы, параўнаць старыя фотаздымкі з сучаснымі гарадскімі краявідамі. Асобна ў фотаальбоме стаяць работы Саміра Юхніна – вядомага фатографа пачатку XX стагоддзя, які ў 1896 годзе пераехаў з Віцебска ў Слуцк і заснаваў тут фотасалон. У спадчыну ад фатографа случчанам засталася серыя паштовак, прысвечаных Слуцку.

Падчас работы над фотаальбомам творчая група збірала матэрыял па крупінках: фотаздымкі знаходзілі ў архівах Слуцкага краязнаўчага музея, Капыльскага краязнаўчага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Беларускага тэлеграфнага агенцтва, у Расійскім этнаграфічным музеі Санкт-Пецярбурга, бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта, Інстытуце мастацтваў Польскай акадэміі навук. Некаторыя фотаздымкі знаходзіліся ў асабістых архівах П. Валынцэвіча, М. Каламайскай-Саед, Т. Зайкевіч, І. Ціткоўскага і іншых. Фотаальбом выпусціла ў свет рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» тыражом 2 000 экзэмпляраў…

– Наш родны горад мае багатую гісторыю, але інфармацыі пра яе недастаткова, – адзначыў падчас прэзентацыі фотаальбома дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі цукровараф інадны камбінат» Мікалай Паўлавіч Пруднік. – Таму, калі

2017©nasledie-sluck.by

«нарадзілася» ідэя стварэння фотаальбома, мы яе падтрымалі. Спадзяюся, што вынік нашай работы выкліча цікавасць у случчан, асабліва – у маладога пакалення. Выданне гэтага фотаальбома – наш падарунак роднаму гораду да 895-годдзя. Выказваю шчырыя словы падзякі ўсім, хто працаваў над гэтым выданнем...

– Гэты альбом – сумесная работа двух калектываў, у якую больш як дзесяць чалавек уклалі часцінку сваёй душы і цеплыні, – гаварыла дырэктар краязнаўчага музея Наталля Георгіеўна Серык. Дарэчы, фотаальбом «Слуцк. Падарожжа ў часе» – не першы сумесны творчы праект калектываў краязнаўчага музея і цукраварафінаднага камбіната. У мінулым годзе быў выдадзены альбом, прысвечаны мастацтву Случчыны, – «Слуцкая палітра».

***

КОНКУРС ВЫЗНАЧЫЎ ЛЕПШЫХ

…Складаная работа ў аператараў машыннага даення кароў: у шэсць гадзін раніцы, а то і раней, яны ўжо на рабоце, трохразовае даенне, на хатнія справы часу амаль не застаецца. У асноўным у гэтай галіне працуюць жанчыны, якія не баяцца вышэйназваных цяжкасцяў. І доказ гэтаму – конкурс прафесійнага майстэрства сярод маладых аператараў машыннага даення кароў, які прайшоў на базе адкрытага акцыянернага таварыства «Вясейскі Пакроў», арганізаваны аддзелам па справах моладзі і ўпраўленнем сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама, райкамам прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу.

У конкурсе прынялі ўдзел 22 аператары машыннага даення кароў. У адпаведнасці з правіламі яны павінны былі не толькі прадэманстраваць прафесійныя навыкі, але і годна прадставіць сябе. Дзяўчаты чыталі вершы, расказвалі пра працоўныя будні, захапленні. Сярод іншых у конкурсе «Візітка» вызначыліся аператары Ірына Мікалаеўна Пенязь (ААТ «Вясейскі Пакроў») і Вольга Мікалаеўна Гецікава (філіял «Падсобная сельская гаспадарка» ААТ «Слуцкі мясакамбінат»)…

Аб'яўленне пераможцаў – самая хвалюючая частка конкурсу. На першую прыступку п'едэстала ўзнялася аператар машыннага даення кароў Вольга Мікалаеўна Гецікава з філіяла «Падсобная сельская гаспадарка» ААТ «Слуцкі мясакамбінат», Наталля Аляксандраўна Ліневіч (ААТ «Казловічы-Агра») – на другой пазіцыі, трэцяе прызавое месца заняла Ірына Мікалаеўна Пенязь (ААТ «Вясейскі Пакроў»), за волю да перамогі адзначана Ірына Анатольеўна Шушкевіч (СВК «Аграфірма «Лучнікі»). Дзяўчаты адзначаны ганаровымі граматамі ад арганізатараў і падарункамі. Сувенірамі заахвоцілі ўсіх канкурсантак…

І. Каваленка.

11 кастрычніка

СТАЎКА – НА МОЛАДЗЬ

У 2011 годзе працоўныя калектывы Случчыны папоўнілі 214 маладых спецыялістаў: 113 выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў і 101 выпускнік сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў краіны. 65 маладых спецыялістаў пачалі сваю працоўную дзейнасць у сельскагаспадарчых арганізацыях Случчыны, 40 папоўнілі педагагічную кагорту раёна, 25 – прамысловыя прадпрыемствы, 22 – установы аховы здароўя, 16 – установы культуры, 8 – гандлёвыя прадпрыемствы, 27 – іншыя прадпрыемствы і арганізацыі.

На мінулым тыдні ў кінатэатры «Беларусь» прайшоў раённы злёт маладых спецыялістаў…

Н. Жук.

2017©nasledie-sluck.by

9 лістапада

КАЛЯ ПОКРАШАВА – ВАЛУН-УКАЗАЛЬНІК

На павароце з мінскай шашы ў вёску Покрашава два тыдні таму па ініцыятыве дэпутата Мінскага абласнога Савета дэпутатаў дырэктара сумеснага адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі воцатны завод» Аляксандра Валянцінавіча Рыбака і старшыні Покрашаўскага сельвыканкама Івана Іванавіча Гарбацэвіча ўстанавілі своеасаблівы валун-указальнік, а 4 лістапада на ім з'явілася памятная дошка з надпісам «Покрашава. 1535».

16 снежня

ЦЭХ НА НОВЫХ ПЛОШЧАХ

На мінулым тыдні на прыватным унітарным прадпрыемстве «Ямпаль-Слуцк» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» прайшло ўрачыстае адкрыццё новага будынка дрэваапрацоўчага цэха. У прасторных светлых памяшканнях ужо наладжана вытворчасць прадукцыі… Плошча будынка ў разы пераўзыходзіць плошчу былога памяшкання дрэваапрацоўчага цэха, што ў перспектыве забяспечыць магчымасць далейшага нарошчвання вытворчых магутнасцяў, стварэнне новых працоўных месцаў. Для гэтага ёсць усе падставы: прадукцыя нашага прадпрыемства – пэндзлі, шчоткі, мэбля для дачы і іншыя вырабы з дрэва – карыстаецца попытам. Штогод павялічваем аб'ёмы яе вытворчасці. У сярэднім штомесяц выпускаем прадукцыі на суму 1200 мільёнаў рублёў…

Н. Селязнёва.

2012 год

20 студзеня

УЧРЕЖДЕН ОРДЕН СОФИИ СЛУЦКОЙ

В нынешнем году отмечается 400-летие преставления святой праведной Софии, княгини Слуцкой. В память об этом решением Митрополита Минского и Слуцкого, Патриаршего Экзарха всея Беларуси Филарета и Святого синода Белорусской православной церкви учрежден специальный орден святой праведной Софии Слуцкой.

Валун-указальнік

Княгиня Слуцкая вошла в историю нашего Отечества как подвижница, сочетавшая в своей жизни личные христианские добродетели с непоколебимой стойкостью в защите и исповедании православной веры.

Орденом Софии Слуцкой будут награждаться предстоятели, иерархи и клирики поместных православных церквей, архиереи и клирики Белорусской православной церкви за многолетнее служение в священном сане либо за заслуги перед Белорусской православной церковью. Также им могут быть награждены церковные и общественные деятели за труды на благо церкви и православия, епархии, монастыри, духовные учебные заведения и иные церковные организации.

Согласно иерархии наград Белорусской православной церкви орден Святой праведной Софии Слуцкой располагается вслед за орденом Креста преподобной Евфросинии Полоцкой.

2017©nasledie-sluck.by

На территории одноименного минского прихода планируется открыть памятник праведной Софии Слуцкой. А также к 400-летию преставления святой княгини будет выпущена памятная монета…

22 мая

СКУЛЬПТУРА САЛОЎКІ

15 мая гэтага года на тэрыторыі Слуцкага эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў адкрылі драўляную скульптуру салаўя, якую выканаў рэзчык па дрэве, скульптар Алег Шапель. Менавіта гэту птушку большасць случчан назвалі прыродным сімвалам горада.

Ва ўрачыстасці ўдзельнічалі былая старшыня Слуцкага аддзялення грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Галіна Мікалаеўна Мілянцей, начальнік Слуцкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей Аляксандравіч Цыбулька, метадыст аддзела адукацыі райвыканкама Аксана Віктараўна Падабед. Яны заклікалі прысутных беражліва адносіцца да прыроды…

Н. Грамыка.

8 чэрвеня

СТАДЫЁН АДКРЫТЫ…

На гарадскім стадыёне ў Слуцку ўстаноўлены дзве новыя трыбуны з «навесамі» на 828 пасадачных месцаў. Поле стадыёна ўпрыгожаць новыя вароты, за якімі ўстаноўлена загараджальная сетка. Устаноўлены банер з надпісам «Вас вітае футбольны клуб «Слуцк».

Беларуская федэрацыя футбола дала дазвол, каб стадыён стаў адным з аб'ектаў чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па футболе ў першай лізе сезона 2012 года. Першая гульня на абноўленым стадыёне пройдзе 9 чэрвеня ў 16.00: СФК «Слуцк» згуляе з ФК «СКВІЧ» (г. Мінск). Уваход – бясплатны. Адкрыецца мерапрыемства ў 15.15 канцэртнай праграмай з удзелам салістаў гарадскога Дома культуры моладзі. На чэмпіянат запрошаны прадстаўнікі Беларускай федэрацыі футбола, будаўнічых арганізацый, якія прымалі ўдзел у добраўпарадчых работах.

6 ліпеня

ГОРОДСКИЕ ЧАСЫ

В Слуцке появились городские часы. Их установили на городском Доме культуры. Эти работы проведены работниками КУПП «Слуцкое ЖКХ» и Минской организации ИП «Кокаровцев А.С.». На часах установлена общая подсветка, в ближайшей перспективе появится и дополнительная.

3 жніўня

«ЗОЛОТО» ПО ХИМИИ ЗАВОЕВАЛ СЛУТЧАНИН

Ученик гимназии № 1 города Слуцка Никифор Лазовский завоевал золотую медаль 44-й международной олимпиады по химии, проходившей с 21 по 30 июля в Вашингтоне.

Никифор Лазовский был одним из четырех представителей Беларуси на международном состязании знаний по химии. Интеллектуальное соревнование состояло из теоретического экзамена и решения практических задач. Они охватывали вопросы из курсов органической, неорганической, физической, аналитической химии, а также биохимии и спектроскопии.

***

ЮБІЛЕЙ ХРАМА Ў ВЁСЦЫ БАРОК

100-годдзе адзначыў адзін са старэйшых храмаў Случчыны, храм у гонар прападобнага Сімяона Стоўпніка, які знаходзіцца ў вёсцы Барок. 29 ліпеня тут прайшло святочнае набажэнства, якое ўзначаліў епіскап Барысаўскі Веніямін, вікарый Мінскай епархіі.

За старанную працу ў славу Царквы ўзнагароджаны самыя актыўныя прыхаджане храма.

2017©nasledie-sluck.by

Уладыка Веніямін благаславіў усіх удзельнікаў набажэнства іконай Глінскіх старцаў.

Як і належыць на юбілеі, госці храма ў гонар прападобнага Сімяона Стоўпніка ўручылі прыходу каштоўныя падарункі. На малітоўную памяць аб святочным набажэнстве прыхаджане і госці атрымалі ў падарунак абраз Божай Маці Уладзімірская.

Г. Лемеш.

17 жніўня

МОВАЙ ЛІЧБАЎ

Спісачная колькасць работнікаў у арганізацыях Слуцкага раёна (акрамя суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) за І паўгоддзе 2012 года склала 33 200 чалавек, у тым ліку ў сельскай гаспадарцы, паляўніцтве, лясной гаспадарцы – 6700 чалавек, прамысловасці – 6700 чалавек, адукацыі – 4300 чалавек, ахове здароўя і прадастаўленні сацыяльных паслуг – 3100, гандлі, рамонце аўтамабіляў, бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання – 2600, будаўніцтве – 2300, транспарце і сувязі – 1800 чалавек.

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў за І паўгоддзе 2012 года ў Слуцкім раёне склала 2 739 500 рублёў, у тым ліку ў чэрвені – 3 172 400 рублёў (на 6,7 % больш у параўнанні з маем 2012 года, або на 198 500 рублёў).

За студзень – чэрвень 2012 года вышэй сярэднераённага ўзроўню аплаты працы налічана заработная плата работнікам фінансавай дзейнасці (4 268 400 рублёў), занятым вытворчасцю і размеркаваннем электраэнергіі, газу, вады (3 157 200 рублёў), занятым у апрацоўчай прамысловасці (3 146 300 рублёў), работнікам сферы будаўніцтва (3 084 300 рублёў), транспарту і сувязі (2 920 400 рублёў). У сельскай гаспадарцы, паляўніцтве і лясной

Храм у гонар прападобнага Сімяона Стоўпніка

гаспадарцы намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў за І паўгоддзе склалася ў размеры 2 343 600 рублёў (на 14,5 % ніжэй, чым у сярэднім па раёне).

21 жніўня

НА ВУЛІЦЫ ІВАНОЎСКАГА – НАВАСЕЛЛЕ

Для членаў жыллёва-будаўнічага спажывецкага кааператыва «Настаўнік-2» 18 жніўня 2012 года, канечне, стане памятнай датай – у гэты дзень яны атрымалі ключы ад сваіх кватэр у новым цагляным пяціпавярховым доме на вуліцы Іваноўскага ў Слуцку. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел старшыня Слуцкага раённага выканаўчага камітэта У.В. Даманеўскі, старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў В.А. Ражанец, намеснік старшыні райвыканкама Л.Г. Дабравольская, начальнік аддзела адукацыі райвыканкама І.А. Дзерман, намеснік начальніка Будаўнічага

2017©nasledie-sluck.by

ўпраўлення-55 адкрытага акцыянернага таварыства «Салігорскпрамбуд» В.М. Радкевіч, старшыня райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі А.У. Васілевіч.

Н. Селязнёва.

11 верасня

ПАМЯЦЬ ПРА БІТВУ

6 верасня на полі каля аграгарадка Раманава Слуцкага раёна адбылося асвячэнне 12-метровага паклоннага крыжа, які ўстаноўлены ў азнаменаванне 200-годдзя падзей Айчыннай вайны 1812 года.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел ветэраны аператыўных службаў міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Честь» і ветэраны МУС Расіі, Беларусі, Казахстана, Украіны, Кыргызстана.

З прывітальным словам да прысутных звярнуўся старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў В.А. Ражанец, у мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці Слуцкага раёна.

Н. Грамыка.

21 верасня

ЛУЧШИЙ РЕЗУЛЬТАТ – 11 ЛЕТ ПОДРЯД

Сборная команда педагогов Слуцкого района заняла первое место в областном туристическом слете педагогов Минской области, который проходил 11–14 сентября в Крупском районе.

На протяжении 11 лет команда слуцчан занимает первое место. Лучшие результаты показали 12 педагогов дополнительного образования государственного учреждения «Слуцкий центр туризма»: Е.А. Кравченко, Д.М. Кравченко, Т.В. Семёнова, А.Г. Мигун, Е.Л. Сосновская, Е.Н. Жиркова, М.С. Винчевский, а также Л.А. Мирончик – учитель ГУО «СШ № 11», А.В. Неделько – учитель ГУО «СШ № 5», И.С. Иванова – учитель ГУО «СШ № 10 имени С.Ф. Рубанова», М.М. Витко – учитель ГУО «Греская СШ», Д.Н. Малейчик – учитель ГУО «СШ № 5».

28 верасня

ГЕАГРАФІЯ «ДАЖЫНАК» БРАТОЎ ЧЫЖЫКАЎ

Для братоў Сяргея Віктаравіча і Яўгена Віктаравіча Чыжыкаў (ААТ «Ісерна») сёлетняя ўборка збожжавых і зернебабовых культур стала дзявятай.

Яны ў трэці раз удзельнічалі ў рэспубліканскім фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі «Дажынкі»: у Лідзе, Маладзечне, а сёлета геаграфію «Дажынак» дапоўніў горад Горкі. Браты Чыжыкі – у ліку ўзнагароджаных за другое месца ў рэспубліканскім спаборніцтве на ўборцы ўраджаю 2012 года.

– Прыемна, што ганаровыя дыпломы нам уручыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Леанід Канстанцінавіч Заяц. За працу нас узнагародзілі каштоўнымі падарункамі – халадзільнікам і скутарам. Удзел у «Дажынках» – гэта і добрая магчымасць пабываць у гарадах нашай радзімы, пераканацца ў тым, што яна – самая прыгожая, непаўторная, – дзяліўся ўражаннямі Яўген Віктаравіч. – Асабліва запомнілася наведванне Лядовага палаца.

Н. Грамыка.

Браты С.В. і Я.В. Чыжык

2017©nasledie-sluck.by

***

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Згодна з даручэннем кіраўніка краіны А.Р. Лукашэнкі да канца гэтага года на Міншчыне павінны быць рэканструяваны і мадэрнізаваны 324 малочнатаварныя фермы, з іх 23 – на Случчыне.

Як паведаміў першы намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама, начальнік управаўлення сельскай гаспадаркі і харчавання В.П. Статкевіч, на трох малочнатаварных фермах вёсак Сярагі (СВК «Аграфірма «Лучнікі»), Стары Гуткоў (ААТ «Вясейскі Пакроў»), Покрашава (сельскагаспадарчы філіял «Агра-Замосце» ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў») ужо пачаты мантаж даільнага абсталявання. Плануецца, што яно будзе запушчана да 1 кастрычніка 2012 года. Найбольш хуткімі тэмпамі вядуцца будаўніча-мантажныя работы па рэканструкцыі малочнатаварных фермаў у сельгасарганізацыях ААТ «Падлессе-2003», «Ісерна», «Крывая Ірада».

Ужо пастаўлена жывёла ў рэканструяваныя будынкі фермаў вёсак Цалевічы (ААТ «Вітка-Агра», Чапліцы (КСУП «Эксперыментальная база «Танежыцы»), у бліжэйшыя дні яна будзе пастаўлена на ферме вёскі Мусічы (філіял ПСГ ААТ «Слуцкі мясакамбінат»).

З 20 запланаваных ужо змантіравана 17 даільна-малочных блокаў. Сельгасарганізацыі і падрадныя арганізацыі асвоілі звыш 50 мільярдаў рублёў (больш 30 % ад неабходнага). З іх 6,1 мільярда рублёў – у ААТ «Падлессе-2003», 4,9 – у СВК «Аграфірма «Лучнікі», 5,8 – у сельскагаспадарчым філіяле ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», 4,7 – у ААТ «Вясейскі Пакроў», 5 – у КСУП «Эксперыментальная база «Танежыцы».

Для паскарэння тэмпаў будаўнічых работ дадаткова выдзяляюцца людскія рэсурсы. У рабочыя дні ўдзел у іх прымаюць спецыялісты і іншыя работнікі гаспадарак.

Працягваецца будаўніцтва бульбасховішча на 10 000 тон прадукту ў саўгасе «Рачкавічы». Па словах дырэктара гаспадаркі Р.М. Красуцкага, у адной чвэрці будынка на днях прыступяць да мантажу абсталявання. Напрыканцы верасня сюды плануюць засыпаць першыя 2,5 тысячы тон бульбы.

Н. Грамыка.

9 кастрычніка

СЛУЦКИЙ ЗПТО – В ХОЛДИНГЕ

ОАО «Слуцкий завод подъемно-транспортного оборудования» – в числе предприятий, которые вошли в состав холдинга ОАО «БелАЗ».

Создание холдинга будет способствовать увеличению объема выпуска конкурентоспособной продукции и расширению ее поставок на внешние рынки, обеспечению стабильного экономического состояния его участников, модернизации и техническому перевооружению действующих производств и освоению новых технологий.

Белорусский автомобильный завод (Жодино) основан в сентябре 1948 года, с 2010 года – ОАО «БелАЗ». «БелАЗ» занимает треть мирового рынка карьерных самосвалов и входит в группу ведущих мировых концернов по производству карьерной техники.

БЕЛТА

26 кастрычніка

У ПАДАРУНАК – МАЗ

У абласным конкурсе прафесійнага майстэрства, які праходзіў 19 кастрычніка 2012 года ў Мар'інай Горцы, каманда ДЭУ-64 заняла першае месца. Пераможцам уручылі кубак і сертыфікат на атрыманне аўтамабіля МАЗ-5551.

Удзельнікі прайшлі тэарэтычныя і практычныя іспыты. Прадстаўнікі

2017©nasledie-sluck.by

Случчыны выступілі годна, прадэманстравалі выдатныя веды і прафесійную падрыхтоўку… Прадстаўнікі каманд дэманстравалі майстэрства валодання геадэзічным інструментам, кіравання аўтамабілем. Случчане і ў асабістых заліках паказалі добрыя вынікі: вадзіцель «Газелі» Генадзій Мікалаевіч Гудкоў і дарожны рабочы Юрый Міхайлавіч Шыловіч занялі першыя месцы ў сваіх намінацыях, машыніст аўтагрэйдара Тадзій Іванавіч Насуковіч – трэцяе месца, вадзіцель грузавога аўтамабіля Уладзімір Іванавіч Капусцін – чацвёртае месца…

30 лістапада

ТВОРЧЫ ПАДЫХОД І МАЙСТЭРСТВА

У лістападзе 2012 года ў Мінску праходзіў пяты міжнародны фестываль прыгажосці «Ружа вятроў». Удзел у ім прынялі і слуцкія майстры.

На конкурсе выдатна сябе праявіла Таццяна Канстанцінаўна Дзергачова, работы якой занялі два першыя месцы, тры другія месцы, а таксама трэцяе і чацвёртае месцы. Адно з першых месцаў прынесла модная прычоска на доўгіх валасах – любімая катэгорыя цырульніка. Акрамя таго, у намінацыі «Майстар года» Таццяна Канстанцінаўна заняла другое месца.

У конкурсе таксама ўдзельнічала цырульнік, мадэльер 6-га разраду цырульні «Фіялка» Таццяна Аляксандраўна Лагіновіч. Яна заняла другое месца ў сваёй пастаяннай катэгорыі – вясельнай прычосцы, а таксама два трэція месцы…

С. Чарнушэвіч.

30 лістапада

«СЛУЦКИЕ ПОЯСА»

Утверждена государственная программа возрождения технологий и традиций производства слуцких поясов и развития производства национальной сувенирной продукции «Слуцкие пояса» на 2012–2015 годы. Об этом говорится в постановлении Совета Министров № 1069 от 22 ноября.

В 2012–2015 годах на ее реализацию необходимы средства в размере около 20,2 млрд рублей, в том числе из республиканского бюджета – почти 17,8 млрд рублей.

В госпрограмме обозначены проведение исследований истории возникновения, художественных особенностей и характеристик, выявление основных типологических вариантов слуцких поясов на основе местной продукции XVIII – начала XIX века и их этносоциальных функций; исследование характера и технико-технологических особенностей производства аутентичных слуцких поясов на Слуцкой мануфактуре; изучение материалов, которые использовались в производстве аутентичных слуцких поясов, и разработка предложений по их замене в современных условиях промышленного производства при сохранении основных образно-пластических особенностей.

Также предполагается проведение международных и республиканских конференций, семинаров и мастер-классов с участием специалистов в сфере текстиля XVIII–XIX веков и производства современной сувенирной продукции; проведение республиканских выставок современного народного декоративно-прикладного искусства и национальной сувенирной продукции белорусских художественных промыслов (ремесел); включение в учебные планы и программы дисциплин по истории и технологии производства слуцких поясов и другое.

БЕЛТА

2013 год

5 студзеня

ПЕРШЫ БАЛЬ, АБО КАДЭЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ АДРАДЖАЮЦЦА

…У Слуцку 28 снежня 2012 года прайшоў сапраўдны баль – на свята

2017@nasledie-sluck.by

запрасілі ў Мінскае кадэцкае абласное вучылішча. У ліку ганаровых гасцей – старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс Васільевіч Батура, яго намеснік Аляксандр Мікалаевіч Юшкевіч, старшыня Слуцкага раённага выканаўчага камітэта Уладзімір Віктаравіч Даманеўскі.

Знаёмства з арганізацыяй вучэбнага працэсу, умовамі быту кадэтаў уразіла кіраўніка вобласці. Выхаванцы вучылішча захоплена расказвалі пра работу лінгафоннага кабінета, на англійскай мове павіншавалі прысутных: пераклад не спатрэбіўся, госці зразумелі шчырыя пажаданні. Не менш захапляльным быў відэамост з дапамогай скайпа з Брэсцкім абласным кадэцкім вучылішчам: шматфункцыянальная класная дошка на гэты час стала экранам….

Дырэктар Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча Сяргей Віктаравіч Мяцельскі расказаў, што ўстанова адукацыі створана ў 2010 годзе, адбыўся першы выпуск. З 35 выпускнікоў 14 сталі студэнтамі ўстаноў вышэйшай адукацыі сілавой накіраванасці. Зараз у вучылішчы праходзяць навучанне 220 кадэтаў.

Баль пачаўся ў дэкарыраваным фае, дзе размясцілася вытанчана аформленая высокая ёлка. Вальс, паланэз, мазурка, падэспань і падэграс – яшчэ нядаўна мудрагелістыя «па» для юнакоў здаваліся невыканальнымі. І вось яны лёгка рухаюцца пад гукі мелодый, ды так, што і госці не ўседзелі на месцы: на белы танец Барыса Васільевіча Батуру запрасіла навучэнка чацвёртага курса Наталля Гісь. Баль, прызналася яна, запомніцца назаўжды….

В. Ражанец.

Навагодні баль у Мінскім кадэцкім абласным вучылішчы ў Слуцку

2017©nasledie-sluck.by

8 лютага

У СЛУЦКУ – МАЙСТАР-КЛАС АЛІМПІЙСКАЙ МЕДАЛІСТКІ

З кветкамі і цёплымі словамі ў мінулую суботу дырэктар Слуцкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву Аляксандр Паўлавіч Панцялееў і намеснік дырэктара Ірына Рыгораўна Мірончык сустракалі заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавую медалістку Алімпійскіх гульняў 2012 года ў індывідуальным першынстве, шматразовага сярэбранага і бронзавага прызёра чэмпіянатаў свету па мастацкай гімнастыцы, уладальніцу дзвюх залатых, сярэбранай і дзвюх бронзавых узнагарод чэмпіянатаў Еўропы Любоў Чаркашыну. Знакамітая спартсменка прыехала ў Слуцк, каб правесці майстар-клас па мастацкай гімнастыцы...

Перадгісторыю гэтай падзеі распачала выпускніца Слуцкай СДЮШАР, выхаванка трэнера аддзялення мастацкай гімнастыкі Людмілы Анатольеўны Грыневіч, у мінулым член Нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па мастацкай гімнастыцы, а цяпер трэнер Смалявіцкай СДЮШАР Юлія Страковіч (у дзявоцтве Рудэня). Пры яе садзейнічанні ў студзені гэтага года з мэтай устанаўлення больш цеснага спартыўнага ўзаемадзеяння разам з трэнерам Сяомінь у Беларусь завіталі шэсць юных гімнастак нацыянальнай маладзёжнай зборнай каманды Паўднёвага Кітая. З 25 студзеня па 4 лютага «кітайская дэлегацыя» гасцявала і трэніравалася ў Слуцку – абаяльных прадстаўніц Паднябеснай камфортна размясцілі ў інтэрнаце Слуцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа перапрацоўчай прамысловасці (дырэктар Барыс Браніслававіч Блахін), трэніроўкі праходзілі ў Слуцкай СДЮШАР, канечне, не без удзелу Юліі Страковіч і Людмілы Анатольеўны Грыневіч....

Н. Селязнёва.

5 сакавіка

САНАТОРИЙ «СЛУЧЬ» ПОЛУЧИЛ ДИПЛОМ

В Республиканском центре по оздоровлению и санаторно-курортному лечению населения подведены итоги работы санаториев Республики Беларусь за 2012 год. Филиал «Детский санаторий «Случь» ОАО «Белагроздравница» занял почетное третье место среди детских оздоровительных и лечебных учреждений страны.

В феврале 2013 года состоялось торжественное собрание сотрудников и отдыхающих санатория, посвященное итогам работы за 2012 год. Заместитель генерального директора ОАО «Белагроздравница» В.А. Понамарев вручил диплом третьей степени Республиканского центра по оздоровлению и санаторно-курортному лечению населения директору филиала «Детский санаторий «Случь» М.В. Марачковскому... который отметил, что в филиале есть все условия и возможности для дальнейшего развития санаторно-курортных услуг для детей и подростков не только Республики Беларусь, но и для отдыхающих из стран ближнего и дальнего зарубежья.

В. Соловей.

12 сакавіка

СТАТУЭТКА «ОСКАР» АТРЫМАЛА «СЛУЦКУЮ» ПРАПІСКУ

У мінулую сераду кіраўнік групы кампаній «Белвіясат» Пётр Пятровіч Станкевіч уручыў статуэтку ў выглядзе «Оскара» дырэктару ААТ «СлуцкАбл-Гарант» Аляксандру Валянцінавічу Тышкевічу – за асабісты ўклад у развіццё кабельнага тэлебачання ў Рэспубліцы Беларусь.

2017©nasledie-sluck.by

Такая форма ўзнагароды распрацавана спецыяльна да 10-годдзя офіса кампаніі «Viasat» у краінах СНД. Адзначаны ёю 10 лепшых партнёраў са 134 кабельных аператараў, якія дзейнічаюць у Беларусі.

У расшыраным пакеце сеткі кабельнага тэлебачання ААТ «СлуцкАбл-Гарант» – 52 праграмы, шэсць з якіх прадастаўлены ТДА «Белвіясат»…

26 красавіка

«ІТАЛЬЯНСКІ» АБ'ЕКТ У «СЛУЦКІМ» ФАРМАЦЕ

Літаральна за некалькі месяцаў на Случчыне, наводдаль ад Грэска, «выраслі» будынкі новага вытворчага аб'екта, аналагаў якому няма ў нашым раёне, ды ў іншых рэгіёнах вобласці і рэспублікі, – свінагадоўчага комплексу па адкорму 24 000 галоў свіней за год. Нагадаю, што гэты інвестыцыйны праект ажыццяўляецца па рэспубліканскай праграме развіцця свінагадоўлі на 2010–2015 гады.

Заказчык свінакомплексу – адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі мясакамбінат». Унікальнасць аб'екта ў тым, што ён будзе поўнасцю аўтаматызаваны, з завершаным цыклам вытворчасці, будуецца па праекце вядомай італьянскай кампаніі «Elioріс». Яна забяспечвала адкрыццё замежных крэдытных ліній на будаўніцтва.

Н. Селязнёва.

3 мая

«СЛУЦКАМУ КРАЮ» – ДЫПЛОМ

У рамках XVII міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі» прайшло ўрачыстае ўзнагароджанне сродкаў масавай інфармацыі, якія вызначыліся ў рэспубліканскім конкурсе на лепшае асвятленне пытанняў міжнацыянальных і міжканфесіянальных адносін, міжкультурнага дыялогу ў Рэспубліцы Беларусь і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой….

Будаўніцтва свінакомплексу

За высокапрафесійнае асвятленне тэмы дзяржаўная ўстанова «Рэдакцыя газеты «Слуцкі край» і праграмы радыёвяшчання «Весткі Случчыны» ўзнагароджана дыпломам.

31 мая

ВЫРАС «ЗАМАК» НА ПЛЯЦОЎЦЫ

На вуліцы Галавашчанкі ў Слуцку нядаўна з'явіўся дзіцячы гульнёвы міні-гарадок. Новы гульнёвы комплекс вельмі падобны на маленькі чароўны замак з каляровымі лесвічкамі, арэлямі, «лабірынтамі» і іншымі забавамі. Штодня цяпер яго «абжывае» шматлікая дзетвара з дамоў гэтага мікрараёна. На дзіцячых тварыках – неапісальная радасць, малышы так хораша смяюцца, што не прыходзіцца сумнявацца: яны – у захапленні ад гульнёвага «замка».

Дзіцячы гульнёвы міні-гарадок

2017©nasledie-sluck.by

А «ўзведзены» ён дзякуючы адкрытаму акцыянернаму таварыству «Слуцкі цукраварафінадны камбінат».
Н. Селязнёва.

28 чэрвеня

ЛЕПШЫ ЦУКРОВЫ ЗАВОД МЫТНАГА САЮЗА – СЛУЦКІ

На вялікім міжнародным форуме прадстаўнікоў цукровай сферы ў Арле (Расія) адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» удастоена дыплома першай ступені Асацыяцыі вытворцаў цукру краін – удзельніц Мытнага саюза і адзнакі «Лідар буракацукровага падкомплексу Мытнага саюза».

Як расказаў дырэктар ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» Мікалай Паўлавіч Пруднік, форум праходзіў з 18 па 21 чэрвеня. У ім удзельнічалі не толькі прадстаўнікі Расіі, Беларусі, Казахстана, але і іншых дзяржаў, у тым ліку спецыялісты па вытворчасці тэхналагічнага абсталявання з Германіі, Францыі, Італіі. Адбыўся абмен думкамі па пытаннях удасканалення тэхналогіі вытворчасці цукру, з лекцыямі выступілі вучоныя з Расійскай Федэрацыі, Украіны….

На форуме былі ўшанаваны і лепшыя сельгасвытворцы цукровых буракоў, прыемна, што дыплома трэцяй ступені Асацыяцыі вытворцаў цукру краін – удзельніц Мытнага саюза ўдастоена слуцкая сельскагаспадарчая арганізацыя – адкрытае акцыянернае таварыства «Падлессе-2003».
Н. Селязнёва.

12 ліпеня

З ФЕСТЫВАЛЮ – З ДЫПЛОМАМ

У Севастопалі (Украіна) прайшоў 7-ы міжнародны фестываль народнай музыкі «Самародкі-2013», мэта якога – развіццё і прапаганда народнай інструментальнай музыкі і песні, умацаванне міжнароднага творчага супрацоўніцтва.

У фестывалі прынялі ўдзел творчыя калектывы з Украіны (Кіеў, Харкаў, Адэса, Данецк), Расіі (Масква, Яраслаўль, Варонеж, Белгарад), Беларусі (Мінск, Стоўбцы, Слонім). Сярод удзельнікаў – і прадстаўнікі Слуцкага раёна. Казловіцкі народны хор Казловіцкага сельскага Дома культуры (кіраўнік – Святлана Генадзьеўна Расіч) адзначаны дыпломам лаўрэата II ступені…
І. Бранавец.

23 жніўня

З ВЫЯВАЙ СЛУЦКАГА ПОЯСА

Мне пашанцавала: я адна з першых з гараджан убачыла памятны знак «Адраджэнне слуцкага пояса», які ўстанавілі каля фабрыкі мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы».

Дакладней сказаць, стала сведкай гістарычнага моманту яго ўстаноўкі – вечарам 20 жніўня 2013 года. Шчыра кажучы, злёгку хвалявалася: ці атрымаўся прыгожым знак, а асабліва – калі пад'ёмны кран пераносіў бронзавую кампазіцыю з машыны на гранітны пастамент. Усё прайшло выдатна, і работнікі Мінскага скульптурнага камбіната, Слуцкай жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія займаліся ўстаноўкай стэлы, з палёгкай уздыхнулі. Толькі яе аўтар – скульптар, член Беларускага саюза мастакоў Сяргей Львовіч Гумілеўскі – яшчэ доўга і прыдзірліва аглядаў сваю работу: ці роўна ўстаноўлена стэла, як выглядае на фоне гарадскога пейзажу і ўвогуле, ці падабаецца яна гараджанам...

На маю думку, стэла атрымалася – прыгожа, арыгінальна, лірычна, сімвалічна. Выява кветкі-ўзору ў абрамленні старажытнага слуцкага пояса, выкананая ў бронзе, як нельга лепш упісваецца ў агульны стыль афармлення ўжо кардынальна пераўтворанага

2017©nasledie-sluck.by

мікрараёна горада: фабрыкі мастацкіх вырабаў, набярэжнай, прылягаючых тэрыторый. Пастамент знака стылізаваны, афармлены выявамі герба Слуцка і вензеля князёў Радзівілаў. Нагадаю, што гэта добраўпарадкаванне, рэканструкцыя будынка рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы» праводзіцца ў рамках дзяржаўнай праграмы па адраджэнні вытворчасці слуцкіх паясоў і іх аналагаў....

Н. Селязнёва.

27 жніўня

«МУЗЕЙ» ПОД ОТКРЫТЫМ НЕБОМ

...В Слуцком городском парке культуры и отдыха возник музей деревянной монументальной скульптуры после проведения областного праздника-конкурса «Сонечная цеплыня дрэва». Деревянные скульптуры не просто украшают городской парк, а «молча» повествуют об истории Слутчины.

Деревянные скульптуры знаменитых земляков, искусно выполненные мастерами из разных областей Беларуси, наверняка оставят яркие впечатления у горожан. «Ян Маджарский», «Богуслав Радзивилл», «Слуцкий ткач», «Летописец», «Вороны», «Вежа» с гербом Слуцка и многие другие деревянные скульптуры напоминают нам об интересной истории нашего края. Эти и другие работы создавали белорусские умельцы: Владимир Ломейко (г. Солигорск), Николай Скляр (г. Гродно), Николай Задрейко (г.п. Ивенец), Сергей Концевич (г. Минск), Олег Шапель (г. Слуцк), Василий Силков (г. Гомель).

Е. Никитина.

10 верасня

УСТАНОВЛЕНА СКУЛЬПТУРА «ТКАЧ»

В ноябре 2012 года газета «Слуцкі край» рассказывала о едином ансамблевом комплексе, в который «впишутся»

Скульптар С.Л. Гумілеўскі ў майстэрні каля мадэлі памятнага знака «Адраджэнне слуцкага пояса»

здание фабрики художественных изделий «Слуцкие пояса», территория вокруг, зона реки и набережной. 30 октября 2012 года на заседании Минского областного экспертного совета по монументальному и монументально-декоративному искусству утверждена скульптура «Ткач». Её автор – скульптор, член Белорусского союза художников Сергей Львович Гумилевский. На конкурс, который проводился на бесплатной основе, было представлено около 20 творческих работ. И вот «Ткач» занял своё место у здания фабрики. Волнистость пояса символизирует новую волну развития, новый виток истории. Ткач словно на минуту оторвался от работы, выбежал из помещения взглянуть

2017©nasledie-sluck.by

Скульптар С.Л. Гумілеўскі ў майстэрні каля мадэлі скульптуры «Ткач»

на пояс, развернул, приподнял на руке и словно приглашает: зайдите, полюбуйтесь красотой!

13 верасня

ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ – ЛЕС, А ГОНАР – ЛЮДЗІ

За дасягненне ў 2012 годзе высокіх паказчыкаў па эканоміі рэсурсаў дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Слуцкі лясгас» занесена на Рэспубліканскую Дошку гонару…

Слуцкі лясгас займае амаль 60 тысяч гектараў лясных угоддзяў на Случчыне, часткова – у Старадарожскім, Пухавіцкім, Любанскім раёнах. У яго склад уваходзяць восем структурных падраздзяленняў: шэсць лясніцтваў, майстроўскі вытворчы ўчастак «Жылін Брод» і паляўнічая гаспадарка. Ахова і пасадка лесу, нарыхтоўка драўніны, яе перапрацоўка, рэалізацыя на экспарт і ўнутраны рынак, ахова раслінага і жывёльнага свету лясоў – асноўныя задачы, якія стаяць перад работнікамі лесагаспадарчай установы…

І. Кавалёнка.

20 верасня

МУЗЕЙ СЛУЦКАГА ПОЯСА

– Кожны музей – жывы арганізм, – сцвярджае кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дырэктар музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Барыс Андрэевіч Лазука.

З ім нельга не пагадзіцца – асабліва пасля наведвання экспазіцый музея ў будынку фабрыкі мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы». Першае наведванне – і захоплівае дух, туды хочацца вярнуцца зноў і зноў, каб па крупіцах разам з навукоўцамі

Экспазіцыя музея ў будынку фабрыкі мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы»



2017©nasledie-sluck.by

адчуць атмасферу эпохі Слуцкіх паясоў, дакрануцца да іх тайны…
В. Ражанец.

24 верасня

«ГАСЦЕЙ БАГАТА ПРЫБЫЛО НА СВЯТА»

Сталіцай рамёстваў стаў Слуцк у мінулую суботу: каля 500 майстроў-умельцаў Мінскай вобласці прынялі ўдзел у свяце «Слуцкія паясы».

У Беларусі зацверджана Дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады, згодна з якой калегія галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама вырашыла правесці абласное свята рамёстваў «Слуцкія паясы»…

Урачыстае адкрыццё свята распачалося на цэнтральнай плошчы горада. Дэкарацыі сцэны, факеланосцы, вобразы Міхаіла Казіміра Рыбанькі і Яна Маджарскага нагадалі гледачам пра гістарычнае мінулае Слуцка. Віталі ўдзельнікаў і гасцей, віншавалі з адметнай падзеяй, жадалі натхнення і творчых адкрыццяў намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Мікалаевіч Юшкевіч, выконваючы абавязкі старшыні Слуцкага раённага выканаўчага камітэта Васілій Пятровіч Статкевіч. Удзел у свяце прынялі начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Руслан Іванавіч Трухан, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Інэса Анатольеўна Кляшчук….
В. Ражанец.

27 верасня

«ФЛАМЕНКА» АД ІРЫНЫ КУПРЫЯНЧЫК

Случчанка стала пераможцай міжнароднага чэмпіянату кандытарскага майстэрства.

Кожная сустрэча з кандытарам адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі хлебазавод» Ірынай Васільеўнай Купрыянчык – для мяне яшчэ адна магчымасць упэўніцца, якія таленавітыя на Случчыне людзі…

А повадам для сустрэчы з Ірынай Купрыянчык стала яе чарговая перамога – першае месца ў адной з намінацый на міжнародным чэмпіянаце кандытарскага майстэрства, які праходзіў у рамках IX міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «Хлебная і кандытарская справа».

Выстаўка «працавала» 10–13 верасня ў павільёне «Белэкспа» ў Мінску. У выставачных форумах прынялі ўдзел больш за 60 кампаній з розных краін свету, а ў міжнародным чэмпіянаце кандытарскага майстэрства – 69 майстроў з Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краін. У складзе журы – вядомыя шэф-кандытар, член нацыянальнай зборнай Ісландыі па кулінарыі Марыя Шрамко, кіраўнік вядомай расійскай «Школы шакаладу» Алена Сучкова.

«Фламенка» – так называецца работа Ірыны Купрыянчык. Страсная танцоўшчыца з цудоўнымі архідэямі ў валасах, у шыкоўнай «узлятаючай» сукенцы з кветак быццам на імгненне замерла ў танцы. Убачыўшы гэта дзіўнае тварэнне, я, шчыра кажучы, адразу і не здагадалася, што «скульптура» – з цукровай масцікі. Гэта работа ўразіла журы, удзельнікаў і наведвальнікаў чэмпіянату…
Н. Селязнёва.

29 кастрычніка

ЁСЦЬ ПЕРШЫ ПОЯС!

Цудоўная навіна – на новым абсталяванні на рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Слуцкія паясы» выраблі першы слуцкі пояс! У цэлым па тэхналагічных параметрах, арнаментацыі, колеравай гаме ён адпавядае

2017©nasledie-sluck.by

сусветна вядомым старажытным аналагам… Пояс выраблены на адмысловым тэхналагічным абсталяванні нямецкай кампаніі «Магеба»… Яно зроблена пад заказ, спецыяльна для вытворчасці слуцкіх паясоў… Над першым слуцкім поясам працавалі ткачы прадпрыемства Святлана Віктараўна Каржэвіч, Юлія Аляксандраўна Валадковіч, займаліся наладкай абсталявання Андрэй Віктаравіч Гурыновіч, Аляксандр Сяргеевіч Карцель.

Першы «сучасны» слуцкі пояс – пробны, ён сатканы з шаўковых і метанітавых нітак, якія пакуль выкарыстоўваюць замест залатых і сярэбраных…

Н. Селязнёва.

12 лістапада

З УДЗЯЧНАСЦЮ ЗА ПАМЯЦЬ

– Я ўзрушаны ўвагай і памяццю пра майго бацьку – Міхаіла Ісаакавіча Мукасея. Разам з мамай Лізаветай Іванаўнай яны больш за дваццаць гадоў працавалі ў нелегальнай разведцы. Іх памятаюць і ўшаноўваюць. Гэта не можа не кранаць, – расчулена прызнаваўся знакаміты кінааператар-пастаноўшчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, народны артыст Расіі Анатолій Міхайлавіч Мукасей у мінулую сераду (6 лістапада 2013 года) падчас наведвання радзімы бацькі – вёскі Замосце Слуцкага раёна. У кастрычніку мінулага года каля школы ўстаноўлены памятны знак у гонар унікальнага разведчыка-нелегала. І вось Анатолій, Эла і Міхаіл Мукасеі ўсклалі кветкі да помніка…

Знаёмства са Слуцкам і экспазіцыямі краязнаўчага музея пакінула ў гасцей незабыўнае ўражанне. Доўгія гады сям'я Мукасеяў захоўвала кінакамеру Canon, якой рабіў здымкі чалавек-легенда Міхаіл Ісаакавіч Мукасей. Унікальную рэч Мукасеі падарылі краязнаўчаму музею – і гэта таксама ўжо гісторыя.

В. Ражанец.

Каля памятнага знака ў гонар М.І. Мукасея

26 лістапада

НЯХАЙ СТАРТ БУДЗЕ ЎДАЛЫМ

На мінулым тыдні ў чацвер адбылося ўрачыстае адкрыццё фабрыкі фасоўкі ў ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» і падпісанне дагавора на пачатак будаўніча-мантажных работ дражджавога завода.

Самыя сучасныя тэхналогіі прыменены на фабрыцы, інвестыцыі ў будаўніцтва і аснашчэнне якой склалі 12 мільёнаў еўра….

– Магутнасць фабрыкі – фасоўка 350 тон цукру за суткі, ранейшыя магчымасці дазвалялі фасаваць толькі 200 тон, на гэтым участку былі задзейнічаны 70 чалавек, зараз спраўляюцца 25 работнікаў. Безумоўна, мадэрнізацыя дазволіла палепшыць умовы працы, зменшыцца сабекошт прадукцыі, – тлумачыў падчас невялікай экскурсіі па паверхах новай фабрыкі дырэктар ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» Мікалай Паўлавіч Пруднік….

У гэты ж дзень у канферэнц-зале цукраварафінаднага камбіната адбылося падпісанне дагавора на правядзенне мантажна-будаўнічых работ па будаўніцтве дражджавога завода ў Слуцку.

2017©nasledie-sluck.by

Урачыстае адкрыццё фабрыкі фасоўкі ў ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат». Злева направа: дырэктар ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» Мікалай Пруднік, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаіл Русы, старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна харчовай прамысловасці «Белдзяржкарчпрам» Аляксандр Забела. 21 лістапада 2013 г.

Дагавор заключаны паміж будаўнічай кампаніяй «Магнус Груп», ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат», нямецкай кампаніяй Unifermi СТАА «Інтэрферм» – сумесным германа-беларускім прадпрыемствам, створаным спецыяльна для рэалізацыі праекта…

Інвестыцыі ў дражджавы завод складуць прыкладна 35 мільёнаў еўра. Асноўныя вытворчыя пляцоўкі зоймуць плошчу ў чатыры гектары. Завод размесціцца недалёка ад цукраварафінаднага камбіната: вытворчы корпус, дадатковы, рэзервуарны парк для патакі, помпавыя станцыі і іншыя аб'екты – такая інфармацыя прадстаўлена на генеральным плане будаўніцтва аб'екта…

За год на заводзе плануюць выпускаць 20 тысяч тон дражджэй, будзе створана 87 новых рабочых месцаў…

В. Ражанец.

Фабрыка фасоўкі ў ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат»



2017©nasledie-sluck.by

6 снежня

ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ

4 снежня ў галерэі мастацтваў урачыста прадставілі слуцкі пояс, набыты пры фінансавай падтрымцы случчан…

«…Пояс выткан из шелковой, серебряной и серебряной позолоченной («золотной») нити. Двухсторонний, четырехлицевой, полулитой… Общая стилистика указывает на его изготовление на мануфактуре Слуцка между 1762 и 1780 годами…» (из заключения Комиссии по экспертизе произведений изобразительного и декоративно-прикладного искусства Национального художественного музея Республики Беларусь)…

Падчас прадстаўлення пояса кіраўнікам прадпрыемстваў Случчыны дырэктар краязнаўчага музея Наталля Георгіеўна Серык выказала словы вялікай шчырай падзякі ўсім, хто дапамог у яго набыцці: гэта самы каштоўны з 40 тысяч экспанатаў Слуцкага музея. У музейных калекцыях Беларусі ўсяго 11 цэлых слуцкіх паясоў, з іх 5 выткана на Слуцкай мануфактуры. Наш – шосты. А з'яўленне пояса ў Слуцкім музеі – самая важная падзея за 60 гадоў яго існавання.

– Наша ўстанова – пасрэднік паміж грамадствам і спадчынай, выконвае місію па перадачы яе нашчадкам. Таму пояс, вядома, набыты не для музея, а для ўсіх нас, – гаварыла Наталля Георгіеўна…

У спецыяльна выдадзенай кнізе пералічаны ўсе прадпрыемствы, установы, прадстаўнікі прыватнага бізнесу, якія аказалі музею фінансавую дапамогу ў набыцці пояса…

І. Міргародава.

13 снежня

СФК «СЛУЦК» – У ВЫШЭЙШАЙ ЛІЗЕ!

Аб гэтым паведаміў 11 снежня старшыня клуба Алег Мікалаевіч Каранеўскі.

Ушанаванне каманды-чэмпіёна СФК «Слуцк» прайшло ў гарадскім Доме культуры моладзі 6 снежня.

Іх любяць, у іх вераць, на іх спадзяюцца. Гэта адчувалася па атмасферы, якая панавала ў зале. Футбалістаў,

Слуцкі пояс, набыты пры фінансавай падтрымцы случчан

Навічкі вышэйшай лігі, СФК «Слуцк», 30 кавяніка 2014 г. у гродне атрымалі перамогу над футбалістамі «Нёмана» 1:0

2017©nasledie-sluck.by

На ўшанаванні СФК «Слуцк»

трэнерскі састаў сустракалі гучнымі апладысментамі, стоячы. І не стамляліся апладзіраваць на працягу ўсяго вечара.

Першы намеснік старшыні Беларускай федэрацыі футбола Сяргей Сафар'ян уручыў чэмпіёнскія медалі, дыпломы і пераходны кубак нашым героям, якія сталі пераможцамі ў чэмпіянаце рэспублікі па футболе сярод каманд першай лігі сезона 2013 года.

Каманду вітаў выконваючы абавязкі старшыні Слуцкага райвыканкама Васілій Пятровіч Статкевіч, адзначыў Ганаровай граматай райвыканкама галоўнага трэнера Юрыя Міхайлавіча Крата, аб'явіў падзякі старшыні райвыканкама футбалістам Вячаславу Грыгараву і Станіславу Гнядзько, уручыў клубу падарунак.

Як адзначыў дырэктар ААТ «Слуцкі цукровараф інадны камбінат» (прадпрыемства – генеральны спонсар каманды) Мікалай Паўлавіч Пруднік, кожныя тры гады «Слуцк» робіць упэўнены крок наперад – ад чэмпіёнства ў Мінскай вобласці да выхаду ў вышэйшы дывізіён. «Я мяркую, гэта пуцёўка мае права на жыццё і не павінна «згарэць», – словы Мікалая Паўлавіча Прудніка абнадзеілі балельшчыкаў, якія так хочуць бачыць сваю любімую каманду сярод мацнейшых у рэспубліцы…

І. Міргародава.

2014 год
28 лютага

НАРОШЧВАЮЦЬ АБ'ЁМЫ ВЫТВОРЧАСЦІ

Па валавому намалоту збожжа ў 2013 годзе Случчына займае чацвёртае месца ў краіне, па вытворчасці малака – на другім месцы. Дарэчы, у параўнанні з 2012 годам валавая вытворчасць малака павялічылася на 1,2 тысячы тон і склала 146,3 тысячы тон пры сярэднераённай таварнасці 87,9 %. Па сярэднім ўдоі малака ад каровы раён замацаваўся на восьмай пазіцыі сярод 118 раёнаў рэспублікі.

У ліку лепшых у краіне – комплекс па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы раённага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас

2017©nasledie-sluck.by

«Слуцк» (дырэктар Васілій Міхайлавіч Ачапоўскі). Па прыросце жывой масы ў сярэднім на адну галаву буйной рагатай жывёлы за студзень – снежань 2013 года комплекс займае 14 пазіцыю з 81 аналагічнага комплексу рэспублікі…

…За апошнія тры гады ўведзены ў эксплуатацыю 23 сучасныя малочнатаварныя фермы з даільнымі заламі.

Умацавана матэрыяльна-тэхнічная база ў раслінаводстве. Пабудавана 8 зернесушыльных комплексаў прадукцыйнасцю 30–40 тон у гадзіну, праведзены мадэрнізацыя і рамонт насеннеачышчальных ліній, уведзены ў эксплуатацыю бульбасховішча ў ААТ «Слуцкі мясакамбінат» на 3 тысячы тон і бульбасховішчы ў ДП «Саўгас «Рачкавічы» Беларускай чыгункі на 3 тысячы і 10 тысяч тон. Такія высокія паказчыкі дасягнуты дзякуючы самаадданай, зладжанай рабоце кіраўнікоў сельгасарганізацый, спецыялістаў, механізатараў, жывёлаводаў.

А. Сарокіна.

***

У РАМКАХ ІНВЕСТПРАЕКТАЎ

Прыемна адзначыць, што 2013 год быў выніковым для калектываў большасці прамысловых, перапрацоўчых прадпрыемстваў раёна. У тым ліку павялічылі аб'ёмы вытворчасці прадукцыі адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Слуцкі сыраробны камбінат», «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў», «Слуцкая мэблевая фабрыка», рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы», прыватныя прадпрыемствы – таварыствы з абмежаванай адказнасцю «Тэхнацэнтр», «Вудэн Хаус-Бел» і іншыя. Слуцкія прамыслоўцы (94,4 працэнта экспарту тавараў забяспечваюць валаўтваральныя прадпрыемствы – ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», «Слуцкі цукраварафінадны камбінат», «Слуцкі мясакамбінат») летась павялічылі экспарт тавараў (з улікам рэспубліканскіх арганізацый)…

…Сярод найбольш значных інвестыцыйных праектаў – беларуска-італьянскі праект ААТ «Слуцкі мясакамбінат» па будаўніцтве свінагадоўчага комплексу з замкнутым цыклам вытворчасці па адкорме 24 000 галоў свіней за год, абсталяванне біягазавай сістэмы. У гэтым годзе плануецца яго завяршэнне. Рэалізацыя праекта дазволіць істотна павысіць эфектыўнасць вытворчасці свініны, палепшыць якасць, павялічыць аб'ёмы паставак прадукцыі камбіната на знешні рынак, а значыць – атрымаць большы прыбытак.

Вялікія пераўтварэнні адбудуцца ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Слуцкі льнозавод»: рэканструкцыя і будаўніцтва вытворчага корпуса з устаноўкай лініі па перапрацоўцы льнотрасты. Кошт праекта – 183,5 мільярда рублёў…

У ліку мерапрыемстваў інвестпраектаў прамысловых прадпрыемстваў Слуцчыны – устаноўка новай аўтаматычнай фармовачнай лініі ў ААТ «Слуцкі завод «Эмальпасуда», завяршэнне рэканструкцыі камбікормавага і мукамольнага цэхаў ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў», мадэрнізацыя выпарной станцыі і далейшае нарошчванне магутнасцей ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат», рэканструкцыя абсталявання на адной з вытворчых ліній ААТ «Слуцкі хлебазавод». Плануецца прыцягненне прамых замежных інвестыцый у рамках інвестыцыйнага праекта «Новае будаўніцтва і эксплуатацыя дражджавога завода ў Слуцкім раёне». Па праграме «Энергазберажэнне» на гэты год запланаваны

2017©nasledie-sluck.by

103 мерапрыемствы з дасягненнем эканомii 12,3 тысячы тон умоўнага паліва…
Ж. Руцкая.

18 красавіка

ЛЕПШЫ СЯРОД ЦУКРОВЫХ

ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» прызнаны пераможцам у конкурсе «Лепшы цукровы завод Мытнага саюза 2013 года».

Культура вытворчасці, тэхналагічная дысцыпліна, парадак на камбінаце і прылягаючай тэрыторыі вылучае Слуцкі цукраварафінадны камбінат. Аб гэтым гаварылі многія з удзельнікаў тэхналагічнага семінара вытворцаў цукру краін Мытнага саюза «Клуб тэхнолагаў 2014» пасля экскурсіі па цэхах ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат».

Каля 200 прадстаўнікоў цукровай галіны з Расіі, Украіны, Францыі, Германіі, Італіі, Польшчы, Кыргызстана наведалі беларускія прадпрыемствы, абмеркавалі шляхі ўдасканалення вытворчасці, інавацыі, абмяніліся вопытам. Прайшло ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу «Лепшы цукровы завод Мытнага саюза 2013 года».
І. Міргародава.

25 красавіка

КІНАТЭАТР «БЕЛАРУСЬ»: НОВАЕ «КІНАВЫМЯРЭННЕ»

Пасля тэхнічнага перааснашчэння кінатэатра «Беларусь» цяпер і для случчан, гасцей нашага горада стаў даступным прагляд кінафільмаў у фармаце 2D, 3D.

Нагадаю, што рэканструкцыю глядзельнай залы кінатэатра «Беларусь» распачалі ў лютым гэтага года (раней былі адрамантаваны дах, фасад будынка, фае кінатэатра, некаторыя іншыя памяшканні). 18 красавіка ў тэставым рэжыме правялі першыя пасля рэканструкцыі кінасеансы. А ў сераду адбылося афіцыйнае адкрыццё кіназалы: чырвоную стужку, не пабаюся гэтага параўнання, у новы свет кіно перарэзалі старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Аляксеевіч Ражанец, намеснік генеральнага дырэктара камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінаблкінавідэапракат» Таццяна Іосіфаўна Дарашкевіч, дырэктар Слуцкага філіяла КУП «Мінаблкінавідэапракат» Анатолій Барысавіч Папоў. А першымі наведвальнікамі абноўленай кіназалы сталі навучэнцы гарадскіх школ, Слуцкага дзяржаўнага медкаледжа, Слуцкага дзяржаўнага каледжа, сельгасліцэя, кадэты Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча…
Н. Селязнёва.

8 ліпеня

З ПАМЯЦЦЮ ПРА МІНУЛАЕ

У вёсцы Гарадзішча 28 чэрвеня мясцовыя жыхары сабраліся на адкрыццё адноўленага помніка зямлячцы, загінулай ад рук фашыстаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

– Сёлета да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вырашылі ўстанавіць новы помнік ураджэнцы нашай вёскі Марыі Грак, маладой дзяўчыне, якую ў 1943 годзе фашысты павесілі ў Слуцку. Памятаю, школьнікамі мы часта прыносілі

Адкрыццё адноўленага помніка М. Грак

2017©nasledie-sluck.by

кветкі на магілы партызана і салдата, якія пахаваны на вясковых могілках, гэтай дзяўчыны. Ад сваіх бацькоў, некаторых іншых жыхароў вёскі мы неаднаразова чулі такую гісторыю: дзяўчына была пахавана ў агульнай магіле каля вёскі Журава, яе бацькі раскапалі магілу, дачушку пазналі па сукенцы, прывезлі на могілкі ў Гарадзішча і пахавалі. Час бяжыць няўмольна. Надмагільны камень, які быў устаноўлены, «урос» у зямлю. Не так даўно на могілках я сустрэла дальняга сваяка Марыі Ірак. Ён выказаў просьбу ўстанавіць новы помнік на яе магіле.

Адметна, што помнік устаноўлены за грашовыя сродкі, якія сабрала наша моладзь: і той, хто зараз жыве ў вёсцы, і выхадцы з Гарадзішча, якія жывуць у іншых населеных пунктах. Цудоўна, што маладыя людзі разумеюць важнасць зробленага. Усе яны – унукі, праўнукі тых, хто тут пахаваны. Да добраўпарадчых работ далучыліся і больш сталыя жыхары вёскі, якія таксама ўнеслі свае грашовыя сродкі. За што ўсім ім – вялікі дзякуй…

…Яўгенія Васільеўна Сыцько 31 год працавала загадчыцай фельчарска-акушэрскага пункта гэтай вёскі. На заслужаным адпачынку 6 гадоў. Аднак актыўную жыццёвую пазіцыю не губляе. Яна – дэпутат Слуцкага раённага Савета дэпутатаў, у гэтым годзе ўдастоена звання «Чалавек года Міншчыны»…

Н. Грамыка.

8 жніўня

УДАРНАЕ СОНЦА

Больш за 32 °С складала тэмпература паветра ў Слуцку з 29 ліпеня па 5 жніўня. Самы гарачы дзень быў 3 жніўня – 35,5 °С (такая тэмпература была і 7 жніўня 2010 года), паведаміў начальнік метэастанцыі «Слуцк» Уладзімір Іванавіч Пашко. Аднак тэмпературны рэкорд пакуль што не пабіты: самы спякотны дзень за апошнія 40 гадоў быў 11 жніўня 1992 года – ртутныя слупкі падымаліся да 36,1 °С.

Н. Грамыка.

15 жніўня

СЛУЦКІ РАЁН ЛІДЗІРУЕ Ў ВОБЛАСЦІ ПА ВАЛАВЫМ НАМАЛОЦЕ ЗЕРНЯ

Сёлета хлебаробы Случчыны пры сярэдняй ураджайнасці 49,3 цэнтнера з гектара намалацілі 183 924 тоны зерня.

На палях Случчыны

2017©nasledie-sluck.by

Найбольшая ўраджайнасць збожжавых – у ААТ «Падлессе-2003» (67,3 ц/га), СВК «Аграфірма «Лучнікі» (62,9 ц/га), КСУП «Эксперыментальная база «Танежыцы» (62,5 ц/га), найменшая – у ААТ «Сорагі-Агра», «Крывая Града», РСУП «Саўгас «Слуцк» (па 32,9 ц/га).

Шэсць сельгасарганізацый раёна намалацілі больш за дзесяць тысяч тон зерня кожная, а сельскагаспадарчы філіял сыраробнага камбіната – больш за 20 тысяч тон. Зараз намаганні працаўнікоў сельскай гаспадаркі накіраваны на падрыхтоўку глебы да сяўбы азімых культур, працягваецца нарыхтоўка кармоў.

І. Каваленка.

26 жніўня

У ГОСЦІ ДА СДЮШАР

З 10 па 16 жніўня ў Слуцкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву праходзіў Міжнародны турнір па гандболе сярод хлопчыкаў і дзяўчынак 2004–2005 гадоў нараджэння.

Турнір праводзіўся ў рамках акцыі «Разумныя канікулы: адпачывай, загартоўвайся, гуляй і развівайся». У спаборніцтвах удзельнічалі каманды з гарадоў Пратвіно і Дубна Маскоўскай вобласці, нашы суседзі з Капыля і Салігорска. Слуцк прадстаўлялі навучэнцы СДЮШАР: каманда дзяўчынак (трэнер Аксана Іванаўна Пракаповіч) і дзве каманды хлопчыкаў (трэнеры Ілья Ігаравіч Малейка і Людміла Эдуардаўна Папова)…

Пераможцамі спаборніцтваў сталі выхаванцы Слуцкай СДЮШАР.

А. Белая.

***

СВЯЦІ, «СОНЕЙКА»

Адкрыццё дзяржаўнай установы адукацыі «Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці «Сонейка» горада Слуцка» адбылося 24 жніўня.

Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці «Сонейка»

…Яго асабліва чакалі жыхары мікрараёна вуліц Чэхава і Іваноўскага, дзе актыўна будуюцца жылыя дамы і жывуць маладыя сем'і. Для бацькоў вельмі важна, каб дашкольная дзіцячая ўстанова была ў крокавай даступнасці ад дома.

– Установа разлічана на 230 месцаў, дзве групы прадугледжаны для выхаванцаў ясельнага ўзросту, 10 – для дашкольнікаў… Кожная група адметная індывідуальным інтэр'ерам, забяспечана гульнёвымі і вучэбнымі матэрыяламі. Абсталяваны музычная, фізкультурная і трэнажорная залы, працуюць басейн, студыя выяўленчага мастацтва, тэатральная майстэрня. У харчовым блоку створаны ўмовы для прыгатавання дыетычных страў. Медыцынскі блок мае фізіятэрапеўтычны, працэдурны, масажны кабінеты. Дзеці могуць займацца ў камп'ютарна-гульнёвым пакоі.

Праект хаця і тыповы, але ўяўляе сабой своеасаблівы сімбіёз лепшых напрацовак пры стварэнні ўстаноў такога прызначэння…

…Сярод ганаровых гасцей – член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Барыс Васільевіч Батура, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі

2017©nasledie-sluck.by

На адкрыцці дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці «Сонейка»

Беларусь Інэса Анатольеўна Кляшчук, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван Эдуардавіч Ліпніцкі, намеснік начальніка ўпраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь кандыдат педагагічных навук Альбіна Леанідаўна Давідовіч, начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна Мікалаеўна Казак, старшыня Слуцкага раённага выканаўчага камітэта Андрэй Уладзіслававіч Янчэўскі, старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Аляксеевіч Ражанец і іншыя. Госці падарылі кожнай групе камплекты развіваючых гульняў, а выхаванцы «Сонейка» на памяць пра сустрэчу ўручылі сувеніры – закладкі для кніг з сімволікай слуцкага пояса. Старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён Барысавіч Шапіра пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей і прыняў удзел у пасадцы дрэва на тэрыторыі «Сонейка». Гісторыя ўстановы толькі пачынаецца!

В. Ражанец.

29 жніўня

ДА НОВЫХ СПАРТЫЎНЫХ ПЕРАМОГ

Значных поспехаў дасягнуў на спартыўнай арэне СФК «Слуцк»: першае месца ў першай лізе і пераход у вышэйшую. Гэта прад'яўляе пэўныя патрабаванні да поля, аб'ектаў стадыёна, каб праводзіць «хатнія» гульні ў Слуцку. І вось доўгачаканая падзея для аматараў футбола – у мінулую нядзелю 24 жніўня ў Слуцку ўрачыста ўведзены ў дзеянне адміністрацыйна-спартыўны комплекс на стадыёне «Гарадскі».

У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён Барысавіч Шапіра, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай Мікалаевіч Корбут, старшыня асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Сяргей Мікалаевіч Румас, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Барыс Васільевіч Батура, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу

2017©nasledie-sluck.by

У Слуцку ўведзены адміністрацыйна-спартыўны комплекс

Рэспублікі Беларусь Інэса Анатольеўна Кляшчук, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван Эдуардавіч Ліпніцкі, старшыня Слуцкага раённага выканаўчага камітэта Андрэй Уладзіслававіч Янчэўскі, старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Аляксеевіч Ражанец, іншыя госці….

…Дырэктар стадыёна «Гарадскі» Генадзій Уладзіміравіч Паніч адзначыў, што адміністрацыйна-спартыўны будынак адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляе Федэрацыя футбола. Ёсць раздзявалкі, душавыя, кабінет урача, масажны кабінет, прэс-цэнтр, судзейскі і трэнерскі пакоі, трэнажорная зала і іншае.

Увядзенне ў эксплуатацыю адміністрацыйна-спартыўнага комплексу на стадыёне «Гарадскі» прадаставіць магчымасць праводзіць спаборніцтвы рэспубліканскага ўзроўню, займацца ў трэнажорнай зале розным катэгорыям насельніцтва, скарыстацца паслугамі пункта пракату спартыўнага інвентару…

І. Кавалёнка.

2 верасня

ВЫТОКІ ПОСПЕХУ ЮНЫХ МАСТАКОЎ

XIX міжнародны фестываль-конкурс дзіцячай мастацкай творчасці «Парыж, я люблю цябе!» у рамках міжнароднага праекта «Салют талентаў» праходзіў у горадзе Парыжы ў Францыі. Удзельнічалі ў ім дзеці з розных краін, з рознымі захапленнямі: танцоры, музыканты, фатографы, відэааператары, мастакі. У ліку іншых былі і навучэнцы студыі выяўленчага мастацтва «Вытокі» Слуцкага цэнтра дзіцячай творчасці. Вынік конкурсу – 23 дыпломы за першае месца і ўзнагарода за лепшую мастацкую работу. Случчане сталі лепшымі на конкурсе сярод мастакоў ва ўсіх узроставых катэгорыях.

А. Белая.

12 верасня

МИСТЕР БРСМ

30 октября в средней школе № 11 состоялся шоу-конкурс «Мистер БРСМ». В Слуцком районе он проходил впервые. Конкурсантами стали четырнадцать старшеклассников из городских и

2017©nasledie-sluck.by

сельских средних школ – секретари первичных организаций БРСМ, спортсмены, прилежные ученики и творческие люди…

Итоги конкурса: первое место и звание «Мистер БРСМ 2014» – у Кирилла Прыня, ученика 10-го класса средней школы № 11 г. Слуцка. Вице-мистером стал учащийся 11-го класса Минского областного кадетского училища Юрий Чижонков. «Мистер Оригинальность» – Александр Бубырев, ученик 10-го класса гимназии № 1 г. Слуцка. Приз за второе место получил Денис Данилович, учащийся 10-го класса средней школы № 13. Третье место – у Вадима Атрасевича, десятиклассника средней школы № 9. Приз зрительских симпатий достался Артему Власову, ученику 10-го класса средней школы № 6 г. Слуцка.

О. Белая.

11 лістапада

У ГОНАР ВІТОЛЬДА ЦЭРАСКАГА

У дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія № 1 г. Слуцка» прайшло ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар ураджэнца Случчыны, выпускніка Слуцкай гімназіі 1867 года, вядомага астранома і даследчыка Вітольда Карлавіча Цэраскага. У гэтым годзе знакамітаму вучонаму споўнілася б 165 гадоў…

У старэйшай навучальнай установе Беларусі – гімназіі № 1 горада Слуцка – з вялікай пашанай ставяцца да навуковай спадчыны Вітольда Цэраскага, які стаяў ля вытокаў касмічнай навукі. Дарэчы, Случчына – радзіма і іншых знакамітых прадстаўнікоў «касмічнай сферы», у тым ліку доктара тэхнічных навук, галоўнага канструктара ракетных рухавікоў Сямёна Арыевіча Косберга, былых кіраўнікоў касмадрома «Байканур» генерал-палкоўніка Канстанціна Васільевіча Герчыка, генерал-лейтэнанта Юрыя Аверкавіча Жукава і іншых. Як сведчыць гісторыя, больш за 20 ураджэнцаў Слуцкага краю ў свой час звязалі сваё жыццё з касмічнай навукай, асваеннем космасу. Дзейнасці гэтых людзей, розным «касмічным» аспектам прысвечаны даследчыя, творчыя работы сучасных навучэнцаў гімназіі. З 2010 года слуцкія гімназісты паспяхова ўдзельнічаюць у штогадовых міжнародных Гагарынскіх

Урачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар В.К. Цэраскага

2017©nasledie-sluck.by

чытаннях, міжнародных навукова-практычных канферэнцыях у Серпухаве, Пратвіно, іншых форумах такога кшталту, дзе высока ацэнены ўзровень іх работ…

…Вельмі прыемна, што на ўрачыстасць прыехалі госці з Расійскай Федэрацыі – член Кансультатыўнага савета пры Савеце Федэральнай нацыянальнай культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі, член Савета рэгіянальнай нацыянальнай культурнай аўтаноміі беларусаў Маскоўскай вобласці Уладзімір Максімавіч Дудко, вядучы спецыяліст Краснапрэсненскай лабараторыі Дзяржаўнага астранамічнага інстытута імя П.К. Штэрнберга Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава Ірына Канстанцінаўна Лапіна. Адметны факт: астранамічны інстытут імя П.К. Штэрнберга заснаваны на базе Маскоўскай астранамічнай абсерваторыі, арганізаванай у свой час Вітольдам Цэраскім! Ірына Канстанцінаўна Лапіна прывезла ў Слуцк прывітальны адрас дырэктара Дзяржаўнага астранамічнага інстытута імя П.К. Штэрнберга Анатолія Міхайлавіча Чарапашчука…

Н. Селязнёва.

28 лістапада

ГАНДЛЁВЫ ЦЭНТР «МАЯК» ПАЧАЎ СВАЮ РАБОТУ

Відавочна, гэта стала падзеяй у жыцці Слуцка. «Маяк» – першы буйнафарматны гандлёвы аб'ект у нашым горадзе. Адкрыццё гандлёвага цэнтра ў мінулую суботу праходзіла, што называецца, пры аншлагу: на свята завіталі многія случчане і нават жыхары суседніх рэгіёнаў, пляцоўкі каля гандлёвага цэнтра былі поўнасцю заняты людзьмі…

…Нагадаю, што «Маяк» размясціўся на плошчах былой макароннай фабрыкі. Рэканструкцыйна-будаўнічыя работы праводзіліся ў рамках інвестпраекта, які ажыццяўляе ААТ «Гандлёва-прамысловая кампанія «Ракан». Генпадрадчык – ТАА «ИСМТ-СтройСервис». Агульная плошча гандлёвага цэнтра – больш за 10 000 квадратных метраў. «Маяк» забяспечаны ліфтамі, сучаснымі сістэмамі вентыляцыі і кандыцыяніравання паветра, пажарнай бяспекі, відэаназірання, навігацыі…

Н. Селязнёва.

5 снежня

ПРОДОЛЖАЯ «ЗОЛОТЫЕ ТРАДИЦИИ»

Слуцкой специализированной школе олимпийского резерва (директор Александр Павлович Пантелеев) – 60 лет. Она по праву считается одной из лучших в Минской области. На протяжении многих лет здесь готовят спортсменов высокого класса.

За 60 лет работы школы подготовлено 5 заслуженных мастеров спорта, 11 мастеров спорта международного класса, 51 мастер спорта. Только с 2000 года по настоящее время из школы вышло более 1000 спортсменов массовых разрядов, 51 кандидат в мастера спорта, 18 мастеров спорта, 8 мастеров спорта международного класса, один заслуженный мастер спорта Республики Беларусь.

Из стен школы вышли выдающиеся спортсмены: чемпионы Олимпийских игр (гандбол) заслуженные мастера спорта Республики Беларусь Михаил Якимович, Юрий Шевцов, участница двух Олимпиад (легкая атлетика) Татьяна Шевчик, обладатель высшего европейского достижения в толкании ядра и победитель соревнований «Дружба-84» в Москве, заслуженный мастер спорта Республики Беларусь Сергей Каснаускас, чемпионка мира среди юниоров по гандболу Антонина Чибангу, призер IV Спартакиады народов СССР по плаванию, чемпионка мира 1981, 1982, 1983 годов, победительница международных соревнований

2017©nasledie-sluck.by

«Дружба-84» по академической гребле заслуженный мастер спорта Республики Беларусь Елена Макушкина, неоднократные победительницы и призеры чемпионатов мира и Европы, участницы Олимпийских игр (современное пятиборье) мастера спорта международного класса Анастасия Прокопенко и Анастасия Мирончик-Иванова, серебряный призер чемпионата мира по художественной гимнастике мастер спорта международного класса Ольга Маслакова, неоднократный победитель и призер чемпионатов мира и Европы по кикбоксингу заслуженный мастер спорта Республики Беларусь Вероника Домбровская и многие другие.

В разные годы звание «Мастер спорта международного класса» получили Жанна Гурбанова, Татьяна Шевчик, Ирина Чернушенко-Стасюк, Анастасия Мирончик-Иванова (легкая атлетика); Антонина Чибангу, Алексей Кишов, Дмитрий Жук, Кирилл Князев (гандбол); Александр Кунцевич (военное пятиборье); Ольга Маслакова (художественная гимнастика), Анастасия Прокопенко (современное пятиборье).

В настоящее время с учащимися СДЮШОР занимаются 23 тренера-преподавателя, среди которых немало бывших ее воспитанников. Два тренера-преподавателя имеют высшую категорию, пять – первую, одиннадцать – вторую категорию, три тренера – звание «Мастер спорта». На четырех отделениях в 63 учебных группах занимаются 618 учащихся…

Н. Громыко.

19 снежня

З ПРАВАМ МАРКІРОЎКІ ЗНАКАМ «ГУСТ»

На рэспубліканскі конкурс-дэгустацыю «Густ» на лепшы прадукт 2014 года адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі воцатны завод» у намінацыі «Воцат» прадставіла пяць відаў сваёй прадукцыі: воцат спіртавы, воцат яблычны, воцат вінны, воцаты спіртавыя араматызаваныя «Для шашлыка» і «Бальзаміка салата». Прадпрыемства атрымала Дыплом пераможцы з правам маркіроўкі прадукцыі знакам «Густ», у чарговы раз пацвердзіўшы яе высокую якасць.

Прадукцыя ААТ «Слуцкі воцатны завод»

2017©nasledie-sluck.by

Конкурс праводзіўся пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Інстытута мяса-малочнай прамысловасці, ТАА «Цэнтр крэатыўных тэхналогій «Арт-Шок».

31 снежня

СЧАСТЬЯ, РАДОСТИ ВАМ, НОВОСЕЛЫ!

В преддверии Нового года 60 семей слутчан получили ключи от новых квартир в доме ЖСПК «Сахарник-2012» в 1-м переулке Чайковского в Слуцке…

– Строительство дома жилищно-строительного потребительского кооператива «Сахарник-2012» было задумано еще в 2012 году. В конце этого года он сдан в эксплуатацию. Строительство давалось сложно. Чтобы поддержать своих работников, предприятие полностью оплатило расходы, связанные с проектными работами. Всем решившим строиться была выделена беспроцентная финансовая помощь на возвратной договорной основе в размере 30 процентов стоимости строительства квартиры….

…В 60-квартирном новом доме будут жить 50 семей тружеников нашего предприятия и 10 – работников других организаций.

Н. Громыко.

Падрыхтавала В.С. Відлога.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ

Ардэнаносцы

Узнагароджаны ордэнам Леніна

БЫЧЭНЯ Соф'я Паўлаўна, жывёлавод саўгаса «Танежыцы» (1966).

ВАСІЛЕВІЧ Мікалай Ільіч, старшыня калгаса «Ленінскі шлях» (1981).

ГУТКОЎСКІ Адам Васільевіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Калініна.

ДУБІНА Любоў Ціханаўна, даярка калгаса імя Мічурына.

ЖУК Яўгенія Герасімаўна, свінарка калгаса імя Калініна.

ІВАНОВІЧ Іван Іванавіч, брыгадзір, начальнік вытворчага ўчастка № 3 (Бранавічы) калгаса «Ленінскі шлях» (1978).

КАПАЦЭВІЧ Вольга Ціханаўна, калгасніца калгаса імя Мічурына (1967).

КАСЦЮКЕВІЧ Уладзімір Пятровіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях» (1978).

ЛАКЦІЁНАВА Алімпіяда Емяльянаўна, даярка калгаса імя Кірава.

ПАЛЯШЧУК Сяргей Сямёнавіч, старшыня калгаса імя Калініна (тройчы). (Герой Сацыялістычнай Працы. Гл. кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 2. 2001. С. 422).

РАДЗЮК Ганна Гаўрылаўна, даярка калгаса імя Кірава (1984).

САВАНОВІЧ Лілія Міхайлаўна, старшыня калгаса імя Арджанікідзе (1988).

ШАКУН Рыгор Васільевіч, дырэктар Лучнікоўскай школы (1957).

ШУТКО Аляксандр Фёдаравіч, старшыня калгаса імя Арджанікідзе.

ШЫЛОВІЧ Віктар Мікалаевіч, машыніст бульдозера Слуцкага будаўнічамантажнага ўпраўлення меліярацыі (1975).

Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

БАЛВАНОВІЧ Леанід Аляксандравіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Калініна.

ГАЛЬЦ Міхаіл Іванавіч, трактарыст калгаса імя Красіна (1973).

2017@nasledie-sluck.by

ГАРКАВЫ Уладзімір Макаравіч, брыгадзір калгаса імя К. Маркса (1973).

ГЛАЗКОЎ Іван Іванавіч, машыніст бульдозера Слуцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі (1974).

ДЗЕГЦЯРОЎ Міхаіл Паўлавіч, брыгадзір брыгады муляраў ПМК-223 (1981).

КАЧУР Іван Сцяпанавіч, брыгадзір калгаса імя Красіна (1972).

КУНЦЭВІЧ Іван Сямёнавіч, трактарыст калгаса імя К. Маркса (1971).

ПЯКЕЛЬНІК Аляксандр Дзяменцьевіч, галоўны інжынер калгаса імя Кірава (1983).

САМУСЕВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, брыгадзір калгаса імя Красіна (1971).

СУЧОК Канстанцін Канстанцінавіч, механік саўгаса «Танежыцы».

УЛАСАЎ Аляксей Аляксеевіч, старшыня калгаса імя Красіна (1971).

ШКУРСКІ Іван Аляксандравіч, трактарыст-машыніст калгаса «Рассвет» (1983).

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

АБРАЗЦОВА Еўдакія Пятроўна, хімік па сыравіне цукровараф інаднага завода (1971).

АРАНОВІЧ Тамара Іванаўна, даярка калгаса імя Кірава.

БАГАЛЕЙКА Марыя Пятроўна, даярка калгаса імя Кірава (1976).

БАЛАХОЎСКІ Пётр Андрэевіч, лесатэхнік Жылінбродскага лясніцтва лясгаса (1970).

БАЛВАНОВІЧ Канстанцін Віктаравіч, брыгадзір калгаса імя Калініна (1972).

БАНДУРА Валянціна Рыгораўна, даярка калгаса імя Калініна (1986).

БАРЧУК Іван Аляксеевіч, трактарыст калгаса імя Энгельса (1975).

БАРЫСАВЕЦ Уладзімір Міхайлавіч, камбайнер калгаса «Гігант» (1966).

БАХАНОВІЧ Антон Герасімавіч, завуч сярэдняй школы № 10 (1949).

БРОДСКІ Аляксандр Іванавіч, старшыня калгаса імя Чкалава (1979).

БУГАРЭВІЧ Аркадзь Спірыдонавіч, фрэзероўшчык цукровараф інаднага завода (1981).

БУЛАТ Уладзімір Васільевіч, загадчык фермы калгаса імя Тэльмана (1973).

БЫЛІНОВІЧ Анатоль Іосіфавіч, брыгадзір брыгады бетоншчыкаў ПМК-223.

ВАНКЕВІЧ Мікалай Васільевіч, бурыльшчык геолагаразведачнай экспедыцыі (1976).

ВАСІЛЕВІЧ Мікалай Ільіч, дырэктар саўгаса «Танежыцы» (1970).

ВЛАСЕНКА Рыгор Васільевіч, начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела геолагаразведачнай экспедыцыі (1966).

ВЯРБІЦКАЯ Надзежда Фёдараўна, даярка саўгаса «Танежыцы».

ВЯРБІЦКІ Рыгор Іванавіч, механізатар саўгаса «Танежыцы» (1978).

ГАНЧАРОЎ Аляксей Данілавіч, дырэктар лясгаса (1970).

ГАПАНОВІЧ Вера Паўлаўна, цялятніца саўгаса «Танежыцы».

ГАЎРУК Ніна Пятроўна, даярка калгаса імя Энгельса (1972, 1977).

ГРАБЯНЧУК Валянціна Дзмітрыеўна, даярка калгаса імя Чкалава (1973).

ГРЫНЮК Таццяна Фёдараўна, цялятніца калгаса імя Мічурына (1971).

ДАПІРА Восіп Іосіфавіч, галоўны рафінёр цукровараф інаднага завода (1977).

ДОЛБІК Ганна Сямёнаўна, свінарка калгаса імя Чкалава (1976).

ДРОБЫШ Ніна Іосіфаўна, свінарка калгаса «Рассвет».

ЖУК Віктар Георгіевіч, загадчык МТФ № 1 калгаса імя Калініна (1973).

ЖУК Мікалай Аляксеевіч, брыгадзір рамонтнай брыгады калгаса імя Тэльмана (1986).

2017©nasledie-sluck.by

ЖУК Мікалай Сямёнавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана (1988).

ЗАХАРЭВІЧ Васіль Максімавіч, загадчык свінафермы калгаса імя Калініна.

ЗАХАРЭВІЧ Лідзія Васільеўна, палявод калгаса імя Калініна.

ЗАХАРЭВІЧ Мікалай Іванавіч, брыгадзір калгаса імя Кірава (1976).

ЗІНКЕВІЧ Канстанцін Канстанцінавіч, галоўны энергетык цукраварафінаднага завода (1974).

ІВАНОЎСКІ Аляксандр Васільевіч, брыгадзір брыгады бетоншчыкаў ПМК-223.

КАЛЯДКА Леанід Цімафеевіч, настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 6 (1978).

КАМОЦКАЯ Любоў Каленікаўна, галоўны аграном калгаса імя Кірава (1976).

КАПАЕВА Ніна Іванаўна, загадчыца вытворчай лабараторыі цукраварафінаднага завода (1960).

КАПАРЫХА Галіна Васільеўна, сакратар Слуцкага ГК КПБ (1979).

КАРПОВІЧ Мікалай Якаўлевіч, начальнік геолагаразведачнай экспедыцыі (1974).

КАСАКЕВІЧ Арсеній Міхайлавіч, электрагазазваршчык Слуцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі (1972).

КАСЦЮКЕВІЧ Уладзімір Пятровіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях» (1976).

КАСЫМАКУМАВА Галіна Аляксандраўна, даярка калгаса імя Леніна (1985).

КЕЦЬКО Ганна Рыгораўна, палявод, загадчыца СТФ калгаса «Ленінскі шлях» (1975).

КОСТЫШАН Іван Купрыянавіч, слесар-кацельшчык цукраварафінаднага завода (1974).

КУПРЫЯНЕНКА Анатолій Паўлавіч, дырэктар цукраварафінаднага завода (1986).

ЛАГУН Пётр Паўлавіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Калініна (1979).

ЛЕМЕШ Лідзія Іванаўна, палявод калгаса імя Энгельса (1977).

ЛЕМЕШ Міхаіл Васільевіч, жывёлавод калгаса імя Энгельса (1972).

ЛІХАДЗІЕЎСКІ Віктар Іосіфавіч, экскаватаршчык цукраварафінаднага завода (1986).

МАГІЛЯВЕЦ Віктар Васільевіч, старшыня калгаса імя Тэльмана (1966, 1976).

МАРОЗ Ядвіга Міхайлаўна, майстар фабрыкі мастацкіх вырабаў (1975).

МОШКА Анатолій Якаўлевіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях» (1976).

НАВУМОВІЧ Іван Пракоф'евіч, электраслесар майстэрні прадпрыемства электрасетак (1974).

НЕКРАШЭВІЧ Леанід Максімавіч, жывёлавод саўгаса «Танежыцы».

ПАЛЮХОВІЧ Васіль Міхайлавіч, буравы майстар геолагаразведачнай экспедыцыі (1981).

ПІСАРЭВІЧ Агнія Аляксандраўна, калгасніца калгаса імя К. Маркса.

ПУЦЕЙКА Міхаіл Васільевіч, калгаснік калгаса імя К. Маркса (1973).

РАДЗЮК Ганна Гаўрылаўна, даярка калгаса імя Кірава (1973).

САВАНОВІЧ Анастасій Паўлавіч, бондар калгаса «Ленінскі шлях» (1973).

САВАНОВІЧ Клаўдзія Сцяпанаўна, даярка калгаса «Ленінскі шлях» (1981).

САВАНОВІЧ Лілія Міхайлаўна, галоўны заатэхнік, намеснік старшыні калгаса «Ленінскі шлях» (1982).

САВАНОВІЧ Пётр Цімафеевіч, брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Ленінскі шлях» (1966).

САРОКІНА Вера Якаўлеўна, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 7 (1985).

СІДАРЭНКА Іван Фёдаравіч, муляр ПМК-223 (1977).

2017©nasledie-sluck.by

СУКАЧ Ганна Міхайлаўна, даярка саўгаса «Танежыцы» (1973).

СЫЦЬКО Дзмітрый Васільевіч, старшыня калгаса «III Інтэрнацыянал» (1973).

ТРАФІМОВІЧ Вольга Аляксандраўна, загадчыца МТФ калгаса імя Кірава.

УЛАСЕВІЧ Пётр Іосіфавіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Леніна (1984).

ХАЦЬКО Галіна Іванаўна, цялятніца калгаса імя Энгельса (1975).

ЦЮННІКАВА Святлана Леанідаўна, аператар варкі утфелю цукраварафінаднага завода (1974).

ШАЎНЁЎ Васілій Пятровіч, дырэктар УПП «Беларускае таварыства сляпых» (1976).

ШАХЛЕВІЧ Анатоль Піліпавіч, брыгадзір участка № 1 калгаса імя Энгельса (1975).

ШУМАНСКІ Уладзімір Іванавіч, бурыльшчык геолагаразведачнай экспедыцыі (1974).

ШУТКО Аляксандр Фёдаравіч, старшыня калгаса імя Арджанікідзе.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

АВЕРЧАНКА Клаўдзія Пятроўна, загадчык эпідэміялагічнага аддзела санэпідстанцыі (1986).

ЖДАНОВІЧ Сяргей Паўлавіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Калініна (1988).

ЖУК Віктар Георгіевіч, загадчык МТФ № 1 калгаса імя Калініна (1986).

ІВАНОВА Яўгенія Мікалаеўна, начальнік страхавога ўчастка раённага вузла паштовай сувязі (1986).

КАЧУР Ніна Аляксандраўна, даярка калгаса імя Красіна (1971).

КЕРНАЖЫЦКАЯ Вера Рыгораўна, аператар варкі утфелю цукраварафінаднага завода (1986).

КУДЗЁЛКА Раіса Іванаўна, арганізатар пазакласнай і выхаваўчай работы Грэскай сярэдняй школы (1981).

КУНІК Міхаіл Мікалаевіч, геолаг геолагаразведачнай экспедыцыі (1981).

МАКАРАНКА Галіна Станіславаўна, загадчыца МТФ калгаса імя Кірава (1985).

СЛАВАШЭВІЧ Валянціна Пятроўна, даярка калгаса «Ленінскі шлях» (1983).

ШЧЫГЛОЎ Павел Сцяпанавіч, намеснік старшыні калгаса «Ленінскі шлях» (1986).

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»

АЛІНОЎСКАЯ Ніна Міхайлаўна, вышывальшчыца фабрыкі мастацкіх вырабаў (1980).

АЎДУСЬ Ларыса Вячаславаўна, галоўны тэхнолаг цукраварафінаднага завода (1976).

БАБЕНКА Уладзімір Аляксеевіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Калініна (1966).

БАБРОЎ Аляксандр Мацвеевіч, машыніст бульдозера ПМК-71 (1974).

БАЛАМАЦЮК Аляксандр Паўлавіч, слесар малочнага комплексу саўгаса «Танежыцы».

БАЛОШКА Вольга Міхайлаўна, брыгадзір участка № 2 калгаса імя Энгельса (1974).

БАРОДЗІЧ Мікалай Пятровіч, механізатар калгаса імя Энгельса (1976).

БАРЫСЮК Валянціна Пятроўна, загадчыца свінафермы калгаса імя Леніна (1985).

БАСАЛЫГА Уладзімір Васільевіч, слесар кантрольна-вымяральных прыбораў цукраварафінаднага завода (1986).

БАХАНОВІЧ Антон Герасімавіч, завуч Амговіцкай сярэдняй школы (1939).

БАЯЗІТАВА Ірына Браніславаўна, геолаг геолагаразведачнай экспедыцыі (1966).

БОБІК Фёдар Рыгоравіч, буравы майстар геолагаразведачнай экспедыцыі (1976).

2017©nasledie-sluck.by

БУРАЧКОЎ Анатоль Ісакавіч, брыгадзір калгаса імя Калініна (1976).

БУСЕЛ Аляксандр Лявонцьевіч, жывёлавод калгаса імя Энгельса (1974).

ВАЛАТОВІЧ Мікалай Фёдаравіч, нам. старшыні калгаса імя К. Маркса.

ГАПАНОВІЧ Аляксандр Максімавіч, інжынер калгаса імя Энгельса (1977).

ГАРДЗІЕВІЧ Вячаслаў Казіміравіч, электраманцёр раённага вузла электрычнай сувязі (1986).

ГЛАЗКОЎ Іван Іванавіч, машыніст бульдозера міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі (1966).

ГУРБО Раіса Іванаўна, заг. аддзела сельскай гаспадаркі ГК КПБ (1986).

ГУРЫНОВІЧ Аркадзь Канстанцінавіч, начальнік жывёлагадоўчага комплексу саўгаса «Белічы» (1981).

ГУЦЬКО Галіна Міхайлаўна, даярка калгаса імя Энгельса (1974).

ДЗЕГЦЯРОЎ Міхаіл Паўлавіч, брыгадзір брыгады муляраў ПМК-223 (1973).

ДЗЯШКОВІЧ Міхаіл Мікітавіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях» (1972).

ДЗЯРЭЧА Лідзія Мікалаеўна, начальнік участка № 1 калгаса «Ленінскі шлях» (1982).

ДОЛБІК Вольга Мікалаеўна, бетоншчык ПМК-223.

ДУБАЛЕКА Надзежда Іванаўна, палявод калгаса «Ленінскі шлях» (1968).

ДУБОВІК Анатоль Зіноўевіч, трактарыст калгаса імя Мічурына.

ЕЛІСТРАТАЎ Дзмітрый Васільевіч, слесар-інструментальшчык аўтарамзавода (1970).

ЕЎДАКІМАВА (АЛЕШКА) Надзежда Данілаўна, аператар варкі утфелю цукровараф інаднага завода (1971).

ЖУК Іван Аляксеевіч, жывёлавод калгаса імя Тэльмана (1973).

ЖУК Марыя Якаўлеўна, свінарка калгаса імя Тэльмана (1981).

ЖУК Мікалай Аляксеевіч, брыгадзір рамонтнай брыгады калгаса імя Тэльмана (1977).

ЖУК Мікалай Сямёнавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана (1980).

ЖУРНЕВІЧ Лявон Фядосавіч, ліцейшчык завода «Эмальпасуда».

КАЗЛОЎСКАЯ Марыя Фёдараўна, палявод, кладаўшчык калгаса «Ленінскі шлях» (1975).

КАЗЛОЎСКАЯ Таццяна Уладзіміраўна, загадчыца МТФ № 3 калгаса «Ленінскі шлях» (1973).

КАЛЯДА Баляслаў Адамавіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Мічурына (1975).

КАМІНСКІ Валянцін Паўлавіч, токар майстэрні прадпрыемства электрасетак (1967).

КАНОПЛІЧ Іван Паўлавіч, бурыльшчык геолагаразведачнай экспедыцыі (1986).

КАПУСЦІНСКІ Яўген Іванавіч, машыніст турбіны цукровараф інаднага завода (1981).

КАЧАНОЎСКАЯ Вера Лявонцьеўна, брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Маяк» (1976).

КІРЫКАЎ Леанід Канстанцінавіч, электраманцёр прадпрыемства электрасетак (1974).

КІСЛЮК Яўген Фёдаравіч, вадзіцель цэха перапрацоўкі «Жылін Брод» лясгаса (1974).

КОРБУТ Віктар Антонавіч, начальнік ПМК-223.

КРОТ Міхаіл Радзівонавіч, электраманцёр па абслугоўванні падстанцыі прадпрыемства электрасетак (1974).

КРЫВАДУБСКАЯ Галіна Рыгораўна, жывёлавод калгаса «Ленінскі шлях» (1980).

КУПРЫК Генадзь Пятровіч, начальнік лабараторыі кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі цукровараф інаднага завода (1971).

2017©nasledie-sluck.by

ЛАЗУК Іван Паўлавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана (1973).

ЛАТВІС Францц Францавіч, бурыльшчык геолагаразведачнай экспедыцыі (1986).

ЛЯСУН Мая Майсееўна, старшы прадавец магазіна № 18 гарпрамхарчгандлю (1983).

МАГЛЫШ Рыгор Іванавіч, загадчык МТФ, СТФ, памочнік нач. участка калгаса «Ленінскі шлях» (1982).

МАКАРАЎ Клаўдзій Аляксеевіч, слесар механазборачных работ аўтарамзавода (1970).

НАВУМЕНКА Аляксандр Савельевіч, начальнік падстанцыі прадпрыемства электрасетак (1986).

НЕКРАШЭВІЧ Ганна Іванаўна, даярка саўгаса «Танежыцы».

ПАВЕЛКА Іван Іванавіч, начальнік цэха аўтарамзавода (1970).

ПАДЛІПСКАЯ Ганна Пятроўна, аператар варкі утфелю цукраварафінаднага завода (1974).

ПЫШНІК Зоя Аляксееўна, даярка калгаса «Ленінскі шлях» (1979).

САМУСЕВІЧ Любоў Пятроўна, старшыня калгаса «Праўда» (1966).

САСНОЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч, трактарыст прадпрыемства электрасетак (1976).

СІНЬКЕВІЧ Іван Анісімавіч, жывёлавод калгаса імя Калініна.

СМОЛЬСКІ Канстанцін Канстанцінавіч, вадзіцель калгаса «Маяк» (1973).

ТОЛСЦІК Пётр Рыгоравіч, трактарыст калгаса імя Мічурына.

ТРЭГУБОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, вадзіцель геолагаразведачнай экспедыцыі (1974).

ФІЛІППОВІЧ Анатоль Аляксеевіч, трактарыст калгаса імя Чкалава (1976).

ХАДАРОВІЧ Зінаіда Сямёнаўна, паляавод калгаса імя Чкалава (1973).

ХАДАРОВІЧ Уладзімір Ігнатавіч, трактарыст калгаса імя Чкалава (1976).

ХАЎРАТОВІЧ Пётр Іванавіч, начальнік партыі геолагаразведачнай экспедыцыі (1963).

ХАЎСТОВІЧ Галіна Антонаўна, паляавод калгаса імя Леніна (1972).

ЧАРНЫШЭЙ Тамара Цімафееўна, настаўніца біялогіі сярэдняй школы № 2.

ЧУРЫЛА Барыс Мікалаевіч, галоўны аграном калгаса імя Калініна.

ШАБЛЮК Ганна Аляксандраўна, фармацэўт-рэцэптар аптэкі № 75 (1981).

ШЧАРБІЦКІ Уладзімір Браніслававіч, старшыня калгаса «Маяк» (1973).

ШЫЛОВІЧ Марыя Герасімаўна, даярка калгаса імя Калініна.

ЯРАШЭНЯ Галіна Сямёнаўна, паляавод калгаса імя Мічурына (1976).

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы

АЛІНОЎСКАЯ Ніна Міхайлаўна, вышывальшчыца фабрыкі мастацкіх вырабаў (I ступені, 1975).

АЛЯКСАНДРАВА Галіна Іосіфаўна, даярка калгаса імя Тэльмана (III ступені, 1975; II ступені, 1981).

АНТОНАЎ Іосіф Леанідавіч, трактарыст калгаса імя К. Маркса (III ступені, 1976).

АСАДЧЫ Уладзімір Сямёнавіч, бурыльшчык геолагаразведачнай экспедыцыі (III ступені, 1977).

БАБКОЎ Іван Фёдаравіч, трактарыст калгаса імя Энгельса (III ступені, 1976).

БАЛВАНОВІЧ Яўген Андрэевіч, трактарыст-машыніст калгаса імя Калініна (III ступені, 1977; II ступені, 1986).

БАРКОЎСКІ Мікалай Віктаравіч, механізатар саўгаса «Танежыцы» (III ступені, 1986).

БАРЫСІК Анатоль Спірыдонавіч, брыгадзір брыгады страхароў ПМК-223 (III ступені, 1978).

БРАНАВЕЦ Іван Іванавіч, вадзіцель калгаса «Маяк» (III ступені, 1988).

2017©nasledie-sluck.by

БРАНАВЕЦ Уладзімір Андрэевіч, трактарыст-машыніст калгаса «Маяк» (III ступені, 1975; II ступені, 1976).

БЯРНАЦКІ Анатоль Мікалаевіч, начальнік участка калгаса імя Калініна (III ступені, 1984).

ВАРЧЭНЯ Міхаіл Міхайлавіч, электраманцёр цукровараф інаднага завода (III ступені, 1978).

ВАСІЛЕЎСКІ Леанід Іванавіч, механізатар саўгаса «Танежыцы» (III ступені).

ВЯРБІЦКІ Мікалай Дзянісавіч, механізатар саўгаса «Танежыцы» (III ступені).

ГАРДЗІЕВІЧ Вячаслаў Казіміравіч, электраманцёр раённага вузла электрычнай сувязі (III ступені, 1978).

ГІРЭЛЬ Аляксей Сцяпанавіч, трактарыст калгаса імя К. Маркса (III ступені, II ступені).

ГУРЫНОВІЧ Анатоль Канстанцінавіч, слесар-рамонтнік цукровараф інаднага завода (III ступені, 1978).

ГУРЫНОВІЧ Мікалай Мікалаевіч, механізатар калгаса «III Інтэрнацыянал» (III ступені, 1976).

ДАБРАЛЁТ Надзежда Антонаўна, сатуратаршчык цукровараф інаднага завода (III ступені, 1986).

ДАМАНСКІ Анатоль Георгіевіч, кабельшчык-спайшчык раённага вузла электрычнай сувязі (III ступені, 1978).

ЖДАНОВІЧ Павел Пятровіч, вадзіцель калгаса імя Леніна (III ступені, 1981).

ЖУК Леанід Мітрафанавіч, токар аўтарамзавода (III ступені, 1980).

ЖУК Міхаіл Антонавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана (III ступені 1976).

ЖУК Эдуард Аляксандравіч, вадзіцель калгаса імя Кірава (III ступені, 1978).

ЖЫВАГЛОД Міхаіл Лявонцьевіч, вадзіцель калгаса імя Кірава (III ступені, 1978).

ЗАБЕЛА Іван Уладзіміравіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана (III ступені, 1976).

ЗАХАРЭВІЧ Васіль Васільевіч, вадзіцель калгаса імя Калініна (III ступені, 1978).

ЗАЯЦ Аляксандр Іванавіч, машыніст экскаватара Слуцкага будаўнічамантажнага ўпраўлення меліярацыі (III ступені, 1976).

КАЛЯДКА Уладзімір Мікалаевіч, вадзіцель калгаса імя Кірава (III ступені, 1977).

КАПЦЕЛАЎ Рыгор Іванавіч, слесар-рамонтнік цукровараф інаднага завода (III ступені, 1976).

КАПЦЭВІЧ Лідзія Мікалаеўна, палявод калгаса імя Энгельса (III ступені, 1976).

КАРПУК Уладзімір Сідаравіч, сталяр УПП «Беларускае таварыства сляпых» (III ступені, 1981).

КАЦЕЛА Генадзь Міхайлавіч, вадзіцель калгаса імя Тэльмана (III ступені, 1976).

КАЧКОЎСКІ Аляксандр Канстанцінавіч, трактарыст калгаса імя Энгельса (III ступені, 1986).

КЕРНАЖЫЦКІ Мікалай Пятровіч, слесар-рамонтнік цукровараф інаднага завода (III ступені, 1981).

КОРЗУН Аляксандр Аляксандравіч, трактарыст-машыніст калгаса «Маяк» (III ступені, 1986).

КРОТ Барыс Канстанцінавіч, кабельшчык-спайшчык раённага вузла электрычнай сувязі (III ступені, 1977).

КУПРЭЙЧЫК Міхаіл Паўлавіч, вадзіцель калгаса «Маяк» (III ступені, 1980).

ЛЕШЧАНКА Уладзімір Казіміравіч, машыніст экскаватара Слуцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі (III ступені, 1975; II ступені, 1981).

МАЗОК Аляксандр Сцяпанавіч, каваль цукровараф інаднага завода (III ступені, 1975).

МАМЧЫЦ Віктар Аляксандравіч, электраманцёр службы лініі прадпрыемства электрасетак (III ступені, 1981).

2017@nasledie-sluck.by

МАСКАЛЕВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, машыніст экскаватара Слуцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі (III ступені, 1986).

МАТЫЛІЦКІ Леанід Пятровіч, трактарыст-машыніст калгаса «Маяк» (III ступені, 1977).

МАТЫЛІЦКІ Міхаіл Пятровіч, трактарыст-машыніст калгаса «Маяк» (III ступені, 1976).

НІКІФАРАЎ Павел Сямёнавіч, загадчык МТФ калгаса імя Кірава (III ступені).

ПЛЮЦІНСКАЯ Лідзія Міхайлаўна, даярка калгаса імя Тэльмана (III ступені, 1976; II ступені, 1986).

ПРАКАПОВІЧ Валянціна Якаўлеўна, даярка калгаса імя Кірава (III ступені, 1986).

ПРАКАПОВІЧ Іван Яўсеевіч, слесар-рамонтнік цукраварафінаднага завода (III ступені, 1975).

РАБЦЭВІЧ Яўген Міхайлавіч, майстар сталярнага цэха МВУ «Жылін Брод» лясгаса (III ступені, 1977).

РАЧКОЎ Мікалай Цімафеевіч, бляхар УПП «Беларускае таварыства сляпых» (III ступені, 1986).

РОЗУМ Яўген Аляксандравіч, рэзчык-штампоўшчык УПП «Беларускае таварыства сляпых» (III ступені, 1977).

РУДНІЦКІ Іван Іванавіч, электраманцёр раённага вузла электрычнай сувязі (III ступені, 1978).

САВАНОВІЧ Анатолій Рыгоравіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях» (III ступені, 1978).

САВАНОВІЧ Уладзімір Фёдаравіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях» (III ступені, 1986).

СТАСЕВІЧ Генадзь Сцяпанавіч, электраманцёр службы лініі прадпрыемства электрасетак (III ступені, 1978).

СУЧОК Валянціна Пятроўна, свінарка калгаса «Ленінскі шлях» (III ступені, 1977).

СЯРЧЭНЯ Фёдар Міхайлавіч, дызеліст геолагаразведачнай экспедыцыі (III ступені, 1975).

ТАГІЛЬ Фёдар Анатольевіч, трактарыст калгаса імя Мічурына (III ступені).

ТРЫКА Мікалай Паўлавіч, электраманцёр цукраварафінаднага завода (III ступені, 1981).

ТЫЧЫНА Анатоль Фёдаравіч, электраманцёр аператыўна-выязной брыгады прадпрыемства электрасетак (III ступені, 1975).

ХАТЭНКА Іван Мікалаевіч, шафёр калгаса імя Чкалава (III ступені, 1976).

ЦВІРКО Георгій Адамавіч, трактарыст-машыніст калгаса «Рассвет» (III ступені, 1984).

ШНЭК Уладзімір Пятровіч, слесар-кацельшчык цукраварафінаднага завода (III ступені, 1977).

ШОСТАК Сцяпан Сцяпанавіч, трактарыст-машыніст калгаса «Маяк» (III ступені, 1982).

ШЭЎЧЫК Рыгор Мікалаевіч, электраманцёр прадпрыемства электрасетак (III ступені, 1986).

ЯКІМОВІЧ Яўгенія Аляксандраўна, даярка калгаса імя Кірава (III ступені, 1985).

ЯСІНСКІ Міхаіл Іванавіч, рэзчык-штампоўшчык УПП «Беларускае таварыства сляпых» (III ступені, 1978).

ЯЦЭВІЧ Мікалай Валянцінавіч, вадзіцель калгаса імя Энгельса (III ступені, 1986).

Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені

АЧАПОЎСКІ Васіль Міхайлавіч, дырэктар раённага сельскагаспадарчага прадпрыемства саўгас «Слуцк» (2006).

ВАСІЛЕВІЧ Мікалай Ільіч, старшыня СВК «Аграфірма «Лучнікі» (2006).

2017@nasledie-sluck.by

Узнагароджаны ордэнам Пашаны

АЧАПОЎСКІ Васіль Міхайлавіч, дырэктар раённага сельскагаспадарчага прадпрыемства саўгас «Слуцк» (2001).

РАМАНЮК Георгій Сцяпанавіч, дырэктар Вясейскай сярэдняй школы (2001).

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі»

БЕЛЫ Мікалай Васільевіч, дырэктар ААТ «Слуцкпрамбурвод» (2013).

БЕРАЗОЎСКАЯ Наталля Уладзіміраўна, аператар машыннага даення ААТ «Вясейскі пакроў» (2013).

БЛАХІН Барыс Браніслававіч, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Слуцкі прафесіянальна-тэхнічны каледж перапрацоўчай прамысловасці» (2008).

ВАЛАСАЧ Мікалай Фёдаравіч, трактарыст-машыніст СВК «Аграфірма «Лучнікі» (2011).

ДРАКО Аляксандр Аляксандравіч, старшыня Слуцкага райвыканкама (2004).

ДУБОЎСКІ Генадзь Міхайлавіч, станочнік дрэваапрацоўчых станкоў вытворчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Ямпаль-Слуцк» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» (2008).

ЖЫЛКО Аляксандр Рыгоравіч, дырэктар дзяржаўнай установы «Слуцкі лясгас» (2013).

КАВАЛЬЧУК Мікалай Уладзіміравіч, дырэктар установы адукацыі «Слуцкі дзяржаўны сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй» (2009).

ЛОМАЦЬ Зянон Кузьміч, старшыня Слуцкага райвыканкама (2001).

ЛОСІК Людміла Пятроўна, начальнік Слуцкага раённага аддзялення гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінаблсаюздрук» (2009).

МЕЛЕХ Мікалай Іванавіч, вадзіцель філіяла «Дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне № 64» РУП аўтамабільных дарог «Мінскаўтадар-Цэнтр» (2011).

РАК Аляксандр Фёдаравіч, брыгадзір цесляроў-бетоншчыкаў будаўнічага ўпраўлення № 55 адкрытага акцыянернага таварыства «Салігорскпрамбуд» (2006).

РЫМАШЭЎСКІ Аляксандр Браніслававіч, першы намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама (2006).

САЙКО Аляксандр Аляксеевіч, старшыня Слуцкага гарвыканкама (2001).

ХАРТАНОВІЧ Таццяна Мікалаеўна, аператар варкі утфелю ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» (2011).

ЧЫРЭЦ Дзмітрый Дзям'янавіч, дырэктар ААТ «Вітка-Агра» (2013).

За мужнасць і адвагу

Адгрукатала вайна, зацягнуліся раны шматпакутнай зямлі, на іх месцы закаласіліся нівы, узняліся прыгожыя гмахі будынкаў. І цяжка ўявіць, што побач з мірным жыццём могуць крочыць смертаносныя водгаласы вайны – міны, снарады, бомбы, гранаты… Прымусіць замаўчаць іх могуць рукі людзей самай мужнай ваеннай прафесіі – сапёраў, якія ўмеюць спалучаць цвёрдасць і ўпэўненасць моцнай мужчынскай далоні з пяшчотнай мацярынскай… а інакш – нельга: як дзіцятка бярэцца ў рукі кожная знойдзеная пачвара, якая моцным выбухам можа заявіць пра сабе.

Сёння цяжка сказаць, колькі тысяч такіх знаходак абясшкодзіў старшы лейтэнант, камандзір сапёрнага ўзвода, сакратар камсамольскай арганізацыі 193-га асобнага сапёрнага батальёна

2017©nasledie-sluck.by

Л.П. Серык

29-й танкавай дывізіі Леанід Пятровіч Серык. 60-я гады XX стагоддзя – гэта яшчэ не такі далёкі час, які аддзяляў ад апошняга залпа вайны. Сапёраў часта падымалі па трывозе: то падмыла бераг ракі і агаліла супрацьтанкавыя міны, то на новабудоўлі экскаватарам падкапалі скрыні з баявымі снарадамі ці выаралі плугам бомбу, альбо дзетвара знайшла гранаты і г.д. Але самай складанай аперацыяй, пра якую не любіў успамінаць Леанід Пятровіч, было разміраванне выяўленых нямецкіх складоў у Калінкавічах. Пасля атрыманага задання зборы былі хуткімі, развітанне з сям'ёй кароткім: абняў жонку, пацалаваў маленькага соннага сынка Ігара, сказаўшы толькі, што некалькі дзён прабудзе ў камандзіроўцы. У жончыных вачах мільгатнулі трывога і дакор. «Усё, усё добра, чакайце, хутка вярнуся…» – з гэтымі словамі пабег да машыны.

Па дарозе ў Калінкавічы Леаніда Пятровіча агарнулі ўспаміны аб дзяцінстве, якое прайшло ў роднай вёсцы Забалацце Гомельскай вобласці, юнацтве, а яны былі нялёгкімі. Калі пачалася вайна, яму было крышачку больш за два гадкі. Бацька ваяваў з ворагам, таксама лейтэнант, загінуў на фронце ў 1944 годзе. А ўся сям'я апынулася ў лагеры смерці Азарычы, які быў створаны фашыстамі ў Калінкавіцкім раёне. Ён, былы малалетні вязень, якому ў тую пару было ўжо пяць гадоў, тое-сёе памятаў: здаровых крыклівых і страшных дзядзькаў – немцаў, ад якіх хаваўся за матчыну спадніцу, страшэнных раз'юшаных сабак і многа, вельмі многа людзей. Але пра жудасныя дні лагернага жыцця ўсё ж больш знаў з расказаў маці і старэйшай сястры: як у сакавіку 1944 года іх вызвалілі і як ён у гэты час ужо паміраў ад голаду – ужо не плакаў, не прасіў есці, ляжаў ціхенька і паміраў… Потым было вяртанне дамоў, праз год школа. Скончыў дзесяцігодку ў Бабровічах і вырашыў стаць шахцёрам, бо трэба было дапамагаць сям'і ды і самому ўсталёвацца ў жыцці. Паступіў у горна-прамысловае вучылішча г. Свярдлоўска Варашылаўградскай вобласці. Пасля заканчэння працаваў машыністам шахтнага электравоза. Сумаваў па радзіме, звала дамоў маці. У 1959 годзе вярнуўся ў родныя мясціны, уладкаваўся на працу ў Бабруйску, а хутка быў прызваны на службу ў армію. Так і звязаў з ёй свой лёс. Механік-вадзіцель, камандзір аддзялення, начальнік аўтафільтравальнай станцыі 29-й танкавай дывізіі, а потым – Калінінградскае ваенна-тэхнічнае вучылішча імя А.А.Жданава. Адразу пасля яго заканчэння пачалася служба ў Слуцку. Гэты горад стаў для маладога лейтэнанта родным. Так, непрыкметна, ва ўспамінах праляцеў час у дарозе.

Калінкавічы. А вось і аб'ект разміравання. Узброіўшыся шчупамі і мінашукальнікамі група прыбыўшых са Слуцка сапёраў, якую ўзначальваў Л.П. Серык, падышла да ўваходу, які вёў глыбока ў зямлю, дзе знаходзіліся склады з рознымі боепрыпасамі. Відовішча не для слабых. Напалову ў вадзе велізарная колькасць смертаноснай сілы. Такога

2017©nasledie-sluck.by

яшчэ ст. лейтэнанту Л.П. Серыку не даводзілася бачыць у сваёй практыцы. Сабраўшы ўсю волю, сілу і мужнасць, прыступілі да працы. Асабліва цяжкімі былі першыя гадзіны: стоячы амаль па пояс у халоднай вадзе, размеранымі рухамі рабілі сваю справу рукі, напружана працавала галава, стукала кроў у скроні, дзесьці за спіною халадзіў страх. Паступова пачала знікаць напруга, стаў адыходзіць страх, з'явілася ўпэўненасць. Трое сутак ішла барацьба, барацьба за жыццё. І на гэты раз баявое заданне было выканана на выдатна.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры размініраванні, Л.П. Серык быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (1967). Пазней да гэтай узнагароды дабавіліся медалі «За бездакорную службу» 1, 2 і 3-й ступеняў і інш. Закончыў службу ў арміі на пасадзе начальніка 3-га аддзялення Слуцкага аб'яднанага гарадскога ваеннага камісарыята ў 1986 годзе ў званні маёра. На жаль, у 1989 годзе пайшоў з жыцця.

Не толькі знешне бываюць людзі падобнымі, але і лёсамі, сваімі ўчынкамі. У жыцці Генадзія Рыгоравіча Шыфмана (н. у 1972 у г. Старыя Дарогі) шмат чаго агульнага з Л.П. Серыкам. Праз гады, у 1995 годзе, таксама скончыў Калінінградскае вышэйшае інжынернае вучылішча інжынерных войскаў, прыехаў у Слуцк на службу ў асобны інжынерны батальён 29-й базы захоўвання маёмасці. Першая афіцэрская пасада – камандзір групы размініравання. Гэтай небяспечнай ваеннай прафесіі прысвяціў многія гады свайго жыцця. На яго рахунку больш за дваццаць тысяч снарадаў, мін, бомбаў і іншых смертаносных водгаласаў мінулай вайны. І так, як колісь лейтэнанту Л.П. Серыку, Г.Р. Шыфману давялося праводзіць размініраванне ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці.

Бульбакапалка выцягнула з зямлі 122-міліметровы артылерыйскі снарад. Глыбокія насечкі на медным паяску боепрыпаса гаварылі аб тым, што ён прайшоў канал ствала гарматы і мог узарвацца ад малейшай неасцярожнасці сапёра. У Генадзія Рыгоравіча гэта было першае баявое хрышчэнне. А пасля даводзілася працаваць і днём, і ўначы, пры любым надвор'і. Але самае сур'ёзнае выпрабаванне на прафесіяналізм і мужнасць адбылося ў 1996 годзе ў в. Адамова Слуцкага раёна, дзе ўспыхнуў пажар на артылерыйскім арсенале. Узрыўнымі хвалямі снарады, асколкі, парахавыя зарады параскідвала на адлегласць да пяці кіламетраў. Група размініравання ст. лейтэнанта Г.Р. Шыфмана адной з першых прыбыла да месца здарэння. Жудасная карціна паўстала перад вачыма сапёраў: замест дрэў – голыя абадраныя ствалы, утыканыя маталічнымі іголкамі – элементамі снарадаў; велізарныя плошчы ўсланы боепрыпасамі – месцамі няма куды паставіць нагу. Навокал гарэлі дрэвы, кусты. Прама з агню рукамі прыходзілася даставаць снарады. Слуцкія сапёры расчышчалі праход да сховішчаў, што гарэлі. За імі ішла інжынерная машына разгараджэння, якая з дапамогай спецыяльных тралаў зразала верхні слой зямлі, распіхваючы яго ў бакі, што давала магчымасць праходу гусенічным пажарным машынам.

Два тыдні гарэў арсенал. Потым пачаліся работы па ачыстцы зямлі ад небяспечных знаходак. Тры гады працавала група Г.Р. Шыфмана на гэтым участку.

У маі 1997 года ст. лейтэнант Г.Р. Шыфман быў узнагароджаны медалём «За адвагу» на першым Афіцэрскім сходзе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у ліку адных з першых удастоеных гэтай узнагароды. Трэба адзначыць, што гэта падзея адбылася роўна праз 30 гадоў,

2017©nasledie-sluck.by

месяц у месяц, як атрымаў узнагароду ст. лейтэнант Л.П.Серык.

Цікавы і такі факт, што ў Генадзія Рыгоравіча захоўваецца баявая ўзнагарода яго дзеда – таксама медаль «За адвагу», атрыманая ім у гады Вялікай Айчыннай вайны. Значыць, мужнасць і адвага перадаюцца, як і іншыя рысы характару, ад бацькі да сына, ад дзеда да ўнука.

Г.Р. Шыфман і сёння служыць Радзіме. Ён падпалкоўнік, з 2001 года з'яўляецца начальнікам захоўвання 4970-й базы інжынерных боепрыпасаў.

В.С. Відлога.

Заслужаныя работнікі Беларусі

Заслужаны артыст

ЯРАВЫ Аляксандр Якаўлевіч (гл. раздзел «Нарадзіліся на Случчыне»).

Заслужаны дзеяч навукі

ХІЛЬКЕВІЧ Анатоль Паўлавіч (гл. раздзел «Нарадзіліся на Случчыне»).

Заслужаны майстар спорту СССР.

ШАЎЦОЎ Юрый Анатольевіч, нарадзіўся ў 1959 г. у г. Слуцку. Заслужаны майстар спорту СССР (1982), спартсмен і трэнер (гандбол). Чэмпіён Алімпійскіх гульняў (1988), чэмпіён свету (1982). Пераможца Гульняў добрай волі (1986). Уладальнік Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў (1987, 1989, 1990), Кубка кубкаў (1983), Суперкубка (1989).

Заслужаны настаўнік

ШАЎЧУК Сяргей Савельевіч, нарадзіўся ў 1908 г. у в. Амельня Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1968). Скончыў Рагачоўскае педвучылішча (1930), філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны (гл. раздзел «Вярнуліся з Перамогай»). З 1944 г. у Слуцку: дырэктар педагагічнага вучылішча (1944–1952), дырэктар СШ № 9 (1952–1957), загадчык гарана (1957–1966). За гэты час было пабудавана 5 сярэдніх школ, прыбудова да СШ № 9, 10 дзіцячых садкоў. У 1966 г. узначаліў будаўніцтва СШ № 6, дырэктарам і настаўнікам якой быў да 1976 г. Пасля пераехаў у Маскву да сына, дзе і памёр у 2000 г.

Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту

ВАРАНЦОЎ Валерый Леанідавіч, нарадзіўся ў 1956 г. у пас. Дзесятак Валагодскай вобласці (Расія). Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Беларусі (2001). Скончыў Брэсцкі педінстытут імя А.С. Пушкіна (1983). Працаваў настаўнікам фізічнай культуры ў Замосцкай і Селішчанскай школах Слуцкага р-на, з 1980 г. працуе ў СШ № 10 г. Слуцка. Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года» (1992), узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1992).

Заслужаны трэнер

БЫКАЎ Анатолій Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1950 г. у в. Бранавічы (пас. Спаскі). Заслужаны трэнер БССР (1991), майстар спорту СССР па цяжкай атлетыцы (1970), двойчы чэмпіён СССР па цяжкай атлетыцы сярод моладзі (1971, 1972), сярэбраны чэмпіён СССР па армрэстлінгу (1991), рэкардсмен Беларусі па цяжкай атлетыцы ў рыўку (штанга), чэмпіён Беларусі. Скончыў СШ № 5 г. Слуцка, Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1972). Працаваў трэнерам па цяжкай атлетыцы Беларускай ваеннай акругі,

2017@nasledie-sluck.by

ст. трэнерам зборнай Беларусі па гіравому спорту. З 1993 г. па цяперашні час – старшы трэнер нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы. Аддзяленне кіданняў, якое ўзначальвае А.М. Быкаў, заваявала на чэмпіянатах свету 17 медалёў, на Алімпійскіх гульнях – 15. Трэніраваў чэмпіёна Вячаслава Харанеку (гіравы спорт) і інш.

Заслужаны юрыст

ЯРМОШЫНА Лідзія Міхайлаўна (гл. раздзел «Нарадзіліся на Случчыне»).

Заслужаны канструктар Расійскай Федэрацыі

ШАЎЧУК Ігар Сяргеевіч (гл. раздзел «Нарадзіліся на Случчыне»).

ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ СЛУЦКАГА РАЁНА

АРЛОЎСКІ Віктар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1933 г. у в. Ужа Капыльскага раёна. Скончыў Беларускі інстытут механізацыі і электрафікацыі сельскай гаспадаркі па спецыяльнасці «інжынер-механік», Вышэйшую партыйную школу. Уся працоўная дзейнасць звязана са Слуцкім раёнам. Працаваў загадчыкам майстэрань машынна-трактарных станцый, інжынерам рамонтна-тэхнічнай станцыі, галоўным механікам рамонтна-тэхнічнай меліярацыйнай станцыі, галоўным інжынерам раённага аддзялення «Белсельгастэхніка», кіраўніком Вясейскага спецыялізаванага аддзялення «Сельгастэхніка», начальнікам раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі, адначасова з'яўляючыся намеснікам старшыні Слуцкага райвыканкама. З 1974 па 1995 г. працаваў старшынёй Слуцкага райвыканкама. Пад кіраўніцтвам В.Ф. Арлоўскага Слуцкі раён у 80–90-я гг. XX ст. дасягнуў найвышэйшых паказчыкаў у сваім развіцці, аб чым сведчаць прысуджаныя пераходныя чырвоныя сцягі саюзнага, рэспубліканскага і абласнога ўзроўню, а таксама дзяржаўныя ўзнагароды СССР і БССР працоўных Случчыны. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, неаднаразова выбіраўся дэпутатам абласнога і раённага Саветаў дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), Дружбы народаў, «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (двойчы).

Званне Ганаровы грамадзянін прысвоена 8.9.2006 г.

В.Ф. Арлоўскі

М.І. Васілевіч

ВАСІЛЕВІЧ Мікалай Ільіч, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі СССР (1985), член Савета калгаснікаў СССР (1989), Акадэмік Беларускай інжынерна-тэхналагічнай акадэміі (1998). Нарадзіўся ў 1939 г. у в. Варкавічы. Скончыў СШ № 5 г. Слуцка, Мар'інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1960), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1969). Служыў у Савецкай арміі. Працаваў брыгадзірам у калгасе «Праўда» Мінскага р-на, гал. аграномам у к-се імя Энгельса, дырэктарам саўгаса «Танежыцы»

2017©nasledie-sluck.by

Слуцкага р-на, начальнікам раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. У 1976–2010 гг. старшыня калгаса «Ленінскі шлях» (СПК «Аграфірма «Лучнікі»). Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Слуцкага раённага і Сяражскага сельскага Саветаў дэпутатаў. Дэлегат другога Усебеларускага народнага сходу (2001).

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1981), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1970), Айчыны III ступені (2006), роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра III ступені, медалямі «За доблесную працу», «У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна», залатымі і бронзавымі ВДНГ, юбілейнай «60 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, мае падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.

Званне Ганаровы грамадзянін прысвоена 8.9.2011 г.

РУСАК Валянціна Паўлаўна, заслужаны будаўнік БССР (1973). Нарадзілася ў 1936 г. у в. Давыдкава Пашахона-Валадарскага р-на Яраслаўскай вобл. (Расія). У 1954 г. на камсамольскай будоўлі ў Ленінградзе, будаўнік. З 1958 г. у Слуцку, працавала мулярам у міжгаспадарчай перасоўнай механізаванай калоне № 223. Прымала ўдзел у будаўніцтве цукраварафінаднага камбіната, сельскага будаўнічага камбіната, льнозавода, спартыўна-аздараўленчага комплексу «Дэльфін», аддзялення сувязі па вул. М. Багдановіча, жылых шматпавярховых дамоў, дзіцячых садоў і іншых аб'ектаў будаўніцтва. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), Леніна (1986), Ганаровымі граматамі Міністэрства сельскага будаўніцтва, будтрэста і інш.

Званне Ганаровы грамадзянін прысвоена 10.9.2009 г.

В.П. Русак

У.С. Садзін

САДЗІН Уладзімір Сцяпанавіч, беларускі мастак, член Саюза мастакоў СССР (1963), заслужаны работнік культуры БССР (1985). Нарадзіўся ў 1924 г. у с. Чыркава Лунінскага р-на Пензенскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, сяржант, камандзір аддзялення разведкі 100-га гв. мінамётнага палка. З 1945 г. у Слуцку. Служыў у арміі, працаваў мастаком у арцелях, на прадпрыемствах. Скончыў студыю выяўленчага мастацтва Усесаюзнага Дома народнай творчасці ў Маскве (1953). У 1953 г. узначаліў студыю выяўленчага мастацтва ў Слуцкім Доме піянераў, якая была арганізавана па яго ініцыятыве. У 1981 г. студыі прысвоена званне «народная». У.С. Садзін з'яўляецца настаўнікам многіх вядомых мастакоў, сярод якіх Уладзімір і Міхаіл Басалыгі, Георгій Скрыпнічэнка, Уладзімір Голуб, Уладзімір Цэслер, Аляксандр Рубец, Уладзімір Суздальцаў і інш.

Працаваў у станковай графіцы і жывапісе. Аўтар серыі лінагравюр «Паўночныя матывы», «Поры года», «Белавежская пушча», «Нафта Палесся», серыі жывапісных палотнаў «Случчына», «Беларускія пейзажы».

Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Слуцкім краязнаўчым

2017@nasledie-sluck.by

музеі, музеях Расіі, Казахстана, ЗША, В'етнама, Японіі, у прыватных калекцыях розных краін. Карціна «Летні вечар» атрымала высокую ацэнку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі і была падаравана прадстаўнікам ААН з нагоды яе 50-годдзя.

Узнагароджаны баявым ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй», у мірны час – медалём Саюза мастакоў Беларусі «За заслугі ў выяўленчым мастацтве», знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік народнай адукацыі».

Званне Ганаровы грамадзянін прысвоена 8.9.2006 г.

Памёр 23.2.2010 г.

І.А. Фядотава

ФЯДОТАВА Ірына Аляксандраўна, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь, двухразовая чэмпіёнка XI летніх Паралімпійскіх гульняў па веласпорту ў Сіднеі (Аўстралія), удзельніца XII летніх Паралімпійскіх гульняў у Афінах (Грэцыя, 2004), XIII летніх Паралімпійскіх гульняў у Пекіне (Кітай, 2008; залаты і сярэбраны медалі).

Нарадзілася ў 1968 г. у в. Садкі Капыльскага раёна. У 1986 г. скончыла спецыяльную школу № 2 у г. Маладзечне. Працоўны шлях пачала ў г. Слуцку на УП «Ямпаль-Слуцк» грамадскага аб'яднання «Беларускага таварыства інвалідаў па зроку», дзе і пачала займацца спортам.

У 1990 г. І.А. Фядотава разам з інструктарам па спорту прадпрыемства Л. Гундзіловіч у Мінску на чэмпіянаце па веласпорту заваявала залаты, сярэбраны і бронзавы медалі. У сярэдзіне 1990-х гг. спартсменку запрасілі ў Беларускую федэрацыю спорту і прапанавалі трэніравацца ў майстра спорту С.А. Плашчынскага.

У 2001 г. на чэмпіянаце Еўропы ў Швейцарыі І.Фядотава ў велагонках на тандэмах заваявала залаты і тры сярэбраныя медалі. У 2002 г. на чэмпіянаце свету ў Германіі – два залатыя медалі, на чэмпіянаце Еўропы: у Чэхіі (2003) – чатыры залатыя, у Галандыі (2005) – залаты, сярэбраны і бронзавы. Удзельнічала ў чэмпіянатах свету ў Швейцарыі (2006), дзе атрымала бронзавы медаль, а ў Францыі (2007) – два залатыя.

І.А. Фядотава – член зборнай каманды Беларусі па гандболе, працуе спартсменам-інструктарам Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Удзельнічала ў складзе нацыянальнай каманды па велатандэму ў летніх Паралімпійскіх гульнях 2012 года ў Вялікабрытаніі.

Званне Ганаровы грамадзянін прысвоена 8.9.2011 г.

ШКЛЯРЭЎСКІ Сяргей Іванавіч, (гл. раздзел «Вызначыліся працай» у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». 2001. Т. 2. С. 423). Званне Ганаровы грамадзянін прысвоена 29.8.2007 г.

2017©nasledie-sluck.by

НАРАДЗІЛІСЯ НА СЛУЧЧЫНЕ

АБРАВЕЦ Святлана Мітрафанаўна, беларускі вучоны ў галіне геолага-мінералагічных навук, кандыдат навук (1983), дацэнт па спецыяльнасці «Геалогія». Нарадзілася ў 1945 г. у Слуцку. У 1963 г. скончыла СШ № 1 г. Слуцка, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1968). Працавала ў Беларускім навукова-даследчым геолагаразведачным інстытуце ў сектары мінеральных солей і займалася даследаваннямі Старобінскага, Петрыкаўскага радовішчаў калійных солей (1969–1986), у Беларускім дзяржаўным універсітэце вядучым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам навукова-даследчай лабараторыі па палеаграфічных і палеагеалагічных метадах прагнозу карысных выкапняў (1986–1997), у Інстытуце геахіміі і геафізікі НАН Беларусі вядучым навуковым супрацоўнікам у лабараторыі літалогіі і геахіміі (1997–2008).

Абараніла дысертацыю па тэме «Несолевые породы верхнефаменской соленосной толщи Припятского прогиба» па спецыяльнасці «літалогія». Навуковую дзейнасць сумяшчала з педагагічнай. У рамках міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй праводзіла навукова-даследчыя работы па праекце «Прогноз нефтегазоносности фундамента верхнепротерозойских и палеозойских комплексов Беларуси и Сибири на основе нетрадиционных тектонических, седиментологических и геофлюидодинамических концепций (фундаментальные и прикладные аспекты) 2002–2005 гг.», з'яўляючыся кіраўніком тэмы.

Аўтар 150 навуковых прац, выдадзеных у тым ліку за межамі краіны – у Польшчы, Фінляндыі, Румыніі, Германіі, Швейцарыі, Італіі і ЗША.

Удзельнічае ў міжнародных нарадах па тэмах: «Проблемы соленакопления, седиментогенеза терригенных, карбонатных и сульфатных пород палеогеоморфологии и формирования литологически ограниченных ловушек углеводородов».

Вынікі навукова-даследчай работы выкарыстоўваюцца ў вытворчых арганізацыях РУП ВА «Беларуснафта» і РУП «Белгеалогія». Мае 10 актаў укаранення.

АДЖАЕЎ Уладзімір Барысавіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1999), прафесар (2000). Нарадзіўся 13.9.1955 г. у Слуцку. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1977). З 1977 г. працуе ў БДУ: загадчык лабараторыі (1991–1996), прарэктар (1997–2003), адначасова з 2002 г. загадчык кафедры. Навуковыя працы па радыяцыйнай фізіцы паўправаднікоў і дыэлектрыкаў, фізіцы высокамалекулярных злучэнняў. Даследаваў працэсы ўзаемадзеяння іонаў з паверхняй паўправаднікоў і палімераў, распрацаваў мадэлі прымесна-дэфектнага ўзаемадзеяння, высокаэфектыўныя тэхналагічныя працэсы мікраэлектронікі на аснове ўзаемадзеяння іонных пучкоў і аптычнага выпрамянення з паверхняй, якая апрацоўваецца. Работы: «Ионная имплантация полимеров» (Мінск, 1998, у сааўт.), «Физика электропроводящих полимеров» (Мінск, 2000, у сааўт.) і інш.

АГАРОДНІК Іван Андрэевіч, кандыдат тэхнічных навук (1982). Нарадзіўся 2.1.1937 г. у в. Чыжоўка. Скончыў Беліцкую сярэднюю школу (1955), Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1962). Працаваў у Слуцку на аўтарамонтным заводзе інжынерам-

2017©nasledie-sluck.by

тэхнолагам, майстрам цэха. З 1963 г. – дырэктар завода металавырабаў «Пралетарый», з 1970 г. – дырэктар аўтарамонтнага завода. У 1977 г. узначаліў Салігорскі рамонтна-механічны завод. З 1980 г. у Маскве, навуковы супрацоўнік інстытута «ВНІІТИМЖ», у 1982 г. узначаліў лабараторыю завода «Ремдеталь». З 1991 па 1993 г. – тэхнічны дырэктар прадпрыемства па абслугоўванні аўтамабіляў. У 1993–2001 гг. – першы віцэ-прэзідэнт канцэрна «Белаграмаш». З 2001 г. на заслужаным адпачынку.

АКУЛОВІЧ Леанід Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання, працэсаў фіз.-тэхніч. апрацоўкі матэрыялаў. Доктар тэхнічных навук (2000), прафесар, вынаходнік СССР (1973). Нарадзіўся 19.5.1941 г. у в. Малоткава. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1970). Працаваў у Цэнтральным КБ з доследнай вытворчасцю АН БССР, у Мінскім канструктарска-тэхналагічным эксперыментальным інстытуце аўтамабільнай прамысловасці (з 1976 г. – заг. лабараторыі). З 1984 г. намеснік дырэктара канструктарска-тэхналагічнага Інстытута сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі, з 2005 г. – галоўны інжынер. Распрацаваў тэарэтычныя асновы стварэння тэхналагічных комплексаў, тэрмамеханічнага аднаўлення і ўмацавання вырабаў у магнітным полі. Выдадзены працы: «Термомеханическое упрочнение деталей в электромагнитном поле» (Полацк, 1999), «Интелектуальное производство» (Наваполацк, 2002, у сааўт.), «Основы технологии автоматизированного производства в машиностроении» (Мінск, 2003, у сааўт.) і інш.

Узнагароджаны знакам «Вынаходнік СССР» (1973). Прэмія Савета Міністраў Беларусі (1991).

АНЦЫПОВІЧ Мікалай Барысавіч, палкоўнік, кандыдат ваенна-тэхнічных навук. Нарадзіўся 6.8.1950 у в. Бранавічы. Скончыў СШ № 10 г. Слуцка, Пушкінскае ваеннае вучылішча проціпаветранай абароны, Харкаўскую ваенную акадэмію. Заг. кафедры Беларускай ваеннай акадэміі.

АНЦЫПОВІЧ Мікалай Васільевіч, кандыдат філасофскіх навук (1989), дацэнт (1994). Нарадзіўся 15.12.1944 г. у в. Бранавічы (пас. Іванаўскі). Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1973). З 1999 працуе ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце.

АСТРОЎСКІ Аляксандр Іосіфавіч, доктар педагагічных навук (1992), прафесар (1994), заслужаны работнік народнай адукацыі Узбекістана (1989). Нарадзіўся ў 1926 г. у г. Слуцку. Вучыўся ў яўрэйскай школе № 3 у Слуцку. У 1940 г. паступіў у рамеснае вучылішча металістаў № 13 г. Мінска. З 1941 г. у Самаркандзе (Узбекістан). Скончыў школу ФЗН, працаваў слесарам у г. Чырчык на электрахімічным камбінаце. У 1944 г. скончыў лётнае вучылішча, у 1946–1947 гг. школу рабочай моладзі ў г. Чырчык, юрыдычны факультэт Ташкенцкага ўніверсітэта (1952), філалагічны факультэт Педагагічнага інстытута імя Нізамі (1965). З 1952 па 1973 г. – педагог, дырэктар спецыяльнай школы-інтэрната, інспектар Упраўлення адукацыі Ташкенцкай вобласці па спецінтэрнатах і дзіцячых дамах, дырэктар эксперыментальнай школы. З 1973 па 1995 г. заг. лабараторыі, сектара, аддзела НДІ педагагічных навук Міністэрства адукацыі Узбекістана.

Аўтар звыш 80 навуковых прац па тэорыі і гісторыі педагогікі, тэорыі і практыцы педагагічнай прафілактыкі правапарушэнняў школьнікаў, педагагічнай крыміналогіі і інш. З іх 4 выдадзены

2017@nasledie-sluck.by

у Германіі, перакладзена на нямецкую мову і надрукавана манаграфія «Криминологические и педагогические аспекты профилактики правонарушений подростков» (2001–2003), выдадзены 2 кнігі «Проблемы и пути интеграции еврейских иммигрантов» (2004–2008, Германия, в соавт. с нем. профессором Р. Гольцем). Пад кіраўніцтвам А.І. Астроўскага абаронена 8 кандыдацкіх і 1 доктарская дысертацыі ва Узбекістане. Выдатнік народнай адукацыі Узбекістана (1981). З 1995 г. у Германіі (Магдэбург). На працягу 8 гадоў быў старшыней Навуковатворчага таварыства пры сінагагальнай абшчыне г. Магдэбурга, дапамагаў вучоным і вынаходнікам, членам абшчыны, інтэгравацца ў навуковую, навуковатэхнічную і культурную сферы жыцця Германіі.

БАШУРА Андрэй Мікалаевіч, беларускі гаспадарчы дзеяч. Нарадзіўся 29.8.1946 г. у в. Гуляева. Скончыў Усесаюзны завочны політэхнічны інстытут (1991). З 1974 г. працуе на РУП «ВА Беларуськалій». Быў электраслесарам, механікам участка, намеснікам галоўнага механіка рудніка, начальнікам рудніка 4-га рудаўпраўлення, намеснікам генеральнага дырэктара (1993–2001), з 2001 па 2010 г. – генеральным дырэктарам. Дзяржаўная прэмія Беларусі (2000) за распрацоўку і асваенне вытворчасці пад'ёмна-транспартнага абсталявання для горназдабыўной прамысловасці.

БУЛАТ Валерый Аляксандравіч, кандыдат тэхнічных навук (1982), дацэнт (1986). Нарадзіўся 10.3.1950 г. у в. Сярагі. Скончыў Сяражскую школу, Беларускі політэхнічны інстытут (1971), дзе і працуе. Намеснік дэкана Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

БУЛГАК Аляксандр Рыгоравіч, беларускі вучоны, доктар медыцынскіх навук (2003), прафесар (2005). Нарадзіўся 2.3.1958 г. у Слуцку. Скончыў СШ № 2 (1975), Мінскі медыцынскі інстытут (1981), клінічную ардынатуру на кафедры кардыялогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў (1988). У 1990 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Влияние высокочастотного ультразвука на экспериментальный инфаркт миокарда», у 2003 г. – доктарскую «Особенности тактики ведения больных хронической ишемической болезнью сердца с мерцательной аритмией». Працаваў урачом-отарыналарынголагам у 17-й гар. паліклініцы г. Мінска (1981–1984), служыў у Савецкай арміі на пасадзе ўрача (1984–1985), працаваў урачом у Рэспубліканскай отарыналарынгалагічнай бальніцы, урачом прыёмнага аддзялення Дарожнай бальніцы на ст. Мінск (1985–1986). З 1988 па 2000 г. на кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў на пасадах ст. лабаранта, асістэнта, дацэнта. У 2000–2008 гг. заг. кафедры функцыянальнай дыягностыкі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. З 2008 г. нам. дырэктара па тэрапеўтычнай дапамозе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія». Аўтар больш як 220 навуковых прац,

А.М. Башура

А.Р. Булгак

2017©nasledie-sluck.by

«Наши сотрудники относились ко мне очень хорошо, – отмечала Елизавета Ивановна. – Получалось так, что каждый год я проводила свой отпуск с детьми. И ребята у нас с Мишей выросли талантливые. Сын Анатолий – один из лучших кинооператоров. Дочка тоже была связана с кино, работала администратором, директором картин на Центральной студии документальных фильмов. У Анатолия жена – Светлана Дружинина, актриса, режиссер, она мне сразу понравилась. У нас в семье четыре члена Союза кинематографистов. Личная жизнь у нас удалась. Мы можем гордиться редчайшим взаимопониманием. Один взгляд Михаила Исааковича – и мне было все абсолютно ясно. Лечу – и выполняю... Думаю, что мы из всех разведпар – действительно редкая по пониманию друг друга. Не помню, чтобы мы хоть одного задания не выполнили. Обычно даже перевыполняли. И ни разу

2017©nasledie-sluck.by

никого не подвели. Выручать нас не приходилось, потому что провалом не пахло, поэтому известны мы лишь в своем узком кругу. Тихо получали государственные награды и благодарности от руководства разведки и КГБ СССР... Что для разведчика вообще наиболее важно? Может, слава? Но она если приходит, то только в результате провала».

Так, может быть, лучшая награда и свидетельство успеха – все-таки безвестность? Ну и конечно же – стенд, посвященный разведпаре Мукасеев в Музее славы Службы внешней разведки в ее штаб-квартире в районе Ясенево в Москве.

О. Пересятник.

Слуцкі край. 2011. 15 ліпеня.

МЯЦЕЛЬСКІ Мікалай Уладзіміравіч, беларускі матэматык, педагог, доктар педагагічных навук (1987), прафесар (1990). Нарадзіўся 16.9.1919 г. у в. Грэск. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1950), з 1961 г. працаваў у ім. Навуковыя працы па псіхолага-педагагічных асновах дыдактыкі матэматыкі, пытаннях методыкі выкладання матэматыкі. Работы: «Психолого-педагогические основы дидактики математики» (Минск, 1977), «Дидактика математики. 2-е изд» (Минск, 1982). Памёр 30.12.1997 г.

НОВІК Арцём Іванавіч, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл, доктар ветэрынарных навук (1963), прафесар (1964), заслужаны дзеяч навукі БССР (1965). Нарадзіўся 31.10.1897 г. у в. Селішча. Скончыў Ленінградскі ветэрынарны інстытут (1926). У 1934–1977 гг. працаваў у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (з 1938 – дэкан, у 1951–1956 – прарэктар, адначасова да 1973 – загадчык кафедры). Аўтар шэрагу навуковых прац, у тым ліку: «Биологические особенности белорусских черно-пестрых свиней // Некоторые вопросы развития животноводства» (Минск, 1963). Памёр 19.8.1984 г.

НЯМКОВІЧ Мікалай Аляксеевіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1998), лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола (1984). Нарадзіўся 11.8.1952 г. у в. Маяк. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1974). З 1974 г. працуе ў Інстытуце фізікі НАН Беларусі. Аўтар шэрагу навуковых прац, прысвечаных даследаванню і распрацоўцы лазераў на фарбавальніках з электрахімічным кіраваннем частатой генерыраванага святла. Выявіў дынамічнае расшырэнне электронных спектраў фарбавальнікаў у чыстых і бінарных растваральніках. Зарэгістраваў шэраг новых спектраскапічных эфектаў.

ПАДЛІПСКАЯ Зоя Іванаўна, беларуская паэтэса. Нарадзілася ў 1964 г. у в. Сярагі (пас. Манькова). Скончыла Сяражскую школу, Слуцкае медыцынскае вучылішча (1983), Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (1994), аспірантуру пры БДПУ імя М. Танка (2003). У Слуцку працавала медсястрой, выхавальнікам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 10, арганізатарам па выхаваўчай рабоце аддзела адукацыі гарвыканкама. Пераехала ў Мінск і працавала ў абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі навуковым супрацоўнікам лабараторыі тэорыі і методыкі навучання мовам і літаратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі, з 2009 г. – галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова». Друкавалася ў ЛІМе, часопісах «Полымя», «Маладосць», «Роднае слова», «Першацвет», зборніках «Нас слова Купалы да творчасці кліча» (1995, 1997), «Прызнанне ў любові і каханні» (2005) і інш. Аўтар кніг паэзіі «Палон нябёсаў» (1998), «У вэлюме завей» (2005), вучэбнага выдання

2017©nasledie-sluck.by

«Вобраз часу праз прызму беларускай філасофскай лірыкі апошняй чвэрці XX стагоддзя» (2002), вучэбна-метадычнага дапаможніка «У дапамогу настаўніку беларускай мовы і літаратуры» (2003) і інш.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Мікалай Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне цеплафізікі, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1994), доктар фізіка-матэматычных навук (1991). Нарадзіўся 18.5.1937 г. у в. Бандары. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1959). З 1960 г. у Інстытуце энергетыкі АН БССР, з 1963 г. у Інстытуце цепла- і масаабмену – намеснік дырэктара (1991–2004). Аўтар шэрагу навуковых прац, у тым ліку «Физическая кинетика и процессы переноса при фазовых превращениях» (Минск, 2002) і інш.

РАДЗІВОНЦАЎ Сяргей Аляксандравіч, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся 5.10.1969 г. у г. Слуцку. Начальнік лабараторыі навукова-даследчага інстытута-4 у Маскве. Палкоўнік. Займаецца даследаваннем асобных тэм космасу.

РОДЧАНКА Віктар Віктаравіч, расійскі вучоны ў галіне ўстойлівасці і кіравальнасці самалётаў і мадэліравання палёту, кандыдат тэхнічных навук (1977), старшы навуковы супрацоўнік (1978), лаўрэат Прэміі Савета Міністраў СССР (1987). Нарадзіўся 23.2.1945 г. у в. Покрашава. Дзяцінства прайшло ў м. Цімкавічы Капыльскага раёна. Скончыў 7 класаў Цімкавіцкай сярэдняй школы. З 1958 па 1961 г. у Слуцку, выхаванец музычнага ўзвода вайсковай часці. Скончыў вячэрнюю сярэднюю школу рабочай моладзі № 1 у Слуцку (1961), факультэт аэрамеханікі і лятальнай тэхнікі Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута па спецыяльнасці «аэрадынаміка і трываласць» (1967). З 1965 г. студэнтам пачаў працаваць у Цэнтральным аэрагідрадынамічным інстытуце імя М.Я. Жукоўскага (ЦАГІ) у аддзяленні «Дынаміка палёту і сістэмаў кіравання», потым – інжынер, старшы, вядучы інжынер, нач. сектара (1978–2006) у гэтай жа ўстанове. Яго даследаванні праводзіліся ў межах стварэння, мадэрнізацыі розных тыпаў самалётаў, пілатажных стэндаў, авіяцыйных трэнажораў і падрыхтоўкі шэрагу галіновых нарматыўных дакументаў. Аўтар звыш 70 навуковых публікацый, 4 вынаходніцтваў. Выдаў манаграфію «Лётчык як дынамічная сістэма» (1992, у сааўт.)

Па кантрактах з ЗША, Вялікабрытаніяй і Швецыяй быў кіраўніком даследаванняў, вынікі якіх атрымалі міжнароднае прызнанне. Член Амерыканскага інстытута аэрадынамікі і астранаўтыкі (2000). Узнагароджаны медалём «За доблесную працу» (1971). Жыў у г. Жукоўскі Маскоўскай вобл. Памёр 12.6.2006.

РУМО Алег Алегавіч, беларускі вучоны, галоўны трансплантолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук (2012), прафесар (2013), заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь (2011). Нарадзіўся 4.8.1970 у г. Слуцку ў сям'і ўрачоў. Скончыў з залатым медалём СШ № 7 (1987), лячэбны факультэт Мінскага медыцынскага інстытута (1993), клінічную ардынатуру (1995), аспірантуру (1999), абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Коррекция интраинтестинального статуса при кишечной непроходимости различного генеза» (1999), доктарскую дысертацыю на тэму «Комплексное лечение синдрома интеральной недостаточности при хирургических заболеваниях органов брюшной полости» (2012), прысвечаную прафілактыцы і лячэнню эндатаксікацыі пасля вострых хірургічных захворванняў органаў

2017©nasledie-sluck.by



М.І. Савановіч

А.Р. Лукашэнка ў час наведвання Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак. Злева – А.А. Румо

брушной поласці і трансплантацыі печані. З 1995 г. працаваў урачом-хірургам 9-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска. У 2000–2005 гг. у Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце – старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі лімфасорбцыі, загадчык гэтай жа лабараторыі, асістэнт 2-й кафедры хірургічных захворванняў. З 2005 па 2010 г. нам. галоўнага ўрача 9-й гарадской клінічнай бальніцы. З 2010 г. – кіраўнік створанага (на базе гэтай бальніцы) Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак. Дацэнт. У 2008 г. выканаў першую ў гісторыі медыцыны Беларусі трансплантацыю печані. У 2009 г. прымаў удзел у першай у гісторыі Беларусі спалучанай трансплантацыі ныркі і падстраўнікавай залозы. Таксама выканаў першыя ў гісторыі медыцыны Казахстана трансплантацыі печані (2011), печані дзіцяці (2013).

Аўтар звыш 150 навуковых прац, 10 патэнтаў на вынаходніцтва. Ганаровы прафесар Нацыянальнага навуковага цэнтра хірургіі імя А.Н. Сызганава Рэспублікі Казахстан, член міжнароднай асацыяцыі трансплантацыі печані ILTS, Еўрапейска-Азіяцкай асацыяцыі гепатапанкрэатабіліярных хірургаў, асацыяцыі хірургаў-гепатолагаў Расіі і дзяржаў СНД, Еўрапейскай асацыяцыі трансплантолагаў ESOT, прэзідыума Беларускай асацыяцыі хірургаў. Выдатнік аховы здароўя.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны (2008), ордэнамі Беларускай праваслаўнай царквы Св. Кірыла Тураўскага II ступені, Крыжа Прападобнай Ефрасінні Полацкай, нагрудным знакам «За вклад в развитие здравоохранения Казахстана».

САВАНОВІЧ Мікалай Іванавіч, кандыдат тэхнічных навук у галіне фізікі (1992). Нарадзіўся 2.5.1955 г. у в. Лучнікі. Скончыў Лучнікоўскую васьмігадовую школу, СШ № 10 г. Слуцка, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1977). Працаваў у Інстытуце прыкладной фізікі НАН Беларусі. Аўтар шэрагу навуковых артыкулаў. Памёр 31.12.2003 г.

САКАЛОЎСКІ Анатоль Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне траўматалогіі

2017©nasledie-sluck.by

і артапедыі, доктар медыцынскіх навук (1985), прафесар (1990). Нарадзіўся 2.1.1937 г. у в. Палікарпаўка. Скончыў Грэскую СШ (1954), Мінскі медыцынскі інстытут (1960), з 1975 г. працаваў там жа. З 1998 г. у НДІ траўматалогіі і артапедыі (з 1999 заг. лабараторыі). Аўтар навуковых прац па прыроджанай і набытай паталогіі тазасцегнавога сустава, у т.л. прыроджанаму звіху сцягна, дэгенератыўна-дыстрафічных захворваннях. Работы: «Хирургическое лечение заболеваний тазобедренного сустава» (Мінск, 1993, у сааўт.), «Патологический вывих бедра» (Мінск, 1977, у сааўт.).

САМУСЕВІЧ Альбіна Рыгораўна, паэтэса, член Саюза расійскіх пісьменнікаў. Нарадзілася 9.12.1935 г. у г. Горкі (цяпер – Ніжні Ноўтарад). З 1940 г. пражывала ў Слуцку. У 1953 г. скончыла СШ № 10, у 1959 г. – Мінскі медыцынскі інстытут. Аўтар зборнікаў вершаў «Утренний обход» (1998), «Дайте женщине сад» (1990), «Нательный крестик» (1993) і інш. Жыве ў Калінінградзе.

САНЬКО Аляксандр Фёдаравіч, беларускі геолаг, доктар геолага-мінералагічных навук (2001). Нарадзіўся 2.2.1950 г. у в. Маяк. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1972). З 1975 г. у Інстытуце геалагічных навук НАН Беларусі (з 2000 заг. лабараторыі). З 2006 г. у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Аўтар навуковых прац па геалогіі і стратыграфіі чацвярцічных адкладаў, геамарфалогіі, палеанталогіі. Работы: «Неоплейстоцен северо-восточной Белоруссии и смежных районов РСФСР» (Мінск, 1987), «Фауна моллюсков гляциоплейстоцена и голоцена Беларуси» (Мінск, 1999, у сааўт.), «Геология Беларуси» (Мінск, 2001, у сааўт.).

СКОБЕЛЕЎ Мікалай Вітальевіч, генерал-маёр. Нарадзіўся 11.7.1958 г. у

А.Р. Самусевіч

М.В. Скобелеў

г. Слуцку. Скончыў з залатым медалём Слуцкую СШ № 7 (1975), Кіеўскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча (1979), Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе (1991, Масква). Пасля вучылішча быў камандзірам мотастралковага ўзвода, старшым ад'ютантам камандуючага 32-й агульнавайсковай арміяй, у аператыўным штабе 32-й, 39-й армій. Пасля заканчэння акадэміі – старшы афіцэр, нач. групы аператыўнага штаба 2-й гв. танкавай арміі Заходняй групы войскаў, нач. аддзела, штаба, базы ўзбраення і тэхнікі (1991–2002). З 2002 па 2004 г. камандзір 11-й гв. асобнай механізаванай брыгады Заходняга аператыўнага камандавання. У 2004–2005 гг. – намеснік камандуючага сухапутнымі войскамі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. З 2005 па кастрычнік 2011 г. – начальнік Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча.

СКРЫГАН Міхаіл Іванавіч, адмірал. Нарадзіўся 25.11.1948 г. у в. Грэск. Скончыў Грэскую СШ (1965), Калінінградскае вышэйшае Ваенна-марское вучылішча (1970), Ваенна-марскую акадэмію. Служыў у Ваенна-марскім флоце СССР (Архангельск, Рыга). У 1993 г. выйшаў на пенсію. Жыве у г. Дзмітраў Маскоўскай вобл.

СМАРТЫН Сяргей Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар

2017©nasledie-sluck.by

медыцынскіх навук (2004). Нарадзіўся 8.10.1955 г. у в. Барок. Скончыў Гродзенскі медыцынскі інстытут (1978), дзе і застаўся працаваць на розных пасадах (з 2002 – прарэктар, з 2005 – загадчык кафедры). Аўтар навуковых прац па прымяненні лазерных тэхналогій у хірургіі, эндаскапічных метадах абдамінальнай хірургіі і інш. Выдадзена кніга «Хирургическая рана: прогнозирование и оптимизация заживления» (Гродна, 2005).

СТАРЖЫНСКІ Валерый Паўлавіч, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1993), прафесар (1997). Нарадзіўся 21.9.1950 г. у в. Замошша. Вучыўся ў Казловіцкай СШ. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1971). З 1972 г. у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Аўтар шэрагу навуковых прац па філасофскіх праблемах фізікі і тэхнікі, гуманізацыі і тэхналагізацыі адукацыі, лагістычных асновах кіравання рэсурсамі прадпрыемства. Работы: «Две линии в философии» (Мінск, 1982, у сааўт.), «Стереотипы и динамика мышления» (Мінск, 1993, у сааўт.), «Гуманизация инженерного образования: филос.-конструктивный подход» (Мінск, 1997), «Понятие «состояние» и его методологическая роль в физике» (Мінск, 1999) і інш.

ТРАФІМАВА Таісія Іванаўна (сястра З.І. Падліпскай), беларуская паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Саюза журналістаў Беларусі. Нарадзілася 21.1.1955 г. ў в. Сяргі (пас. Манькова). Скончыла Сяржскую школу, Мінскае педагагічнае вучылішча, тэатральны факультэт Маскоўскага народнага ўніверсітэта мастацтваў, факультэт журналістыкі БДУ. Працавала ў СШ № 10 г. Слуцка, у цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей у г. Маладзечне, у цяперашні час у Літаратурным музеі М. Багдановіча ў Мінску.

Друкавалася ў ЛІМе, часопісах «Полымя», «Маладосць», «Роднае слова», «Першацвет», у васьмі паэтычных калектыўных зборніках, аўтар зборнікаў паэзіі «Усміхнуся вятрам», «Зёлкі ад пакут», «Паспелі вішні». Песні на словы яе вершаў гучалі на «Славянскім базары ў Віцебску» і іншых фестывалях песні і паэзіі.

Урыўкі з аўтабіяграфічнай паэмы «Вёска пад ліпамі»

Вецер іграе на скрыпцы,
Розум у кожным акне –
Родная вёска Падліпцы
Зноў сустракае мяне.

Часта мне начамі сніцца
Казка-вёсачка – Падліпцы.
Назва, ўслухайся, якая –
Меладычная, жывая.
Хто музыка-чарадзейка?
Ці то гуслі, ці жалейка.
Мо вятры на скрыпцы граюць,
Ці то плачуць, ці спяваюць
Пра адвечнае… Пра вечнасць…

Чым мне помняцца Падліпцы –
Гэта кнігі на паліцах,
Стосы сшыткаў на стале.
Бацька ў цёплым каптане
Акуратна іх гартае
І памылкі выпраўляе.
Пры газовачцы не спіць,
Як на варце ён стаіць,
Хіба ж памыліцца можна?!
Слоўцы ж родныя, жывыя,
Нібы кветкі лугавыя.
Палюбуйся іх пяшчотай,
Дай душы сваёй работу,
Каб душа не пуставала,
Слоўцы-кветкі адчувала.
Мала проста разумець,
Трэба сэрцам прыкіпець,
Да зямелькі той адзінай,
Што завуць малой радзімай!
Чалавекам быць старайся,
Каранёў не выракайся,
Іх шануй, як бацьку й маці,

2017©nasledie-sluck.by

Пакланіся роднай хаце,
Што дала для ўзлёту крылы,
Узлятай над краем мілым,
Мовы роднай не цурайся,
Да вытокаў зноў вяртайся!
Ты – часцінка Беларусі.

Я хіба змагу забыцца
Школу-школку ў Падліпцах.
Як матуля першы раз
Прывяла ў першы клас.
Стала ціха ў парозе,
Не забуду любы позірк –
Перад ім і я дагэтуль
У даўгу, як перад светам.

Аб настаўніцы аб першай
Успамін найпрыгажэйшы.
Вольга Канановіч-Бусел
Нас вучыла без прымусу –
Ласкай, поглядам, пацешкай,
Мудрай прымаўкай, усмешкай.
Першай літарцы вучыла
І любові да Айчыны,
Ведаць працаваць, дзядоў,
Колькі б ні сплыло гадоў.
Мы з-за парты ўставалі,
Апанасаўну чакалі,
Дружна ўсе яе віталі,
Добрай раніцы жадалі.

Нашы чыстыя крыніцы
І ў Манькове, і ў Падліпцах,
Хай струменяць, выцякаюць,
Яшчэ доўга нас натхняюць.

Мне ў Падліпцах і Манькове
Толькі сонца дастаткова.
Бо жыву я без спачынку
З успамінамі ў абдымках.
Можа, то каму й на дзіва,
Што лічу сваёй Радзімай
Водар цёплае раллі,
Кожны лапік той зямлі.

М.В. Хаўстовіч

Мой салодка-горкі лёс –
Край маленства, край стракоз.
Ён у спомне маім,
Я – укленца перад ім.

ХАЎСТОВІЧ Мікалай Валянцінавіч, беларускі літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук (2003), перакладчык. Нарадзіўся 10.8.1959 г. у в. Млынка. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1985). У 1985–1988 гг. працаваў настаўнікам на Случчыне. У 1988–1991 гг. вучыўся ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры. З 1991 г. пачаў працаваць у БДУ (у 2000–2005 – заг. кафедры гісторыі беларускай літаратуры). Даследуе літаратурны працэс Беларусі XVIII–XIX стст. Аўтар манаграфій «Мастацкі метад Яна Баршчэўскага» (Мінск, 2003), «Айчына здалёку і зблізку: Ігнацы Яцкоўскі і Аляксандар Рыпінскі» (Мінск, 2006), «Жыццё і творчасць Рамуальда Падбярэскага» (Мінск, 2008), вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

ХІЛЬКЕВІЧ Анатоль Паўлавіч, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1994), прафесар (1991), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1996). Нарадзіўся 11.6.1934 г. у в. Бярозаўка. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1976). З 1965 г. у Нацыянальным інстытуце бяспекі – начальнік кафедры (1976–1978),

2017©nasledie-sluck.by

намеснік начальніка інстытута (1978–1991). З 2000 г. у Мінскім інстытуце кіравання. Аўтар шэрагу навуковых прац па тэорыі і метадалогіі пазнання, праблемах логікі, псіхалогіі асобы, юрыдычнай псіхалогіі. Работы: «Гносеологическая природа гипотезы» (Мінск, 1974), «Проблема расширения традиционной силлогистики» (Мінск, 1981), «Психологический портрет личности» (Мінск, 2002, у сааўт.).

ЦВІРКО Міхаіл Паўлавіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1989), прафесар (1990). Нарадзіўся 25.7.1945 г. у в. Грэск. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1969). З 1968 г. у Інстытуце фізікі АН Беларусі, з 1975 г. у НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ, з 1997 г. – намеснік дырэктара Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азанасферы (БДУ). Аўтар шэрагу навуковых прац па фотафізіцы і фотахіміі біямалекул і комплексных злучэнняў рэдказямельных элементаў, маніторынгу сонечнага прызямнога ультрафіялетавага выпрамянення, распрацоўцы новых метадаў спектральнага аналізу. Работы: «Спектроскопия и квантовая химия порфиронов» (Масква, 1987, у сааўт.), «Фотофизика комплексных соединений редкоземельных элементов» (Мінск, 2001, у сааўт.) і інш.

ЧУЙКА Мікалай Макаравіч, вучоны, вынаходнік, доктар тэхнічных навук, прафесар. Нарадзіўся 30.1.1903 г. ў в. Сярагі. Скончыў рабфак у Мінску, Кіеўскі політэхнічны інстытут. Больш за 50 гадоў працаваў у Днепрапятроўскім металургічным інстытуце на кафедры электраметалургіі.

У пачатковы перыяд асваення тэхналогіі і вытворчасці спецыяльных сталей і сплаваў было многа нявырашаных пытанняў у тэхналогіі выплаўкі і разліву сталі, што давала высокі брак металапрадукцыі. Па загаду ўрада група вучоных, якую ўзначаліў М.М. Чуйка, правяла шэраг навукова-даследчых работ, што спрыяла павышэнню якасці стальных вырабаў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны М.М. Чуйка разам з іншымі вучонымі ў лабараторыі Кузнецкага металургічнага камбіната распрацавалі новыя тэхналогіі выплаўкі бранявой і снараднай сталі, унёсшы вялікі ўклад у перамогу.

Вучоны падтрымліваў сувязь з многімі сталеплавільнымі заводамі, што дапамагло яму распрацаваць тэорыю дэгазацыі сталі і будовы шлакаў, якая ўвайшла ў падручнікі па металургіі. Ён аўтар трох манаграфій, звыш 200 навуковых артыкулаў, пяці вынаходніцтваў. За гады працы ў інстытуце М.М. Чуйка падрыхтаваў больш за 500 высокакваліфікаваных спецыялістаў, 25 кандыдатаў і дактароў тэхнічных навук. Яго праца была адзначана многімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Памёр у 1983 г.

ЧЫМБУРГ Іван Савіч, кандыдат гістарычных навук (1936). Адзін з арганізатараў Еўліцкай камсамольскай ячэйкі ў канцы 1920 г. (Гл. у кн. «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Т. 1. С. 167). Нарадзіўся 27.1.1904 г. у в. Еўлічы. У 1921 г. вучыўся ў беларускай гімназіі ў Слуцку, скончыў працоўную школу. У 1923 г. паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, з 1925 г. – студэнт Саратаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля заканчэння працаваў следчым у органах пракуратуры, з 1931 г. на выкладчыцкай рабоце. Скончыў аспірантуру Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры (1936). У 1936–1941 гг. дацэнт, дэкан гістарычнага факультэта БДУ, загадчык кафедры марксізму-ленінізму. З ліпеня 1941 па май 1946 г. у Чырвонай арміі на палітычнай рабоце. Пасля дэмабілізацыі зноў загадчык кафедры. У 1947–1949 гг.

2017©nasledie-sluck.by

дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. З ліпеня 1949 па ліпень 1952 г. – рэктар БДУ. Унёс значны ўклад у аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі ўніверсітэта. У гэты перыяд праведзена шэраг арганізацыйных мерапрыемстваў, перабудоўваецца выкладанне ўсіх дысцыплін, асабліва мовазнаўчых, заключаюцца дагаворы аб творчым супрацоўніцтве кафедраў БДУ з МАЗам, велазаводам і інш. прадпрыемствамі. У 1952–1957 гг. працуе загадчыкам кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ, загадчыкам сектара Інстытута філасофіі і права АН БССР. У 1957–1962 гг. – загадчык кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму Беларускага політэхнічнага інстытута, у 1962–1976 гг. – дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.

ЧЫРКІН Аляксандр Аляксандравіч, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі, доктар біялагічных навук (1980), прафесар (1986), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1986). Нарадзіўся 2.1.1943 г. у г. Слуцку. Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1965), дзе і працаваў загадчыкам аддзела (1965–1982), загадчыкам кафедры (1982–2002). З 2002 г. загадчык кафедры Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта. Аўтар шэрагу навуковых прац.

ШАЎЧУК Ігар Сяргеевіч, заслужаны канструктар Расійскай Федэрацыі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі, ганаровы авіябудаўнік. Нарадзіўся 30.1.1953 г. у г. Слуцку. Яго бацька – С.С. Шаўчук – заслужаны настаўнік БССР (гл. у арт. «Заслужаныя работнікі Беларусі»). Скончыў СШ № 2, працаваў на аўтарамонтным заводзе ў Слуцку. У 1977 г. скончыў маторабудаўнічы факультэт Маскоўскага авіяцыйнага інстытута імя С. Арджанікідзе. З 1976 г. працаваў у Аб'яднаным канструктарскім

І.С. Шаўчук

бюро А.М. Тупалева. Займаўся распрацоўкай канструкцый, укараненнем у вытворчасць самалётаў Ту-144, Ту-204, Ту-160, Ту-155 і інш., працаваў над пытаннямі аднаўлення патэнцыялу паветраных баявых комплексаў. Аўтар ідэі стварэння мадэльнага рада пасажырскіх магістральных самалётаў, большасць з якіх была распрацавана і сертыфікавана пад яго кіраўніцтвам. У 1998 г. старшыня савета дырэктараў, з 2001 г. генеральны канструктар, потым прэзідэнт – генеральны канструктар адкрытага акцыянернага таварыства «Тупалеў». Жыў у Маскве. Памёр 6.1.2011 г.

ШКЕЛЬ Міхаіл Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне земляробства, доктар сельскагаспадарчых навук (1979). Нарадзіўся 1.3.1918 г. у в. Бялевічы. Скончыў Львоўскі сельскагаспадарчы інстытут (1953). З 1960 г. загадчык аддзела Мінскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі. З 1963 г. у Беларускім НДІ земляробства і селекцыі. Аўтар шэрагу прац па выкарыстанні ўгнаенняў для павышэння ўрадлівасці глебы, павелічэнні ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і г.д. Распрацаваў тэарэтычныя асновы выкарыстання серы як элемента жыўлення раслін ва ўмовах Беларусі і прапанаваў практычны спосаб выкарыстання серных угнаенняў.

2017©nasledie-sluck.by

Работы: «Применение серосодержащих удобрений» (Мінск, 1979), «Оптимальные параметры плодородия почв» (Мінск, 1984, у сааўт.). Памёр 6.8.2003 г.

ЯНОВІЧ Леанід Аляксандравіч, беларускі матэматык, член-каррэспандэнт НАН Беларусі (1989), доктар фізіка-матэматычных навук (1987), прафесар (1992). Нарадзіўся 4.3.1934 г. у в. Кажушкі. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1957). З 1957 г. у Інстытуце матэматыкі НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік (з 1996). Аўтар шэрагу навуковых прац. Распрацаваў і даследаваў шэраг метадаў апраксімацыі функцый і аператараў, лікавых метадаў рашэння інтэгральных і інтэградыферэнцыяльных ураўненняў, набліжанага кантынуальнага інтэгравання. Рашыў задачу пабудовы формул Чабышова з рэчаіснымі вузламі для некаторых відаў інтэгралаў. Пабудаваў і даследаваў лікавыя метады рашэння ўраўненняў аэрапругкасці з дэтэрмінаванымі і выпадкова ўзбуджанымі ядрамі і правай часткай, формулы аператарнага інтэрпаліравання ў функцыянальных і агульных лінейных прасторах. Работы: «Приближенное вычисление континуальных интегралов по гауссовым мерам» (Мінск, 1976), «Интерполирование операторов» (Кіеў, 2000, у сааўт.) і інш.

ЯРАВЫ Аляксандр Якаўлевіч, беларускі спявак (бас-барытон), заслужаны артыст Беларусі (2005). Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола (1978). Нарадзіўся 10.11.1948 г. у Слуцку. З 1968 г. артыст, саліст-вакаліст Ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Аўтар песень «Весна Победы», «Офицеры Беларуси», «Доблесть и честь», «Белая Русь», «День победы – мы поём», «Офицерские жены», «Марш белорусских солдат», «Только ты – моя любовь» і інш. Аўтар кнігі пра бацьку (Яравы Якаў Паўлавіч, беларускі харавы дырыжор, заслужаны артыст Беларусі) «Годы, отданные песне» (2003) і аднайменнага дыска (2004).

ЯРМОШЫНА Лідзія Міхайлаўна, дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь, заслужаны юрыст Беларусі (2003). Нарадзілася 29.1.1953 г. у Слуцку. Скончыла Калінінградскі ўніверсітэт (1975). З 1975 г. юрыдычны кансультант на гандлёвых і прамысловых прадпрыемствах Калінінграда і Бабруйска. З 1987 г. памочнік пракурора Акцябрскага р-на Калініграда, з 1988 г. юрыдычны кансультант, нач. юрыдычнага аддзела Бабруйскага гарвыканкама. З 14.11.1996 г. старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Пры яе ўдзеле падрыхтаваны і прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў» (1998), «Аб выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў» (1998), «Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь» (2000).

Падрыхтавала В.С. Відлога.

Л.М. Ярмошына

2017©nasledie-sluck.by

От Слуцка дороги к планетам легли

В Слуцком краеведческом музее хранятся документы, материалы, фотографии, личные вещи земляков-ученых, военнослужащих, чьи имена связаны с освоением космического пространства. Им посвящен раздел экспозиции «Слуцчане и Космос».

27 апреля 1849 г. в Слуцке родился Витольд Карлович Цераский. После окончания местной гимназии поступил на физико-математический факультет Московского университета. По окончании заведения Витольда как одного из лучших учеников пригласили на работу в этот же университет. С 1874 г. он начал трудиться в астрономической обсерватории при университете, а в 1890 году возглавил ее и работал на этом посту до 1916 г.

В.К. Цераский по праву считается одним из пионеров применения фотографии в астрономии. Он основал московскую школу астрофотометрии. В 1887 г. построил фотометр (на основе фотометра Цёлльнера), при помощи которого определил звездные величины и составил каталоги звезд в околополярной области. В 1903 г. он определил видимую звездную величину Солнца, осуществил важные эксперименты по определению температуры Солнца. Организовал в Московской обсерватории систематические поиски и изучение переменных звезд фотографическим путем. В 1885 г. открыл ночные светящиеся так называемые серебристые облака, определил их среднюю высоту. Предложил аналитический способ определения координат метеорного радианта и метод определения угловой скорости метеоров, усовершенствовал ряд астрономических приборов. Умер В.К. Цераский 29 мая 1925 г., оставив после себя богатое научное наследие – 92 научных труда, опубликованных еще при жизни, которые имеют огромное значение. В честь Цераского названы малая планета 807 Ceraskia и кратер на Луне.



Московская обсерватория на Пресне

В.К. Цераский

С.А. Косберг

14 октября 1903 г. в семье кузнеца родился Семен Ариевич Косберг. После окончания школы он поступил в коммерческое училище в Слуцке, затем работал кузнецом и мастером по металлу в кузнице своего отца. Отслужив два года в Красной армии и демобилизовавшись, Семен Ариевич работал слесарем на фабрике имени С. Халтурина в Ленинграде. Потом учился в Ленинградском политехническом институте, в Московском институте авиации, который

2017©nasledie-sluck.by

окончил в 1930 г. В 1931 г. С.А. Косберга направили на работу в Центральный институт авиационного моторостроения (ЦИАМ), где он прошел путь от инженера-конструктора до начальника научно-исследовательского отдела.

В годы Великой Отечественной войны С.А. Косберг руководил ОКБ моторостроительного завода в Сибири, создал систему впрыска топлива для поршневых авиадвигателей. После войны его коллектив вместе с коллективом Сергея Павловича Королева создал первый жидкостный ракетный двигатель. Двухступенчатая ракета-носитель конструкции Королева успешно выводила на орбиту три первых искусственных спутника Земли. Но для дальнейшего «прорыва» в космос нужна была третья ступень, которая разогнала бы аппарат до второй космической скорости. Главной разработкой ОКБ Косберга стало создание кислородно-керосинового жидкостно-реактивного двигателя для третьей ступени ракеты-носителя «Восток», которая обеспечила выход на орбиту всех первых советских космических кораблей. Наградой Семену Ариевичу за этот труд стала Ленинская премия. В секретном указе Президиума Верховного Совета СССР, подписанном сразу после полета Юрия Гагарина, в числе удостоенных звания Героя Социалистического Труда был и С.А. Косберг. Его жизнь трагически оборвалась в январе 1965 г. в результате автомобильной катастрофы. Именем С.А. Косберга названы кратер на обратной стороне Луны и улица в городе Слуцке.

27 сентября 1918 г. в деревне Сороги Слуцкого района родился Константин Васильевич Герчик. Великую Отечественную войну он завершил в Праге. В июне 1957 г. полковника Герчика направили на полигон № 5 (так тогда назывался Байконур) в качестве начальника штаба. А уже через год он стал начальником Байконура. К.В. Герчик был участником запуска первого искусственного спутника Земли, под его командованием отрабатывались исходные варианты баллистических ракет, параллельно шла подготовка к запуску космических кораблей «Восток» в пилотируемом варианте. Однако тяжелая авария, случившаяся на полигоне в 1960 г. при государственных испытаниях межконтинентальной баллистической ракеты Р-16, больше чем на полгода вывела его из строя. Тогда погибли 126 человек (с учетом не выживших в госпитале и больницах), еще 50 человек получили тяжелые ожоги. Константин Васильевич сумел вернуться в строй. В 1963 г. он стал начальником штаба, в 1972-м – командующим 50-й Смоленской ракетной армией. В 1976 г. ему было присвоено звание «генерал-полковник». За вклад в обеспечение обороноспособности страны и развитие космонавтики К.В. Герчик награжден двумя орденами Ленина, ему присуждена Ленинская премия. В 2000 г. К.В. Герчик стал Почетным гражданином Байконура. После смерти Константина Васильевича (23 июня 2001 года) его имя присвоили школе в деревне Сороги, где он учился.

Любопытная деталь: двоюродный брат Константина Васильевича, родившийся там же, в деревне Сороги Слуцкого района, Даниил Максимович Герчик (1918–1989), выучившись на инженера-конструктора, оказался в подмосковном Реутове, в КБ академика Челомея, где занимались космическими системами (преимущественно военного назначения) и крылатыми ракетами морского базирования.

2017©nasledie-sluck.by

17 июня 1933 г. в Слуцке в семье военнослужащего родился Юрий Аверкиевич Жуков. Окончил Рижское высшее инженерно-авиационное училище ВВС, Военную академию имени Ф.Э. Дзержинского. Потом двадцать пять лет служил в Ракетных и шесть лет – в Космических войсках.

Ю.А. Жуков в качестве начальника космодрома Байконур (1983–1989) 15 ноября 1988 г. руководил пуском УРКТС «Энергия – Буран». При нем отрабатывали и новую ракету-носитель «Зенит», выполняли пилотируемые полеты по программе «Интеркосмос». Ю.А. Жуков награжден орденами Октябрьской Революции, Красной Звезды, многими медалями. Он – Почетный гражданин городов Байконура, Смоленска. Умер Ю.А. Жуков в Смоленске 19 марта 2010 г. Несмотря на внушительное расстояние между Слуцким краеведческим музеем и Смоленском, Юрий Аверкиевич принимал активное участие в проведении мероприятий, посвященных Всемирному дню космонавтики и авиации. Сотрудники музея организовывали «прямую связь», и участники мероприятий – учащиеся школ – имели возможность по телефону поговорить с Жуковым и задать ему несколько вопросов.

10 апреля 1937 г. в деревне Избудище Слуцкого района родился Константин Константинович Давидовский. Окончив Весейскую среднюю школу, Тульское оружейное училище, он служил в Плесецке. Оттуда его направили на учебу в Ростовское артиллерийское училище. В это время ему предложили войти штурманом в состав экипажа «Луноход-1». На встрече с сотрудниками Слуцкого краеведческого музея К.К. Давидовский рассказывал, что в марте 1971 г., чтобы поздравить женщин-коллег, осуществлявших инженерное и техническое обеспечение, с Международным женским днем, он рассчитал маршрут так, чтобы луноход выписал колесами на лунном грунте «8 МАРТА». Но из-за нехватки энергии слово «...МАРТА» написать не удалось, поскольку луноход работал от солнечных батарей, а подзарядка должна была состояться лишь на следующий день с восходом Солнца. Экипаж сфотографировал творение своих рук и продемонстрировал сотрудницам. К.К. Давидовский трагически погиб 5 ноября 2004 г.

30 января 1953 г. в Слуцке родился Игорь Сергеевич Шевчук. С золотой медалью окончил СШ № 2. Год работал на слуцком авторемзаводе. В 1977 г. окончил моторостроительный факультет Московского авиационного института. С 1976 г. работал в КБ Туполева. Разрабатывал конструкции, ведал вопросами прочности самолетов Ту-144, Ту-204, Ту-334, Ту-160, Ту-155 и других, вводил их в производство. В 1994 г. занял должность директора экспериментального завода ОАО «Туполев». В 1997 г. совет директоров доверил И.С. Шевчуку пост генерального директора предприятия. С 1998 г. был председателем совета директоров предприятия, с 2001 г. – президентом, генеральным конструктором ОАО «Туполев». И.С. Шевчук – почетный авиастроитель, лауреат Государственной премии Российской Федерации. Умер 6 января 2011 г.

В 1941 г. в Слуцке родился Александр Александрович Куницкий – начальник кафедры баллистики академии имени Дзержинского, автор более 80 трудов по экспериментальной баллистике ракет и космических аппаратов, член-корреспондент Российской инженерной академии, член Экспертного совета по Национальной безопасности при

2017@nasledie-sluck.by

Председателе Госдумы Российской Федерации. Нашими земляками являются: Евгений Александрович Жалковский (1938 г. р.) – доктор технических наук, лауреат Государственной премии СССР, профессор, заведующий лабораторией Института физики Земли РАН, который в 90-е гг. возглавлял Госкомиссию по запуску и управлению полетами космических аппаратов народнохозяйственного назначения, служил на космодроме Плесецк в 1981–1999 гг.; Марат Александрович Броновец – кандидат технических наук, ведущий научный сотрудник Института проблем механики Российской академии наук.

Огромную помощь нашему музею в сборе материалов о слутчанах, связанных с тематикой космоса, оказывает наш земляк Владимир Максимович Дудко, который занимался разработкой систем ПВО и обеспечением системами ЭВМ ракетных войск. Он был военным представителем Главного управления космических средств, участвовал в организации и разработке государственных информационных систем, предназначенных для чрезвычайных ситуаций. В.М. Дудко – член исполкома межрегионального совета ветеранов космодрома Байконур.

Ежегодно к Всемирному дню авиации и космонавтики Слуцкий краеведческий музей организовывает цикл мероприятий, посвященных первому полету человека в космос. Во встречах с учащимися учебных заведений Слутчины принимают участие Сергей Николаевич Гончарик, который работал старшим инженером-испытателем космодрома Байконур и в конструкторском бюро имени Бармина, Валерий Владимирович Концов, который в 1979–1999 гг. служил на космодроме Байконур и занимался строительством объектов, относящихся к космосу.

К 50-летию полета Ю.А. Гагарина в нашем музее работала выставка «Земля и Вселенная», на которой в максимальном объеме были представлены материалы о наших земляках, имеющих отношение к освоению космического пространства, вымпелы, марки, значки, открытки, плакаты с космической символикой.

Н.Г. Серик.

ЗВЯЗАНЫ ЛЁСАМ СА СЛУЧЧЫНАЙ

АЛЕНДСКІ Стафан, дзеяч кальвінскай царквы. Нарадзіўся каля 1720 г. у в. Мачуліна Ваўкавыскага р-на. Скончыў Слуцкую гімназію, вучыўся ў Парыжскім ўніверсітэце (Сарбона). У 1745 г. староста сітнаўскі (в. Малое Сітна Полацкага р-на). У 1757 г. пераклаў з французскай на бел.-польск. макаранічную мову 2-ю частку культавай кнігі пратэстантаў Еўропы «Шлях пілігрыма» Дж. Баньяна. Магчыма, аўтар інш. перакладаў друкарні ў Караляўцы (Кёнігсбергу). Памёр 2.9.1763 г.

БЕЛЬСКІ Фама Антонавіч, вучоны, педагог, прафесар (1925). Нарадзіўся 31.10.1890 г. у м. Цімкавічы Слуцкага пав. (цяпер Капыльскі р-н). Скончыў Цімкавіцкае народнае вучылішча (1901), з сярэбраным медалём Слуцкую гімназію (1909), Кіеўскі ўніверсітэт з дыпломам I ступені як лепшы выпускнік (1913). Працаваў выкладчыкам у Златапольскай гімназіі, у сярэдніх навучальных установах. З 1923 па 1929 г. выкладаў у Данецкім інстытуце народнай адукацыі ў г. Луганску. Узначальваў кафедры

2017©nasledie-sluck.by

педагогікі ў Херсонскім, Краснадарскім, Магілёўскім (1935–1936), Чарнігаўскім, Ферганскім педагагічных інстытутах, Кіеўскім інстытуце фізічнай культуры. Аўтар шматлікіх педагагічных артыкулаў і даследаванняў: «Арганізацыя навуковай работы» (1926), «Тэсціраванне і ацэнка паспяховасці навучэнцаў» (1926), «Вывучэнне здольнасцей дзяцей» (1928) і інш. Жыў у Кіеве. Памёр у 1952 г.

ВАКАР Віктар Канстанцінавіч, генерал-маёр, начальнік Ваеннай акадэміі з 1994 г. Нарадзіўся ў 1942 г. у г.п. Багушэўск Віцебскай вобл. Скончыў Адэскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча і быў накіраваны ў Групу савецкіх войскаў у Германію камандзірам узвода. Сакратар камсамольскай арганізацыі, памочнік начальніка палітаддзела дывізіі. У 1969 г. – у Слуцку, намеснік камандзіра танкавага батальёна па палітчастцы 31-га танкавага палка, намеснік камандзіра мотастралковага палка па палітчастцы, намеснік начальніка, начальнік палітаддзела 29-й танкавай дывізіі. Потым – начальнік палітупраўлення Прыбалтыйскай ваеннай акругі, памочнік галоўнакамандуючага сухапутнымі войскамі па рабоце з асабовым складам (Масква). З мая 1992 г. у Беларусі, дзе ўзначаліў Нацыянальнае агенцтва па кантролі і інспекцыях, начальнік Ваеннай акадэміі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах» III ступені, медалямі. Памёр 15.3.1998 г.

ДУБЫНІН Віктар Пятровіч, генерал арміі (1992), Герой Расіі (2003), удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане. Нарадзіўся 1.2.1943 у пас. Марцюш Каменскага р-на Свярдлоўскай вобл. Скончыў сярэднюю школу ў в. Вялікая Рыга Галкінскага р-на Курганскай вобл. (1951). У Савецкай арміі з 1961 г. Скончыў танкавае вучылішча ў г. Благавешчанск Амурскай вобл., вышэйшыя афіцэрскія курсы ў Маскве (1973), Ваенную акадэмію Генеральнага штаба УС СССР (1984). Служыў у Беларусі: камандзір танкавага ўзвода (г. Печы, каля Барысава), танкавай роты (1970), батальёна (1971). З 1975 г. – нач. штаба танкавага палка. З 1976 па 1979 г. у Слуцку, камандзір 32-га танкавага палка 29-й танкавай дывізіі ў Беларускай ваеннай акрузе. З 1984 г. у Казахстане, з 1986 па 1992 г. камандуючы 40-й агульнавайсковай арміяй Туркестанскай ваеннай акруті, 7-й танкавай арміяй Беларускай ваеннай акруті, першы нам. камандуючага войскамі Кіеўскай ваеннай акругі, камандуючы Паўночнай групай савецкіх войскаў на тэрыторыі Польшчы. У 1992 г. генерал-палкоўнік В.П. Дубынін нач. Генеральнага штаба Узброеных Сіл – першы намеснік міністра абароны Расійскай Федэрацыі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» II і III стст., медалямі. Памёр 22.11.1992. Пахаваны ў Маскве. Пасмяротна прысвоена званне Героя Расіі за асабістую мужнасць і адвагу і ўмелае кіраўніцтва войскамі ў ходзе баявых дзеянняў у Афганістане.

В.П. Дубынін

2017©nasledie-sluck.by

ІВАНОЎСКІ Яўген Піліпавіч, генерал арміі (1972), Герой Савецкага Саюза (1985). Нарадзіўся 7.3.1918 г. у в. Чарэя Чашніцкага р-на Віцебскай вобласці ў сям'і селяніна. У Савецкай арміі з 1936 г. Скончыў Саратаўскае бранятанкавае вучылішча (1938). Удзельнік вызваленчага паходу ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі (1939), савецка-фінляндскай вайны (1939–1940). У 1941 г. скончыў паскораны курс Ваеннай акадэміі бранятанкавых войскаў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны з кастрычніка 1941 г.: нач. штаба, камандзір танкавага батальёна, нам. нач. штаба танкавай брыгады, нач. аддзела штаба танкавага корпуса, камандзір танкавага палка. Удзельнічаў у Маскоўскай, Сталінградскай і Курскай бітвах, бітве за Дняпро, вызваленні Украіны, Польшчы, ва Усходне-Прускай аперацыі, фарсіраванні Одэра.

У 1946–1956 гг. на камандных пасадах у войсках. З 1954 г. у Слуцку, камандзір танкавай дывізіі. У 1958 г. скончыў Ваенную акадэмію Генштаба і быў накіраваны ў Далёкаўсходнюю ваенную акругу. У 1965–1972 гг. – 1-ы нам. камандуючага і камандуючы войскамі Маскоўскай ваеннай акругі. У 1972–1980 гг. – галоўнакамандуючы Групай савецкіх войскаў у Германіі, у 1980–1984 гг. камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі. З 1985 па 1989 г. галоўнакамандуючы Сухапутнымі войскамі, міністр абароны СССР. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (тройчы), Чырвонага Сцяга (чатыры разы), Чырвонай Зоркі (двойчы), Кутузава I ступені, Суворава II ступені, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, медалямі, замежнымі ўзнагародамі.

Жыў у Маскве. Памёр 22.11.1991 г. У гонар Я.П. Іваноўскага названы вуліцы ў Слуцку і Віцебску.

З.К. Ломаць

ЛОМАЦЬ Зянон Кузьміч, дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся 27.1.1944 г. у в. Карабаны Мядзельскага р-на. Скончыў Навапольскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1965), Мінскі педагагічны інстытут (1971), Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1982), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1983). Працаваў эканамістам у калгасе, інструктарам Мядзельскага райкама, Мінскага абкама ЛКСМБ, першым сакратаром Уздзенскага райкама ЛКСМБ. З 1974 па 1981 г. – загадчык арганізацыйнага аддзела, сакратар райкама КПБ у г.п. Узда. З 1983 г. інструктар Мінскага абкама КПБ, другі сакратар Слуцкага гаркама КПБ, першы сакратар Клецкага райкама КПБ, першы сакратар Слуцкага гаркама КПБ. У 1991–1992 гг. сакратар Камітэта Савета Рэспублік па аграрных пытаннях (Масква). У 1992–1995 гг. член планавай і бюджэтна-фінансавай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. У 1995–2001 гг. – старшыня Слуцкага райвыканкама. У 2001–2006 гг. – памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўны інспектар па Гомельскай вобласці, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўны інспектар па Віцебскай вобласці. У 2006–2010 гг. –

2017©nasledie-sluck.by

старшыня Камітэта Дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

МІКЛАШЭВІЧ (НАХОДКА) Ганна Іванаўна, паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2006). Нарадзілася 29.7.1973 г. у в. Якавічы Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Скончыла школу на Любаншчыне, Нясвіжскае педвучылішча (1992), філалагічны факультэт Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка (2000). З 1995 г. працуе настаўніцай у Грэскай сярэдняй школе. Друкавалася ў «Настаўніцкай газеце», газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Слуцкі край», часопісах «Першацвет», «Бярозка», «Маладосць», «Роднае слова». Аўтар зборнікаў вершаў «Калыханка на дваіх» (1999), «Пялёсткі снежынак» (2010).

ПЛАШЧАДНЫ Віктар Якаўлевіч, кандыдат тэхнічных навук (1974), вынаходнік СССР (1988), горны інжынер, член-карэспандэнт Беларускай горнай акадэміі, член прэзідыума Рэспубліканскага праўлення НТТ – Горнае. Нарадзіўся 25.1.1937 г. у в. Мікаянаўка Мікаянаўскага р-на Курскай вобл. Скончыў Днепрапятроўскі горны тэхнікум (1955), Усесаюзны Маскоўскі політэхнічны інстытут (1968). Працаваў горным майстрам Кугітанскай геолага-разведачнай экспедыцыі Туркменскага геалагічнага ўпраўлення, начальнікам участка, аддзела Упраўлення геалогіі пры Савеце Міністраў Туркменскай ССР (1964–1975). Адначасова з'яўляўся старшынёй тэрытарыяльнага і членам Рэспубліканскага Савета Усесаюзнага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў (1958–1974); членам кансультатыўнага Савета наватараў ВДНГ СССР (1962–1974). У 1975–2002 гг. – гал. інжынер Беларускай геолагаразведачнай экспедыцыі ВА «Беларусьгеалогія»

В.Я. Плашчадны

ў Слуцку. Прымаў удзел у разведцы радовішчаў калійнай і каменнай солей, жалезнай руды, будаўнічага і абліцовачнага каменю, у пошуку алмазаў. Мае 12 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва, два з якіх запатэнтаваны ў замежных краінах. Аўтар даведніка «Шнековый буровой инструмент», 37 навуковых артыкулаў па аптымізацыі буравых працэсаў свідравання. Узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Туркменскай ССР, медалямі «За заслуги в разведке недр», «За доблестный труд в ознаменование 100-летия со дня рождения В.И. Ленина» і інш., двойчы знакам «Отличник разведки недр» (1965, 1987), знакам «Изобретатель СССР», Граматамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і інш. Жыве ў Слуцку.

РАМАШКІН Іван Данілавіч, Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся 15.9.1909 г. на хутары Рамашкін Палассаўскага раёна Валгаградскай вобласці. Працаваў механікам у Ніжне-Чыркаўскай МТС. У Савецкай арміі з 1931 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны (1939–1940). На фронце ў Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. Скончыў курсы мал. лейтэнантаў у 1942 г. 23–26 красавіка 1945 г. мотастралковы батальён 33-й гв. мотастралковай брыгады

2017©nasledie-sluck.by

(9-ы гв. танкавы корпус, 2-я гв. танкавая армія, 1-ы Беларускі фронт) пад камандаваннем гв. ст. лейтэнанта І.Д. Рамашкіна фарсіраваў каналы Гогенцолерн і Закровер, паспяхова прарваў абарону праціўніка на подступах да г. Патсдам (Германія). 1–3 мая 1945 г. у раёне Берліна воіны батальёна ўзялі ў палон сотні варожых салдат і афіцэраў. Пасля вайны жыў і служыў у Слуцку. Маёр. У 1956 г. выйшаў у запас. Пераехаў у г. Уфу, дзе і жыў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалямі.

ТАМАШЭЎСКІ Казімір Адамавіч, Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся 1.11.1914 г. у г. Бярдзічаў, цяпер Жытомірскай вобл. Скончыў 7 класаў. Працаваў на галоўпаштамце. У Савецкай арміі з 1936 г. У 1939 г. скончыў курсы малодшых лейтэнантаў, у 1942 г. – курсы «Выстрал». На фронце ў Вялікую Айчынную вайну з лютага 1942 г. Камандзір мотастралковага батальёна 21-й механізаванай брыгады (8-ы гв. мех. корпус, 1-я гв. танкавая армія, 1-ы Беларускі фронт) капітан Тамашэўскі ў ліку першых 19.4.1945 г. пераправіўся на супрацьлеглы бераг р. Шпрэя і захапіў плацдарм. Сваімі дзеяннямі садзейнічаў пераправе ўсёй брыгады і выхаду яе на ўсходнюю ўскраіну Берліна. Пасля вайны прадоўжыў службу ў арміі. У 1950-я гг. служыў і жыў у Слуцку, потым – у Мінску. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга (тройчы), Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 11.4.1983 г.

ТАРАСАЎ Рыгор Іванавіч, Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся 25.1.1913 г. у с. Верхняя Добрынка Жырноўскага р-на Валгаградскай вобл. У Савецкай арміі з 1935 г. Скончыў Арлоўскае ваеннае пяхотнае вучылішча (1942). На фронце ў Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. Камандзір батальёна 25-га стралковага палка (1-ы Украінскі фронт) гв. капітан Р.І. Тарасаў разам з байцамі ў ліку першых 26.1.1945 г. фарсіраваў р. Одэр у р-не нас. пункта Таркздорф (Польшча) і ўтрымліваў плацдарм, адбіўшы некалькі атак праціўніка. У 1948 г. скончыў курсы «Выстрал». Служыў у Слуцку, ваенны камісар райваенкамата (1955–1959). З 1959 г. падпалкоўнік запасу. Працаваў у гандлёвым прадпрыемстве ў Ленінградзе. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга (двойчы), Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалямі. Жыў у пас. Кузьмілаўскі Ленінградскай вобл.

ЧУБРЫК Тамара Уладзіміраўна, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Нарадзілася 20.2.1937 г. у в. Баранавічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл. З 1953 г. працавала даяркай у калгасе «Знамя Перамогі» Карэліцкага раёна. Неаднаразова з'яўлялася дэпутатам Карэліцкага раённага Савета дэпутатаў. Узнагароджана ордэнамі Леніна (двойчы), «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі, залатым, сярэбраным і бронзавым медалямі ВДНГ. З 2001 г. жыла ў Слуцку. Памерла ў 2009 г.

ШУКАЙЛА Паўлюк (Павел Захаравіч), беларускі пісьменнік, прафесар (1933). Нарадзіўся ў 1904 г. у в. Лапенеўцы Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. Вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, скончыў Камуністычную акадэмію ў Маскве (1930). У пач. 1920-х г. удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, чл. КПЗБ. З 1924 г. у БССР. Быў сакратаром Расонскага райкама КП(б)Б, удзельнічаў у рабоце Полацкай філіі «Маладняка». У 1925–1926 гг. жыў і

2017©nasledie-sluck.by

працаваў у Слуцку, рэдактар акруговай газеты «Вясковы будаўнік», арганізатар Слуцкай філіі «Маладняка». З 1926 г. у Мінску, ініцыятар стварэння «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны», рэдактар часопіса «Росквіт». З 1928 г. у Маскве. У 1930–1931 гг. паліткарэктар у Галоўліце СССР, загадчык кафедры метадалогіі мастацтва Інстытута кінематаграфіі. Да 1931 г. кіраўнік беларускай секцыі Маскоўскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. У верасні 1930 г. арыштаваны, праз месяц вызвалены. З 1932 г. у Ленінградзе, віцэ-прэзідэнт Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. З 1936 г. у Маскве. У 1938 г. рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959 г. Друкаваўся з 1925 г. Першая і адзіная кніга паэзіі – «Акрываўленая зямля» (1930), у якую ўвайшлі вершы, паэмы «Акорды дзён» і «Партызанка Люба». Аўтар шэрагу крытычных артыкулаў паэзіі А. Вольнага, А. Дудара, У. Жылкі і інш.

ЯРАВЫ Якаў Паўлавіч, беларускі харавы дырыжор, заслужаны артыст Беларусі (1970). Нарадзіўся 1.5.1923 г. у г.п. Старая Ушыца Камянец-Падольскага р-на Хмяльніцкай вобл. (Украіна). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1940–1950-я гг. служыў у Слуцку, старшына музычнага ўзвода танкавага палка. Скончыў Беларускую кансерваторыю (1961). З 1962 г. дырыжор-хормайстар Ансамбля песні і танца Беларускай ваеннай акругі, з 1974 г. мастацкі кіраўнік хору народнай песні «Серабранка» Палаца культуры Мінскага трактарнага завода, з 1983 г. – народнага вакальнага ансамбля ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і Савецкай арміі Дома афіцэраў у Мінску. Аўтар музыкі песень «Край мілы мой», «Беларусь мая», «Шляхам бацькоў», «Дружней, беларусы», «Беларуская наша сталіца», «Чорная быль» і інш. Памёр 20.2.1999 г.

Падрыхтавала В.С. Відлога.

ЯНЫ ВЫКОНВАЛІ СЛУЖБОВЫЯ АБАВЯЗКІ

РУСАКЕВІЧ Валерый Уладзіміравіч, н. 28.9.1953 г. у Слуцку. Скончыў Сызранскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў (1975). У паветраных войсках СССР з 1971. Баявыя задачы выконваў у Рэспубліцы Афганістан са снежня 1979 г., зрабіў больш за 200 баявых вылетаў. Загінуў 27.6.1985 г. у Афганістане пры выкананні задання па перакіду дэсанта з месца баявых дзеянняў і нанясення ракетнага ўдару па праціўніку. Верталёт быў збіты і пры падзенні на зямлю разбіўся. Экіпаж загінуў. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга (другім – пасмяротна). Пахаваны ў г. Ташкенце.

БАРЫСАВЕЦ Уладзімір Уладзіміравіч, н. 1.3.1973 г. у в. Вясея, жыў у Слуцку. Скончыў СШ № 2, вучыўся ў Ленінградскім вышэйшым ваенным камандным вучылішчы ўнутраных войскаў МУС СССР, Акадэміі МУС Беларусі, якую і скончыў. Службу пачынаў оперупаўнаважаным па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю Мінскага РАУС, затым следчым Слуцкага ГРАУС, оперупаўнаважаным Слуцкага міжрайаддзела ўпраўлення па Мінскай вобл., Камітэта па арганізаванай злачыннасці і карупцыі пры МУС Рэспублікі Беларусь. Загінуў 14.4.1999 г. выконваючы службовы абавязак пры затрыманні небяспечных злачынцаў. У гонар В.В. Барысаўца названа вуліца ў г. Слуцку.

2017©nasledie-sluck.by

Через годы, через расстояния…

Житель города Слуцка подполковник запаса Анатолий Николаевич Гноевых более двух лет исполнял интернациональный долг в Афганистане. Время, проведенное там, он, как и многие другие военнослужащие, вспоминает как страшный сон. Ведь люди в Афгане подвергались постоянному риску, они видели смерть…

Анатолий Николаевич после окончания Алмаатинского высшего общевойскового командного училища проходил службу командиром разведывательной роты на Дальнем Востоке. В 1985 г. вместе с другими военнослужащими военного округа его направили в жаркий Афганистан. Кабул. Баграм. Панджшерское ущелье. В поселке Руха стояло подразделение, куда определили Анатолия Николаевича командиром разведывательной роты 682-го мотострелкового полка (в 1986 г. переименован в 682-й горнострелковый полк). Там была «столица» самого могучего афганского полевого командира Ахмад Шаха.

А.М. Гноевых

– Мы находились в боевом районе, мирных жителей там не было, только стояли афганские подразделения. Полк сам себя охранял, – рассказывал Анатолий Николаевич. – Разведывательная рота выходила через день на боевые действия, засады, сопровождения колонн.

А.Н. Гноевых хорошо помнит первый бой, когда соседнее подразделение ошиблось при передвижении на свое место дислокации и его рота попала в засаду. Ее действия были ограничены, так как прикрытия сверху не было. Только к вечеру рота отошла на безопасное расстояние.

– Укрываться в горах сложно, не понимаешь, откуда стреляют. В тот день погибли два сапера из другой роты. Безусловно, испытывали страх, находились в постоянном напряжении. Если иной день, когда не было боя, рядовые могли расслабиться, то офицеры себе этого не позволяли. Мы несли ответственность за их жизни. Надо было отдавать распоряжения, контролировать их выполнение, – говорил А.Н. Гноевых. – Возникали проблемы во время боевых действий из-за неподготовленности ребят к передвижению по горам. Многие теряли контроль над собой. Но мы не позволяли себе бросать сослуживцев, выносили их на руках.

На вооружении разведроты Анатолия Николаевича были боевые машины пехоты, боевые разведывательные машины, но их практически не использовали, так как в горах большие помехи. Вместе с разведчиками на задания выходили саперы, они минировали определенные участки местности, выставляли специальные комплексы из противотанковых мин. Во время выполнения

2017©nasledie-sluck.by

задания саперы однажды обнаружили обмундирование. При обследовании участка нашли две тюрьмы с военнопленными, среди которых были 12 советских солдат и около ста афганцев.

– В разных погодных условиях доводилось нам воевать. Однажды участвовали в операции на высоте четырех тысяч метров над уровнем моря. Была сильная пурга. Мы ни на минуту не сомкнули глаз, смотрели друг за другом, чтобы не замело. В нашей роте все выжили, а в соседней шесть человек погибли, около 60 получили обморожения, – рассказывал Анатолий Николаевич. – За время службы не единожды находили склады с продуктами, боеприпасами (их уничтожали или вывозили, если было много), взяли в плен двух душманов. Из 25 месяцев, что мы находились в Афганистане, рота 22 раза была награждена грамотой за первое место в полку. Оценивались повседневный быт солдат, ведение боевых действий, состояние вооружения.

За выполнение интернационального долга Анатолий Николаевич Гноевых награжден орденами Красной Звезды, «За храбрость», медалью «За отвагу», знаком воинской доблести. С помощью Интернета он нашел командиров взводов, прапорщиков, сержантов и солдат, с которыми бок о бок стоял на огневых рубежах жаркого Афгана. Несмотря на то, что всех «разбросало» по разным уголкам бывшего Советского Союза, сослуживцы уже три года подряд встречаются, вспоминают былое, вспоминают тех, кого нет в живых…

И. Коваленко.

Лёс наканаваў зберагчыся

Вайна ў Афганістане пакалечыла лёсы многіх людзей. Нягледзячы ні на што, ваеннаслужачыя свята выконвалі свой абавязак, заставаліся вернымі прысязе...

В.Л. Шарупіч з унучкай Юляй

Сярод тых, хто хадзіў пад кулямі ў Афганістане, бачыў смерць, – случчанін Валерый Львовіч Шарупіч. Родам ён – з вёскі Леніна. Яшчэ ў маленстве марыў стаць ваеннаслужачым, як яго дзядзька, і праходзіць службу ў Ваенна-марскім флоце.

– Стан здароўя не адпавядаў патрабаванням, якія прад'яўлялі на флоце, таму я паступіў у Маскоўскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча імя Вярхоўнага Савета РСФСР, – расказваў Валерый Львовіч. – Пасля заканчэння ўстановы мяне ў групе савецкіх войскаў накіравалі на службу ў Германію ў 6-ю мотастралковую дывізію. Праз пяць гадоў перавялі ў Паўночна-Каўказскую ваенную акругу, адтуль праз пэўны час – на Камчатку, потым – у Слуцк, дзе праходзіў службу камандзірам каменданцкай роты ў штабе 29-й танкавай

2017©nasledie-sluck.by

дывізіі. Жонка Любоў Фёдараўна мужна пераносіла са мной усе пераезды.

У 1987 г. Валерыя Львовіча накіравалі ў Афганістан: служыў у асобным батальёне матэрыяльнага забеспячэння. У Баграм, Хайратон, Поліхумры, Кабул і іншыя населеныя пункты гарачай краіны Валерый Львовіч разам з іншымі вайскоўцамі дастаўляў прадукты харчавання, боепрыпасы, гаруча-змазачныя матэрыялы. Неаднаразова калоны траплялі ў засады, аўтамабілі падалі ў бездань. В.Л. Шарупіч расказваў, што для тых вадзіцеляў, якія адхіляліся ад маршруту, гэта каштавала жыцця.

– Таксама падчас службы ў Афганістане быў начальнікам штаба 100-га асобнага медыцынскага батальёна. Аказвалі дапамогу не толькі савецкім салдатам, але і афганскаму народу, – расказваў Валерый Львовіч. – Жудасныя карціны паўставалі перад вачыма. Нашы салдаты мужна пераносілі ўсе цяжкасці, добрасумленна адносіліся да выканання сваіх абавязкаў.

Аднойчы з месца пастаяннай дыслакацыі эвакуіравалі параненых у шпіталь у Кабул на трох бронетранспарцёрах. Першы, у якім ехаў Валерый Львовіч, узарваўся. Пяць чалавек загінулі, Валерый Львовіч быў паранены. Крыху паправіў сваё здароўе ў медсанбаце – і зноў у строй. За праяўленую мужнасць падчас баявых дзеянняў у Афганістане Валерый Львовіч Шарупіч адзначаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР», медалямі «За ратную доблесць», «Ад удзячнага афганскага народа» і іншымі ўзнагародамі. Болем у сэрцы Валерыя Львовіча адгукаецца вайна ў Афганістане, узгадваць падзеі таго часу ён не любіць.

15 студзеня 1989 г. ў горадзе Тэрмез на мяжы з Афганістанам Валерыя Львовіча сустракала любімая жонка, а дома іх чакалі дзеці. Любоў Фёдараўна расказвала, што, калі муж служыў у Афганістане, сын з дачкой яе падтрымлівалі, а калі па тэлевізары дэманстравалі кадры з гарачай краіны, наогул адпраўлялі яе ў іншы пакой. Па шляху Валерыя Львовіча пайшоў і яго сын: таксама стаў ваенным.

Кажуць, час лечыць, але вайна – незагойная рана, забыць яе нельга...

І. Кавалёнка.

ЯНЫ КІРАВАЛІ ГОРАДАМ І РАЁНАМ

Старшыні Слуцкага гарвыканкама

САЙКО Аляксандр Аляксеевіч (14.5.1993 – 10.2.2005)

Старшыні Слуцкага райвыканкама

ЛОМАЦЬ Зянон Кузьміч (2.1.1995 – 23.2.2002)

ДРАКО Аляксандр Аляксандравіч (20.3.2002 – 18.9.2009)

ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч (8.12.2009 – 13.6.2013)

ЯНЧЭЎСКІ Андрэй Уладзіслававіч (27.1.2014 – па цяперашні час)

Будынак Слуцкага раённага выканаўчага камітэта

2017©nasledie-sluck.by

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Народныя і ўзорныя самадзейныя калектывы Случчыны, званні якім прысвоены ў 2001–2014 гг.

Ансамбль народнай музыкі Дзяржаўнай установы адукацыі «Селішчанская дзіцячая музычная школа мастацтваў».

Створаны на базе ДУА «Селішчанская дзіцячая музычная школа мастацтваў» у 1992 г. Спачатку гэта быў ансамбль аматараў ігры на народных інструментах, які прапагандаваў народную музыку сярод сельскіх жыхароў. З 2007 г. кіраўніком ансамбля з'яўляецца настаўнік Селішчанскай дзіцячай музычнай школы мастацтваў Капцэвіч Людміла Мікалаеўна.

На працягу часу калектыў назапасіў шмат музычных твораў беларускіх кампазітараў, народных песень, прафесійных і аматарскіх апрацовак.

Ансамбль – дыпламант абласных фестываляў «Грай, гармонік», «Напеў зямлі маёй», актыўна прымаў удзел у раённых мерапрыемствах. Неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі Упраўлення культуры аблвыканкама і райвыканкама за актыўны ўдзел у творчым жыцці вобласці і раёна. У 2012 г. ансамбль народнай музыкі ўдзельнічаў у V абласным фестывалі-конкурсе народнай музыкі «Грай, гармонік» (Нясвіж), дзе быў узнагароджаны дыпломам другой ступені.

У 2002 г. калектыву прысвоена званне «народны».

Ансамбль скрыпачоў «Tutti» Дзяржаўнай установы адукацыі «Слуцкая дзіцячая школа мастацтваў».

Заснаваны ў 1959 г. Кіраўнікі: Скубская Р.А. і Сарапулава Р.М., з 1995 г. Кулакова І.М., з 2012 г. Ярмушэвіч І.У., якая пашырыла склад калектыву, змяніла рэпертуар.

Штогод узорны ансамбль скрыпачоў «Tutti» актыўна прымае ўдзел у справаздачных канцэртах школы, мерапрыемствах і канцэртах горада і раёна, аглядах, паспяхова ўдзельнічае ў конкурсах і фестывалях розных узроўняў.

У 2011 г. калектыў быў адзначаны граматай абласнога конкурсу ансамбляў дзіцячых школ мастацтваў (г. Салігорск).

У 2001 г. ансамблю скрыпачоў прысвоена званне «ўзорны».

Ансамбль танца «Конфетти».

Створаны ў 1996 г. з дня адкрыцця Слуцкага гарадскога Дома культуры моладзі. Арганізатар – Г.В. Зданевіч, якая дасюль кіруе ім.

За час існавання калектыву ў ім прайшлі абучэнне каля 500 дзяцей.

У склад калектыву ўваходзяць чатыры групы (старшая, сярэдняя і дзве падрыхтоўчыя) ва ўзросце ад 5 да 20 гадоў колькасцю 100 чалавек. Калектыў працуе ў розных стылях харэаграфіі.

У 2001 г. калектыву прысвоена званне «ўзорны».

Вакальны ансамбль «Лабірынт».

Заснаваны ў снежні 2001 года М.Ф. Громам. У рэпертуары ансамбля – песні беларускіх і расійскіх аўтараў, народныя песні ў эстраднай апрацоўцы. Ёсць аўтарскія работы. Аднак асновай рэпертуару з'яўляюцца папуры на тэмы папулярных песень розных гадоў. Калектыў – пастаянны ўдзельнік гарадскіх і раённых, абласных і рэспубліканскіх святочных мерапрыемстваў: ушанаванні старшынь

2017©nasledie-sluck.by

ветэранскіх рухаў Мінскай вобласці (2010); у святочных мерапрыемствах да 65-годдзя Перамогі (2010, Курган Славы); Дня маці (2010, Маладзечна); Дня сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці агрэпрамысловага комплексу (2010, Маладзечна); у фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2011» (2011, Маладзечна); маладзёжнай грамадска-культурнай акцыі, прысвечанай памяці ахвяр выбуху ў Мінскім метро і на Чарнобыльскай АЭС «Зберагчы Беларусь для будучыні» (2012, Слуцк); святочнага канцэрта да 95-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (2012, Барысаў).

Калектыў неаднаразова выступаў з канцэртнай праграмай за мяжой (Расія, Польшча).

У 2010 г. калектыў за ўдзел у IX абласным фестывалі народнай творчасці «Напеў зямлі маёй» узнагароджаны Дыпломам III ступені.

У 2010 г. калектыву прысвоена званне «народны».

Вакальны ансамбль настаўнікаў «Элегія» Дзяржаўнай установы адукацыі «Вясейская дзіцячая школа мастацтваў».

Створаны ў 1996 г. У 2008 г. у калектыве змяніўся склад салістаў пад кіраўніцтвам М.К. Бярковіч.

Рэпертуар ансамбля шматжанравы: духоўная музыка, руская і замежная класіка, апрацоўкі беларускіх песень, творы беларускіх кампазітараў, джазавыя апрацоўкі і эстрадныя творы. Аснову выканання складаюць творы a capella.

Ансамбль вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. Ён пастаянны ўдзельнік гарадскіх і раённых мерапрыемстваў, абласных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў: (дыплом III ступені ў г. Барысаве на конкурсе патрыятычнай песні; дыплом лаўрэата II ступені на абласным аглядзе творчых калектываў ДМШ і ДШМ Мінскай вобласці; дыплом лаўрэата на IV Рэспубліканскім фестывалі «Ханука-2007» і г.д.).

У 2000 г. калектыву прысвоена званне «народны».

Духавы аркестр Дзяржаўнай установы адукацыі «Слуцкая дзіцячая школа мастацтваў».

Заснаваны ў 1977 г. на базе аддзялення духавых і ўдарных інструментаў Слуцкай ДМШ. Першы кіраўнік – Чарняўскі А.І., з канца 80-х г. Лазука П.К. і Лях С.Г., з 1998 г. і па цяперашні час Лазука П.К.

У рэпертуары духавога аркестра – творы розных стыляў і жанраў, класічная і сучасная музыка, суправаджэнне салістаў-вакалістаў і інструменталістаў.

Актыўны ўдзельнік абласных і рэспубліканскіх мерапрыемстваў: 2010 г. – абласное Свята Перамогі ў рамках фестывалю духавой музыкі «Майскі вальс» (Маладзечна) – дыплом лаўрэата III ступені; 2011 г. – Рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Дажынкі-2011» (Маладзечна); 2013 г. – IV Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах імя І. Дабравольскага (Мінск) – дыплом дыпламанта II ступені; 2013 г. – XXV фестываль духавой музыкі «Майскі вальс» (Нясвіж) – дыплом лаўрэатаў III ступені.

У 2002 г. калектыву прысвоена званне «ўзорны».

Калектыў клуба народных майстроў «Крылы творчасці» Квасыніцкага цэнтра рамёстваў.

Заснаваны ў 1999 г. на базе Квасыніцкага цэнтра рамёстваў. Налічвае 22 чал. Кіраўнік клуба Н.К. Матусевіч.

Удзельнікі клуба валодаюць наступнымі відамі рамёстваў: ткацтва, льняная цацка, вышыванне, дробная пластыка з

2017©nasledie-sluck.by

гліны, маляванне, лозапляценне, роспіс па дрэве, інкрустацыя, саломапляценне, бісерапляценне, пляценне паясоў, выцінанка.

Працуе творчая лабараторыя майстроў народнага аматарскага калектыву клуба народных майстроў «Крылы творчасці», дзе майстры дзеляцца сваім вопытам, новымі распрацоўкамі і праводзяць заняткі для кіраўнікоў клубных устаноў, якія набываюць навыкі і адкрываюць гурткі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў сваіх клубных установах.

Плённы ўдзел майстроў клуба і ў абласных, рэгіянальных святах-конкурсах: у рэгіянальным свяце-конкурсе па пляценні паясоў і вышыванні (Узда) І.В. Пісарык і Н.А. Барынь сталі лаўрэатамі за лепшы тканы пояс; Н.К. Матусевіч заняла 3-е месца ў намінацыі «За зберажэнне традыцый свайго рэгіёна»; на абласным свяце-конкурсе «Беларуская лялька» (Слуцк) І.В. Пісарык стала лаўрэатам конкурсу; майстры Н.І. Гарбацэвіч і А.М. Лістапад занялі 1-е месца ў розных намінацыях, Н.А. Барынь стала дыпламантам трэцяй ступені; з III рэгіянальнага свята-конкурсу «Саламяны павук» майстры клуба прывезлі чатыры дыпломы за 2-е месца ў розных намінацыях і два дыпломы за 3-е месца.

У 2002 г. калектыву прысвоена званне «народны».

Тэатр драмы і камедыі «Папараць-кветка».

Заснаваны ў 2001 г. Кіраўнікі: А. Салавей (2001–2005), А. Пінчук (2005–2012), Д. Шуманін (2012). Рэпертуар тэатра складаюць разнажанравыя пастаноўкі па творах М. Чарота «Чый гэта лапаць?», А. Астроўскага «Жаніцьба Бальзаміна-ва», Я. Стэльмаха «Каханне ў стылі барока», Ж.Б. Мальера «Уяўны хворы». Калектыў – дыпламант Міжнароднага фестывалю аматарскіх тэатральных калектываў «Рампа дружбы» (Еўпаторыя, 2005) у намінацыях «За выканальніцкае майстэрства» і «За лепшае ўвасабленне твораў народнай драматургіі». У 2007 г. на гэтым жа фестывалі тэатр атрымаў дыплом «За аб'яднанне славянскіх культур». На абласным конкурсе «Тэатральны верніса ж» (Барысаў, 2005) за спектакль па п'есе Міхася Чарота «Чый гэта лапаць?» у пастаноўцы рэжысёра А.І. Пінчука тэатр удастоены дыплома «За лепшае мастацкае ўвасабленне твора і выканальніцкае майстэрства».

У 2008 г. прысвоена званне «народны».

Тэатр лялек і масак «Бі-Ба-Бо».

Заснаваны ў 1993 г. Кіраўнікі – А. Яўташук (1993), Г. Несцярчук (2009), А. Яўташук (2010). У рэпертуары спектаклі: «38 попугаев» Р. Остэра, «Часы с кукушкой» С. Пракоф'евай, «Фараон Кузя» Л. Цітовай і інш. У 2005 г. калектыў за ўдзел у V абласным фестывалі дзіцячай тэатральнай творчасці «Чароўны куфэрак» узнагароджаны спецыяльным дыпломам «За разнастайнасць тэатральных форм, вернасць традыцыям тэатра лялек». Калектыў прыняў удзел у II рэгіянальным свяце-конкурсе «Беларуская лялька» (2010) і ў II абласным свяце-конкурсе «Беларуская лялька» (2013).

У 2002 г. калектыву прысвоена званне «ўзорны».

Тэатр танца «Дэмі-Гран» Слуцкага гарадскога маладзёжнага цэнтра.

Створаны ў 2000 г. Кіраўнік – А.І. Астроўская. Калектыў налічвае 20 удзельнікаў ад 15 да 35 гадоў. Тэатр танца працуе ў розных жанрах харэаграфіі: вольная пластыка, сучасны танец, характарны танец, у якім прысутнічае і драматургія. Першай работай тэатра быў

2017©nasledie-sluck.by

музычны спектакль, музыка да якога была напісана беларускім кампазітарам А. Залётневым «И рождён, и распят, и воскрес». Калектыў з'яўляецца актыўным удзельнікам усіх культурна-масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў горадзе і за яго межамі.

У 2002 г. калектыву прысвоена званне «народны».

Харэаграфічны ансабль «Кордэс».

У 2004 г. два калектывы – эстрадна-балетная група «Блеск» і ансамбль «Случчына» – аб'ядналіся ў адзін калектыў, які ў 2005 г. змяніў назву на ансамбль танца «Кордэс». Заснавальнік гэтых калетываў – Н.М. Мартыновіч. Рэпертуар ансамбля разнастайны, яго аснову складаюць народна-сцэнічныя танцы, эстрадныя танцы, тэатралізавана-харэаграфічныя кампазіцыі. Калектыў вядзе актыўную творчую дзейнасць: свята, прысвечанае Дню беларускага пісьменства (2008); тэлевізійны праект АНТ «Песні маёй краіны» (2009); міжнародны форум студэнтаў «Новая смена» (2009, Масква) – сертыфікат удзельніка; рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі» (Слуцк, 2005, Маладзечна, 2011); канцэрты, прысвечаныя 70-годдзю вызвалення горада-пабраціма Ржэва (Расія), ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (2013); абласное свята рамёстваў «Слуцкія паясы» (2013, Слуцк).

У 2006 г. калектыву прысвоена званне «народны».

Хор ветэранаў.

Створаны ў 1988 г. на базе Слуцкага гарадскога Дома культуры. Кіраўнікі – А. Бурмака (1988–1998), А. Шыян (1998), А. Матанская (2012).

Рэпертуар складаюць народныя беларускія, рускія і ваенна-патрыятычныя песні. Калектыў – дыпламант IX абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны» (2008); лаўрэат IX Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны» – дыплом лаўрэата (2008); лаўрэат X абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны» (2010); дыпламанты I і III ступені Міжнароднага фестывалю творчасці інвалідаў «Віцебск-2010», дыпламант абласнога свята «Пераможны май» у рамках рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны» (2012). У 2013 г. салісты народнага хору ветэранаў прынялі ўдзел у Міжнародным фестывалі творчасці інвалідаў «Віцебск-2013» у рамках Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар» і былі ўзнагароджаны: В. Баравік – дыплом I ступені і дыплом удзельніка, А. Кузняцоў – дыплом за ўдзел і дыплом удзельніка за волю да перамогі.

У 2001 г. калектыў атрымаў званне «народны».

Хор «Праменьчык» Дзяржаўнай установы адукацыі «Казловіцкая дзіцячая школа мастацтваў».

Створаны ў 1985 г. Кіраўнік – В.В. Ліпоўская.

Жанравы кірунак хору – акадэмічны. У складзе калектыву працуюць групы: малодшая, старшая, дуэты, салісты. Канцэртмайстры – А.А. Каляда, А.С. Васілевіч.

Калектыў з'яўляецца пастаянным удзельнікам раённых мерапрыемстваў: фестываляў творчай моладзі «Калейдаскоп талентаў», конкурсах патрыятычнай песні «Песні юнацтва нашых бацькоў», святаў дзіцячай творчасці «Таленты дабрыні» і інш.

2017©nasledie-sluck.by

У апошні час хор удзельнічаў у рэгіянальным туры абласнога конкурсу харавых калектываў у г. Маладзечне (2010), адкрытым рэгіянальным конкурсе ансамбляў «Веснавы праменьчык – 2012».

У 2002 г. калектыву прысвоена званне «ўзорны».

Эстрадная студыя «Звездопад» Слуцкага гарадского маладзёжнага цэнтра.

Дзіцячы эстрадны калектыў арганізаваны ў 2002 г. Кіраўнік – А.Г. Кудзёлка. Калектыў налічвае больш за 40 удзельнікаў, падзяляецца на тры ўзроставыя групы: малодшая – дзеці ад 5 да 8 гадоў, сярэдняя – ад 9 да 14 гадоў, старшая – ад 15 да 25 гадоў. Юныя спевакі асвойваюць вакальнае майстэрства, вучацца артыстызму. У працэс стварэння канцэртных нумароў і сцэнічных касцюмаў прыцягваюцца бацькі і родныя маленькіх артыстаў. Выхаванцы студыі дастойна прадстаўляюць Слуцкі раён на конкурсах, фестывалях абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню.

У 2011 г. калектыву прысвоена званне «ўзорны».

Падрыхтаваў Ю.А. Гайдук.

Дзяржаўная ўстанова «Слуцкі краязнаўчы музей» (гл. артыкул «Краязнаўчы музей» у кн. «Памяць. Слуцк. Слуцкі раён», кн. 2. С. 511–513).

У 2004 г. краязнаўчы музей рашэннем Мінскага аблвыканкама быў рэарганізаваны ў ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей» як юрыдычная асоба.

У музеі налічваецца звыш 30 тыс. музейных прадметаў, якія аб'ядноўваюцца ў 32 фондавыя калекцыі. За час з 2000 па 2014 г. фонды папоўніліся матэрыяламі знакамітых землякоў: пісьменнікаў М. Лобана, Г. Каржанеўскай, паэта В. Віткі, генерал-лейтэнанта галоўнага ваеннага саветніка ў краінах Афрыкі В. Шахновіча, генерал-лейтэнанта начальніка касмадрома Байканур Ю. Жукава, генеральнага канструктара ААТ «Тупалеў» І. Шаўчука, заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь, трохразовай чэмпіёнкі Паралімпійскіх гульняў І. Фядотавай і інш.

Адметнай падзеяй у 2013 г. стала набыццё за спонсарскія сродкі слуцкага пояса XVIII ст. З экспертнага заключэння: «Представленное на изучение произведение сшито из двух частей (118 см и 120 см длиной соответственно) одного пояса, каждая из которых включает «голову» (конец) и часть «середника», на концах – бахрома. Общая длина пояса 238 см… Пояс выткан из шелковой, серебряной и серебряной позолоченной («золотной») нити. Двухсторонний, четырехлицевой, полулитой… На одном из концов, в углах окантовки пояса вытканы метки «SLUCK» в прямом и зеркальном изображении. Данная метка, использование на концах мотива «цветущие пни», а также его общая стилистика и особенности художественного языка пояса указывают на его изготовление на мануфактуре Слуцка между 1762 и 1780 годами, когда фабрику возглавлял прославленный художник-текстильщик Ян Маджарский (Ованес Маджарянц)».

У структуру музея ўваходзяць два філіялы.

Музей этнаграфіі адчыніўся ў 2001 г., першапачатковая назва «Быт сялян XIX – пач. XX ст.». У сувязі з вялікай выставачнай дзейнасцю ў 2006 г. перайменаваны ў Музей этнаграфіі. Стацыянарная экспазіцыя распавядае аб жыцці сялян Слуцкага павета ў XIX – пач. XX ст., пра іх побыт, заняткі і г.д. У экспазіцыі – інтэр'ер «чырвонага кута» сялянскай

2017©nasledie-sluck.by

Экспазіцыя Слуцкага краязнаўчага музея

хаты, посуд і іншыя хатнія рэчы, традыцыйнае адзенне сялян, прыстасаванні для апрацоўкі лёну і інш.

Супрацоўнікамі музея этнаграфіі праводзяцца перасоўныя і тэматычныя выставы ў школах горада і раёна, а таксама выставы народных майстроў – Т. Чэркас, І. Калацкага, Н. Сыцько, Л. Рамановіч, А. Шапеля, А. Піхцеравай, А. Альховіка, Н. Гарбацэвіч, Л. Гуцавай і інш.

Галерэя мастацтваў адчынена ў 2005 г. у час правядзення Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005» у Слуцку. Месціцца ў 2-павярховым будынку былога дзіцячага садка, мае 4 выставачныя залы і лекцыйную на 40 месц са зменнай экспазіцыяй. У сярэднім за год праводзіцца каля 20 выставачных праектаў рознага кірунку: тэматычныя і персанальныя выстаўкі жывапісу і графікі з фондаў краязнаўчага музея, мастакоў У. Голуба, У. Садзіна, І. Бархаткова, А. Бархатковай, І. Пратасені, У. Вітко, М. Валынца, У. Хадаровіча, В. Шкарубы, скульптараў У. Ламейкі, Э. Астаф'ева і інш.

У 2013 г. філіялу ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей» – «Галерэя мастацтваў» прысвоена імя мастака У.С. Садзіна.

У сярэднім штогод фонды ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей» папаўняюцца больш як 500 адзінак захоўвання, супрацоўнікамі ўстановы арганізоўваецца звыш 30 выставак, праводзіцца каля 700 экскурсій, у навучальных установах прачытваецца 80 лекцый, праходзіць 60 культурна-адукацыйных мерапрыемстваў. Гэта «Ночы музеяў», сустрэчы з ветэранамі

Экспазіцыя музея этнаграфіі

2017©nasledie-sluck.by

Галерэя мастацтваў

Вялікай Айчыннай вайны і з воінамі-інтэрнацыяналістамі, музейна-педагагічныя заняткі, майстар-класы, прэзентацыі і інш.

Увага надаецца падрыхтоўцы публікацый па асобных тэмах гісторыі краю. Выдадзены альбомы «Слуцкая палитра» (2010), «Слуцк. Путешествие во времени» (2011), буклет «Слуцкий пояс» (2013).

Усе гэта – вынік вялікай навукова-даследчай дзейнасці, якая праводзіцца калектывам.

Фондавыя матэрыялы музея выкарыстаны пры падрыхтоўцы гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк». Кн. 1, 2 (2000, 2001) і 3-я дапаўняльная.

У музеі і філіялах можна набыць друкаваныя выданні, прысвечаныя гісторыі Случчыны, і сувенірную прадукцыю з краявідамі горада.

Захаваннем, вывучэннем і прапагандай спадчыны роднага краю займаюцца супрацоўнікі музея і яго філіялаў В.А. Ажэўскі, І.А. Бойка, І.Л. Левочка, Г.А. Макарэвіч, П.Г. Мароз, І.А. Мурашка, В.В. Цішкевіч, Л.У. Шкурская. З 2003 г. установу ўзначальвае Н.Г. Серык.

Экспазіцыя ў галерэі мастацтваў

2017©nasledie-sluck.by

Спіс населеных пунктаў Слуцкага раёна

№№ пп	Название населенного пункта	Число личных хозяйств	Число постоянно прожи-вающего населения	В том числе в возрасте		
				моложе трудо-способ-ного	трудо-способ-ном	старше трудо-способ-ного
1	2	3	4	5	6	7
БЕЛИЧСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Беличи	87	183	21	86	76
2.	Болотчицы	196	382	38	195	149
3.	Горки	47	80	9	33	38
4.	Евличи	87	172	27	85	60
5	Квасыничи	272	753	142	465	146
6.	Мацицы	25	39	2	16	21
7.	Млынка	25	39	3	16	20
8.	Новобеличи	38	75	10	41	24
9.	аг. Октябрь	103	298	41	208	49
10.	Целевичи	103	205	31	99	75
11.	Чижовка	75	134	10	60	64
	ИТОГО	**1058**	**2360**	**334**	**1304**	**722**
БОКШИЦКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Бокшицы	63	125	11	64	50
2.	Василинки	112	465	161	234	70
3.	Городище	141	282	19	168	95
4.	Гороховка	15	26	3	9	14
5.	Заболоть	9	10	–	3	7
6.	Загорье	12	22	2	8	12
7.	аг. Заполье	129	319	55	204	60
8.	Кухты	66	122	9	57	56
9.	Малая Падерь	66	160	12	95	53
10.	Михейки	145	331	38	183	110
11.	Молотково	37	64	8	25	31
12.	Новая Нива	12	17	–	8	9
13.	Прощицы	149	321	35	156	130
14.	Радичево	48	106	10	60	36
15.	Уланово	25	39	–	14	25
16.	Ушаловичи	28	50	2	26	22
	ИТОГО	**1057**	**2459**	**365**	**1314**	**780**

2017©nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7
ВЕСЕЙСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Березовка	64	136	18	69	49
2.	Борки	16	30	1	18	11
3.	Бусловка	6	10	–	5	5
4.	Васильково	16	53	15	24	14
5.	аг. Весея	503	1285	183	790	312
6.	Избудище	42	90	19	39	32
7.	Камора	3	5	–	2	3
8.	Красное Село	63	116	11	50	55
9.	Леньки	5	13	1	6	6
10.	Липники	1	4	–	2	2
11.	Лошица	5	5	–	–	5
12.	аг. Мелешки	184	408	53	220	135
13.	Муравищина	17	38	4	21	13
14.	Набушево	14	37	8	20	9
15.	Поповцы	107	266	51	146	69
16.	Слобода	9	11	–	2	9
17.	Талица	2	2	–	–	2
	ИТОГО	**1057**	**2509**	**364**	**1414**	**731**
ГАЦУКОВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Белый Бор	13	24	1	4	19
2.	Белая Лужа	37	60	2	28	30
3.	Буда Гресская	47	102	8	51	43
4.	аг. Вежи	160	492	100	328	64
5.	Воробьево	8	12	–	3	9
6.	аг. Гацук	393	978	145	587	246
7.	Забелы	3	4	–	–	4
8.	Залесье	13	19	2	5	12
9.	Евладовичи	10	18	–	5	13
10.	Кривая Гряда	24	49	3	29	17
11.	Озерцы	21	42	4	18	20
12.	Ульяновка	10	13	–	5	8
13.	Шведы	24	40	6	15	19
14.	Шицицы	137	346	53	202	91
	ИТОГО	**900**	**2199**	**324**	**1280**	**595**
ГРЕСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Борки	25	42	2	17	23

2017©nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7
2.	Ветка	66	127	14	69	44
3.	аг. Греск	699	1625	224	874	527
4.	Клешево	55	130	16	76	38
5.	аг. Летковщина	134	363	74	224	65
6.	Маяк	126	269	50	146	73
7.	Морозы	8	12	–	5	7
8.	Мусичи	54	106	11	50	45
9.	Островок	23	33	1	19	13
10.	Прогресс	4	4	–	2	2
11.	Старина	7	11	–	4	7
12	Степково	32	52	5	21	26
13.	Шуляки	21	31	3	13	15
	ИТОГО	**1254**	**2805**	**400**	**1520**	**885**
ЗНАМЕНСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	пос. Беларусь	7	15	4	6	5
2.	Борок	77	143	10	77	56
3.	Ваньковщина	9	15	3	6	6
4.	пос. Вишневка	8	19	3	9	7
5.	пос. Дуброва	8	11	–	4	7
6.	Залядье	7	14	1	8	5
7.	Знамя	198	494	67	302	125
8.	Кажушки	24	38	5	15	18
9.	аг. Ленино	177	460	89	267	104
10.	Лопатичи	50	90	7	37	46
11.	пос. Малиновка	39	105	31	55	19
12.	пос. Михайловка	8	14	–	7	7
13.	Невязцы	40	96	13	53	30
14.	аг. Подлесье	182	492	90	308	94
15.	пос. Сахалин	7	9	–	2	7
16.	пос. Свободный	5	9	2	3	4
17.	Селище	245	572	85	318	167
18.	Середняки	21	42	7	17	18
19.	Славинск	28	74	16	46	12
20	Терасполь	25	58	4	32	22
21.	Ульяновка	15	33	3	18	12
22.	пос. Усход	8	19	5	7	7
23.	пос. Хлебный Клин	5	13	2	7	4

2017©nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7
24.	Чирвоная Нива	10	19	2	4	13
25.	Шаловичи	53	98	6	49	43
	ИТОГО	**1254**	**2952**	**455**	**1657**	**838**
	ИСЕРНСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ					
1.	Великая Слива	289	591	89	303	199
2.	Великий Быков	78	145	19	53	73
3.	Волоты	9	11	1	2	8
4.	Гуляево	41	64	7	22	35
5.	аг. Исерно	158	411	84	243	84
6.	пос. Калиновка	11	15	–	4	11
7.	пос. Малиновка	6	9	–	3	6
8.	Малый Быков	29	40	2	16	22
9.	Нежевка	51	109	23	42	44
10.	Новоселки	9	13	1	6	6
11.	Паничи	10	14	2	5	7
	ИТОГО	**699**	**1422**	**228**	**699**	**495**
	КИРОВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ					
1.	Великое Журово	54	96	10	45	41
2.	Ивановские Огородники	91	205	22	114	69
3.	Ивань	27	58	8	29	21
4.	Кирово	168	381	59	204	118
5.	Клепчаны	186	376	52	181	143
6.	Лесище	24	44	8	19	17
7.	Маглыши	28	50	5	17	28
8.	Малая Падерь	35	87	15	51	21
9.	Новодворцы	244	573	80	297	196
10.	Новый двор	81	179	21	104	54
11.	Огородники	50	111	15	63	33
12.	Працевичи	165	343	52	170	121
13.	Устрань	17	26	3	11	12
	ИТОГО	**1165**	**2529**	**350**	**1305**	**874**
	КОЗЛОВИЧСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ					
1.	Ближние Бондари	46	98	16	44	38
2.	Великая Падерь	70	141	23	71	47
3.	Дальние Бондари	35	60	8	20	32
4.	Заградье	44	91	12	45	34

2017©nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7
5.	аг. Козловичи	382	915	143	533	239
6.	Кублище	7	12	2	4	6
7.	Лесуны	58	111	11	46	54
8.	Малая Слива	26	55	5	30	20
9.	Мерешино	53	123	27	58	38
10.	Огородники	107	244	36	127	81
11.	Повстынь	179	466	74	295	97
12.	Рабак	53	109	9	54	46
13.	Ячево	174	383	39	221	121
	ИТОГО	**1228**	**2808**	**405**	**1548**	**855**
ПЕРВОМАЙСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Аполины	17	27	2	9	16
2.	Боровая	16	42	6	22	14
3.	Гольчичи	209	485	82	281	122
4.	Жилин Брод	60	156	18	86	52
5.	Кальчицы	42	65	2	30	33
6.	Кулики	10	18	1	10	7
7.	Нива	44	62	3	18	41
8.	Новинки	55	135	16	78	44
9.	Пильня	8	14	2	8	4
10.	Поликаровка	2	3	–	–	3
11.	Ржавка	19	63	15	36	12
12.	Строхово	–	–	–	–	–
13.	Таковище	19	33	3	17	13
14.	Шантаровщина	12	21	2	9	10
	ИТОГО	**528**	**1150**	**155**	**615**	**380**
ПОКРАШЕВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Адамово	15	31	5	16	10
2.	Ануфровичи	53	95	10	44	41
3.	Бобовище	10	24	7	12	5
4.	Выницци	83	140	6	48	86
5.	Замостье	221	536	90	304	142
6.	аг. Леньки	178	371	36	222	113
7.	Павловка	15	30	5	15	10
8.	Покрашево	163	354	53	176	125
9.	Рудня	59	134	17	73	44
	ИТОГО	**819**	**1715**	**229**	**910**	**576**

2017©nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7
РАЧКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Белевичи	64	123	21	68	34
2.	Замошье	15	19	–	4	15
3.	Ковержицы	2	3	–	3	–
4.	аг. Лядно	280	712	131	430	151
5.	Малышевичи	34	61	8	21	32
6.	Новые Рачковичи	126	236	22	144	70
7.	Придирки	6	10	–	5	5
8.	Пятницы	2	2	–	–	2
9.	Рачковичи	20	40	3	22	15
10.	Славино	–	–	–	–	–
11.	аг. Танежицы	225	530	97	315	118
12.	пос. Чайчицы	2	2	–	1	1
13.	пос. Чаплицы	15	28	1	14	13
14.	Чаплицы	68	117	8	47	62
15.	пос. Юлисино	6	8	–	4	4
	ИТОГО	**865**	**1891**	**291**	**1078**	**522**
СЕРЯЖСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Безверховичи	130	270	35	126	109
2.	пос. Безверховичи	20	33	1	16	16
3.	Брановичи	206	511	71	305	135
4.	Браново	13	16	1	4	11
5.	Варковичи	151	294	26	154	114
6.	пос. Качалово	2	2	–	–	2
7.	аг. Лучники	629	1628	265	958	405
8.	Павловка	13	18	–	11	7
9	Подлипцы	81	132	7	58	67
10.	пос. Ретовщина	7	9	–	1	8
11.	Серяги	238	549	75	320	154
	ИТОГО	**1490**	**3462**	**481**	**1953**	**1028**
СОРОГСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ						
1.	Волошево	21	41	3	20	18
2.	Гутница	9	14	–	11	3
3.	Дворище	21	60	7	32	21
4.	Калита	22	50	6	29	15
5.	Красное	3	3	–	1	2
6.	Круглое	5	7	–	3	4

2017©nasledie-sluck.by

1	2	3	4	5	6	7
7.	Кучино	2	2	–	–	2
8.	Ляхово	2	2	–	1	1
9.	Мелитоново	2	2	–	–	2
10.	Новый Гутков	20	31	3	10	18
11.	Омговичи	149	392	65	228	99
12.	Оступище	1	1	–	–	1
13.	Павловка	3	3	–	1	2
14.	Подлошица	4	5	–	1	4
15.	Подстарево	–	–	–	–	–
16.	Рубеж	2	3	–	2	1
17.	Рыжица	9	16	2	9	5
18.	Сливка	5	10	1	11	4
19.	Сороги	188	472	69	311	92
20.	Старево	2	6	2	4	–
21.	Старый Гутков	32	91	21	47	23
22.	Тарасовка	1	1	–	1	–
23.	Тихонь	3	3	–	1	2
24.	Хиноловка	2	3	1	2	–
25.	Хорошево	8	9	–	3	6
26.	Чирвоная Сторонка	4	4	–	1	3
	ИТОГО	**520**	**1237**	**180**	**729**	**328**
	Всего по району	**13894**	**31962**	**4625**	**17608**	**9729**

2017©nasledie-sluck.by

ЗМЕСТ

Да чытача 17

Ад часоў старажытных – 1917 20

Слуцк у кнігапісанні Беларусі 21

Слуцкі Троіцкі манастыр 26

Слуцкія званы 28

Слуцкае Евангелле –
беларуская святыня 31

Слуцкае выданне «Манархіі Турэцкай» 33

«На всемирную пользу…» 34

Сімвалы справаводства 40

Дакументы сведчаць 42

Слуцкая батлейка 44

Арганізацыя паляванняў
у ардынацыях князёў Радзівілаў
у канцы XIX – пачатку XX ст. 44

Гартаючы старонкі XX стагоддзя 47

Знакамітыя землякі 56

2017©nasledie-sluck.by

Гісторыя Слуцка ў перыядычных выданнях XIX стагоддзя 60
Музыканты и исполнители Слутчины в XIX веке 64

1917–1941 66

На крутым павароце гісторыі 67
Вернутыя імёны 87
Дакументы сведчаць 151
Савецка-фінляндская вайна 1939–1940 гг. 156

1941–1945 164

Ішла вайна народная 165
На фронце і ў тыле ворага 184
У акупіраваным Слуцку 200
Не забыць слуцкі лагер 204
Гавораць сведкі спаленых вёсак 209
У ваеннае ліхалецце 232
Мы – дзеці вайны 233
Была вайна… 237
Дакументы сведчаць 288
Вызваленне 304
Ім давялося жыць на той зямлі, якую адваёўвалі 321
«Перамога дасталася нялёгка...» 325
Пераможныя крылы «Нармандыі – Нёман» 326
Дакументы сведчаць 328
Яны вярнуліся пераможцамі 329
Ахвяры вайны 394

2017©nasledie-sluck.by

1945 – да нашых дзён 164

Аднаўленне народнай гаспадаркі 465

Дакументы сведчаць 477

Ад дня ўчарашняга да дня сённяшняга 480

Гісторыя газетным радком 488

Вызначыліся працай 551

Ганаровыя грамадзяне Слуцкага раёна 563

Нарадзіліся на Случчыне 566

Звязаны лёсам са Случчынай 597

Яны выконвалі службовыя абавязкі 602

Яны кіравалі горадам і раёнам 605

З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны 606

Спіс населеных пунктаў Слуцкага раёна 613

2017©nasledie-sluck.by

Прадстаўнікі грамадскасці Слуцкага раёна, якія прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы рукапісу кнігі «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк. Кн. 3 (дадатак)»:

І.І. Васілевіч, Л.І. Дзідзенка, В.К. Закрэўская, А.Я. Кіслюк, І.І. Кулеш, М.М. Тарасевіч, М.А Тычына, Л.У. Шкурская.

Камп'ютарны набор:
І.І. Васілевіч, У.М. Грыдасаў, Г.А. Загароўская, С.І. Сарагавец, Т.І. Стальмашонак.

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі
з фондаў ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей»,
фотахронікі УП «БЕЛТА»,
з асабістых архіваў.

Раённая камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі выказвае падзяку ўсім, хто прымаў удзел у падрыхтоўцы і выданні гэтай кнігі.

2017©nasledie-sluck.by

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ХРОНІКА
СЛУЦКАГА РАЁНА І ГОРАДА СЛУЦКА

Кніга 3-я
(дадатак)

На беларускай і рускай мовах

Галоўны рэдактар
Г.М. Галаватая

Рэдагаванне і падбор ілюстрацый:
А.А. Дылейка, А.В. Жыбуль

Сканіраванне ілюстрацый і камп'ютарная вёрстка:
І.А. Буфетава, Ю.М. Комар

Тэхнічны рэдактар
А.У. Касцюк

Карэктар
Т.М. Бутэвіч

ISBN 978-985-7064-14

Падпісана да друку 10.04.2015.
Фармат 70х100 1/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум.- друк. арк. 49,4. Ул.- выд. арк. 42,9.
Тыраж 1500 экз. Заказ 1102.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Беларускае тэлеграфнае агенцтва» (УП «БЕЛТА»).
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/200 ад 20.02.2014.
Вул. Кірава, 26, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 4.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

2017©nasledie-sluck.by